Уладзімір КАНАНОВІЧ

# Рыцар на полі бітвы:

## Клецк, жнівень 1506 года



Уладзімір КАНАНОВІЧ

# Рыцар на полі бітвы:

## Клецк, жнівень 1506 года



**Уладзімір КАНАНОВІЧ**

# Рыцар на полі бітвы:

## Клецк, жнівень 1506 года

Гісторыка-антрапалагічнае даследаванне



Смаленск
Інбелкульт
2017

УДК 94(476.1)"1506"
ББК 63.3
К19

**Кананові̇ч, У. І.**

К19 Рыцар на полі. Клецк, жнівень 1506 г.: гісторыка-антрапалагічнае даследаванне / Уладзімір Ільіч Кананові̇ч. — Смаленск: Інбелкульт, 2017. — 410 с.

ISBN 978—5-00076—043—7

У кнізе рэканструюецца ход і характар бітвы пад Клецкам 1506 г., якая была адной з найбольш важных і знакамітых у вайсковай гісторыі Вялікага Княства Літоўскага. Гэтая падзея разглядаецца на фоне агульнага ваенна-палітычнага становішча ва Усходняй Еўропе на мяжы XV—XVI стст. Даследаванне праведзена з выкарыстаннем метаду гістарычнай антрапалогіі: адзін з яго раздзелаў уяўляе сабой палітычную біяграфію галоўнага героя бітвы пад Клецкам Міхаіла Глінскага, не абмінутыя таксама ўвагай і іншыя найбольш яркія палітычныя постаці тагачаснай дзяржавы Ягелонаў. Акрамя таго, аналізуецца гісторыя стварэння памяці пра Клецкую бітву 1506 г.: складванне вобразу бітвы, а таксама яе галоўнага героя, у свядомасці сучаснікаў і нашчадкаў, а таксама трансфармацыя гэтага вобразу на працягу стагоддзяў.

**УДК 94(476.1)"1506"**
**ББК 63.3**

**ISBN 978—5-00076—043—7**

© ТАА «Інбелкульт», 2017
© Уладзімір Кананові̇ч, 2017

# Змест

**Скарачэнні ... 10**

**Уводзіны ... 11**

**1. Ваенна-палітычнае становішча ва Усходняй Еўропе на мяжы XV—XVI стст. ... 22**

**1.1. Ад міру да вайны ... 22**

1.1.1. Смерць вялікага князя Казіміра Ягайлавіча і канец мірнай эпохі ў ВКЛ ... 22

1.1.2. Геапалітычныя зрухі ва Усходняй Еўропе і ўзвышэнне Масквы ... 26

1.1.3. Пагроза з поўдня ... 27

1.1.4. Новы выклік: Крымскае ханства ... 30

1.1.5. Крымскі хан Менглі-Гірэй ... 35

1.1.6. Вайна з Масквой 1492—1494 гг. ... 38

1.1.7. «Вечны мір» 1494 г. і шлюб вялікага князя літоўскага Аляксандра Казіміравіча і вялікай княжны маскоўскай Алены Іванаўны ... 39

1.1.8. Новая маскоўска-літоўская вайна ... 41

1.1.9. Катастрофа на Вядрошы (14.06.1500 г.) ... 43

1.1.10. Найманыя жаўнеры ... 46

1.1.11. Пачатак спусташальных татарскіх нападаў на цэнтральныя землі ВКЛ ... 47

1.1.12. Старыя і новыя хаўруснікі ... 48

1.1.13. Каранацыя Аляксандра Казіміравіча ... 50

1.1.14. Абарона Смаленска (1502 г.) ... 52

1.1.15. Татарскі напад 1502 г. ... 54

1.1.16. Крымскі напад 1503 г. Руйнаванне Клецка ... 55

1.1.17. Слуцкі князь Сямён Міхайлавіч ... 58

1.1.18. Мур вакол Вільні ... 59

1.1.19. Крымскі смерч 1505 г. Аблога Менска ... 61

1.1.20. Арышт і інтэрніраванне заволжскіх паслоў у 1506 г. ... 63

1.1.21. Аляксандр Казіміравіч збіраецца ў Польшчу ... 66

1.1.22. Першыя весткі пра новы татарскі напад ... 68

1.1.23. Змаганне пад Клецкам ........ 71
1.1.24. Разгром крымскага войска. Уцёкі татараў ........ 73
1.1.25. Вяртанне ў Вільню ........ 74
1.1.26. Пасля перамогі ........ 75
1.1.27. Смерць Аляксандра Казіміравіча (19.08.1506 г.) ........ 77
1.1.28. Новы гаспадар ........ 78
1.1.29. Угода з Крымам. Татарскія «ўпамінкі» ........ 80
1.1.30. Лёс крымскіх палонных ........ 82

**2. Князь Міхаіл Глінскі: фаварыт вялікага князя Аляксандра Казіміравіча і герой Клецкай бітвы ........ 89**

**2.1. Паходжанне роду Глінскіх ........ 89**

2.1.1. Складанасці вывучэння паходжання роду Глінскіх ........ 89
2.1.2. Крыніцы па гісторыі роду князёў Глінскіх. «Подлинный родослов Глинских князей» ........ 95
2.1.3. Кіяты і Чынгізхан ........ 100
2.1.4. Князь Мамай ........ 102
2.1.5. Княства Мансур-Кіята ........ 104
2.1.6. Князь Алекса Мансуравіч ........ 105
2.1.7. Князь Іван — пачынальнік роду князёў Глінскіх ........ 108
2.1.8. Князь Барыс Глінскі ........ 112
2.1.9. Князь Леў Глінскі ........ 114

**2.2. Выхаванне і гады вандраванняў Міхаіла Глінскага ........ 116**

2.2.1. Нараджэнне і маленства ........ 116
2.2.2. Пераезд у Літву ........ 119
2.2.3. У Храптовічаў у Шчорсах ........ 120
2.2.4. Міхаіл у Вільні ........ 122
2.2.5. На гаспадарскім двары ........ 124
2.2.6. За мяжой ........ 126
2.2.7. На дварах Габсбургаў і Вецінаў ........ 129
2.2.8. З імператарам Максіміліянам Габсбургам у Італіі ........ 130
2.2.9. Кароткачасовае вяртанне дамоў. Удзел у чарнаморскай выправе 1497 г. ........ 133
2.2.10. Знаёмства з князем Астрожскім ........ 137
2.2.11. На вайне ў Фрысландыі ........ 141
2.2.12. Вяртанне дамоў ........ 144

**2.3. На гаспадарскай службе ....................................146**
2.3.1. Браты Іван і Васіль — гаспадарскія дваране ...............146
2.3.2. Уцянскі намеснік ...............................................148
2.3.3. Надворны маршалак ............................................150
2.3.4. Мерацкі намеснік ...............................................155
2.3.5. Пасольства да венгерскага караля
Уладзіслава Ягелона.................................................158
2.3.6. Міхаіл Глінскі і канфлікт у радзе паноў.
Судовая справа з Янам Забярэзінскім ..........................161
2.3.7. З гаспадаром у Польшчы.....................................167
2.3.8. Уладар Турава ...................................................168
2.3.9. У Прусіі...........................................................170
2.3.10. Бельскі намеснік ...............................................172
2.3.11. Справа запісу па душу князя Дзімітрыя Пуцяціча ....174
2.3.12. Апошні загад гаспадара.......................................175
**2.4. У няласцы ў новага гаспадара .................................176**
2.4.1. Зайздрасць радных паноў. Аднаўленне спрэчкі
з Янам Забярэзінскім ...............................................176
2.4.2. Зносіны з крымскім ханам Менглі-Гірэем ..................178
2.4.3. Візіт да венгерскага караля Уладзіслава Ягелона........... 181
2.4.4. Помста Яну Забярэзінскаму....................................183
**2.5. На службе ў вялікага князя маскоўскага Васіля III .......185**
2.5.1. Бунт Глінскіх ....................................................185
2.5.2. Ад'езд Глінскіх у Маскву......................................189
2.5.3. Смерць і нашчадкі..............................................189

## 3. Стварэнне памяці пра Клецкую бітву 1506 г. ......202

**3.1. Клецкая бітва ў пісьмовых дакументах эпохі ...............202**
3.1.1. Эпоха татарскіх нападаў у гістарычнай
памяці рыцарскага саслоўя ВКЛ...................................202
3.1.2. Першыя весткі пра перамогу пад Клецкам ...................204
3.1.3. Адлюстраванне Клецкай бітвы ў літаратуры
эпохі Адраджэння. «Пруская вайна» Яна Вісліцкага ..........206
3.1.4. Апісанне Клецкай бітвы польскімі храністамі.
Мацей Мяхоўскі (з Мехава)........................................207
3.1.5. Бернард Вапоўскі...............................................208

3.1.6. Прускія аўтары пра Клецкую бітву.
Вармінскі біскуп Лукаш Ватцэнродэ ........................................ 209
3.1.7. Клецкая бітва ў летапісах ВКЛ 20—40-х гг. XVI ст. ... 211
3.1.8. Марцін Кромер ........................................ 213
3.1.9. Марцін Бельскі ........................................ 215
3.1.10. Інфлянцкая вайна і патрэба ў новых героях ........... 216
3.1.11. Новы вобраз бітвы ў Хроніцы Быхаўца ................. 217
3.1.12. Мацей Стрыйкоўскі ........................................ 223
3.1.13. Аляксандр Гваньіні ........................................ 228
3.1.14. Віюк-Войцех Каяловіч ........................................ 229
**3.2. Трыумфатар Клецкай бітвы Міхаіл Глінскі вачыма сучаснікаў ........................................ 230**
3.2.1. Працэс стварэння «чорнай легенды»
Глінскага: прычыны і абставіны ........................................ 230
3.2.2. Адмоўны вобраз Міхаіла Глінскага
ў палітычнай публіцыстыцы ВКЛ першай паловы XVI ст. .... 232
3.2.3. Голас у абарону Глінскага: Ёдак Дэцыус ................. 233
3.2.4. Міхаіл Глінскі як галоўны герой
«Нататак пра Масковію» Жыгімонта Герберштайна ........... 234
**3.3. Клецкая бітва ў мясцовых паданнях і легендах .............. 241**
3.3.1. Месца Клецкай бітвы 1506 г. у гістарычнай
памяці клецкай мяшчанскай абшчыны XVI—XIX стст. ...... 241
3.3.2. Клецкая бітва 1506 г. з татарамі і бітва
пад Клецкам 1706 г. са шведамі ........................................ 250
**4. Рэканструкцыя бітвы пад Клецкам 1506 г. ......258**
**4.1. Агульныя меркаванні ........................................ 258**
4.1.1. Цяжкасці, звязаныя з рэканструкцыяй
бітвы ў Сярэднявеччы і пачатку Новага часу ................. 258
4.1.2. Вобраз бітвы ў наратыўных крыніцах
канца XV — пачатку XVI ст. ........................................ 259
**4.2. Ваенныя сілы праціўнікаў ........................................ 264**
4.2.1. Войска ВКЛ ........................................ 264
4.2.2. Крымска-татарскае войска ........................................ 278
4.2.3. Шляхі пранікнення татарскіх аддзелаў на землі
ВКЛ і Польшчы, тактыка дзеянняў татарскага войска ....... 281
**4.3. Прастора бітвы ........................................ 288**

4.3.1. Прыродны ландшафт Клеччыны ў старажытнасці ........ 288
4.3.2. Клецкае княства ў Сярэднявеччы ........ 292
4.3.3. Клецк у канцы XV — пачатку XVI ст. ........ 294
**4.4. Бітва ........ 302**
4.4.1. Шлях гаспадарскага войска да Клецка ........ 302
4.4.2. Лакалізацыя бітвы ........ 304
4.4.3. Надвор'е ў час бітвы.
Клімат у Познім Сярэднявеччы ........ 318
4.4.4. Тактычныя дыспазіцыі праціўнікаў перад бітвай ........ 319
4.4.5. Апошнія прыгатаванні бакоў да бітвы ........ 324
4.4.6. Змаганне ........ 326
4.4.7. Разгром галоўных сіл праціўніка ........ 330
4.4.8. Пастка ........ 331
4.4.9. Праследаванне ........ 332
**4.5. Пасля бітвы ........ 333**
4.5.1. Пахаванне забітых і ўшанаванне іх памяці ........ 333
4.5.2. Клецк: гарадскі ландшафт пасля бітвы ........ 335
**4.6. Асоба военачальніка ........ 340**
4.6.1. Цяжкасці, звязаныя з вывучэннем
асобы ў Сярэднявеччы ........ 340
4.6.2. Прыдворнае грамадства і станаўленне
характару героя ........ 342
4.6.3. Фізічнае і духоўнае аблічча князя
Міхаіла Глінскага ........ 351
4.6.4. Стаўленне героя да смерці ........ 353
4.6.5. Міхаіл Глінскі ў коле сям'і ........ 353
4.6.6. Глінскі і бліжэйшыя сваякі: Храптовічы ........ 354
4.6.7. Глінскі і гаспадар ........ 357
**Заканчэнне ........ 360**
**Дадатак ........ 366**
**Крыніцы і літаратура ........ 382**
Крыніцы ........ 382
Літаратура ........ 384
**Геаграфічны паказальнік ........ 390**
**Імянны паказальнік ........ 400**

# Скарачэнні

АЗР — Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою Комиссиею

ВИМОИиДР — Временник Императорского Московского общества истории и древностей Российских

НГАБ — Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі

ПКПКК — Писцовая книга Пинского и Клецкого княжеств

ПСРЛ — Полное собрание русских летописей

РИБ — Русская историческая библиотека

СИРИО — Сборник Императорского Русского исторического общества

AA — Akta Aleksandra, króla polskiego, wielkiego księcia litewskiego itd.

AGAD — Archiwum Główne Akt Dawnych

AS — Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie

AT — Acta Tomiciana

AU — Akta unii Polski z Litwą

LM — Lietuvos Metrika

PSB — Polski Słownik Biograficzny

RHDOMT — Regesta historico-diplomatica Ordinis S. Mariae Theutonicorum

# Уводзіны

XVI ст. пачалося для Вялікага Княства Літоўскага (далей — ВКЛ) надзвычай драматычна. Яшчэ маці, жонкі і нявесты працягвалі аплакваць сваіх сыноў, мужоў і каханых, што паклалі свае галовы на Вядрошы 14 ліпеня 1500 г. або трапілі ў цяжкі маскоўскі палон, як на землі дзяржавы прыйшла новая бяда. Пачынаючы з восені 1500 г. не было бадай і года, каб тэрыторыя ВКЛ не станавілася аб'ектам нападу крымскіх татараў. Хан апошніх, Менглі-Гірэй, які дзейнічаў у хаўрусе з вялікім князем маскоўскім Іванам III, рэгулярна і мэтанакіравана нішчыў уладанні паўночнага суседа. У свядомасці наступных пакаленняў жыхароў ВКЛ другая палова кіравання вялікага князя літоўскага Аляксандра Казіміравіча (польскі кароль — з 1501 г.), на якую прыпалі няўдалая вайна 1500—1503 гг. з Маскоўскай дзяржавай і знішчальныя татарскія набегі 1500—1506 гг., засталася адной з самых трагічных старонак гісторыі дзяржавы.

Тым не менш, ваенна-палітычная гісторыя ВКЛ пачатку XVI ст. або нават адносіны з Крымскім ханствам гэтага часу не з'яўляюцца галоўным прадметам нашага даследавання. Гэта тэма мае багатую гістарыяграфію[1]. Прадметам даследавання з'яўляецца выключная гістарычная падзея, якая завяршала і, разам з тым, падсумоўвала перыяд панавання караля і вялікага князя Аляксандра Казіміравіча. Яна адбылася ўсяго за два тыдні да смерці гаспадара. Гэта перамога над крымскімі татарамі, якую ў бітве пад Клецкам 5 жніўня 1506 г. атрымаў фаварыт Аляксандра Казіміравіча, князь Міхаіл Львовіч Глінскі.

Зварот аўтара да тэмы Клецкай бітвы 1506 г. абумоўлены некалькімі фактарамі. Па-першае, перамога пад Клецкам з'яўляецца

[1] Карпов Г. Ф. История борьбы Московского государства с Польско-Литовским (1462—1508). Москва, 1867; Kolankowski L. Polska Jagiellonów: dzieje polityczne. Lwów, 1936; Kolankowski L. Problem Kryma w dziejach Jagiellońskich // Kwartalnik Historyczny. 1935. Z. 3; Papée F. Aleksander Jagiellończyk. Kraków, 1949; Koneczny F. Sprawy z Mengli-Girejem 1473—1504 // Ateneum Wileńskie. 1927. R. 4. Z. 12—13; Dundulis B. Lietuvos užsienio politika 16 a. Vilnius, 1971; Кацановіч У. Дыпламатыя Вялікага Княства Літоўскага ў 1480 — першай чвэрці XVI ст. (Адносіны з Вялікім Княствам Маскоўскім і Крымскім ханствам). Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук. Мінск, 1997.

адной з самых знакамітых ва ўсёй вайсковай гісторыі ВКЛ[2]. Клецкая бітва з'яўляецца адным з месцаў памяці (lieux de mémoire) у сённяшняй беларускай гістарыяграфіі. Тым не менш, яна дагэтуль усё яшчэ знаходзіцца ў цені іншых перамог Ягелонаў: Грунвальда, Крапіўны і інш. Па-другое, Клецкая бітва, хоць і вялася старымі спосабамі, азнаменавала важны этап ва ўдасканаленні вайсковай тактыкі і, у пэўнай ступені, ваеннай тэхнікі ВКЛ[3]. Па-трэцяе, увагу да Клецкай бітвы прыцягвае надзвычай неардынарная і супярэчлівая фігура яе галоўнага героя — князя Міхаіла Львовіча Глінскага. Надворны маршалак ВКЛ, фаварыт караля і вялікага князя Аляксандра Казіміравіча з'яўляўся, несумненна, найбольш яркай фігурай на палітычным алімпе ВКЛ пачатку стагоддзя. Пра яго хадзіла мноства чутак, нікому так не зайздросцілі, як па-еўрапейску адукаванаму князю Міхаілу. Па-чацвёртае, у свядомасці мясцовага люду бітва 1506 г. дагэтуль з'яўляецца адной з галоўных падзей гісторыі Клецка. Нарэшце, зварот да Клецкай бітвы быў у значнай ступені абумоўлены маімі асабістымі перажываннямі і ўспамінамі, якія бяруць пачатак у дзяцінстве. Ад старых людзей мне прыходзілася неаднаразова чуць пра жудасную бітву на Красным Ставе, што атрымаў сваю назву ад колеру крыві, якой напоўніліся воды ракі Лань. Цікавасць да гэтай падзеі падаграваў і той факт, што мая сям'я пражывала на вуліцы, якая калісьці насіла назву Краснаставскай (зараз Першамайская), а да самога Краснага Става можна было дайсці ад дома бацькоў за 10—15 хвілін. Пазней, у школьныя гады, калі я пачаў цікавіцца мясцовай гісторыяй, я даведаўся пра неардынарную асобу галоўнага героя бітвы — князя Міхаіла Глінскага. Мая цікавасць да Клецкай бітвы 1506 г. узмацнілася ва ўніверсітэцкія гады, калі я рыхтаваў дыпломную работу па гісторыі Клецка. Можна сказаць, што праз цікавасць да гісторыі ўласнага населенага пункта я атрымаў магутны стымул да вывучэння асобы князя Міхаіла Глінскага і бітвы пад Клецкам 1506 г. Нават на выбар мной тэмы дысертацыі, якая была прысвечана дыпламатычным адносінам ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай і Крымскім ханствам у 1480 — першай чвэрці XVI ст., можна глядзець праз прызму доўгатэрміновай цікавасці да бітвы пад Клецкам і асобы яе галоўнага героя.

[2] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami Aleksandra Jagiellończyka. Poznań, 1995. S. 207.

[3] Herbst S. Kleck 1506 // Herbst S. Potrzeba historii, czyli o polskim stylu życia: wybór pism. T. 2. Warszawa, 1978. S. 230.

Па сутнасці, у кнізе два галоўныя героі: з аднаго боку — сама Клецкая бітва, а з другога — яе трыумфатар, князь Міхаіл Львовіч Глінскі. За час, які прайшоў з моманту бітвы, яны амаль з'ядналіся: калі гаворыцца пра Клецкую бітву 1506 г., згадваецца ў першую чаргу князь Міхаіл Глінскі; калі аповед ідзе пра Міхаіла Глінскага, у памяці ўзнікае вобраз бітвы. Дзеля таго, каб зразумець, чаму і як адбылося гэтае зліццё, неабходна было пільна зірнуць на тыя разнастайныя з'явы і падзеі, што папярэднічалі бітве. Мне прыйшлося звярнуцца да таго недалёкага мінулага (з пункту гледжання людзей пачатку XVI ст.), памяць пра якое яшчэ захоўвала пакаленне Клецкай бітвы 1506 г., каб высветліць, збег якіх знешнепалітычных абставінаў і акалічнасцей прывёў да гэтай бітвы. Гэта мінулае ахоплівала 40—50 гадоў і сваім пачаткам сягала 60—70-х гг. XV ст. — таго часу, калі знешнепалітычнае становішча ВКЛ ва Усходняй Еўропе пачало істотна пагаршацца, калі перад Ягелонамі паўсталі новыя выклікі ў выглядзе ваенна-палітычнага хаўрусу Маскоўскай дзяржавы і Крымскага ханства. Аднак чым больш мяне захоплівала даследаванне клецкіх падзей, тым больш мне хацелася яшчэ далей углыбіцца ў нетры гісторыі. Так паступова я дайшоў да крайняй мяжы, да якой распаўсюджвалася памяць людзей пачатку XVI ст. На маю думку, гэтую мяжу складалі падзеі 80—90-х гг. XIV ст. У сваёй працы я паспрабаваў паказаць, што перадумовы Клецкай бітвы 1506 г. трэба шукаць у грандыёзных палітычных канфліктах і войнах канца XIV ст., якія пакінулі глыбокі след у гістарычнай памяці і свядомасці наступных пакаленняў насельніцтва Усходняй Еўропы.

Разважаючы пра асобу і характар князя Міхаіла Глінскага, мне прыйшлося таксама закрануць праблему індывідуальнасці ў ВКЛ у XV—XVI стст. Нягледзячы на тое, што тагачасны чалавек быў цалкам паглынуты грамадою, якая вызначала яго тоеснасць і маральнае аблічча, вытокі індывідуальнасці ў Літве і на Русі неабходна шукаць менавіта ў гэтай эпосе. Прадстаўнікі вышэйшага духавенства, частка арыстакратыі і гарадской гандлёвай вярхушкі ўжо тады ўсведамлялі сваё паходжанне, сваю сацыяльную ролю і месца ў жыцці. Безумоўна, да ліку гэтых асоб адносіўся і князь Міхаіл Глінскі.

У сувязі з праблемай індывідуальнасці і каб адказаць на пытанне, чаму менавіта Глінскаму было суджана стаць галоўным героем бітвы 1506 г., я паспрабаваў стварыць умоўны гісторыка-псіхалагічны партрэт князя. Прыйшлося ўважліва і дэталёва прааналізаваць яго біяграфію, звярнуць асаблівую ўвагу на характар і выхаванне, даследаваць станоўчыя і адмоўныя якасці яго асобы,

прасачыць асноўныя этапы палітычнай кар'еры. У выніку я прыйшоў да высновы, што ў складаных абставінах лета 1506 г. сярод тагачаснага кіраўніцтва дзяржавы толькі Міхаіл Глінскі меў неабходную сілу волі, ваенна-палітычны талент і ўпэўненасць ва ўласных сілах, каб смела выступіць насустрач небяспецы. І, самае галоўнае, у гэтай справе яму не былі патрэбныя памочнікі і дарадцы, а сам ён не жадаў знаходзіцца ў падпарадкаванні якога-небудзь уплывовага велікакняскага вяльможы.

Кніга складаецца з чатырох раздзелаў. У першым разгледжана ваенна-палітычнае становішча ва Усходняй Еўропе на мяжы XV—XVI стст. Другі ўяўляе сабой палітычную біяграфію Міхаіла Глінскага да 1506—1508 гг. Апісанне жыцця Глінскага падаецца на шырокім фоне падзей ваенна-палітычнай і культурнай гісторыі Еўропы. Не абмінуў я і найважнейшыя падзеі таго часу ў ВКЛ, найбольш яркія палітычныя постаці дзяржавы Ягелонаў мяжы стагоддзяў. У даследаванні я паспрабаваў яшчэ раз узняць пытанне пра паходжанне роду Глінскіх, асвятліць пачатковы этап іх службы вялікім князям літоўскім. Таксама зроблена спроба рэканструяваць дзіцячыя і юнацкія гады героя, што засталіся па-за ўвагай яго біёграфаў. Мяне цікавіла сям'я і тое асяроддзе, у якім рос і выхоўваўся Міхаіл. Адсюль такая ўвага да персон яго бацькі — князя Льва Барысавіча, а таксама найбліжэйшых сваякоў, у першую чаргу, Храптовічаў.

У трэцім раздзеле аналізуецца гісторыя стварэння памяці пра Клецкую бітву 1506 г. Мяне цікавіла, як складваўся вобраз бітвы, а таксама яе галоўнага героя ў свядомасці сучаснікаў і нашчадкаў, якія этапы ў сваім станаўленні прайшоў, як трансфармаваўся на працягу стагоддзяў. Нарэшце, я паспрабаваў адказаць на пытанне, з якога часу бітва пачала замацоўвацца ў свядомасці жыхароў Клецка як галоўная падзея гісторыі горада. У выніку, пасля правядзення даследавання ў мяне былі ўсе падставы сцвярджаць, што вобраз бітвы пад Клецкам з'яўляецца гістарыяграфічнай канструкцыяй, на змест якой істотна паўплывалі палітычныя тэндэнцыі наступных часоў, інтарэсы асноўных гульцоў на палітычнай сцэне ВКЛ і Кароны.

У чацвёртым і заключным раздзеле я паспрабаваў рэканструяваць ход і характар бітвы. Дзеля гэтага мне прыйшлося даследаваць розныя аспекты падзеі: прыродны ландшафт Клеччыны ў Познім Сярэднявеччы, месца і час бітвы, тактыку і стратэгію дзеянняў праціўнікаў, спосаб і характар іх узбраення, маршруты войскаў. Гэта даследаванне можна было б назваць антрапалогіяй

бітвы, бо яно праведзена з выкарыстаннем метаду гістарычнай антрапалогіі. Даследаванне дазволіла зрабіць выснову, што ход бітвы істотна адрозніваўся ад таго вобраза, які замацаваўся ў пазнейшай гістарыяграфіі і свядомасці нашчадкаў.

У працы мне прыйшлося цытаваць мноства крыніц. Хочацца, каб праз гэтыя тэксты чытач пачуў галасы ўдзельнікаў і сучаснікаў бітвы, а таксама найбольш адукаваных прадстаўнікоў наступных пакаленняў, дзякуючы якім яе вобраз не згас, а набыў новыя фарбы. Гэтыя галасы гучалі на розных мовах: беларускай, латыні, польскай, нямецкай і інш. На розных этапах працы мне прыходзілася звяртацца да тых жа тэкстаў, неаднаразова паўтараць іх фрагменты, вяртацца да папярэдніх тэм. Гэта частка метаду майго даследавання, якая дазваляе лепей зразумець такую неардынарную падзею, як бітва пад Клецкам 1506 г.



**Урачысты ўезд князёўны Алены Іванаўны ў Вільню ў 1495 г. Выява XIX ст.**



**Каранацыя вялікага князя Аляксандра Ягелончыка ў Кракаве. 1501 год.**



**Вялікі князь літоўскі і кароль польскі Аляксандр Ягелончык і польскі канцлер Ян Ласкі. Статут Яна Ласкага 1506 года.**



Сумесны сойм Польшчы і ВКЛ. Статут каронцага канцлера Яна Ласкага 1506 года.



Жыгімонт Стары.
Малюнак Ганса
фон Кульмбаха.



**Вялікі князь маскоўскі Васіль III (1505—1533). Гравюра XVI ст.**



**Герцаг Фрыдрых Саксонскі.**




**Конны партрэт імператара Максіміліяна I Габсбурга аўтарства Ганса Бургкмайра.**

# 1. Ваенна-палітычнае становішча ва Усходняй Еўропе на мяжы XV–XVI стст.

## 1.1. Ад міру да вайны

### 1.1.1. Смерць вялікага князя Казіміра Ягайлавіча і канец мірнай эпохі ў ВКЛ

Сямітысячны год ад Стварэння свету, з якім звязвалася ідэя яго канца[1] (заканчваўся ў 1492 г. ад Раства Хрыстова), апраўдваў для кіраўніцтва і насельніцтва ВКЛ самыя змрочныя прадчуванні і трывогі. 7 чэрвеня 1492 г. памёр польскі кароль і вялікі князь літоўскі Казімір Ягайлавіч, які кіраваў Літвой амаль 52 гады, а Польшчай — 47 гадоў. Пасля яго смерці перастала існаваць персанальная унія ВКЛ і Кароны. Краіны выбралі сабе асобных манархаў: Польшча — старэйшага сына Казіміра каралевіча Яна Ольбрахта, Літва — трэцяга сына Казіміра каралевіча Аляксандра.

Са смерцю Казіміра Ягайлавіча скончылася цэлая эпоха ў жыцці ВКЛ. Ніколі, як дагэтуль, так і пасля, дзяржава не жыла ва ўмовах такога працяглага мірнага перыяду. Ліквідацыя крыжацкай пагрозы ў другім дзесяцігоддзі XV ст. і ўнутраная кансалідацыя пасля грамадзянскай вайны 30-х гг. XV ст. стварылі спрыяльныя ўмовы для мірнай працы. Упершыню з сярэдзіны XIII ст. ВКЛ атрымала ўнікальную магчымасць засяродзіцца на ўнутраных праблемах. Папярэднія два стагоддзі былі часам змагання са знешнімі ворагамі, барацьбы за прызнанне ў якасці самастойнай дзяржавы. Амаль усе сілы ішлі на вайну. Усё жыццё ў Літве і на Русі, якія складалі адзіны дзяржаўны арганізм, было падпарадкавана вайне. Дзяржава нагадвала ўмацаваны ваенны лагер. Гэта была тыповае «societé de la guerre» — ваеннае грамадства, грамадства, якое жыло ў ваенны час і па законах ваеннага часу.

Эпоха праўлення Казіміра была часам глыбокай трансфармацыі ўнутранага жыцця дзяржавы. Гэты працэс быў у значнай ступені абумоўлены уніяй з Польскім каралеўствам. Не было такой сферы

[1] Юрганов А. Л. Категории русской средневековой культуры. Москва, 1998. С. 306—309.

жыцця, якую б не закранулі пераўтварэнні. У авангардзе змен ішла палітычная эліта дзяржавы — баяры і князі, якія ў перыяд праўлення Казіміра Ягайлавіча пачалі кансалідавацца ў адзінае саслоўе. У пачатку XVI ст. гэты працэс быў ужо ў асноўным завершаны. Новае саслоўе на польскі і чэшскі ўзоры стала называцца шляхтай. Статут ВКЛ 1529 г. толькі юрыдычна замацаваў складванне шляхецкага саслоўя.

Складванне шляхецкага саслоўя ішло поруч з пашырэннем шляхецкіх правоў і прывілеяў. Значную ролю ў гэтым працэсе адыграў гарадзельскі прывілей (1413 г.), у адпаведнасці з якім польскія рыцарскія роды прынялі літоўскія баярскія роды ў гербавае брацтва[2]. Літоўскія баяры атрымалі саслоўныя правы польскіх феадалаў. У сярэдзіне XV ст. у ВКЛ, як і ў некаторых іншых еўрапейскіх краінах, распачаўся кадыфікацыйны рух, які стаў магчымым дзякуючы наяўнасці высокай пісьмовай культуры ў дзяржаве. Яшчэ ў 1447 г. Казімір Ягайлавіч, які толькі што быў абраны на польскі трон, надаў баярам і князям ВКЛ агульназемскі прывілей, што гарантаваў ім асабістую і маёмасную недатыкальнасць, права вотчыннага суда[3]. Велікакняскі судзебнік 1468 г. сістэматызаваў тагачасныя прававыя і працэсуальныя нормы[4].

Адначасова з пашырэннем шляхецкіх саслоўных правоў і прывілеяў адбываўся рост шляхецкай зямельнай уласнасці. З сярэдзіны XV ст. увайшла ў практыку масавая раздача зямель з велікакняскага фонду прадстаўнікам феадальнага саслоўя[5]. У гэты час пачалі паўставаць першыя буйныя латыфундыі (Манівіды, Кезгайлы, Радзівілы і інш.).

Сацыяльна-эканамічныя змены стымулявалі значныя культурныя змены. Паколькі ў ВКЛ любое зямельнае наданне ці маёмасная здзелка патрабавалі адпаведнага гаспадарскага акта, то актывізацыя зямельна-маёмасных адносін у дзяржаве не магла не стымуляваць рост пісьмовай культуры. Менавіта ў часы Казіміра Ягайлавіча, пры канцлеру Міхале Кезгайлавічу, паўстаў велікакняскі архіў — Метрыка ВКЛ. Усе дакументы, што выходзілі з велікакняскай канцылярыі, а таксама найбольш важныя лісты і граматы, што

[2] Бычкова М. Е. Русское государство и Великое княжество Литовское с конца XV в. до 1569 г. Москва, 1996. С. 65.

[3] Старостина И. П. Судебник Казимира 1468 г. // Древнейшие государства на территории СССР: Материалы и исследования, 1988—1989 гг. Москва, 1991. С. 237.

[4] Тамсама. С. 287.

[5] Бычкова М. Е. Русское государство и Великое княжество Литовское… С. 55—61.

прыходзілі да гаспадара, уносіліся ў выглядзе копій у асобныя кнігі, што складалі Архіў канцылярыі, або Метрыку[6].

За час праўлення Казіміра Ягайлавіча ў Літве істотна ўзрасла роля шляхецкага саслоўя ў палітычных справах. З шэрагаў шляхты вылучылася адметная грамадская група — паны-рада, значэнне і кампетэнцыя якой істотна ўзраслі ў другой палове XV ст.[7]. З-за частай адсутнасці гаспадара ў дзяржаве паны-рада вымушаны былі выконваць значныя ўладныя паўнамоцтвы. У канцы жыцця Казіміра Ягайлавіча рада ператварылася ўжо з дарадчага органа ў самастойны дзяржаўна-палітычны інстытут, які сур'ёзна абмяжоўваў уладу вялікага князя.

Згодна з агульназемскім прывілеем 1492 г. наступніка Казіміра — яго сына Аляксандра, паны-рада юрыдычна замацавалі за сабой права супрацоўнічаць і раіцца з гаспадаром пры наданні ўрадаў, намесніцтваў і г. д. Вялікі князь абавязваўся не адмяняць законы, пастановы і судовыя рашэнні, прынятыя сумесна з радай, не адмяняць свае папярэднія рашэнні, не адбіраць свае колішнія наданні[8].

У склад паноў-рады ўваходзілі каталіцкія біскупы (віленскі, медніцкі, луцкі), ваяводы (віленскі, троцкі, віцебскі), жмудскі староста, кіеўскі, луцкі староста і маршалак зямлі Валынскай, новагародскі, полацкі, смаленскі), кашталяны (віленскі і троцкі), гетман, канцлер, земскі маршалак, дворскія маршалкі, падскарбі, а таксама дворскія ўраднікі (канюшы, крайчы, кухмістр, лоўчы, мечнік, падкаморы, надворны падскарбі, падстолі, пісар, падчашы, стольнік, земскі харужы, надворны харужы)[9]. Усе яны ўваходзілі ў склад г. зв. палітычнага народа, пад якім разумелася кола асоб, якое брала актыўны ўдзел у грамадскім і палітычным жыцці дзяржавы[10]. У канцы XV ст. склад паноў-рады стабілізаваўся. Рашаючая роля ў дзейнасці рады належала віленскаму біскупу, віленскаму і троцкаму ваяводам, віленскаму і троцкаму кашталянам, а таксама жмудскаму старосце. Другое па значэнні месца ў радзе займалі цэнтральныя ўраднікі: земскі (вялікі) маршалак і канцлер. Паколькі ў часы Казіміра Ягайлавіча ўсталяваўся звычай

[6] Бережков Н. Г. Литовская Метрика как исторический источник. Ч. 1: О первоначальном составе книг Литовской Метрики по 1522 год. Москва—Ленинград, 1946. С. 5. Пра канцылярыю ВКЛ гл.: Груша А. Канцылярыя Вялікага Княства Літоўскага 40-х гадоў XV — першай паловы XVI ст. Мінск, 2006. 215 с.

[7] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 76—77.

[8] Zbiór pamiętników do dziejów polskich / W. S. Broel-Plater. T. 1. Warszawa, 1858. S. 24.

[9] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 78.

[10] Suchocki J. Formowanie się i skład narodu politycznego w Wielkim Księstwie Litewskim późnego średniowiecza // Zapiski Historyczne. 1983. T. 48. Z. 1—2. S. 31—78.

сумяшчаць дзве або некалькі пасад у адных руках, то ў выніку склад пярэдняй рады, зазвычай, не перавышаў 5—6 асоб[11].

За больш чым паўстагоддзя панавання Казіміра Ягайлавіча дзяржава змянілася да непазнавальнасці. Дзякуючы мірнаму суіснаванню з суседзямі ў ВКЛ адбываўся рост насельніцтва, павялічвалася колькасць гарадоў і населеных пунктаў, будаваліся новыя дарогі і масты, асвойваліся новыя землі. Квітнеў гандаль, рос дабрабыт народа, пачалі складвацца цэлыя купецкія дынастыі, да ліку якіх адносіўся і род знакамітага беларускага першадрукара Францыска Скарыны. Выраслі будучыя спонсары і мецэнаты, людзі кшталту віленскага мешчаніна Багдана Онкавіча Грыцэвіча. У другой палове XV ст. быў закладзены той салідны матэрыяльны падмурак, без якога не паўстала б рэнесансная культура ВКЛ XVI ст.

Істотна змяніліся знешнія ўмовы існавання ВКЛ. Адбылася стабілізацыя знешнепалітычнага становішча дзяржавы. Спакой з боку Маскоўскай дзяржавы гарантаваў трактат 1449 г. Татарскія ханы яшчэ з часоў Вітаўта з'яўляліся марыянеткамі ў руках улад ВКЛ. Здавалася, ніхто і ніштo не можа парушыць гегемонію ВКЛ у рэгіёне. Вырашыўшы праблемы на Усходзе, Казімір Ягайлавіч мог праводзіць больш актыўную палітыку ў Цэнтральнай Еўропе, дзе ён дазволіў уцягнуць сябе спачатку ў працяглы палітычны і ваенны канфлікт з Тэўтонскім ордэнам (1454—1466 гг.), а пасля прыступіць да ажыццяўлення ўласных дынастычных планаў у Чэхіі і Венгрыі.

З усталяваннем міру і спакою адбыўся істотны рост знешніх гандлёвых сувязяў. Пашырыліся культурныя сувязі з замежжам, у першую чаргу з Захадам. Маладыя людзі са шляхецкіх сем'яў атрымалі магчымасць выязджаць за мяжу дзеля навучання ў школах і ўніверсітэтах, удасканалення рыцарскага майстэрства. У выніку гэтых кантактаў значна пашырыўся кругагляд грамадства. Многія прадстаўнікі шляхты і мяшчанства нечакана для сябе адкрылі новы вонкавы свет, які знаходзіўся за межамі іх грамадства і так адрозніваўся ад яго. Працэс адкрыцця знешняга свету найбольш адукаванымі прадстаўнікамі грамадства ВКЛ у XV ст. можна параўнаць з адкрыццём Амерыкі Калумбам, якое адбылося ў тым самым 1492 г., калі памёр Казімір Ягайлавіч. Услед за знаёмствам з нормамі і каштоўнасцямі еўрапейскай культуры распачаўся працэс іх асэнсавання, успрыняцця і засваення. Так быў закладзены падмурак росквіту айчыннай культуры ў наступным XVI ст.

[11] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 79.

У другой палове XV ст. сур'ёзна змяніўся менталітэт грамадства ВКЛ. За гады праўлення Казіміра Ягайлавіча вырасла, па меншай меры, два пакаленні, для якіх мір з'яўляўся звыклай з'явай. Гэтыя людзі знаходзілі больш радасці ў мірнай дзейнасці, чым у ваенных паходах і практыкаваннях. Шляхціц з воіна ператварыўся ў землеўласніка, гаспадара. Подзвігі на ніве культуры і асветы ўспрымаліся больш вартымі, чым подзвігі на полі бою. Усё больш маладых людзей са шляхецкіх сем'яў прысвячала сябе навукам і адукацыі. Дзеля справядлівасці адзначым, што не бракавала ў тагачасным грамадстве ВКЛ тых, хто з задавальненнем шукаў ваенных прыгод і ратнай славы. Сярод іх быў будучы трыумфатар Клецкай бітвы князь Міхаіл Львовіч Глінскі, які ў маладым узросце адправіўся ў Германію дзеля ўдасканалення ваеннага майстэрства. Але, як падаецца, у канцы праўлення Казіміра Ягайлавіча мірныя настроі ахоплівалі большую частку грамадства ВКЛ.

Сама тагачасная рэчаіснасць прывучала людзей да думкі, што мірнае жыццё будзе калі не вечным, то працяглым. Пасля двух стагоддзяў вайны грамадства ВКЛ атрымлівала дурманячую асалоду мірнай перадышкі. Ніштo, здаецца, не магло зрушыць яго з гэтай пазіцыі. Нават калі партнёр і саюзнік Польшча прасіла аказаць пасільную дапамогу ў змаганні з Тэўтонскім ордэнам (Трынаццацігадовая вайна 1454—1466 гг.), паны-рада ВКЛ абмежаваліся пасылкай усяго толькі 5-тысячнага корпуса на чале з віцебскім намеснікам Аляксандрам Хадкевічам. На настроі шляхты ВКЛ не паўплывала нават рэальная пагроза з боку Маскоўскай дзяржавы, што анексіравала Вялікі Ноўгарад, які тагачаснае грамадства Літвы і Русі разглядала як сваю ўласнасць[12].

### 1.1.2. Геапалітычныя зрухі ва Усходняй Еўропе і ўзвышэнне Масквы

У апошнія два дзесяцігоддзі праўлення Казіміра Ягайлавіча баланс сіл ва Усходняй Еўропе пачаў пастулова мяняцца. Новы вялікі князь маскоўскі Іван III (1462—1505), карыстаючыся пасіўнасцю Казіміра Ягайлавіча, перайшоў да пашырэння межаў уласнай дзяржавы. Ён далучыў да Маскоўскага княства Вялікі Ноўгарад (1471—1478 гг.) і Цвярское княства (1485 г.), што знаходзіліся ў сферы ўплыву ВКЛ. Тады ж Іван III упершыню ў практыцы адносін з ВКЛ

[12] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян / Пер. В. И. Матузовой; Отв. ред. А. Л. Хорошкевич. Москва, 1994. С. 79.

высунуў прэтэнзіі на Полацк, Смаленск, Віцебск і некаторыя іншыя рускія гарады[13].

Услед за інкарпарацыяй Вялікага Ноўгарада і Цверы падданыя вялікага князя маскоўскага перайшлі да нападаў на памежныя землі ВКЛ. Пачалася г. зв. памежная вайна, што зводзілася да змагання паміж сабой памежных князёў з абодвух бакоў. Казімір Ягайлавіч, які ў пачатку 1486 г. вярнуўся ў ВКЛ, спрабаваў дыпламатычнымі сродкамі ўрэгуляваць спрэчкі паміж падданымі абедзвюх дзяржаў. У 1486—1492 гг. паміж Іванам III і Казімірам Ягайлавічам адбываліся інтэнсіўныя дыпламатычныя перамовы. Маскоўскі бок абраў тактыку іх зацягвання; на кожную скаргу прадстаўнікоў ВКЛ баяры Івана III адказвалі скаргай, на кожны аргумент знаходзілі свой контраргумент. Тым часам, маскоўскія падданыя працягвалі атакаваць усходнія межы ВКЛ, а маскоўскае кіраўніцтва высоўвала ўсё новыя тэрытарыяльныя прэтэнзіі. Увесну 1492 г. стала відавочна, што перамовы канчаткова зайшлі ў тупік. Аднак да гэтага маскоўскі ўрад здолеў узяць пад свой кантроль значную тэрыторыю ў вярхоўях Акі (Варатынскі і Белеўскі ўдзелы, Адоеў, Перамышль, Казельск, Сярэнск і некаторыя іншыя гарады)[14].

### 1.1.3. Пагроза з поўдня

Істотныя змены адбыліся таксама на паўднёвых межах ВКЛ. У 1466 г. памёр крымскі хан Хаджы-Гірэй (1443, 1449—1466 гг.), які доўгі час праводзіў палітыку добрасуседства з Казімірам Ягайлавічам. Пасля смерці Хаджы-Гірэя ў Крыме пачаліся міжусобныя канфлікты, у выніку якіх да ўлады прыйшоў адзін з сыноў Хаджы-Гірэя — Менглі-Гірэй. Унутрыпалітычная барацьба ў Крыме суправаджалася актыўным умяшаннем у крымскія справы замежных дзяржаў. У 1475 г. туркі-асманы рашыліся на прамую інтэрвенцыю ў Крым[15]. Асманскі марскі дэсант акупіраваў Кафу (Феадосію). Крымскі хан Менглі-Гірэй трапіў у васальную залежнасць ад турэцкага султана. Змяніўся характар адносін крымскага хана з ягелонскімі дзяржавамі. Менглі-Гірэй цалкам адышоў ад палітыкі добрасуседства з ВКЛ і Польшчай, якую праводзіў ягоны бацька. У 1480 г. паміж Масквой

---

[13] Codex epistolaris saeculi decimi quinti. T. 3: 1392—1501 / Wyd. A. Lewicki. Kraków, 1894. S. 280.

[14] Кром М. Меж Русью и Литвой: Западнорусские земли в системе русско-литовских отношений конца XV — первой трети XVI в. Москва, 1995. С. 82—83.

[15] Возгрин В. Е. Исторические судьбы крымских татар. Москва, 1992. С. 149—150;. Fischer A. The Crimean Tatars. Stanford, 1978. P. 11—14.

і Крымам быў заключаны двухбаковы ваенна-палітычны альянс, скіраваны супраць ягелонскіх дзяржаў і Залатой (Заволжскай) Арды[16]. Заключаючы гэтае пагадненне, і Іван III, і Менглі-Гірэй праследавалі свае ўласныя інтарэсы. Маскоўскі вялікі князь імкнуўся стварыць супольны фронт барацьбы супраць свайго галоўнага праціўніка Казіміра Ягайлавіча. Крымскі фактар мусіў адыграць немалаважную ролю ў будучым рашаючым супрацьстаянні Масквы з Заволжскай Ардой, уладар якой усё яшчэ фармальна з'яўлялася сюзерэнам вялікіх князёў маскоўскіх. У сваю чаргу, крымскі хан (таксама пакуль што васал Залатой (Заволжскай) Арды)[17] хацеў з дапамогай маскоўскага ўладара канчаткова паслабіць пазіцыі свайго праціўніка, далучыць да свайго юрта яго ўладанні. Пагадненне з Масквой дазваляла крымскім ханам рабіць набегі на багатыя і ўрадлівыя землі ВКЛ і Польшчы. Маскоўска-крымскі хаўрус быў выгадны таксама туркам-асманам, якія спадзяваліся пры дапамозе Крыма стрымаць Казіміра Ягайлавіча ад далучэння да антыасманскай кааліцыі еўрапейскіх краін. Гэта пагадненне мусіла істотна паўплываць на характар міжнародных дачыненняў ва Усходняй Еўропе.

Вынікі заключэння маскоўска-крымскага хаўрусу кіраўніцтва ягелонскіх дзяржаў адчула вельмі хутка. Восенню 1480 г., калі заволжскі хан Ахмат стаяў на межах Маскоўскай дзяржавы, дарэмна чакаючы Казіміра Ягайлавіча, атрады Менглі-Гірэя спустошылі Падолле[18]. 1 верасня 1482 г. была спалена былая сталіца Русі — Кіеў[19]. Асманы таксама актывізаваліся ў паўночным Прычарнамор'і. У 1484 г. яны захапілі стратэгічна важныя чарнаморскія парты Кілію і Белгарад[20]. Услед за гэтым крымскія татары авалодалі чарнаморскім узбярэжжам паміж Днястром і Дняпром.

У такіх умовах Казіміру Ягайлавічу не заставалася нічога іншага, як аднавіць хаўрус з ханам Вялікай Арды. Адначасова ён, каб выйграць час,

---

[16] СИРИО. Т. 41. С. 1—12; Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego za Jagiellonów. T. I: 1377—1499. Warszawa, 1930. S. 324—328.

[17] У рэальнасці вялікі князь маскоўскі заставаўся даннікам заволжскага хана да 1502 г., калі дзяржава апошняга была зліквідаваная крымскім ханам. Гл.: Ostrowski D. Muscovy and the Mongols. Cross-Cultural Influences on the Steppe Frontier, 1304—1589. Cambridge, 1998. P. 165—166.

[18] Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. International Diplomacy on the European Periphery (15th—18th century). A Study of Peace Treaties Followed by Annotated Documents. Brill, 2011. P. 23.

[19] Ostrowski D. Muscovy and the Mongols. P. 170; Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. P. 24.

[20] Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. P. 25.

веў перамовы з Менглі-Гірэем. У 1484 г. паміж каралём і заволжскімі ханамі Муртазой і Саід-Ахматам было дасягнута пагадненне аб сумеснай барацьбе супраць Масквы і Крыма. Ужо ў наступным годзе заволжскія татары распачалі атакі на валоданні крымскага хана. Унутрытатарскія міжусобіцы ўспыхнулі з новай сілай. Толькі з дапамогай турэцкага султана Баязіда II, які прыслаў свайму васалу на дапамогу тысячу янычараў, крымскаму хану Менглі-Гірэю ўдалося разбіць ардынцаў[21].

Разгром заволжскіх татараў адкрыў крымцам прамую дарогу на землі Казіміра Ягайлавіча. Аднак Менглі-Гірэй, знясілены працяглым змаганнем з заволжскімі ханамі, быў не ў стане арганізаваць буйную выправу. Таму на працягу 1491—1492 гг. паміж Вільняй і Крымам ішлі перамовы, пад прыкрыццём якіх кожны з бакоў рашаў уласныя задачы. Казімір Ягайлавіч імкнуўся выйграць час, каб знайсці новыя сродкі нейтралізацыі Крыма; Менглі-Гірэй рыхтаваў новую выправу на землі сваіх паўночных суседзяў[22].

Не выклікае сумнення, што ў апошнія дзесяцігоддзі істотна ўзрасла роля татарскага фактару для дзяржавы Ягайлавічаў. Улады Кароны і ВКЛ мусілі лічыцца з напорам татарскіх ордаў на паўднёвыя і паўднёва-ўсходнія межы. Гэты націск у значнай ступені быў выкліканы глабальнымі прыродна-кліматычнымі зменамі, якія сталі адчувальнымі ў сярэдзіне XV ст. На змену кліматычнаму оптымуму, які доўжыўся ў Еўропе прыблізна з 900 па 1300 гг., пасля пераходнага перыяду прыйшоў малы ледавіковы перыяд з рэзкімі ваганнямі клімату. 60-я гг. XV ст. характарызуюцца надзвычай халоднымі зімамі і вёснамі, дажджлівым надвор'ем[23]. Пачатак наступнага дзесяцігоддзя знамянаваўся частымі засухамі і суправаджаўся неўраджаем. У другой палове 70-х гг. вярнуліся ранні маразы і халодныя зімы. Так, у кастрычніку 1480 г., калі хан Вялікай Арды Ахмат ішоў на Маскву, замерзла рака Угра. У той год вялікія маразы стаялі да самай вясны. Можна меркаваць, што 80-я гг. XV ст. характарызаваліся халоднымі і снежнымі зімамі. Нярэдкай з'явай быў голад. Так, у 1485 г. «глад бысть велик в Орде»[24]. Халодныя і снежныя зімы суправаджалі апошняе дзесяці-

---

[21] Памятники дипломатических сношений Московского государства с Крымскою и Ногайскою Ордами и Турцией. Т. 1: 1474—1505 / Ред. Г. Ф. Карпов // Сборник Императорского Русского исторического общества (далей — СИРИО). Т. 41. Санкт-Петербург, 1884. С. 118; Базилевич К. В. Внешняя политика Русского централизованного государства. Вторая половина XV века. Москва, 1952. С. 208—218.

[22] Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. P. 25.

[23] Борисенков Е., Пасецкий В. Тысячелетняя летопись необычайных явлений природы. Москва, 1988. С. 185—186.

[24] Тамсама. С. 300—301.

годдзе XV ст. Выключэннем была, хіба што, надзвычай цёплая зіма 1492—1493 гг. Сталі частымі эпідэміі і хваробы. У хроніках упершыню пад 1498 г. згадваецца «французская болесть», г. зн. сіфіліс. Першыя гады наступнага XVI ст. пацвердзілі існуючую тэндэнцыю. Халодныя і снежныя зімы чаргаваліся з дажджлівым або засушлівым летам. Кліматычныя катаклізмы суправаджаліся голадам і эпідэміямі.

Прыродныя анамаліі былі больш адчувальнымі ў стэпавай паласе, у зоне паўкачавой гаспадаркі татараў. Кліматычныя змены ў Паволжы, якія выражаліся ў змяншэнні колькасці ападкаў і засухах, прывялі да дэградацыі ворных земляў. Услед за экалагічнай катастрофай прыйшло разбурэнне звыклага гаспадарчага ўкладу, якое суправаджалася эпідэміямі і голадам[25].

Усё гэта прымусіла шматлікае насельніцтва Заволжскай Арды шукаць паратунку ў суседніх землях. Заволжскія татары пачалі масава перасяляцца ў Крым і на паўднёва-ўсходнія межы Маскоўскай дзяржавы. Некаторыя групы заволжскіх татараў шукалі паратунку ў ВКЛ[26]. Тыя, хто застаўся, нярэдка рабілі набегі на землі суседзяў. Улады Заволжскай Арды пераўтварыліся ва ўтрыманца Ягайлавічаў. Апошні масавы сыход здарыўся зімой 1502—1503 гг., калі Шах-Ахмат быў разбіты Менглі-Гірэем.

Несумненна, найбольш масавай была эміграцыя заволжскіх татараў у Крым. Аднак эканоміка паўвострава не была ў стане пракарміць такую колькасць людзей. Заставаўся адзіны выхад: набегі на землі паўночных суседзяў — Кароны і ВКЛ. Магчымасць лёгкай нажывы за кошт суседзяў стрымлівала развіццё крымскай эканомікі і ўрэшце прывяла да такой ганебнай з'явы, як гандаль рабамі. Пачатак гэтага працэсу храналагічна супаў з асманскай інтэрвенцыяй і прыходам да ўлады ў Крыме новага хана Менглі-Гірэя. З сярэдзіны 70-х XV ст. пачаліся татарскія набегі на землі Русі і Літвы.

### 1.1.4. Новы выклік: Крымскае ханства

З'яўленне Крымскага ханства на палітычнай карце Еўропы было вынікам распаду Залатой Арды, што паўстала пасля падзелу імперыі

[25] Артюхин Ю. Природные катаклизмы как одна из причин «Великой замятни» в Золотой Орде и возникновения Азака // Боспорские исследования. Вып. XXVI. Симферополь—Керчь, 2013. С. 314—334.

[26] У 1487—1491 гг. аддзелы заволжскіх татараў, відавочна ратуючыся ад голаду, вымушаныя былі здзейсніць тры набегі на землі ВКЛ. Гл.: Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. P. 25.

Чынгізхана ў 1227 г.[27]. Залатая Арда разглядалася як улус (удзел) сына Чынгізхана Джучы, а насамрэч яго ўнука хана Батыя (Бату-хана). Дзяржава ахоплівала землі Сярэдняй Азіі, усходнееўрапейскія стэпы (Кіпчак), а таксама залежныя ад яе рускія княствы (Паўночна-Усходняя Русь з Масквой, Уладзімірам, Цвер'ю, Разанню і інш.). Крымскі юрт (улус), які паўстаў у сярэдзіне 30-х гг. XIII ст., быў на працягу амаль двух стагоддзяў часткай залатаардынскай дзяржавы[28]. Юрт кіраваўся залатаардынскім намеснікам з мясцовых ханаў ардынскага паходжання, які тытулаваўся ханам.

Ператварэнню былога залатаардынскага юрта ў самастойнае ханства паспрыяла міжнародная палітычная кан'юнктура. Унутранае аслабленне Залатой Арды пасля смерці ў 1357 г. хана Джанібека суправаджалася крызісам і паступовым аддзяленнем ад цэнтра дзяржавы яе ўскраін. Гэтым скарысталіся суседзі Арды, у першую чаргу Літва, якая ў той час перажывала перыяд тэрытарыяльнай экспансіі, у выніку якой пад уладай літоўскіх уладароў апынуліся многія залатаардынскія землі: Кіеўскае, Чарнігаўскае, Ноўгарад-Северскае, Пераяслаўскае княствы, а таксама Падолле[29]. Дзяржава літоўскіх князёў стала непасрэдным суседам Крымскага юрта і атрымала магчымасць уплываць на яго ўнутраныя справы. У 1398 г. Вітаўт зрабіў ваенную выправу на Крым і прывёў шмат палонных, якія былі паселены ў цэнтральнай частцы яго дзяржавы[30]. Пасля паразы ад залатаардынскага хана Цімур-Кутлука на Ворскле ў 1399 г. Вітаўт на некаторы час аслабіў актыўнасць у татарскіх улусах. Аднак пасля перамогі пад Грунвальдам ён ізноў актывізаваў сваю татарскую палітыку[31].

У 1428 г. Вітаўту пры дапамозе крымскага знатнага роду Шырынаў удалося пасадзіць на крымскі трон свайго стаўленіка — хана Хаджы-Гірэя (Даўлет-Берды), які правёў свае маладыя гады на вялікакняскім двары ў Троках[32]. Неўзабаве, пры падтрымцы польскага караля

[27] Podhorodecki L. Chanat Krymski i jego stosunki z Polską w XV—XVIII w. Warszawa, 1987. S. 7.

[28] Возгрин В. Е. Исторические судьбы крымских татар. С. 126, 143; Fischer A. The Crimean Tatars. P. 2—3.

[29] Podhorodecki L. Chanat Krymski... S. 7—8; Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. P. 4—5.

[30] Тамсама. S. 8—9.

[31] Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. P. 8.

[32] Смирнов В. Д. Крымское ханство под верховенством Оттоманской Порты до начала XVIII века. Санкт-Петербург, 1887. С. 226; Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Litrhuania. P. 11—12. Дарыюш Каладзейчык сцвярджае, што Хаджы-Гірэй паходзіў ад малодшага брата хана Батыя, Тага Цімура. Ягоным бацькам мусіў быць Гіясэдзін, які падтрымліваў Тахтамыша, і які, мажліва, загінуў у бітве на Ворскле ў 1399 годзе.

Уладзіслава Ягайлы і вялікага князя літоўскага Жыгімонта, ён абвясціў сябе незалежным ад залатаардынскіх ханаў. Так з'явілася новая татарская дзяржава на берагах Чорнага мора, а Хаджы-Гірэй стаў першым яе ўладаром. Пазней ён быў скінуты з крымскага трона, але адваяваў яго недзе ў 1433—1434 гг.[33]. Не выключана, што Хаджы-Гірэй мог яшчэ раз страціць трон, а пасля вярнуць яго ізноў з дапамогай вялікіх князёў літоўскіх. Так, вялікі князь Аляксандр пісаў у чэрвені 1492 г. да крымскага хана Менглі-Гірэя, сына Хаджы-Гірэя: «И напоминаемъ тебе, абы еси вспоменулъ давныи дела, какъ было из вековъ за предъковъ нашыхъ и твоихъ, и за отъца нашого и за твоего отъца часу прыгоду: коли которому цару або царевичу оръды Перекопъское прыгода прыгоживалася, нигде коня потного не розъседлалъ, толко у отчыне нашои, у Великомъ княжестве Литовъскомъ, и хлеба и соли имъ не боронено, покуль хто хотелъ змешкати, и какъ добровольне прыежъдчывали, такъ добровольно отъежъдчывали. Такъжо и тебе ведомо, ижъ и отецъ твои цар Анъжы Кгиреи в отъца нашого хлебъ и соль елъ и отътоль и стольца царъского досталъ...»[34]. Пазнейшая летапісная інфармацыя аб пражыванні Хаджы-Гірэя ў Лідзе, каранацыі яго вялікім князем Казімірам у Вільні, суправаджэнні ў Крым, верагодна, з'яўляецца водгукам тых падзей, калі хан быў вымушаны шукаць дапамогі ў ВКЛ[35]. Не выключана, што ў пачатку 40-х гг. XV ст. Хаджы-Гірэй быў сагнаны з крымскага трона ханам Заволжскай Арды Саід-Ахматам, які падтрымліваў спачатку Свідрыгайлу, а пасля Міхаіла Жыгімонтавіча як прэтэндэнтаў на вялікакняскі трон. Пасля працяглай барацьбы Казіміру Ягайлавічу і Хаджы-Гірэю ўдалося ў 1455 г. сумесна разбіць Саід-Ахмата[36].

Толькі пасля гэтага дзяржава Хаджы-Гірэя стала па-сапраўднаму незалежнай. Хаджы-Гірэй здолеў перадаць крымскі трон сваім нашчадкам і стаў пачынальнікам новай крымскай дынастыі — Гірэяў. Сімвалам суверэнітэту Крыма стала біццё ўласнай манеты. За гады яго праўлення Крымскае ханства значна пашырыла сваю тэрыторыю і стала ахопліваць увесь паўвостраў і прылеглыя да яго прычарнаморскія стэпы. Хутка развіваліся гандаль, рамёствы, жывёлагадоўля. За кошт уцекачоў з іншых татарскіх ордаў павялічылася колькасць

[33] Смирнов В. Д. Крымское ханство… С. 227—228.

[34] Lietuvos Metrika (далей — LM). Užrašymų knyga 5 / Parengė E. Banionis. Vilnius, 1993. P. 56.

[35] Полное собрание русских летописей (далей — ПСРЛ). Т. 32. Москва, 1975. С. 160; Stryjkowski M. O początkach, wywodach, dzielnościach, sprawach rycerskich i domowych sławnego narodu litewskiego, żemojdzkiego i ruskiego / Oprac. J. Radziszewska. Warszawa, 1978. S. 433—434.

[36] Podhorodecki L. Chanat Krymski… S. 13—14; Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. P. 12—13.

насельніцтва. Дзяржава была шматэтнічнай і шматканфесійнай. Акрамя татараў, якія складалі каля трэці насельніцтва, там пражывалі грэкі, армяне, італьянцы, яўрэі. Палітыка хана характарызавалася рэлігійнай і этнічнай талерантнасцю.

За гады праўлення Хаджы-Гірэя ўзрос міжнародны аўтарытэт яго дзяржавы. Яе прызнавалі ВКЛ, Польшча, Вялікае Княства Маскоўскае, Валахія. У зносінах з Крымам быў зацікаўлены Ватыкан, які імкнуўся ўцягнуць яго ў антытурэцкую лігу. Але найбольш прязнымі былі адносіны Крыма з яго паўночнымі суседзямі — Польшчай і ВКЛ. У 1461 г. Хаджы-Гірэй выдаў Казіміру Ягайлавічу ярлык на ўсе былыя татарскія валоданні ў паўднёвай і ўсходняй частцы Русі[37]. Дакумент абапіраўся на аналагічныя ярлыкі, якія ад ханаў Тахтамыша і Улу-Мухамеда атрымалі Вітаўт і Жыгімонт Кейстутавіч, і з'яўляўся ўзорам для[38] пазнейшых ярлыкоў наступнікаў Хаджы-Гірэя для ўладароў Літвы.

Вырас знешнепалітычны прэстыж самога Хаджы-Гірэя. Уладары Кароны і ВКЛ, як і суседняга Вялікага Княства Маскоўскага, тытулавалі крымскага хана царом (imperator), а яго дзяржаву называлі «Орда Перекопская» (Ordo Precopiensis, Ordo Fossatis, ад лац. *Fossa* — перакоп)[39]. Сам паўвостраў называўся звычайна Таўрыдай. Само слова Крым паходзіла ад назвы горада Стары Крым (Эскі-Крым, Салхат), які доўгі час быў цэнтрам Крымскага ўлуса[40]. У часы Гірэяў была разбудавана новая сталіца дзяржавы — Бахчысарай (Бахчэ-сарай). Сам хан у зносінах з вялікімі князямі літоўскімі звычайна тытулаваўся як «Великое Орды великий царь».

Самае важнае дасягненне Хаджы-Гірэя — стварэнне эфектыўнай і разгалінаванай сістэмы дзяржаўнага кіравання. Першае месца ў ёй займаў сам хан. Другім па значэнні саноўнікам з'яўляўся калга, які кіраваў усходняй часткай дзяржавы і загадваў правым крылом крымскага войска. Нурэддзін кіраваў заходняй часткай дзяржавы і загадваў левым крылом арміі. Калга і нурэддзін рэкрутаваліся з найбліжэйшых сваякоў хана (звычайна брат або старэйшы сын). Рэлігійным кіраўніком быў муфцій, у абавязкі якога ўваходзіла тлумачэнне законаў шарыяту, прызначэнне суддзяў (кадзі)[41]. Значныя паўнамоцтвы мелі таксама лідары (беі)

---

[37] Kolankowski L. Problem Kryma w dziejach Jagiellońskich. S. 289.

[38] Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. P. 14—16.

[39] Перакопская арда атрымала ў ВКЛ і Польшчы назву ад рова-перакопу на Крымскім перашэйку (Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 63).

[40] Смирнов В. Д. Крымское ханство… С. 47.

[41] Возгрин В. Е. Исторические судьбы крымских татар. С. 184.

чатырох галоўных крымскіх родаў (Шырыны, Барыны, Аргыны і Кіпчакі), якіх тытулавалі карачамі. Калга, нурэддзін, муфцій, беі-карачы, іншыя ўпаўнаважаныя асобы складалі дыван, свайго роду дзяржаўную раду. У кампетэнцыі дывана знаходзіліся найважнейшыя палітычныя пытанні. Дыван моцна абмяжоўваў уладу хана, што часам прыводзіла да сур'ёзных унутраных канфліктаў (як той, што разгарэўся пасля смерці Хаджы-Гірэя і з перапынкамі працягваўся больш за 10 год)[42]. У гэтым канфлікце акрамя знешнепалітычных фактараў (Вялікая Арда, Асманская імперыя) важную ролю адыгралі прадстаўнікі ханскага дывана, беі-карачы чатырох крымскіх родаў, асабліва прадстаўнік роду Шырынаў Эмінэк. У выніку да ўлады ў Крыме прыйшоў шосты сын Хаджы-Гірэя Менглі-Гірэй, які абапіраўся на дапамогу Турцыі. За гэтую падтрымку[43] хан быў вымушаны прызнаць залежнасць турэцкага султана.

Мірны даасманскі перыяд узаемных дачыненняў ВКЛ і Крыма трывала замацаваўся ў гістарычнай памяці наступных пакаленняў. У 1500 г. пасол вялікага князя Аляксандра ў Крым Дзімітрый Пуцяціч мусіў пачаць размову з ханам Менглі-Гірэем з наступных слоў: «Цар вольныи, ведаешь, твоя милость, самъ, што предкове твои, першыи цары, зъ давныхъ часовъ были с предки господаря нашого, з великими князи литовскими, почонъ отъ великого князя Тактамыша и от великого князя Олкгирда, в братстве и в прыязни, и в правде тверъдои. И какъ тежъ был отец твои, Ачъжы Кгиреи цар, со отцомъ господаря нашого, королемъ его милостю, в каковом братстве и прыязни, а предкове твои, первшыи цары, ни с ким иным братства и прыязни не мели, толко з великими князи литовъскими. А коли тыя прыязнь межы ними была, тогды волными цары слыли, и многии земли, господаръства имъ ся кланивали и пошлины, и выходы царскии их имъ давали»[44]. Крымскі бок адказваў у тым самым духу і амаль тымі ж словамі. Гаспадарскі пісар занатаваў змест прамоў паслоў Менглі-Гірэя на аўдыенцыі ў Жыгімонта Старога, які толькі што стаў вялікім князем, наступным чынам: «А какъ опосле на впокои послы и великих были у короля его милости в середу по обеде, и они много от царя его милости припоминали стародавных господареи и великих князеи от Витовта и далеи, також о Тактамыша, Чжелегдиня, Перберди, Кебек, Керемъберди, Кадерберди, Магметъ. Сидехмат, Ажи Кгиреи, Мордовлат, Менди Кгиреи и вси деи тыи цари

[42] Podhorodecki L. Chanat Krymski… S. 19—22.

[43] Fischer A. The Crimean Tatars. P. 11—14; Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. P. 21—22.

[44] LM. Užrašymų knyga 5. P. 160—161.

были з великими князи литовъскими у верномъ братстве, у присязе на всякого неприятеля заодин»[45]. Са спіса пералічаных крымскіх ханаў добра вядомыя толькі Тахтамыш, Хаджы-Гірэй, Нурдуўлат і Менглі-Гірэй. Магчыма, пад згаданым у спісе Чжэлегдзінем трэба разумець Джэлал-эд-Дзіна, аддзел якога ўдзельнічаў у Грунвальдскай бітве і які пасля правіў у Залатой Ардзе[46]. Аднак яго ў хуткім часе скінулі з залатаардынскага трона, куды ўзышоў хан Карым-Берды[47]. Згаданыя ў спісе Кадерберди, Магметъ, і Сидехметъ — гэта безумоўна ханы Кадыр-Берды, Улу-Мухамед і Саід-Ахмат[48]. Пра згаданых у спісе Пербердзі і Кебека немагчыма сказаць нічога[49]. Агучаны ханскімі пасламі спіс уладароў Крыма сведчыў не толькі пра глыбіню гістарычнай памяці крымскай палітычнай эліты, якая ахоплівала як мінімум стагоддзе, але і пра яе спробу манапалізаваць палітычную спадчыну былой Залатой Арды.

### 1.1.5. Крымскі хан Менглі-Гірэй

Нягледзячы на прызнанне ханам Менглі-Гірэем (1478—1515 гг.) верхавенства турэцкага султана, а таксама прысутнасць з 1475 г. асманскіх гарнізонаў у Кафе (Феадосіі), Азове і Манкупе, утварэнне на паўднёвым беразе Крыма асобнай турэцкай правінцыі (эялета), ён імкнуўся праводзіць самастойную палітыку. За гады яго праўлення пры фінансавай і вайсковай падтрымцы з боку Асманскай імперыі адбылося ўмацаванне дзяржаўнага суверэнітэту Крыма. Хан праводзіў адносна самастойную знешнюю палітыку, галоўны вектар якой карэнным чынам змяніўся. Менглі-Гірэй адышоў ад саюзу з Каронай і ВКЛ. Яшчэ ў датурэцкі перыяд ён заключыў пагадненне з маскоўскім вялікім князем Іванам III, скіраванае супраць Вялікай Арды, а таксама ВКЛ і Польшчы. Хаўрус з Масквой прынёс шмат карысці Крыму. Дзякуючы яму і пры падтрымцы Турцыі ханства перайшло да актыўнай наступальнай палітыкі ў адносінах да Вялікай Арды і ВКЛ. Пад ударамі крымскіх войскаў у 1502 г. Вялікая Арда перастала існаваць як дзяржаўнае ўтварэнне[50]. Улусы Заволжскага ханства і іх насельніцтва

---

[45] LM. Knyga Nr. 14 (1524—1529): Užrašymų knyga 14 / Parengė D. Antanavičius ir L. Karalius. Vilnius, 2008. P. 53.

[46] Смирнов В. Д. Крымское ханство… С. 205.

[47] Тамсама. С. 205.

[48] Тамсама. С. 218—222.

[49] Падрабязней пра генеалогію крымскіх ханаў гл.: Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. P. 13.

[50] Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. P. 28—29.

перайшлі пад уладу крымскага хана. Пачынаючы з 70-х гг. XV ст. крымскія татары распачалі атакі на паўднёвыя рубяжы ВКЛ. Да канца стагоддзя іх набегі абмяжоўваліся паўднёвымі землямі ВКЛ (Падолле, Валынь, Кіеў, Ноўгарад-Северскі). Але з пачаткам наступнага XVI ст. маштаб набегаў на землі ВКЛ і Польшчы значна павялічыўся. Татары пачалі пранікаць у глыб гэтых дзяржаў.

У канцы XV — пачатку XVI стст. Крымскае ханства, нягледзячы на залежнасць ад Асманскай імперыі, з'яўлялася важным фактарам міжнароднага жыцця ва Усходняй Еўропе. Да хаўрусу з ім імкнуліся ўсе дзяржавы рэгіёна. Узмацненне Крыма суправаджалася ростам цікавасці еўрапейцаў да ягонай мінуўшчыны і сучаснасці. Звесткі пра Крым у Еўропу звычайна пастаўлялі яго суседзі, у тым ліку дзяржавы Ягайлавічаў.

Сам кароль і вялікі князь Аляксандр з'яўляўся важнай крыніцай інфармацыі пра татараў для еўрапейскіх манархаў. Так, у пасланні да рымскага папы Юлія ад 6 снежня 1504 г. ён падрабязна апісаў татараў. Ён падкрэсліў, што Польшча і ВКЛ з залежнымі ад іх землямі пачынаючы ад часу іх засялення не перастаюць быць аб'ектам нападаў з боку варварскіх народаў і знаходзяцца ў стане перманентнага ваеннага супрацьстаяння з імі[51]. Гэтую асаблівасць мінуўшчыны і сучаснасці сваёй дзяржавы кароль тлумачыў тым, што значная частка яе зямель знаходзілася ў межах Скіфіі, прасторы якой ад Польшчы да Персіі і Белай Русі займае татарскі народ, уладароў якога не атрымліваецца перамагчы па прычыне значнай колькасці іх войска і адчайнасці воінаў[52]. Далей Аляксандр спыніўся на розных татарскіх ордах: Заволжскай (Transtanaitanus Ordo), Нагайскай (Nohaiski Ordo) і Перакопскай (Fossatus Ordo).

Кароль адзначыў сілу і магутнасць перакопскага цара: «ён атрымлівае дапамогу ад блізкіх і суседніх з ім валахаў і таксама мае ў сваім распараджэнні турак, якія прыбываюць да яго праз кафінскі порт, і такім чынам ён сам або разам з туркамі нападае на палякаў з вялікім мноствам войска, бо войска цара без турак і валахаў налічвае як мінімум 100 тысяч чалавек, а часам нават і 200 тысяч». Аляксандр падкрэсліў, што «з гэтым царом мы маем пастаянную праблему, бо не бывае года, каб палякі і літвіны не мелі б з ім бітвы: яны (татары) або нападаюць на нас з усёй сілай і ў вялікай колькасці, так што мы ледзь стрымліваем іх націск, або знянацку ўрываюцца дзеля спустошэння (нашых зямель), і калі яны адыходзяць або адступаюць,

[51] Akta Aleksandra, króla polskiego, wielkiego księcia litewskiego itd. (1501—1506) / Wyd. F. Papée. Kraków, 1927 (далей — АА). S. 442—443.

[52] AA. S. 443.

то мы нападаем на іх і і іншы раз перамагаем іх, але бывае і так, што яны перамагаюць нас, але не бывае года, каб (яны) не выводзілі соцень схопленых імі хрысціян». Змаганне з татарамі патрабавала вялізных сродкаў. Як адзначаў кароль, дзеля эфектыўнага супрацьстаяння Крыму Карона і ВКЛ павінны былі мець як мінімум 10 тысяч добра ўзброеных воінаў, што каштавала 100 тысяч венгерскіх фларэнаў у год[53]. Кароль прызнаўся, што гэтая сума з'яўляецца практычна непад'ёмнай, а на абарону ідуць амаль усе сродкі скарбу[54].

Пасланне Аляксандра Ягелончыка да рымскага папы Юлія заклала падмурак даследавання гісторыі, звычаяў і традыцый татараў. Да сярэдзіны стагоддзя з'явіліся апісанні татараў, зробленыя Мацеем Мяхоўскім і Міхалонам Літвінам. Гэтыя працы стымулявалі рост цікавасці грамадства Кароны і ВКЛ да сваіх суседзяў татараў.

Узмацненне Крыма ў канцы XV — пачатку XVI стст. мела пад сабой эканамічныя падставы. Дагэтуль галоўнымі крыніцамі існавання насельніцтва паўвострава былі жывёлагадоўля і земляробства. Менглі-Гірэй, калі прыйшоў да ўлады, пачаў весці гандаль рабамі[55]. Змены адбыліся пад уплывам асманаў, якія ўжо даўно займаліся падобнай дзейнасцю[56]. У той час гандаль людзьмі быў звычайнай справай. У розных краінах Азіі і Еўропы існаваў устойлівы попыт на рабскую працу. Попыт нараджаў прапанову. У доўгім ланцугу гандлю рабамі крымскія татары былі толькі першым звяном. Ім была адведзеная роля пастаўшчыкоў жывога тавару. Рабоў прадавалі на рынках у Кафе або Гезлёве і везлі нават у дастаткова аддаленыя краіны. Частка нявольнікаў заставалася на месцы і паступала ў сем'і заможных крымцаў, а таксама ў ханскі гарэм. Паступова значная частка насельніцтва паўвострава была ўцягнута ў гэты небяспечны, але надзвычай прыбытковы бізнес. Гандаль рабамі стаў падставай усёй эканомікі Крыма. Грошы ўзмацнілі кіруючую вярхушку Крыма і стымулявалі яе апетыты, што знаходзіла выраз у новых выправах на землі суседзяў[57].

Для крымскай вярхушкі не было розніцы, у якія краіны рабіць набегі. Татары нападалі не толькі на тэрыторыі, населеныя іншаверцамі, але таксама і на землі, дзе пражывалі іх адзінаверцы мусульмане. Аднак асноўным накірункам татарскіх набегаў былі ўсё ж землі паўночных суседзяў — ВКЛ, Польшчы і Маскоўскай дзяржавы.

---

[53] AA. S. 443.

[54] AA. S. 444.

[55] Podhorodecki L. Chanat Krymski… S. 26, 46.

[56] Возгрин В. Е. Исторические судьбы крымских татар. С. 158, 195.

[57] Fischer A. The Crimean Tatars. P. 26—28.

Адтуль у Крым ішоў асноўны паток жывога тавару. Пытанне, на каго нападаць, вырашалася пад уплывам палітычных фактараў. Звычайна татары рабілі напады на таго суседа, які ў дадзены момант лічыўся больш моцным. У апошняй чвэрці XV — пачатку XVI стст. такім аб'ектам з'яўляліся для крымскага хана ВКЛ і Польшча. Важнае значэнне меў голас турэцкага сюзерэна, які ў гэты час разглядаў Ягелонскія дзяржавы, а не Маскву, у якасці сваіх галоўных праціўнікаў.

Для арганізацыі паспяховых набегаў на землі суседзяў Крымскае ханства павінна было мець моцнае войска[58]. Крымская армія складалася як з апалчэння, збройных аддзелаў хана і беяў, так і з наёмных жаўнераў. Узбраенне татараў, асабліва тых, якія бралі ўдзел у выправах на суседзяў, было дастаткова простым. Татарскія воіны былі ўзброены лукам і стрэламі, дзідамі, часам шаблямі і кінжаламі. Абавязковым атрыбутам татарына, які адпраўляўся ў паход, былі дзягі, з дапамогай якіх яны вязалі палонных. У стратэгіі і тактыцы вядзення бою крымскія татары следавалі традыцыям Чынгізхана і Батыя. Галоўнай якасцю татарскага войска былі яго манеўранасць і хуткасць. Татарскія воіны вылучаліся дысцыплінаванасцю, вытрымкай, стойкасцю. Тактыка набегаў была простай. Татары ўрываліся ў зямлю праціўніка, імкнучыся захапіць як мага болей здабычы, пасля чаго хутка адыходзілі назад. У бітву татары ўступалі толькі ў самым крайнім выпадку, калі не было іншага выйсця. У баі яны спачатку асыпалі праціўніка градам стрэл, пасля чаго атакавалі яго ў плыткім баявым парадку ў выглядзе паўмесяца. Мэтай з'яўляліся абыход з фланга, акружэнне і знішчэнне праціўніка.

### 1.1.6. Вайна з Масквой 1492—1494 гг.

Смерць Казіміра Ягайлавіча і распад персанальнай уніі паміж ВКЛ і Польшчай пераканалі Івана III у тым, што настаў зручны момант для актывізацыі дзеянняў. У Маскве разлічвалі на маладосць і нявопытнасць новага літоўскага гаспадара. У выніку ўжо восенню 1492 г. памежныя канфлікты перараслі ў адкрытую вайну паміж Маскоўскай дзяржавай і ВКЛ. Дзеянні маскоўскага войска былі скаардынаваныя з дзеяннямі крымскіх татар. У той час, калі маскоўскае войска разгортвала наступ у кірунку Вязьмы і «вярхоўскіх княстваў» (Адоеў, Варатынск, Казельск), татары пустошылі северскія землі. Маскоўскаму войску ўдалося авалодаць Хляпенем, Рагачовам, Мяшчэрскам, Серпухавам, Любуцкам і інш. Поспехі крымскай зброі былі меней відавочнымі: татары толькі спустошылі

[58] Podhorodecki L. Chanat Krymski… S. 52—60.

ваколіцы Кіева, Чарнігава, Пуціўля. У адказ гаспадарскія падданыя разбурылі збудаваную каля вусця Дняпра крымскую крэпасць Цягін.

Памежныя войны 1486—1492 гг. і маскоўска-літоўская вайна 1492—1494 гг. засведчылі абыякавасць грамадства ВКЛ да лёсу памежных княстваў і гарадоў. Пры тагачасных сродках камунікацыі большасць насельніцтва ВКЛ, у тым ліку і баяр-шляхты, асабліва на захадзе і ў цэнтры дзяржавы, магла нават не ведаць пра ваенныя канфлікты на ўсходніх межах, а калі і ведала, то не прыдавала ім вялікага значэння. Баяры-шляхта не жадалі паміраць за інтарэсы памежных князёў. Віленскі ўрад не меў сродкаў, каб абараніць памежныя тэрыторыі ад агрэсіі з боку Маскоўскай дзяржавы. Вялікі князь Аляксандр быў пацыфісцкі настроеным маладым чалавекам. Да таго ж, ён быў рэалістам і добра ацэньваў перспектывы прамога сутыкнення з вялікім князем маскоўскім. Міжнароднае становішча таксама складвалася не на карысць ВКЛ. З поўдня дзяржаве пагражалі крымскія татары і туркі. Не спяшалася аказваць ваенную дапамогу Польшча[59]. У выніку памежныя князі і гарады былі прадастаўлены самі сабе.

### 1.1.7. «Вечны мір» 1494 г. і шлюб вялікага князя літоўскага Аляксандра Казіміравіча і вялікай княжны маскоўскай Алены Іванаўны

Не маючы неабходных сродкаў дзеля вядзення вайны, Аляксандр Казіміравіч звярнуўся да такога сродку вырашэння палітычных праблем, як дыпламатыя. У Маскву было даслана пасольства, якое 5 лютага 1494 г. падпісала «вечны мір». Згодна з гэтым пагадненнем, у склад Маскоўскай дзяржавы перайшлі Вязьма і Сярпейск[60], на маскоўскай службе засталіся ўсе навасільскія князі (Варатынскія, Адоеўскія, Белеўскія)[61]. Іван III вярнуў ВКЛ Мцэнск, Лучын, Дзмітраў, Масальск, Любуцк, Апакаў[62].

Мірны дагавор паміж Іванам Васілевічам і Аляксандрам Казіміравічам быў замацаваны шлюбным саюзам. Маскоўскі ўладар пагадзіўся выдаць за літоўскага гаспадара сваю дачку — князёўну Алену. Пра настроі ў Літве лепш за ўсё сведчыць той прыём, які

---

[59] Кром М. Меж Русью и Литвой… С. 90.

[60] Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским государством в царствование Великого Князя Ивана Васильевича. Ч. 1 (годы с 1487 по 1533) / Ред. Г. Ф. Карпов // Сборник Императорского Русского исторического общества (далей — СИРИО). Т. 35. Санкт-Петербург, 1882. С. 118—122.

[61] Тамсама. С. 126—127.

[62] Тамсама. С. 125—126.

быў аказаны маскоўскай князёўне падчас яе падарожжа з Масквы ў Вільню. Згодна з паведамленнем Хронікі Літоўскай і Жамойцкай, ва ўсіх гарадах ВКЛ, праз якія праязджала Алена Іванаўна, яе віталі артылерыйскім салютам. Перад Вільняй маскоўскую князёўну сустракала літоўскае войска, а таксама значная колькасць паноў і князёў. Калі Алена Іванаўна праязджала праз Вільню, яе вітаў мясцовы люд; ёй кідалі кветкі, а ў абодвух віленскіх замках чатыры гадзіны запар стралялі з гармат у яе гонар. Само вяселле працягвалася тры тыдні[63]. Шлюбны саюз Аляксандра Казіміравіча і Івана Васілевіча ўспрымаўся ў Літве як гарантыя міру. Урачыстасці сведчылі пра мірныя настроі, якія панавалі ў тагачасным літоўскім грамадстве, пра ўсеагульнае жаданне вырашаць спрэчныя пытанні мірным шляхам. Як пакажуць будучыя падзеі, такі пацыфізм быў жорсткай ілюзіяй, самападманам.

Вялікі князь Аляксандр, нягледзячы на адносна малады ўзрост, добра разумеў, што ў склаўшыхся ўмовах пазбегнуць узброеных канфліктаў з суседзямі ў будучым не магчыма. Прычым, ваяваць прыйдзецца, як мінімум, на два франты. На ўсходзе Маскоўская дзяржава ўзяла толькі кароткі перапынак перад новым наступам на на рускія землі ВКЛ. На поўдні пагражалі крымскія татары, за спінамі якіх маячыла магутная Асманская імперыя.

Аляксандр добра ўсведамляў, што ВКЛ не гатова да працяглай барацьбы з новымі праціўнікамі. Грамадства Літвы і Русі паводзіла сябе так, як быццам нічога не змянілася і працягваўся мірны час, да якога прызвычаіліся за апошнія 60 гадоў. Ваенная арганізацыя ВКЛ здэградавала за дзесяцігоддзі спакою. Адчуваўся брак баявога вопыту і вайсковай вывучкі сярод баяр-шляхты. У войску адсутнічала дысцыпліна, пакідала жадаць лепшага ўзбраенне. У той час, калі арміі Заходняй Еўропы сталі актыўна выкарыстоўваць агнястрэльную зброю, войска ВКЛ заставалася практычна на тым самым тэхнічным узроўні, што існаваў у канцы эпохі Вітаўта. Само паспалітае рушанне — аснова ваеннай структуры ВКЛ — безнадзейна састарэла.

Вялікі князь Аляксандр не меў ніякіх ілюзій адносна «вечнага міру», заключанага ў 1494 г. Ён разумеў, што маскоўскі ўладар узяў толькі паўзу, каб пазней распачаць новы больш маштабны наступ на землі ВКЛ. Таму, неўзабаве пасля заключэння пагаднення, гаспадар прыняў шэраг мер па павышэнні абараназдольнасці дзяржавы. Згодна з паведамленнем Хронікі Быхаўца, восенню 1494 — вясной

[63] ПСРЛ. Т. 35. С. 97.

1495 гг. Аляксандр Казіміравіч разам з жонкай вялікай княгіняй Аленай Іванаўнай і панамі-радай зрабіў аб'езд рускіх зямель дзяржавы. Кароль наведаў Смаленск, Віцебск, Полацк[64]. Праўдападобна, у ходзе паездкі гаспадар аглядаў мясцовыя замкі, правяраў іх надзейнасць, абмяркоўваў з мясцовай адміністрацыяй меры па ўдасканаленні абароны ўсходняй мяжы. Не забываў гаспадар і іншы напрамак, адкуль зыходзіла пагроза. Восенню1497 г. Аляксандр наведаў паўднёвыя межы ВКЛ, дзе даў загад аднавіць разбураную раней малдаўскім ваяводам Стафанам крэпасць Брацлаў[65].

## 1.1.8. Новая маскоўска-літоўская вайна

Міжнароднае становішча пасля чарнаморскай выправы 1497 г. характарызавалася далейшым пагаршэннем адносін ВКЛ з Маскоўскай дзяржавай і Крымскім ханствам. Не спраўдзіліся спадзяванні Аляксандра Казіміравіча на пасрэдніцтва свайго цесця ў нармалізацыі адносін з Крымам. У рэчаіснасці Іван III толькі падбухторваў свайго хаўрусніка да новых нападаў на землі ВКЛ. У 1499 г. адно з такіх завярэнняў маскоўскага боку хану Менглі-Гірэю трапіла ў Вільню, што выклікала сур'ёзны крызіс у адносінах паміж дзвюма дзяржавамі[66].

Ужо ў 1498 г. супярэчнасці паміж Масквой і Вільняй абвастрыліся настолькі, што новая вайна здавалася непазбежнай. Вялікі князь маскоўскі лічыў, што надышоў зручны момант для аднаўлення наступу на рускія землі ВКЛ. Шмат спрэчак выклікаў новы тытул Івана III як «Государя всея Руси», прызнаны за ім у ходзе перагавораў зімы 1494 г. Вялікі князь літоўскі не спяшаўся прызнаваць за маскоўскім уладаром гэты тытул, справядліва бачачы ў ім замах на дзяржаўную цэласнасць ВКЛ. У 1499 г. была зроблена спроба неяк вырашыць гэтае пытанне. Гаспадарскі пасол маршалак Станіслаў Глябовіч заявіў у Маскве, што вялікі князь літоўскі Аляксандр прызнае новы тытул Івана III толькі тады, калі той прызнае за ВКЛ Кіеў[67]. Аднак маскоўскі ўладар адмоўна паставіўся да гэтай прапановы, назваўшы яе «нялепіцай».

Падрыхтоўка да вайны суправаджалася ў Маскве магутнай прапагандысцкай кампаніяй. Аляксандр Казіміравіч абвінавачваўся

[64] «Y na tuiu zimu (1494—1495. — *У. К.*) kniaź weliki Alexandro z welikoiu kniahineiu Olenoiu y z pany iezdył u w objezd po zemli Ruskoy, y był u Smolensku y w Witebsku, y w Połocku, y k wesne paki wozwratysia k Wilni» (ПСРЛ. Т. 32. С. 164).

[65] ПСРЛ. Т. 32. С. 165

[66] СИРИО. Т. 35. С. 282.

[67] Тамсама. С. 285.

не толькі ў абмежаванні свабоды веравызнання вялікай княгіні Алены Іванаўны, але і ў быццам маючых месца праследаваннях праваслаўных у ВКЛ. Гэта былі пераважна дробныя факты або вымыслы і падазрэнні, але яны трапілі на добра падрыхтаваную глебу.

У канцы 1499 — пачатку 1500 гг. пад уздзеяннем маскоўскай прапаганды на бок Івана III перайшлі памежныя князі Сямён Бельскі, Сямён Мажайскі і Васіль Шамячыч[68]. Гэта былі князі, якія атрымалі свае ўладанні ад вялікіх князёў літоўскіх. Пастулова, аднак, яны ператварылі наданні ў амаль адасобленыя ад ВКЛ удзелы. Сямён Бельскі перайшоў на маскоўскі бок з Бельскам, Сямён Мажайскі — з Чарнігавам, Старадубам і Гомелем, а Васіль Шамячыч — з Ноўгарадам-Северскім[69]. Як адзначае расійскі даследчык М. Кром, згаданыя князі, пераходзячы на бок Масквы, кіраваліся галоўным чынам меркантыльнымі інтарэсамі, а менавіта імкненнем захаваць за сабой старыя ўладанні, а пры магчымасці набыць новыя[70]. На іх учынак магла паўплываць асабістая незадаволенасць, у тым ліку і ўмовамі гаспадарскай службы. Гэтае меркаванне адносіцца ў першую чаргу да северскіх князёў, Сямёна Мажайскага і Васіля Шамячыча. Апошнія лічыліся аднымі з найбольш таленавітых военачальнікаў у ВКЛ. Абодва вызначыліся ў памежнай вайне з маскоўскімі падданымі ў 1492—1494 гг., а таксама бралі ўдзел у чарнаморскай выправе 1497 г.[71]. Не выключана, што і Сямён Мажайскі, і Васіль Шамячыч спадзяваліся заняць створаную ў 1497 г. пасаду вялікага гетмана ВКЛ. Калі іх надзеі не спраўдзіліся, яны вырашылі перайсці на бок вялікага князя маскоўскага, спадзеючыся павысіць свой статус на новай службе[72].

Пераход памежных князёў на бок Масквы прывёў да пачатку новай вайны паміж Масквой і Вільняй. 3 мая 1500 г. маскоўская рацьна чале з ваяводам Якавам Захарнічам рушыла ў глыб земляў ВКЛ, каб узяць пад абарону валоданні князёў-перабежчыкаў. У ходзе ваеннай аперацыі былі захоплены Бранск, Пуціўль і Дарагабуж[73]. Мяцежныя князі таксама не сядзелі склаўшы рукі, а захапілі некаторыя землі па суседстве з іх удзеламі: Сямён Мажайскі — Любеч, Васіль

[68] ПСРЛ. Т. 32. С. 166; Кром М. Меж Русью и Литвой… С. 92—96, 100—101.

[69] Кром М. Меж Русью и Литвой… С. 98.

[70] Тамсама. С. 97.

[71] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 105—106.

[72] Кром М. Меж Русью и Литвой… С. 97.

[73] Тамсама. С. 97—99.

Шамячыч — Рыльск[74]. Тады ж да Масквы былі гвалтам далучаны землі князёў Трубяцкіх. Пераход северскіх земляў да Масквы рэзка змяніў баланс сіл у рэгіёне. Навісла непасрэдная пагроза над Кіевам, што апынуўся непадалёк ад новай мяжы. Паўднёва-ўсходні фланг абароны дзяржавы быў аслаблены.

Страта северскіх земляў яшчэ доўга адгукалася болем сярод інтэлектуальнай і палітычнай эліты ВКЛ. Праз паўстагоддзя пасля згаданых падзей велікакняскі сакратар Венцлаў Мікалаевіч, больш вядомы пад псеўданімам Міхалон Літвін, пісаў, што: «гэтыя гарады былі бедныя, калі перайшлі да нас, але ад нас яны адышлі багатыя і ўмацаваныя новымі землямі, якія былі даверэны іх кіраванню»[75]. Галоўная выснова, якую робіць Літвін, — ніколі не давяраць ворагам і не прымаць на службу перабежчыкаў. Падзеі 1500 г., страта багатых северскіх зямель тывала замацаваліся ў гістарычнай памяці наступных пакаленняў у ВКЛ, у тым ліку ў летапіснай форме[76].

### 1.1.9. Катастрофа на Вядрошы (14.06.1500 г.)

Пераход на бок вялікага князя маскоўскага С. Бельскага, С. Мажайскага і В. Шамячыча, захоп маскоўскім войскам Бранска і іншых гарадоў выклікалі хуткую рэакцыю Аляксандра Казіміравіча. Гаспадар абвясціў збор войска, якое ўзначаліў вялікі гетман Канстанцін Астрожскі[77]. Войска рушыла ў кірунку Смаленска. Сам вялікі князь паследаваў за ім спачатку да Менска, а пасля да Барысава, дзе размясціў сваю стаўку. Гаспадарскае войска рушыла далей да Смаленска, дзе да яго далучыўся мясцовы ваявода Станіслаў Пятровіч Кішка.

Выправа была арганізаваная не найлепшым чынам. Гаспадарскае войска было невялікім па колькасці. Згодна Хронікі Быхаўца, яно налічвала максімум «polczetwerty» (3,5 тыс.) коннікаў, не ўлічваючы пехацінцаў[78]. І гэта ў той час, калі мабілізацыйныя здольнасці ВКЛ у канцы XV — пачатку XVI стст. складалі не менш за 40 тысяч воінаў[79]. Як бачна, было сабрана меней за дзясятую частку ўсяго паспалітага рушання дзяржавы. Аснову войска складалі пераважна панскія і княскія початы, а таксама надворная харугва. Згодна

[74] Кром М. Меж Русью и Литвой. С. 98.

[75] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 96.

[76] ПСРЛ. Т. 32. С. 99—100; ПСРЛ. Т. 35. С. 166.

[77] ПСРЛ. Т. 32. С. 100.

[78] ПСРЛ. Т. 35. С. 167.

[79] Papée F. Polska i Litwa na przełomie wieków średnich. T. 1. Ostatnie dwunastolecie rządów Kazimierza Jagiellończyka. Kraków, 1904.

з паведамленнямі крыніц, у войску знаходзіліся надворны маршалак Рыгор Станіслававіч Осцікавіч, гаспадарскі падчашы Мікалай Мікалаевіч Радзівіл, маршалак Ян Пятровіч, маршалак Ян Літавор Храптовіч[80]. Усе яны былі дворскімі ўраднікамі. Менавіта іх вялікі князь Аляксандр выслаў супраць маскоўскага войска. Іх початы і харугвы і склалі аснову войска ВКЛ у кампаніі 1500 г. У гаспадара не было часу чакаць на падыход харугваў з аддаленых земляў ВКЛ. Ён мусіў дзейнічаць хутка і аператыўна.

Сабранае на хуткую руку гаспадарскае войска рухалася не вельмі імкліва. Яно доўгі час знаходзілася ў Смаленску. Атрымаўшы нарэшце вестку ад шпегаў, што адносна невялікае маскоўскае войска на чале з ваяводам Юрыем Захарнічам стаіць на Вядрошы, гаспадарскія ваяводы няспешна рушылі ў гэтым кірунку. Па дарозе яны зрабілі прывал у Ельні. Такі нетаропкі марш дазволіў войску Юрыя Захарніча атрымаць значныя падмацаванні.

Вялікі гетман Канстанцін Астрожскі і падначаленыя яму паны паводзілі сябе дастаткова самаўпэўнена. Спачатку яны з недаверам паставіліся да вестак маскоўскага перабежчыка, былога дзяка пана Багдана Сапегі Германа, пра падыход дадатковых сіл маскоўскага войска на чале з ваяводамі Данілам Шчэнем і Іванам Перамышльскім[81]. Асабліва раззлавала паноў парада перабежчыка не ўступаць у бой з пераўзыходзячымі сіламі праціўніка, а адысці. Загадаўшы павесіць перабежчыка, яны рушылі далей. Нават калі ў Лапаціне гаспадарскія ваяводы атрымалі дакладную інфармацыю пра колькасны склад праціўніка, што чакаў іх на Вядрошы[82], іх рашэнне не было зменена. Апошнія дзве мілі войска ВКЛ мусіла ісці праз лес па разбітай дарозе, што не магло не паўплываць на фізічны стан воінаў[83]. Да Вядрошы літвіны падышлі стомленымі.

Гетман Астрожскі спадзяваўся раптоўным ударам апракінуць галоўныя сілы маскоўскага войска і змусіць яго да ўцёкаў. Такі манеўр меў на мэце пераканаць маскоўскіх баяр, што войска ВКЛ колькасна не саступае маскоўскаму. Лес, які прыкрываў тылы гаспадарскага войска, не даваў магчымасці праціўніку ацаніць яго колькасць. План

[80] ПСРЛ. Т. 35. С. 166—167.

[81] Тамсама. С. 167.

[82] «Kniaź Konstantyn że i panowe y wse lude, suszcze s nimi, radu a wmysł swoy na tom położyli, malol mnoho moskwicz budet, tolko wzemszy Boha na pomocz bitysia s nimi, a ne biwszysia nazad ne wernutysia, no ity, y wse pryłuczywszesia widyty, ino szto budet wola bożaja» (ПСРЛ. Т. 35. С. 167).

[83] ПСРЛ. Т. 35. С. 167.

Астрожскага спрацаваў толькі ў самым пачатку бітвы. Маскоўскія баяры, думаючы, што іх атакуе авангард вялікага гаспадарскага войска, пачалі адступаць. Але калі кіраўніцтва праціўніка даведалася пра малалікасць войска ВКЛ, яно павярнула назад і ўсімі сіламі ўдарыла на літвінаў. Апошнія спрабавалі мужна абараняцца, але змушаныя былі ратавацца ўцёкамі. У выніку арганізаванага маскоўскімі ваяводамі праследавання амаль усе літвіны былі забіты або ўзяты ў палон. Так няўдала завяршылася для вялікага князя літоўскага летняя кампанія 1500 г.

Катастрофа на берагах Вядрошы мела выключна цяжкія наступствы для ВКЛ. Дзяржава страціла лепшых ваяроў, лепшыя харугвы і початы. Гаспадарскае войска, а дакладней яго ядро, фактычна перастала існаваць. Пасля Вядрошы вялікі князь літоўскі быў не ў стане весці наступальныя дзеянні і мусіў перайсці да абароны. На шчасце найвышэйшага кіраўніцтва ВКЛ, Іван III задаволіўся дасягнутымі ў 1500 г. поспехамі і спыніў[84] актыўныя дзеянні. Ён жа прыслаў паслоў з мірнымі прапановамі.

У палон трапіла амаль усё ваеннае кіраўніцтва дзяржавы разам з вялікім гетманам. Гэту страту вялікі князь Аляксандр перажываў асабліва цяжка. Неўзабаве пасля паразы на Вядрошы Аляксандр, прыняўшы мірныя прапановы вялікага князя маскоўскага, з роспаччу пісаў да таго: «И мы посылали были там на границы гетмана нашого, князя Константина Ивановича Острозского, и панов нашых от твоих людей постереч. И твои люди нашых людей поразили и гетьмана нашого, и панов нашых головами к тобе прывели»[85]. Сярод палонных былі Рыгор Осцік, Ян Літавор Храптовіч, Мікалай Глябовіч, Мікалай Зяноўевіч і многія іншыя паны[86]. Толькі ўцёкамі ўратаваў жыццё пан Ян Пятровіч[87]. Пазбег смерці палону смаленскі ваявода Станіслаў Пятровіч Кішка[88].

Акрамя гэтага, параза на Вядрошы 14 ліпеня 1500 г. надзвычай моцна дэмаралізавала ўсё грамадства ВКЛ. Весткі аб катастрофе вельмі хутка распаўсюдзіліся па землях дзяржавы, дасягнуўшы самых аддаленых яе куточкаў. Жах і роспач агарнулі людзей. Сам жа вялікі

---

[84] 1500 г.: Квяткоўскі К. Бітва на рацэ Вядрошы 14 ліпеня 1500 года. Ваенна-палітычныя перадумовы, абставіны і хада сечы, вынікі і значэнне для ўсёй кампаніі 1500 года // ARCHE. 2014. № 12. С. 40—80.

[85] LM. Užrašymų knyga 5. P. 154.

[86] ПСРЛ. Т. 35. С. 167. Хроніка Літоўская і Жамойцкая падае пашыраны спіс палоненых на Вядрошы паноў (ПСРЛ. Т. 32. С. 100).

[87] ПСРЛ. Т. 35. С. 167.

[88] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 100.

князь Аляксандр мужна ўспрыняў навіну пра разгром свайго войска[89]. Нарэшце, параза на Вядрошы адкрыла дарогу татарскім атрадам у глыб земляў ВКЛ. Карыстаючыся паслабленнем Літвы і дэмаралізацыяй мясцовага насельніцтва, крымскі хан Менглі-Гірэй пачаў раз за разам высылаць свае войскі ў цэнтральныя раёны дзяржавы.

### 1.1.10. Найманыя жаўнеры

Кампанія 1500 г. пераканала вялікага князя Аляксандра ў слабасці паспалітага рушання. Больш таго, у сувязі з гібеллю гаспадарскага войска на Вядрошы і паланеннем часткі камандавання, яго аператыўна-тактычныя магчымасці істотна зменшыліся. На яго нельга ўжо было пакладацца ў змаганні з моцнымі і небяспечнымі ворагамі. Патрэбны былі новыя ваенныя сілы.

Такой сілай бачылася найманае войска. У XV ст. найманыя жаўнеры сталі ўжо асновай армій у Еўропе. Гэта былі прафесіяналы ваеннай справы, што вывучкай і падрыхтоўкай пераўзыходзілі феадальнае апалчэнне. На чале найманых жаўнераў стаялі кандацьеры (итал. Condotto — падрадчык, военачальнік). Апошнія звычайна самі набіралі воінаў, якімі затым камандавалі. Практычна ніводны канфлікт XV ст. не абыходзіўся без наймітаў. Італьянскія войны канца XV ст. толькі засведчылі ўзрослае значэнне гэтай катэгорыі воінаў[90]. У канцы стагоддзя ўтварыўся таксама ўстойлівы рынак найманых жаўнераў. Большасць іх паходзіла з бедных і перанаселеных (Боснія, Іспанія) або вядомых сваімі воінскімі традыцыямі (Швейцарыя, Чэхія, Германія) краін Еўропы.

Вялікі князь Аляксандр прыступіў да найму замежных жаўнераў. Іх вярбоўка адбывалася ў Польшчы, Чэхіі і асобных нямецкіх землях[91]. Пунктам збору жаўнераў быў польскі горад Познань[92]. Там жа адбываўся разлік з імі. Гетманам усіх найманых войск быў прызначаны ўраджэнец Чэхіі Ян Чэрнін. У 1501 г. найміты ўдзельнічалі ў паходзе войска ВКЛ на чале з вялікім гетманам Станіславам Янавічам Кезгайлам пад Смаленск з мэтай вызвалення горада з аблогі. Пасля завяршэння кампаніі іх адаслалі «на заставу» ў Полацк і іншыя памежныя замкі[93].

[89] ПСРЛ. Т. 35. С. 167; ПСРЛ. Т. 32. С. 100.

[90] Пра ролю кандацьераў у еўрапейскай гісторыі эпохі Рэнесансу гл. падрабязней: Burckhardt J. The Civilization of the Renaissance in Italy. 3d ed. Phaidon, 1995. P. 14—18; Trease G. The Condottieri. London, 1970.

[91] ПСРЛ. Т. 35. С. 168.

[92] ПСРЛ. Т. 32. С. 100.

[93] ПСРЛ. Т. 35. С. 168. Гл. таксама пасольства Аляксандра Казіміравіча да паноў Кароны 5 жніўня 1502 г. (АА. S. 125).

Думаецца, што князь Міхаіл, як адзін з найбліжэйшых дарадцаў гаспадара, браў актыўны ўдзел у вярбоўцы замежных жаўнераў. Як ніхто іншы, Глінскі ведаў еўрапейскі рынак наймітаў і добра арыентаваўся ў коштах на іх паслугі. З асобнымі ротмістрамі ён быў добра знаёмы або нават падтрымліваў сяброўскія сувязі. Не выключана, што многія жаўнеры і ротмістры з'явіліся ў ВКЛ дзякуючы намаганням князя Міхаіла. Той жа Ян Чэрнік мог быць завербаваны, калі не самім Глінскім, то па яго рэкамендацыі. Глінскі і Чэрнік маглі ведаць адзін аднаго яшчэ з часу фрысландскай кампаніі або нават яшчэ раней. Сярод багемскіх жаўнераў аўтарытэт «пана Міхала», як яны яго называлі[94], быў неаспрэчным.

Магчыма, сярод наймітаў, якія прыбылі ў ВКЛ у 1501 г., быў Колікратар, імя якога стане вядомым у сувязі з канфліктам паміж Глінскім і Забярэзінскім. Верагодна, яго сапраўднае прозвішча было Калькройт (Kalkreut) і паходзіў ён менавіта з Саксоніі. Калі нашая ідэнтыфікацыя верная, тады можна меркаваць, што Калькройт прадстаўляў цэлую дынастыю дворскіх служэбнікаў. Яго продак, Тама фон Калькройт (Thammo von Kalkreut), у 1381—1406 гг. быў прыдворным саксонскіх герцагаў[95].

### 1.1.11. Пачатак спусташальных татарскіх нападаў на цэнтральныя землі ВКЛ

З канца XV ст. павялічылася колькасць татарскіх набегаў на землі ВКЛ. У гэты ж час мяняецца кірунак нападаў. Калі раней іх аб'ектам былі пераважна памежныя землі ВКЛ (Падолле, Валынь, Кіеўшчына, Ноўгарад-Северская зямля), то цяпер татары пачалі пранікаць у цэнтральныя раёны дзяржавы. Заняты на ўсходнім фронце, вялікі князь літоўскі быў не ў стане даць належны адпор татарскім аддзелам, што ўрываліся з поўдня. Сам вялікі князь маскоўскі неаднаразова падбухторваў крымскага хана атакаваць цэнтральныя землі ВКЛ, якія складалі заплечча абароны дзяржавы: «Говорити ему (послу. — *У. К.*) царю Менгли-Гирею накрепко, чтобы царь однолично пошел на Литовскую землю ратью, или бы брата своего да и детей своих послал. А шел бы царь, или его дети, к Киеву, или к Слуцку, и к Турову, и к Пинску, ик Менъску, того деля, чтобы как недругу гораздо недружба довести»[96]. Ваюючы з Маскоўскай дзяржавай, вялікі князь літоўскі заўжды меў перад сабой двух ворагаў.

---

[94] Герберштейн С. Записки о Московии: В 2 т. / Под ред. А. Л. Хорошкевич. Т. 1: Латинский и немецкий тексты. Москва, 2008. С. 464—465.

[95] Streich B. Zwischen Reiseherrschaft und Residenzbildung: der wettinische Hof im späten Mittelalter (= Mitteldeutsche Forschungen. Bd. 101). Köln, 1989. S. 594.

[96] СИРИО. Т. 41. С. 326.

У самым канцы XV ст. крымскія татары выйшлі на лінію Прыпяці. Першапачаткова дзеянні татарскіх чамбулаў абмяжоўваліся выключна правым берагам ракі. Вясной 1497 г. татары рабавалі Мазырскую воласць. Імі быў схоплены і забіты мітрапаліт Кіеўскі і ўсяе Русі Макарый, які накіроўваўся з Вільні ў Кіеў[97]. Восенню 1500 г. крымскія татары рабавалі ўжо не толькі Валынскую зямлю, але таксама ваколіцы Любліна і іншых польскіх гарадоў. Тады ж татары ўпершыню праніклі на левы бераг Віслы і спалілі горад Апатаў. У ходзе гэтага нападу было спалена Берасце[98]. Магчыма, што тады былі спаленыя таксама Камянец і Тураў[99].

Цяжкае становішча, у якім апынуўся вялікі князь літоўскі Аляксандр напрыканцы 1500 г., вымусіла яго звярнуцца да непапулярнай ідэі, сэнс якой заключаўся ў тым, каб узамен за гарантаваную штогадовую плату (па тры літоўскія грошы з кожнага чалавека паўднёвых земляў ВКЛ) атрымаць ад крымскага хана спакой і падтрымку ў барацьбе з Масквой. Менглі-Гірэй, патрабуючы выплаты, спасылаўся на гістарычны прэцэдэнт, калі ў 1438 г. пасля разгрому падольскіх зямян заволжскім ханам Саід-Ахматам Карона і Княства нейкі час плацілі даніну Ардзе[100]. Пазней, у выніку татарскіх міжусобіц, пра даніну забыліся, і толькі ў канцы 1499 г. Менглі-Гірэй нагадаў пра яе. Грошы ў Крым павінны былі ісці з былых уладанняў хана Шах-Ахмата ў межах былога Кіеўскага княства Алелькавічаў, а таксама з кароннага Падолля. З гэтай нагоды ў Перакоп збіралася выехаць пасольства на чале з кіеўскім ваяводам Дзімітрыем Пуцяцічам[101]. Аднак плануемае пасольства так і не адбылося. Вялікі князь Аляксандр тлумачыў гэта тым, што крымскі бок так і не даслаў у Кіеў абяцанага вяльможнага закладніка, які мусіў быць гарантам бяспечнага знаходжання Дзімітрыя Пуцяціча ў ханскай стаўцы[102].

### 1.1.12. Старыя і новыя хаўруснікі

Акрамя найманых жаўнераў, Аляксандр Казіміравіч ускладаў асаблівыя надзеі на войскі сваіх старых хаўруснікаў. Восенню 1500 г. гаспадар выслаў пасольства да хана Заволжскай Арды Шах-Ахмата,

[97] ПСРЛ. Т. 32. С. 124.

[98] ПСРЛ. Т. 35. С. 168.

[99] СИРИО. Т. 41. С. 333, 360.

[100] Kolankowski L. Problem Kryma w dziejach Jagiellońskich. S. 285—286.

[101] LM. Užrašymų knyga 5. P. 154—156, 160—163.

[102] Тамсама. P. 182.

каб той аказаў яму ваенную дапамогу супраць Масквы[103]. Тады ж да магістра Інфлянцкага ордэна з просьбай аб дапамозе быў дасланы Юрый Касцевіч[104]. У Вільні не без падстаў разлічвалі, што ў выпадку аднachасовага выступу ўсіх трох хаўруснікаў Маскве пагражала сур'ёзная небяспека.

У дыпламатычных перагаворах з Інфлянтамі і Заволжскай Ардой актыўны ўдзел браў і князь Міхаіл Глінскі. Разам з іншымі раднымі панамі ВКЛ надворны маршалак выступіў гарантам двухбаковага пагаднення паміж лівонскім магістрам Вальтэрам фон Плетэнбергам і вялікім князем літоўскім Аляксандрам, якое было заключана 21 чэрвеня 1501 г. у Вендэне[105]. Паслом да заволжскага хана Шах-Ахмата быў гаспадарскі дваранін Міхал Халецкі, які вёз з сабой асабістае пасланне ад Міхаіла Глінскага. У лісце ён не толькі адказаў на пытанне пра лёс слугі Шах-Ахмата па імені Чаркас, вяртання якога патрабаваў заволжскі хан, але, верагодна, таксама ўздымаў праблему ваенна-палітычнага супрацоўніцтва абодвух манархаў[106]. Аўтарытэт надворнага маршалка паўплываў на станоўчы вынік перагавораў з Шах-Ахматам. 10 студзеня 1501 г. у польскім горадзе Пётркаў (Piotrków) прадстаўнікі Польшчы і ВКЛ заключылі сумеснае пагадненне з Заволжскай Ардой, скіраванае як супраць Маскоўскай дзяржавы, так і Крымскага ханства[107]. У выніку быў сфарміраваны даволі грозны антымаскоўскі хаўрус.

Пра аўтарытэт братоў Львовічаў у вачах Шах-Ахмата сведчыць пасольства на чале з Чан Каірам, якое заволжскі хан накіраваў асабіста да Глінскіх улетку 1502 г. Пасольства застала надворнага маршалка ў Навагародку, дзе ў той час знаходзіўся двор Аляксандра Казіміравіча[108]. У лісце Шах-Ахмат называў Львовічаў прыяцелямі, адзначаў іх высокае паходжанне, прасіў выслаць да сябе

[103] «Того ж року кроль полский Олбрихт и великий князь литовский Александр послали до царя Шахмата татарского за 30.000 золотых кожухов, также и сукна през пана Михаила Халецкого, жадаючи затягов войска его против великого князя московского, которые всю землю северскую сплендровали» (ПСРЛ. Т. 32. С. 101). Гл. пасольства Халецкага да Шах-Ахмата (LM. Užrašymų knyga 5. P. 159—160, 163—165).

[104] LM. Užrašymų knyga 5. P. 146—147, 168—170.

[105] Тамсама. P. 238—244.

[106] Шах-Ахмат звяртаўся да Аляксандра Казіміравіча з наступнай просьбай: «А въ князя Львовича, въ князя Михаила, слуга мои есть, на имя Черкас, и ты бы его, братъ мои, не поборонилъ» (LM. Užrašymų knyga 5. P. 158).

[107] Materiały do dziejow dyplomacji Polskiej z lat 1486—1516 (Kodeks zagrzebski) / Oprac. J. Garbacik. Wrocław—Warszawa, 1966. S. 78—79.

[108] LM. Užrašymų knyga 5. P. 178.

кагосьці з братоў або ў крайнім выпадку іх цётачнага брата Андрэя Дрожджу[109].

Аднак да скаардынаваных дзеянняў хаўруснікаў справа так і не дайшла. Летам-восенню 1501 г. ваенныя дзеянні вялі толькі Шах-Ахмат і Вальтэр Плетэнберг. Асабліва актыўна дзейнічаў Шах-Ахмат, які адначасова змагаўся з Крымам і Масквой. На працягу 1501—1502 гг. заволжскія татары амаль беспераппынна атакавалі крымскія ўлусы, у выніку чаго амаль спыніліся крымскія набегі на валоданні ВКЛ і Польшчы. Надзвычай эфектыўна дзейнічалі заволжскія татары і на паўночным фронце. У 1501 г. Шах-Ахмат здабыў усе северскія землі і гарады (Рыльск, Ноўгарад-Северскі), што былі захоплены Іванам III або перайшлі на ягоны бок[110]. Мясцовыя князі (С. Мажайскі і інш.) мусілі ратавацца ўцёкамі. Авалодаўшы северскімі землямі, заволжскі хан паслаў да вялікага князя літоўскага з просьбай выступіць супраць вялікага князя маскоўскага[111]. Аднак у прызначаны час Аляксандр Ягелончык так і не выступіў.

Вальтэр Плетэнберг у жніўні 1501 г. разбіў маскоўскае войска на рацэ Сырыца, знішчыў замак Остраў. Аднак і ён не дачакаўся падтрымкі з боку Літвы і, маючы дэфіцыт харчавання, быў вымушаны вярнуцца дамоў[112].

### 1.1.13. Каранацыя Аляксандра Казіміравіча

Пачынаючы з другой паловы XVI ст. факт адсутнасці Аляксандра Казіміравіча на полі бою ўлетку 1501 г. звычайна тлумачылі тым, што ён ахвяраваў сваімі хаўруснікамі дзеля польскай кароны[113]. Ужо 25 чэрвеня 1501 г. Аляксандр даведаўся пра смерць брата (17 чэрвеня, Торунь). Роўна праз месяц вялікі князь выставіў сваю кандыдатуру на польскі каралеўскі трон. Замест усходняга тэатра ваенных дзеянняў Аляксандр у канцы жніўня 1501 г. выправіўся ў Польшчу. Гаспадара суправаджаў яго надворны маршалак Міхаіл Глінскі. Нейкі час гаспадар знаходзіўся на Падляшшы, дзе ўважліва сачыў за ходам перадвыбарнай кампаніі ў Кароне, а ў канцы верасня ён вырушыў туды асабіста[114].

[109] LM. Užrašymų knyga 5. P.

[110] Тамсама. P.

[111] LM. Užrašymų knyga 5. P. 170.

[112] Papée F. Aleksander Jagiellończyk. Kraków, 2006. S. 43—44.

[113] ПСРЛ. Т. 35. С. 169.

[114] Papée F. Aleksander Jagiellończyk. Kraków, 2006. S. 44, 48—51.

Выбары новага караля адбыліся на з'ездзе каронных і літоўскіх дэлегатаў у Пётркаве. Літоўскі бок прадстаўлялі віленскі біскуп Война цех Табар, віленскі кашталян Аляксандр Гальшанскі, троцкі ваявода Ян Забярэзінскі, падчашы Мікалай Радзівіл. У саперніцтве з роднымі братамі Уладзіславам і Жыгімонтам, пры падтрымцы трэцяга брата, уплывовага кардынала Фрыдэрыка, Аляксандр быў абраны польскім каралём. Але яму давялося пайсці на значныя саступкі Кароне. Аляксандр атрымаў польскую карону коштам абмежавання суверэнітэту ВКЛ. Фактычна прадугледжвалася зліццё ВКЛ і Кароны з утварэннем унітарнай дзяржавы. Уладар аб'яднанай дзяржавы павінен быў абірацца на агульным сойме[115]. Нягледзячы на тое, што пагадненне было надзвычай нявыгадным пануючай у ВКЛ дынастыі Ягайлавічаў, Аляксандр быў вымушаны падтрымаць яго, бо спадзяваўся на актыўны ўдзел Кароны ў абароне яго спадчыннай дзяржавы. 23 кастрычніка 1501 г. у падляшскім горадзе Мельнік Аляксандр Казіміравіч з панамі-радай зацвердзіў унію паміж Каронай і ВКЛ. Сярод радных паноў знаходзіўся князь Міхаіл Глінскі, які прыклаў да тэксту уніі сваю шыкоўную пячатку з нямецкамоўным надпісам «Michel Herzog Linczki»[116].

Пасля зацвярджэння уніі гаспадар вырушыў у Кракаў. 12 снежня 1501 г. у Вавельскім замку Аляксандр быў каранаваны. Кардынал Фрыдэрык, родны брат, асабіста ўсклаў на скроні Аляксандра каралеўскую дыадэму. У цырымоніі бралі ўдзел усе вышэйшыя духоўныя асобы Польшчы, Літвы, Русі і Прусіі. Прысутнічала маці новага караля, каралева Альжбета, а таксама родны брат, глогаўскі і апаўскі князь Жыгімонт[117]. Сярод удзельнікаў каранацыі былі найбольш уплывовыя свецкія вяльможы, сярод якіх храністы вылучаюць князя Міхаіла Глінскага. У дзень каранацыі і ў наступныя дні ў Вавельскім замку адбываліся піры, рыцарскія турніры, танцы[118]. Міхаіл Глінскі мусіў браць актыўны ўдзел ва ўсіх гэтых забавах.

Князь Міхаіл упершыню ўдзельнічаў у каранацыі. Дагэтуль ён, верагодна, толькі быў сведкам «паднясення» на велікакняскі стол Аляксандра Казіміравіча ў 1492 г. Трэба адзначыць, што

[115] Гудавичюс Э. История Литвы с древнейших времен до 1569 года. Москва, 2005. С. 505—506.

[116] Akta unii Polski z Litwą 1385—1791 / Wyd. S. Kutrzeba i W. Semkowicz. Krakow, 1932 (далей — AU). S. 132.

[117] Papée F. Aleksander Jagiellończyk. Kraków, 2006. S. 54.

[118] Kroniki Bernarda Wapowskiego (1480—1535) / Wyd. J. Szujski (= Scriptores Rerum Polonicarum. T. 2). Kraków, 1874. S. 48.

ў ходзе каранацыі па-еўрапейску адукаваны, з бліскучымі манерамі Міхаіл Глінскі зрабіў добрае ўражанне як на гаспадароў, так і на гасцей. Тут ён мусіў пазнаёміцца з каронным канцлерам Янам Ласкім, каронным падканцлерам Мацеем Джэвіцкім і іншымі тагачаснымі ўплывовымі асобамі, з якімі ён будзе падтрымліваць цесныя сувязі да канца сваёй кар'еры ў ВКЛ. У Кракаве князь Міхаіл сустрэўся таксама са сваім добрым знаёмым каралевічам Жыгімонтам.

### 1.1.14. Абарона Смаленска (1502 г.)

Усю зіму і першыя два месяцы вясны наступнага 1502 г. надворны маршалак знаходзіўся побач са сваім гаспадаром у Кракаве. Толькі 3 мая двор Аляксандра вырушыў у ВКЛ[119]. Шлях караля ляжаў праз Малы Корчын, Сандомір, Люблін. 20 чэрвеня Аляксандр быў ужо ў Берасці, а 29 — у Слоніме. З 2 па 27 ліпеня гаспадар знаходзіўся ў Навагародку, дзе ён сярод іншага прыняў пасольства заволжскага хана Шах-Ахмата.

З Навагародка Аляксандр вырушыў на ўсход. Ужо 31 ліпеня гаспадар быў у Койданаве[120], адкуль выехаў у Менск, дзе з 1 жніўня па 31 верасня размяшчалася яго стаўка. З Менска гаспадар уважліва назіраў за падзеямі пад Смаленскам. Яшчэ калі кароль знаходзіўся ў Польшчы, вялізнае маскоўскае войска на чале з сынам Івана III Дзімітрыем атакавала Смаленск. Былі спустошаны ваколіцы Оршы, Віцебска. Пасля першай няўдалай спробы ўзяць Смаленск штурмам пачалася працяглая аблога горада. Дзеяннямі абаронцаў кіраваў вялікі гетман ВКЛ Станіслаў Пятровіч Кішка. Гарнізон горада, у складзе якога былі і замежныя наймiты, неаднаразова рабіў удалыя вылазкі.

У Менску побач з гаспадаром заўсёды знаходзіўся князь Міхаіл Глінскі і іншыя радныя паны, у тым ліку віленскі біскуп Войцех Табар, гарадзенскі староста Аляксандр Гальшанскі, троцкі ваявода Ян Забярэзінскі, жамойцкі староста Станіслаў Кезгайла, ахмістр Войцех Клочка, лідскі намеснік Юрый Іллініч, ваўкавыскі намеснік Войцех Кучукавіч, пан Юрый Пацэвіч. У Менску інтэнсіўна працавала велікакняская канцылярыя. 16 жніўня, у разгар

[119] Własnoręczne zapiski Erazma Ciołka z lat 1499—1508 // Kwartalnik Historyczny. 1902. R. 16. S. 331; Sochaniewicz K. Itinerarium króla polskiego Aleksandra (29 listopada 1501 do 19 sierpnia 1506) // Sprawozdania z czynności i posiedzeń Polskiej Akademji Umiejętności. T. 27. 1922. Nr. 5. S. 6.

[120] Sochaniewicz K. Itinerarium króla polskiego Aleksandra... S. 6.

бітвы за Смаленск, смаленскія мяшчане былі на 6 гадоў вызвалены ад выплаты сярэбшчыны[121].

16 верасня смаляне адбілі генеральны штурм, няўдача якога дэмаралізавала маскоўскае войска. У першай палове кастрычніка войска Дзімітрыя вымушана было адступіць. Праціўнік быў адкінуты ад Оршы. На поўначы лівонскі магістр Вальтэр фон Плетэнберг разбіў маскоўскае войска каля Смольнага возера[122]. Пасля адыходу варожага войска ад Смаленска двор Аляксандра вярнуўся ў Вільню.

Як бачым, дзеянні саюзнікаў былі зноў нескаардынаванымі, што не дала магчымасці пераламіць ход кампаніі 1502 г. З-за адсутнасці актыўных баявых дзеянняў з боку войска ВКЛ усе поспехі хаўруснікаў па зброі не мелі сур'ёзнага выніку. Больш таго, хаўруснікі панеслі сур'ёзныя страты. Улетку 1502 г. Заволжская Арда фактычна перастала існаваць. Лёс жа заволжскага хана Шах-Ахмата ўвогуле аказаўся надзвычай трагічным. Не атрымаўшы падтрымкі з боку вялікага князя літоўскага, Шах-Ахмат стаў ахвярай крымскага хана Менглі-Гірэя, які зімой 1501—1502 гг. разбіў яго і авалодаў усімі яго ўлусамі. Заволжскае ханства спыніла сваё існаванне. Сам жа Шах-Ахмат са сваім братам Хазакам, некаторымі ўланамі і князямі збег да кіеўскага ваяводы Дзімітрыя Пуцяціча. Пазней ён скіраваўся ў Белгарад-Чарнаморскі. Ён шукаў там дапамогі супраць крымскага хана, але не атрымаў яе і вярнуўся ў Кіеў. Па загадзе Аляксандра Ягелончыка ён быў неўзабаве адпраўлены ў Вільню, дзе і быў інтэрніраваны[123].

Перспектывы далейшага змагання станавіліся цьмянымі. Адчуваўся брак вопытных военачальнікаў, большасць з якіх на той момант знаходзілася ў маскоўскім палоне. Пасля катастрофы на Вядрошы летам 1500 г. гаспадарскае войска было няздольнае весці актыўныя наступальныя дзеянні[124]. У ходзе кампаніі 1501—1502 гг. яно вымушана было абмяжоўвацца абаронай. Абараняліся літвіны паспяхова. Вораг так і не авалодаў Смаленскам і Мсціславам, якія доўгі час знаходзіліся ў аблозе[125].

У выніку хаўруснікі былі змушаны пайсці на замірэнне са сваім праціўнікам. Але і апошні вычарпаў амаль усе рэсурсы для працягу збройнай барацьбы. У гэтых умовах пачаліся мірныя перагаворы.

---

[121] Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 6 (1494—1506): Užrašymų knyga 6 / Parengė A. Baliulis. Vilnius, 2007. P. 283.

[122] Гудавичюс Э. История Литвы… С. 506.

[123] ПСРЛ. Т. 35. С. 169.

[124] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 205—206.

[125] ПСРЛ. Т. 35. С. 168.

Ролю пасярэдніка ў іх узяў на сябе старэйшы брат Аляксандра Казіміравіча — венгерскі і чэшскі кароль Уладзіслаў II. Перагаворы распачаліся ў Маскве 10 сакавіка 1503 г. Аднак бакам так і не ўдалося заключыць мірнае пагадненне. Толькі дзякуючы прадстаўніку караля-пасярэдніка Жыгімонту Сантаю бакі заключылі перамір'е тэрмінам на 6 гадоў. У выніку да Масквы адышлі ўсе тыя землі, якія былі захопленыя ў 1500 г. Дамова 1503 г. прадугледжвала вольны гандаль паміж дзяржавамі, вольны праезд і пропуск паслоў. Аднак дамоўленасць аб абмене палоннымі так і не была дасягнута[126].

## 1.1.15. Татарскі напад 1502 г.

Калі на ўсходнім фронце наступіла перамір'е, на поўдні, наадварот, скончылася кароткачасовае зацішша, выкліканае збройным канфліктам паміж Перакопскай і Заволжскай Ордамі. Пасля таго, як заволжскі хан Шах-Ахмат быў разбіты крымскім ханам Менглі-Гірэем, на паўднёвых межах ВКЛ ізноў усталявалася напружанасць. Спачатку Менглі-Гірэй распачаў своеасаблівую псіхалагічную атаку супраць караля Аляксандра. Крымскі пасол, які прыбыў у Навагародак у ліпені 1502 г., з гонарам заявіў ад імя свайго ўладара аб разгроме хана Заволжскай Арды. Дыпламатычны прадстаўнік зрабіў асаблівы націск на тое, што «заволжскі хан пазбаўлены ўсяго, што ён толькі меў, што ён быў і ёсць даннікам крымскага хана, а сам крымскі хан, які з'яўляецца вялікім і магутным ханам, атрымаўшы ўладанні свайго ворага, стаўся такім чынам ханам дзвюх ордаў»[127]. Пасля канстатацыі магутнасці і сілы крымскага хана пасол прапанаваў гаспадару заключыць мірнае пагадненне, спасылаючыся на старыя традыцыі: «братэрства і сяброўства заўжды існавалі паміж польскімі каралямі і ханам і ягонымі продкамі, чаго і сам хан стала жадаў»[128]. Да таго ж, працягваў пасол, хан добра ведае, што кароль меў хаўрус з заволжскім ханам не супраць Крыма, а Масквы, і менавіта з гэтай прычыны ён «устрымліваецца сам і стрымлівае сваіх падданых ад нападаў і рабавання каралеўскіх уладанняў»[129]. У якасці доказу прыхільнасці гаспадара да міру з Крымам пасол прасіў выслаць у Крым пасольства на чале з кіеўскім ваяводам Дзімітрыем Пуцяцічам.

---

[126] СИРИО. Т. 35. С. 400—412.

[127] «Imperator Zavolhensis exitus est omnibus, quae habuit, erat et est ribaldus imperatoris Precopiensis. Idem imperator Precopiensis, magnus et potens imperator, recepit unam alteram hostis suis potentiam, sic factus duplicis hordae imperator» (AA. S. 106).

[128] «Fraternitatem et amicitiam semper fuisse inter reges Poloniae et imperatorem suosque praedecessores, quam etiam imperator ipse semper quaesivit» (AA. S. 105).

[129] AA. S. 106.

Наколькі словы ханскага пасла, што хан устрымліваецца сам і стрымлівае сваіх падданых ад нападаў на землі Кароны і ВКЛ, адпавядалі рэчаіснасці, засведчылі падзеі наступных дзён. Не паспеў крымскі пасол пакінуць стаўку Аляксандра ў Новагародку, як да яго прыйшлі весткі аб уварванні крымскіх татараў на Валынь[130]. Праследаванне наезнікаў узначаліў сам кіеўскі ваявода Дзімітрый Пуцяціч, той самы Пуцяціч, якога так чакалі, але не дачакаліся ў Крыме. Кароль Аляксандр выказваў боязь, што татары з вялікімі сіламі могуць праз нейкі час уварвацца на землі Кароны[131]. Манарх заклікаў выкарыстаць шляхту і найманых жаўнераў для абароны краю. Сваю боязь кароль паўтарыў у лісце да кардынала Фрыдэрыка[132].

Аляксандр Казіміравіч меў рацыю. У 1502 г. у дзень Св. Архангела Міхаіла не менш чым 4 тысячы татараў уварваліся на Русь і суседнія землі Польскага каралеўства. Былі спалены Жэшаў, Яраслаў, Белз, Дубніца, Кунаў, Апатаў і іншыя населеныя пункты[133]. З вялікім здабыткам і палонам татары бесперашкодна адышлі ў Крым. Больш паспяховымі былі дзеянні валынскага баярства. Мясцовыя воіны на чале з луцкім намеснікам князем Сямёнам Юр'евічам Гальшанскім знішчылі 350 і ўзялі ў палон 50 татараў і туркаў[134]. Згодна са звесткамі, атрыманымі ад шпегаў (*avisata per exploratores*), у нападзе на Валынь удзельнічала каля 1000 татараў і туркаў. Самі палонныя прызналіся, што палова захопнікаў прыбыла з чарнаморскага Белгарада. Менглі-Гірэй, аднак, апраўдваўся перад каралём Аляксандрам, што гэты напад быў зроблены без яго волі[135]. Ён у чарговы раз пацвердзіў сваю прыхільнасць мірнаму ўрэгуляванню адносін з Каронай і ВКЛ.

### 1.1.16. Крымскі напад 1503 г. Руйнаванне Клецка

29 красавіка 1503 г. у Вільні з'явіўся чарговы крымскі пасол. Прадстаўнік Менглі-Гірэя заявіў, што толькі ў тым разе, калі Карона і ВКЛ пагодзяцца выплачваць 10 тысяч залатых штогод, можа быць заключаны

[130] Кароль і вялікі князь Аляксандр да кардынала Фрыдэрыка, Новагародак, 14.07.1502 г. (AA. S. 109—110).

[131] «Verendum est paucis post diebus, si modo hactenus quiescent, ipsos (крымскія татары. — *У. К.*) cum magnis copiis regnum invasuros» (AA. S. 110).

[132] Кароль і вялікі князь Аляксандр да біскупа і кардынала Фрыдэрыка, Менск, 5 жніўня 1502 г. (AA. S. 125).

[133] Lectiones variantes primae editionis (anni 1519) Matthiae de Miechow Chronicae Polonorum // Kroniki Bernarda Wapowskiego (1480—1535) / Wyd. J. Szujski (= Scriptores Rerum Polonicarum. T. 2). Kraków, 1874. S. 275.

[134] AA. S. 125.

[135] LM. Užrašymų knyga 5. P. 220.

вечны мір. Пасол дадаў, што адказ на гэтыя прапановы павінен быць дадзены да Вялікадня 1503 г. (16 красавіка), але пакольki ён прыехаў ужо пасля гэтага тэрміну і, адпаведна, не здолее ў прызначаны час прынесці дамоў адказ, ён баіцца, спасылаючыся на словы самога хана, каб татары не прычынілі шкоды каралеўскім уладанням[136]. Відавочна, Менглі-Гірэй, карыстаючыся слабасцю Аляксандра, папросту шантажыраваў яго.

Кароль і вялікі князь Аляксандр сур'ёзна паставіўся да ўльтыматуму. Надта свежымі былі раны мінулагодняга спусташальнага нападу на каронныя землі. Не марнуючы часу, гаспадар адразу звярнуўся да паноў Кароны з заклікам рыхтавацца да паспалітага рушання[137]. Асаблівая ўвага надавалася адсочванню руху татарскіх аддзелаў у памежных раёнах. Былі накіраваныя паслы да памежных старостаў, у першую чаргу да львоўскага і холмскага, якім загадвалася размясціць шпегаў на важнейшых татарскіх шляхах. Львоўскі староста павінен быў трымаць сваіх шпегаў каля Сарокі ў Валашскай зямлі і ў некаторых іншых месцах. Шпегі хелмскага старосты мусілі знаходзіцца ў Чаркасах і іншых месцах, дзе была размешчана гаспадарская старожа. У выпадку з'яўлення варожых аддзелаў памежныя старосты павінны былі тэрмінова паведамляць аб рухах ворага ў Кракаў. Атрымаўшы такія звесткі, вялікі каронны гетман мусіў неадкладна арганізаваць ваенную выправу супраць татараў[138]. Адначасова з мерамі ваеннага характару былі прынятыя і дыпламатычныя захады. У Крым быў накіраваны велікакняскі ганец для абмеркавання ўмоў мірнага пагаднення[139]. Шляхам перагавораў Аляксандр Казіміравіч спадзяваўся адтэрмінаваць мяркуемы татарскі напад на землі Кароны[140]. У канцы мая 1503 г. ад шпегаў сталі паступаць весткі пра рух татарскіх чамбулаў на межах Кароны[141]. Тут было абвешчана паспалітае рушанне. Была прызначана дата збору ўсіх сіл Кароны. Тым, хто не з'явіцца, пагражала смяротнае пакаранне і канфіскацыя маёнткаў. Здавалася, што ўсё было падрыхтавана для адпору ворагу.

---

[136] AA. S. 271.

[137] AA. S. 272.

[138] AA. S. 272.

[139] LM. Užrašymų knyga 5. P. 223—224.

[140] Радныя паны ВКЛ да радных паноў Кароны, другая палова лістапада 1503 г.: «R. Mtas cum dominiis suis consilii, audita ipsius legatione (пасольства крымскага хана. — *У. К.*), eundem nuntium ac interpretem suum cum eo ad imperatorem in eadem re statim misit, ut iam imperator filios et gentes suas retineret, ne hominibus subditis in confinibus agentibus aliqua damna transferrent, donec R. M. Cum V. Dbus utriusque consilii tam regni Poloniae quam ducatus Lithuaniae, captato desuper consilio, oratores suos ad eum mitteret» (AA. S. 361).

[141] AA. S. 273.

Аднак татары ўдарылі зусім не там, дзе іх чакалі. Яны скіравалі свой асноўны ўдар на землі ВКЛ[142]. Напад адбыўся ў другой палове жніўня 1503 г. Сваім нечаканым прыходам татары вынішчылі памежную старожу, якая, верагодна, нават не паспела папярэдзіць гаспадарскіх ураднікаў. Таму татарскі напад і аказаўся абсалютна нечаканым. Нападнікам быў фактычна адкрыты прамы шлях у глыб ВКЛ. Найвялікшай перашкодай на шляху татарскага войска была рака Прыпяць. Татарам, аднак, удалося знайсці броды і ўпершыню пераправіцца праз яе ў раёне Мазыра[143].

Пасля татары хутка рушылі ў напрамку Слуцка. Адлегласць паміж Мазырам і Слуцкам яны пераадолелі за адзін дзень. Вечарам 30 жніўня 1503 г. 6-тысячнае войска сына крымскага хана Біці-Гірэя ўжо стаяла пад сценамі слуцкага замка. З'яўленне вялізнага татарскага войска было поўнай нечаканасцю як для слуцкага князя Сямёна Міхайлавіча Алелькавіча, так і для мясцовага насельніцтва. Хроніка Быхаўца яскрава перадае здзіўленне князя Сямёна: «Kniaź że Semen Michaylowicz w tot czas był w Slucku y ne wedaiuczy ni o czom, tolko wozrywszy z horoda na misto za reku Słucz z cerkwy swiatoho Jurja, y uwideli tatar skaczuczych na koniach, y muży y żeny imaiuczy y stynaiuczy. Y widewsze syia naprasnoie prychożdenije pohanskoie kniaź Semen Michaylowicz z tymi, kotoryie s nim byli wo horody, podywilisia takowomu nahłomu newiedomomu prychożdeniju ich, iże odnoho dnia pereszedsze reku Prypiat, y toho ż dnia pryszli k Slucku dwadcat y piat mil»[144].

Татары не распачалі аблогу і штурм Слуцка, відавочна, ведаючы пра ваенны патэнцыял крэпасці. Хутчэй за ўсё, аблога замка нават не ўваходзіла ў іх планы. Татараў цікавілі палонныя і здабыча. Таму царэвіч Біці-Гірэй загадаў разбіць лагер каля Слуцка, у мястэчку Умаль[145], адкуль разаслаў загоны ў розныя накірункі. Большасць загонаў рушыла ў напрамку Капыля, Клецка і Нясвіжа. Тады ж быў спалены клецкі замак[146], а Клецкае княства ўшчэнт спустошана. Мноства людзей трапілі ў татарскі палон. Арганізаваць эфектыўны супраціў ворагу не ўяўлялася магчымым. Клецкія баяры былі або забітыя, або шукалі паратунку разам з іншымі жыхарамі воласці

[142] Радныя паны ВКЛ да радных паноў Кароны, другая палова 1503 г.: «Idem imperator Przekopski, sicut ille qui christianos sua astutia solitus est circumvenire, intelligens hominess suae sermae R. Mtis secure existere, mox non modicum gentium suarum exercitum in dominuia magni ducatus Lithuaniae misit» (AA. S. 361).

[143] ПСРЛ. Т. 35. С. 169. Гл. таксама Хроніку Літоўскую і Жамойцкую: ПСРЛ. Т. 35. С. 101.

[144] ПСРЛ. Т. 35. С. 169.

[145] Тамсама.

[146] Тамсама.

ў лясах і балотах. Верагодна, клецкі князь Іван Васілевіч Яраславіч, які адначасова з'яўляўся пінскім князем, у часе нападу знаходзіўся ў сваёй галоўнай рэзідэнцыі Пінску. Частка загонаў пайшла ў бок Менска і Свіслачы. Некаторыя татарскія аддзелы дзейнічалі ў ваколіцах Пінска і Турава. Радныя паны ВКЛ пісалі да сваіх польскіх калег, што татары пустошылі землі ВКЛ і ўздоўж, і ўпоперак[147].

### 1.1.17. Слуцкі князь Сямён Міхайлавіч

Князь Сямён Міхайлавіч апынуўся ў цяжкім становішчы. Слуцкі замак быў блакіраваны і адрэзаны ад воласці. У самім замку меўся толькі невялікі гарнізон. Татары захапілі амаль усіх коней, без якіх эфектыўны супраціў быў немагчымы[148]. Алелькавічу прыходзілася спадзявацца выключна на дапамогу звонку. У Вільню да караля і вялікага князя Аляксандра быў высланы ганец[149]. Яму ўдалося паспяхова праслізнуць скрозь татарскую старожу і дабрацца да сталіцы дзяржавы. Аляксандр Ягелончык, пачуўшы пра цяжкае становішча князя, выслаў яму на дапамогу почат сына падольскага ваяводы Яна Бучацкага, а таксама свой надворны почат, да якіх далучыў аддзелы імклівых рацаў[150].

Аднак дапамога прыбыла позна. Татарскія загоны, што дайшлі нават да Ішкалдзі, ужо вярнуліся з вялікім палонам у кош пад Слуцкам і пачалі адыход. Калі гаспадарскае войска прыбыла ў Слуцк, галоўныя татарскія сілы ўжо пачалі адыход у Крым. Толькі асобныя татарскія аддзелы ўсё яшчэ блукалі на свой страх і рызыку па палескіх балотах і лясах. Не абышлося без непаразуменняў у гаспадарскім войску. У Слуцку мусіў адбыцца нейкі канфлікт паміж вайсковымі камандзірамі, якіх Аляксандр прыслаў на дапамогу. У выніку частка гаспадарскіх дваран, калі даведалася пра адыход татараў, вярнулася ў Вільню[151]. Невядома, ці засталіся ў Слуцку пасля адыходу гаспадарскіх дваран рацы і які ўдзел яны прынялі ў пераследаванні татарскага войска.

Увесь цяжар пагоні за татарамі лёг на плечы мясцовых князёў і ўраднікаў. Князь Сямён Міхайлавіч з падольскім ваяводзічам і з асобнымі гаспадарскімі дваранамі дагналі і знішчылі татарскі аддзел

[147] AA. S. 361.

[148] ПСРЛ. Т. 35. С. 169.

[149] Тамсама.

[150] Тамсама.

[151] Тамсама. С. 169—170.

у 150 чалавек на рацэ Уша, у 6 мілях за Бабруйскам[152]. Восенню таго ж года адбыўся бой паміж войскам, якім камандавалі сын пінскага і клецкага князя Фёдар Іванавіч Яраславіч, князь Юрый Іванавіч Гальшанскі-Дубровіцкі і князь Рыгор Глінскі, з татарамі ў 6 мілях ад Оўруча, на рацэ Вуж[153]. На гэты раз ваеннае шчасце было на баку татараў. Войска князёў было разбіта; князь Рыгор Глінскі і пан Гарнастай загінулі.

У выніку татарскага набегу дзяржава панесла вялізныя страты. Былі разбураны і спалены дзясяткі населеных пунктаў. Было забіта мноства людзей: сялян, гараджан і баяр. І самае галоўнае, быў захоплены і выведзены ў Крым вялікі палон. Пасля набегу 1503 г. абязлюдзелі цэлыя валасці. Найбольшыя страты панеслі цэнтральныя землі ВКЛ: ваколіцы Слуцка, Капыля, Клецка і Нясвіжа. Ніколі дагэтуль яны не неслі такіх ахвяр.

### 1.1.18. Мур вакол Вільні

Татарская пагроза адчувалася настолькі востра, што ўлады вымушаны былі пачаць будаўніцтва абарончага муру вакол сталіцы дзяржавы Вільні. Згодна ранейшай гістарыяграфічнай традыцыі, якая брала свой пачатак ад Тэадора Нарбута, узвядзенне муру пачалося 23 красавіка 1498 г. Аднак пазнейшыя даследаванні паказалі, што дакумент пра пачатак будаўніцтва абарончых умацаванняў у 1498 г. з'яўляецца фальсіфікатам, магчыма, самога Нарбута[154].

Больш пэўнымі з'яўляюцца сведчанні пра пачатак узвядзення абарончага муру вакол Вільні ў 1505 г. Пачатак будаўніцтва звязваецца са спусташальным татарскім нападам летам 1505 г., калі чамбулы Менглі-Гірэя пустошылі ваколіцы Слуцка, Навагародка, даходзячы ледзь не да Вільні. Як сведчыць Хроніка Літоўская і Жамойцкая, «Того ж року вилняне и панове литовские, тым страхом стрвожены, мур около Вилня обвели и замки обмуровали»[155]. 6 верасня 1505 г. Аляксандр Казіміравіч выдаў прывілей, якім вызваліў віленскіх мяшчан на адзін год ад вайсковай службы пры ўмове ажыццяўлення будаўніцтва абарончага муру іх коштам[156].

---

[152] ПСРЛ. Т. 35. С. 169.

[153] Тамсама.

[154] Lowmianski H. Sfalszowany opis obwarowania miasta Wilna //Ateneum Wilenski. R. 3 (1923). Zeszyt 9. S. 84

[155] ПСРЛ. Т. 32. С. 101.

[156] Собрание древних грамот и актов городов: Вильны, Ковна, Трок, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Ч. 1. Вильно, 1843. С. 18—19; Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Т. 1. Менск, 1928. С. 191—192.

Будаўніцтва працягвалася, па меншай меры, да 1522 г., пра што сведчыць адпаведны прывілей Жыгімонта Старога[157]. Жыгімонт Герберштайн, які наведаў Вільню ў 1526 г., адзначыў: «Vilna porro nunc est muro cincta» (*Вільня ж цяпер абведзена мурам*)[158]. Гарадскія ўмацаванні першапачаткова мелі чатыры вежы: Вілейскую, Троцкую, Рудніцкую і Вострую (Медніцкую). Абарончы мур павінен быў абараніць сталіцу ад нападу з усходу і поўдня. З поўначы Вільню абаранялі Верхні і Ніжні замкі. У Верхнім замку знаходзіўся Арсенал, створаны Аляксандрам Казіміравічам. Тут меўся вялікі выбар зброі і гармат. У сукупнасці з прыроднымі перашкодамі віленскія замкі і абарончы мур павінны былі гарантаваць жыхарам горада бяспеку перад абліччам татарскага або нават маскоўскага нападу. Падзеі кампаніі 1512—1522 гг., калі ваяводы Васіля III ледзь не дайшлі да Вільні, пацвердзілі, што маскоўская пагроза з'яўляецца рэальнасцю.

На жаль, невядомы імёны дойлідаў, якія ўзводзілі абарончы мур вакол Вільні. Можна меркаваць, што сярод іх былі як мясцовыя, так і замежныя ўмельцы. Мікола Шчакаціхін выказаў меркаванне пра беспасрэдны ўплыў кракаўскага абарончага дойлідства канца XV — пачатку XVI стст. Прыкладна ў той жа час (1498 г.) быў узведзены кракаўскі барбакан[159]. Аднак канструкцыйная сістэма віленскіх абарончых збудаванняў усё ж такі адрозніваецца ад кракаўскай. Ускоснае дачыненне да будаўніцтва віленскага абарончага муру мог мець князь Міхаіл Глінскі. Апошні, які пабываў у многіх краінах Еўропы, меў магчымасць на ўласныя вочы бачыць многія абарончыя збудаванні і розныя сістэмы фартыфікацыі. Ён не мог не расказваць гаспадару пра тыя абарончыя збудаванні, якія бачыў у Еўропе.

Сам Міхаіл Глінскі меў у сталіцы ВКЛ Вільні мураваны дом (domus lapideus), які падараваў яму вялікі князь Аляксандр. Дом гэты знаходзіўся на замкавым пляцы (in platea castrensi), насупраць парафіяльнага касцёла Святога Яна (ex opposito ecclesiae parochialis sancti Ioannis sitam). Пасля выезду князя Міхаіла ў Масковію дом перайшоў ва ўласнасць Канстанціна Іванавіча Астрожскага[160].

[157] Собрание древних грамот и актов городов: Вильны, Ковна, Трок... Ч. 1. С. 26—28; Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. С. 191.

[158] Герберштейн С. Записки о Московии. Т. 1. С. 462.

[159] Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. С. 195.

[160] Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie / Wyd. Z. L. Radziszewski i in. T. 3: (1432—1534). Lwów, 1890 (далей — AS). S. 58.

## 1.1.19. Крымскі смерч 1505 г. Аблога Менска

Паспяховы і беспакараны набег на землі ВКЛ у 1503 г. пераканаў хана Менглі-Гірэя ў слабасці абароны дзяржавы і натхніў яго на новыя авантуры. Аднак хітры ліс Менглі-Гірэй не адразу прыступіў да ажыццяўлення задуманага плана. Падрыхтоўку да новага набегу на землі Кароны і Княства ён прыкрываў дыпламатычнымі перагаворамі, ініцыятарам якіх выступаў польскі кароль і вялікі князь літоўскі. Наступны 1504 г. прайшоў у інтэнсіўных і напружаных дыпламатычных зносінах паміж Вільняй і Крымам. На працягу года ў ханскай стаўцы пабывалі 4 гаспадарскія пасольствы. Крым наведалі гаспадарскія дваране Фёдар Калантай, Леў Цішкавіч, Грыцка Быкоўскі[161], а таксама бабруйскі намеснік князь Фёдар Пронскі[162]. Вільню наведаў ханскі пасол Хажам-Бердзей[163]. Перагаворы, аднак, не далі ніякага выніку. Бакі так і не ўзгаднілі памер даніны, якую гаспадар мусіў плаціць хану за мір, а таксама характар закладніцтва крымскага мурзы Бахціяра Даўлетэкавіча падчас планаванага пасольства кіеўскага ваяводы Дзімітрыя Пуцяціча. Апошні, так і не дачакаўшыся прыезду ганаровага крымскага закладніка, неўзабаве памёр[164].

Перагаворы былі працягнуты ў наступным 1505 г. У пачатку года ў Крым выехала пасольства на чале з гаспадарскім дваранінам Дзядком, а таксама татарскім талмачом і пісарам Рэчжыпам[165]. Дыпламатычную перапіску з ханам Менглі-Гірэем падтрымлівалі таксама саноўнікі ВКЛ, уключаючы надворнага маршалка князя Міхаіла Глінскага[166].

У пачатку лета 1505 г. Менглі-Гірэй прыйшоў да высновы, што настаў зручны момант для новага набегу на землі Русі і Літвы. У канцы чэрвеня да хана павінны былі дайсці весткі ад яго інфарматараў у Кароне пра апаплексічны ўдар, які стаўся з каралём у Радаме 10 чэрвеня 1505 г.[167]. Даходзілі да Менглі-Гірэя і няпэўныя чуткі пра канфлікт у асяродку паноў-рады ВКЛ адносна характару дынастычных правоў Ягайлавічаў у ВКЛ у сувязі з растучым перакананнем,

---

[161] LM. Užrašymų knyga 5. P. 223, 225.

[162] Stosunki z Mendli-Girejem, chanem tatarów perekopskich (1469—1515): akta i listy / Wyd. K. Pułaski. Kraków—Warszawa, 1881. S. 273.

[163] LM. Užrašymų knyga 5. P. 224.

[164] Дзімітрый Пуцяціч памёр у першай палове 1505 г. (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 118).

[165] Stosunki z Mendli-Girejem... S. 276.

[166] Тамсама. S. 281—282, 274, 284—285; LM. Užrašymų knyga 5. P. 233.

[167] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 121—122.

што кароль і вялікі князь Аляксандр не будзе мець дзяцей. Дынастыя мусіла зрабіць паважныя крокі дзеля забеспячэння велікакняскага трона за каралевічам Жыгімонтам[168].

Думаецца, што ў сувязі з хваробай караля летам 1505 г. мусілі зноў усплыць старыя крыўды і ўзаемная нянавісць сярод радных паноў. Не выключана, што нядобразычліўцы Міхаіла Глінскага маглі ўспрыняць хваробу манарха як сігнал да пераходу да больш актыўных дзеянняў па абароне сваіх правоў. Яны не без падстаў спадзяваліся, што хвароба гаспадара прывядзе да аслаблення пазіцый князя Міхаіла і роду Глінскіх у жыцці дзяржавы. Паноў не задавальняла тое, што клан Глінскіх за апошні час істотна ўзмацніўся. Аднак да адкрытага супрацьстаяння паміж Забярэзінскім і Глінскім справа пакуль яшчэ не дайшла. Абодва ва ўзаемных дачыненнях трымаліся падкрэслена ветліва. Сярод сведак гаспадарскіх актаў, нададзеных у гэты час Яну Забярэзінскаму, значыцца і князь Міхаіл Глінскі[169].

Менглі-Гірэй вырашыў скарыстацца адсутнасцю ў ВКЛ гаспадара і яго прагрэсіруючай хваробай для ажыццяўлення новага буйнамаштабнага нападу. У жніўні 1505 г. 5-тысячнае крымскае войска, на чале якога стаялі тры ханскія сыны, Махмет-Гірэй, Біці-Гірэй і Бурнаш, пераправілася праз Дняпро ў раёне Лоева і рушыла далей у глыб ВКЛ[170]. Махмет-Гірэй пайшоў да Слуцка, а сваіх братоў, Бурнаша і Біці-Гірэя, выслаў да Менска. Практычна аднячасова, 15 жніўня 1505 г. царэвічы разбілі лагеры: Махмет-Гірэй пад Менскам, Бурнаш і Біці-Гірэй пад Слуцкам. З-пад Менска загоны былі пушчаны ў бок Полацка, Віцебска, Друцка і нават Вільні, а з-пад Слуцка — у бок Навагародка. Цэнтральная і ўсходняя часткі ВКЛ трапілі пад удар татарскіх чамбулаў. Не абмінула навала і Клецкае княства, якое другі раз стала на шляху татараў.

Даведаўшыся пра напад татараў на землі Літвы і Русі, Аляксандр Ягелончык, нягледзячы на хваробу, збіраўся выехаць у ВКЛ. Але смерць 30 жніўня 1505 г. маці, каралевы Альжбеты, паўстрымала яго ад выезду на радзіму[171].

Наступствы татарскага набегу 1505 г. былі жахлівымі. Былі знішчаны дзясяткі населеных пунктаў. Татары спалілі пасады Менска і Навагародка, аднак самі замкі засталіся непрыступнымі. Не

[168] Pietkiewicz. K. Wielkie Księstwo Litewskie. S. 116.

[169] Акты Литовской Метрики. Т. 1. Вып. 2 / Собр. Ф. И. Леонтовичем. Варшава, 1897. С. 152.

[170] ПСРЛ. Т. 32. С. 101.

[171] AA. S. 505.

ўдалося татарам узяць і слуцкі замак і пасад. Згодна Хронiцы Ліітоўскай і Жамойцкай і Хронiцы Быхаўца[172], абарону Слуцка ўзначаліла княгіня Настасся, жонка князя Сямёна Міхайлавіча. Не выключана, што сам князь адсутнічаў у замку ў часе татарскага нападу. Як паведамляе Хроніка Быхаўца[173], князь Сямён Міхайлавіч далучыўся да паноў Станіслава Кішкі, Альбрэхта Гаштаўта і Юрыя Немiровіча, якія праследавалі адзін з татарскіх чамбулаў, што адступаў не звыклым шляхам праз Петрыкаў (Петрыкавічы), а праз Грычынскае балота. Татары былі насцігнутыя ўжо за Прыпяццю, у адной мілі ад Давыд-Гарадка, дзе і адбыўся бой. Татары былі разбіты і страцілі ўвесь палон[174]. У ходзе бою загінулі гаспадарскія дваране Рак Масквіч і Жынявой. Бітва пад Давыд-Гарадком была апошняй у ваеннай кар'еры слуцкага князя. Неўзабаве князь Сямён Міхайлавіч Алелькавіч памёр[175].

Пасля татарскага набегу абязлюдзелі многія землі ВКЛ, праз якія прайшлі нападнікі. Пазнейшыя крыніцы гавораць пра 100 тысяч чалавек, якіх татары вывелі ў Крым[176]. Пра спусташэнне рускіх і літоўскіх земляў гаварылася і ў пасланні караля і вялікага князя Аляксандра да велікапольскага сойміка ў канцы кастрычніка — пачатку лістапада 1505 г.[177]. Пасля адыходу татараў пачаўся вялікі мор у Менску і іншых мясцовасцях[178]. Страх перад новымі татарскімі набегамі быў настолькі моцны, што паны-рада і віленскі магістрат пачалі ў канцы 1505 г. узвядзенне абарончага муру вакол сталіцы дзяржавы Вільні[179].

### 1.1.20. Арышт і інтэрніраванне заволжскіх паслоў у 1506 г.

Адразу пасля татарскага нападу ўвосень 1505 г. у Крым выруШыла чарговае гаспадарскае пасольства на чале з панам Якубам

[172] ПСРЛ. Т. 32. С. 101; ПСРЛ. Т. 35. С. 170—171.

[173] Паведамленні Хронікі Быхаўца пра татарскі напад 1505 г., як і пра іншыя набегі, надзвычай непаслядоўныя і блытаныя. Ход падзей можа быць адноўлены толькі ў выніку прыцягнення больш дакладных крыніц.

[174] ПСРЛ. Т. 35. С. 170.

[175] «Toie że oseni misiaca nowembra czetyrnadcaty deń so seredy na czetwer prestawisia błahowirny i chrystolubiwy kniaź Semen Michayłowicz Alexandrowicza Słucki» (ПСРЛ. Т. 35. С. 170).

[176] ПСРЛ. Т. 32. С. 101.

[177] AA. S. 510.

[178] ПСРЛ. Т. 35. С. 170.

[179] ПСРЛ. Т. 32. С. 101.

Івашэнцавічам[180]. У адказ на яго ў канцы 1505 — пачатку 1506 г. у Літву прыбыў пасол Менглі-Гірэя Батуш. Ён меў пры сабе лісты хана да вялікага князя Аляксандра, а таксама надворнага маршалка князя Міхаіла Глінскага і паноў-рады[181]. У якасці ўмовы вечнага міру Менглі-Гірэй патрабаваў арышту былога хана заволжскіх татараў Шах-Ахмата, а таксама паслоў, што прыбылі ў ВКЛ ад нагайскіх мурзаў. Хан настойваў, каб гаспадарскі вялікі пасол быў накіраваны ў Крым не пазней зімы. У якасці вялікага пасла Менглі-Гірэй, спасылаючыся на традыцыю дыпламатычных зносін паміж Крымам і ВКЛ, прапаноўваў асобу троцкага ваяводы або іншага роўнага яму саноўніка ў выпадку, «коли троцкии воевода за которыми делы не поспеетъ до насъ прыехати»[182].

З прычыны ад'езду ў пачатку студзеня 1506 г. караля Аляксандра на каронны сойм у Любліне[183] перагаворы праходзілі вельмі павольна. Толькі пасля вяртання гаспадара ў ВКЛ у пачатку красавіка 1506 г. яны актывізаваліся[184]. Прапановы Менглі-Гірэя выклікалі сярод паноў-рады неадназначную рэакцыю. Толькі пасля гарачых спрэчак кароль і вялікі князь прыняў рашэнне змясціць заволжскага хана Шах-Ахмата ў Ковенскі замак, а яго мурзаў, князёў і слуг разам з нагайскімі пасламі размеркаваць па іншых гаспадарскіх месцах і шляхецкіх маёнтках.

Заволжскія татары былі раздадзены на парукі некаторым літоўскім панам і служылым татарам. Юрый Андрэевіч Салагубавіч атрымаў татарына Ажбердзея, Ян Юр'евіч Забярэзінскі — Мамкажу і Башыка, Марцін Храптовіч — Кудаяра і Інікліка (якіх пазней аддаў гаспадару), Іван Сапега — 12 слуг цара Шах-Ахмата. Астатнія заволжскія паслы і слугі Шах-Ахмата былі размеркаваныя сярод служылых татараў ВКЛ. Так, новагародскі ўлан і князь Ахмет, а таксама Турун, Адка, Бекім Уланавічы ўзялі на парукі свайго пляменніка Ікібека ўлана. Маршалкі Тэмеш і Урус узялі да сябе шурына і зяця нейкага Абдулы Богуша, а таксама Кочара. Князь Касым Сандукавіч разам з братам Сездою прынялі двух каморнікаў Шах-Ахмата, Дэрмаша і Чаратая. Князь Іван Кадышавіч і яго брат Андрэй

[180] Stosunki z Mendli-Girejem... S. 281—282.

[181] LM. Užrašymų knyga 5. P. 231—234.

[182] LM. Užrašymų knyga 5. P. 234.

[183] У Любліне гаспадар знаходзіўся з 15 студзеня па 18 сакавіка 1506 г. (Sochaniewicz K. Itinerarium króla polskiego Aleksandra.., S. 7).

[184] У ВКЛ Аляксандр Ягелончык вярнуўся 7 красавіка 1506 г. (Sochaniewicz K. Itinerarium króla polskiego Aleksandra... S. 7).

прытулілі царскага трубача. Талмач Анакоза Рамадан узяў мулу Дэрбішэле Еваша. Усяго па панскіх і татарскіх маёнтках было размеркавана звыш 60 чалавек[185].

Не былі забытыя нагайскія і астраханскія татары. Іх размеркаваннем займаўся гаспадарскі дваранін Пятрашка Епімахавіч. Пуньскія баяры Панька і Еська ўзялі да сябе 7 татараў. Князь Прыхабскі і Івашка Глябовіч размясцілі ў Мейшагале 4 татараў. Таксама атрымалі татараў: Мітка Храптовіч — да Доўгаў, Іван Янкавіч — да Лынгмянаў, Дашка, пляменнік Барыса Сямёнавіча (Глінскага?), — да Немянчына, наўгародскія баяры Аліфер і Юшка Вязьміцін — да Вены (!), Пуцята Палачанін і Сенька Тверыцін — да Скерстамонаў, дзяк Мітка і Васіль Масквіцін — да Стаклішкаў. Татараў далі Федзьку Храптовічу, смаленскаму старасце Аўрааму, Пятрашку Епімахавічу. Нейкі бакалаўр Ганус атрымаў на парукі хворага татарына для далейшага лячэння[186]. Як заўжды, самы дзейсны ўдзел у размеркаванні інтэрніраваных татараў узялі мясцовыя служылыя татары. Улан Ахмет Асанчуковіч узяў на парукі нагайскага пасла Усейна Хажака. Харужы, князь Асман, а таксама маршалак Асан прынялі Кітмахмета і нагайскага пасла Сюліменя са слугой. Талмач Айдар Малы атрымаў Емурчэя і Касаіта. Талмач Легуш узяў да сябе Садулу. Нарэшце, Айдар Хазбеевіч прыняў Ізмаіла і Мольну[187].

Арышт Шах-Ахмата і нагайскіх паслоў мусіў адбыцца ў маі — пачатку чэрвеня 1506 г. Хроніка Вапоўскага сведчыць, што «Менглі-Гірэй, Таўрычаскі хан, даведаўшыся пра арышт заволжскага хана Шахмата (sic), не марудзячы выслаў з Таўрыкі ў маі месяцы вялізнае татарскае войска, якое спустошыла Літву, Падолле і Русь»[188]. Згодна з Хронікай Мацея Мяхоўскага, гэты татарскі напад мусіў адбыцца недзе каля Вялікадня[189]. Ва ўсякім разе, у канцы чэрвеня — пачатку ліпеня 1506 г. знаходжанне хана пад арыштам у Ковенскім замку разглядалася як неаспрэчны факт[190]. Даныя Літоўскай Метрыкі, у першую чаргу Кнігі запісаў 6, даюць падставу сцвярджаць, што ў пачатку ліпеня 1506 г. усе татары былі

[185] LM. Užrašymų knyga 6. P. 68—69.

[186] Тамсама. P. 70.

[187] Тамсама.

[188] Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 65.

[189] Lectiones variantes primae editionis (anni 1519) Matthiae de Miechow Chronicae Polonorum. S. 279.

[190] Дату ante quem арышту заволжскага хана Шах-Ахмата і нагайскіх паслоў можна ўстанавіць на падставе тагачаснай карэспандэнцыі: Ян Ласкі да Лукаша Ватцэнродэ, 12 ліпеня 1506 г. (AA. S. 539).

размеркаваныя па шляхецкіх і татарскіх маёнтках. Услед за вопісам заволжскіх татараў, адданых на парукі, ідзе прывілей Яну Юр'евічу Забярэзінскаму на маёнтак Неманойці, які датуецца 5 ліпеня 1506 г.[191]. Дарэчы, сярод сведак надання гэтага прывілея прысутнічаў князь Міхаіл Львовіч Глінскі.

Нягледзячы на чарговы набег, які крымскія татары здзейснілі на каронныя землі, у Польшчы дастаткова аптымістычна ацэньвалі перспектывы супрацоўніцтва з ханам у ваеннай сферы. Каронны канцлер Ян Ласкі ў лісце ад 12 ліпеня 1506 г. да вармінскага біскупа Лукаша Ватцэнродэ каментаваў арышт заволжскага хана і нагайскіх паслоў наступным чынам: «Мы маем нарэшце з гэтай нагоды надзвычайную справу з (ханам. — *У. К.*) Перакопа, які з лікаваннем успрыняў гэтую навіну, абяцаючы нам вечны мір і заўжды быць гатовым выступіць у будучым з усёй сваёй сілай, куды толькі не пакліча яго Каралеўская Вялікасць, і асабліва абяцаў ён утаймаваць і падпарадкаваць маскавітаў, каб без нашага войска і без нашай працы гэтыя (крымскія татары. — *У. К.* ) рабілі ўсю справу каралеўству і каб усё было падпарадкавана гэтай мэце»[192]. Магчыма, у Кароне лічылі, што апошні татарскі напад быў выпадковасцю, на той падставе, што хан і яго мурзы маглі яшчэ не ведаць пра арышт заволжскага хана Шах-Ахмата, а магчыма, у чарговы раз цешылі сябе ілюзіямі.

### 1.1.21. Аляксандр Казіміравіч збіраецца ў Польшчу

Кароль Аляксандр не меў такіх ілюзій адносна крымскага хана. Выканаўшы ўсе справы ў ВКЛ, ён пачаў збірацца назад у Карону[193]. Караля мусілі паклікаць у Польшчу ўсё тыя ж пільныя справы, якім Аляксандр прысвяціў шмат увагі перад сваім ад'ездам у ВКЛ у пачатку вясны 1503 г. Яшчэ на каронным вальным сойме ў Любліне 2 сакавіка 1506 г. кароль выдаў Ваенны статут для Малой Польшчы і Русі на выпадак уварвання татарскіх чамбулаў[194]. Літаральна перад самым ад'ездам з Любліна ў ВКЛ, 18 сакавіка 1506 г., кароль прызначыў кракаўскага кашталяна Спытка з Яраслава камандуючым усім паспалітым рушаннем Малой Польшчы і Русі[195]. Яго памочнікамі сталі сандамірскі ваяво-

---

[191] LM. Užrašymų knyga 6. P. 69.

[192] AA. S. 539.

[193] Ян Ласкі да Лукаша Ватцэнродэ, 12 ліпеня 1506 г.: «Proptereaque rebus in bono statu locatis iam Mtas Ria reditura est ad regnum, ventura propediem Cracoviam» (AA. S. 539).

[194] AA. S. 522—525.

[195] Тамсама. S. 528—529.

да Мікалай Камянецкі і каралеўскі маршалак Станіслаў Хадэцкі. Адначасова былі прыняты меры для ўзмацнення рускіх земляў Кароны[196].

Кароль ехаў у Польшчу ўжо пасля чарговага татарскага нападу, які адбыўся ў маі 1506 г. Пазнейшыя храністы малююць страшэнную карціну запусцення, якое наступіла пасля адыходу татараў[197]. Гэта стэрэатыпныя апісанні, асабліва там, дзе размова ідзе пра колькасць людзей, выведзеных у татарскі палон[198].

Пагроза каронным землям была асноўнай прычынай, што вымусіла Аляксандра Ягелончыка ў сярэдзіне ліпеня 1506 г. вырушыць у Польшчу. Відавочна, кароль лічыў, што ў той момант татары ў большай ступені пагражалі Кароне, а не ВКЛ. Каралеўскі двор суправаджала адмысловае коннае войска на чале з надворным маршалкам Міхаілам Глінскім. Пазней склад войска планавалася давесці да 6 тысяч коннікаў. Гэта войска мусіла выступіць на старожу ў рускіх землях[199]. У разе татарскага нападу яно павінна было прыкрыць памежныя раёны як Польшчы, так і ВКЛ. Міхаілу Глінскаму прадпісвалася спыніць рух татарскага войска на мяжы і не даць яму пранікнуць у глыб Ягелонскіх дзяржаў.

Была яшчэ адна прычына, якая прымушала Аляксандра паспешна выехаць у Польшчу — хвароба. Бернард Вапоўскі тлумачыць, што гаспадар, разумеючы, што ён не мае надзеі на выздараўленне, пастанавіў вярнуцца ў Польшчу, каб перадаць уладу ў Кароне і ВКЛ свайму малодшаму брату Жыгімонту[200].

---

[196] AA. S. 529, 530—533.

[197] «Hic exercitus Boristene laboriose transmisso Lituaniam, Podoliam, Roxiamque ingressus, atrocissime, si unquam antea, eas terras est populatus; intactum nihil reliquit, urebat, vastabatque omnia: oppida, pagi et horrea longe et late fumabant, cruore humano madebant omnia. Centum circiter hominum milia christiani nominis barbarus hostis abduxit» (Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 65—66). Гл. таксама Хроніку Мяхоўскага: «(Thartari)…, tyrannide terribili usi, domos et acervos cum frumentis exurebant, hominess et pecora quae abducere non valebant, secabant, utque certificatores referebant, super praedicta fere infinitum populum, quia centum milia adduxerunt. Et quom vix quinque milia Thartarorum fuerunt, cuique Thartaro vigintiquinque homines sorte cesserunt» (Lectiones variantes primae editionis (anni 1519) Matthiae de Miechow Chronicae Polonorum. S. 279).

[198] Напрыклад, паведамленне Хронікі Літоўскай і Жамойцкай пра наступствы нападу ханскіх сыноў Махмета, Біці-Гірэя і Бурнаша на землі ВКЛ, які гэтая крыніца адносіць да 1506 г.: «Махмет Герей стоял кошем под Минском и вси волости около Минска побурил, Минско все выпалил, не маючи шкоды в своих людех ни от кого, вернулся назад, людей самых над 1000000 християн вязнев з Руси и Литвы, крои иншых добытков, вывели так, иж на кождого татарина по 25 вязнев доставало, кром побитых» (ПСРЛ. Т. 35. С. 101).

[199] AA. S. 539.

[200] Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 66.

Аляксандр Ягелончык мусіў выехаць з Вільні не пазней 23 ліпеня 1506 г. У гэты дзень ён пацвердзіў прывілей гаспадарскаму двараніну Багдану Аляксеевічу на сяло Капылы ў Камянецкім павеце[201]. Сярод сведак, што прысутнічалі пры гэтым, быў князь Міхаіл Глінскі. У гэты ж дзень кароль у суправаджэнні сваёй жонкі вялікай княгіні Алены Іванаўны, каронных і велікакняскіх радных паноў вырушыў у дарогу. За каралём следаваў скарб. Паблізу рухалася войска Міхаіла Глінскага. На наступны дзень гаспадар быў ужо ў Лідзе.

24 ліпеня Аляксандр Ягелончык загадаў скласці інвентар асабістага скарбу[202]. Складанне каралеўскага інвентару адбылося ў прысутнасці кароннага канцлера Яна Ласкага, а таксама велікакняскага земскага падскарбія Федзькі (Храптовіча), велікакняскага надворнага канюшага Марціна (Храптовіча), раўскага намесніка Яна Бучацкага-старэйшага, падкаморыя Ланьцуцкай зямлі Яна Гінэка, кароннага надворнага віцэ-падскарбія Станіслава Міляноўскага, велікакняскага надворнага віцэ-падскарбія Івашкі (Солтана), кароннага пісара Георгія Мышкоўскага і велікакняскага пісара Богуша (Багавіцінавіча). Несумненна, што складанне рэестра каралеўскіх рэчаў магло быць выклікана далейшым пагаршэннем стану здароўя манарха.

У той жа дзень, 24 ліпеня, быў складзены тастамент караля і вялікага князя, у якім ён пажадаў быць пахаваным у кракаўскім Вавелі побач з дзедам, бацькам і братам. Каралеўскі трон і велікакняскі стол мусілі перайсці да адзінага спадчынніка, польскага каралевіча і глогаўскага князя Жыгімонта. Сведкамі гаспадарскага тастамента былі каралеўскі канцлер Ян Ласкі, віленскі біскуп Войцех Табар, земскі маршалак і гарадзенскі намеснік Ян Забярэзінскі, троцкі ваявода Мікалай Радзівіл-малодшы, надворны маршалак Міхаіл Глінскі[203].

### 1.1.22. Першыя весткі пра новы татарскі напад

Рэвізія каралеўскага скарбу магла быць прыспешана не толькі пагаршэннем стану здароўя манарха, але таксама нейкай нечаканай падзеяй. Несумненна, такой падзеяй стала вестка аб уварванні на землі ВКЛ вялізнага татарскага войска. Плоцкі біскуп Эразм Цёлак занатаваў у сваім дзённіку, што навіну аб татарскім нападзе ён атрымаў 24 ліпеня[204]. Верагодна, што ў гэты ж дзень падобную

[201] LM. Užrašymų knyga 5. P. 279.

[202] AA. S. 540—546.

[203] Papée F. Aleksander Jagiellończyk. S. 113.

[204] Własnoręczne zapiski Erazma Ciołka... S. 454.

вестку мусіў атрымаць кароль і вялікі князь. Пазнейшыя крыніцы маляўніча апісваюць гэты эпізод. У стаўку Аляксандра Ягелончыка ў Лідзе прыбыў усхваляваны ганец, які паведаміў, што татары рабуюць і пустошаць землі ўсяго толькі ў адным дні дарогі ад гэтага месца. У пацверджанне ўласных слоў ён паказаў рану на твары ад татарскай стралы[205].

Крымскі хан Менглі-Гірэй, як яму падавалася, выбраў зручны час для новага нападу на гаспадарскія валоданні. Рашэнне было прынята недзе ў канцы мая — пачатку чэрвеня, яшчэ да вяртання ханскага пасла Батуша з Вільні[206]. У сярэдзіне чэрвеня быў аддадзены загад рыхтавацца да выправы. Не маючы доўгі час пэўных вестак адносна вынікаў місіі Батуша ў Літве, Менглі-Гірэй вырашыў прыспешыць ход перагавораў. У якасці галоўнага інструменту націску на віленскае кіраўніцтва быў абраны амаль бездакорны сродак — узброены набег. З дапамогай ваеннага шантажу Менглі-Гірэй спадзяваўся змусіць Аляксандра пайсці на сур'ёзныя саступкі адносна пажыццёвага арышту заволжскага хана Шах-Ахмата і выплаты штогадовай даніны. Нельга выключаць, што крымскі хан у ходзе выправы разлічваў захапіць свайго ворага, які быў інтэрніраваны ў Коўне. У складзе крымскага войска маглі знаходзіцца спецыяльныя аддзелы з самых падрыхтаваных і вопытных воінаў, перад якімі была пастаўлена задача прабіцца да Коўна і паспрабаваць «вызваліць» ці забіць былога хана Заволжскай Арды. Такое меркаванне не з'яўляецца зусім неверагодным і беспадстаўным. У Крыме надзвычай скептычна ставіліся да абараназдольнасці ВКЛ. Менглі-Гірэй не без падстаў разлічваў, што ўзброеныя сілы ВКЛ не будуць у стане аказаць належны адпор татарскім аддзелам. Чаму б у такіх абставінах не паспрабаваць прарвацца да Коўна? Папярэдні набег 1505 г. прывучыў крымскае кіраўніцтва да думкі, што на тэрыторыі Літвы татары могуць адчуваць сябе гаспадарамі. Дарэчы, бунт Міхаіла Глінскага 1508 г. паказаў, на што здольнае невялікае войска, якое дзейнічае на татарскі манер. Цікава, што пазней самому Глінскаму прыпісвалі спробу вызвалення з ковенскага замка ў ходзе паўстання былога заволжскага хана Шах-Ахмата. Нарэшце, у самой сталіцы ВКЛ Вільні не без падстаў асцерагаліся нападу татараў. Тое, што крымскія татары былі здольныя арганізаваць выправу далёка за Вільню, засведчыў іх напад 1510 г.

У Крыме былі ўпэўнены ў паспяховым зыходзе ваеннай экспедыцыі. Галоўны ўдар мусіў быць скіраваны ў цэнтральныя

---

[205] Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 66.

[206] Herbst S. Kleck 1506. S. 215.

густанаселеныя землі ВКЛ. На чале экспедыцыі стаялі ханскія сыны Бурнаш і Біці-Гірэй, якія добра ведалі мясцовасць, дзе ім належала дзейнічаць. Галоўным, на думку хана, было тое, што Літва і Русь яшчэ не адышлі ад мінулагодняга нападу. Пасля паражэнняў ад Маскоўскай дзяржавы і знішчальных татарскіх нападаў пачатку XVI ст. грамадства ВКЛ выглядала дэмаралізаваным, няздольным да актыўнага супраціву. Упэўненасці хану прыдавала цяжкая хвароба Аляксандра Ягелончыка. Нарэшце, як здавалася Менглі-Гірэю, яму ўдалося пераканаць кіраўніцтва Кароны і ВКЛ у тым, што на гэты раз ён збіраецца атакаваць выключна каронныя землі. Веснавыя напады татарскіх аддзелаў на землі Кароны мусілі адцягнуць увагу кіраўніцтва Ягелонскіх дзяржаў ад сапраўднага кірунку летняга ўварвання.

Аднак на гэты раз Менглі-Гірэй пралічыўся. Ён не мог ведаць, што ў распараджэнні караля было добра падрыхтаванае і адмабілізаванае войска, якім кіраваў князь Міхаіл Глінскі. Крымскі хан разлічваў, што павінна прайсці досыць часу, пакуль збярэцца шляхецкае апалчэнне, і што за гэты час яго загоны здзейсняць задуманае і вярнуцца дамоў. Султаны Бурнаш і Біці-Гірэй не спадзяваліся спаткаць вялікае гаспадарскае войска. Праўда, і Глінскі не разлічваў сустрэць татараў у самым сэрцы ВКЛ. Ён вёў войска ў Карону, на дапамогу рускім землям, якім, як лічыла польскае кіраўніцтва, пагражаў новы татарскі напад. І толькі шчаслівы збег абставінаў прадухіліў новую страшэнную катастрофу для ВКЛ. Корпус Глінскага, які рухаўся ў Польшчу, стаў для дзяржавы сапраўдным паратункам.

Абодва войскі сустрэліся нечакана. Для Глінскага з'яўленне вялізнага татарскага войска ў Панямонні было поўнай нечаканасцю. Але куды большым шокам для татарскіх царэвічаў было паведамленне, што на іх пазіцыі імкліва насоўваецца вялікае літоўскае войска. Сустрэча абодвух войскаў была шмат у чым выпадковай, але гэтая выпадковасць уяўлялася непазбежнай.

Ва ўмовах небяспекі хворы Аляксандр Ягелончык абвясціў паспалітае рушанне. Кіраўніцтва ўсім войскам было даверана гаспадарскаму фаварыту, надворнаму маршалку, князю Міхаілу Глінскаму[207]. Згодна пазнейшых сведчанняў, кіраваць войскам мусіў Станіслаў Пятро́віч Кішка, а Глінскі быў усяго толькі яго намеснікам. Лаўры пераможцы дасталіся Глінскаму дзякуючы таму, што Кішка напярэдадні бітвы нечакана быццам бы захварэў і быў вымушаны перадаць кіраванне войскам свайму намесніку. У падобных паведам-

[207] Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 66—67.

леннях адчуваецца несумненная тэндэнцыйнасць. Легенда аб дуумвіраце вялікага гетмана Станіслава Кішкі і надворнага маршалка Міхаіла Глінскага ў кіраванні паспалітым рушаннем з'явілася пазней, ужо пасля мяцяжу Глінскага і наступнай эміграцыі Глінскіх у Маскву. Не маючы магчымасці цалкам адабраць у князя Міхаіла лаўры пераможцы, праціўнікі Глінскага і іх нашчадкі паспрабавалі падважыць яго ролю ў клецкай перамозе. Згодна легендзе, кіраўніцтва паспалітым рушаннем было даручана хворым каралём вялікаму гетману Станіславу Кішку і надворнаму маршалку Міхаілу Глінскаму, прычым прызначэнне апошняга адным выглядала хутчэй вынікам асаблівага стаўлення да яго з боку манарха. Аповед пра раптоўную хваробу Станіслава Кішкі напярэдадні бітвы і перадачу камандавання ў рукі Міхаіла Глінскага меў на мэце паказаць, што лаўры пераможцы дасталіся Глінскаму выпадкова. Разам з тым легенда рэабілітоўвала ў вачах сучаснікаў Станіслава Кішку.

### 1.1.23. Змаганне пад Клецкам

На момант абвяшчэння паспалітага рушання гаспадарскія ўзброеныя сілы налічвалі ўсяго некалькі тысяч воінаў[208]. Відавочна, 6-тысячнае войска, якое планавалася выслаць на Русь, яшчэ не было сабрана. Пры Глінскім мусілі знаходзіцца яго асабісты почат, надворная харугва, а таксама лёгкая кавалерыя — рацы. Магчыма, да іх далучылася і польская надворная харугва Пятра Герваста. Найбольш баяздольнай вайсковай адзінкай у гаспадарскім войску былі рацы. Менавіта апошнія правялі разведку боем і прынеслі князю Міхаілу звесткі пра знаходжанне татарскіх аддзелаў[209].

Абавязак збору паспалітага рушання ляжаў на надворным маршалку[210]. Сам кароль і вялікі князь Аляксандр, якога адвозілі на насілках-лектыцы з Ліды ў Вільню, загадаў адсылаць да князя Міхаіла тых воінаў, якія прыбывалі з розных мясцін[211]. Збор паспалітага рушання працягваўся амаль тыдзень, да 29 або нават 30 ліпеня 1506 г. Тады мусілі сабрацца асноўныя павятовыя харугвы і панскія початы. У гэты час колькасць гаспадарскага войска дасягнула 7 тысяч[212]. Аснову яго складала паспалітае рушанне бліжэйшых паветаў,

---

[208] Herbst S. Kleck 1506. S. 218 (спасылка 29).

[209] Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 66.

[210] «Michael dux cogebat exercitum, ut tartaris, terram Lituaniam late urentibus ac diffusis iret obviam» (Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 67).

[211] Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 67.

[212] Herbst S. Kleck 1506. S. 221.

якое мусіла налічваць 5—6 тысяч коннікаў. Пазнейшыя крыніцы згадваюць тры харугвы: гарадзенскую, навагародскую і менскую[213]. Астатнія 1,5—2 тысячы складалі рацы, велікакняская і каронная надворныя харугвы. Акрамя кавалерыі ў войску мелася, па меншай меры, некалькі гармат.

У канцы ліпеня Глінскі ўжо дакладна ведаў месцазнаходжанне татарскага лагера. Ён размяшчаўся непадалёк ад клецкага замка на левым беразе ракі Лань. Менавіта адтуль татары і распусцілі чамбулы для рабавання і пусташэння зямель. Ад палонных Глінскі даведаўся таксама пра крайні тэрмін вяртання чамбулаў у клецкі кош — 8 жніўня. Тады ж у гаспадарскім войску даведаліся, што на чале крымскага войска стаяць сыны хана Менглі-Гірэя царэвічы Бурнаш і Біці-Гірэй. Не губляючы часу, Глінскі з папоўненым новымі сіламі войскам рушыў на ворага[214].

Шлях гаспадарскага войска на Клецк пралягаў праз Навагародак, Асташын, Ішкалдзь, Малева. Першыя сутычкі адбыліся праўдападобна ўжо 1 жніўня 1506 г. і ішлі ўвесь тыдзень, да 8 жніўня ўключна[215]. За гэты час адбылося трынаццаць сутычак паміж войскамі праціўнікаў[216]. Барацьба была надзвычай упартай, і доўгі час яе вынік заставаўся няпэўным. Пералом адбыўся толькі 5 жніўня, калі быў захоплены татарскі кош і разбітыя асноўныя сілы праціўніка[217]. Аднак яшчэ, па меншай меры, тры дні пасля разгрому татарскага каша працягваліся баі з тымі татарскімі аддзеламі, што вярталіся з рабункаў. Не ведаючы, што іх лагер больш не існуе, яны вярталіся пад Клецк і траплялі ў пастку, падрыхтаваную Глінскім. Частка гэтых аддзелаў была знішчана, другая спрабавала шукаць паратунку ва ўцёках. 8 жніўня ўсё было скончана.

Напярэдадні рашаючай бітвы з татарамі, 4 жніўня 1506 г., экіпаж з хворым каралём і вялікім князем прыбыў нарэшце ў Вільню. Нягледзячы на часовае паляпшэнне, агульны стан здароўя гаспадара заставаўся вельмі цяжкім. Ніхто не сумняваўся, што дні Аляксандра

---

[213] Herbst. S. Kleck 1506. S. 221.

[214] Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 67.

[215] Memoriale domini Lucae // Scriptores rerum Warmiensium oder Quellenschriften zur Geschichte Ermlands. Bd. 2 / Bearb. v. C. P. Woelky. Braunsberg, 1889. S. 156.

[216] Кароль Аляксандр да жыхароў Гданьска, 14 жніўня 1506 г.: «…tridecim conflictus commissi errant usque ad diem mensis eiusdem octavam…» (AA. S. 548).

[217] Міхаіл Глінскі да вармінскага біскупа Лукаша Ватцэнродэ: «Ubi Dei optimi gracia et auxilio regieque Mtis fortuna felici aspirante, omnes Tartarorum acies, feria quarta die S. Marie ad Nives aliisque antea et post diebus per unam hebdomadam successive pugnando trans Hlana fluvium… totaliter sunt cesi et prostrati» (AA. S. 548—549).

Казіміравіча злічаныя. Хвароба (большасць даследчыкаў схіляюцца да думкі, што гэта быў lues — сіфіліс) аказалася мацней за арганізм уладара, тым больш, што сам працэс лячэння быў няправільным. На апошняе ў маі 1506 г. у часе візіту ў Вільню ўказваў вармінскі біскуп Лукаш Ватцэнродэ. Не дапамагло і вяртанне даўняга каралеўскага ўрача Мацея з Блоні, які змяніў арыштаванага каронным канцлерам Янам Ласкім кракаўскага лекара Балінскага[218].

### 1.1.24. Разгром крымскага войска. Уцёкі татараў

Аднак перамога была ўсё ж няпоўнай. Нягледзячы на новыя элементы ў тактыцы, узбраенні і кіраванні войскам, сама кампанія вялася старымі сродкамі. Асноўную сілу гаспадарскага войска складала паспалітае рушанне. Адсутнасць дысцыпліны, адказнасці і вытрымкі ў шэрагах паспалітага рушання не дала магчымасці Глінскаму цалкам ажыццявіць свой тактычны план. Як вынік, частка татараў здолела вырвацца з абцугоў акружэння і пазбегнуць пагоні. Пазбеглі смерці татарскія военачальнікі Бурнаш і Біці-Гірэй. Нягледзячы на пагоню, яны здолелі адарвацца і ўцячы.

З улікам падзей, што мелі месца ўжо пасля бітвы пад Клецкам, можна задаць рытарычнае пытанне: ці сапраўды Глінскі імкнуўся паланіць ці забіць татарскіх военачальнікаў? У тыя гарачыя жнівеньскія дні будучы трыумфатар не мог не ведаць, што яго абаронцу каралю і вялікаму князю Аляксандру засталося жыць зусім мала і што пасля яго смерці ён застанецца сам-насам са сваімі ворагамі, якія паспрабуюць звесці рахункі. І было невядома, як павядзе сябе сябар Глінскага, будучы гаспадар Жыгімонт. Тут магла б спатрэбіцца падтрымка з боку крымскага хана, такога ж Чынгізіда, як і Глінскі. Агульнасць паходжання, а таксама прыязныя адносіны паміж Гірэямі і Мамаевічамі — вось на што мусіў спадзявацца Глінскі. Забойства ханскіх сыноў зрабіла б яго асабістым ворагам хана, яго кроўнікам. Глінскі апынуўся ў цяжкім становішчы. З аднаго боку, ён павінен быў выканаць свой абавязак перад гаспадаром, якому быў столькім абавязаны. З другога боку, ён мусіў па магчымасці не дапусціць смерці тых, хто стаяў на чале татарскага войска. У выніку кампраміс быў знойдзены. Глінскі разбіў татарскае войска, але даў магчымасць уцячы сынам хана. Ці вярнуцца тыя ў Крым да бацькі, ці трапяць у рукі мясцовага люду, — гэта ўжо цалкам залежала ад волі

[218] Papée F. Aleksander (1492—1506) // Historia polityczna Polski. Cz. 1: Wieki średnie. Krakow, 1920. S. 655—656.

лёсу. Ён, Глінскі, зрабіў усё, што ад яго залежала. Магчыма, Глінскі не раз маліў Бога, каб царэвічы пазбеглі па дарозе небяспекі. Нельга выключыць, што менавіта гэты эпізод паслужыў пазней падставай для ворагаў і нядобразычліўцаў князя Міхаіла, каб абвінаваціць яго ў змове з крымскім ханам Менглі-Гірэем.

### 1.1.25. Вяртанне ў Вільню

На наступны дзень пасля перамогі, 9 жніўня 1506 г., гаспадарскае войска вырушыла ў Вільню. У Глінскага была сур'ёзная нагода спяшацца. У сталіцы паміраў кароль і вялікі князь Аляксандр. На моцы велікакняскага тастамента патрэбна было забяспечыць дынастычныя інтарэсы Ягайлавічаў і ажыццявіць легітымную перадачу ўлады глогаўскаму князю Жыгімонту Казіміравічу. Неабходна было ў сціслыя тэрміны арганізаваць і правесці выбары новага вялікага князя літоўскага. Прычын для хвалявання не бракавала. Як у Кароне, так і ў ВКЛ існавала ўплывовая партыя, якая імкнулася ажыццявіць адпаведную пастанову Мельніцкага сойма 1501 г., згодна якой выбары агульнага манарха былі прэрагатывай магнатэрыі абедзвюх дзяржаў. На яе чале ў ВКЛ стаялі віленскі біскуп Войцех Табар і троцкі ваявода Ян Забярэзінскі[219]. Глінскі не сумняваўся, што пасля смерці Аляксандра яны пачнуць рашучыя дзеянні, каб перашкодзіць намерам прыхільнікаў ліквідацыі Мельніцкай уніі і сарваць выбары новага гаспадара.

Амаль усю дарогу ад Клецка да Вільні войска суправаджала камета, змрочны сілуэт якой пачаў з'яўляцца на начным небе 8 жніўня[220]. Калі гаспадарскае войска падыходзіла да сталіцы, камета ўжо набыла выразныя абрысы[221]. У войску не пераставалі гадаць, што азначае яе раптоўнае з'яўленне. Гэта сімвал перамогі над ворагам ці прадвеснік бед у недалёкай будучыні?

12 жніўня 1506 г. надворны маршалак Міхаіл Глінскі быў ужо ў Вільні. Яго воіны-пераможцы трыумфальна ўехалі ў горад. У сувязі з хваробай гаспадара ўрачыстых цырымоній, стральбы з гармат і мушкетаў не было[222]. Глінскі ў поўным рыцарскім рыштунку адразу накіраваўся ў Ніжні замак. Пасля таго як Глінскі ўвайшоў у пакой

[219] Finkel L. Elekcya Zygmunta I. Sprawy dynastyi jagiellońskiej i unii polsko-litewskiej. Kraków, 1910. S. 30—35; Papée F. Aleksander Jagiellończyk. Kraków, 1949. S. 99; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 116—117.

[220] «Augustus 8: Cometes apparuit fusce» (Własnoręczne zapiski Erazma Ciołka... S. 454).

[221] «Augustus 12: Cometes clarus apparuit hora tertia» (Własnoręczne zapiski Erazma Ciołka... S. 454).

[222] Аповед пра ўезд вялікай княгіні Алены Іванаўны ў Вільню ў 1495 г. (ПСРЛ. Т. 32. С. 97).

гаспадара, ён літаральна з парога паведаміў паміраючаму Аляксандру пра перамогу над татарамі. Саму рэляцыю Глінскі мусіў рабіць па-польску, на той мове, на якой гаспадар і фаварыт часцей за ўсё камунікавалі паміж сабой. Аляксандр, які не мог гаварыць, уважліва выслухаў рапарт надворнага маршалка, а затым узняў рукі ўгору і са слязамі ў вачах падзякаваў Богу за перамогу.

У гэты ж дзень Міхаіл Глінскі напісаў пераможную рэляцыю даармінскага біскупа Лукаша Ватцэнродэ[223]. Можна меркаваць, што яна была пісьмовай рэдакцыяй прамовы Глінскага перад паміраючым каралём. Пераклад прамовы на лацінскую мову быў зроблены, відаць, самім князем Міхаілам. З ліста надворнага маршалка вынікала, што перамога над крымскімі татарамі была амаль поўная. Была дасягнута галоўная мэта: вызвалены практычна ўвесь захоплены татарамі палон, які налічваў да 40 тысяч чалавек. Таксама была захоплена багатая здабыча, у тым ліку і 30 тысяч коней — бахматаў. Татарскае войска ў выніку бітвы перастала існаваць. Праўда, частка татараў, у тым ліку ханскія сыны, здолела пазбегнуць смерці і паспрабавала ўратавацца ўцёкамі, аднак за імі была адпраўленая пагоня. Большасць уцекачоў была перахоплена і знішчана. Толькі невялікай колькасці татараў удалося вярнуцца дамоў. Сярод шчаслівчыкаў былі сыны хана — Бурнаш і Біці-Гірэй. Яны і прынеслі ў Крым жахлівую вестку аб паразе татарскага войска пад Клецкам.

### 1.1.26. Пасля перамогі

Кампанія 1506 г. мела важныя ваенна-тэхнічныя наступствы. Бітва пад Клецкам 5 жніўня 1506 г. засведчыла пэўную эвалюцыю ваеннага мастацтва ў ВКЛ[224]. Размова ў першую чаргу мусіць ісці пра тактычны бок аперацыі, дзе можна заўважыць мноства новых элементаў. Хуткі марш на варожы кош, атака дзвюма калонамі на пазіцыі ворага з мэтай знішчэння галоўных сіл праціўніка, паказная дэманстрацыя ваеннай сілы, актыўнае праследаванне адступаючага ворага — гэтыя і некаторыя іншыя невядомыя дагэтуль у баявой практыцы гаспадарскага войска тактычныя прыёмы былі шырока выкарыстаныя ў ходзе бітвы пад Клецкам.

Бліскуча зарэкамендавалі сябе новыя віды войска, у першую чаргу, лёгкая кавалерыя — рацы. У бітве пад Клецкам рацы выконвалі многія фунцыі. Яны выкарыстоўваліся як шпегі і праводзілі

[223] AA. S. 546—547.

[224] Herbst S. Kleck 1506. S. 228.

разведку боем пазіцый праціўніка. Рацы былі ў шэрагу першых аддзелаў, якія пераправіліся на другі бераг Лані і рушылі на пазіцыі ворага. У адкрытым баі рацам не было роўных у гаспадарскім войску. Іх адвага, вывучка і хуткасць здзіўляла ворагаў. Нарэшце, рацы былі першымі, хто кінуўся наўздагон уцякаючым татарам. Можна ўпэўнена сказаць, што рацам належыць выключная роля ў разгроме татарскага войска пад Клецкам.

Цікавым уяўляецца тэхнічны бок бітвы. Дагэтуль артылерыя ў гаспадарскім войску выкарыстоўвалася эпізадычна. Яна не адыгрывала самастойнай ролі ў бітве. Клецкая бітва 1506 г. засведчыла ўзрослую ролю артылерыі і ператварэнне яе ў самастойны род войска.

Гэтыя новыя элементы з'явіліся, галоўным чынам, дзякуючы асобе і таленту надворнага маршалка князя Міхаіла Львовіча Глінскага. Не выключана, што без яго тактычнай граматнасці, асабістай мужнасці, ініцыятыўнасці і хітрасці не было б ніякай перамогі. Кампанія яскрава засведчыла ўзрослую ролю военачальніка ў баі.

Засігналізаваная ў Клецкай бітве 5 жніўня 1506 г. праграма ваеннай рэформы ў ВКЛ не страціла сваёй актуальнасці пасля ад'езду князя Міхаіла Глінскага на службу ў Маскву. Справа, распачатая Глінскім, была прадоўжана яго старэйшым калегам князем Канстанцінам Іванавічам Астрожскім. У 1507 г. князь Канстанцін вярнуўся на радзіму з сямігадовага маскоўскага палону. У хуткім часе яму была вернута пасада вялікага гетмана ВКЛ. На гэтай пасадзе Астрожскі прадоўжыў рэформы гаспадарскага войска. Ён выкарыстаў тыя новыя элементы (найманыя жаўнеры, рацы, артылерыя, асабісты прыклад военачальніка, актыўная тактыка), якія былі апрабіраваныя Міхаілам Глінскім у бітве пад Клецкам 1506 г. Здаецца, што слынная Аршанская перамога 1514 г., якая высвеціла ваенны талент князя Канстанціна, была б немагчымай без Клецкай перамогі 1506 г. Дзякуючы Канстанціну Астрожскаму змянілася таксама становішча на поўдні. Яго перамогі над татарамі разам з «упамінкамі» аслабілі ў рэшце рэшт крымскі прэсінг на землі Кароны і ВКЛ.

Бітва пад Клецкам 1506 г. мела несумненнае псіхалагічнае і маральнае значэнне. Клецк паказаў, што гаспадарскае войска здольна перамагаць праціўніка на полі бою. Гэта была, бадай што, першая буйная перамога, якую ВКЛ атрымала з часоў легендарнай Грунвальдскай бітвы 1410 г. Быў узняты баявы дух войска, маральны клімат у грамадстве стаў больш аптымістычным. Сама бітва пад Клецкам неўзабаве стала часцінай народнай памяці. Пра Клецкую

перамогу складалі песні і аповесці, якія дэкламавалі на маршы, у моманты адпачынку і непасрэдна перад боем.

### 1.1.27. Смерць Аляксандра Казіміравіча (19.08.1506 г.)

Вестка пра перамогу над татарамі, здавалася, прыпадняла настрой Аляксандра. З'явілася надзея на паляпшэнне стану караля. 14 жніўня ў Гданьск ад яго імя было накіравана пасланне з паведамленнем аб перамозе над татарскім войскам[225]. Цікава, што ў ім нічога не гаварылася пра ролю Міхаіла Глінскага, затое падкрэслівалася заслуга аддзела на чале з гаспадарскім каморнікам Пятром Гервастам з Унрава. У лісце агульна гаворыцца пра жыхароў ВКЛ, якім на дапамогу былі пасланыя асобныя польскія прыдворныя (...contra quos (Tartaros) dum istius terre populum cum nonnullis curiensibus Polonis felici auspicio direxissemus). Ці не было гэта пасланне адрэдагавана палякам-сакратаром, які раўніва ставіўся да заслуг Глінскага? Не выключана, што ліст у Гданьск быў напісаны і адрэдагаваны самім каронным канцлерам Янам Ласкім, які, як Міхаіл Глінскі і жонка ўладара вялікая княгіня Алена, да апошніх хвілін знаходзіўся побач з Аляксандрам. Вельмі хутка надзея на паляпшэнне здароўя караля канчаткова згасла. 19 жніўня а чацвёртай гадзіне раніцы караля і вялікага князя Аляксандра не стала[226].

Паводле ўспамінаў сучаснікаў, Аляксандр Казіміравіч быў сярэдняга росту, меў прадаўгаватую форму твару, насіў звычайна, як сапраўдны літвін, доўгія валасы. Дзякуючы навукам Яна Длугаша і Філіпа Калімаха Буанакорсі ён атрымаў неблагую адукацыю, хоць інтэлектуальная дзейнасць не асабліва яго і займала. Кароль быў немнагаслоўным і нават флегматычным. Ён быў сціплым і непатрабавальным у жыцці. Адзінай яго забавай з'яўлялася музыка, захапленне якой падзяляла яго жонка вялікая княгіня Алена Іванаўна[227]. Увогуле, музыка займала важнае месца на двары Аляксандра, тут заўжды не бракавала таленавітых і здольных музыкаў. Аляксандр быў дбайным гаспадаром, умеў лічыць кожны грош. За гады яго праўлення значна вырас дзяржаўны скарб ВКЛ[228]. Разам з тым, ён быў дастаткова шчодрым манархам, умеў узнагароджваць і абдорваць сваіх падданых. Кароль добра разбіраўся ў людзях, меў вялікі

[225] AA. S. 548.
[226] Papée F. Aleksander (1492—1506) S. 656.
[227] Тамсама. S. 656.
[228] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 198—200.

талент у падборы супрацоўнікаў. У гэтым плане каронны канцлер Ян Ласкі і надворны маршалак ВКЛ Міхаіл Глінскі з'яўляюцца найлепшым прыкладам. Аляксандр вылучаўся дыпламатычнымі здольнасцямі і немалой сілай волі, што ў сукупнасці дазволіла яму паспяхова супрацьстаяць прэсінгу з боку вяльможаў і магнатаў[229]. Увогуле, як падаецца, Аляксандр Казіміравіч не меў удачы і харызмы, так неабходных для любога палітыка[230]. Разам з тым, у яго апраўданне неабходна сказаць, што становішча Літвы ў гады яго панавання было надзвычай некарысным. Але адказнасць за гэта кладзецца ў першую чаргу на бацьку Аляксандра — караля і вялікага князя Казіміра Ягайлавіча.

### 1.1.28. Новы гаспадар

У той час, калі ў Вільні паміраў кароль і вялікі князь Аляксандр, глогаўскі князь Жыгімонт быў ужо ў дарозе. Яго шлях у Літву ляжаў праз Познань, Мазовію. У невялікім мазавецкім мястэчку пад назвай Ліў Жыгімонта ў канцы жніўня 1506 г. насцігла вестка пра смерць брата[231].

Першым, хто сустрэў Жыгімонта ў Літве, быў надворны маршалак. Міхаіл Глінскі старанна падрыхтаваўся да сустрэчы са сваім даўнім знаёмым, а цяпер галоўным прэтэндэнтам на велікакняскі трон. Абодва пазнаёміліся яшчэ ў часе першага пасольства Глінскага ў Буду, узімку 1501 г. Пасля яны некалькі разоў сустракаліся ў Польшчы. Так, на званым абедзе ў Жыгімонта 29 лістапада 1504 г. у Кракаве, на якім прысутнічалі князі Міхаіл Глінскі, Міхаіл Заслаўскі і Юрый Гальшанскі, быў створаны зародак групоўкі для забеспячэння выбару на велікакняскі прастол глогаўскага князя[232]. Канчаткова праягелонская групоўка была афармленая на берасцейскім сойме ў лютым — сакавіку 1505 г., калі да яе далучыліся Станіслаў Кезгайла, Станіслаў Глябовіч і Радзівілы. Пасля смерці Аляксандра Казіміравіча Глінскаму патрэбна было выканаць апошняе жаданне ўладара і дапамагчы князю Жыгімонту атрымаць велікакняскі стол.

Пад Горадняй Глінскі сустрэў Жыгімонта на чале шыкоўнага почата з 700 коннікаў (почат самога глогаўскага князя складаў усяго 200 чалавек). Жыгімонт выйшаў насустрач князю Міхаілу

[229] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie...

[230] Тамсама. S. 206—207.

[231] Borucki M. Jak w dawnej Polsce królów obierano. Warszawa, 1976. S. 43.

[232] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 117.

і з радасцю прыняў яго[233]. У ходзе перагавораў Глінскі прысягнуў Жыгімонту як будучаму гаспадару, а апошні яшчэ раз пацвердзіў тыя шматлікія абяцанні, якія ён папярэдне зрабіў надворнаму маршалку.

Далей Жыгімонт і Глінскі вырушылі разам. 10 верасня 1506 г. яны ўжо знаходзіліся ў Вільні. Першай іх справай было забяспечыць годнае пахаванне памерлага ўладара. Менавіта тады, не без удзелу Жыгімонта і Глінскага, было вырашана пахаваць Аляксандра ў сталіцы ВКЛ. Праз месяц, 11 кастрычніка 1506 г.[234], цела Аляксандра Казіміравіча было пахавана ў віленскім кафедральным касцёле побач з яго братам Казімірам[235]. Дарэчы, рашэнне пахаваць караля не ў Кракаве, а ў Вільні, выклікала вялікую незадаволенасць з боку польскіх вяльможаў. Пазней, ужо пасля выступу Глінскага, літоўскія магнаты апраўдвалі свой крок тым, што баяліся, каб у іх адсутнасць колішні фаварыт не авалодаў усім ВКЛ.

Праз тыдзень пасля ўрачыстага пахавання, 19 кастрычніка 1506 г., адбыліся выбары новага вялікага князя літоўскага. На безальтэрнатыўнай аснове новым уладаром быў абраны князь Жыгімонт, трэці сын караля Казіміра Ягайлавіча. Яшчэ праз тыдзень, 26 кастрычніка 1506 г., нованабраны вялікі князь атрымаў у прысутнасці паноў-рады галоўную адзнаку велікакняскай улады — «шапку Гедзіміна»[236].

У акце абрання Жыгімонта вялікім князем літоўскім польскія вяльможы справядліва ўбачылі спробу сваіх літоўскіх калег сарваць рашэнні Пётркаўска-Мельніцкай уніі. Несумненна, галоўным завадатарам гэтай інтрыгі ў Кракаве лічылі князя Міхаіла Глінскага. Але, не маючы магчымасці паўплываць на настроі грамадства ВКЛ, польскія ўлады вымушаны былі пагадзіцца з выбарам Жыгімонта вялікім князем і прызнаць яго ў якасці кандыдата на каралеўскі трон. 8 снежня 1506 г. вялікі князь літоўскі Жыгімонт быў абраны польскім каралём. 24 студзеня 1507 г. ён быў урачыста каранаваны ў Вавельскім кафедральным касцёле. Сярод іншых паноў з Кароны і ВКЛ на ўрачыстай цырымоніі прысутнічаў князь

[233] «Michaeli venienti longius, quam par erat, ex cubiculo, qou pedibus obviam processit et cum multa alacritate excepit, introductum in secretius cubiculum multis promissis oneravit» (Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 69).

[234] Własnoręczne zapiski Erazma Ciołka... S. 455; Dziennik Macieja Drzewickiego // Monumenta Poloniae Historica. T. 3 / Wyd. A. Bielowski. Lwów, 1878. S. 344.

[235] Acta Tomiciana (далей — AT). T. 1: 1507—1511. Poznań, 1852. S. 4.

[236] AT. T. 1. S. 4.

Міхаіл Глінскі[237]. Наўрад ці ён думаў тады, што гэта будзе апошняя каранацыя, на якой ён прысутнічае. Наўрад ці ён дакладна прадчуваў, што яму нясе новы 1507 г. Ён неаднаразова лавіў на сабе нядобразычлівыя і зайздросныя погляды, але яго сумленне цешыла думка пра выкананы абавязак перад Аляксандрам Казіміравічам. Ён, Глінскі, не толькі збавіў Айчыну ў той момант, калі ёй пагражалі ворагі, але і забяспечыў легітымны пераход улады да прадстаўніка дому Ягайлавічаў.

### 1.1.29. Угода з Крымам. Татарскія «ўпамінкі»

Увосень 1506 г., неўзабаве пасля вяртання царэвічаў у Крым, Менглі-Гірэй адправіў у Вільню свайго ганца Тайлака разам з гаспадарскім талмачом Рамаданам[238]. Хан паведамляў, што высылае сваіх вялікіх паслоў на чале з Цювікелем-уланам дзеля падпісання вечнага міру з каралём і вялікім князем. Пра спешку, у якой высылалася гэтае пасольства, сведчыць той факт, што ханскія ярлыкі былі адрасаваныя на імя караля і вялікага князя Аляксандра, які памёр 19 жніўня 1506 г. Менглі-Гірэй выказваў жаданне жыць у міры і згодзе з гаспадаром. Што да апошняга нападу на гаспадарскія землі, хан спісваў яго на некаторых сваіх нядобрасумленных падданых, якія падбухторылі яго сыноў да набегу. Але за гэты ўчынак яны атрымалі спаўна, і цяпер ён, Менглі-Гірэй, цвёрда трымае сыноў каля сябе[239]. Разам з крымскім пасольствам да новага вялікага князя літоўскага Жыгімонта прыехала таксама пасольства казанскага хана Махмет-Аміна, які абяцаў гаспадару дапамогу супраць вялікага князя маскоўскага. Ад крымскіх паслоў Глінскі і даведаўся пра шчаслівае вяртанне ханскіх сыноў дамоў, што, канешне, не магло не пацешыць яго.

На Мельніцкім сойме, куды прыбыла крымская дэлегацыя, Цювікель-улан прысягнуў ад імя хана Менглі-Гірэя трымаць мір з каралём і вялікім князем Жыгімонтам, а таксама дапамагаць таму супраць усіх ворагаў, у першую чаргу вялікага князя маскоўскага[240]. Перагаворы з крымскім пасламі былі паспяхова завершаныя ў самым пачатку наступнага года, пасля чаго 7 студзеня 1507 г. Жыгімонт Казіміравіч у добрым настроі адправіўся

[237] Decius I. De Sigismundi regis temporibus. Cracoviae, 1521. P. 19—20.

[238] Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 8 (1499—1514): Užrašymų knyga 8 / Parengė A. Baliulis, R. Firkovičius, D. Antanavičius. Vilnius, 1995. P. 50.

[239] Тамсама. P. 51.

[240] Тамсама. P. 53—54.

на каранацыйныя ўрачыстасці ў Кракаў[241]. Несумненна, у перагаворах мусіў браць удзел галоўны трыумфатар бітвы пад Клецкам князь Міхаіл Глінскі[242].

Перагаворы былі затым прадоўжаныя ў стаўцы хана, куды паехалі вялікія паслы Юрый Зяноўевіч, Якуб Івашэнцавіч і татарскі пісар Абрагім Цімірчыч[243]. Ад імя гаспадара і радных паноў паслы пацвердзілі падпісанае ў Мельніку пагадненне. У сваю чаргу, хан Менглі-Гірэй прысягнуў каралю і вялікаму князю Жыгімонту, а затым уручыў яго прадстаўнікам ратыфікаваную грамату («прысяжныи лист»). Ратыфікацыя двухбаковага пагаднення адбывалася ў канцы чэрвеня 1507 г., верагодна, у ханскай рэзідэнцыі «в городе Веселом». У ёй бралі ўдзел усе султаны, князі і ўланы, разам «с полковыми князи, зъ дворяны и с кочовными князи…»[244]. Цікава, што сярод прысутных афіцыйных асоб Крымскага ханства знаходзіліся кіраўнікі крымскага войска пад Клецкам ханскія сыны Бурнаш і Біці-Гірэй. Сам рытуал прысягі вельмі вобразна апісаны Менглі-Гірэем у лісце да Жыгімонта Старога ад 14 ліпеня 1507 г.: «…я в головах з верхописаными, зъ братомъ и з детьми, з уланы и с князи, со всими полковыми князи и зъ дворяны, и с кочовными князи, и зъ слугами моими, вси посполне стоя, Жикгимонту, королю, брату нашому, присягнули есмо и тот присяжныи лист дали есмо с тыми вызнаными речми, которые речи стали ся»[245]. Пазней ад імя караля і вялікага князя Жыгімонта хану прысягнулі гаспадарскія паслы. Пры гэтым Менглі-Гірэй і яго вяльможы мусілі прысягаць на Каране, а гаспадарскія паслы — на Евангеллі.

Менглі-Гірэй нават выдаў Жыгімонту ярлык на рускія гарады, уключна з Кіевам і Смаленскам, на якія прэтэндаваў маскоўскі ўладар[246]. Зроблена гэта было ў стылі былых залатаардынскіх ханаў, да аўтарытэту і славы якіх так імкнуліся ў Крыме. Спіс гарадоў і мясцовасцей, якія крымскі хан «надаваў» Жыгімонту, быў доўгім. Ён уключаў Кіеў, Уладзімір-Валынскі, Луцк, Смаленск, Падольскую зямлю, Камянец-Падольскі, Брацлаў, Сокаль, Звянігарад, Чаркасы, Пуціўль, Рыльск, Мцэнск, Любуцк, Казельск, Пронск, Аскол, Старадуб і нават

[241] Dziennik Macieja Drzewickiego. S. 344—345.

[242] Пра перамовы паміж Жыгімонтам Старым і Менглі-Гірэем гл. падрабязней: Kołodziejczyk D. Te Crimean Khanate and Poland-Lithuania. P. 30—36.

[243] LM. Užrašymų knyga 8. P. 54—55.

[244] Тамсама. P. 84.

[245] Тамсама. P. 84.

[246] Тамсама. P. 83—84.

Пскоў, Вялікі Ноўгарад і Разань. У спіс увaходзіў таксама Глінск, бацькаўшчына князёў Глінскіх, а таксама цьма напаўміфічнага Ягалдая Сараевіча. Надаючы рускія гарады і землі вялікаму князю літоўскаму, Менглі-Гірэй спасылаўся на адпаведныя пагадненні паміж ханам Хаджы-Гірэем і Вітаўтам, а таксама на дамоўленасць паміж ім самім і Казімірам Ягайлавічам.

Нарэшце, абодва бакі дамовіліся распачаць летам наступнага года сумесную ваенную выправу супраць вялікага князя маскоўскага[247]. У пачатку лета 1507 г. велікакняскае войска рушыла трыма калонамі на ўсход: на Смаленск, Полацк і Менск[248]. У канцы ліпеня ўслед за войскам рушыў новы гаспадар. У пачатку жніўня 1507 г. ён быў ужо ў Менску[249]. Са свайго боку, Менглі-Гірэй абяцаў паслаць на Васіля III вялікае войска на чале са сваім сынам султанам Махмет-Гірэем. Разам з ім мусілі выправіцца ханскія сыны Біці-Гірэй і Бурнаш[250]. Аднак да рэальнага ваеннага супрацоўніцтва паміж Крымам і ВКЛ справа так і не дайшла. Сумесная выправа на Маскву так і не адбылася. 8 кастрычніка 1507 г. Жыгімонт са скрухай пісаў да Менглі-Гірэя: «...тыми разы пришли до насъ от наших граничныхъ людеи таковыи слухи, иж тое твое воиско, которое посылал в московского земли, и до сих часов не бывали и никоторому москвитину жадное шкоды не вчинили»[251]. Хан апраўдваўся тым, што ў яго зямлю ўварваліся нагайцы, і войска на чале з Махмет-Гірэем мусіла вярнуцца дамоў[252].

Разам з тым, умовай далейшага ваенна-палітычнага супрацоўніцтва Менглі-Гірэй называў пакаранне смерцю былога заволжскага хана Шах-Ахмата, які знаходзіўся ў Коўне[253]. Жыгімонт адказваў, што ні ён, ні радныя паны нічога падобнага не абяцалі[254]. Аднак плаціць «впоминки» Менглі-Гірэю ён не адмаўляўся.

### 1.1.30. Лёс крымскіх палонных

Хоць сынам Менглі-Гірэя царэвічам Біці-Гірэю і Батушу ўдалося пазбегнуць палону, тым не менш, у рукі літвінаў трапіў шэраг

[247] LM. Užrašymų knyga 8. P. 55.

[248] Гл. ліст Жыгімонта Старога да Менглі-Гірэя ад 20 чэрвеня 1507 г. (LM. Užrašymų knyga 8. P. 71—72).

[249] Тамсама. P. 72.

[250] Тамсама. P. 86.

[251] Тамсама. P. 89.

[252] Тамсама. P. 90—91, 95.

[253] Тамсама. P. 86, 87.

[254] Тамсама. P. 96.

знатных татараў. Пра іх незайздросны лёс крымскі хан даведаўся з вуснаў ацалелых татарскіх воінаў. Пад ціскам іх родных і блізкіх Менглі-Гірэй мусіў распачаць перагаворы аб вызваленні некаторых вяльможных татарскіх палонных. Першае крымскае пасольства, накіраванае ў ВКЛ пасля Клецкай бітвы 1506 г., мела наказ хана прасіць польскага караля і вялікага князя літоўскага аб іх вызваленні. Спачатку сярод татарскіх вязняў згадваліся толькі дзве асобы: нейкі Сеілт (Хажа-Сеіт?), а таксама Мелік-баша. Крымскія паслы ад імя хана прыводзілі аргументы на карысць вызвалення абодвух: Сеілт збіраўся ў паломніцтва да Труны прарока Аўраама, а ў Мелік-башы памёр брат, і ён мусіў ажаніцца з яго ўдавой[255].

Просьба крымскіх паслоў не падзейнічала на Жыгімонта, бо ўлетку наступнага 1507 г. Менглі-Гірэй ізноў хадайнічаў перад гаспадаром аб вызваленні крымскіх палонных. Цяпер размова ішла не толькі пра Хажа-Сеіта і Мелік-башу. Хан прасіў адпусціць у Крым нейкага Хажаша, Мамчыца-Сеіта, а разам з імі свайго роднага брата царэвіча Іздэміра, які некалі ўцёк у Заволжскую Арду, а пасля перабраўся ў Літву[256]. Князь Айдар (Гайдар) хадайнічаў за свайго падданага Жангечу і за Тарахожу, сына Мелік-Хафеза[257].

Цяжка сказаць, як склаўся лёс згаданых татарскіх вязняў. Выключэнне складае толькі Мелік-баша — самы знакаміты палонны Клецкай бітвы. Ён належаў да знакамітага крымска-татарскага роду Шырынаў. Як вынікае з ханскай перапіскі, неўзабаве пасля бітвы Мелік-баша быў адасланы на двор ханскага брата царэвіча Іздэміра: «А ещо Мелик-баша а Хажаш, наши слуги есть, озле брата моего Азъдемир царевича были, хто бы их поималъ не есть, да тые люди из своее воли зашли…»[258]. Не пазней лета 1507 г. Мелік-баша быў выкуплены і ўзяты на парукі знакамітай татарскай сям'ёй Асанчуковічаў з роду Барынаў (Багрынаў)[259]. Галоўную ролю ў вызваленні Мелік-башы мусіў адыграць тагачасны галава сям'і Асанчуковічаў — Урус-Улан, які з 1506 г. з'яўляўся татарскім маршалкам Навагародскага павета. Верагодна, што і іншыя знатныя татарскія палонныя, у тым ліку згаданыя Хажаш, Жангеча і Тарахожа, былі выкуплены і ўзятыя на парукі асобнымі татарскімі родамі, якія пражывалі ў ВКЛ. Неўзабаве пасля выкупу, недзе

[255] Гл. ліст Жыгімонта Старога да Менглі-Гірэя ад 20 чэрвеня 1507 г. (LM. Užrašymų knyga 8. P. 53).
[256] Тамсама. P. 69.
[257] Тамсама. P. 69. Невядома аднак, ці ўсе пералічаныя асобы былі палоннікамі Клецкай бітвы.
[258] Тамсама. P. 69.
[259] Tyszkiewicz J. Tatarzy na Litwie i w Polsce: studia z dziejów XIII—XVIII w. Warszawa, 1989. S. 168.

ў 1507 г., Мелік-баша быў прыняты на гаспадарскую службу[260]. Між іншым, кароль і вялікі князь Жыгімонт Стары абгрунтоўваў сваю адмову адпусціць Мелік-башу ў Крым тым, што ў яго здольнасцях як воіна мела патрэбу гаспадарскае войска. Манарх абяцаў, аднак, адпусціць Мелік-башу дамоў пасля паспяховай літоўска-крымскай выправы на Маскву: «А што еси писалъ к намъ о Сеите и о Мелик-баши, абыхмо ихъ к тобе, брату нашому, отъпустили, ино и тое, какъ того часъ будетъ для тебе, брата нашого, ради вчинимъ, нижли на тотъ часъ самъ можешъ розумети, коли з тымъ неприятелемъ нашимъ в таковое дело вступили, ради быхмо ещо з иных сторонъ слугъ собе прыбавили, абыхмо тымъ сильнеи неприятелю отьпор вчинили, а какъ дастъ Богъ, с твоею, брата нашого, помочъю с тымъ неприятелемъ нашимъ московскимъ нашо дело на доброи мере поставимъ, тые люди перед тобою будут»[261].

У 1510 г. за службу Мелік-баша атрымаў з гаспадарскага скарбу грошы на набыццё шубы[262]. На гаспадарскай службе Мелік-баша здабыў славу і багацце. Ён браў удзел у войнах 1507—1508 і 1512—1522 гг. з Маскоўскай дзяржавай. На службу разам з Мелік-башой паступілі яго сыны, Муртаза і Хасан, якія, верагодна, былі захоплены ў палон пад Клецкам разам з бацькам. Старэйшы сын Муртаза ўдзельнічаў у складзе добраахвотнага татарскага аддзела ВКЛ у польска-прускай вайне 1519—1521 гг.[263]. Яго зямельныя ўладанні знаходзіліся пераважна ў Навагародскім павеце. Галоўнай сядзібай Мелік-башы і яго нашчадкаў з'яўляўся двор Крашын (Крошын)[264] непадалёк ад Клецка. Мелік-баша не забываў сваю радзіму і падтрымліваў цесныя сувязі са сваімі роднымі ў Крыме. На схіле жыцця, у 1522 г., ён са згоды караля і вялікага князя Жыгімонта Старога вырашыў вярнуцца ў Крым[265], каб аддаць апошнія гады жыцця службе хану Махмет-Гірэю, сыну Менглі-Гірэя. У ВКЛ ён пакінуў сям'ю, да якой перайшлі ўсе яго ўладанні. Як бачым, Жыгімонт Стары выканаў абяцанне адпусціць Мелік-башу дадому, якое 15 гадоў таму даў крымскаму хану Менглі-Гірэю. Аднак Менглі-Гірэю, які памёр у 1515 г., так і не давялося больш пабачыць свайго слугу.

---

[260] Tyszkiewicz J. Tatarzy na Litwie i w Polsce. S. 168.

[261] LM. Užrašymų knyga 8. P. 97.

[262] «Мелик-баши на шубу кунюю с скарбу отмена» (LM. Užrašymų knyga 8. P. 424).

[263] Tyszkiewicz J. Tatarzy na Litwie i w Polsce... S. 198.

[264] Тамсама. S. 168.

[265] Тамсама. S. 168, 198.



**Выява Міхала Глінскага з люблянскай копіі "Нататак пра Масковію" Жыгімонта фон Герберштайна.**


uuste aber den Römischen glauben in Teutschen Landen angenummen/
Thumb verhoffi er ain gnad zuerlangen / nam wider den Reüssischen
n Erster Potschafft hab ich beuelch gehabt / seiner erledigung halben
nd sein person dem Khaiser Maximilian zuerlangen / ward mir ge
r den Reüssischen glauben widder angenumen / wolt dem Fürsten nit
ain andern glauben zugeben / man vergont mir auch nit mit jme zu
aschen / Als ich aber zum andern mal hinein geschickht ward / weil
ain Ehelichs weib von sich schaiden / vnd in ain Closter stossen las
ichael brueder / Knes Basily des plinten Tochter genumen hette /
er erledigung halben / Ich was von etlichen Erlichen leuten in
n gefangnen was guets so ich möchte zu thuen / bin offt seinethal
/ob ich jme Knes Michaeln schente / hab meines verstands dem
n khünnen / dan das ich gesagt / ich schente den nit / hab gleichwol
Maximilians zeiten beuelch gehabt / von seind wegen zuhandlen /
s / damit ich jme sein sach nit verhinderte / vnnd khain verdacht
ig gelassen / vnd jme vil personen zugeordent / die meer sein ge
ue dieneten / vnd die vrsach seiner erledigung was / das der Groß
r khinder vberkhäme / so wurden seine brueder der er noch zwen
e Eelich sein / vnd zu der herrschung wellen khumen lassen / Die
ch schicklichkait jres vettern Knes Michaeln darbey erhalten
neben etlichen andern zu Gerhaben verordent. Nach abster
hat die witbe sich nit rechtgeschaffen gehalten / darumen er sy
an etlich mal angeredt hat / Sy jme für ain verräter jres Mans

**Выява князя Міхала Глінскага ў строі нямецкага ландскнэхта з люблянскай копіі "Нататак пра Масковію" Жыгімонта Герберштайна.**



Герб роду князёў Глінскіх.



Герб (Ляліва) роду Забярэзінскіх.



Герб крымскіх Гірэяў.



Хан Мамай. Помнік тысячагоддзю Русі ў Вялікім Ноўгарадзе.



**Чынгізхан. Персідская гравюра.**



**Султан Баязід II і хан Менглі-Гірэй. Гравюра XVI ст.**



**Колішні ханскі палац у Бахчысараі. Выява XIX ст Карла Басолі.**

# 2. Князь Міхаіл Глінскі: фаварыт вялікага князя Аляксандра Казіміравіча і герой Клецкай бітвы

## 2.1. Паходжанне роду Глінскіх

### 2.1.1. Складанасці вывучэння паходжання роду Глінскіх

Род князёў Глінскіх здолеў за кароткі час зрабіць бліскучую кар'еру і апынуцца на вяршыні ўлады спачатку ў ВКЛ, а пасля ў Маскоўскай дзяржаве. Князі Іван, Васіль, Міхаіл Львовічы адыгрывалі важную ролю ў палітычным жыцці ВКЛ у часы Аляксандра Казіміравіча (1492—1506 гг.). Пазней яны і іх нашчадкі ўваходзілі ў склад палітычнай эліты ў суседняй Маскоўскай дзяржаве. Аднак паходжанне гэтага знакамітага роду, які адыграў такую важную ролю ў гісторыі Усходняй Еўропы, даследавана яўна недастаткова. Нашай мэтай з'яўляецца высвятленне пачаткаў роду князёў Глінскіх. Асаблівая ўвага звернута на дзейнасць прадстаўнікоў роду ў часы Аляксандра Казіміравіча, калі адбылася знакамітая Клецкая бітва 1506 г. Што да самой даты, то 1506 г. з'яўляецца важнейшым рубяжом у гісторыі роду Глінскіх.

Разгледзім паходжанне роду. Асноўнай крыніцай даследавання з'яўляецца «Подлинный родослов Глинских князей»[1]. У працы таксама выкарыстаны іншыя гістарычныя сведчанні, у тым ліку «Память роду Глинских» з Румянцаўскага збору[2]. Такая ўвага да індывідуальнага ў гісторыі абумоўлена, перш за ўсё, тым, што асобныя сацыяльныя структуры ці індывіды часта дзейнічаюць і прымаюць рашэнні, зыходзячы з уласных праблем і патрэб. Абагульненне і гамагенізацыя праяў жыццёвага вопыту вядзе да дэгуманізацыі

---

[1] Временник Императорского Московского общества истории и древностей Российских (далей — ВИМОИиДР). Кн. 10. Москва, 1851. С. 195—197.

[2] Бычкова М. Е. Родословие Глинских из Румянцевского собрания // Записки отдела рукописей Государственной библиотеки им. В. И. Ленина. Кн. 38. Москва, 1977. С. 104—125.

гістарычных прац, выдалення з іх самога чалавека з яго пачуццямі, марамі, інтарэсамі.

«Подлинный родослов Глинских князей» быў укладзены кімсьці з клана Глінскіх або іх саюзнікаў. Ідэйным натхняльнікам гэтай працы быў, несумненна, старэйшы на той час у родзе Глінскіх князь Міхаіл Львовіч. «Подлинный родослов» завяршаецца сціслым апісаннем жыцця апошняга.

«Подлинный родослов» укладзены пасля жаніцьбы ў 1526 г. вялікага князя маскоўскага Васіля III з пляменніцай князя Міхаіла Львовіча князёўнай Аленай Васілеўнай і вызвалення з турэмнага зняволення, якое доўжылася больш за 12 год, самога Міхаіла Львовіча. Шлюб з велікакняскай сям'ёй істотна ўзняў прэстыж клана Глінскіх на маскоўскім двары[3]. З апалы род Глінскіх адразу трапіў у склад палітычнай эліты Маскоўскай дзяржавы. Сам князь Міхаіл Львовіч разам з князем Дзімітрыем Фёдаравічам Бельскім быў прызначаны ў тастаменце Васіля III апекуном яго непаўналетніх дзяцей Івана і Георгія.

Смерць Васіля III у 1533 г. разбурыла ў асяроддзі маскоўскай палітычнай эліты той механізм раўнавагі, што быў усталяваны ў 1526—1527 гг.[4]. Наступіў час унутраных канфліктаў. У барацьбу палітычных груповак, такіх як Захар'іны-Юр'евы, Целяпнёвы-Абаленскія, Чалядніны, Бельскія, Шуйскія, былі ўцягнутыя таксама іншыя кланы і сем'і. Устанавіць палітычныя сімпатыі роду Глінскіх у гэтай сітуацыі няпроста. Апошнія былі звязаны сваяцкімі вузамі з Чалядніным і Целяпнёвымі-Абаленскімі[5] і, тым не менш, дзейнічалі самастойна. Аднак спроба князя Міхаіла Львовіча, як найбліжэйшага сваяка непаўналетняга Івана III, усталяваць уласную гегемонію на маскоўскім двары не дала жаданых вынікаў: ён быў арыштаваны, кінуты ў турму, дзе хутка памёр[6].

Менавіта ў той час, калі князь Міхаіл Львовіч Глінскі адкрыта выступіў з прэтэнзіямі на вядучую ролю ў асяроддзі маскоўскай палітычнай эліты, і мог быць укладзены «Подлинный родослов». Можна паспрабаваць вызначыць храналогію паўстання твора. Паколькі ў ім нічога не гаворыцца пра смерць Міхаіла Львовіча ці рэпрэсіі супраць яго асобы, «Подлинный родослов» мог быць створаны да

[3] Пра матывы вяселля і яго наступствы для палітычнага жыцця Маскоўскай дзяржавы: Kollman N. Kinship and Politics. The Making of Muscovite Political System. 1345—1547. Stanford, 1987. S. 144—145.

[4] Тамсама. S. 161—162.

[5] Тамсама. S. 164. Табл. 9.

[6] Тамсама. S. 169.

верасня 1534 г. Ніжнюю дату падказвае апошні радок «Родослова», дзе гаворыцца пра прыезд братоў Глінскіх у Маскву «служити Великому Князю Ивану Даниловичу всеа Руси». Здаецца, тут няма ніякай памылкі. Укладальнік меў на ўвазе сына Васіля III непаўналетняга Івана IV. Ужытае імя па бацьку павінна было падкрэсліць яго родавую прыналежнасць да дынастыі маскоўскіх Данілавічаў. Такім чынам, можна меркаваць, што «Подлинный родослов» паўстаў паміж 3 снежня 1533 г. (дата смерці Васіля III) і 15 верасня 1534 г. (дата арышту Міхаіла Львовіча). Твор паўстаў у атачэнні Глінскіх і мусіў ідэалагічна падмацаваць іх прэтэнзіі на вядучую ролю ў маскоўскім палітычным жыцці.

Перад укладальнікам радаводу стаяла задача паказаць знатнасць паходжання роду, засведчыць выключныя якасці і заслугі князя Міхаіла Львовіча і яго продкаў, абгрунтаваць палітычныя аспірацыі Глінскіх. Разам з тым твор быў прызваны забяспечыць пераемнасць рэальных ці ўяўных традыцый у самім родзе, сувязь паміж яго пакаленнямі. Радавод мусіў быць візітоўкай роду Глінскіх, якая б прэзентавала іх палітычнай эліце Маскоўскай дзяржавы.

Гэтая задача не была лёгкай. У родзе Глінскіх існаваў сапраўдны разрыў паміж мінулым і сучасным. Вымушаная эміграцыя ў Маскву ўяўлялася як адчужэнне ад папярэдняй традыцыі. Усё, што адносілася да сучаснага стану роду, кантраставала з яго папярэдняй гісторыяй. Сама ж мінуўшчына амаль не пакінула слядоў. Родавая памяць Глінскіх сягала не глыбей 30-х гг. XV ст. Аднак сама гісторыю роду ўяўлялася значна больш старажытнай і, як вынік, амаль недасягальнай. Мінуўшчына, якую мусілі адшукаць Глінскія, павінна была адпавядаць патрэбам той сучаснасці, у якой яны жылі і дзейнічалі.

Складанай праблемай, з якой мусіў сутыкнуцца ўкладальнік «Родослова», быў пошук неабходных крыніц. У першую чаргу, ён мог абаперціся на вусныя сведчанні жывых Глінскіх. Патрыярх роду, князь Міхаіл Львовіч, мог паведаміць яму пра сваю паездку ў Германію, адукацыю, далейшую службу пры двары польскага караля і вялікага князя літоўскага Аляксандра, бунт супраць новага гаспадара Жыгімонта Старога і эміграцыю ў Маскву. Аднак гэта блізкая гісторыя ахоплівала не больш за чатыры дзесяцігоддзі.

Акрамя гэтага, Міхаіл Львовіч мог паведаміць укладальніку тое, што чуў ад іншых. Але падобныя магчымасці таксама былі абмежаванымі. Яго бацька князь Леў Барысавіч памёр, калі Міхаіл Львовіч быў дзіцем, а дзед князь Барыс Іванавіч — яшчэ да нараджэння

ўнука. Даўно (у 1516 г.) памёр выхавацель і апякун Міхаіла Ян Літавор Храптовіч. Старэйшыя браты, князі Іван і Васіль, таксама ўжо даўно пакінулі гэты свет. Не выключана, што менавіта ад апошніх князь Міхаіл ведаў пра асобныя факты біяграфіі свайго дзеда. Але факты гэтыя адносіліся выключна да зямельных наданняў князю Барысу ў часы праўлення Жыгімонта Кейстутавіча і Казіміра Ягайлавіча. Гэта інфармацыя магла быць атрыманая і з пісьмовых крыніц: дакументаў, што зберагаліся ў доме Глінскіх, метрычных запісаў. Сам князь Міхаіл Львовіч як каралеўскі фаварыт меў доступ да дзяржаўнага архіва ВКЛ. Асобныя запісы Літоўскай Метрыкі пацвярджаюць інфармацыю «Родослова» пра наданне князю Барысу валасцей і гарадоў[7]. Пра бацьку князя Міхаіла, Льва Барысавіча, «Родослов» паведамляе вельмі сцісла. Ён толькі названы першым сярод сыноў. Па ўсёй верагоднасці, пры Льве Барысавічу сям'я не атрымлівала буйных зямельных наданняў і не прымала актыўнага ўдзелу ў палітычным жыцці дзяржавы. Такая гісторыя Глінскіх ахоплівае падзеі прыблізна стогадовай даўніны. У «Родослове» падкрэсліваецца сам факт службы князя Барыса вялікім князям літоўскім.

За гэтым стагоддзем, падзеі якога ў жыцці роду можна было паспрабаваць аднавіць на падставе вусных сведчанняў[8], прасціралася эпоха, якую чалавечая памяць ахапіць не здольная. Пра свайго прадзеда, князя Івана, браты Львовічы практычна нічога не ведалі. Аднак існуюць разнастайныя паданні і легенды, якія перадаюцца ад пакалення да пакалення. У родзе Глінскіх захоўвалася паданне пра іх татарскае паходжанне. Пра гэта яскрава сведчыць пасланне заволжскага хана Шах-Ахмата братам Львовічам, датаванае 1502 г.: «От Шы Ахмата цара маршалъку, князю Ивану, а князю Василью, а князю Михаилу. Вамъ тремъ прыятелемъ со многа многии поклонъ. Кият князя Мамаевы есте правыи дети, тамъ есте подле брата моего, а тут есте подле мене, у моемъ царстве, и справа, и злева. Вланы князей чотыры, корачы болшы киятовъ князей и брати вашое слуг у мене нетуте болшыхъ и лепшых»[9]. У дадзеным выпадку не так істотна, ці цар Шах-Ахмат выклаў Глінскім сямейнае паданне Кіятаў, ці тыя самі раней ведалі пра яго. Нельга выключыць, што гэта паданне браты Львовічы маглі чуць ад сваіх сваякоў, якія ездзілі з пасольствамі ў Крым. Там яны, несумненна, сустракаліся з асобнымі Кіятавічамі, у тым ліку з уплывовым Кіят-Мансурам. У часе знаходжання

[7] Русская историческая библиотека (далей — РИБ). Т. 27. Санкт-Петербург, 1910. Стлб. 31, 86, 93.
[8] Гене Б. История и историческая культура Средневекового Запада. Москва, 2002. С. 96—97.
[9] LM. Užrašymų knyga 5. P. 180.

ў Маскве, асабліва ў 1508—1514 і 1527—1534 гг., Міхаіл Львовіч Глінскі таксама меў мажлівасць сустракацца з крымскімі пасламі, а таксама з татарскімі мурзамі і бекамі, што знаходзіліся на службе вялікага князя маскоўскага. Ад іх ён мог даведацца пра паходжанне некаторых татарскіх родаў.

У татарскіх родаў, многія з якіх вялі свой пачатак ад мангольскай качавой арыстакратыі часоў Чынгізхана, традыцыя памяці адыгрывала вельмі важную ролю. Амаль кожная сям'я мела ўласны радавод. У абавязак бацькоў уваходзіла распавядаць дзецям пра іх паходжанне[10].

Радаводы знатных татарскіх родаў ярка высвечвалі культ Чынгізхана. Калі ў XII—XIV стст. у якасці продка выступаў легендарны Боданчар, муж Алан-гоа, то ў пазнейшыя часы, па меншай меры з XVI ст., гэтую ролю стаў выконваць сам Чынгізхан, рэальны роданачальнік кіруючай дынастыі[11]. Важную ролю ў радаводах адыгрывала атрыманне продкам тытула «хаган», а затым і «цар». Гэта было паказчыкам вышэйшай улады і легітымiравала прэтэнзіі на дамінуючую ролю ў грамадстве. У асобных паданнях адчуваецца таксама культ князя Мамая, якога нярэдка тытулуюць царом. Некаторыя Кіяты, асабліва крымскія, уводзілі былога ўладара Крыма ў свае радаводы як продка.

Ардынскія і крымскія Кіяты вялі сваё паходжанне ад Чынгізхана. Генеалогія Кіятавічаў ад Чынгіза да князя Мамая ўяўлялася агульнай для родаў як Мансур-Кіята, так і Глінскіх. Гэтую частку падання Львовічы маглі смела трактаваць як уласную. Аднак паміж Мамаем-князем і князем Іванам, прадзедам Львовічаў, заставалася пустка, якую трэба было запоўніць персанажамі і падзеямі. Эпоха Вітаўта, культ якога складваўся ў ВКЛ у другой палове XVI ст., не даносіла водгукаў пра гісторыю роду Кіятаў-Глінскіх.

Аднак гэта цяжкасць здавалася непераадольнай толькі на першы погляд. Для ўкладальніка існаваў шырокі фонд памяці, які ўключаў сістэму асабістых імёнаў і прозвішчаў, тытулаў і званняў, геаграфічных назваў, прыродных аб'ектаў і помнікаў, што захаваліся да яго часу. Ён мог таксама абаперціся на сістэму агульных паняццяў і сюжэтаў, распаўсюджаных у грамадстве[12].

Укладальнік «Радаслова», як і іншыя аўтры Сярэднявечча, імкнуўся прывязаць памяць і легенды да канкрэтных фізічных

[10] Юрганов А. Л. Категории русской средневековой культуры. С. 156.

[11] Скрынникова Т. Харизма и власть в эпоху Чингис-хана. Москва, 1997. С. 49.

[12] Halbwachs M. La mémoire collective. Paris, 1968. P. 241.

аб'ектаў. Для яго родавая памяць Глінскіх увасобілася перадусім у геаграфічных пунктах. Назвы гарадоў, адпаведна Глінск і Глінеск, з'яўляліся неабвержнымі доказамі легенды, якая прыпісвала продкам Глінскіх заснаванне гэтых гарадоў, а разам з імі і суседняй Палтавы[13]. Легенда пра наданне вялікім князем Вітаўтам прадзеду Львовічаў шматлікіх уладанняў захоўвалася ў назвах гарадоў і валасцей на тагачасным літоўска-маскоўскім памежжы: горад Хорабр, воласці Макошын, Сахочаў, Верх, Кабалонь (Абалонь)[14]. Таксама назва ракі Ворскла сведчыла не толькі пра буйную паразу Вітаўта ад татарскага хана Цімур-Кутлука, але і ўвасабляла легенду пра выратаванне продкам Глінскіх князем Іванам самога літоўскага ўладара[15].

Памяць пра значныя зямельныя ўладанні роду Глінскіх таксама з'яўлялася істотным элементам фізічнай памяці. Але разрыў са старой літоўскай традыцыяй нішчыў гэтую сувязь з прыродным ландшафтам. У 1530-я гг. у Маскве князь Міхаіл Львовіч мог ужо з пэўнай цяжкасцю аднавіць геаграфічную памяць свайго роду. Магчыма таму, некаторыя валоданні Глінскіх, згаданыя ў «Родослове», не маюць пацверджання ў пісьмовых крыніцах, што захаваліся да нашых дзён. Існаваннем 100-гадовага бар'ера можна вытлумачыць той факт, што Міхаіл Львовіч, а ўслед за ім укладальнік радаводу адносяць дзве розныя назвы аднаго і таго ж горада (Клецк і Клічаск) да розных гарадоў. А мажліва, у гэтым факце можна разгледзець пэўную палітычную тэндэнцыю. Наданне дзеду Львовічаў князю Барысу «Клиглическа» і Старадуба не пацвярджаецца дакументамі часоў Казіміра Ягайлавіча. Старадуб атрымаў сам князь Міхаіл Львовіч з рук вялікага князя маскоўскага Васіля III у 1527 г.[16]. Пра загадкавы «Клиглическ» нічога не вядома. Можна дапусціць, што гэты горад — калі пад ім сапраўды разумеецца гістарычны Клецк — быў «дададзены» ўкладальнікам да ўладанняў Барыса Іванавіча з мэтай падняць значнасць і прэстыж роду Глінскіх у часы Казіміра Ягайлавіча. Аўтарытэт Глінскіх у тыя часы павінен быў быць не меншым, чым у маскоўскі перыяд гісторыі роду. Для ўкладальніка абставіны кар'еры Глінскіх у Маскве вызначалі стаўленне да гісторыі роду ў Літве. Адносна «Клиглическа» можна меркаваць, што ён быў уключаны ў склад валоданняў Глінскіх на той падставе, што ім у другой палове XV — першай чвэрці XVI стст. валодалі збеглы маскоўскі князь Іван Васілевіч Яраславіч і яго сын Фёдар, вотчыну якіх (Бароўск) князь

[13] ВИМОИиДР. Кн. 10. С. 195.

[14] Тамсама. С. 196.

[15] Тамсама. С. 196.

[16] Pociecha W. Gliński Michał // Polski Słownik Biograficzny. T. 8. S. 68.

Міхаіл атрымаў пасля эміграцыі ў Маскву. Тут можна ўбачыць тэндэнцыю: уладальнік вотчыны збеглага князя высоўвае прэтэнзіі на валоданні, якія апошні атрымаў ад свайго новага ўладара. Мэтай было ўзняцце прэстыжу роду Глінскіх, гісторыя якога складалася. Дарэчы, і Старадуб у 1446—1454 гг. (часы Казіміра Ягайлавіча) належаў бацьку Івана Васілевіча Яраславіча — князю Васілю Яраславічу[17]. Магчыма, у гэтым факце крыецца праява нейкага канфлікту паміж родамі Глінскіх і Бароўскіх падчас побыту першых у Літве[18].

У розных галінах роду Глінскіх ужываліся таксама прозвішчы (мянушкі). У афіцыйных дакументах ВКЛ князь Іван Львовіч ужо ў 80-я гг. XV ст. называецца Мамаем (Манаем)[19]. Яго брат Васіль меў прозвішча «Сляпы»[20]. Нарэшце, трэці брат Міхаіл пасля пераезду ў Масковію нярэдка называўся «Немцам» або «Дародным»[21]. Гэтыя прозвішчы маглі адлюстроўваць паходжанне, фізічны стан, манеры і звычаі.

### 2.1.2. Крыніцы па гісторыі роду князёў Глінскіх. «Подлинный родослов Глинских князей»

«Родослов» складаецца з трох частак: (1) аповед пра продкаў Глінскіх — князёў Кіятаў; (2) прыезд князя Алексы — Аляксандра з сынам Іванам на службу да вялікага князя літоўскага Вітаўта; (3) служба князёў Глінскіх у Літве. Апошні з трох вызначаных у «Родослове» перыядаў заканчваецца сціслым паведамленнем пра прыезд братоў Львовічаў на службу ў Маскву. Такі падзел надаў гісторыі Глінскіх контуры. Персанажы і падзеі размешчаны ў творы ў храналагічным парадку, але ўкладальнік не дае ніякіх даціровак. Уся гісторыя Глінскіх адбываецца ў храналагічна нявызначаных рамках ад вандравання Кіятаў у паволжскіх стэпах да эміграцыі Львовічаў у Маскву.

Што да геаграфічных рамак, то тут галоўным арыенцірам для ўкладальніка з'яўлялася рака Волга, якая дзеліць прастору на дзве

[17] Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. T. 11. Warszawa, 1890. S. 247.

[18] Князь Барыс Глінскі быў жанаты з удавой князя Івана Карыбута, унучка якога (дачка Фёдара Варатынскага) была замужам за Іванам Яраславічам (Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою Комиссиею (далей — АЗР). Т. 1. Санкт-Петербург, 1846. С. 364).

[19] «Князю Мамаю 7 копъ съ корчомъ тамъ жо, а 7 копъ з мыта тамъ жо» (РИБ. Т. 27. Стлб. 195). Маюцца на ўвазе корчмы ў Эйшышках і мыта ў Берасці.

[20] Pociecha W. Gliński Wasyl // Polski Słownik Biograficzny. T. 8. S. 69; Герберштейн С. Записки о Московии / Под ред. В. Л. Янина. Москва, 1988. С. 87, 111, 191.

[21] Разрядная книга 1475—1605 гг. Т. 1. Ч. 1. Москва, 1977. С. 103.

часткі. Укладальнік прывязвае гісторыю роду Глінскіх да правабярэжжа Волгі. Усе падзеі адбываюцца ў гэтай прасторы.

Кожны з трох перыядаў мае сваіх галоўных персанажаў і герояў, з якімі звязаны ключавыя падзеі. Галоўны персанаж першай часткі «Радаслова» — напаўлегендарны продак Глінскіх Мансур-Кіят. Ключавая падзея гэтага перыяду — заснаванне Мансур-Кіятам гарадоў Палтава, Глінск і Гліміца. Постаць Мансур-Кіята з'ўлялася ідэальным тыпам князя-будаўніка. Гарады, заснаванне якіх яму прыпісвала традыцыя, далі яго продкам родавае імя, якое і забяспечыла ім трывалую самаідэнтыфікацыю. Першы перыяд, які можна ўмоўна назваць качавым, заканчваецца ад'ездам малодшага сына Мансур-Кіята Скіндара ў Крым. Старэйшы сын Алекса застаўся ў тых гарадах, якія заснаваў яго бацька[22].

Чынгізхан і Мамай таксама належаць да гэтага перыяду. «Родослов» паведамляе пра змаганне Кіятаў з Чынгізханам і іх наступнае прымірэнне, якое было замацавана шлюбам прадстаўнікоў родаў. Тым самым падкрэсліваецца кроўнае радства Кіятаў і Чынгізідаў, хоць і па жаночай лініі. У творы паведамляецца, што Чынгіз выдаў сваю дачку Залахуб за нейкага Бурлуда, а сам узяў жонку з роду Кіят. Нельга выключыць, што гэты Бурлуд паходзіў з Кіятаў, бо для Чынгізавай эпохі была ўласціва дуальнасць шлюбных адносін[23]. У той час з'явілася ўжо новая форма шлюбу, калі жонак бралі з іншых родаў. Аднак, несумненна, што вусная традыцыя, пакладзеная ў аснову першай часткі «Родослова», у цэлым дакладна адлюстроўвала сутнасць шлюбных адносін у мангольскім грамадстве эпохі Чынгізхана. Думка пра шлюбныя сувязі паміж Кіятамі і Чынгізам магла ўзнікнуць з наступных прычын. Па-першае, абодва роды вялі сваё паходжанне ад агульнага продка Хабул-хана; па-другое, Кіяты маглі быць паказаны сваякамі Чынгіза і яго нашчадкаў таму, што гэтага патрабавалі абставіны, у якіх паўстала легенда.

Далей легенда апавядае пра цесныя сувязі Кіятаў з Чынгізідамі, а таксама з князем Мамаем, які быў сваяком Чынгізідаў па жаночай лініі. Асаблівая ўвага акцэнтуецца на тым, што ў гэты час Кіяты вярнулі сабе царскі тытул, якім яны валодалі да прыходу Чынгізхана. Цікава, што ў «Родослове» Мамай названы царом. Гэта можа сведчыць на карысць крымскага паходжання легенды, бо шэраг тагачасных татарскіх родаў выводзілі сваё паходжанне ад былога правіцеля Крыма. Дэклараваныя ў творы сыноўства Мансур-Кіята[24] і бацькоўства Ма-

[22] ВИМОИиДР. Кн. 10. С. 195.

[23] Скрынникова Т. Харизма и власть… С. 18—20.

[24] Тамсама. С. 30—32.

мая адлюстроўвалі сацыяльную арганізацыю залатаардынскага грамадства: «сын» падпарадкоўваецца «бацьку», удзельнічае ў ваенных кампаніях апошняга, прыносіць яму даніну. «Бацька», у сваю чаргу, дзеліцца з «сынам» здабычай, дапамагае яму ў цяжкіх сітуацыях. Такія адносіны азначаюць асаблівую форму радства, але не кроўнага, а ўяўнага. Аўтар легенды, а ўслед за ім і ўкладальнік «Родослова» звялі форму ўяўнага радства, якім характарызаваліся адносіны Кіятаў з Чынгізідамі і Мамаем, да кроўнага. Гэтым самым было падкрэслена іх высакароднае паходжанне.

Галоўным героем другой часткі з'яўляецца князь Іван Аляксандравіч, унук Мансур-Кіята. Ён увасобіў ідэальны тып князя, што прыняў хрысціянскую веру і пасля верна служыў свайму новаму ўладару, вялікаму князю літоўскаму Вітаўту. У «Родослове» паведамляецца, што пасля прыезду князя Івана з бацькам на службу да Вітаўта той надаў ім воласці Станка, Хоразаў, Серакаў, Гладкавічы. Калі Станка (Ставак) і Гладкавічы сапраўды належалі Глінскім[25], то наконт Серакава і Хоразава няма пэўнасці. Вядома толькі, што Казімір Ягайлавіч пацвердзіў баярыну Пешку маёнткі Серхаў і Харахорын, што таму калісьці надаў князь Свідрыгайла[26].

У апавяданні гаворыцца таксама пра шлюб князя Івана Аляксандравіча з дачкой князя Данілы Астрожскага Настассяй. Гэты факт не пацвярджаецца іншымі крыніцамі, але, зыходзячы з характару адносін Глінскіх і Астрожскіх з Карыбутавічамі (Фёдар Данілавіч Астрожскі ўдзельнічаў у чэшскай выправе Фёдара Карыбутавіча 1422 г., а ўдава яго сына пазней выйшла замуж за Барыса Глінскага), нельга выключаць такой мажлівасці. Ад гэтага шлюбу нарадзіліся сыны Барыс (дзед Міхаіла Львовіча), Фёдар і Сямён.

У другой частцы «Родослова» ўвага ўкладальніка засяроджваецца на падзеях, звязаных з бітвай на Ворскле. Ён апавядае пра змаганне Вітаўта з татарскім ханам Цімур-Кутлукам, паражэнне літоўскага ўладара ад татарскага войска. Далей укладальнік паведамляе, што падчас уцёкаў Вітаўта яго суправаджаў Іван Аляксандравіч. Вялікі князь заблукаў і стаў прасіць князя Івана: «Только выведуть меня твои вожи к моей Украине, к которым моим городам или к волостем; и я теми городы и волостьми тебя пожалую»[27]. За выратаванне гаспадара князь Іван атрымаў ад яго тыя гарады і воласці, куды яны прыбылі: горад

[25] LM. Užrašymų knyga 8. P. 252.

[26] РИБ. Т. 27. Стлб. 95.

[27] ВИМОИиДР. Кн. 10. С. 196.

Хорабр, воласці Макошын, Сахочаў, Верх, Абалонь. Апісанне надання князю Івану згаданых населеных пунктаў не грунтуецца на рэальных фактах, а толькі адлюстроўвае тагачасны стан літоўска-маскоўскай мяжы. Апісанне выратавання вялікага князя Вітаўта грунтуецца на распаўсюджаным у Сярэднявеччы сюжэце пра збаўленне воінам свайго ўладара. Гэты сюжэт увайшоў у легенды пра паходжанне некаторых тагачасных літоўскіх сем'яў. Так, згодна традыцыі, продак Валовічаў Юрый Вол прыкрываў адыход караля Казіміра Ягайлавіча пасля паразы ў бітве пад Хойніцамі (1454 г.), за што атрымаў ад яго значныя зямельныя наданні ў Гарадзенскім павеце[28].

Прыезд Алексы на службу Вітаўту і аповед пра выратаванне Вітаўта сынам Алексы павінен быў не толькі паказаць асаблівыя заслугі продка Глінскіх, але таксама вытлумачыць прыхільнасць вялікіх князёў літоўскіх да гэтага роду. Аповед пра князя Івана мае важнае значэнне ва ўсёй структуры «Радослова». Ён з'яўляецца мостам паміж легендарным паданнем пра вытокі роду Глінскіх і «жывой памяццю» ўкладальніка. У ім адлюстраваліся сітуацыя і патрэбы сучаснасці. Прыезд продка Глінскіх да вялікага князя Вітаўта разумеўся ў тых жа катэгорыях, што і прыезд братоў Львовічаў на службу да вялікага князя маскоўскага. Лепш за ўсё пра гэта сведчыць тэрміналогія: «… и князь Иванъ и съ отцемъ своимъ Александромъ сотворили хотение великого князя Витовта, и приехали къ нему, и били челомъ ему въ службу съ своими прдреченными тремя городы…»[29]. У канцы «Радослова» прыезд братоў Глінскіх у Маскву апісваецца ў тых жа словах: «…а отъ короля отъ Жигимонта изъ Литвы князь Михайло Глинской съ братією, и со всеми людьми своими со многими, и съ дворяны королевскими, пріехали къ Москве служити великому князю Ивану Даниловичу (sic!) всеа Русіи»[30]. У абодвух выпадках падкрэсліваецца добраахвотны характар учынкаў.

Галоўны персанаж трэцяй часткі — сам Міхаіл Львовіч Глінскі. Гэты раздзел пачынаецца з апісання наданняў, якія яго дзед Барыс Іванавіч атрымаў ад вялікага князя літоўскага Жыгімонта і караля Казіміра Ягайлавіча. Пасля згадкі, што дзеці Барыса служылі ў Літве, укладальнік пераходзіць непасрэдна да біяграфіі Міхаіла[31]. Аповед пра яго жыццёвы шлях аўтар распачынае з паведамлення пра пасольства Яна Літавора Храптовіча «въ Немцы». Яна Літавора

[28] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 93, 138.

[29] ВИМОИиДР. Кн. 10. С. 196.

[30] Тамсама. С. 197.

[31] Тамсама. С. 197.

суправаджаў яго выхаванец князь Міхаіл, які пасля заканчэння дыпламатычнай місіі застаўся ў Германіі працягваць адукацыю. Пасля вяртання дамоў Міхаіл служыў Аляксандру Казіміравічу: «…и король Александро взялъ князя Михаила Глинского Львовича къ себе во дворъ, и учинилъ его моршалком дворным»[32]. Галоўная падзея гэтага перыяду — бунт князёў Львовічаў: «И после королевы Александровы смерти селъ, на королевскомъ и литовскомъ государстве, въ Литве братъ его король Жигимонтъ и не почалъ его (князь Міхаіл. — *У. К.*) жаловати; и князь Михайло Глинской своею родною братьею большими: со княземъ Иваномъ, и со княземъ Васильемъ, и со княземъ Федоромъ убили у короля, у Жигимонта, боярина его Яна Березинского и казну его всю взяли»[33]. Раздзел заканчваецца паведамленнем пра ад'езд братоў Львовічаў ад караля Жыгімонта і іх прыезд да вялікага князя маскоўскага.

Па сутнасці, заканчэнне трэцяй часткі апавядання з'яўляецца пачаткам чацвёртай, якая ў тэксце адсутнічае. Падзеі, што адбываліся пасля эміграцыі Глінскіх у Маскву, належалі да таго самага перыяду, у якім жыў аўтар «Родослова». Гэты перыяд гісторыі роду Глінскіх-Львовічаў, непасрэдным сведкам якога з'яўляўся ўкладальнік радаводу, не завершаны.

Маскоўскі перыяд жыцця князя Міхаіла Львовіча з'яўляецца адлюстраваннем князя Івана, унука Мансур-Кіята. Падзеі і абставіны ўласнага часу паўплывалі на бачанне ўкладальнікам «Родослова» мінулага Глінскіх і знайшлі адлюстраванне ў сканструяванай ім версіі іх гісторыі. Якім уяўляўся ўкладальніку маскоўскі перыяд жыцця Глінскіх, можна зразумець са зместу другой часткі апавядання. Прыезд князя Івана ў Літву і яго служба Вітаўту — гэта свайго роду архетып, які мусілі паўтараць яго нашчадкі князі Львовічы пасля прыезду ў Маскву і паступлення на службу да вялікага князя[34]. Такім чынам, сучаснасць князя Міхаіла адбілася ў мінулым яго продка.

Са з'яўленнем «Подлинного родослова Глинских князей» род атрымаў выклад уласнай гісторыі. Радавод быў калектыўнай памяццю Глінскіх-Львовічаў. «Подлинный родослов», які быў створаны

---

[32] ВИМОИиДР. С. 197.

[33] Тамсама. С. 197.

[34] У сувязі з гэтым цікавымі ўяўляюцца суадносіны тыпалагічнай пары «Вітаўт — Іван IV». Многія сучаснікі адзначалі, што новы вялікі князь маскоўскі (з 1547 г. — цар) увабраў усе тыя лепшыя рысы ўладара, якія былі ўласцівыя Вітаўту. Такой думкі прытрымліваліся некаторыя публіцысты свайго часу. Так, Міхалон Літвін, спасылаючыся на меркаванні сучаснікаў, пісаў, што Іван IV Васілевіч сваім ладам жыцця намагаецца быць падобным на Вітаўта (Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 80).

ў перыяд вострай палітычнай барацьбы паміж баярскімі групоўкамі, мусіў служыць палітычнай зброяй. Поспеху ў такой барацьбе маглі дасягнуць толькі найбольш інтэграваныя групы з высокім узроўнем самаідэнтыфікацыі, састаўной часткай якой і з'яўлялася калектыўная памяць. Такія групы абаронены, звычайна, не толькі эканамічна і палітычна, але і псіхалагічна — праз усведамленне свайго высокага статусу і ролі ў грамадстве. Але, самае галоўнае, адноўленае мінулае як міф павінна было служыць мадэллю, узорам для сённяшніх і будучых прадстаўнікоў роду.

### 2.1.3 Кіяты і Чынгізхан

Племя кіятаў у XIII ст. качавала ў стэпах Манголіі. Тагачасны летапісец Рашыд ад-Дзін падрабязна апавядае пра плямёны і роды, з якіх складаўся мангольскі этнас. Уласна манголы дзяліліся на манголаў-нірунаў і манголаў-дарлекінаў. Да манголаў-нірунаў, якія яшчэ называліся кіятамі, адносіліся тыя плямёны і роды, што вялі сваё паходжанне ад легендарнай Алан-Гоа. Пры гэтым плямёны, якія паходзілі з роду Алан-Гоа да шостага пакалення, адносіліся да нірунаў. У сваю чаргу, тыя з нірунаў, што вялі свой род ад шостага пакалення Алан-Гоа, ад Хабул-хана, зваліся кіятамі[35]. Тыя, што з'яўляліся прамымі нашчадкамі Хабул-хана, лічыліся кіят-барджыгінамі. Доўгі час на чале кіят-барджыгінаў стаяў Есугэй-багатур, унук Хабул-хана, бацька Тэмуджына — будучага Чынгізхана. Адзначым, што да нірунаў, акрамя кіят-барджыгінаў і ўласна кіятаў, належалі яшчэ тайджыуты, салджыуты, катакіны, дурбэны, баарыны, уруты, мангуты, барул асы, ісуты і інш.

Узначальваў племя Кіят яшчэ да Чынгіза Менгету-кіян. Пасля яго смерці кіраваць племем у якасці эміраў-тысяцкіх пачалі яго дзеці Кукі-наён і Мугэту-бахадур[36]. Кіяты, відавочна, не ўдзельнічалі ў еўрапейскім паходзе хана Батыя. Тысяча Кукі-наёна і Мугэту-бахадура засталася ў Манголіі пад камандай сына Чынгізхана Тулуя (Тулі)[37].

Перасяленне кіятаў у створаную нашчадкамі Батыя дзяржаву — Залатую Арду — адбылося недзе напрыканцы XIII ст. пры хане Такце (1290—1312). У гэты час кіяты, разам з тайджыутамі, кінкітамі

[35] Рашид-ад-дин. Сборник летописей. Т. 1. Кн. 1. Москва—Ленинград, 1952. С. 73—75, 152—153.

[36] Федоров-Давыдов Г. А. Общественный строй Золотой Орды. Москва, 1973. С. 46.

[37] Тизенгаузен В. Г. Сборник материалов, относящихся к истории Золотой Орды. Т. 2. Москва—Ленинград, 1941. С. 33.

і хушынамі, складалі аснову мангольскага войска ў Залатой Ардзе[38]. Адзін з туменаў Такты складаўся выключна з кіятаў[39]. Пераход кіятаў на службу хану Такце і перасяленне ў волжскія стэпы былі выкліканы, несумненна, усталяваннем сяброўскіх адносінаў паміж урукам (родам) Тулуй-хана, якому служылі кіяты, і ўрукам Джучы-хана, нашчадкі якога валодалі тронам у Залатой Ардзе[40].

Вядома, што трэці сын Тулуй-хана Кутукту меў толькі адну дачку Кельміш-ака, якую ён аддаў замуж за эміра Салджыдай-гургана з племені конгурат. Гэты эмір служыў Такце і памёр у 1302 г.[41]. Тады ж, відавочна, кіяты і перайшлі на службу хану Такце. На далейшы лёс кіятаў сур'ёзна паўплывала ўнутрыпалітычнае становішча Мангольскай імперыі. У пачатку праўлення Такты спыніла сваё існаванне ў Каракаруме старэйшая кіруючая галіна Чынгізідаў — лінія Угэдэя. У Мангольскай імперыі напрыканцы XIII ст. узмацніліся дэцэнтралізатарскія тэндэнцыі. Ужо пры папярэдніку хана Такты, хане Менгу-Цімуру, адбылося фактычнае аддзяленне джучыцкіх ханаў ад вялікага каана ў Каракаруме. Адзіны род Чынгіза распаўся, і пачаўся працэс умацавання асобных яго галін. Пазіцыі Джучыдаў у гэты час рэзка ўмацаваліся. Пры ханах Узбеку (1312—1342) і Джанібеку (1342—1357) Залатая Арда перажывала свой зорны час.

На службе джучыдскіх ханаў кіяты па старой традыцыі выконвалі ваенныя функцыі. Яны мусілі ўдзельнічаць на баку хана Такты ў барацьбе з ханам Нагаем, прэтэндэнтам на залатаардынскі трон. Верагодна, ханы Залатой Арды выкарыстоўвалі кіятаў у якасці ваеннай сілы ў супрацьстаянні з уладарамі Персіі, асабліва пасля распаду там у першай палове XIV ст. мангольскай дзяржавы. Нельга выключыць магчымасць удзелу кіятаў у збройнай канфрантацыі залатаардынскіх ханаў з уладарамі Літвы і Русі ў сярэдзіне XIV ст. Але прадстаўнікі роду выкарыстоўваліся не толькі на вайсковай службе. Вядомы выпадак, калі выхадзец з кіятаў выконваў дыпламатычныя даручэнні[42].

У 1315 г. хан Узбек пасылаў нейкага Азбуку (Azbuka) з племені кіятаў да персідскага ільхана Ходабэнда з прычыны нападу военачальніка апошняга Баба на Харасан.

---

[38] Греков Б. Д., Якубовский А. Ю. Золотая Орда и ее падение. Москва—Ленинград, 1950. С.100.

[39] Тизенгаузен В. Г. Сборник материалов, относящихся к истории Золотой Орды. Т. 2. С. 33.

[40] Пра адносіны гэтых двух родаў: Тамсама. Т. 2. С. 50.

[41] Тамсама. Т. 2. С. 50.

[42] Hammer-Purgstall J. Geschichte der Goldenen Horde in Kiptschak. Pest, 1840. S. 283—284.

Служба залатаардынскім ханам мусіла, несумненна, паўплываць на культурную дамінанту роду. На працягу стагоддзя, калі кіяты качавалі ў стэпах паміж Волгай і Дняпром, яны не маглі не зведаць на сябе культурнага ўплыву плямёнаў, якія іх акружалі. Пастунова адзін са знакамітых і старэйшых мангольскіх родаў цюркізаваўся. Гэта тычылася, галоўным чынам, мовы. Замест мангольскай эліта ўсё часцей стала выкарыстоўваць кіпчака-агузскія дыялекты. Разам з мовай змянілася рэлігія. У часы Узбека многія мангольскія роды, у тым ліку, несумненна, кіяты, мусілі прыняць іслам. Разам з тым, яны захоўвалі вернасць старым мангольскім звычаям і традыцыям.

### 2.1.4. Князь Мамай

У пачатку 60-х гг. XIV ст. адзіная дагэтуль залатаардынская дзяржава раскалолася на дзве часткі. Мяжой паміж імі стала Волга. У той час, калі ў левабярэжнай Ардзе адбываліся бясконцыя міжусобіцы, у правабярэжнай ад імя залежных ад яго ханаў непадзельна кіраваў князь Мамай. Акрамя таго, паміж гэтымі дзвюма ордамі амаль дваццаць гадоў (да 1380 г.) ішла несупынная барацьба за ўладу ў колішнім улусе Джучы.

Згодна з татарскімі крыніцамі (у прыватнасці, ʻAbd el-Gaffār), князь Мамай паходзіў з племені кіятаў[43]. Ён меў несумненныя воінскія здольнасці і з'яўляўся вайсковым камандзірам татараў (цемнікам). Не будучы ад нараджэння Чынгізідам па прамой лініі, Мамай вымушаны быў прыкрываць сваю ўладу ў заходняй частцы Залатой Арды марыянетачнымі фігурамі ханаў з дынастыі Чынгіза. Сам жа ён быў жанаты з дачкой хана Бердзібека, што быў забіты ў 1359 г., пасля чаго ў Залатой Ардзе пачаўся працяглы перыяд унутраных канфліктаў.

Князь Мамай бліскуча скарыстаўся ўнутрыардынскімі міжусобіцамі. Ён здолеў распаўсюдзіць сваю ўладу ад Каспійскага мора да Дняпра і Крыма. Нягледзячы на шматлікія спробы, яму, аднак, так і не ўдалося захапіць сталіцу Залатой Арды Сарай[44].

Пад непасрэднай юрысдыкцыяй Мамая знаходзіліся землі ў басейне ракі Ворсклы на татарска-рускім памежжы[45]. Глінск, як і іншыя гарады, таксама быў пад уладай татараў Мамая. Другая пало-

[43] Spuler B. Die Goldene Horde. Die Mongolen in Russland 1223—1502. Leipzig, 1943. S. 112.

[44] Historical Dictionary of medieval Russia / Ed. L. Langer. London, 2002. P. 120—121.

[45] Летапісы XV—XVI стст. адзначаюць, што землі ў басейне ракі Ворскла знаходзіліся пад непасрэднай юрысдыкцыяй татарскіх ханаў. Так, рускі кніжнік, апісваючы месца бітвы 1399 г., лакалізаваў яго «у реки Ворсклы в Татарской земле». Гл.: Русина О. В. Україна під татарами і Литвою. Київ, 1998. С. 36.

ва XIV ст. была часам узмоцненай татарскай каланізацыі рэгіёна. З цюркскай каланізацыяй было цесна звязана фарміраванне ў гэтым рэгіёне тэрытарыяльных утварэнняў татарскіх феадалаў. Адным з такіх апорных пунктаў татарскай улады ў Падняпроўі была «цьма» татарскага князя Ягалдая Сараевіча, якая размяшчалася ў вярхоўях Псла, Северскага Данца, Сейма і Аскола і праіснавала да канца XV ст.[46]. Такім жа татарскім «феодам» у Падняпроўі з'яўляўся Сніпарод, заснаванне якога звязвалася ў калектыўнай памяці пазнейшых насельнікаў з выхадцамі з Паўночнага Каўказа[47]. Глінск таксама з'яўляўся важнейшым фарпостам татарскай улады ў Падняпроўі[48].

Кім былі першыя татарскія латыфундысты ў басейне Ворсклы і, у прыватнасці, у Глінску? Нашчадкамі каго былі князі Глінскія? Каб адказаць на гэтыя пытанні, неабходна высветліць родавую сувязь будучых князёў Глінскіх з князем Мамаем. Як было згадана, «Подлинный родослов Глинских князей» упрост прыпісвае ім паходжанне ад князя Мамая. Большасць даследчыкаў, аднак, успрымае гэтыя звесткі як легендарныя. Так, радавод Глінскіх утрымлівае шэраг фальклорных матываў, легендарных звестак. Але адначасова ён мае рэальнае ядро адносна паходжання гэтага татарскага роду. Увогуле памяць цюркскіх народаў надзвычай трывала захоўвае родавыя і генеалагічныя сувязі. Звесткі радаводу Глінскіх пацвярджаюцца афіцыйнымі крыніцамі. Так, у 1502 г. заволжскі хан Шах-Ахмат звяртаўся да Івана, Васіля і Міхаіла Глінскіх: «Кият князя Мамаевы есте правыи дети…»[49]. Хто-хто, а хан Заволжскай Арды мусіў дакладна ведаць паходжанне найбуйнейшых татарскіх родаў. Да таго ж, ад часу смерці Мамая мінула ўсяго сто з нечым гадоў. Другі татарскі хан, крымскі хан Менглі-Гірэй, звяртаўся да князя Міхаіла Глінскага як «брат», г. зн. як да роўнага. Адзін з братоў трыумфатара Клецкай бітвы 1506 г. князь Васіль Глінскі меў мянушку «Мамай», якая ўказвала на яго паходжанне. Больш таго, у асобных дакументах ён, у адрозненне ад сваіх малодшых братоў, выступае выключна пад гэтым імем[50]. Можна запярэчыць, што тут маецца на ўвазе нейкі іншы Мамай, тым больш, што ў татарскім свеце гэтае імя было

[46] Петрунь Ф. Ханські ярлики на українські землі // Східний світ. 1929. № 2. С. 176—177; Русина О. В. Україна під татарами і Литвою. С. 63.

[47] Петрунь Ф. Ханські ярлики на українські землі. С. 181.

[48] Тамсама. С. 180—181.

[49] LM. Užrašymų knyga 5. P. 180.

[50] «Князю Манаю 7 копъ съ корчомъ тамъ жо, а 7 копъ з мыта тамъ жо. Брату его, князю Василью 5 копъ з мыта тамъ жо. Брату жъ ихъ Федору 3 копы съ корчомъ тамъ жо, а 3 копы зъ мыта тамъ жо…» (РИБ. Т. 27. Стлб. 195).

дастаткова распаўсюджаным. Нашчадкі арыстакратычных родаў у ВКЛ нярэдка бралі імёны сваіх славутых продкаў, як, напрыклад, віленскі біскуп Павел Аляксандравіч Гальшанскі, які выкарыстоўваў імя свайго продка, Альгімант. Сярод асобаў, якія насілі імя Мамай, залатаардынскі князь быў несумненна самым вядомым і знаным.

У святле гэтых фактаў мы можам канстатаваць, што род Глінскіх паходзіў непасрэдна ад князя Мамая, славутага татарскага военачальніка і дзяржаўнага дзеяча, які належаў да роду кіятаў. Нават калі гэтая сувязь была плёнам уяўлення князёў Глінскіх-Львовічаў.

Па ўсёй верагоднасці, басейн ракі Ворскла з гарадамі Глінск, Глечаніца і Палтава з'яўляўся латыфундыяй роду Мамая або ўласнасцю яго сыноў. Пра татарскую каланізацыю гэтых земляў у часы Мамая ўскосна сведчаць асобныя тапонімы: Мамай-сурка, Мамаева ўрочышча і інш.[51]. Дарэчы, цікавым уяўляецца меркаванне тых даследчыкаў, якія лічаць, што знакамітая бітва 1381 г. паміж Мамаем і Тахтамышам адбывалася не на рацэ Калка, якая ўпадае ў Азоўскае мора, а на рацэ Калмак, Кальчанцы (Кальчане), прытоку Ворсклы[52].

### 2.1.5. Княства Мансур-Кіята

Пасля забойства ў 1381 г. у Кафе Мамая землі ў Глінску і суседніх гарадах мусілі перайсці да яго нашчадкаў. Невядома, колькі сыноў было ў Мамая і якія імёны яны мелі. Радавод Глінскіх згадвае аднаго сына Мамая — Мансур-Кіята. Некаторыя сучасныя Мамаю ўсходнія і рускія крыніцы згадваюць яго асобных сыноў, не называючы, аднак, іх па імёнах. Не выключана, што Мамай мог мець мноства сыноў, з якіх законным прызнаваўся толькі адзін. Магчыма, што апошні насіў імя Мансур-Кіят.

Княства Мансур-Кіята знаходзілася на паўночнай ускраіне качавой тэрыторыі татараў, нашчадкаў полаўцаў, якія падпарадкоўваліся Мамаю і яго продкам. Менавіта тут, у раёне Палтавы, на мяжы стэпавай і лясной прыродных зон жылі нашчадкі Мамая. У сацыяльна-эканамічным плане княства Мансура не было тыповым феадальным утварэннем. Мясцовыя князі, хутчэй, былі падобныя на казацкіх атаманаў, а насельніцтва ўяўляла сабой ваенізаванае саслоўе, якое сумяшчала гаспадарчую дзейнасць з ваеннымі

[51] Сафаргалиев М. Г. Распад Золотой Орды. Саранск, 1960. С. 143; Ляскоронский В. Г. Русские походы в степи в удельно-вечевое время и поход кн. Витовта на татар в 1399 году // Журнал Министерства народного просвещения. 1907. № 5. С. 9.

[52] Сафаргалиев М. Г. Распад Золотой Орды. С. 143.

набегамі на суседзяў. Думаецца, што напрыканцы XIV ст. княства Мансура перажывала гаспадарчы бум, звязаны з асваеннем новых земляў. На бацькоўскай вотчыне Мансур-Кіят зарэкамендаваў сябе як дбайны і ініцыятыўны гаспадар, пра што сведчыць радавод Глінскіх: «И после Донского побоища Мамаевъ сынъ Мансуръ-Кият князь зарубилъ три городы Глинескъ, да Полдову, да Глеченицу»[53]. Пад словам «зарубилъ» у дадзеным выпадку мусіць разумецца «аднавіў», «адбудаваў», але не «заснаваў», бо згаданыя гарады існавалі раней. Магчыма, Глінеск, Палтава і Глечаніца былі разбураны ў выніку татарскіх міжусобіц або паходаў Тамерлана ў 80—90 гг. XIV ст. Не выключана, што ў ходзе выправы 1395 г. Тамерлан спустошыў Падняпроўе[54].

У этнічным плане княства Мансура было прадстаўлена змешаным цюрка-славянскім насельніцтвам. Думаецца, што маюць рацыю тыя даследчыкі, якія мяркуюць, што ва ўладаннях памежных татарскіх князёў, такіх як Ягалдая або Мансура Мамаевіча, меў месца працэс мірнага суіснавання і паступовага зліцця цюркскай і славянскай груп насельніцтва. Мірнаму суіснаванню спрыяла адзінства эканамічнай сістэмы і гаспадарчага ўкладу. Эканамічная сістэма лесастэпавай зоны, заснаваная на сінтэзе дамінуючай жывёлагадоўлі пашавага тыпу з другасным земляробствам на аснове аблогі, паўкачавы гаспадарча-бытавы ўклад спрыялі мірнаму суіснаванню і паступовай інтэграцыі дзвюх этнічных груп. Працэс інтэграцыі не заўжды (асабліва ў XIV—XV стст.) меў характар сталага і аднабаковага аславяньвання цюрка-татарскага насельніцтва. Мяшанае цюрка-славянскае насельніцтва было зародышам пазнейшага казацтва.

Княства Мансура знаходзілася на мяжы не толькі дзвюх прыродных зон, стэпавай (лесастэпавай) і лясной, у кантактнай зоне двух вялікіх этнасаў, цюркаў і славян. Яго дзяржава ўяўляла сабой буфернае ўтварэнне, якое аддзяляла Залатую Арду ад ВКЛ. Гэта акалічнасць адыграе значную ролю ў лёсе нашчадкаў Мансура.

### 2.1.6. Князь Алекса Мансуравіч

Пасля гібелі Мамая землі паміж Волгай і Дняпром перайшлі пад юрысдыкцыю хана Тахтамыша, які аднавіў былое дзяржаўнае

[53] ВИМОИиДР. Кн. 10. С. 195.

[54] Падрабязней пра выправу Тамерлана ў Падняпроўе гл.: Hammer-Purgstall J. Geschichte der Goldenen Horde… S. 360—361.

адзінства ўлуса Джучы. Нашчадкі Мамая, па ўсёй верагоднасці, былі вымушаны прызнаць яго ўладу. Магчыма, яны, як і многія кіяты, бралі ўдзел у войнах Тахтамыша з Тамерланам (Цімурам). Так, у бітве 1391 г. на рацэ Белай удзельнічаў нейкі Урусчук — кіят[55]. У гэтай бітве ў палон да Цімура-Тамерлана трапіў сын і Мамая, імя якога невядомае.

Невядома, як склаўся далейшы лёс сына Мамая. Магчыма, Мансур-Кіят (калі гэта сапраўды быў ён) так ніколі не вярнуўся дадому з варожага палону і там скончыў свой жыццёвы шлях. Але, ва ўсялякім разе, ён пакінуў уласных нашчадкаў. Згодна радаводу Глінскіх, імі былі Скідэр і Лекса. На жаль, гэтыя імёны дайшлі да нас у скажоным выглядзе, і зараз цяжка аднавіць іх сапраўднае татарска-мусульманскае гучанне. Першае імя, хутчэй за ўсё, гучала як Скіндар або Іскандэр. Яно было дастаткова распаўсюджаным сярод татараў ВКЛ. Што да імені Алекса (Лекса, Лексада), то гэта нязвыклае імя для татараў. Верагодна, гэта зрусіфікаваная форма нейкага рэдкага татарскага імені. У пазнейшыя часы многія татары вядомыя пад славянскімі імёнамі: Алехна Кенкевіч, Юхна Сеітавіч, Малышка Супрыч і інш.[56].

Нягледзячы на паражэнні ад Цімура (1389, 1391, 1395 гг.), Тахтамыш не збіраўся складваць зброю і працягваў барацьбу за залатаардынскі трон. Ён абапіраўся на дапамогу польскага караля Уладзіслава Ягайлы і вялікага князя літоўскага Вітаўта. За падтрымку хан Тахтамыш ярлыком ад 20 мая 1393 г. перадаваў Ягайлу тыя рускія землі, што належалі да Арды. Над гэтымі землямі, аднак, захоўваўся татарскі суверэнітэт. Польскі манарх павінен быў плаціць з іх татарам падатак (выхад)[57]. Большасць гэтых земляў пазней адышла Вітаўту, які ў 1392 г. заняў велікакняскі стол у Літве.

Сярод населеных пунктаў, якія адышлі да Літвы, быў таксама Глінск[58]. Татарскія роды, у тым ліку старэйшы сын Мансур-Кіята Мамаевіча Алекса, былі вымушаны прызнаць уладу Вітаўта. У абмен на гаспадарскую службу яны захавалі ўсе свае ўладанні і прывілеі. Не выключана, што за пераход на службу да вялікага князя літоўскага

---

[55] Тизенгаузен В. Г. Сборник материалов, относящихся к истории Золотой Орды. Т. 2. С. 168. Цяжка ўстанавіць, у якой сувязі былі гэты Урусчук-кіят і згаданы ў «Памяці» роду Глінскіх Мансур-Кіят.

[56] LM. Užrašymų knyga 8. P. 420.

[57] Spuler B. Die Goldene Horde… S. 131—132.

[58] Яшчэ ў 1507 г. Глінск згадваўся ў спісе гарадоў, з якіх крымскі хан Менглі-Гірэй патрабаваў ад караля і вялікага князя Жыгімонта даніну (LM. Užrašymų knyga 8. P. 83). Падрабязна: Петрунь Ф. Ханські ярлики на українські землі. С. 170—182.

Алекса Мансуравіч атрымаў дадатковыя зямельныя наданні (Станка, Хоразаў, Серакаў, Гладкавічы), пра што ўскосна сведчыць радавод Глінскіх. Частка татарскіх уладальнікаў, у тым ліку і малодшы сын Мансур-Кіята Скіндар-Іскандэр, не захацела прызнаваць уладу Літвы, і выехала ў Арду.

У складзе Літоўскай дзяржавы асобныя татарскія роды паступова асіміляваліся, прымалі рускую веру, а з ёй і мову. Так мусіла здарыцца і з Алексам Мансуравічам. Згодна родаваму паданню, Алекса добраахвотна прыняў хрышчэнне з рук самога мітрапаліта ўсяе Русі і атрымаў хрысціянскае імя Аляксандр. Разам з ім быў ахрышчаны яго сын, які атрымаў імя Іван. Гэта падзея мусіла адбыцца ў часе знаходжання мітрапаліта Кіпрыяна ў Кіеве. Хутчэй за ўсё, хрышчэнне Алексы адбылося пасля 1390 г. У паданні пра хрышчэнне продка Глінскіх, безумоўна, змешаны розныя эпохі і асобы, маюцца храналагічныя нестыкоўкі, і, тым не менш, яно адлюстроўвае рэальныя факты.

Пасля далучэння рускіх зямель Арды Літва атрымала мноства новых падданых, у тым ліку татараў, што пражывалі там. Сярод іх былі такія буйныя землеўласнікі, як Ягалдай Сараевіч, Алекса Мансуравіч Мамаевіч, Урустай Менскі. Вітаўт, рыхтуючыся да рашаючай бітвы з ханам Цімур-Кутлукам, меў патрэбу ў вопытных воінах, якія ведалі тактыку і баявы лад праціўніка. Верагодна, што Алекса Мансуравіч браў удзел у разведвальных выправах Вітаўта на Дон (1397 г.) і чарнаморскае ўзбярэжжа (1398 г.).

Базай выправы Вітаўта супраць Цімур-Кутлука стаў Кіеў. Там, неўзабаве пасля паразы ад ханаў Кайрычак-аглана і Цімур-Кутлука, знайшоў палітычны прытулак хан Тахтамыш[59]. Здарылася гэта на мяжы 1396 і 1397 гг.[60]. Цалкам верагодна, што разам з ханам Тахтамышам прыехалі некаторыя татарскія вяльможы. У паход супраць Цімур-Кутлука выправілася вялізнае войска, у склад якога ўваходзілі шматлікія татарскія аддзелы, у тым ліку, несумненна, і аддзел Алексы Мансуравіча. Рашаючая бітва мусіла адбыцца непадалёк ад родавых маёнткаў унука Мамая: «на Воркслe, в земле Татарской»[61]. Войска Вітаўта было разбіта і часткова знішчана. Толькі нямногія, у тым ліку сам вялікі князь, здолелі ўратавацца ўцёкамі.

---

[59] Hammer-Purgstall J. Geschichte der Goldenen Horde… S. 360—365.

[60] Purc J. Itinerarium Witolda wielkiego księcia Litwy (17 lutego 1370 roku — 27 października 1430 roku) // Zeszyty naukowe Uniwersytetu im. Adama Mickiewicza w Poznaniu. 1971. Nr. 11. S. 89—109.

[61] Русина О. В. Україна під татарами і Литвою. С. 92.

Бітва на Ворскле 1399 г. пакінула значны след у народнай памяці. Яна стала значным эпізодам у калектыўнай памяці нашчадкаў Алексы Мансуравіча. Больш таго, далёкі продак Глінскіх — ім у сямейным паданні выступае сын Алексы Мансуравіча Іван — аказаўся выратавальнікам Вітаўта. Магчыма, гэта паданне, нягледзячы на яго эпічны характар, з'яўляецца адлюстраваннем рэальнага геройскага ўчынку, здзейсненага на Ворскле ў 1399 г.

### 2.1.7. Князь Іван — пачынальнік роду князёў Глінскіх

Гэтым продкам Глінскіх быў князь Іван, сын Аляксандра (Алексы) Мансуравіча Мамаевіча. Акрамя радаводу Глінскіх князь Іван з прозвішчам Глінскі выступае таксама сярод сведак пры наданні Свідрыгайлам у 1437 г. населеных пунктаў Уладова і Жураўка над Бугам нейкаму Стафану[62]. Радавод Глінскіх паведамляе, што князь Іван Глінскі быў жанаты на Настассі, дачцэ князя Данілы Астрожскага[63]. Гэта ж крыніца згадвае, што ў Івана было тры сыны: Барыс, Фёдар і Сямён[64]. Жаніцьба на Настассі Астрожскай дазволіла Глінскім парадніцца з адным з самых уплывовых родаў ВКЛ і ўвайсці ў кола праваслаўнай рускай знаці. Гэта падзея магла адбыцца на мяжы першага і другога дзесяцігоддзяў XV ст., хутчэй за ўсё, неўзабаве пасля перамогі пад Грунвальдам. Аднак неабходна канстатаваць, што паведамленне пра жаніцьбу Івана Глінскага з Настассяй Астрожскай магло мець легендарны характар. У іншых крыніцах згадкі пра гэты шлюб адсутнічаюць[65].

Любецкі сінодык згадвае як нябожчыка яшчэ аднаго князя Івана Глінскага[66]. Аднак польскі даследчык С. Кучыньскі надзвычай скептычна паставіўся да ідэнтыфікацыі Івана Глінскага з Любецкага сінодыка з Іванам Аляксандравічам з радаводу Глінскіх. Ён аргументаваў сваю пазіцыю тым, што паміж смерцю Мамая і паступленнем яго ўнука на гаспадарскую службу прайшло ўсяго трохі болей за 15 гадоў, а Глінск у мангольскія часы не належаў да Чарнігава-Северскай

[62] Boniecki A. Poczet rodów w Wielkim Księstwie Litewskim w XV i XVI wieku. Warszawa, 1887. S. 63.

[63] ВИМОИиДР. Кн. 10. С. 196.

[64] Тамсама. С. 196.

[65] Пра радавод Астрожскіх падрабязна: Kempa T. Dzieje rodu Ostrogskich. Toruń, 2003. S. 5—14.

[66] Зотов Р. О черниговских князьях по Любецкому синодику и о Черниговском княжестве в татарское время. Санкт-Петербург, 1892. С. 28.

зямлі[67]. Не выключана, што згаданы Іван Любецкага сінодыка быў іншым «глінскім» князем, тым больш, што ў Падняпроўі існавала шмат тапонімаў кшталту Глінск, Глінско.

Сапраўды, пачаткі гаспадарскай службы Івана Аляксандравіча з радаводу Глінскіх аднесены да занадта ранняга часу. У лепшым выпадку ён мусіў быў быць яшчэ дзіцем. Яго служба вялікаму князю Вітаўту мусіла пачацца на некалькі дзесяцігоддзяў пазней. Толькі ў гэтым выпадку можна было б ідэнтыфікаваць Івана Аляксандравіча з радаводу Глінскіх з Іванам Глінскім дакумента канцылярыі Свідрыгайлы. Ва ўсялякім выпадку, верагоднасць такога атаясамлення нельга адмаўляць цалкам.

Цяжкасць ідэнтыфікацыі Глінскіх звязана з тым, што тэрмін «князь глінскі» з'яўляўся, хутчэй, не родавым, а тэрытарыяльным азначэннем. На геаграфічны змест выразу «князь глінскі» ўказвае той факт, што бунт Міхаіла Глінскага ў 1508 г. падтрымалі толькі яго родныя браты і бліжэйшыя сваякі, а астатнія Глінскія ўстрымаліся ад удзелу ў паўстанні і выказалі поўную лаяльнасць віленскаму ўраду. Пасля бунту ў Маскву, акрамя трох братоў Івана, Васіля і Міхаіла Львовічаў, эмігравалі толькі двое князёў Глінскіх — Дзімітрый і Іван[68]. Увогуле, Львовічаў Глінскіх, калі тыя яшчэ знаходзіліся ў Літве, не звязвала з большасцю Глінскіх амаль нічога. Больш таго, Львовічы імкнуліся выдзеліцца сярод іншых Глінскіх, падкрэсліць сваю адметнасць. Так, калі ў пачатку XVI ст. Львовічы атрымалі ад Аляксандра Ягелончыка Тураў, у адносінах да іх стаў выкарыстоўвацца дэнамінат «Herr in Thurow», «Haeres in Thurow». Але не забывалі яны таксама пра ўласнае паходжанне з Глінска: «Herzog Michael zu Lynow»[69], «Micael dux in Helinav»[70], «Michel dux Hlinensis»[71], «herzog Michel von Glynzky»[72]. Часам ужываліся два дэнамінаты: «Herzog Michel zu Lynow Herr zu Turow»[73].

У склад «князёў глінскіх» мусілі ўваходзіць асобы рознага паходжання, якія пражывалі на тэрыторыі Глінскай воласці і мелі там

[67] Kuczyński S. Ziemie czernihowsko-siewierskie pod rządami Litwy. Warszawa, 1936. S. 90.

[68] Зимин А. А. Новое о восстании Михаила Глинского в 1508 году // Советские архивы. 1970. № 5. С. 68—73.

[69] Regesta historico-diplomatica Ordinis S. Mariae Theutonicorum 1198—1525 (далей — RHDOMT) / Hrsg. v. E. Joachim und W. Hubatsch. T. 2. Göttingen, 1950. S. 381.

[70] Герберштейн С. Записки о Московии / Под ред. В. Л. Янина. Москва, 1988. С. 297.

[71] Finkel L. Elekcya Zygmunta I... S. 280.

[72] AA. S. 304.

[73] RHDOMT. T. 2. S. 369.

сваё валоданні. Гэта назва ахоплівала, па меншай меры, некалькі татарскіх родаў. Яны пасяліліся тут яшчэ ў эпоху цюркскай каланізацыі Паўднёвай Русі XIII—XIV стст. Па суседстве з Глінскай воласцю ў вярхоўях Псла, Северскага Данца, Сейма і Аскола знаходзілася г. зв. Ягалдаеўшчына, буйное тэрытарыяльнае ўтварэнне (цьма), паўстанне якога звязваецца з імем татарскага князя Ягалдая Сараевіча, якое праіснавала да канца XV ст.[74]. Праўдападобна, такія тэрытарыяльныя ўтварэнні існавалі ў іншых землях, у тым ліку на рацэ Сула, адкуль пазнейшая традыцыя выводзіла Глінскіх. На гэтай тэрыторыі жылі розныя татарскія роды, у тым ліку Кіяты. Тут мелі валоданні татарскія князі і бекі, побач з якімі пражывалі прадстаўнікі дробнай татарскай шляхты.

Значныя змены ў становішчы мясцовых татарскіх родаў княскага паходжання мусілі адбыцца ў канцы XIV ст., калі Тахтамыш перадаў Вітаўту землі Паўднёва-Заходняй Русі. Пад ціскам новай улады татарскія князі мусілі з цягам часу страціць сваё прывілеяванае становішча і ператварыцца ў звычайных землеўласнікаў, абавязкам якіх з'яўлялася служба літоўскаму гаспадару. Істотныя змены адбываліся ў культурнай сферы. Некаторыя прадстаўнікі татарскай знаці пакінулі іслам, які не меў яшчэ сярод іх устойлівай традыцыі, і прынялі хрысціянства. Працэс гэты можна датаваць першымі дзесяцігоддзямі XV ст., калі ўзмацнілася цэнтралізатарская палітыка Вітаўта. Тады ж пачалося гаспадарчае асваенне новых тэрыторый, у тым ліку Чарнігава-Северскіх зямель[75]. З гэтага часу мясцовыя служылыя землеўласнікі княскага паходжання, у тым ліку татары, сталі называцца Глінскімі, па назве горада, у ваколіцах якога яны жылі. Сярод іх былі продкі князя Міхаіла Львовіча Глінскага.

Як прадстаўнікі знатнага мангольскага роду Кіятаў, продкі Львовічаў-Глінскіх вылучаліся з астатніх Глінскіх[76]. Пра іх высокае паходжанне ўскосна сведчыць шлюб маскоўскага вялікага князя Васіля III з дачкой князя Васіля Львовіча Аленай. Аднак Глінскія не з'яўляліся адзіным родам, які ўладарыў у Глінскай воласці. У дадзеным выпадку напрошваецца, хутчэй, параўнанне з Гедройцкімі князямі, якія ўяўлялі сабой сукупнасць розных княскіх і баярскіх родаў, а не адзіную родавую групу[77].

[74] Русина О. В. Україна під татарами і Литвою. С. 63—64.

[75] Пра гаспадарчае становішча Чарнігава-Северскай зямлі з далучанымі да яе валасцямі гл.: Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 96.

[76] LM. Užrašymų knyga 5. P. 180.

[77] Łowmiański H. Studia nad dziejami Wielkiego Księstwa Litewskiego. Poznań, 1983. S. 299—300.

Ідэнтыфікацыя Глінскіх ускладняецца яшчэ тым, што на працягу многіх стагоддзяў родавая памяць на Русі і ў Літве абыходзілася выключна двума пакаленнямі сваякоў: бацькоў і дзяцей. Так, князі Іван, Васіль і Міхаіл іменаваліся па бацьку Львовічамі, але нідзе не згадвалі імя свайго дзеда або прадзеда. Гэтую традыцыю кансервавала тое, што доўгі час у грамадстве ВКЛ панавала вуснае, а не пісьмовае слова. Толькі з другой паловы XV ст., калі ў сувязі з развіццём магнацкіх латыфундый узнікла патрэба ў пісьмовым слове і паўстаў дзяржаўны архіў ВКЛ — Літоўская Метрыка, — стала магчымым прасачыць генеалогію роду на працягу больш чым двух пакаленняў.

У крыніцах пачатку XV ст. згадваецца нейкі князь Урустай Менскі (у асобных даследчыкаў — Мцэнскі)[78]. Як мяркуе польскі даследчык С. Кучыньскі, Урустай меў татарскае паходжанне і атрымаў сваё прозвішча ад гарадка Мена, што знаходзіўся ў Чарнігава-Северскай зямлі паміж Хорабрам і Макішынам. Кучыньскі не выключае, што князь Урустай Менскі мог таксама называцца Глінскім, бо князі Глінскія валодалі землямі паміж Макішынам і Хорабрам[79].

Цяжка прасачыць сувязь паміж Урустаем Менскім і Іванам Глінскім. Адзінае, што звязвае Урустая і Івана, гэта служба Свідрыгайле. Абодва паказалі сябе аддanымі слугамі мяцежнага літоўскага князя. Жылі і дзейнічалі яны практычна ў адзін і той жа час — першыя дзесяцігоддзі XV ст. Ці можна атаясаміць Урустая Менскага і Івана Глінскага? Паміж 1408 г., калі ўпершыню згадваецца Урустай, і 1437 г., калі ў актах з'яўляецца Іван Глінскі, ляжыць не такі працяглы адрэзак часу. Да таго ж, князь Іван Глінскі мусіў быць у 1437 г. ужо старым чалавекам, які, хутчэй за ўсё, у хуткім часе памёр. Такую магчымасць нельга выключаць цалкам. Адзінкавая згадка крыніц пра Урустая Менскага і далейшае іх маўчанне можна было б вытлумачыць тым, што з пераходам у новую веру ён змяніў імя. Аднак даказаць гэта ў святле захаваных крыніц не ўяўляецца магчымым.

Князь Іван быў першым з нашчадкаў Мамая, які стаў афіцыйна называцца Глінскім. Таму яго можна лічыць родапачынальнікам князёў Глінскіх. Сваё прозвішча ён атрымаў ад назвы населенага пункта, якім валодаў. Глінск для роду меў вялікае сімвалічнае значэнне. Нашчадкі Івана, нават калі яны перасяляліся ў іншыя маёнткі, працягвалі па-ранейшаму называцца Глінскімі.

[78] Kuczyński S. Ziemie czernihowsko-siewierskie... S. 90—91.

[79] Тамсама. S. 195.

Адначасова з новым родавым прозвішчам нашчадкі Мамая, як прадстаўнікі ваеннай арыстакратыі, атрымалі княскі тытул. Тытул таксама з'яўляўся важным сродкам тоеснасці Глінскіх, які сведчыў пра іх высокі статус.

Захаванню адзінства Глінскіх, незалежна ад месца пражывання, спрыяў іх родавы герб. Несумненна, ён паходзіў ад родавай тамгі Мамая або Мансур-Кіята. Некаторыя крымскія і казахскія роды выкарыстоўвалі падобныя або блізкія знакі. Бліжэй за ўсё да герба князёў Глінскіх родавая тамга крымскіх ханаў Гірэяў. Не выключана, што Гірэі і Глінскія маглі выкарыстоўваць блізкія па зместу тамгі. Традыцыя выкарыстання такога знака магла ісці ад часу прымірэння Тахтамыша з нашчадкамі Мамая. На карысць гэтай версіі сведчыць тое, што ў пачатку XVI ст. існавалі надзвычай цесныя, ледзь не брацкія сувязі паміж Менглі-Гірэем і надворным маршалкам ВКЛ Міхаілам Львовічам Глінскім. Існуе таксама меркаванне, што родавы герб Глінскіх паходзіць ад татарска-кіпчацкай тамгі. Ён уяўляе сабой княскі сталец у чырвоным полі, з крыжападобным скіпетрам уверсе[80]. Відавочна, у канцы XIV ст. нашчадкі Мамая ўжо дастаткова далёка аддзяліліся ад астатніх Кіятавічаў.

Князь Іван быў першым продкам Глінскіх, які з маленства выхоўваўся ў Хрыстовай веры праваслаўнага абраду, разам з якой увабраў рускую культуру і мову. Ён сімвалізаваў культурны выбар Глінскіх, іх будучую культурную прыналежнасць. Культурная асіміляцыя продкаў Мамая дазволіла ім хутка ўвайсці ў склад вышэйшага саслоўя ВКЛ, дзе Глінскія адыгрывалі адну з вядучых роляў.

### 2.1.8. Князь Барыс Глінскі

Няпроста ўстанавіць сувязь паміж Іванам Глінскім і Барысам Глінскім, які, згодна радаводу Глінскіх, з'яўляецца дзедам Львовічаў. У актавых матэрыялах Іван і Барыс Глінскія з'яўляюцца амаль адначасова, каля 1437 г.[81]. Пазнейшая родавая традыцыя даводзіла, што Іван з'яўляўся бацькам Барыса. Аднак тагачасныя крыніцы не дазваляюць прасачыць іх узаемную сувязь. Адам Банецкі сцвярджае, што князь Іван Глінскі памёр, не пакінуўшы нашчадкаў[82]. Але тое, што абодва служылі Свідрыгайле, можа ўскосна

[80] Kryczyński S. Początki rodu książat Glińskich // Prace historyczne w 30-lecie działalności profesorskiej Stanislawa Zakrzewskiego. Lwów, 1934. S. 403.

[81] Poczet rodów... S. 63.

[82] Тамсама. S. 63.

сведчыць на карысць іх кроўнага радства. Да таго ж, імя Іван было дастаткова распаўсюджаным у родзе Глінскіх. Ва ўсякім разе, цалкам верагодна, што ў родзе князёў Глінскіх у першай палове XV ст. быў продак, які насіў імя Іван.

Пра князя Барыса Глінскага мы маем больш надзейныя звесткі. Падчас грамадзянскай вайны ў ВКЛ паміж вялікімі князямі Свідрыгайлам і Жыгімонтам Кейстутавічам ён спачатку апынуўся ў лагеры першага. Князь Барыс з'яўляўся падканцлерам Свідрыгайлы і ўваходзіў у склад яго рады. Ён фігуруе як сведка ў дакуменце, якім Свідрыгайла надаў у 1437 г. Мішку Каленіку шэраг вёсак у Жытомірскім і Оўруцкім паветах[83], а таксама ў акце, якім гэты ж вялікі князь у 1433 г. надаў вёску Міхлін у Луцкім павеце нейкаму Андрэю Валатовічу[84]. У дакуменце, якім Свідрыгайла ў 1437 г. надаў свайму слугу Аліферу вёску Глухні і селішча Стаі ў Луцкім павеце, князь Барыс згадваецца як падканцлер[85].

Пасада падканцлера сведчыць пра тое, што Барыс быў вельмі адукаваным для свайго часу чалавекам. Ён павінен быў прымаць непасрэдны ўдзел у працэсе стварэння дакументаў. Асоба Барыса Глінскага сімвалізуе поспех культурнай асіміляцыі нашчадкаў Мамая. Гэта ўжо не проста свядомы культурны выбар, як у выпадку з Іванам Глінскім, а актыўны ўдзел у тварэнні самой культуры. Акрамя таго, Барыс быў першым з Глінскіх, хто ўвайшоў у склад эліты ВКЛ.

Калі ў грамадзянскай вайне пачалі перамагаць прыхільнікі Жыгімонта Кейстутавіча, Барыс Глінскі перайшоў на бок апошняга. Ад вялікага князя Казіміра Ягайлавіча, які стаў вялікім князем літоўскім у 1440 г., ён атрымаў двор Дамыслін[86], людзей у Заслаўскай воласці[87], дзесяць чалавек ракаўцаў, а таксама людзей, што выселіліся з Новага Двара[88]. Князь Барыс выконваў адказныя даручэнні гаспадара. У 1453 г. ён разам з іншымі літоўскімі пасламі — князем Юрыем Сямёнавічам, Оначам (Начам), Андрэем Саковічам, Янам Неміровічам — ездзіў на сойм у Парчаве па справе Падольскай зямлі, Ратна, Алеска і Ветлы[89].

---

[83] AS. T. 1. S. 33—34.

[84] Тамсама. S. 37—38. У Банецкага памылкова пазначана дата 1442 г. (Boniecki A. Herbarz polski. T. 6. Warszawa, 1903. S. 82).

[85] «Приказ князя Борисов подканцлерего» (AS. T. 1. S. 42—43).

[86] РИБ. Т. 27. Стлб. 31.

[87] Тамсама. Стлб. 86.

[88] Тамсама. Стлб. 93.

[89] Długosz J. Jana Długosza kanonika krakowskiego Dziejów polskich ksiąg dwanaście. T. 5. Ks. 12 / przekł. K. Mecherzyńskiego. Kraków, 1870. S. 126. У Ю. Вольфа гэта пасольства датуецца 1451 г.: Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca XIV wieku. Warszawa, 1895. S. 78.

Барыс Глінскі быў жанаты з удавой князя Яна Карыбутавіча[90]. Паколькі Дзмітрый-Карыбут меў маёнткі ў Падоллі і на Валыні, а некаторыя Карыбутавічы, як, напрыклад, Фёдар, падтрымалі Свідрыгайлу, не выключана, што да шлюбу справа магла дайсці падчас службы Барыса ў Свідрыгайлы ў 1433—1437 гг. Ян Карыбутавіч пасля 1431 г. не згадваецца ў гістарычных крыніцах[91]. На жаль, невядома, з якога роду паходзіла ўдава Яна Карыбутавіча, невядомым застаецца і яе імя. Гэты шлюб дазволіў Барысу зблізіцца з рускай элітай ВКЛ (Варатынскія), а праз яе і з літоўскай арыстакратыяй (Манцігердавічы)[92].

### 2.1.9. Князь Леў Глінскі

Ад шлюбу Барыса Глінскага і ўдавы Яна Карыбутавіча на свет з'явіліся дзеці: сыны Іван, Рыгор і, верагодна, Васіль. Іван Барысавіч у 1485—1496 гг. быў чарнігаўскім намеснікам[93] Ён меў адну дачку, якая выйшла замуж за Якуба Івашэнцавіча, актыўнага ўдзельніка бунту 1508 г. Іван Барысавіч неаднаразова з'яўляўся паслом у Крым (1474, 1479—1480, 1492). Рыгор Барысавіч Глінскі ў 1496—1501 гг. займаў пасаду оўруцкага намесніка[94].

Князь Васіль Барысавіч меў 4 сыноў: Івана і Васіля, якія засталіся бяздзетнымі, а таксама Дзімітрыя і Івана[95]. На жаль, пра жыццёвы шлях Васіля Барысавіча, яго шлюб і далейшы лёс яго дзяцей сказаць што-небудзь пэўнае немагчыма. Вядома толькі, што ў 1496 г. ён трапіў у крымскі палон[96].

Сынам Барыса даследчыкі зазвычай лічаць князя Льва, што быў бацькам князёў Івана, Васіля, Міхаіла і Фёдара. Гэта пацвярджаецца ўскоснымі сведчаннямі. Так, у ходзе судовай справы 1505 г. паміж клецкім князем Іванам Яраславічам і панам Станіславам Пятровічам пра маёнтак Лоск, цётачны брат князёў Львовічаў Андрэй Аляксандравіч Дрожджа назваў жонку Барыса Глінскага, удаву Яна

[90] АЗР. Т. 1. С. 364.

[91] Codex epistolaris saeculi decimi quinti. T. 1. S. 70. У АЗР адзначана, што Барыс Глінскі ажаніўся з удавой Івана Карыбутавіча ў 1447 г. (АЗР. Т. 1. С. 47).

[92] АЗР. Т. 1. С. 47. Гл. таксама справу «межи княземъ Иваномъ Ярославичомъ о именье Лоско» (АЗР. Т. 1. С. 364).

[93] Boniecki A. Poczet rodów... S. 63.

[94] Тамсама. S. 63.

[95] «Род Глиньских князей и Литовских» дадае да іх Сямёна (ВИМОИиДР. Кн. 10. С. 83).

[96] Бычкова М. Е. Родословие Глинских из Румянцевского собрания. С. 122.

Карыбутавіча, сваёй бабкай[97]. Адсюль вынікае, што Барыс Глінскі, з'яўляўся дзедам Львовічаў і бацькам Льва.

Вядома таксама, што братам Льва і, тым самым, сынам Барыса з'яўляўся князь Дашка Глінскі. Сынам апошняга быў Васіль, які валодаў маёнткамі Гастамляны ў Кіеўскім павеце, Ставак у Жытомірскім павеце, Гладкавічы ў Оўруцкім павеце, а таксама дваром у Оўруцкім замку. Пасля смерці Васіля Дашкавіча Глінскага ўсе яго маёнткі перайшлі яго стрыечным братам князям Львовічам[98].

Князь Леў мусіў нарадзіцца ў сярэдзіне XV ст. Як гістарычны факт можна прыняць паведамленне пра шлюб князя Льва з удавою Гаўрылы Мялешкавіча[99]. Ад гэтага шлюбу нарадзілася пяцёра дзяцей (сыны Іван, Васіль, Міхаіл, Фёдар і дачка Федка). Хутчэй за ўсё, ён ажаніўся ў пачатку 60-х гг. XV ст., і яму спатрэбілася каля 15—17 гадоў, каб займець такое вялікае сямейства.

Як ужо гаварылася, князь Барыс здолеў зрабіць неблагую кар'еру на вялікакняскім двары, сведчаннем чаго былі тыя наданні, якія ён атрымаў ад Казіміра Ягайлавіча. Князь Леў з'яўляўся поўнай супрацьлегласцю бацьку. Усе свае сілы і час ён аддаваў уласнай сям'і і практычна не ўдзельнічаў у палітычным жыцці ВКЛ. Не выключана, што яго адсутнасць на палітычнай арэне дзяржавы была выклікана нейкай сур'ёзнай хваробай ці фізічным недахопам.

З іншага боку, ён не атрымаў у спадчыну значнай маёмасці, а ў кнігах Метрыкі не згадваюцца наданні на яго карысць. Таму шлюб Льва з удавой Гаўрылы Мялешкавіча можна разглядаць як яго спробу палепшыць свой маёмасны стан. Якраз у другой палове XV ст. род выхадцаў з Валыні Мялешкавічаў пачаў закладаць падмурак сваёй будучай латыфундыі ў Панямонні.

Цяжка сказаць, чым валодаў і дзе жыў князь Леў у акрэслены час. Калі параўноўваць валоданні, якія атрымаў яго бацька, з тымі, што мелі яго сыны, можна ўявіць, што яму дасталася ў спадчыну. Яго сыны, паступаючы на вялікакняскую службу, амаль не мелі ўласнасці, за выключэннем часткі Новага Двара ў Клецкім павеце. Гэты Новы Двор тоесны Новаму Двару, які згадваецца ў кнігах Метрыкі сярэдзіны XV ст. і радаводзе Глінскіх. Такім чынам, Новы Двор у Клецкім павеце быў самым старым валоданнем Львовічаў-Глінскіх.

---

[97] АЗР. Т. 1. С. 364.

[98] LM. Užrašymų knyga 8. P. 252.

[99] Бычкова М. Е. Родословие Глинских из Румянцевского собрания. С. 119—120.

Магчыма, што Новы Двор[100] быў адзіным уладаннем Льва Барысавіча. Магчыма, што ў гэтым месцы ці дзе-небудзь непадалёк ён, карыстаючыся тэрміналогіяй «Памяці», «прижил» усіх сваіх дзяцей. Тое, што побач (у Навагародскім павеце — Шчорсы; Слонімскім павеце — Свержань) знаходзіліся валоданні Храптовічаў, з якімі Львовічы парадніліся, робіць гэтую здагадку верагоднай.

## 2.2. Выхаванне і гады вандраванняў Міхаіла Глінскага

### 2.2.1. Нараджэнне і маленства

Цяжка сказаць, дзе нарадзіўся Міхаіл Глінскі. Згодна радаводу Глінскіх, да паўстання якога спрычыніліся князі Мсціслаўскія, Леў Глінскі служыў мсціслаўскаму князю Івану Юр'евічу, у якога выслужыў сяло Ходасава (зараз вёска Ходасы Мсціслаўскага раёна Магілёўскай вобласці). Леў быў жанаты з удавой Гаўрылы Мялешкавіча. Мялешкавічы з'яўляліся старажытным баярскім родам, зямельныя валоданні якіх з эпохі Вітаўта знаходзіліся ў Гарадзенскім павеце[101]. Родная сястра Гаўрылы Мялешкавіча была замужам за Сцяпанам Есьмановічам, яшчэ адным членам баярскай рады мсціслаўскага князя Івана Юр'евіча[102].

Можна толькі меркаваць, што пачатковую адукацыю Міхаіл атрымаў дома. Навучанне вялося на рускай мове, а першымі яго настаўнікамі былі бацькі.

*Свет даўніны вывучаў я па кнігах славянскіх,*
*Граматах рускіх, кірыліцай пісаных вязкай.*
*Лад алфавіту наш прашчур для ўласнай карысці*
*У грэкаў пазычыў і, гукі мясцовых гаворак*
*Зладзіўшы з ім, іншаземцам, застаўся сабою*[103].

---

[100] Ракаў у той час належаў Міхалу Кезгайлавічу (Kodeks dyplomatyczny katedry i diecezji wileńskiej. T. 1 (1387—1507) / Wyd. J. Fijałek i W. Semkowicz. Kraków, 1948. S. 349).

[101] Бычкова М. Белорусские предки Ивана Грозного // Наш радавод: Материалы Международной научной конференции по региональной истории Восточной Европы «Культура народов Великого Княжества Литовского и Белоруссии XIII—XX вв.». Ч. 3. Гродно, 1991. С. 468—469.

[102] Бычкова М. Е. Родословие Глинских из Румянцевского собрания. С. 114, 119; Барэйша Ю. Мсціслаўскі манетны двор Алелькавічаў — Бельскіх. «Пісараўшчына» вясны 1482 г. Хроніка змовы 1480—1482 гг. па нумізматычных матэрыялах. Мінск, 2010. С. 57.

[103] Гусоўскі М. Песня пра зубра. Мінск, 1980. С. 59.

Дзяцінства Міхаіла прыпала на 70–80-я гг. XV ст. Гэты час быў насычаны падзеямі, як ва ўнутрыпалітычным жыцці ВКЛ, так і на міжнароднай арэне. Рушыўся стары, звыклы свет, а на ягоных руінах узнікаў новы, контуры якога толькі вымалёўваліся. Падзеі, аднак, давалі мала аптымізму наконт таго, якім будзе гэты свет. Прадчуванне буры, небяспекі вісела ў паветры. І самае істотнае, гэтыя прадчуванні пачалі спраўджвацца. Галоўнай падзеяй гэтага часу, што літаральна ўскалыхнула вышэйшы стан дзяржавы, была змова князёў 1481 г. Арышт і наступнае пакаранне смерцю князёў Івана Гальшанскага і Міхаіла Алелькавіча (Фёдар Бельскі здолеў уцячы ў Маскву), якіх мусіў асабіста ведаць бацька Міхаіла князь Леў, былі ўспрынятыя з горыччу ў сям'і Глінскіх. І справа не толькі ў тым, што князь Леў мог спачуваць змоўшчыкам ці нават быць пасвечаным у іх планы. Падзеі 1481 г. засведчылі адсутнасць адзінства ў асяроддзі пануючага класа, незадаволенасць палітыкай Ягайлавічаў як унутры дзяржавы, так і на міжнароднай арэне.

Змова князёў 1481 г. была ў значнай ступені выкліканая праваламі знешнепалітычнага курсу ВКЛ. Ва ўмовах нарастаючай экспансіі Масквы вялікі князь Казімір паводзіў сябе надзвычай пасіўна. Не выключана, што змоўшчыкі, спрабуючы ўзвесці на велікакняскі стол Алелькавіча, хацелі тым самым актывізаваць усходні вектар палітыкі ВКЛ, перайсці да больш актыўных дзеянняў у дачыненні да Масквы.

Анексія Масквой у 1471—1478 гг. Вялікага Ноўгарада, які разглядаўся кіруючым класам ВКЛ як уласная вотчына, выклікала абурэнне ў Літоўскай Русі. Балюча перажываў страту Вялікага Ноўгарада мсціслаўскі князь Іван Юр'евіч Лінгвенавіч. Яго дзед і бацька былі ў свой час службовымі князямі ў Ноўгарадзе і шмат зрабілі для ўмацавання аўтарытэту ВКЛ сярод мясцовага баярства. Думаецца, наўгародскія падзеі актыўна абмяркоўваліся ў доме князя Льва, які, вяртаючыся са службы, дзяліўся сваімі думкамі адносна палітычнага становішча з блізкімі.

За Вялікім Ноўгарадам прыйшла чарга Цверы. У 1483 годзе цвярскі князь Міхаіл Барысавіч, не маючы магчымасці супрацьстаяць вялікаму князю маскоўскаму Івану Васілевічу, збег да вялікага князя Казіміра. Князь-уцякач быў шчодра адораны, ён атрымаў сёлы Бялавічы і Гошчава, а таксама маёнтак Ласосіна пад Слонімам. Пасля смерці Міхаіла Барысавіча двор Ласосіна перайшоў да роднага брата Міхаіла, князя Васіля[104]. Думаецца, што бацька Міхаіла князь Леў,

[104] LM. Užrašymų knyga 5. P. 270.

а таксама яго старэйшыя браты Іван і Васіль неаднаразова сустракаліся з цвярскім князем на вялікакняскім двары. Сам Міхаіл Львовіч, калі падрос, таксама мусіў пры пасрэдніцтве братоў пазнаёміцца з князем Міхаілам Барысавічам.

Становішча ВКЛ абвастрылася не толькі на ўсходніх межах. На поўдні з'явіўся небяспечны праціўнік у асобе новага крымскага хана Менглі-Гірэя. Пачынаючы з 70-х гг. XV ст. крымскія татары рэгулярна рабавалі паўднёвыя землі ВКЛ. Знішчэнне імі ў 1482 г. Кіева было, відавочна, з боллю ўспрынята ў Мсціславе.

Такім чынам, можна меркаваць, што з самага дзяцінства Міхаіл меў мажлівасць акунуцца ў атмасферу палітычных дыскусій. Несумненна, гэты дзіцячы досвед спрычыніўся да таго, што пазней, ужо будучы дарослым, ён так лёгка ўвайшоў у палітычнае жыццё ВКЛ. Інтарэс да дзяржаўных спраў быў закладзены ў ім яшчэ ў раннім узросце. У тым, што Міхаіл Глінскі стаў вядомым палітычным дзеячам свайго часу, ёсць заслуга яго сацыяльнага асяроддзя, у першую чаргу бацькі, князя Льва, а таксама мсціслаўскага князя Івана Юр'евіча Лінгвенавіча.

Аднак сям'я Льва Глінскага жыла не толькі сучаснасцю. Важнае значэнне мелі і гістарычныя традыцыі. У сярэдзіне XV ст. у суседнім з Мсціславам Смаленску пад кіраўніцтвам мітрапаліта Герасіма паўстаў першы летапісны звод ВКЛ. Думаецца, адна з копій магла трапіць на двор мсціслаўскага князя Івана Юр'евіча, дзе з ёю мог азнаёміцца князь Леў Глінскі. Эпічныя апавяданні пра вялікіх князёў літоўскіх мусілі асабліва захавацца ў ягонай памяці.

Аповед пра бітву на Ворскле, дзе вялікі князь літоўскі Вітаўт быў разбіты татарамі і мусіў ратавацца ўцёкамі, павінна была асабліва запасці ў памяць. Мажліва, пад уздзеяннем гэтага аповеду пазней у родзе князёў Глінскіх і ўзнікла легенда пра іхняга продка, які выратаваў жыццё свайго гаспадара.

Як служэбнікі мсціслаўскага князя Івана Юр'евіча, князь Леў і яго дзеці мусілі ўвабраць гістарычныя традыцыі Лінгвенавічаў. У гістарычнай памяці апошніх асаблівая роля належала бітве пад Грунвальдам. Дзед Івана Юр'евіча, князь Лінгвен-Сямён, быў адным з герояў бітвы. У рашаючы момант, калі тэўтонскія рыцары зацята рушылі наперад, смаленскія харугвы, якімі кіраваў Лінгвен-Сямён, спынілі варожы наступ, што дало магчымасць галоўным сілам польска-літоўскага войска перайсці ў контрнаступ і апракінуць ворага. Несумненна, у родзе Лінгвенавічаў памяць

пра Грунвальд перадавалася з пакалення ў пакаленне. Князь Міхаіл неаднаразова мусіў чуць пра ратныя подзвігі князя Лінгвена-Сямёна, пра яго нечалавечую стойкасць і ўпартасць на полі бою. Мабыць, ужо тады ён уяўляў сябе на месцы вайсковага праводыра. Ён хацеў быць такім жа смелым, адважным і мудрым, як князь Лінгвен-Сямён.

У 1486 г. памёр мсціслаўскі князь Іван Юр'евіч. Радавод Глінскіх звязвае яго смерць з нейкай «службай» у Кіеве. Верагодна, размова можа ісці пра адбудову Кіева пасля знішчальнага нападу крымскага хана Менглі-Гірэя ў 1482 г.[105]. На аднаўленне Кіева і забеспячэнне абараназдольнасці памежных валасцей былі кінутыя значныя матэрыяльныя і людскія сродкі ВКЛ. Кіравалі адбудовай былой сталіцы Русі вышэйшыя ўраднікі ВКЛ. Для праваслаўных князёў, у тым ліку Івана Юр'евіча, удзел у адбудове Кіева быў справай асабістага гонару. Магчыма, праца падарвала здароўе ўжо немаладога князя, у выніку чаго ён памёр. Мсціслаўскі князь Іван Юр'евіч Лінгвенавіч быў пахаваны ў Кіева-Пячэрскім манастыры побач з дзедам і бацькам.

### 2.2.2. Пераезд у Літву

Смерць у 1486 г. апошняга мсціслаўскага спадчыннага князя Івана Юр'евіча Лінгвенавіча не магла не паўплываць на далейшы лёс Льва Глінскага. Згодна радаводу Глінскіх з Румянцаўскага збору, князь Леў «поехал изо Мстиславля в Литву служити»[106]. Крыніца дадае наступнае: «служил тот князь Лев Глинский по паном по литовским и з детми своими»[107]. Аднак іншыя крыніцы амаль нічога не гавораць пра службу князя Льва ў Літве. Праўда, у «кнізе данін» 1486 і 1488 гг. караля Казіміра некалькі разоў згадваецца нейкі князь Леў[108]. Можна меркаваць, што размова ідзе менавіта пра Льва Барысавіча Глінскага. Пасля 1488 г. яго імя больш не згадваецца. Не выключана, што неўзабаве пасля гэтай даты ён памёр.

---

[105] Шэраг даследчыкаў звязваюць службу князя Івана Юр'евіча Мсціслаўскага ў Кіеве са змовай князёў Алелькавічаў, Гальшанскіх і Бельскіх пачатку 1480-х гг. (Бычкова М. Е. Родословие Глинских из Румянцевского собрания. С. 114; Барэйша Ю. Мсціслаўскі манетны двор Алелькавічаў — Бельскіх... С. 57).

[106] Бычкова М. Е. Родословие Глинских из Румянцевского собрания. С. 119.

[107] Тамсама. С. 120—121.

[108] «Князю Льву 7 локоть сукна махальского» — 27.03.1486, Вильна (LM. Knyga Nr. 4 (1479—1491): Užrašymų knyga 4 / Parengė L. Anužytė. Vilnius, 2004. P. 35); «Князю Льву 10 копъ з мыта берестейского» — 24.06.1486, Троки (LM. Užrašymų knyga 4. P. 34); «Князю Льву 10 копъ грошей з мыта луцъкого, а шуба лисья завыиковая с ключа Троцъкого» — 28.10.1488, Петръков (LM. Užrašymų knyga 4. P. 78).

Не выключана, што пасля службы мсціслаўскаму князю Леў Глінскі адышоў на адпачынак і заняўся хатнімі справамі. На жаль, мы не ведаем, у якім маёнтку пражывала сям'я пасля пераезду з Ходасава. Радавод Глінскіх згадвае выслужаныя яго бацькам князем Барысам воласць Ракаў, Новы Двор пад Клецкам і воласць Рашуковічы. Вядома, што ў 1508 г. князь Іван Львовіч Глінскі валодаў адным дваром каля Клецка. Магчыма, гэты двор дастаўся старэйшаму Львовічу ў спадчыну ад бацькі. Магчыма, недзе пад Клецкам і пражываў князь Леў з сынамі пасля вяртання са службы. Не выключана, што недзе тут ён і памёр.

Князь Леў Глінскі паклапаціўся пра будучыню ўласных дзяцей. У першую чаргу, ён удала выдаў замуж дачку Федку. Яе абраннікам стаў Марцін Багданавіч Храптовіч, прадстаўнік праваслаўнага літоўскага баярскага роду, які пачынаючы з апошняй чвэрці XV ст. адыгрываў важную ролю ў грамадскім і палітычным жыцці ВКЛ. Храптовічы паходзілі з недалёкіх ад Клецка Шчорсаў. Дзякуючы матрыманіяльным сувязям з Храптовічамі Глінскія ўвайшлі ў кола вышэйшай літоўскай арыстакрытыі, да якой належалі князі Гальшанскія, кузэны Ягайлавічаў. Родны брат Марціна, Ян Літавор, быў жанаты з Ядвігай Гальшанскай, дачкой віленскага кашталяна. Гэта акалічнасць паспрыяла імклівай кар'еры Яна Літавора на вялікакняскім двары. Сам жа Ян Літавор, як вялікакняскі падскарбі, паспрыяў хуткай кар'еры сваіх сваякоў Глінскіх. Верагодна, не без яго падтрымкі браты Іван і Васіль Львовічы сталі прыдворнымі караля Казіміра. Дзякуючы вялікакняскім наданням Храптовічы сталі буйнымі землеўласнікамі. Іх уладанні знаходзіліся пераважна ў Навагародскім павеце.

### 2.2.3. У Храптовічаў у Шчорсах

Тады ж гаспадарскі падскарбі Ян Літавор Храптовіч мусіў узяць пад апеку непаўналетняга Міхаіла. Не выключана, што пасля смерці бацькі ў канцы 80-х — пачатку 90-х гг. XV ст. апошні выхоўваўся (ці, па меншай меры, часта гасціў) у маёнтках Храптовічаў — Шчорсах ці Сваротве. Сам Ян Літавор пакуль што не меў уласных дзяцей.

Падчас вандровак па ваколіцах Шчорсаў Міхаілу неаднаразова траплялiся сведчанні слаўнай гісторыі краю. Непадалёк знаходзіўся Лаўрышаўскі манастыр, заснаванне якога традыцыя дому Гальшанскіх прыпісвала легендарнаму князю Рыманту-Васілю-Лаўрышу, а царкоўная — прападобнаму Елісею, сыну літоўскага князя

Трайната[109]. Верагодна, малады Міхаіл у суправаджэнні апекуна неаднаразова бываў у святыні, дзе меў магчымасць бачыць старажытнае Евангелле[110], пакланіцца цудатворным машчам прападобнага Елісея. Мясцовы люд захоўваў памяць пра загадкавага навагародскага князя Вайшвілака-Войшалка, постаць якога не магла не закрануць чулую душу юнака. Велічны навагародскі замак нагадваў пра насычаную войнамі і разбурэннямі гісторыю горада.

Суседзямі Храптовічаў былі многія знаныя роды Літвы і Русі. Суседняя Любча належала пісару Федзьку Рыгоравічу, дачка якога выйшла замуж за Федзьку Гаўрылавіча, што быў Міхаілу братам па маці. Блізкія Нягневічы з'яўляліся ўласнасцю Радзівілаў. У 1486—1491 гг. тагачасны ўладальнік Нягневічаў Мікалай І Радзівіл трымаў Новагародскае намесніцтва. 6 кастрычніка 1492 г. ужо ў якасці віленскага ваяводы ён атрымаў ад вялікага князя Аляксандра Казіміравіча вёску Ліпск у паўднёвай частцы Новагародскага павета[111]. Уладальнікамі Міра з'яўляліся Іллінічы, з якімі Ян Літавор неаднаразова меў зямельныя спрэчкі. Буйнымі землеўласнікамі Новагародскага павета з'яўляліся Неміровічы. Адзін з іх, Мікалай Неміровіч, уладальнік Уселюба, узвёў у Ішкалдзі ў пачатку 70-х гг. XV ст. першы гатычны касцёл у краі[112]. У канцы 80-х гг. XV ст. Мікалай Неміровіч ужо не жыў, а ўсе яго ўладанні перайшлі да яго ўдавы. Нарэшце, суседам Яна Літавора быў яго дзядзька маршалак Солтан Аляксандравіч[113]. Многія са згаданых асоб неаднаразова наведвалі ў Шчорсах Яна Літавора. Апошні, магчыма са сваім выхаванцам, бываў у іх.

Адзначым яшчэ адзін момант. Дзякуючы выхаванню Яна Літавора Храптовіча, які тады з'яўляўся надворным падскарбіем, Міхаіл здолеў развіць добрыя арыфметычныя здольнасці. Нагадаем, што другім кіраўніком віленскага манетнага двара пасля Яна Літавора стаў яго выхаванец Міхаіл Глінскі. Пасада гэтая патрабавала спецыяльных ведаў.

---

[109] Николай, архим. Историко-статистическое описание Минской епархии. Санкт-Петербург, 1864. С. 129—130.

[110] Свенцицкий И. Лаврашевское Евангелие начала XIV века (палеографическо-грамматическое описание) // Известия отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук. 1913. Т. 18. Кн. 1. С. 206—229.

[111] Malczewska M. Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku. Warszawa—Poznań, 1985. S. 50—52.

[112] Semkowicz W. O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachtą polską w Horodle roku 1413 // Lituano-Slavica Posnaniensia. Studia Historica. 1989. T. 3. S. 51—52.

[113] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 112.

### 2.2.4. Міхаіл у Вільні

Аднойчы гаспадарскі падскарбі ўзяў свайго выхаванца ў Вільню, дзе на той час знаходзіўся двор вялікага князя Казіміра. Горад мала змяніўся з часоў Вітаўта. Працяглая адсутнасць манарха мала спрыяла развіццю горада.

Цэнтрам Вільні з'яўляўся Высокі (Горны) замак, збудаваны яшчэ ў часы Гедзіміна і рэканструяваны ў эпоху Вітаўта. Пасля Грунвальдскай бітвы (1410 г.) і Мельненскага пагаднення з Тэўтонскім ордэнам (1422 г.) Высокі замак канчаткова страціў сваё абарончае значэнне. У падэшвы Замкавай гары знаходзіўся збудаваны яшчэ пры Вітаўце Ніжні (Дольны) замак. Тут зазвычай спыняўся гаспадар, калі наведваў сталіцу. Высокі і Ніжні замкі знаходзіліся на паўднёвым беразе Вяллі, там, дзе ў яе ўпадае рака Вілейка. Муры замкаў захоўвалі памяць пра падзеі амаль стогадовай даўніны, крыжацкія напады, гераічную абарону літвінаў і русінаў. На поўнач ад замкаў знаходзіўся «Зялёны мост», каля якога ў 1481 г. былі пакараны смерцю Міхаіл Алелькавіч і Іван Гальшанскі. У пачатку 90-х гг. віленскім ваяводам з'яўляўся Мікалай Радзівіл, уладальнік Нягневічаў. Віленскім кашталянам быў князь Аляксандр Гальшанскі, зяць Яна Літавора Храптовіча. З гэтымі вяльможамі Міхаіл мог пазнаёміцца яшчэ да прыезду ў Вільню.

Непадалёк ад Ніжняга замка знаходзіўся кафедральны сабор Св. Станіслава, патрона Польскага каралеўства. Ён паўстаў на месцы паганскага капішча ў даліне Швінтарога. Гэта быў дастаткова сціплы і просты будынак, які яшчэ мала нагадваў будучы велічны сабор. У ім меліся капліцы Гаштаўта і Манівіда, фундаваныя адпаведна Гаштаўтамі і Манівідамі. Віленскім біскупам з'яўляўся Войцех Табар, якому будзе наканавана адыграць важную ролю ў палітычнай барацьбе ў ВКЛ у пачатку наступнага стагоддзя. Тады і Міхаілу прыйдзецца сутыкнуцца з гэтым хітрым і каварным праціўнікам.

Сабор з'яўляўся некропалем літоўскіх князёў ад часу хрышчэння Літвы. Тут пакоілася цела Вітаўта, з імем якога сямейнае паданне Глінскіх звязвала іх з'яўленне ў Літве. Верагодна, ужо тады ў храме знаходзіўся намаляваны ў грэчаскім стылі партрэт вялікага князя. Апошнім па часе тут быў пахаваны Жыгімонт Кейстутавіч, забіты змоўшчыкамі ў Вербную нядзелю 1440 г. у Троках. Сабор з'яўляўся месцам памяці літоўскіх князёў. Тут знаходзіліся крыжацкія харугвы, захопленыя на Грунвальдскім полі. Несумненна, юны Міхаіл неаднаразова наведваў кафедральны сабор, дзе аглядаў захопленыя варожыя штандарты. Магчыма, у гэты момант у яго памяці

ўсплывалі апавяданні князя Івана Юр'евіча Лінгвенавіча пра мужнасць і стойкасць літвінаў і русінаў пад Грунвальдам.

Ад Ніжняга замка пачыналася Замкавая вуліца, на якой знаходзіўся касцёл Св. Яна. Гэта была галоўная артэрыя тагачаснай Вільні. Да вуліцы прылягаў «Рускі горад» (Civitas Ruthenica), які знаходзіўся на паўднёвым беразе Вільні. У гэтым раёне пражывала пераважна праваслаўнае, рускае насельніцтва горада[114], яго ўпрыгожвалі шматлікія цэрквы. Сам Міхаіл Глінскі згадваў пра 14 віленскіх цэркваў, калі 24 красавіка 1506 г. раздаваў з маёнтка памерлага кіеўскага ваяводы Дзімітрыя Пуцяціча сродкі на ўтрыманне святынь у ВКЛ, у тым ліку ў сталіцы дзяржавы[115]. Да тагачасных віленскіх цэркваў адносіліся: Прачысценская, манастыр Св. Тройцы, Мікольская Перанясенская, Уваскрэсенская, Мікольская Успенская, Кацярынінская, Міхайлаўская, Раства Хрыстова, Іванаўская, Пятніцкая, Козмадзям'янская, Спаская, Юр'еўская на Росе, Саборная, Петрапаўлаўская на Зарэччы. Большасць пералічаных цэркваў знаходзіліся ў Рускім горадзе, усе яны ўжо існавалі ў XV ст. Асабліва вядомым быў Свята-Троіцкі манастыр, заснаваны на месцы смерці ад рук язычнікаў прыдворных вялікага князя літоўскага Альгерда Антонія, Іаана і Яўстафія. У канцы XV ст. Свята-Троіцкая царква патрабавала капітальнага рамонту. Несумненна, Міхаіл Глінскі неаднаразова наведваў Свята-Троіцкі манастыр. Яму было добра вядома паданне пра пакутніцкую смерць трох хрысціян. Цяжка сказаць, які віленскі храм асабліва ўпадабаў Міхаіл. Магчыма, гэта быў Прачысценскі храм, духоўны цэнтр Рускага горада. Тут знаходзілася рэзідэнцыя кіеўскага мітрапаліта, якім у 1488—1494 гг. з'яўляўся Іёна Глезна[116].

Каля Рускага горада, на паўднёвым беразе Вільні, некалі існаваў Крывы замак (Curvum Castrum). Замак быў спалены ў часе выправы крыжакоў і Вітаўта на Вільню ў 1390 г. У памяці жыхароў Вільні Крывы замак атаясамліваўся з гераічным чынам князя Карыгайлы (у хрышчэнні — Казіміра) Альгердавіча, які загінуў пры яго абароне. У 1469 г. на месцы Крывога замка быў заснаваны бернардзінскі кляштар. Паблізу знаходзіўся велікакняскі млын, разбураны ў 1500 г.

Рускі горад размяшчаўся ва ўсходняй частцы Вільні. У заходняй частцы горада, пачынаючы ад Ніжняга замка, знаходзіўся «лядскі

[114] Ochmański J. Krzywy Gród wileński // Zapiski historyczne. 1971. T. 36. Z. 2. S. 64—65.

[115] LM. Užrašymų knyga 6. P. 63.

[116] Карташев А. Очерки по истории Русской церкви. Т. 1. Москва, 1991. С. 552—553.

канец», дзе пражывала каталіцкае насельніцтва. Тут стаялі касцёлы Св. Яна, Св. Духа, Св. Мікалая.

Вільня, аднак, была яшчэ слаба забудавана. За выключэннем Высокага і Ніжняга замкаў, цэркваў і касцёлаў, пераважала драўляная забудова. Вільня была адкрытым горадам, што не меў абарончых муроў. Тэрыторыя горада з другой паловы XV ст. з'яўлялася прадметам экспансіі з боку буйных землеўласнікаў ВКЛ. Бернардзінскі кляштар паўстаў на Манівідаўскім пляцы. Гэты пляц набыў у сярэдзіне XV ст. віленскі ваявода Ян Манівід. Паблізу Ніжняга замка, на паўднёвым беразе Вілейкі, знаходзіліся агарод віленскага біскупа і пляц Гаштаўта. Аднак яшчэ ў канцы стагоддзя гэтыя ўчасткі былі практычна незабудаваныя. У горадзе сяліліся прадстаўнікі каталіцкіх жабрацкіх ордэнаў (бернардзіны, францішканы і інш.), што займаліся місіянерскай дзейнасцю. Іх дзейнасць спрыяла росту аўтарытэту каталіцкай царквы ў ВКЛ. Пад уплывам іх казанняў асобныя жыхары Вільні пачалі пераходзіць у каталіцтва. Але ў канцы XV ст. абсалютную большасць жыхароў Вільні па-ранейшаму складалі праваслаўныя.

Уздым горада пачаўся толькі з таго часу, калі тут стала размяшчацца двор вялікага князя. Гэта адбылося толькі ў апошнія гады праўлення караля і вялікага князя Казіміра Ягайлавіча і пры яго сыне вялікім князю Аляксандру.

### 2.2.5. На гаспадарскім двары

Двор караля і вялікага князя Казіміра, калі той знаходзіўся ў Вільні, з'яўляўся натуральным цэнтрам палітычнага і культурнага жыцця горада. Пра велікакняскі двор і службу на ім Міхаіл меў дастатковае ўяўленне. Амаль ад часу вяртання Казіміра Ягайлавіча ў Літву ў 1483 г. у яго свіце знаходзіліся старэйшыя браты Міхаіла, Іван і Васіль. Несумненна, што яны дзяліліся з малодшым братам уражаннямі, апавядалі яму незвычайныя гісторыі, што здараліся часам на велікакняскім двары. З'яўленне гаспадарскага картэжу рабіла на Міхаіла незабыўнае ўражанне, выклікала ў яго непаддзельнае захапленне. У сваіх марах ён неаднаразова ўяўляў сябе сярод світы вялікага князя. Велікакняскі двор зачароўваў і прыцягваў амбітнага юнака. Тут, поруч з асобай гаспадара, як яму здавалася, ён быў бы здольны рэалізаваць усе свае мары і жаданні.

Першы раз Міхаіл мог патрапіць на велікакняскі двор яшчэ пры жыцці Казіміра Ягайлавіча. Аднак стала ён з'явіўся тут толькі пры новым вялікім князю Аляксандру. Гэтаму магло паспрыяць

прызначэнне ў пачатку праўлення Аляксандра Яна Літавора Храптовіча гаспадарскім маршалкам[117]. Можна меркаваць, што Храптовіч адыгрываў на двары Аляксандра важную ролю. Як надворны падскарбі і велікакняскі маршалак, ён з'яўляўся адным з найбліжэйшых дарадцаў гаспадара, яго даверанай асобай.

Паколькі гаспадарскія маршалкі выконвалі на двары пераважна ганаровыя функцыі, яны часта з'яўляліся ў атачэнні ўласных «пачатаў». Храптовіч таксама мусіў паклапаціцца пра персанальную світу. Хутчэй за ўсё, Міхаіл з'явіўся на гаспадарскім двары ў якасці слугі маршалка. Пазней ён мог стаць гаспадарскім дваранінам. Неабходна адзначыць, што яшчэ ў якасці надворнага падскарбія Ян Літавор з'яўляўся адным з самых уплывовых служэбнікаў гаспадара. Згодна «адправе» караля Казіміра 1488 г., ён знаходзіўся на чале прыдворнай групоўкі, якая ўключала 26 ураднікаў і прыдворных. Сярод іх былі браты Храптовічы (Марцін, Васіль, Фёдар), маладыя князі Глінскія (Іван, Васіль, Фёдар), Андрэй Дрожджа[118].

Велікакняскі двор стаў для маладога Міхаіла сапраўдным універсітэтам. Маладога чалавека літаральна зачароўваў свет прыдворнага этыкету і рытуалу. Міхаілу здавалася, што ў дзеяннях уладара ўсё было рэгламентавана і ўпарадкавана. Здавалася, што кожны яго крок, кожнае слова былі вызначаныя негалосным кодэксам паводзін. Малады чалавек прагнуў як мага хутчэй спасцігнуць гэты кодэкс.

Асабліва Міхаілу падабаўся дыпламатычны, пасольскі рытуал. Калі была такая магчымасць, ён любіў назіраць за тым, як гаспадар адпраўляе ўласных і прымае замежных паслоў. Міхаіл запамінаў, якія словы паслы прамаўляюць на аўдыенцыі, якія жэсты яны пры гэтым робяць. Здавалася, ніводная дэталь пасольскага этыкету не магла застацца ім незаўважанай. Ён убіраў у сябе ўсё, што бачыў і чуў на велікакняскім двары. Авалодаць пасольскім этыкетам маладому Міхаілу дапамагалі ягоныя браты, асабліва старэйшы брат Іван, які неаднаразова ўдзельнічаў у пасольствах. Так, 20 лютага 1493 г. ён быў пасланы да смаленскага намесніка Юрыя Глябовіча з нагоды магчымага нападу маскоўскага войска на горад[119]. Улетку 1492 г. у Крым ездзіў дзядзька Міхаіла, чарнігаўскі намеснік Іван Барысавіч Глінскі[120]. Брат Міхаіла па маці, гаспадарскі пісар Федзька Гаўрылавіч ездзіў

[117] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 111.

[118] Pietkiewicz K. Dwór litewski wielkiego księcia Aleksandra Jagiellończyka (1492—1506) // Lietuvos valstybė XII—XVIII a. Vilnius, 1997. P. 80.

[119] LM. Užrašymų knyga 5. P. 69.

[120] Тамсама. P. 55—56.

з пасольствам да малдаўскага гаспадара Стафана[121]. Мабыць, тады і ўзнікла ў маладога Міхаіла жаданне адправіцца ў далёкае замежнае падарожжа. Ён нават і не ўяўляў, як хутка ягоная мара здзейсніцца.

Паслы прыбывалі з розных краін: Польшчы, Мазовіі, Пскова, Масквы, Прусіі, Інфлянтаў, Вялікай Арды, Крыма, Валахіі. На двары вялікага князя можна было пачуць розныя мовы. Паслы, што выступалі на аўдыенцыях, прамаўлялі на польскай, рускай, татарскай, нямецкай, лацінскай мовах. Свет моўнай поліфаніі зачароўваў Міхаіла. Ён валодаў роднай рускай (старабеларускай) мовай, а падчас знаходжання ў Вільні авалодаў яшчэ і польскай. Не выключана, што ён разумеў татарскую мову, якую мог чуць ад татараў, што пражывалі паблізу Шчорсаў або служылі на двары вялікага князя. Але маладому чалавеку хацелася большага. Ён уважліва ўслухоўваўся ў лацінскія і нямецкія словы, спрабуючы ўлавіць іх значэнне. Ён мусіў зразумець, што валоданне замежнымі мовамі (лацінскай, нямецкай) можа адкрыць шлях да бліскучай кар'еры. Узорам паліглота-перакладчыка для маладога чалавека мог быць пісар Івашка Сапега, які ў 1491 г. ездзіў паслом у Рым, а таксама выпускнік Ягелонскага ўніверсітэта Адам Якубавіч з Котры. Да моў Міхаіл меў несумненныя здольнасці.

Жыццё на двары вучыла маладых людзей правілам узаемных зносін. Міхаіл пазнаёміўся і пасябраваў з дзецьмі многіх уплывовых саноўнікаў ВКЛ: Глябовічаў, Солтанаў, Монтаўтавічаў, Нарбутаў, Неміровічаў, Саковічаў, Кучукавічаў, Петкавічаў. Сярод іх можна вылучыць сыноў канцлера і віленскага ваяводы Мікалая Радзівіла — Мікалая і Яна, а таксама сына троцкага ваяводы Марціна Гаштаўта — Альбрэхта. Усе яны адыграюць важную ролю ў палітычным жыцці ВКЛ у пачатку XVI ст. На велікакняскім двары Міхаіл, верагодна ўпершыню, сустрэў свайго будучага палітычнага саперніка гаспадарскага маршалка Яна Забярэзінскага.

### 2.2.6. За мяжой

Ян Літавор Храптовіч быў несумненна задаволены фізічным і разумовым развіццём свайго выхаванца. Пасля нарадаў надворнага падскарбія з вялікім князем Аляксандрам было вырашана паслаць маладога чалавека на навучанне ў адну з еўрапейскіх краінаў. Яну Літавору Міхаіл абавязаны таксама працяглым выездам за мяжу. Як «Родословие Глинских из Румянцевского собрания», так і «Памяць роду Глінскіх» адзінадушныя ў тым, што Ян Літавор, калі быў

[121] LM. Užrašymų knyga 5. P. 62

высланы вялікім князем Аляксандрам «в Немцы», узяў з сабой Міхаіла Глінскага, якога аддаў там вучыцца нямецкай мове[122].

Звесткі пра пасольства Яна Літавора ў адну з нямецкіх дзяржаў, аднак, адсутнічаюць. Ён ездзіў з пасольствамі, галоўным чынам, у Польшчу і Маскву. Магчыма, што Міхаіл мог трапіць у Германію праз Польшчу. Вядома, што ў сакавіку 1493 г. Ян Літавор быў выпраўлены вялікім князем Аляксандрам у Польшчу[123]. Галоўнай мэтай пасольства з'яўлялася атрыманне ваеннай дапамогі ад Польшчы і збор наёмных жаўнераў для вайны з Масквой.

Адпраўлялася пасольства ў люты мароз, які наступіў пасля на дзіва цёплага надвор'я ў студзені і лютым. Укладальнік «Хронікі Літоўскай і Жамойцкай» занатаваў: «Року 1493. Зима през все дни стычня и лютого месяца так теплая была, иж сады квитнули, травы были великие, ролли и сеножати зеленелися, а потом в марцу 15 дний так срогое ударило зимно, иж що ся зеленело, все посхло и внивечь обернулося»[124]. Ужо пасля ад'езду пасольства аднавіліся ваенныя дзеянні паміж Масквой і Літвой. У хуткім часе вялікі князь маскоўскі Іван Васілевіч захапіў Вязьму, Хляпень, Серпухаў і іншыя памежныя гарады ВКЛ. Вялікі князь літоўскі Аляксандр запрасіў міру. На пачатку лістапада 1493 г., калі пасольства Яна Літавора яшчэ знаходзілася ў Польшчы або выбіралася дамоў, у Маскву былі высланыя гаспадарскія паслы — троцкі ваявода Пётр Янавіч Манцігердавіч і жамойцкі староста Станіслаў Янавіч Кезгайла. У студзені 1494 г. быў заключаны «вечны мір» па прынцыпах «uti possidetis». Мір быў замацаваны шлюбам вялікага князя літоўскага Аляксандра з дачкой вялікага князя маскоўскага Івана Васілевіча Аленай.

У адказ на місію Яна Літавора ў самым пачатку наступнага 1494 г. у Літву прыехала польскае пасольства на чале з доктарам Лібранскім[125]. З адказу польскага пасла вынікала, што падчас знаходжання Яна Літавора ў караля Яна Ольбрахта да апошняга з пасрэдніцкай місіяй прыбыў брандэнбургскі маркграф, герцаг Фрыдрых (Фрыдэрык). Яго мэтай з'яўлялася спрыянне шлюбу дачкі рымскага

[122] ВИМОИиДР. Кн. 10. С. 197; Бычкова М. Е. Родословие Глинских из Румянцевского собрания. С. 121.

[123] «Поселство до короля полского маршалком паномъ Литаворамъ. З Берштъ. Марта 9, индиктъ 11» (LM. Užrašymų knyga 5. P. 70).

[124] ПСРЛ. Т. 32. С. 95.

[125] «Посолствои отказ от короля польского ку наяснеишому великому князю Литовъскому докторомъ Либраньскимъ напротивъ Литаворова посольства» (LM. Užrašymų knyga 5. P. 80—83).

караля Максіміліяна Габсбурга эрцгерцагіні Маргарыты з каралём Янам Ольбрахтам. Сам маркграф з 1479 г. быў жанаты з сястрой апошняга (а значыць, і вялікага князя літоўскага Аляксандра) Соф'яй[126].

На кракаўскім двары брандэнбургскі маркграф Фрыдрых меў сустрэчу з Янам Літаворам. Верагодна, на аўдыенцыі абмяркоўваліся не толькі палітычныя справы. Надворны падскарбі і маршалак мусіў агучыць брандэнбургскаму маркграфу некалькі асабістых просьбаў. Адна з іх магла датычыць асобы князя Міхаіла Глінскага. Не выключана, што ў выніку папярэдняй дамоўленасці паміж вялікім князем літоўскім і брандэнбургскім маркграфам было вырашана перадаць Міхаіла ў распараджэнне апошняга, каб той уладкаваў яго на адным з нямецкіх двароў, пажадана на двары рымскага караля Максіміліяна Габсбурга.

У Кракаве шляхі Яна Літавора і Міхаіла Глінскага разышліся. Першы вярнуўся дамоў. Другі паследаваў за брандэнбургскім маркграфам. Магчыма, нейкі час Міхаіл знаходзіўся на брандэнбургскім двары. На двары Максіміліяна Габсбурга ён апынуўся недзе ў другой палове 1494 г. Не выключана, што да рымскага караля Міхаіла мог адвесці служэбнік брандэнбургскага маркграфа Віт Ханлайн (Veit Henlein). Апошні восенню 1494 г. па даручэнні Фрыдрыха ездзіў да караля Максіміліяна, які на той час знаходзіўся ў Нідэрландах[127]. Размова зноў ішла пра шлюб польскага караля і дачкі Максіміліяна. Шлях брандэнбургскага пасла пралягаў праз Хайльсброн, Кёльн, Антверпен. Віт Ханлайн знайшоў караля Максіміліяна ў яго паляўнічым замку (Jagdschloss) Тэрвурэн (Tervuren) у Нідэрландах[128]. Цікава, што восенню 1494 г. у Нідэрланды сватацца да дачкі рымскага караля прыбыў таксама саксонскі герцаг Фрыдрых[129], у бацькі якога пазней будзе служыць Міхаіл Глінскі. Не выключана, што з гэтага часу пачынаюцца кантакты Міхаіла Глінскага з саксонскім домам Вецінаў. Як адзначыў Віт Ханлайн, герцаг Фрыдрых прыбыў з вялікай світай[130]. З нагоды прыезду такога важнага госця быў арганізаваны ўрачысты прыём з банкетам, танцамі і нават рыцарскім турнірам кшталту рэнэна. Магчыма, што менавіта тады Міхаіл упершыню

[126] Rabeler S. Niederadlige Lebensformen im späten Mittelalter. Wilwolt von Schaumberg (um 1450—1510) und Ludwig von Eyb (1450—1521). Würzburg, 2004. S. 273.

[127] Тамсама. S. 272.

[128] Тамсама. S. 272.

[129] Тамсама. S. 272—273. Свен Рабле мяркуе, аднак, што пад згаданым герцагам Фрыдрыхам трэба разумець саксонскага герцага Фрыдрыха Мудрага.

[130] Тамсама. S. 272—273.

ўбачыў сапраўдны рыцарскі двубой. Там жа ён мог пазнаёміцца і з Вільвальтам фон Шаумбургам, знакамітым военачальнікам Альбрэхта Саксонскага.

### 2.2.7. На дварах Габсбургаў і Вецінаў

Першым этапам у часе працяглай вандроўкі князя Міхаіла па Германіі быў двор імператара Святой Рымскай імперыі Максіміліяна I Габсбурга. Наведванне стала магчымым дзякуючы нармалізацыі ў пачатку 90-х гг. XV ст. адносін паміж Ягайлавічамі і Габсбургамі. Малады князь прыбыў на двор Габсбургаў неўзабаве пасля смерці імператара Фрыдрыха (1440—1493), бацькі Максіміліяна. Жалобныя ўрачыстасці мелі месца ў саборы Св. Стафана ў Вене 6—7 снежня 1493 г.[131].

У часы імператара Максіміліяна двор Габсбургаў стаў адным з самых знакамітых у Еўропе. Ён быў разгалінаванай структурай, што ўключала ў сябе розныя адміністрацыйныя інстытуцыі: дворскі савет (Hofrat), дворскую палату (Hofkammer), дворскую канцылярыю (Hofkanzlei), дворскі суд (Hofgericht), судовую палату (Kammergericht) і г.д.[132]. Вышэйшымі дворскімі ўраднікамі імператара былі такія вядомыя людзі, як Конрад Пойцінгер (Konrad Peutinger), Мельхіёр Пфінцынг (Melchior Pfinzing), Себасцьян Брант (Sebastian Brand), Якуб Вімпелінг (Jakob Wimpeling), Маціяс Ланг (Matthäus Lang) і інш. Двор Максіміліяна арыентаваўся на лепшыя ўзоры былога бургундскага двара з яго шыкоўнымі цырымоніямі і арыстакратычнымі манерамі. У спадчыну ад бургундскіх герцагаў да Габсбургаў перайшоў Ордэн Залатога Руна, якім узнагароджваліся прадстаўнікі арыстакратыі. Габсбургскі двор прыцягваў вялікую колькасць моладзі, для якой на ім адкрываліся добрыя магчымасці і перспектывы. Сацыяльная мабільнасць на двары была дастаткова высокай. Сам імператар Максіміліян зарэкамендаваў сябе як патрон мастацтваў і навук. На яго двор імкнуліся трапіць мастакі, пісьменнікі і паэты (Дзюрэр, Альтдорфер і інш.). Нярэдкімі гасцямі былі банкіры і фінансісты, сярод якіх варта згадаць знакамітага Якуба Фугера (Jacob Fugger).

Міхаіл Глінскі меў таксама мажлівасць пабываць і на двары дзядзькі Максіміліяна, саксонскага герцага Альбрэхта, які ў той час

---

[131] Бойцов М. Погребение императора Фридриха III в 1493 году // Средние Века. 2000. № 61. С. 254—288.

[132] Moraw P. The court of the german kings and of the emperor at the end of the middle ages // Princes, patronage and the nobility: the court at the beginning of the modern age (1450—1650) / Ed. R. Asch, A. Birke. London, 1991. P. 106.

рыхтаваўся да ваенных дзеянняў у Фрысландыі. Так распачаўся другі этап прыдворнай службы князя Міхаіла ў Германіі. На двары Габсбургаў і Вецінаў малады князь служыў, хутчэй за ўсё, у якасці юнкера (Junker) або адвернага (Türknecht). Пасады юнкера і адвернага з'яўляліся ніжэйшымі ў іерархіі двара. Іх функцыяй было суправаджэнне ўладара. Пасля гэтай службы многія шляхціцы ўздымаліся на больш высокія пасады. Нягледзячы на тое, што некаторыя з іх назаўжды пакідалі двор і ад'язджалі дадому, яны захоўвалі цесныя сувязі з уладаром, што знаходзіла свой выраз у звароце *meines gnedigen Herren Dyner* (слуга майго міласцівага ўладара)[133].

У канцы XV ст. двор Вецінаў лічыўся адным з узорных двароў Сярэдняй Еўропы. Ён славіўся сваімі калектыўнымі цырымоніямі, асабліва пасвячэннямі ў рыцары, вясельнымі працэдурамі, прыёмамі замежных паслоў і інш. Інтэграцыі шляхты ў дворскае жыццё Вецінаў спрыяў заснаваны ў 1450 г. курфюрстам Фрыдрыхам Лагодным (Friedrich Sanftmütiger) рыцарскі ордэн св. Гераніма. Сябры Ордэна абавязваліся дапамагаць адзін аднаму ў бядзе, палоне і хваробе. Каб стаць сябрам Ордэна, трэба было мець знатнае паходжанне[134]. На саксонскім двары Вецінаў служылі прадстаўнікі многіх нямецкіх арыстакратычных родаў: Шонбергаў, Мінквічаў, Пфлугаў, Вітцлебенаў і інш. Многія з іх славіліся сваімі вытанчанымі манерамі і рафініраванымі норавамі. Будучы выхаваным у такім прыдворным асяродку, князь Міхаіл увабраў многія яго звычаі, манеры і норавы. Аднак не толькі гэта набыў Міхаіл Глінскі на саксонскім двары. Тут загартоўвалі цела і дух, займаючыся рознымі відамі адзінаборстваў, скачкамі і г. д. У еўрапейскіх вандроўках князь Міхаіл істотна пашырыў уласны кругагляд.

### 2.2.8. З імператарам Максіміліянам Ґабсбургам у Італіі

У гістарыяграфіі трывала замацаваўся тэзіс пра тое, што князь Міхаіл Глінскі ў часе еўрапейскіх падарожжаў наведаў Італію[135]. Ён у значнай ступені грунтаваўся на адказе маскоўскіх баяр імператарскаму паслу Жыгімонту Герберштайну ў 1517 г., што Глінскі, будучы ў «италейских странех», пакінуў праваслаўную веру і перайшоў

[133] Streich B. Zwischen Reiseherrschaft und Residenzbildung… S. 435.

[134] На жаль, вядома толькі некалькі імёнаў сяброў рыцарскага ордэна св. Гераніма (Streich B. Zwischen Reiseherrschaft und Residenzbildung… S. 177).

[135] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 97—98.

у каталіцтва[136]. Пазнейшыя біёграфы Глінскага звычайна абмяжоўваліся канстатацыяй факта яго побыту ў Італіі, не спрабуючы звязаць яго з канкрэтнымі падзеямі і асобамі. Бадай, толькі Тэадор Нарбут выказаў меркаванне, што Глінскі мог пабываць у Італіі ў якасці пажа рымскага караля Максіміліяна Габсбурга[137].

Максіміліян Габсбург быў цесна звязаны з Італіяй. Рымскі кароль і імператар Святой Рымскай імперыі захапляўся італьянскай культурай і мастацтвам Адраджэння. Ён неаднаразова наведваў Італію, у першую чаргу, яе паўночную частку. Другой жонкай Максіміліяна Габсбурга з'яўлялася Б'янка Марыя Сфорца, сястра міланскага герцага Джан-Галеаца. Гэты шлюб адбыўся дзякуючы настойлівасці герцага Ладавіка Сфорца, дзядзькі Джан-Галеаца.

У Германіі, сярод імперскіх князёў і баронаў, было шмат незадаволеных гэтым шлюбам па прычыне худароднасці міланскага дому. Заснавальнікам роду лічыўся герцаг Франчэска Сфорца. Яго бацька Муцыё Атандола (Muzio Attendola) быў кандацьерам. Пра яго паходжанне хадзілі розныя чуткі. Так, Філіп дэ Камін перадае, што бацька Франчэска з'яўляўся простым башмачнікам, хоць і лічыўся надзвычай адважным чалавекам[138]. Сам Франчэска прыйшоў да ўлады дзякуючы шлюбу з Марыяй, пазашлюбнай дачкой міланскага герцага Філіпа Вісконці. Пазней, у 1450 г., Франчэска Сфорца, пазбавіўшы ўлады род Вісконці, абвясціў сябе міланскім герцагам. У якасці прозвішча ён узяў сваю баявую мянушку (ад sforzare — напружвацца, узламваць)[139]. Міхаіл Глінскі знаходзіўся ўжо на двары Максіміліяна Габсбурга, калі ў кастрычніку 1494 г. з Мілана прыйшла вестка пра смерць герцага Джан-Галеаца. Сястра нябожчыка і жонка рымскага караля Б'янка Марыя была, аднак, перакананая, што гэта было забойства, якое здзейсніў яго дзядзька Ладавіка. На двары Максіміліяна хадзілі чуткі пра магчымае атручванне міланскага герцага[140]. Тым не менш, новым міланскім герцагам стаў мяркуемы забойца ўласнага пляменніка Ладавіка Сфорца па мянушцы «Мора» (Мурын), якой ён быў абавязаны смуглому колеру скуры.

Восенню 1494 г. французскі кароль Карл VIII арганізаваў выправу ў Італію, быццам бы з мэтай далейшага наступу на

[136] Памятники дипломатических сношений древней России с державами иностранными. Т. I: 1488—1594. Москва, 1851. С. 314.

[137] Narbutt T. Dzieje narodu litewskiego. T. 8. Wilno, 1840. S. 411.

[138] Коммин Ф дэ. Мемуары. Москва, 1986. С. 275.

[139] Николл Ч. Леонардо да Винчи. Полет разума. Москва, 2006. С. 244.

[140] Heyck E. Kaiser Maximilian I. Bielefeld, 1898 (= Monographien zur Weltgeschichte. Bd. 5). S. 69.

Канстанцінопаль і вызваленне «другога Рыма» ад туркаў. На чале французскага войска стаяў герцаг Людовік Арлеанскі, які як унук былога міланскага герцага Валянціна Вісконці меў прэтэнзіі на Мілан. Французская пагроза змусіла герцага Ладавіка Сфорца да палітычнага зблiжэння з рымскім каралём. У красавіку 1495 г. праціўнікі Францыі заснавалі Святую лігу, куды ўвайшлі рымскі кароль, рымскі папа, кастыльская каралева Ізабела, арагонскі і сіцылійскі кароль Фердынанд, міланскі герцаг Ладавіка Сфорца, а таксама ўладары Неапаля і Венецыі. Пазней, у маі 1495 г., Ладавіка Сфорца ў абмен на падтрымку быў вымушаны прызнаць сябе васалам рымскага караля. Цырымонія адбылася на цэнтральнай плошчы Мілана. Не выключана, што ў сувязі з гэтымі ўрачыстасцямі Міхаіл Глінскі мог наведаць Італію.

Сам горад мусіў моцна ўразіць маладога чалавека. Мілан з'яўляўся цэнтрам Ламбардыі. У канцы XV ст. тут пражывала больш за 80 тысяч чалавек. Вакол горада ўзвышаліся крапасныя сцены, збудаваныя яшчэ ў XII ст. У цэнтры горада знаходзіўся велічны гатычны сабор, узвядзенне якога было нядаўна скончана. Калі князь Міхаіл сапраўды быў у Мілане, ён мусіў наведаць рэзідэнцыю Ладавіка Сфорца. У гэты час міланскія герцагі пражывалі ў Кастэла Сфарчэска. Сцены замка, складзеныя з цёмнай чырвонай цэглы, мусілі зрабіць на князя Міхаіла змрочнае ўражанне.

Міхаіла Глінскага павінна была ўразіць бліскучая прыдворная культура, што панавала на двары Сфорца. Яна, як і прыдворная культура Габсбургаў, узыходзіла каранямі да двара бургундскіх герцагаў. Не засталіся па-за ўвагай маладога чалавека свабодныя і нават разбэшчаныя норавы, што панавалі на двары Ладавіка Сфорца[141]. Сам герцаг быў надзвычай неразборлівы ў сродках дзеля дасягнення мэты.

Побыт у Італіі, хоць, здаецца, кароткачасовы, меў вялікія наступствы для будучага лёсу Міхаіла Глінскага. Тут, верагодна, ён мусіў перайсці з праваслаўнай канфесіі ў каталіцкую. Менавіта на Апенінах малады прыдворны мусіў захапіцца навукамі і ўдасканаліў веданне латыні. Нарэшце, не выключана, што ў часе побыту ў Італіі Міхаіл Глінскі набыў асабісты герб і пячатку з выявай лілеі і нямецкамоўным надпісам. Як здаецца, лілея, хаця і маргінальна, выкарыстоўвалася ў геральдыцы дому Сфорца. Напрыклад, на

[141] Пра характарыстыку нораваў на двары Сфорца: Burckhardt J. The Civilization of the Renaissance in Italy. London, 1995. P. 29—30.

карціне П'ера дэль Палаёла Джан-Галеаца Сфорца (1444—1476), намаляваны ў шатах з мноствам выяваў лілеі. Сваім з'яўленнем у геральдыцы дома Сфорца лілея абавязана несумненна іхнім сваякам герцагам арлеанскім.

Маладога Міхаіла мусілі ўразіць і тэхнічныя вынаходніцтвы Леанарда да Вінчы, як, напрыклад, рыцар-робат, які мог згібаць ногі ў каленях, рухаць рукамі і кісцямі, паварочваць галаву. Гэты твор выстаўляўся ў Мілане ў 1495 г.[142], якраз тады, калі там мог знаходзіцца Міхаіл Глінскі. Малады чалавек мог бачыць мадэль велічнага глінянага каня, выдатны твор фларэнційскага генія, які дэманстраваўся на вяселлі Максіміліяна Габсбурга і Б'янкі Сфорца ў Мілане[143]. Глінскі мусіў таксама чуць пра гіганцкую конную статую Ладавіка Сфорца, над якой тады працаваў Леанарда[144]. У тым жа 1495 г. Леанарда пачаў працу над фрэскай «Тайная Вячэра» ў трапезнай дамініканскага манастыра Санта Марыя дэ ла Грацые[145]. Магчыма, Міхаіл наведваў манастыр, дзе мог назіраць за працай славутага майстра.

У Італіі Міхаіл Глінскі мог знаходзіцца да канца 1495 г. Не выключана, што ў гэты час на Апенінах ён мог удзельнічаць у баявых дзеяннях. Магчыма, пад камандаваннем Георга Эбенштайна ці Ганса Хедэрлайна, военачальнікаў рымскага караля, Міхаіл увосень 1495 г. змагаўся ў Навары з французамі. У наступным 1496 г. ён мог браць удзел у выправе Максіміліяна Габсбурга на Фларэнцыю, якая з'яўлялася праціўнікам Габсбургаў і Мілана. На шляху рымскага караля ляжаў партовы горад Ліворна, да аблогі якога звялася кампанія 1496 г. З надыходам зімы Максіміліян быў вымушаны зняць аблогу горада і вярнуцца ў Цiроль. Разам з манархам павінен быў вярнуцца яго выхаванец князь Міхаіл Глінскі.

### 2.2.9. Кароткачасовае вяртанне дамоў. Удзел у чарнаморскай выправе 1497 г.

Пасля чатырохгадовага побыту за мяжой Міхаіл Глінскі ўвесну 1497 г. пачаў збірацца дамоў. Прычынай была падрыхтоўка Ягайлавічаў да выправы на чарнаморскія парты Кілію і Белгарад, якія ад 1484 г. знаходзіліся ў руках асманаў. Прыгатаванні да ваеннай экспедыцыі вяліся, па меншай меры, ад пачатку 1495 г. У Кракаве

[142] Николл Ч. Леонардо да Винчи… С. 368.

[143] Тамсама. С. 366.

[144] Тамсама. С. 362—365.

[145] Тамсама. С. 378—379.

і Вільні разумелі, што пакуль Кілія і Белгарад знаходзяцца ў асманскіх руках, разграміць крымскага хана Менглі-Гірэя немагчыма. У 1495 г. гаспадарскі пасол маршалак Станіслаў Пятрашкавіч Струміла заявіў ад імя вялікага князя Аляксандра каралю Яну Ольбрахту: «Бо, яко розумемы, доколе Белгород а Килея есть в поганских рукахъ, не можеть в покои быти овшеки границамъ нашым обоего панства»[146]. План выправы на Кілію і Белгарад абмяркоўваўся на сойме ў Берштах у сакавіку 1496 г., на перагаворах з каронным паслам ў Вільні ў тым жа годзе, а таксама на сустрэчы Яна Ольбрахта і Аляксандра ў Парчаве ў лістападзе 1496 г.[147].

Сярод разнастайных мерапрыемстваў па падрыхтоўцы экспедыцыі неабходна асобна адзначыць прыцягненне на службу найманых жаўнераў. Відавочна, гэтай задачай мусілі займацца гаспадарскія эмісары ў еўрапейскіх краінах, перадусім там, дзе на троне знаходзіліся Ягайлавічы, іх сваякі або саюзнікі. Збор ротмістраў мусіў адбыцца ў Польшчы каля мяжы з ВКЛ, хутчэй за ўсё ў Любліне[148]. Сярод жаўнераў, якіх удалося сабраць, пераважалі асобы польскага паходжання. Некалькі ротмістраў прыбылі з нямецкіх зямель. Так, Крыштаф Майснер, ураджэнец Саксоніі, узначальваў нямецкую пяхоту («peditum alamanorum»). Не выключана, што разам з Майснерам прыбыў і Міхаіл Глінскі, які ў спісе наёмных ротмістраў папярэднічае саксонцу[149]. Гэта акалічнасць магла б праліць святло на ітынерарый Міхаіла Глінскага. Праўдападобна, у першай палове 1497 г. ён мусіў знаходзіцца ў Саксоніі, верагодна, на двары герцага Альбрэхта. Магчыма, яго шлях з Інсбрука ці Вены толькі пралягаў праз саксонскія землі, дзе ён зрабіў кароткі прыпынак. Ва ўсялякім разе, падаецца верагодным, што з Саксоніі Глінскі выехаў ужо разам з Майснерам. Невядома, ці былі яны знаёмыя раней, ці пазнаёміліся толькі на двары герцага Альбрэхта ў першай палове 1497 г.

Пра планаваную экспедыцыю ў прычарнаморскія стэпы Міхаіл Глінскі мог даведацца не толькі ад гаспадарскіх эмісараў. Ён мог атрымаць інфармацыю непасрэдна ад кагосьці з Ягайлавічаў, з якімі, нават будучы ў Германіі, падтрымліваў цесныя сувязі. Пра выправу на Кілію і Белгарад Міхаіл мог пачуць з вуснаў Людовіка, сына

---

146 LM. Užrašymų knyga 5. P. 95.

147 Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego za Jagiellonów. S. 425—426.

148 Параўн. пасольства Яна Літавора Храптовіча ў Польшчу ў сакавіку 1493 г., калі гаспадарскаму паслу было наказана збіраць ротмістраў у Любліне (LM. Užrašymų knyga 5. P. 71—72).

149 Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego... S. 435.

венгерскага і чэшскага караля Уладзіслава, які таксама, як і Глінскі, выхоўваўся на двары Габсбургаў. Нельга выключаць, што Глінскі мог атрымаць асабістае запрашэнне парыняць удзел у выправе ад Аляксандра або Яна Ольбрахта.

Шлях ротмістраў з жаўнерамі мусіў пралягаць праз Берасце[150]. Здаецца, далей ён вёў на Валынь, дзе ўжо ў пачатку ліпеня знаходзіўся вялікі князь літоўскі[151]. На Валыні ротмістры з жаўнерамі мусілі далучыцца да гаспадарскага войска. Разам з усёй арміяй яны павінны былі вырушыць з Заслава ў кірунку Вінніцы. У авангардзе рухаліся аддзелы пад камандаваннем князя Канстанціна Астрожскага і наёмныя роты, у тым ліку рота Міхаіла Глінскага. У пачатку верасня 1497 г. перадавыя аддзелы гаспадарскага войска былі ўжо пад Брацлавам. Тут яны, чакаючы распараджэнняў, мусілі заняцца адбудовай спаленага малдаўскім ваяводам Стафанам замка[152].

Аднак выправа заламалася ўжо ў самым пачатку. Ва ўмоўлены час не з'явіліся аддзелы заволжскага хана Шах-Ахмата, да якога з просьбай аб падтрымцы і багатымі дарамі ў 1496 г. ездзілі сваякі Міхаіла: родны дзядзька князь Васіль Барысавіч і стрыечны брат Андрэй Дрожджа[153]. Пасольства ў Заволжскую Арду скончылася трагічна. Каля Азова абозы Васіля Глінскага і Андрэя Дрожджы былі абрабаваныя крымскім татарамі[154]. Князь Васіль Барысавіч трапіў у палон, дзе, здаецца, і памёр.

Выправа Яна Ольбрахта і Аляксандра выклікала непакой у Канстанцінопалі. Асманская імперыя пачала збіраць войскі. Пра падрыхтоўку туркаў да вайны не маглі не ведаць у Кароне і Княстве. Гэта акалічнасць мусіла, несумненна, паўстрымаць актыўнасць Ягайлавічаў. Да таго ж, малдаўскі ўладар, якому са стратэгічных прычын адводзілася важная роля ў выправе, пад уплывам маскоўскай і крымскай дыпламатыі заняў выразна антыягелонскую пазіцыю. Аляксандр мусіў таксама азірацца на свайго ўсходняга суседа, які вуснамі сваіх паслоў Забалоцкага і Курыцына выказаў гучны пратэст супраць планаванай акцыі. Фактычна восенню 1497 г. Аляксандр меў справу з аднаўленай кааліцыяй Масквы, Валахіі і Крыма. У выніку, вялікая

---

[150] Параўн. пасольства Яна Літавора Храптовіча ў Польшчу ў сакавіку 1493 г., калі гаспадарскаму паслу было наказана весці сабраных ротмістраў на Берасце (LM. Užrašymų knyga 5. P. 72).

[151] Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego... S. 435.

[152] Тамсама. S. 436.

[153] LM. Užrašymų knyga 5. P. 99.

[154] Тамсама. P. 118.

чарнаморская выправа ператварылася ў паход супраць саюзнікаў вялікага князя маскоўскага — Валахіі і Крыма.

У пачатку верасня 1497 г. авангард гаспадарскага войска на чале з Канстанцінам Астрожскім і Міхаілам Глінскім перайшоў Днестр і рушыў на Валахію. Пасля таго, як былі спустошаны памежныя землі і пачаўся адыход, на шляху авангарда паўсталі крымскія чамбулы на чале з султанам Махмет-Гірэем, сынам хана Менглі-Гірэя. Пад Брацлавам, на Кашылаўскіх селішчах, гаспадарскае надворнае войска на чале з Канстанцінам Астрожскім і Міхаілам Глінскім сустрэлася з татарамі. Апошнія былі цалкам разбіты. Яны страцілі 340 чалавек, а сам султан нават трапіў у палон, адкуль яго з цяжкасцю вызвалілі[155].

7 верасня 1497 г. кароннае войска перайшло Прут і рушыла на Сучаву. Аднак яго рух быў стрыманы дыпламатычнай і ваеннай інтэрвенцыяй венгерскага ўрада, які, лічачы Валахію сферай свайго ўплыву, негатыўна паставіўся да дзеянняў польскага караля. Яшчэ да пачатку перагавораў Яна Ольбрахта са Стафанам польскі кароль звярнуўся да Аляксандра з просьбай выслаць яму на дапамогу літоўскае войска. Аднак, па прычыне дыпламатычнага пратэсту вялікага князя маскоўскага і актуальнасці мірных пагадненняў з малдаўскім уладаром, вялікі князь літоўскі выслаў на дапамогу брату толькі асобныя аддзелы, якія ўзначальвалі лідскі намеснік і маршалак Станіслаў Пятровіч Кішка, князі Сямён Іванавіч Мажайскі і Васіль Іванавіч Шамячыч[156].

Цалкам верагодна, што сярод «kilka tysiacz kniażat y paniat ey dworan perebranych» быў князь Міхаіл Глінскі. Неабходна ўлічваць той давер, які яму аказваў гаспадар. Літоўскае войска падышло ўжо пасля здрадніцкага і дзёрзкага нападу 26 кастрычніка валахаў у Кузьмінскім лесе на ар'ергард войска Яна Ольбрахта, якое вярталася дамоў пасля падпісання перамір'я з малдаўскім уладаром Стафанам. Дапамога літоўскага войска прыйшлася дарэчы: кароннае войска пазбегла больш цяжкай паразы. Ужо 29 кастрычніка Ян Ольбрахт паспяхова прыбыў у Чарнаўцы[157].

У пачатку кастрычніка вялікі князь літоўскі Аляксандр, пасля таго як адбудаваў Брацлаў і выслаў адборныя харугвы на дапамогу свайму брату, рушыў дамоў. Яго шлях пралягаў праз Мазыр і Навагародак[158]. Заслугі князя Міхаіла Глінскага не былі забытыя.

---

[155] Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego... S. 436.

[156] ПСРЛ. Т. 35. С. 165; Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego... S. 437.

[157] Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego... S. 437.

[158] Тамсама. S. 435.

2 сакавіка 1498 г. у Горадні Аляксандр Казіміравіч выплаціў яму за службу 30 фларэнаў[159]. Пазней, на актаву Божага Цела (Octawa Corporis Christi), якая ў 1498 г. прыпадала на 14 чэрвеня, Глінскі атрымаў яшчэ 20 фларэнаў[160].

Калі ў чэрвені вялікі князь Аляксандр шчодра ўзнагароджваў Глінскага за службу, апошні мог быць ужо ў дарозе. На гэты раз у Фрысландыю, дзе саксонскі герцаг Альбрэхт распачаў падрыхтоўку да ваеннай кампаніі супраць непакорных фрызаў. У край пачалі сцягвацца ландскнехты і наёмныя жаўнеры з нямецкіх земляў. Міхаіл ехаў у Фрысландыю не адзін. Яго мусілі суправаджаць некаторыя нямецкія ротмістры, мабыць, у тым ліку і Майснер, з якім ён добра пасябраваў.

### 2.2.10. Знаёмства з князем Астрожскім

Асаблівая ўвага Аляксандра Казіміравіча была звернута на гаспадарскае войска. Ён разумеў, што яно патрабуе сур'ёзных рэформ. У першую чаргу, гаворка ішла пра сістэму кіравання ўзброенымі сіламі. Дзеля яе паляпшэння Аляксандр увёў у 1497 г. пасаду вялікага гетмана ВКЛ. Першым на яе быў прызначаны князь Канстанцін Іванавіч Астрожскі. Згодна традыцыі, занатаванай у Хроніцы Быхаўца, вялікі князь Аляксандр, вяртаючыся ў 1497 г. з Брацлава ў Вільню, заехаў у Трокі наведаць хворага ваяводу і «найвышэйшага» гетмана (!) Пятра Янавіча Манцігердавіча. Гаспадар захацеў параіцца з ім, каму б той мог перадаць пасля сябе гетманскую пасаду. Пётр Янавіч парэкамендаваў вялікаму князю кандыдатуру валынскага князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага. Так апошні стаў найвышэйшым гетманам ВКЛ[161].

Аповед Хронікі Быхаўца не адлюстроўвае рэальную гістарычную традыцыю, але пры прызначэнні на пасаду вялікага гетмана ВКЛ Канстанціна Астрожскага вялікі князь мусіў раіцца з раднымі панамі, у тым ліку з троцкім ваяводам Пятром Янавічам Манцігердавічам. Апошні ніколі не быў вялікім гетманам ВКЛ. Па меншай меры, невядомыя дакументы, дзе ён тытулуецца так. Вялікі князь Аляксандр не мог даць гетманства старому і хвораму чалавеку,

---

[159] Archiwum Główne Akt Dawnych (далей — AGAD), Rachunki Królewskie, sygn. 23, f. 6; Pietkiewicz K. Dwór litewski wielkiego księcia Aleksandra Jagiellończyka... P. 84. Падаецца, што асабістая прысутнасць Глінскага пры згаданых выплатах не была патрэбная. Грошы ён мог атрымаць і пазней.

[160] AGAD, Rachunki Królewskie, sygn. 23, f. 11.

[161] ПСРЛ. Т. 32. С. 165.

нягледзячы на ўсю павагу да яго. Упершыню ў канцылярскай практыцы ВКЛ тытул «найвышэйшы гетман» (*supremus campiductor*) ужываецца ў дачыненні да Канстанціна Іванавіча Астрожскага ў акце надання яму Уздолбіцаў і Глінска пад Брацлавам ад 30 верасня 1497 г.[162]. Канстанцін Астрожскі быў першым вялікім гетманам ВКЛ.

Рэкамендацыя, што прыпісваецца ўкладальнікам Хронікі Быхаўца пану Пятру Янавічу, павінна была абгрунтаваць пераемнасць гэтых дзвюх выдатных асоб. Абодва спачатку займалі пасады луцкага старосты і маршалка зямлі Валынскай, а таксама брацлаўскага і вінніцкага намеснікаў, і, нарэшце, як верх палітычнай кар'еры — троцкага ваяводы. Абодва баранілі Падолле і Валынь ад татараў. Відавочна, такія паралелі ў кар'еры ляглі ў падмурак легенды.

Імклівы пачатак кар'еры Канстанціна Астрожскага звычайна звязваецца з яго ваеннымі поспехамі[163]. На абставіны яго прызначэння вялікім гетманам ВКЛ можа праліць святло пазнейшы ліст пасла ў Іспаніі Яна Данцішка да караля Жыгімонта Старога. У сваім лісце з Вальядаліда (Valleoleti) ад 6 мая 1527 г. пасол, згадваючы, які рэзананс атрымала ў Еўропе апошняя перамога князя Канстанціна Астрожскага над татарамі і туркамі[164], пісаў, што «гэтая перамога прыпісвалася не Вашай каралеўскай міласці, але нейкаму князю Канстанціну, грэку, які служыў (раней) у Італіі імператару Максіміліяну, паколькі ва ўсіх гэтых навінах згадвалася выключна імя князя Канстанціна»[165].

Гэтае паведамленне каралеўскага пасла ў Іспаніі тлумачыць, чаму на наваствораную пасаду вялікага гетмана быў прызначаны менавіта Канстанцін Астрожскі. Вялікі князь Аляксандр, прымаючы рашэнне, мусіў улічваць той бясцэнны ваенны вопыт, які князь Канстанцін набыў на службе імператара Максіміліяна Габсбурга, калі апошні вёў войны ў Італіі. Да паведамлення Яна Данцішка неабходна паставіцца з усёй сур'ёзнасцю, паколькі гэты чалавек быў у курсе ўсіх спраў, што адбываліся як на імператарскім двары, так і ва ўсёй імперыі Габсбургаў. Іспанскі кароль і адначасова імператар Святой Рымскай імперыі Карл V, з якім Данцішак падтрымліваў шчыльныя

---

[162] AS. T. 1. S. 113; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 99.

[163] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 99.

[164] Маецца на ўвазе перамога, якую князь Канстанцін атрымаў ва ўрочышчы Альшаніца на поўдзень ад Кіева ў студзені 1527 г.

[165] «Haecque Victoria imprimis non Mti. Vrae. Sermae., sed cuidam duci Constantion, Graeco, qui in Italia caesari Maximiliani servierat, inscribebatur, quandoquidem in iis novis nudum nomen ducis Constantini exprimebatur» (AT. T. 9. S. 158).

сувязі, быў унукам Максіміліяна Габсбурга і мусіў ведаць найбольш знаных прыдворных свайго дзеда. Нарэшце, Габсбургі ўважліва сачылі за далейшым лёсам усіх сваіх выхаванцаў, незалежна ад іх канфесійнай і этнічнай прыналежнасці.

Калі князь Канстанцін Астрожскі праходзіў ваенную службу ў імператара Максіміліяна? На жаль, пра маладыя гады князя Канстанціна амаль нічога невядома. Упершыню ў гістарычных крыніцах ён згадваецца ў 1495—1496 гг. Восенню 1495 г. ён разам з луцкім старастам і маршалкам Валынскай зямлі Сямёнам Юр'евічам Гальшанскім і ўладзімірскім намеснікам Васілём Храптовічам бараніў Роўна. Змаганне было не зусім паспяховым, бо татары мелі колькасную перавагу над абаронцамі. Татары спалілі пасад, узялі «окуп» з горада і з вялікім палонам вярнуліся ў Крым[166]. У наступным 1497 г. Канстанцін Астрожскі спаўна адыграўся на крымскіх татарах. Разам з братам Міхаілам і велікакняскімі дваранамі ён двойчы разбіў крымскае войска ў Брацлаўскай зямлі, спачатку на рацэ Сарока, на Кашылаўскіх селішчах, а пасля ў вярхоўях ракі Уша, каля Петуховай магілы[167]. Несумненна, гэтыя перамогі паслужылі для вялікага князя Аляксандра рашаючым аргументам пры прызначэнні Астрожскага вялікім гетманам. Прызначэнне мусіла адбыцца паміж маем і вераснем 1497 г. 30 верасня гэтага года князь Канстанцін выступае ўжо як «supremus campiductor magni ducatus nostri Lituaniae»[168]. Не выключана, што прызначэнне на пасаду магло адбыцца ў часе знаходжання Аляксандра Казіміравіча летам 1497 г. у Брацлаўскай зямлі.

Калі ўзяць пад увагу тую акалічнасць, што ўвосень 1495 г. Канстанцін Астрожскі браў удзел у змаганні з татарамі пад Роўна, а ў 1497 г. быў ужо дома, яго ўдзел у італьянскім паходзе імператара Максіміліяна можна датаваць 1496 г. У 1494 г. французскі кароль Карл VIII распачаў ваенныя дзеянні на поўначы Італіі, што дала пачатак г. зв. італьянскім войнам, якія доўжыліся да 1559 г. У 1495 г. супраць Францыі паўстала кааліцыя еўрапейскіх манархаў, куды ўваходзілі імператар Святой Рымскай імперыі Максіміліян Габсбург (тады яшчэ толькі рымскі кароль), рымскі папа, кастыльская каралева Ізабела, арагонскі і сіцылійскі кароль Фердынанд, а таксама правіцелі Венецыі, Неапаля і Мілана. Вясной 1496 г. на Вормскім сойме было прынята рашэнне аб паходзе ў Італію. Сама выправа пачалася 17 жніўня 1496 г. Імператар меў усяго некалькі соцень коннікаў і не

[166] ПСРЛ. Т. 35. С. 123.

[167] Тамсама. С. 124.

[168] AS. T. 1. S. 113; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 99.

больш за дзве тысячы пехацінцаў. Мэтай паходу быў фларэнційскі порт Ліворна, што з'яўляўся базай французскага флоту. Палявой арміі Максіміляна дапамагаў венецыянскі флот. Аблога Ліворна моцна зацягнулася, і з пачаткам зімы Максіміліян быў вымушаны адступіць і вярнуцца ў Цiроль.

Верагодна, князь Канстанцін Астрожскі браў удзел менавіта ў гэтым паходзе імператара Максіміляна. Пасля зняцця аблогі Ліворна ён хутка вярнуўся на радзіму. Так завяршылася служба князя Канстанціна на імператарскім двары. Знаходжанне Астрожскага на двары Габсбургаў, хутчэй за ўсё, не абмяжоўвалася італьянскай выправай 1496 г. Італьянскі паход толькі завяршыў яго службу. Аднак па прычыне недахопу крыніц можна толькі гадаць, калі Астрожскі апынуўся на двары Габсбургаў і колькі часу правёў там. Паколькі яго імя адсутнічае ў айчынных крыніцах першай паловы 90-х гг. XV ст., можна меркаваць, што ў гэты час ён знаходзіўся на двары Габсбургаў. Абарону Валыні ад татарскіх набегаў у гэты час узначальваў луцкі стараста і маршалак Валынскай зямлі, князь Сямён Юр'евіч Гальшанскі. У 1491 г. ён разам з польскімі воінамі разбіў заволжскіх татараў пад Заславам[169], а ў 1494—1495 гг. мужна абараняў Карэц[170].

Знаходжанню дваран Польшчы і ВКЛ у Габсбургаў спрыяў міжнародны фактар. У гэты час пасля пэўнага ахалоджання адносін паміж Ягайлавічамі і Габсбургамі, выкліканага барацьбой за венгерскі трон, адбылася нармалізацыя адносін паміж дынастыямі. Пасля гэтага, недзе ў 1492—1493 гг., князь Канстанцін Астрожскі разам з некаторымі іншымі велікакняскімі дваранамі мог патрапіць на імператарскі двор.

Праўдападобна, зняцце імператарам Максіміліянам аблогі Ліворна не было асноўнай прычынай таго, што Канстанцін Астрожскі прыняў рашэнне вярнуцца дамоў. На яго намер маглі паўплываць татарскія напады на Падолле 1497 г., а таксама запланаваная на гэты год польскім каралём Янам Ольбрахтам і вялікім князем літоўскім Аляксандрам выправа на малдаўскага ваяводу Стафана. Падчас паходу гаспадарскага войска на Сароку праз Брацлаў летам 1497 г. Аляксандр Казіміравіч мог звярнуць увагу на таленавітага военачальніка, які перад гэтым атрымаў дзве перамогі над татарамі. З прызначэннем Астрожскага на пасаду вялікага

[169] ПСРЛ. Т. 32. С. 122.

[170] Тамсама. С. 122.

гетмана ВКЛ скончылася яго вандроўнае жыццё тыповага еўрапейскага кандацьера.

Гэта прызначэнне сведчыць пра несумненны талент вялікага князя Аляксандра падбіраць кадры. Ён абапіраўся на маладых людзей — ініцыятыўных, прадпрымальных і энергічных, якія ўжо пабачылі свет, набылі практычны досвед і еўрапейскую адукацыю. Акрамя Канстанціна Астрожскага да ліку такіх людзей адносіўся князь Міхаіл Львовіч Глінскі. Як і Астрожскі, Глінскі ў маладосці служыў на двары імператара Святой Рымскай імперыі, у войску саксонскага герцага Альбрэхта падчас вайны ў Фрысландыі. Не выключана, што яны маглі патрапіць на імператарскі двор адначасова. «Памяць роду Глінскіх» звязвае ад'езд маладога князя Міхаіла за мяжу з пасольствам пана Яна Літавора Храптовіча ў «немцы»[171]. Магчыма, са згаданым пасольствам за мяжу мог выехаць таксама князь Канстанцін Астрожскі.

У пачатку 1497 г., у сувязі з плануемай чарнаморскай выправай, абодва вярнуліся дамоў[172]. Пасля заканчэння кампаніі іх шляхі разышліся: князь Канстанцін застаўся ў ВКЛ, дзе заняў пасаду вялікага гетмана, а князь Міхаіл найверагодней вярнуўся ў Заходнюю Еўропу, дзе паспеў прыняць удзел у фрызскай кампаніі герцага Альбрэхта Саксонскага[173].

### 2.2.11. На вайне ў Фрысландыі

Фрысландыя з'яўлялася паўночнай правінцыяй Нідэрландаў, якая прасціралася ад Звіна (Zwin) да вусця ракі Везер і далей да ракі Відавы (Wiedau). Большасць яе жыхароў складалі этнічныя фрызы. Гэта быў густазаселены край, жыхары якога займаліся пераважна сельскай гаспадаркай. Апошняя была ў значнай ступені арыентаваная на знешнія рынкі. З краю пастаўляліся на экспарт розныя гатункі масла,

---

171 Бычкова М. Е. Родословие Глинских из Румянцевского собрания. С. 121.

172 Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 98.

173 Нашыя веды пра ўдзел Міхаіла Глінскага ў вайне ў Фрысландыі пераважна грунтуюцца на паведамленні Жыгімонта Герберштайна ў ягоных Нататках пра Масковію (Герберштейн С. Записки о Московии. Т. I. С. 365). Але яшчэ ў часе пасольства 1517 г. імператарскі пасол заяўляў маскоўскім баярам, што Міхаіл Глінскі на службе Альбрэхту Саксонскаму «всегда себя бодрена показалъ» (Памятники дипломатических сношений древней России с державами иностранными. Т. I. С. 313). Варта, аднак, прыслухацца і да пункту гледжання Стывена Роўэла, які лічыць, што весткі Герберштайна пра ўдзел Глінскага ў вайне ў Фрысландыі маглі быць плёнам ягонай уласнай дэдукцыі (Роўэл С. «Не кладзеце надзеяў на князёў»: Міхал Глінскі, Жыгімонт Стары ды пана-рада // ARCHE. 2014. №12. С. 553—554 (зноска 22).

сыроў і мяса; у той жа час правінцыя імпартавала зерне, попыт на якое павялічваўся. Мясцовыя жыхары займаліся таксама рыбалоўствам.

Фрысландыя лічылася багатым краем і пастаянна прыцягвала ўвагу замежных уладароў. Тым больш, што ў краі не было ўладара; графы Галандыі страцілі ўладу над правінцыяй. На мясцовым і рэгіянальным узроўні ў Фрысландыі існавала сістэма самакіравання, заганы якой апошнім часам абвастрыліся. Канфлікт дзвюх варагуючых груповак, а менавіта «Шырынгераў» і «Веткопераў», ствараў ідэальныя ўмовы для ўмяшання ва ўнутраныя справы Фрысландыі манархаў, якія імкнуліся распаўсюдзіць сваю ўладу на правінцыю. Адносіны з Святой Рымскай імперыяй рэгуляваліся на падставе імперскага прывілея 1417 г., які гарантаваў захаванне мясцовых свабод, у першую чаргу, незалежнасці ад княскай улады, а таксама абарону і падтрымку ў выпадку патрэбы з боку Імперыі[174].

Нідэрланды былі добра знаёмыя саксонскаму герцагу Альбрэхту. Яшчэ ў 1488 г. ён на чале імперскага войска ажыццявіў імклівы паход на горад Бруге, каб вызваліць захопленага мясцовымі жыхарамі ў палон рымскага караля Максіміліяна Габсбурга. Пасля паспяхова праведзенай аперацыі Альбрэхт Саксонскі быў прызначаны вышэйшым намеснікам Нідэрландаў (Generalstathalter). Акрамя таго, ён быў прызначаны апекуном непаўналетняга сына Максіміліяна Філіпа.

Пасля таго як Філіп пераняў уладу ў Нідэрландах, герцаг Альбрэхт, перад якім стаяла праблема забеспячэння спадчынных правоў для трох сваіх сыноў, мусіў звярнуць увагу на Фрысландыю. Барацьба палітычных груповак давала яму падставу для ўмяшання ва ўнутраныя справы краю. У фрысландскай палітыцы герцаг Альбрэхт зрабіў стаўку на групоўку «Шырынгераў», якія яшчэ ў 1495 г. былі гатовыя прызнаць яго ў якасці ўладара (Potestat) Фрысландыі. Толькі адсутнасць мандата рымскага караля, а таксама італьянскія падзеі і барацьба Максіміліяна за спадчынныя правы ў герцагстве Гелдэрн перашкодзілі саксонскаму герцагу правесці ваенную аперацыю.

Толькі ў 1497 г., пасля замірэння з герцагам Гелдэрна і італьянскага паходу, з'явіліся спрыяльныя ўмовы для актыўнага ўмяшання ў справы Фрысландыі. Акрамя таго, сам рымскі кароль Максіміліян канчаткова пагадзіўся з тым, каб герцаг Альбрэхт стаў спадчынным

[174] Baks P. Albrecht der Beherzte als erblicher Gubernator und Potestat Frieslands — Beweggründe und Verlauf seines friesischen Abenteuers // Herzog Albrecht der Beherzte (1443—1500): ein sächsischer Fürst im Reich und in Europa / Hrsg. A. Thieme. Köln—Weimar—Wien, 2002. S. 105—106.

уладаром правінцыі. 30 красавіка 1498 г. саксонскі герцаг Альбрэхт быў абвешчаны ўладаром Вестэрга (Herr von Westergo), адной з зямель Фрысландыі, дзе мелі ўплыў яго прыхільнікі «Шырынгеры». Гэтая дата можа лічыцца пачаткам улады саксонскіх герцагаў над Фрысландыяй.

Аднак па-за ўладай герцага Альбрэхта заставалася большая частка правінцыі. Абодва бакі пачалі актыўна рыхтавацца да збройнага канфлікту. У Фрысландыю пацягнуліся ландскнехты і жаўнеры. На чале саксонскага войска стаяў вопытны военачальнік, дарадца герцага Альбрэхта Вільвальт фон Шаумбург (Wiwolt von Schaumburg). Рашаючая бітва адбылася 10 чэрвеня 1498 г. каля мястэчка Лааксум (Laaksum) у паўднёва-заходняй Фрысландыі, дзе паўтары тысячы вопытных і дысцыплінаваных нямецкіх жаўнераў разбілі шэсць тысяч апалчэнцаў з Зевенвудэна (Zewenwouden)[175]. Пасля перамогі Вільвальт фон Шаумбург і Найхард Фухс перакінулі свае войска ў зямлю Астэрга (Ostergo), дзе чатыры тыдні пазней яны прымусілі да капітуляцыі горад Лёвардэн (Leeuwarden). Тым часам, дайшло да згоды паміж Максіміліянам Габсбургам і Альбрэхтам Саксонскім адносна спадчынных правоў Вецінаў на Фрысландыю. 20 ліпеня 1498 г. на паседжанні рэйхстага ў Фрайбургу — Брайзгау Альбрэхт быў афіцыйна абвешчаны спадчынным уладаром Фрысландыі[176].

Невядома, ці браў удзел Міхал Глінскі ўдзел у згаданай бітве каля Лааксума. Ва ўсякім разе змаганне за правінцыю было далёкім ад завяршэння. Патрэбна было падпарадкаваць адзін з буйнейшых гарадоў краю Гронінген. Да таго ж у пачатку жніўня 1498 г. ад герцага Альбрэхта адпалі жыхары Лёвардэна. 13 жніўня Вільвальт фон Шаумбург са сваімі ландскнехтамі, сярод якіх мусіў быць Міхаіл Глінскі, рушыў на Лёвардэн. Аднак саксонскі военачальнік, не маючы дастатковых сродкаў для штурму, змушаны быў перайсці да працяглай аблогі горада. Толькі 23 кастрычніка гарнізон Лёвардэна капітуляваў. Дэпутацыя горада павінна была з непакрытымі галовамі і басанож укленчыць перад саксонскімі военачальнікамі. Пры гэтым гараджане мусілі выплаціць 11 тысяч рэйнскіх гульдэнаў у якасці кампенсацыі за вялізныя выдаткі, якія панёс саксонскі бок у ходзе баявых дзеянняў. З паўторным захопам Лёвардэна герцаг Альбрэхт Саксонскі канчаткова авалодаў Заходняй Фрысландыяй[177].

---

[175] Падрабязна пра бітву: Mol J. A. De slach by Laaksum 10 juny 1498 // It Beaken. 1998. No. 60. S. 102—118.

[176] Baks P. Albrecht der Beherzte als erblicher Gubernator und Potestat Frieslands... S. 133.

[177] Rabeler S. Niederadlige Lebensformen im späten Mittelalter... S. 226—228.

Аднак пасля гэтага ваенныя дзеянні ў Нідэрландах не скончыліся. Неўзабаве аднавілася вайна ў Гелдэрне. У кастрычніку 1498 г. у Нідэрланды асабіста прыбыў рымскі кароль Максіміліян Габсбург. Паралельна з ваеннымі дзеяннямі ў Гелдэрне Максіміліян распачаў вайну супраць французскага караля Людовіка XII, якая доўжылася ўсяго толькі тыдзень і завяршылася 8 лістапада 1498 г. замірэннем бакоў. «Гісторыя і дзеі Вільвальта фон Шаумбурга» апавядаюць пра сутычку саксонскага военачальніка з французскай конніцай, з якой ён выйшаў пераможцам[178]. Не выключана, што ў складзе саксонскіх жаўнераў знаходзіўся Міхаіл Глінскі.

Пасля заканчэння французскай кампаніі Максіміліян Габсбург мог цалкам засяродзіцца на барацьбе з гелдэрнскім герцагам Карлам. У канцы лістапада ён разам з саксонскім герцагам і некаторымі іншымі нямецкімі князямі пачаў аблогу горада Стрэлен (Straelen), які здаўся 8 снежня. У пачатку студзеня 1499 г. капітуляваў іншы горад Гелдэрна — Эмерых. 14 студзеня фармальна капітуляваў гелдэрнскі герцаг Карл[179]. Улічваючы, што ў апошняй кампаніі браў актыўны ўдзел Вільвальт фон Шаумбург, можна меркаваць, што побач з ім знаходзіўся Міхаіл Глінскі.

### 2.2.12. Вяртанне дамоў

Верагодна, ужо пасля капітуляцыі Гелдэрна, у другой палове студзеня 1499 г. Міхаіл Глінскі вырушыў дамоў. Яго шлях пралягаў праз нямецкія землі, Польшчу, дзе ён, магчыма, быў прыняты каралевічам Жыгімонтам. Не выключана, што па дарозе Глінскі заехаў у Мальбарк, дзе наведаў свайго старога сябра, сына Альбрэхта Саксонскага магістра Тэўтонскага ордэна Фрыдрыха. У Вільню ён мусіў прыбыць у другой палове лютага 1499 г.

Ён вяртаўся як трыумфатар. Ваенная кампанія ў Фрысландыі прынесла яму славу[180]. Ён увабраў тое, да чаго імкнуліся рымскі кароль Максіміліян Габсбург і саксонскі герцаг Альбрэхт, што яны прывівалі сваім гадаванцам[181]. Дзякуючы сваім рыцарскім якасцям і вытанчаным манерам ён набыў знаёмых і займеў сувязі. Сваёй галантнасцю ён заваяваў сімпатыі многіх уплывовых людзей. Вяр-

[178] Die Geschichten und Taten Wilwolts von Schaumburg / Hrsg. A. von Keller. Stuttgart, 1859. S. 180; Rabeler S. Niederadlige Lebensformen im späten Mittelalter… S. 230.

[179] Rabeler S. Niederadlige Lebensformen im späten Mittelalter… S. 230.

[180] Герберштейн С. Записки о Московии. Т. 1. С. 465.

[181] Пра рыцарскі ідэал як галоўную рухаючую сілу ў дзейнасці Альбрэхта Саксонскага: Baks P. Albrecht der Beherzte als erblicher Gubernator und Potestat Frieslands… S. 110—113.

таўся дамоў Міхаіл як вопытны, дасведчаны воін. Ён набыў неабходныя веды ў розных галінах ваеннага мастацтва, ад ваеннай тактыкі і стратэгіі да фартыфікацыйнага будаўніцтва. Прадметам асаблівага захаплення Міхаіла Глінскага з'яўлялася, несумненна, артылерыя.

Вайна ў Нідэрландах павінна была прынесці Міхаілу Глінскаму і пэўныя фінансавыя прыбыткі. Яго прыбыткі не маглі параўнацца з прыбыткамі Альбрэхта Саксонскага або Вільвальта фон Шаумбурга. Аднак ён мусіў вяртацца дамоў адносна забяспечаным чалавекам. Ваенныя дзеянні ў Фрысландыі засведчылі, што вайна стала ператварацца ў сапраўдны бізнес. Многія ўладары, у тым ліку і Альбрэхт Саксонскі, выступалі ў якасці прадпрымальнікаў, што імкнуліся атрымаць ад вайны прыбытак[182]. Нарэшце, нельга скідваць з рахункаў ваенную здабычу, захоп якой лічыўся справай гонару. Думаецца, Максіміліян Габсбург і Альбрэхт Саксонскі здолелі прывіць свайму выхаванцу якасці ваеннага прадпрымальніка. У ходзе кампаніі ў Фрысландыі Міхаіл Глінскі навучыўся не толькі ваяваць, але таксама лічыць уласныя грошы. Не дзіўна, што пасля вяртання з замежжа ён быў прызначаны кіраўніком гаспадарскага манетнага двара.

Верагодна, дамоў ён ехаў не адзін. Разам з ім мусілі ехаць некаторыя ягоныя таварышы, якіх ён пераканаў перспектывай хуткай кар'еры ў Літве. Сярод іх вылучалася постаць Крыштафа (Хрыстафора) Шляйніца (Schleinitz), прадстаўніка знакамітай саксонскай фаміліі. Радавым гняздом Шляйніцаў лічыўся саксонскі Майсэн, пазнейшая сталіца нямецкай парцэляны. Уладанні роду Шляйніцаў знаходзіліся ў Саксоніі і суседняй Багеміі. Дзейнасць некалькіх пакаленняў роду Шляйніцаў была звязаная з саксонскім дваром, на якім яны звычайна займалі пасаду вышэйшага маршалка (Obermarschall). Першым з роду, хто выконваў на саксонскім двары Вецінаў абавязкі вышэйшага маршалка, быў прадзед Крыштафа Шляйніца Ян (1449—1464)[183]. Вышэйшым маршалкам з'яўляўся сын Яна Хугальд (Hugold). У час, калі на саксонскім двары курфюрста Альбрэхта знаходзіўся малады Міхаіл Глінскі, гэту пасаду займаў сын Хугальда і бацька Крыштафа Генрых (Heinrich)[184]. Апошні меў пяцярых сыноў: Вольфа, Эрнста, Ёхана, Крыштафа і Георга. Ён таксама меў, па меншай меры, трох дачок:

[182] Baks P. Albrecht der Beherzte als erblicher Gubernator und Potestat Frieslands… S. 109—110.
[183] Streich B. Zwischen Reiseherrschaft und Residenzbildung… S. 129, 595.
[184] Тамсама. S. 135, 596.

Брыгіту, Катарыну і Магдалену[185]. Вольф, Эрнст і Ёхан прысвяцілі сябе духоўнай кар'еры. Ёхан быў біскупам у Мерзэбургу (1518—1537)[186]. Як біскуп, ён падтрымліваў цесныя сувязі з лідарам Рэфармацыі Марцінам Лютэрам[187]. Міхаіл Глінскі мусіў пазнаёміцца з Крыштафам Шляйніцам на вецінскім двары. Не выключана, што пераход маладога Міхаіла з праваслаўя ў каталіцтва мог адбыцца пад уплывам сям'і Шляйніцаў, многія члены якой вызначаліся рэлігійнасцю.

## 2.3. На гаспадарскай службе

### 2.3.1. Браты Іван і Васіль — гаспадарскія дваране

Сыны князя Льва Іван і Васіль пачалі палітычную кар'еру як дваране Казіміра Ягайлавіча ў 80-я гг. XV ст. У 1495 г. Іван Львовіч з'яўляўся ожскім і пераломскім намеснікам, у 1501 г. ён атрымаў пасаду гаспадарскага маршалка і велікакняскага харужага, а ў 1505 г., пасля смерці Дзімітрыя Пуцяціча, стаў кіеўскім ваяводам[188]. Іван Львовіч Глінскі завяршыў сваю кар'еру на пасадзе новагародскага ваяводы, якую ён атрымаў у самым канцы 1506 г.[189]. Другі брат Міхаіла, Васіль, з 1500 г. быў васілішскім намеснікам і велікакняскім падстоліем[190]. У 1505 г. ён стаў старостам і ключнікам берасцейскім. У 1507 г. Жыгімонт Стары пацвердзіў Васілю Львовічу прывілей на берасцейскае староства і ключ, нададзены вялікім князем Аляксандрам[191].

Палітычны статус братоў Глінскіх меў эканамічны падмурак. Іван Львовіч сумесна са сваімі пляменнікамі Дзімітрыем Васілевічам і Юрыем Васілевічам Храмым валодаў трыма дварамі пад Клецкам[192]. Яму належаў таксама двор Вяйсеі ў Пераломскім павеце[193]. Але

[185] Hieke W. Die Freiherren von Schleinitz in Nordböhmen // Mitteilungen des Vereins für Geschichte der Deutschen in Böhmen. Bd. 27. 1889. S. 365—366.

[186] Neues allgemeines Deutsches Adels-Lexicon / Hrsg. E. Kneschke. Bd. 8. Leipzig, 1863. S. 196.

[187] Luther M. Ein Sendebrief an Jhan von Schlenityz zu Jhanszhauszen [meynem besondern gonstigen herrn und freunde]. Wittenberg, 1522.

[188] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 98.

[189] Намінацыя Івана Львовіча Глінскага на пасаду новагародскага ваяводы адбылася ў студзені 1507 г. (LM. Užrašymų knyga 8. P. 185). Упершыню на пасадзе новагародскага ваяводы Іван Львовіч згадваецца ў гаспадарскім лісце на імя мітрапалічага дзяка Васкі Пятровіча ад 30 снежня 1506 г. (Тамсама. P. 175).

[190] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 98.

[191] LM. Užrašymų knyga 8. P. 197—198.

[192] Тамсама. P. 258.

[193] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 99.

асноўныя яго ўладанні знаходзіліся ў Кіеўскім павеце. Большасць іх ён атрымаў ад сваёй жонкі, пані Раманавай, сястры Багдана, Андрэя і Дзімітрыя Івашэнцавічаў. Сярод іх былі маёнткі Стары і Новы Рут, Таганаў, Очкаў, Навасельца, Кастаміраў, сёлы Сычы на Дняпры, Каменнае ў Олеўскай валасці, Апачычына на Прыпяці, Мухаедавічы, Кабановічы, Максімавічы, Загальцы, Скубрычы, Жэрава, Кыполава, Навастаў, Саўка, Вароніна, Барысаў, двор у Кіеўскім замку і на пасадзе, а таксама двор у Оўручы[194]. Івану Львовічу належала сяло Баравое ў Олеўскай валасці Кіеўскага павета[195]. У гэтай жа валасці ён меў сяло Сушчаны[196].

Васіль Львовіч трымаў двор Клевіца ў Ваўкавыскім павеце[197], а таксама двор Забалоцце (Бажанава) у Лідскім павеце[198]. У суседнім Васілішскім павеце ён меў дваццаць службаў людзей[199]. Пасля смерці князя Міхаіла Барысавіча Цвярскога Васіль Львовіч атрымаў маёнтак Ласосіна ў Слонімскім павеце[200]. Меў ён таксама ўласны дом у Вільні[201].

Магутным фактарам, які спрыяў прасоўванню інтарэсаў дому Львовічаў, стала ўтварэнне імі ўласнай групоўкі. Гэтая групоўка была дастаткова шматлікай і грунтавалася як на аснове радства, так і прынцыпе «патрон-кліент». У яе склад уваходзілі як іх крэўныя (Андрэй Дрожджа, Якуб Івашэнцавіч), так і кліенты, сярод якіх былі асобы княскага і панскага паходжання (князі Андрэй Друцкі, Адзінцэвічы, Жыжэмскія, Казлоўскія, Азярэцкія, паны Астафій Дашкавіч, Пётр Фурс), а таксама баяры (Жэрабяцічы, Сямён Аляксандраў, Іван Матаў, браты Крыжыны, Святоша, Дзяменя, Ізмаіл Тураў)[202]. Князі Львовічы актыўна падтрымлівалі крэўных і кліентаў, клапаціліся пра іх кар'ерны рост і дабрабыт. Многія асобы, што пазней сталі вяльможамі ВКЛ, у маладыя гады звярталіся за падтрымкай да князя Міхаіла і яго братоў. Пачатак кар'еры гаспадарскага канцлера эпохі Жыгімонта Старога Альбрэхта Марцінавіча Гаштаўта ў значнай ступені склаўся ўдала дзякуючы сувязям з князем Міхаілам Глінскім і яго братамі. Пазней, знаходзячыся на вяршыні славы,

[194] LM. Užrašymų knyga 8. P. 320.

[195] Тамсама. P. 255.

[196] Тамсама. P. 266.

[197] Тамсама. P. 251—252, 275.

[198] Тамсама. P. 270.

[199] Тамсама. P. 259.

[200] LM. Užrašymų knyga 5. P. 270; LM. Užrašymų knyga 8. P. 324.

[201] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 99.

[202] Тамсама. S. 98.

Альбрэхт Гаштаўт рашуча адмаўляўся ад кантактаў з Глінскімі і ўсяляк бэсціў былога фаварыта Аляксандра Казіміравіча[203].

Акрамя ўласнай партыі ў ВКЛ Глінскія мелі разгалінаваныя сувязі ў рэгіёне Сярэдняй Еўропы: Прусіі, Саксоніі, Сілезіі, Багеміі, Польшчы, Аўстрыі. Князя Міхаіла Глінскага добра ведалі на двары венгерскага караля Уладзіслава Ягелона. Як уладар Райгарада і Гонязя на Падляшшы ён падтрымліваў рэгулярныя кантакты з магістрам Тэўтонскага ордэна Фрыдрыхам. Дзякуючы шлюбу князя Васіля з сербскай княжной з роду Якшычаў-Бранкавічаў Ганнай Глінскія параднiлiся з адным з самых знатных балканскіх родаў[204]. Нельга скідваць з рахункаў сувязі Глінскіх у Крыме. Падтрымлівалі Глінскія сувязі з Кіятавічамі Заволжскай Арды, пакуль тая не знікла з палітычнай карты як самастойнае дзяржаўнае ўтварэнне. У згаданым лісце хана Заволжскай Арды Шах-Ахмата да братоў Львовічаў чытаем: «а тут есте подле мене, у моемъ царстве, и справа, и злева. Вланы князи чотыры, корачы болшы киятов князеи и брати вашое слугъ, у мене нетуте болшыхъ и лепшых»[205].

### 2.3.2. Уцянскі намеснік

На гаспадарскім двары Міхаіл Глінскі быў сустрэты прыхільна. Да Аляксандра Казіміравіча мусілі дайсці весткі пра службу маладога князя ў Італіі і Фрысландыі. Да гонару вялікага князя, ён адразу здолеў ацаніць вопыт і веды, якія Міхаіл набыў у ходзе працяглага знаходжання ў Еўропе.

Услед за вяртаннем паследавала першая пасада. Паміж 15 лютага і 13 сакавіка 1499 г. Міхаіл Глінскі быў прызначаны намеснікам ва Уцяне[206]. У якасці ўцянскага намесніка ён выступае ў дакуменце надання гаспадарскаму пісару, пану Федку Янушковічу, фальварка Антокаль пад Вільняй ад 15 сакавіка 1499 г.[207]. З гэтым тытулам ён выступае пры наданні 4 красавіка таго ж года пану Багдану Карэйвічу двара Дэкшцяны[208]. Тое, што князь Міхаіл Глінскі атрымаў намесніцтва ва ўласна Літве, сведчыць пра давер гаспадара і паноў-рады да яго асобы.

---

[203] AT. T. 9. S. 258—269.

[204] Якшычы-Бранкавічы былі пароднены з візантыйскім імператарскім домам.

[205] LM. Užrašymų knyga 5. P. 180.

[206] Яшчэ 15 лютага 1499 г. уцянскім намеснікам быў Войцех Янавіч Клочка, а 15 сакавіка 1499 г. на гэтай пасадзе знаходзіўся Міхаіл Глінскі (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 213).

[207] Акты Литовской Метрики. Т. 1. Вып. 2. С. 8; LM. Užrašymų knyga 6. P. 190.

[208] РИБ. Т. 27. Стлб. 751—753.

Пасада ўцянскага намесніка з'явілася ў пачатку панавання Аляксандра Казіміравіча. Першым намеснікам тут быў гаспадарскі дваранін Война Янавіч Клочка, які знаходзіўся на гэтай пасадзе з 18 мая 1493 г. па 15 лютага 1499 г.[209]. З гэтай пасады Клочка пайшоў на больш прэстыжнае месца старосты ковенскага, на якім ён згадваецца ўжо 16 сакавіка 1499 г.[210]. Войцех Янавіч зрабіў добрую кар'еру на гаспадарскім двары. У 1495 г. ён стаў ахмістрам двара вялікай княгіні Алены Іванаўны, а ў 1500 г. быў прызначаны гаспадарскім маршалкам[211]. Кар'ернаму росту Войцеха Янавіча паспрыялі шлюбы. Клочка быў жанаты двойчы. Яго абранніцы належалі да вышэйшай арыстакратыі Літвы і Русі. Першай яго жонкай была цётка князя Канстанціна Астрожскага Аграфена (у каталіцтве Кацярына). Пасля смерці ўжо немаладой Аграфены-Кацярыны Астрожскай Войцех Янавіч ажаніўся з Марынай Глябовічавай[212]. Клочка з'яўляўся вопытным дыпламатам; неаднаразова ўдзельнічаў у пасольствах у Маскву, Карону і нават Заволжскую Арду. Ён падрыхтаваў добрую стартавую пляцоўку для свайго сына Мацея, які ў часы Жыгімонта Старога дасягнуў пасады старосты жамойцкага[213].

Міхаіла Глінскага з Войцехам Клочкам звязвалі службовыя справы. Гаварыць пра цесныя і прыязныя адносіны паміж імі не выпадае. Як кіраўнікі двара, Глінскі — вялікага князя, а Клочка — вялікай княгіні, яны мусілі каардынаваць свае дзеянні. Таму сустракаліся маршалкі звычайна падчас афіцыйных мерапрыемстваў і ўрачыстасцей. Нярэдка Міхаіл Глінскі і Войцех Клочка адначасова выступалі ў якасці сведак пры наданні прывілеяў розным асобам[214]. Тая акалічнасць, што ў спісах сведак імя Глінскага заўжды значылася першым, магла з цягам часу выклікаць зайздрасць з боку яго больш сталага калегі. Цікава, што пры наданні прывілеяў Войцеху Клочку Міхаіл Глінскі практычна ніколі не значыцца ў якасці сведкі. Таксама нам невядомыя прывілеі Міхаілу Глінскаму, дзе б у якасці сведкі значыўся Войцех Клочка.

У канцы XV — пачатку XVI стст. Уцяна, што знаходзілася ў Завілейскай Літве і ўваходзіла ў склад Віленскага павета, з'ўлялася

[209] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 213.

[210] Тамсама. S. 209.

[211] Тамсама. S. 110—111.

[212] Тамсама. S. 111.

[213] Тамсама. S. 111.

[214] LM. Užrašymų knyga 5. P. 265, 265—267, 267, 269—270, 275—276, 280—281.

невялікім мястэчкам, цэнтрам воласці[215]. Гэта было невялікае паселішча, максімум некалькі сотняў жыхароў. Пра іх маёмасны стан сведчыць памер дзяржаўнага падатку — «сярэбшчыны», які мусілі выплачваць гарады ВКЛ. Так, у 1512 г., ужо пры новым намесніку, жыхары Уцяны мусілі плаціць на патрэбы войска 5 коп грошаў. Для параўнання, Вільня плаціла 150 коп, Коўна — 50, Горадня — таксама 50, Ліда — 30, суседні Вількамір — 10, Менск — 10. Толькі Ваўкавыск плаціў столькі ж грошай, колькі Уцяна[216]. Як намеснік Міхаіл Глінскі мусіў некалькі разоў на год наведваць Уцяну для азнаямлення з мясцовымі справамі, збору падаткаў і разгляду судовых спраў.

### 2.3.3. Надворны маршалак

Міхаіл Глінскі, верагодна, з'явіўся на двары вялікага князя літоўскага ў другой палове 1500 г., ужо пасля бітвы на Вядрошы. Упершыню ён згадваецца, хоць яшчэ без пасады, у адным з лістоў заволжскага хана Шах-Ахмата да вялікага князя Аляксандра напрыканцы 1500 г.[217]. Як надворны маршалак Міхаіл Глінскі ўпершыню згадваецца 19 снежня 1500 г.[218]. У гэтай якасці ён таксама ўдзельнічаў у ратыфікацыі пагаднення вялікага князя Аляксандра з Лівонскім ордэнам, якое было падпісана 21 чэрвеня 1501 г. у Вендэне (зараз Цэсіс)[219].

Урад надворнага маршалка паўстаў у самым пачатку панавання Аляксандра — у 1494 г.[220]. Першым надворным маршалкам быў Рыгор Станкавіч Осцік, намеснік мерацкі і анікштаўскі. Пасля таго, як у ліпені 1500 г. Осцік трапіў у палон у бітве на Вядрошы, гэты ўрад заставаўся вакантным. У снежні 1500 г. Аляксандр Ягелончык прызначыў на гэтую пасаду Міхаіла Львовіча Глінскага. Пазней, у 1501 г., ён атрымаў намесніцтвы ў Мерачы і Анікштах[221]. Такім чынам, Міхаіл Глінскі замяніў аднаго з самых уплывовых вяльможаў ВКЛ. Можна, аднак, меркаваць, што ўрад надворнага маршалка і намесніцтвы перайшлі да яго часова — да вызвалення Осціка з маскоўскага палону.

---

[215] LM. Užrašymų knyga 5. P. 357. 357.

[216] Тамсама. P. 464.

[217] «А въ князя Львовича, въ князя Михаила, слуга мои есть, на имя Черкасъ, и ты бы его, братъ мои, не поборонилъ» (LM. Užrašymų knyga 5. P. 158).

[218] Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV—XVIII wieku: spisy / Oprac. H. Lulewicz i A. Rachuba. Kórnik, 1994. S. 76.

[219] LM. Užrašymų knyga 5. P. 241.

[220] Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego... S. 76.

[221] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 213.

У часы Аляксандра Казіміравіча адбываліся важныя змены ў характары і структуры велікакняскага двара. Пасля працяглага перыяду заняпаду, выкліканага частым знаходжаннем гаспадара ў Польшчы, велікакняскі двор, пачынаючы з апошніх гадоў панавання Казіміра Ягайлавіча, выяўляе тэндэнцыі да развіцця. Пры вялікім князю Аляксандру двор пачынае паступова ператварацца з асабістай арганізацыі ўладара ў адметную інстытуцыю. Павялічваецца колькасны склад двара; ён разбудоўваецца іерархічна. Яшчэ ў часы Казіміра Ягайлавіча пачалі ўзнікаць некаторыя новыя дворскія ўрады. У якасці ўзору выступаў польскі каралеўскі двор, адкуль былі запазычаны многія пасады і звычаі. Але ў цэлым велікакняскаму двару Аляксандра Казіміравіча былі ўласцівыя рысы, характэрныя для структуры, якая яшчэ знаходзілася ў стане эвалюцыі. Адсутнічаў канчатковы падзел дзяржаўных (земскіх) і дворскіх урадаў. На чале двара стаялі дзяржаўныя саноўнікі, а вышэйшыя дворскія ўраднікі былі толькі іх намеснікамі. Не была таксама канчаткова ўсталявана дворская іерархія[222].

Велікакняскі двор складаўся з чатырох галоўных катэгорый асоб: 1) дзяржаўныя ўраднікі і міністры; 2) дворскія ўраднікі; 3) дваране; 4) службоўцы і чэлядзь[223]. Дзяржаўнымі ўраднікамі, якія адначасова мелі дворскія пасады, былі найвышэйшы маршалак, земскі падскарбі і, у пэўнай ступені, харужы. Да ліку іншых дворскіх урднікаў адносіліся надворны маршалак, канюшы, чашнік, крайчы, кухмістр, лоўчы, мечнік, падчашы, падкаморы і падстолі. Дваранамі з'яўляліся пераважна маладыя асобы, што падпарадкоўваліся дворскім урадніакам, а таксама шляхецкая моладзь, дасланая на двор дзеля набыцця добрых манер і звычаяў. Да складу гаспадарскага двара належалі лекары, муралі, музыканты і нават палольшчыкі (sartores). Дворскімі службоўцамі былі леснікі, конюхі, кухары, пахалкі, аддзверныя, краўцы, лазебнікі[224].

Надворны маршалак з'яўляўся намеснікам вялікага або земскага маршалка — найвышэйшага ўрадніка ВКЛ, пасаду якога з 1498 г. займаў троцкі ваявода Ян Юр'евіч Забярэзінскі[225]. Гісторык Мацей Любаўскі так вызначыў кампетэнцыю вялікага маршалка: «маршалок земский был блюстителем порядка и этикета при дворе и начальником дворян (omnium ceremoniarum et curiensium magister). Он устанавливал этот порядок, издавая с соизволения короля

[222] Fuchs F. Ustrój dworu królewskiego za Stefana Batorego // Studia historyczne wydane ku czci prof. W. Zakrzewskiego. Kraków, 1908. S. 34—37.

[223] Тамсама. S. 37.

[224] AGAD, Rachunki Królewskie, sygn. 23.

[225] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 72.

соответствующие обязательные постановления, следил за тем, чтобы этот порядок соблюдался во всех помещениях и службах королевской квартиры и наказывал за его нарушение. Маршалок земский устанавливал таксу на все съестные припасы, привозившиеся на продажу в местопребывание короля, и собирал с продавцов торговые пошлины. На обязанности его лежало принимать гостей, приехавших к королю, и панов-радных и предварительно выслушывать их для доклада королю, дабы король мог почтить каждого по достоинству. Маршалок земский набирал королевских дворян, расплачивался с ними и вел им реестр, отмечал прилежных и нерадивых, устранял дурных и непослушных»[226]. Надворны маршалак быў цэнтральнай постаццю на гаспадарскім двары, начальнікам усіх дваран, і разам з тым асобай, што стала суправаджала вялікага князя[227]. У разе патрэбы, калі вялікі маршалак адсутнічаў, ён замяшчаў яго і выконваў яго абавязкі. Князь Міхаіл Глінскі, што выхоўваўся на двары імператара Максіміліяна Габсбурга, як ніхто іншы падыходзіў да гэтай пасады. Ён добра ведаў звычаі і цырымоніі, што панавалі на еўрапейскіх дварах.

У падпарадкаванні надворнага маршалка знаходзіліся шматлікія катэгорыі дворскіх ураднікаў і службоўцаў. Асаблівае месца на велікакняскім двары належала гаспадарскім маршалкам, якія выконвалі ганаровыя функцыі, а таксама дапаможныя працы ў галіне суда і адміністрацыі. Імі былі дзецi, блізкія і родныя радных паноў, а таксама асобы, што заслужылі давер вялікага князя. Яны ўсе падпарадкоўваліся надворнаму маршалку. У часы надворнага маршалкаўства Міхаіла Глінскага гаспадарскімі маршалкамі былі: Аляксандр Іванавіч Хадкевіч (1505—1509), Станіслаў Глябовіч (1492—1502), Юрый Іванавіч Ілініч (1501—1518), Янушка (1503), Войцех Янавіч Клочка (1500—1512), Станіслаў Пятровіч Кішка (1503—1512), Войцех Янавіч Кучукавіч (1493—1502), Ян Мікалаевіч Радзівіл (1500—1514), Іван Сямёнавіч Сапега (1505—1517), Барташ Табаравіч (1494—1505), Войцех Івашкавіч (1505—1506), Ян Янавіч Забярэзінскі (1503), Станіслаў Янавіч Забярэзінскі (1501—1507). У ліку гаспадарскіх маршалкаў быў родны старэйшы брат князя Міхаіла Іван (1501—1508)[228].

Побач з гаспадарскімі маршалкамі на двары стала прысутнічалі іншыя катэгорыі ўраднікаў: *надворны падскарбі* (Федзька Багданавіч

[226] Любавский М. К. Литовско-Русский сейм. Москва, 1900. С. 415—416.

[227] Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego... S. 75—76; Pietkiewicz K. Dwór litewski wielkiego księcia Aleksandra Jagiellończyka... P. 81—82.

[228] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 210.

Храптовіч, Марцін Багданавіч Храптовіч, а пасля Іван Андрэевіч Солтан), *надворны харужы* (Войцех Нарбутавіч), *надворны канюшы* (Марцін Багданавіч Храптовіч), *чашнік* (Леў Багавіцінавіч), *крайчы* (Януш Аляксандравіч Гальшанскі), *кухмістр* (Пётр Аляхновіч), *лоўчы* (Васіль Багданавіч Храптовіч, Марцін Багданавіч Храптовіч), *мечнік* (Януш Станкавіч Касцевіч), *падчашы* (Мікалай Мікалаевіч Радзівіл, Альбрэхт Марцінавіч Гаштаўт), *падкаморы* (Пётр Нарбутавіч, Андрэй Якубавіч Давойнавіч), *падстолі* (Васіль Львовіч Глінскі)[229]. Усяго дворскіх ураднікаў было каля 30[230].

На велікакняскім двары знаходзілася вялікая колькасць дваран, што складалі ганаровую світу ўладара. Да іх ліку адносіліся дваране, якія выконвалі вайсковую службу ў складзе надворнай харугвы, пакаёўцы-каморнікі і пажы-пахалкі[231]. Яны былі як ураджэнцамі ВКЛ, так і іншаземцамі. Надворная харугва ў мірны час налічвала ад 170, а ў ваенны — нават да 750 дваран з уласнымі початамі[232]. У мірны час харугоўныя дваране выконвалі шэраг абавязкаў, звязаных з выкананем судовых пастаноў, увядзеннем у валоданне зямлёй і інш. За выкананне сваіх абавязкаў яны атрымлівалі ад гаспадара плату ў форме г. зв. «адпраў». Гэта была прэтарыянская гвардыя вялікага князя літоўскага. Ёй непасрэдна загадваў надворны маршалак. Маючы ў сваім распараджэнні такую вялікую і баяздольную сілу, Міхаіл Глінскі мог пачувацца значнай палітычнай фігурай. Яго паважалі, любілі, з ім шукалі сяброўства, але адначасова яго баяліся і ненавідзелі.

На велікакняскім двары працавала мноства асоб, якія выконвалі прафесійныя абавязкі: пісары, музыканты, духоўныя, лекары, рамеснікі, пушкары і інш.

За час маршалкаўства Міхаіла Глінскага гаспадарскі двор мусіў набыць пэўную свецкасць і пышнасць. У гэтым плане Міхаіл арыентаваўся, пераважна, на саксонскі двор Вецінаў і імператарскі двор Габсбургаў. На двары служыла шляхецкая моладзь, знаходзіліся замежныя госці. Тут адбываліся разнастайныя цырымоніі і рытуалы, рыцарскія турніры, прыёмы замежных паслоў, што прыцягвалі шматлікіх гледачоў. Каларыт двару надавала ягоная поліэтнічнасць: тут знаходзіліся прадстаўнікі розных народаў, у тым ліку літвіны, русіны, немцы, татары, венгры, чэхі, сербы, малдаване. Галоўнай дзеючай

---

[229] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 211—212.

[230] Pietkiewicz K. Dwór litewski wielkiego księcia Aleksandra Jagiellończyka... P. 83.

[231] Тамсама. P. 83—84.

[232] Тамсама. P. 85—86.

фігурай з'яўлялася асоба надворнага маршалка — Міхаіла Львовіча Глінскага. З'яўленне апошняга паўсюль выклікала вялізны інтарэс[233].

Паступова князь Міхаіл высунуўся на першую ролю ў дворскім жыцці. Ён літаральна зацьміў свайго непасрэднага начальніка, вялікага маршалка Яна Юр'евіча Забярэзінскага. І рэч была не толькі ў яго прыцягальнай асабовасці. Карыстаючыся адсутнасцю Яна Забярэзінскага, які часта знаходзіўся па месцы земскай службы ў Троках, і будучы амаль няспынна пры асобе вялікага князя, Міхаіл Глінскі фактычна пераняў кіраванне гаспадарскім дваром. Відавочна, гэта не магло не адбыцца з маўклівай згоды самога гаспадара, які больш давяраў свайму фавroutу, чым земскаму ўрадніку, што ўсё больш станавіўся ў апазіцыю да ўладара. Як вынік такога развіцця падзей гаспадарскі двор апынуўся амаль на мяжы расколу. Вялікі маршалак, якога падтрымалі яго сыны Ян і Станіслаў, ператварыўся ў галоўнага праціўніка князя Міхаіла. Супярэчнасці паміж братамі Глінскімі, якіх, відавочна, падтрымлівалі іх сваякі Храптовічы, і Забярэзінскімі сталі галоўнай прычынай гучных канфліктаў на велікакняскім двары, да якіх мы вернемся пазней. Двор паступова раскалоўся на дзве партыі, што не спрыяла яго нармальнай дзейнасці.

Відавочна, што Глінскі не збіраўся абмяжоўвацца пратакольнымі дворскімі абавязкамі[234]. На базе двара ён зрабіў дастаткова паспяховую спробу стварыць баяздольную вайсковую адзінку, якая магла б браць удзел у ваенных дзеяннях. Гэта мусіла быць сапраўдная прыдворная гвардыя, вайсковая эліта ВКЛ. Падпарадкоўвалася яна выключна надворнаму маршалку. Адначасова князь Міхаіл пачаў разбудоўваць свой уласны двор, дзе галоўныя пасады займалі выхадцы з Германіі, у першую чаргу, з Саксоніі. Пра Крыштафа Шляйніца ўжо была гаворка. Гэта быў галоўны дарадца і таварыш Глінскага. Скарбнікам у князя Міхаіла быў таксама выхадзец з Саксоніі Ульрых Шэлендорф. Тэафіль Маркварт, прадстаўнік слыннага роду

[233] Цікавае паведамленне выйшла з-пад пяра гданьскага храніста, які пад датай 4 чэрвеня 1504 г. адзначыў: «Zu der zeit kwam Knes Michel Glinski zum konig mit 100 pferden aus der Wilde» (Scriptores rerum prussicarum / Hrsg. v. T. Hirsch, M. Toppen, E. Strehlke. Bd. 5. Leipzig, 1874. S. 452).

[234] «Памяць роду Глінскіх» так характарызуе абавязкі Міхаіла Глінскага на пасадзе надворнага маршалка: «И кроль Александр взял князя Михаила Глинсково к собе во двор служити, и у короля Александра князь Михаило служил, и у послов у немецких толмачил и грамоты перед королем чел, и дослужился у короля у Олександра дворового моршалства. Коли король Александр поидет к церкви или от церкви, и князь Михаило Глинскои перед королем детеи боярских розбивает…» (Бычкова М. Е. Родословие Глинских из Румянцевского собрания. С. 121).

з Каралеўца (Кёнігсберга), быў у Глінскага цырульнікам. Пад гэтым тэрмінам у тыя часы разумеўся не толькі брадабрэй, але яшчэ і лекар. Асабісты двор Міхаіла Глінскага быў свайго роду маленькім дваром у гаспадарскім двары.

Вялікакняскі літоўскі двор быў паліфанічным; тут гучалі розныя мовы: русінская, нямецкая, лацінская, чэшская, татарская, нават венгерская. Але «працоўнай» мовай двара была ўсё ж такі польская мова. Аляксандр добра ведаў русінскую мову, якой карыстаўся ў прыватным жыцці. Уладар разумеў і нават праяўляў клопат пра літоўскую мову[235], але, выхаваны ў Польшчы, ён часцей за ўсё карыстаўся на «службе» менавіта польскай мовай. Асабліва пасля 1501 г., калі на вялікакняскім двары не бракавала палякаў, як супрацоўнікаў з Кароны, так і найманых жаўнераў. Польскую мову добра ведалі русінскія і літвінскія вяльможы. Можна сказаць, што мела месца своеасаблівая ўгода, калі ўсе супрацоўнікі двара пагаджаліся камунікаваць пераважна на польскай мове. Натуральна, на польскай мове камунікавалі паміж сабой і Аляксандр з Глінскім.

Дзякуючы вялікакняскаму двару пачаў пашырацца ўплыў польскай мовы і культуры на жыццё ВКЛ. Мова вялікакняскага двара пачала паступова распаўсюджвацца сярод шляхты. Прыдворная мода, у тым ліку і мода на мову, на якой камунікавалі на двары, на дзіва хутка пераймалася прывілеяванымі пластамі насельніцтва ВКЛ.

### 2.3.4. Мерацкі намеснік

Неўзабаве Міхаіл Глінскі атрымаў мерацкае намесніцтва. Прызначэнне князя на гэтую пасаду мусіла адбыцца падчас знаходжання Аляксандра Казіміравіча на Падляшшы ўвосень 1501 г. У прывілеі Пятру Фурсавічу на двор Межава ад 7 кастрычніка 1501 г. Міхаіл Глінскі выступае як мерацкі і ўцянскі намеснік[236]. Надворны маршалак будзе трымаць мерацкае намесніцтва да пачатку 1505 г., пакуль яго на гэтай пасадзе не зменіць Юрый Пацэвіч[237].

---

[235] 18 верасня 1501 г. у Мельніку вялікі князь Аляксандр саступіў права патранату над 28 парафіяльнымі касцёламі ў Літве віленскаму біскупу Войцеху Табару, каб той мог прызначаць святароў, якія ведаюць літоўскую мову (AA. S. 616—17). Спіс касцёлаў дае ўяўленне пра геаграфічныя межы Літвы ў сціслым сэнсе. Тэрыторыя, на якой размяшчаліся згаданыя касцёлы, на захадзе даходзіла да ракі Невяжа (Рамігала, Кейданы), да гістарычнай мяжы з Жамойцю, на ўсходзе яна прасціралася да вытокаў ракі Бярэзіна (Радашкавічы, Краснае Сяло), на поўдні яе мяжой з'яўляўся Нёман (Ліда, Васілішкі, Беліца), а на поўначы яна даходзіла амаль да лівонскай мяжы (Рокішкі).

[236] LM. Užrašymų knyga 6. P. 273.

[237] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 213.

Мерач атрымала назву ад ракі, што цякла побач. Мястэчка знаходзілася на правым беразе Нёмана на стратэгічна важным шляху з Вільні ў Горадню і далей у Польшчу. У 1526 г. праз мястэчка праязджаў, вяртаючыся з Масквы, аўстрыйскі дыпламат Жыгімонт Герберштайн[238]. На паўночны ўсход ад Мерачы знаходзілася знакамітая Рудніцкая пушча, месца, дзе любілі паляваць літоўскія князі. Мерач вядома яшчэ ад часу крыжацкіх нападаў на Літву. Відавочна, што тады гэта быў велікакняскі двор. Мястэчка неаднаразова згадваецца ў «Апісаннях дарог Тэўтонскага ордэна» (Wegeberichte)[239]. Прысутнічае яно і ў «Списке русских городов дальних и близких»[240]. Як цэнтр намесніцтва Мерач упершыню згадваецца ў пачатку панавання Аляксандра Казіміравіча. Першым мерацкім намеснікам быў Станіслаў Глябовіч[241]. Пасля Глябовіча намеснікам з'яўляўся надворны маршалак Рыгор Осцік. Такім чынам, пасля палонення Осціка на Вядрошскім полі ў ліпені 1500 года да Міхаіла Глінскага паступова перайшлі ўсе яго пасады, у тым ліку і пасада мерацкага намесніка. Відавочна, гаспадар разглядаў князя Міхаіла як адпаведную замену Рыгору Осціку. У пачатку XVI ст. Мерач з'яўлялася цэнтрам павета. Тут была свая мяшчанская грамада[242]. У 1512 годзе Мерач выстаўляла ў поле 20 воінаў, а таксама плаціла 20 коп грошаў сярэбшчыны[243].

У кампетэнцыю намесніка ўваходзілі збор падаткаў і суд. У кнігах Літоўскай Метрыкі неаднаразова згадваюцца мерацкія карчомныя пенязі, г. зн. прыбыткі, якія паступалі ў скарб ад эксплуатацыі корчмаў на тэрыторыі павета[244]. Таксама ў Мерачы знаходзіўся гаспадарскі двор, дзе спыняўся Аляксандр Казіміравіч[245]. На мясцовага намесніка быў ускладзены абавязак арганізацыі прыёмаў вялікага князя і яго двара. Несумненна, што Міхаіл Глінскі, суправаджаючы гаспадара ў Польшчу і назад, мусіў часта бываць у Мерачы, якая знаходзілася на шляху з Вільні ў гэтую краіну.

---

[238] Герберштейн С. Записки о Московии. Т. 1. С. 694—695.

[239] Scriptores rerum prussicarum. Bd. II. Leipzig, 1863. S. 689—691.

[240] Тихомиров М. Н. Список русских городов дальних и ближних // Исторические записки. 1952. Т. 40. С. 236—237.

[241] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 213.

[242] LM. Užrašymų knyga 8. P. 389.

[243] Тамсама. P. 463—464.

[244] Тамсама. P. 404, 459.

[245] Тамсама. P. 464.

У Мерацкім і суседніх літоўскіх паветах знаходзіліся ўладанні Міхаіла Глінскага. Ён валодаў Лішкавам каля Мерачы[246]. Упрыгожаннем Лішкава з'яўляўся гаспадарскі замак, будоўля якога пачалася яшчэ пры Вітаўце. Пасля Грунвальдскай перамогі будаўніцтва замка так і не было завершана. У пачатку XVI ст. недабудаваны замак усё яшчэ мусіў рабіць моцнае ўражанне на жыхароў і наведвальнікаў.

Акрамя Лішкава Міхаіл Глінскі валодаў Прэнамі ў суседнім Ковенскім павеце[247]. Гэта было невялікае мястэчка, кшталту Уцяны. Прэны знаходзіліся на левым беразе Нёмана, пры дарозе, якая злучала Коўна і Горадню. Левы бераг Нёмана быў слаба заселены. Амаль да нямецкай мяжы і нават далей, да самага прускага Інстэрбурга, цягнулася пустынь (Wildnis), вынік колішняга змагання крыжакоў з літвінамі і русінамі[248].

Міхаілу Глінскаму належаў Шлягераўскі двор у Ковенскім павеце, якім раней валодаў ковенскі мытнік немец Генрых Шлягер[249]. Шлягераўскі двор Глінскі атрымаў недзе напрыканцы 1504 г. пасля смерці апошняга. Пасада ковенскага мытніка перайшла спачатку да сяброў Генрыха Шлягера, таксама немцаў Генрыха Карлавіча і Ульрыха Гоза, а з 1506 г. яе ўзяў у арэнду будучы падскарбі яўрэй Абрам Ёзафавіч Рабічковіч. Міхаіл Глінскі, бываючы ў сваім двары каля Коўна, мусіў сустракацца з Ульрыхам Гозам і Абрамам Рабічковічам, асобамі, якія адыгрывалі важную ролю ў гаспадарчым жыцці ВКЛ пачатку XVI ст. У размешчаных непадалёк Троках Глінскаму належаў Ашэйкаўскі двор, які ён вымяняў у немца Гануса, а таксама двор, які раней належаў яўрэю Якаву. Як вынікае з прывілея Глінскаму ад 27 мая 1500 г., Ашэйкаўскі двор быў агароджаны мурам[250].

Трокі знаходзіліся на паўдарозе паміж Вільняй і Мерачу. Горад у гэты час ужо стаў дастаткова правінцыйным і, можна сказаць, ператварыўся ў цень Вільні. Але бляск вялікакняскай рэзідэнцыі яшчэ канчаткова не згас. Замкі яшчэ выкарыстоўваліся для рэпрэзентатыўных функцый. У Троках захоўваўся дзяржаўны архіў ВКЛ. Тут утрымліваліся ганаровыя арыштанты, у тым ліку заволжскі хан Шах-Ахмат. У Троках існаваў заасад, дзе ўтрымліваліся разнастайныя жывёлы, у тым ліку зубры і туры[251]. Заасад ужо існаваў у канцы XIV — пачатку

[246] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 99.

[247] Тамсама. S. 99, 129.

[248] Mortensen H., Mortensen G. Die Besiedlung des nordöstlichen Ostpreußens bis zum Beginn des 17. Jahrhunderts. Bd. 2. Leipzig, 1938. S. 218—225.

[249] LM. Užrašymų knyga 5. P. 291.

[250] AGAD, Metryka Litewska (Kopia Warszawska Metryki Litewskiej), sygn. 192, f. 169—170.

[251] Герберштейн С. Записки о Московии. Т. 1. С. 632—634.

XV стст. Пра яго згадвае бургундскі падарожнік Жыльбер дэ Лануа. Троцкім ваяводам з'яўляўся Ян Юр'евіч Забярэзінскі, якому было наканавана адыграць такую важную ролю ў лёсе Міхаіла Глінскага. Троцкім кашталянам быў Станіслаў Янавіч Кезгайла.

Увогуле, Троцкае ваяводства было прадметам экспансіі роду Глінскіх-Львовічаў. Іван Глінскі атрымаў Вяйсеі і Зміркслі ў Пераломскім павеце, непадалёк ад Мерачы і Лішкава. Васіль Глінскі валодаў маёнткам Забалоцце ў Лідскім і Берштамі ў Гарадзенскім паветах[252].

## 2.3.5. Пасольства да венгерскага караля Уладзіслава Ягелона

Яшчэ больш, чым вайсковыя рэзервы, Аляксандру Ягелончыку патрабаваліся новыя людзі, адказныя, ініцыятыўныя, здольныя, дасведчаныя, з шырокім кругаглядам. Гаспадар адчуваў патрэбу ў людзях, што маглі б замяніць палоненых на Вядрошы Канстанціна Астрожскага і іншых прадстаўнікоў ваенна-палітычнай эліты дзяржавы. Адным з такіх людзей, на думку Аляксандра, быў Міхаіл Львовіч Глінскі. Па-рэнесанснаму адукаваны князь значна ўзвышаўся над тагачаснай палітычнай элітай ВКЛ.

Паездка ў Венгрыю была першым адказным даручэннем гаспадара маладому князю[253]. На выбар асобы пасла паўплывалі не толькі добрае веданне Міхаілам Глінскім замежных моў, асабліва лаціны і нямецкай, але, несумненна, і яго сувязі на венгерскім двары, у тым ліку асабістае знаёмства з каралём Уладзіславам Ягелонам. Каб зрабіць пасольства больш прадстаўнічым, а асобу пасла больш уплывовай, Міхаілу Глінскаму перад ад'ездам у Венгрыю быў нададзены ўрад надворнага маршалка.

Пасольства мусіла адбыцца ўжо пасля вяртання Аляксандра Ягелончыка з усходняга фронту ў Вільню, позняй восенню — зімой 1500 г.[254]. Пасольству Міхаіла Глінскага папярэднічала місія

[252] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 129.

[253] LM. Užrašymų knyga 5. P. 184—185.

[254] Пра тое, што пасольства было скіравана пасля завяршэння кампаніі 1500 г., могуць ускосна сведчыць радкі граматы вялікага князя Аляксандра: «(вялікі князь маскоўскі. — *У. К.*) люд великии собравши, не толко свои, але и поганъство многое на то првел безъ отповедне, моцно в землю нашого милостивого пана есть въслал. Которые жъ, впадшы въ его милости панъство, шкоды великии почынили, замъки знаменитые подобывали и волости, и люди забрали, и посели, а иные попалили, и слугъ его милости, некоторых княжат и панят великих, самих головами поимавшы и ку Москве звели. И ажъ до тых часовъ люди его не преставаютъ, казечы землю его милости и посылаючыся, и умоцаючыся» (LM. Užrašymų knyga 5. P. 184—185).

гаспадарскіх дваран Мацея Сцяцка і Дракулы, якая адправілася з Барысава 31 мая 1500 г. (*Feria sexta in festo Visitationis Marie*)[255]. Іх пасольства мела на мэце прыцягнуць чэшскага і венгерскага караля ў якасці пасярэдніка да ўрэгулявання адносін з Маскоўскай дзяржавай. Вынікам пасольства была місія, высланая каралём Уладзіславам у Маскву[256]. Аднак выправа прадстаўніка венгерскага і чэшскага караля Мацея Чажаліцкага, які наведаў Маскву ў студзені 1501 г., завяршылася безвынікова[257].

Пасольства Глінскага мусіла заручыцца палітычнай і ваеннай падтрымкай Уладзіслава Ягелона ў змаганні з вялікім князем маскоўскім. Гаспадарскі пасол павінен быў абгрунтоўваць неабходнасць такога хаўрусу не толькі кроўнымі вузамі абодвух уладароў, але і інтарэсамі каталіцкай царквы, якой быццам бы пагражала Масква і некаторыя падданыя ВКЛ праваслаўнага веравызнання[258].

Пасольства мусіла дасягнуць Буды, рэзідэнцыі караля Уладзіслава Ягелона, у канцы студзеня — пачатку лютага 1501 г. Прыезд пасла вялікага князя літоўскага не застаўся незаўважаным венецыянскім прадстаўніком на венгерскім двары Сабасцьянам Зусціньянам (Sabastian Zustignan), які пад датай 4 лютага адзначыў у сваім данясенні: «Item, uno orator dil fratello, ducha di Lituania, venuto con 60 cavali» (прыехаў пасол ад брата, ад вялікага князя літоўскага, якога суправаджалі 60 коннікаў)[259]. Цікава, аднак, як венецыянскі пасол вызначыў мэту пасольства: «vol socorsso contra moschoviti e tartari, et contra l'altro fratello, re di Polana» (жадаючы дапамогі супраць маскавітаў і татараў, а таксама супраць іншага брата, караля Польшчы (!))[260].

---

[255] AGAD, Rachunki Królewskie, sygn. 27, f. 7, 9. Мацей Сцяцко і Дракула атрымалі на выдаткі ў пасольстве па 45 фларэнаў.

[256] «Братъ вашое милости Александръ, з Божее ласки, великии князь литовскии, панъ нашъ намилостившыи, казалъ вашой ясности, брату своему милому старшому, высоце дяковати за таковую ласку, которую жъ ваша королевская милость пану нашому вделали, слышавши тую прыгоду, которую жъ ся стала его милости паньствам от того несправедливого непрыятеля, то есть от великого князя московъского. Ваша милость порушылися бртскую ласку, в то ся вложыли и для того до него своего посла послали, абы онъ от того своего злого и несправедливого вчынъку ся встягнулъ и персталъ, и за тыи шкоды, котории ся отъ него стали подданымъ нашого милостивого пана, досыть бы вчынилъ» (LM. Užrašymų knyga 5. P. 184).

[257] СИРИО. Т. 35. С. 300—307.

[258] LM. Užrašymų knyga 5. P. 185.

[259] I diarii di Marino Sanuto. Vol. 3. Bologna, 1969 (Ristampa fotomeccanica de l'edizione: Venezia, MDCCCLXXX). P. 1453.

[260] I diarii di Marino Sanuto. Vol. 3. P. 1453. P. 1453.

Венгерскі і чэшскі кароль надзвычай гасцінна прыняў князя Міхаіла. Асабліва цесныя кантакты Міхаіл Глінскі ўсталяваў з каралевічам Жыгімонтам, які тады пражываў у Будзе[261]. На вячэры 3 лютага князь Міхаіл падарыў каралевічу Жыгімонту мяса дзічыны (зубрыну). На наступны дзень, 4 лютага, пасля сняданку гаспадарскі пасол яшчэ раз абдарыў Жыгімонта зубрынай. Нарэшце, 5 лютага Міхаіл Глінскі падараваў каралевічу зацуглянага каня. Праз 4 дні ён падарыў Жыгімонту каня валашскай пароды ад вялікага князя літоўскага Аляксандра. Князь Міхаіл шчодра адарыў каралевіча разам з іншымі гасцямі, у тым ліку канцлерам чэшскага караля, легніцкім князем, а таксама панам Калафёрам, а таксама флейцістаў, што гралі падчас сняданку 7 лютага[262]. Глінскі пакінуў Буду пасля 9 лютага 1501 г. У канцы лютага — пачатку сакавіка 1501 г. ён мусіў быць ужо ў Вільні. У пачатку сакавіка 1501 г. у Буду прыехаў новы гаспадарскі пасол, нейкі Якуб (Якубка)[263].

Вынікам дыпламатычных місій вялікага князя літоўскага Аляксандра можна лічыць згоду венгерскага і чэшскага караля Уладзіслава ўзяць на сябе ролю пасрэдніка ў прымірэнні абодвух бакоў з тым, каб пасля скіраваць намаганні Ягелонаў супраць туркаў і татараў. З пасольствам 1501 г. у Венгрыю звязана таксама наступнае з'яўленне ў ВКЛ лёгкай кавалерыі, г. зв. рацаў. Відавочна, што ў часе побыту ў Венгрыі Глінскі, добра ўсведамляючы немагчымасць прамой дапамогі ягелонскіх дзяржаў ВКЛ, заняўся вярбоўкай добраахвотнікаў. Магчыма, што ён меў на гэты конт заданне вялікага князя Аляксандра. Праўдападобна, Міхаіл Глінскі якраз і меў даручэнне ад вялікага князя Аляксандра наняць у Венгрыі і затым прывесці ў Літву некалькі тысяч рацаў, якія мусілі выкарыстоўвацца ў барацьбе з маскавітамі і татарамі. У часе знаходжання ў Венгрыі князь Міхаіл мусіў увайсці ў кантакт з некаторымі сербскімі дваранамі-эмігрантамі, у тым ліку і прадстаўнікамі арыстакратычных дамоў, такімі як Якшычы і Бранкавічы, якія камандавалі аддзеламі лёгкай кавалерыі венгерскіх каралёў у часе змагання з туркамі. Цікава, што місія Глінскага ў Буду храналагічна супадае з пасылкай у Польшчу, Чэхію і Германію па вярбоўку жаўнераў. Відавочна, гэта была скаардынаваная

[261] Пра знаходжанне каралевіча Жыгімонта на двары венгерскага і чэшскага караля Уладзіслава Ягелона: Diveky A. Królewicz Zygmunt na dworze Władysława II, króla węgierskiego // Mediaevalia. W 50 rocznicę pracy naukowej J. Dąbrowskiego. Warszawa, 1960. S. 353—374.

[262] Diveky A. Zsigmond lengyel herczeg Budai számadásai (1500—1505) // Magyar Történelmi. 1914. Tár XXVI. S. 88—89.

[263] Тамсама. S. 93.

акцыя з боку вялікага князя літоўскага папоўніць ваенныя рэзервы дзяржавы прафесійнымі воінамі[264]. Не выключана, што сам князь Міхаіл Глінскі звярнуў увагу на рацаў яшчэ ў часе свайго побыту на двары імператара Максіміліяна Габсбурга і ўжо пасля вяртання дамоў параіў вялікаму князю прыняць тых на службу. Можна меркаваць, што з'яўленне лёгкай кавалерыі (будучай гусарыі) на землях ВКЛ дый, бадай, і Польшчы ў значнай ступені звязана з досведам і ініцыятывай Міхаіла Львовіча Глінскага.

### 2.3.6. Міхаіл Глінскі і канфлікт у радзе паноў. Судовая справа з Янам Забярэзінскім

У самы разгар татарскіх нападаў на землі ВКЛ раду паноў ускалыхнуў гучны канфлікт паміж надворным маршалкам Міхаілам Глінскім і троцкім ваяводам Янам Забярэзінскім. Што стала прычынай антаганізму паміж Глінскім і Забярэзінскім, высветліць не проста. Розныя даследчыкі ў свой час падавалі ўласныя версіі таго, што здарылася паміж імі. Яшчэ Тэадор Нарбут бачыў прычыны канфлікту ў антаганізме характараў абодвух[265]. У той час, калі князь Міхаіл стаў каралеўскім фаварытам, Ян Забярэзінскі быў ужо чалавекам сталага веку, які меў дарослых сыноў. Ён увасабляў сабой старую Літву, стоячы на абароне яе нораваў і звычаяў. Пры гэтым ён меў вельмі рэзкі і з'едлівы характар, з-за чаго неаднаразова меў сутыкненні з асобнымі панамі. Асабліва напружанымі былі адносіны Яна Забярэзінскага з Міхаілам Глінскім, які быў поўнай супрацьлегласцю троцкаму ваяводзе. Каралеўскі фаварыт увасабляў новую адукаваную Літву. Ён меў ганарлівы і самаўпэўнены характар, да чаго мела спрычыніцца ягонае знатнае паходжанне, а таксама высокі статус на каралеўскім двары. Паны і вяльможы сталага веку не любілі яго. Затое ён карыстаўся павагай сярод маладых арыстакратаў, у тым ліку Альбрэхта Гаштаўта і Мікалая Мікалаевіча Радзівіла.

Палітычны канфлікт паміж Глінскім і Забярэзінскім быў фактычна канфліктам пакаленняў, можна нават сказаць канфліктам бацькоў і дзяцей. Гэта быў таксама канфлікт і розных сістэм каштоўнасцей. Глінскі і яго прыхільнікі адвяргалі стары лад, прыхільнікам якога з'яўляўся Забярэзінскі. Само існаванне прывілеяў за колішнія заслугі або за заслугі продкаў у лепшым выпадку падавалася маладым

---

[264] Пляўчынскі М. Антымаскоўскія кааліцыі Ягайлавічаў у XVI стагоддзі // ARCHE. 2014. № 12. С. 306—307.

[265] Narbutt T. Pomniejsze pisma historyczne: szczególnie do historyi Litwy odnoszące się. Wilno, 1856. S. 211.

сумнеўным і спрэчным. Ім быў недаспадобы ідэал ціхага заможнага жыцця, якога прытрымлівалася старое пакаленне. Маладыя людзі прагнулі актыўнай дзейнасці. Яны, і ў першую чаргу сам князь Міхаіл, выступалі за хутчэйшую мадэрнізацыю, карэнныя рэформы літаральна ва ўсіх сферах жыцця ВКЛ.

Сучасны польскі даследчык, знаўца эпохі Кшыштаф Пяткевіч мяркуе, што ў аснове канфлікту паміж Забярэзінскім і Глінскім маглі ляжаць нейкія маёмасныя спрэчкі[266]. Канфлікт узмацняла зайздрасць да асобы каралеўскага фаварыта, якую адчувалі літоўскія паны, у тым ліку Ян Забярэзінскі. Паглыбіць антаганізм паміж вяльможамі, на думку Пяткевіча, маглі таксама аўтарытэт, якім цешыўся Глінскі, яго адукаванасць і вайсковы талент, а таксама пагарда, якую князь Міхаіл свядома ці несвядома аказваў старой літоўскай арыстакратыі.

На думку даследчыка гісторыі старажытнай Літвы Тэадора Нарбута, важную ролю ў эскалацыі канфлікту паміж Глінскім і Забярэзінскім магла аказаць яўная апазіцыя афіцыйнаму палітычнаму курсу вялікага князя Аляксандра, якую выказваў троцкі ваявода[267]. Ян Забярэзінскі неаднаразова адкрыта выказваўся супраць знешнепалітычнай лініі велікакняскага ўрада, указваў на пралікі і памылкі апошняга. Паступова вакол яго асобы згуртаваліся галоўныя апазіцыянеры сярод радных паноў. Да іх ліку адносіліся віленскі біскуп Войцех Табар, вялікі гетман Станіслаў Пятровіч Кішка, полацкі намеснік Станіслаў Глябовіч, жамойцкі староста Станіслаў Янавіч Кезгайла. Ап'янёныя зайздрасцю і рэўнасцю да гаспадарскага фаварыта і галоўнага дарадцы паны яшчэ пры жыцці Аляксандра Казіміравіча сталі прыпісваць яму віну за няшчасці і беды, што абрынуліся на дзяржаву ў пачатку XVI ст. Нельга выключыць канкурэнцыю паміж Забярэзінскім і Глінскім, вялікім і надворным маршалкамі, начальнікам і падначаленым, што разгортвалася на велікакняскім двары. Да спроб маладога князя Міхаіла адыгрываць рашаючую ролю на двары Аляксандра Забярэзінскі паставіўся варожа і агрэсіўна.

Даследчыкі не адзінадушныя ў тым, што магло паслужыць непасрэдным штуршком пераходу канфлікту паміж Забярэзінскім і Глінскім у вострую фазу. Так, яшчэ пасол імператара Святой Рымскай імперыі Жыгімонт Герберштайн разглядаў у якасці повадаў, якія прывёў да эскалацыі канфлікту, наступныя падзеі. Аднойчы па загадзе надворнага маршалка князя Міхаіла Глінскага паслалі за аўсом

[266] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 123.

[267] Narbutt T. Pomniejsze pisma historyczne... S. 211—212.

для каралеўскіх коней у Трокі. Ваявода Ян Забярэзінскі не толькі адмовіўся даць авёс, але прыгразіў фурману, што калі той з'явіцца яшчэ раз, то будзе жорстка збіты. Пра ўсё гэта адразу данеслі князю Міхаілу, які ў другі раз паслаў таго ж самага фурмана ў Трокі. Як і абяцаў Забярэзінскі, фурман быў збіты. Праз нейкі час троцкі ваявода прыехаў у Вільню. Калі ён уваходзіў у каралеўскія пакоі, Аляксандр Ягелончык адвярнуўся ад яго і прытуліўся да акна, хоць згодна этыкету быў абавязаны ўстаць і зрабіць некалькі крокаў насустрач вяльможу. Разам з каралём у пакоі быў князь Міхаіл Глінскі. Тады Забярэзінскі гучна прамовіў, што ён адчуў няміласць, але не разумее, на чым палягае яго віна. Князь Глінскі нагадаў яму гісторыю з фурманам і аўсом. Забярэзінскі паспрабаваў апраўдацца, тлумачачы свой учынак тым, што ўсё гэта ён рабіў дзеля дабра самога караля. Але манарх абарваў яго і сказаў, што ён ужо дарослы і яму не патрэбныя адвакаты. Пасля гэтых слоў Забярэзінскі выйшаў з пакоя. Няміласць Аляксандра была такой вялікай, што Забярэзінскі страціў ваяводства. Ян Забярэзінскі і яго прыхільнікі баяліся, каб не страціць апошняе, што ў іх засталося, і таму палічылі за лепшае прымірыцца з Глінскім[268]. Згодна Герберштайну, гэта падзея мусіла адбыцца незадоўга да бітвы пад Клецкам. Аўстрыйскі дыпламат, што апісваў падзеі праз паўстагоддзя пасля таго, як яны мелі месца, змяшаў факты, другаснае выдаў за галоўнае. Насамрэч, як зараз вядома, Ян Забярэзінскі паплаціўся не за воз аўса, а за адкрытую апазіцыю дынастычнай палітыцы Аляксандра Казіміравіча[269]. На берасцейскім сойме 1505 г. Забярэзінскі страціў усе свае ўрады.

Згодна Нарбуту, повадам да распальвання канфлікту паміж вяльможамі стала жанчына[270]. Глінскаму аднекуль прыслалі чароўную грачанку або чаркеску, якая цудоўна танцавала, спявала і грала на арфе. Забярэзінскі, хоць і быў чалавекам сталага ўзросту, не мог не пазайздросціць такой удачы свайго праціўніка. Троцкі ваявода папросту выкраў чароўную грачанку-чаркеску. Аперацыя прайшла з поспехам, але адносіны паміж двума вяльможамі пагоршыліся да крайнасці. Маглі быць і іншыя повады. Кожны з аўтараў гіпербалізаваў тую версію, якая падавалася яму больш прывабнай.

---

[268] Herberstein S. Rerum Moscoviticarum Commentarii. Synoptische Edition der lateinischen und der deutschen Fassung letzter Hand Basel 1556 und Wien 1557 / Unter der Leitung von F. Kämpfer. München, 2007. S. 340—341.

[269] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 119—120; Finkel L. Elekcja Zygmunta I... S. 30—35.

[270] Narbutt T. Pomniejsze pisma historyczne... S. 212.

Яшчэ да татарскага набегу 1503 г., у маі, князь Міхаіл абвінавацію Яна Забярэзінскага ў спробе замаху на яго жыццё[271]. Як вынікае са зместу судовага выраку, канфлікт паміж імі мусіў прыняць дастаткова вострую форму яшчэ раней. Князь Міхаіл Глінскі скардзіўся наступным чынам на троцкага ваяводу: «Жаловалъ намъ маршалокъ нашъ дворный, наместникъ Мерецкий и Утенский, князь Михайло Львовичъ Глинский, на воеводу Троцкого, маршалка земъского, пана Яна Юревича тым обычаемъ: Што «перво сего многокроть была межи нами розмова и инекоторая розъторжка, и наша млсть, гсдръ нашъ, нас згодивши, и в томъ поеднали; и и приказали ваша млсть намъ, абыхмо напротивку себе с обу сторонъ в згоде были и напотомъ таковых речей не починали. Ино я, гсдру, противъ росказаня вашее млсти ничого не выступил и пана воеводы есми во всемъ безпеченъ был»[272]. Што гэта была за «розторжка», застаецца невядомым. Відавочна толькі, што славеснымі абразамі і пагрозамі справа на абмежавалася. Як вынікае з далейшага зместу судовай пастановы, антаганізм паміж Глінскім і Забярэзінскім неўзабаве набыў новы нечаканы абарот.

Галоўным фігурантам у далейшай справе паміж Забярэзінскім і Глінскім выступае каралеўскі дваранін Калікратар, якога, па словах надворнага маршалка, каб здзейсніць забойства, накіраваў да яго сам троцкі ваявода за 200 залатых. Далей, як гаворыцца ў тэксце судовага выраку, сам Глінскі «того дворенина нашого перед нами поставилъ»[273], які паведаміў гаспадарскаму суду, як і якім чынам Забярэзінскі схіляў яго ажыццявіць замах на жыццё надворнага маршалка. Сам абвінавачаны, якому далі слова, адмаўляў усё тое, што гаварыў гаспадарскі дваранін, вымаўляючы таму: «ты збойца, а не добрый человекъ»[274]. Паступова прамовы абвінаваўцы і абвінавачанага перайшлі ў славесную перапалку. Гаспадару абрыдла слухаць узаемныя абвінавачванні. Аляксандр Казіміравіч загадаў папросту спыніць разгляд справы і прымусіў бакі прымірыцца пад вялізнай «зарукай» у 10 тысяч залатых[275].

Тэадор Нарбут меў уласную версію, чаму суд прыняў такі абарот. На яго думку, Глінскі пасля выкрадання грачанкі-чаркескі быў шалёна раззлаваны на Забярэзінскага, спрабуючы ўсяляк шкодзіць яму.

---

[271] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 114.

[272] Малиновский И. Рада Великого Княжества Литовского в связи с боярской думой древней России. Ч. 2. Вып. 2. Томск, 1912. С. 381.

[273] Тамсама. С. 381.

[274] Тамсама. С. 382.

[275] Тамсама. С. 382.

Але ў гаспадарскага фаварыта нічога не атрымлівалася. І тады Глінскі быццам бы намовіў гаспадарскага двараніна Калікратара, каб той прызнаўся перад вялікім князем, што троцкі ваявода спрабаваў схіліць яго за плату ў 200 залатых здзейсніць забойства надворнага маршалка[276]. Аднак, на думку Нарбута, гаспадар не даў веры гэтай выдумцы і загадаў закрыць справу, прызначыўшы абодвум сапернікам высокую заруку за парушэнне прымірэння. Як вынік, ніводны з бакоў не быў прызнаны вінаватым; кожны з іх застаўся пры сваёй праўдзе.

Версію Нарбута нельга канчаткова адрынуць. Сам Міхаіл Глінскі як надворны маршалак кіраваў усімі гаспадарскімі дваранамі. Яму асабіста падпарадкоўваўся згаданы Калікратар. Здаецца, быў ён родам з Багеміі (Чэхіі). Нарбут прыпісвае яму нямецкае паходжанне[277]. Трапіў ён у Літву дзесьці ў 1501 г. разам з наймітамі. Не выключана, што ён служыў пад камандаваннем Чэрніка ў полацкім замку. У 1502 г. ён згадваецца сярод жаўнераў, якім было прызначана грашовае ўтрыманне[278]. На той час гэта было даволі высокае ўзнагароджанне: 200 фларэнаў. Ягонае імя гучала на лаціне як: Janiszek Kolkirather Andrzych. Імя несумненна славянскае. Не выключана, што Глінскі быў персанальна знаёмы з Калікратарам яшчэ да з'яўлення апошняга ў ВКЛ. Пасля завяршэння баявых дзеянняў на маскоўскім фронце ён застаўся ў ВКЛ, а затым быў прыняты ў склад гаспадарскіх дваран.

Несумненна, пры жаданні Глінскі мог загадаць свайму падначаленаму і, што не выключана, адначасова кліенту выканаць такі «далікатны» загад. Тым больш, што замежныя жаўнеры-найміты, якія ў той час літаральна наваднілі землі Літвы і Русі, не вызначаліся асаблівымі сантыментамі і былі гатовыя без ваганняў выканаць любы загад свайго камандзіра. Ход судовай справы сведчыць пра тое, што гаспадар засумняваўся ў сапраўднасці абвінавачання і таму загадаў згарнуць справу. Цікава, што галоўным апанентам Забярэзінскага ў судзе выступае не сам Глінскі, а Калікратар, які абвінаваціў троцкага ваяводу ў замаху на жыццё надворнага маршалка. Калі б мела месца намова з боку Глінскага, то Забярэзінскі мусіў бы абавязкова звярнуць увагу суда на гэтую акалічнасць, зрабіўшы таго галоўнай мішэнню свайго абвінавачання. З другога боку, паспешнасць, з якой суд прыняў рашэнне, можа сведчыць пра тое, што гаспадар не жадаў, каб некаторыя далікатныя моманты гэтай гісторыі, асабліва тыя, што маглі дыскрэдытаваць пасаду гаспадарскага служэбніка, атрымалі розгалас:

---

[276] Narbutt T. Pomniejsze pisma historyczne... S. 212.

[277] Тамсама. S. 212.

[278] AGAD, Rachunki Królewskie, sygn. 25, f. 48.

«Ино мы далей тог не дали есмо никому з нихъ противко себе мовити»[279]. Верагодна, што ў канчатковы тэкст судовай пастановы ўвайшло не ўсё, што было прамоўлена на судзе, пра гэта сведчаць наступныя словы з судовага выраку: «и выслухавши есмо тыи речи, которыи ж нам противны суть, а ни их хотели есмо слухати...»[280]. Прамовы ўтрымлівалі нешта такое, што было надзвычай непрыемна чуць гаспадару. І гэтае нешта было значна большым, чым узаемныя папрокі двух вяльможаў. На карту мог быць пастаўлены гаспадарскі аўтарытэт, асабліва ў галіне падбору кадраў!

Аднак нельга канчаткова адрынуць магчымасць подкупу Калікратара з боку ўсеўладнага троцкага ваяводы. Магчыма, не толькі Міхаіл Глінскі, але і Ян Забярэзінскі думаў, як прыбраць свайго працаўніка. Аднак гэта было не так проста здзейсніць, бо надворнага маршалка паўсюль суправаджалі яго сябры і целаахоўнікі, а гаспадарскія дваране без пярэчанняў слухаліся гаспадарскага фаварыта. Не выключана, што менавіта сярод апошніх Ян Забярэзінскі паспрабаваў знайсці такога, хто пагадзіўся б за вялікія грошы выканаць яго даручэнне. У часе візітаў да караля ў Вільню троцкі ваявода мусіў уважліва прыглядацца да каралеўскіх дваран, спрабуючы вызначыць таго, хто б мог падняць руку на свайго начальніка. Нельга выключыць, што такім дваранінам мог быць Янішак Калікратар.

Далей Калікратар мог разыграць папросту цудоўную партыю. Паабяцаўшы Забярэзінскаму прыбраць яго працаўніка, магчыма, нават узяўшы частку грошай, ён мог паведаміць пра змест справы свайму начальніку, палічыўшы, што замах на гаспадарскага фаварыта будзе каштаваць яму жыцця. Пазней, калі адносіны паміж Глінскім і Забярэзінскім у чарговы раз абвастрыліся, першы даў ход справе, звінаваціўшы свайго працаўніка ў спробе забойства. На карысць гэтай версіі ўскосна гаворыць славесная перапалка ў судзе паміж Забярэзінскім і Калікратарам. Так звычайна спрачаюцца людзі, якія мелі агульную справу, а пасля з нейкай прычыны пасварыліся. Супраць гаворыць тое, што Ян Забярэзінскі меў хоць сварлівы і рэзкі, але не крыважэрны характар. У тагачаснай гісторыі ВКЛ цяжка знайсці прыклады крывавай помсты ў асяроддзі магнатаў, акрамя забойства Міхаілам Глінскім самога Яна Забярэзінскага лютаўскай ноччу 1508 г.

Пасля судовага выраку ад 17 мая 1503 г. паміж бакамі наступіла, як здавалася, канчатковае прымірэнне. У якасці сведак прывілеяў

[279] Малиновский И. Рада Великого Княжества Литовского... Ч. 2. Вып. 2. С. 382.
[280] Тамсама. С. 382.

Забярэзінскаму нярэдка выступаў яго былы праціўнік[281]. Але, як аказалася, вяльможы не забылі старыя крыўды і проста перанеслі вырашэнне канфлікту на больш зручны момант.

### 2.3.7. З гаспадаром у Польшчы

У кастрычніку 1503 г., праз нейкі месяц пасля апошняга знішчальнага татарскага нападу на землі ВКЛ, гаспадар разам са сваім дваром і канцылярыяй вырушыў у Польшчу. У Кароне Аляксандр Казіміравіч будзе знаходзіцца амаль два з паловай гады (з апошняй дэкады кастрычніка 1503 г. да другой дэкады сакавіка 1506 г.). Надворны маршалак Міхаіл Глінскі будзе амаль стала суправаджаць вялікага князя. Таксама ў Польшчу адправіліся і два родныя браты Міхаіла, Іван і Васіль. За гэты час Аляксандр толькі двойчы здолеў наведаць родны край. З 1 лютага па 16 сакавіка 1505 г. ён удзельнічаў у рабоце сойма ВКЛ у Берасці. У лістападзе таго ж года гаспадар вярнуўся дамоў, каб правесці тут калядныя святы. Толькі ў пачатку наступнага 1506 г. ён ізноў вырушыў у Карону[282].

Менавіта ў Польшчы гаспадар і надворны маршалак асабліва зблізяцца. Міхаіл Глінскі стане даверанай асобай, найбліжэйшым дарадцам Аляксандра Казіміравіча. З восені 1503 г. можна ўжо даволі ўпэўнена казаць пра асаблівыя адносіны паміж гаспадаром і яго надворным маршалкам. Ад гэтага часу можна беспамылкова гаварыць пра фаварытызм Аляксандра Казіміравіча ў дачыненні да асобы Міхаіла Глінскага. Практычна паўсюдна ў Польшчы надворны маршалак будзе суправаджаць свайго гаспадара. Без рады Глінскага кароль не будзе вырашаць ніводнага пытання па справах падданых ВКЛ. Імя надворнага маршалка будзе амаль заўсёды значыцца на першым месце сярод сведак дакументаў гаспадарскай канцылярыі.

Рада надворнага маршалка мела, аднак, свой кошт. Відавочна, не без уплыву Міхаіла Глінскага Аляксандр Казіміравіч шчодра адарыў Глінскіх, іх бліжэйшых сваякоў і сяброў. Будучы ў Польшчы, гаспадар надаў швагру Глінскага, велікакняскаму канюшаму і падскарбію Марціну Храптовічу сяло Блудава ў Луцкім павеце, а таксама сяло Кадчычы і тры службы ў Шчорсах у Навагародскім павеце[283]. Блізкі сваяк Храптовічаў Станіслаў Монтаўтавіч атрымаў прывілей на некалькі сёл і маёнткаў у Маркаўскім, Гарадзенскім,

---

[281] Акты Литовской Метрики. Т. 1. Вып. 2. С. 152—153.

[282] Sochaniewicz K. Itinerarium króla polskiego Aleksandra... S. 6—7.

[283] LM. Užrašymų knyga 5. P. 266—267.

Уладзімірскім паветах, а таксама ў Жамойцкай зямлі[284]. Як сцвярджае Хроніка Быхаўца, падчас працы берасцейскага сойма 1505 г. Аляксандр па просьбе Міхаіла Глінскага адабраў у Юрыя Ілініча Ліду і аддаў яе стрыечнаму брату Глінскіх, Андрэю Дрожджу, што выклікала востры канфлікт сярод радных паноў[285]. Нарэшце, родны брат Міхаіла Васіль атрымаў гаспадарскі прывілей на двор Ласосіна ў Слонімскім павеце, які раней трымаў збеглы цвярскі князь Міхаіл Барысавіч[286].

Не забыў надворны маршалак і самога сябе. Яшчэ ў чэрвені 1504 г. Міхаіл Глінскі атрымаў Тураў з паветам[287]. Магчыма, што тады ж яму былі нададзеныя маёнткі Строжаўцы і Данілевічы[288]. Пазней, 26 студзеня 1506 г., фаварыт атрымаў права збудаваць у Тураве замак[289]. Ад чэрвеня 1504 г. Міхаіл Глінскі будзе стала тытулавацца дзедзічам, уладаром Турава. Напрыклад, у лісце ад 4 мая 1506 г. да вялікага магістра Ордэна, свайго даўняга сябра Фрыдрыха Саксонскага, ён падпішацца «Michael Herzog Hlynensis, Herr in Thurow, Oberst-Marschall von Litauen»[290].

## 2.3.8. Уладар Турава

Тураў з'яўляўся невялічкім правінцыйным мястэчкам у Пінскім павеце. Ён знаходзіўся на рацэ Прыпяць і з'яўляўся цэнтрам воласці. Дзякуючы прытокам Прыпяці горад быў звязаны з цэнтрам ВКЛ, а таксама з Падоллем і Валынню. Тураўская, як і іншыя падняпроўскія і прыпяцкія воласці, славілася багаццем флоры і фаўны. У першай палове XVI ст. падарожнікі дзівіліся колькасці дзічыны ў навакольных лясах і рыбы ў рэках[291]. Тураўская воласць разглядалася надворным маршалкам як важная крыніца ўласных прыбыткаў.

У X—XIII стст. Тураў быў цэнтрам княства, якое ўзнікла на дрыгавіцкай племяннной тэрыторыі. Першы летапісны ўспамін пра горад адносіцца да 980 г. У перыяд феадальнай раздробленасці з Тураўскага

---

[284] LM. Užrašymų knyga 5. P. 264—265.

[285] ПСРЛ. Т. 32. С. 170; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 115.

[286] LM. Užrašymų knyga 5. P. 270.

[287] Актаў пра наданне Міхаілу Глінскаму Турава не захавалася. Кшыштаф Пяткевіч мяркуе, што Глінскі атрымаў Тураў у 1505 г. (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 108). Аднак у лісце з Мальбарка ад 13 чэрвеня 1504 г. да Рады Нямецкага ордэна Міхаіл Глінскі тытулуецца як «Herzog Michel zu Lynow, Herr zu Turow» (RHDOMT. T. 2. S. 369).

[288] Кшыштаф Пяткевіч звязвае гэта наданне з наданнем Турава і мяркуе, што яно мела месца недзе ў 1505 г. (Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 108).

[289] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 108.

[290] RHDOMT. T. 2. S. 381.

[291] Літвін М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 97.

княства выдзяляецца шэраг удзельных княстваў, у тым ліку Пінскае, Слуцкае і Клецкае. У часы Альгерда гэта зямля ўвайшла ў склад Літвы. У «Спісе рускіх гарадоў далёкіх і блізкіх» Тураў адносіцца да кіеўскіх гарадоў[292]. Факт прыналежнасці Турава да Кіеўшчыны можа сведчыць пра былую залежнасць горада ад сталіцы Русі. Напрыканцы XIV ст. у Тураве, хутчэй за ўсё, княжылі родныя браты караля Уладзіслава Ягайлы, Уладзімір Альгердавіч і Скіргайла, а таксама швагер Вітаўта, Іван Альгімунтавіч Гальшанскі. У XV ст. Тураў належаў да гаспадарскага дамена.

У кіеўскую эпоху Тураў з'яўляўся адным з найважнейшых духоўных і культурных цэнтраў Русі. Тут у XII ст. жыў і працаваў слынны Кірыла Тураўскі, прazваны «другім Златавустам». У царкве Праабражэння Госпада знаходзілася рукапіснае Евангелле XI ст. У Евангеллі захаваліся запісы, зробленыя ўладальнікамі Турава, у тым ліку князем Канстанцінам Астрожскім, які валодаў горадам пасля Міхаіла Глінскага. У царкве Праабражэння знаходзіўся старажытны сінодзік (памянік), куды ўпісваліся імёны князёў, паноў, баяр і ўсіх хрысціян. У 1506 г. Міхаіл Глінскі даў 10 коп грошаў з маёнтка кіеўскага князя Дзімітрыя Пуцяціча, каб імя таго было ўнесена ў Тураўскі сінодзік[293].

Міхаіл Глінскі атрымаў Тураў навечна з правам будаўніцтва замка. На падставе ўскосных сведчанняў можна меркаваць, што ў 1506 г. замак у Тураве быў ужо збудаваны. Так, у прывілеі Міхаілу Глінскаму ад 29 студзеня 1506 г. на тураўскіх баяр гаворыцца: «што есмо ему дали волость нашу Туровъ со всим, какъ на нас держан, у в отчину, и привильем нашимъ потвердили на вечность, где жъ он тыми разы замокъ собе збудовал»[294]. Невядома, які лёс напаткаў тураўскі замак Глінскіх пасля іх мяцяжу і ад'езду ў Масковію. Улада надворнага маршалка распаўсюджвалася на ўсіх жыхароў Тураўскай воласці, у тым ліку і на мясцовых землеўласнікаў. Так, згодна са згаданым прывілеем, Глінскаму былі дадзеныя службовыя баяры, Цішка Валчковіч, Ігнат і Даніл Скалыбічы, Жадзей Патарочыч, Салтанец і Яцка Барысавічы, удава Цяпецкая і Моўчан Свіркавіч[295].

Пасля апалы Глінскага Тураў перайшоў да Канстанціна Астрожскага. Новы ўладальнік зрабіў усё магчымае, каб імя і ўчынкі яго папярэдніка былі выкраслены з гісторыі горада.

---

[292] Тихомиров М. Н. Список русских городов дальних и ближних. С. 229—234.

[293] LM. Užrašymų knyga 6. P. 63.

[294] Тамсама. Р. 322.

[295] Тамсама. Р. 322.

## 2.3.9. У Прусіі

Падчас побыту ў Польшчы кароль і вялікі князь Аляксандр знайшоў час наведаць Заходнюю Прусію, якая з 1466 г. знаходзілася ў леннай залежнасці ад Кароны, з мэтай атрымання прысягі на вернасць ад мясцовых улад[296]. Гаспадар выправіўся ў Прусію з Брэста-Куяўскага 1 красавіка 1504 г.[297]. На наступны дзень ён прыбыў у Торн (Торунь), дзе знаходзіўся на працягу 40 дзён, да 12 мая ўключна[298].

10 красавіка ў Торн выехала дэлегацыя гарадскіх улад Гданьска на чале з бурмістрамі Матсам Цымерманам і Ёргам Мандтам, райцамі Лукасам Кецінгам і Мертэнам Рабенвальдтам, а таксама пісарам Ёханам Вольтэрам. У Штуме яны сустрэліся з дэлегацыяй гарадскіх улад Эльбланга і пасламі магістра Тэўтонскага ордэна, разам з якімі прадоўжылі шлях да Торна. Пазней да іх далучыліся прадстаўнікі рымскага караля Максіміліяна Габсбурга і курфюрстаў Святой Рымскай імперыі. Дэлегацыя Гданьска знаходзілася ў Торне каля 4 тыдняў. Толькі 14 мая дэлегаты вярнуліся дамоў. Услед за імі вырушыў у дарогу кароль. Яго шлях ляжаў праз Мальбарк і Эльбланг[299].

25 мая 1504 г. Аляксандр Казіміравіч прыбыў у Гданьск. Паміж Квадратнай (Karrenthor) і новазбудаванай Знешняй вежай (Eusserster Thor) караля сустракала мноства жанчын і дзяўчат разам з жонкамі райцаў. Уся гарадская рада вітала гаспадара каля Знешняй вежы. Каронны канцлер Ян Ласкі зрабіў прамову перад каралём, які ў гэты час сядзеў на кані. Затым у суправаджэнні райцаў і ўласнай світы Аляксандр накіраваўся да жанчын і, сышоўшы з каня, слухаў іх прывітанні. Пазней кароль адправіўся да святыні (Heiligthumb), якая знаходзілася непадалёк ад Квадратнай вежы, дзе ён спешыўся і выслухаў прамову біскупа. У святыні Аляксандр знаходзіўся да таго часу, пакуль не прыбыла яго жонка, каралева і вялікая княгіня Алена Іванаўна. Яе таксама вітала рада, а потым жанчыны. У апошнім выпадку яна мусіла выйсці з карэты. Затым яна накіравалася ў святыню, дзе ўжо знаходзіўся яе муж[300].

Ад святыні працэсія ў суправаджэнні войска накіравалася ў горад. Перад каралём ехалі два туркі (татары?) і некалькі маскавітаў.

---

[296] Papée F. Aleksander Jagiellończyk. Kraków, 2006. S. 86.

[297] Sochaniewicz K. Itinerarium króla polskiego Aleksandra... S. 6.

[298] Тамсама. S. 6.

[299] Scriptores rerum prussicarum / Hrsg. v. T. Hirsch, M. Toppen, E. Strehlke. Bd. 5. Leipzig, 1874. S. 451.

[300] Тамсама. S. 451.

Спачатку кароль накіраваўся да царквы, дзе выслухаў імшу. Затым Аляксандр паехаў у ратушу, дзе затым і пасяліўся. Алена Іванаўна пасялілася ў сям'і Матса Цымермана, дом якога знаходзіўся на Рынку[301].

Праграма побыту караля ў Гданьску была насычанай. 27 мая Аляксандр прыняў у ратушы райцаў. На наступны дзень пасля абеду кароль у суправаджэнні 12 слуг адправіўся да мора. Як перадае летапісец, кароль, стоячы на беразе мора, доўга ўглядаўся ў далечыню (sah in die sehe). У гэты момант на рэйдзе знаходзілася 14 караблёў. Кароль бачыў, як прыбыў карабель з Аба і яшчэ адзін з Гольма. На наступны дзень да мора адправілася і каралева, якую суправаджала мноства прыдворных і жонак гарадскіх ураднікаў. Як і яе муж, Алена Іванаўна доўга глядзела на мора[302].

Кульмінацыя побыту караля ў Гданьску наступіла 2 чэрвеня. На гарадскім Рынку, каля Двара Артура (Artushoff), быў устаноўлены высокі трон, які быў шыкоўна аздоблены дыванамі. Пасля таго, як кароль са сваёй радай прыняў прысягу райцаў, ён пасвяціў у рыцары некалькі служэбнікаў свайго двара і двара каралевы. Годнасць рыцара атрымаў бурмістр Гданьска Матс Цымерман, якога кароль абдарыў дарагімі футрамі. Пасля таго, як кароль урачыста прыняў прысягу гараджан, усе разам скіраваліся ў царкву слухаць імшу. Пасля імшы ў ратушы быў наладжаны ўрачысты абед[303].

Міхаіл Глінскі прыехаў у Гданьск ужо пасля галоўных урачыстасцей. Адбылося гэта 5 чэрвеня. Ён прыбыў з Вільні ў суправаджэнні шыкоўнай світы ў 100 чалавек. Прыезд надворнага маршалка ВКЛ у Гданьск настолькі ўразіў гараджан, што быў занесены ў аналы горада. Храніст занатаваў: «Zu der zeit kwam Knes Michel Glinszki zum konig mit 100 pferden aus der Wilde»[304]. Праз два дні Аляксандр разам з Глінскім пакінуў гасцінны горад. Да Мальбарка караля суправаджалі бурмістры, Матс Цымерман і Ёрг Мандт, райцы Генрых Фальк, Мертэн Рабенвальдт і Грэгар Брандт[305].

---

[301] Scriptires Rerum Prussicarum. S. 452.

[302] Тамсама. S. 452.

[303] Тамсама. S. 452

[304] Тамсама. S. 452.

[305] Тамсама. S. 452.

### 2.3.10. Бельскі намеснік

На пачатку 1505 г. Міхаіл Глінскі атрымаў замест мерацкага бельскае намесніцтва. Як бельскі намеснік ён выступае ўжо ў прывілеі дзяку Мікольскаму на маёнтак Дзярэчын ад 13 сакавіка 1505 г.[306]. Не выключана, што прывілей на Бельск Глінскі атрымаў на берасцейскім сойме, які доўжыўся з 1 лютага па 16 сакавіка 1505 г.[307]. Што да мерацкага намесніцтва, то ўжо 20 лютага яно належала Юрыю Пацэвічу[308].

Прызначэнне на пасаду бельскага намесніка азначала чарговае ўзвышэнне. Бельск знаходзіўся на Падляшшы, на мяжы з Мазовіяй і Польшчай. Калісьці горад, заснаваны на тэрыторыі яцвягаў, уваходзіў у склад Галіцка-Валынскага княства. У першай палове XIV ст. пасля выгасання лініі валынскіх князёў ён адышоў да вялікіх князёў літоўскіх.

У XV ст. Бельск перажываў перыяд інтэнсіўнага росту. Кульмінацыйным момантам у развіцці горада з'яўлялася зацвярджэнне ў 1430 г. пасады войта[309]. У наступныя дзесяцігоддзі адбываўся масавы наплыў у горад новых пасяленцаў, у тым ліку палякаў і немцаў. У далейшым Бельск і Бельская зямля зведалі магутны каланізацыйны рух польскай і мазавецкай шляхты, а таксама моцны польскі культурны ўплыў, што мела сваім вынікам далучэнне ў 1569 г. Бельска разам з Мельнікам і Дарагічыным да Кароны. У 1495 г. вялікі князь Аляксандр надаў Бельску магдэбургскае права[310]. Перад Міхаілам Глінскім намеснікамі Бельска з'яўляліся Солтан Аляксандравіч і Мікалай Мікалаевіч Радзівіл. У часы Аляксандра ў Бельску быў заснаваны каталіцкі касцёл[311].

Росквіту горада спрыяла яго размяшчэнне на мяжы з Мазовіяй і Тэўтонскім ордэнам. Значны прыбытак прыносілі мыты і корчмы. Пасля выгнання яўрэяў з ВКЛ мытныя каморы ў Берасці, Дарагічыне і Бельску арандаваў ураджэнец Кракава, немец Генрых Карлавіч[312]. У якасці крыніц прыбытку для Бельска можна таксама згадаць про-

---

306 LM. Užrašymų knyga 6. P. 313—314.

307 Sochaniewicz K. Itinerarium króla polskiego Aleksandra... S. 6.

308 Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 213.

309 Vitoldiana: codex privilegiorum Vitoldi magni ducis Lithuaniae 1386—1430 / Zebrał i wyd. J. Ochmański. Warszawa—Poznań, 1986.

310 Biblioteka Czartoryskich (Kraków), Teki Naruszewicza, t. 23, f. 460.

311 Vitoldiana. S. 156.

312 LM. Užrašymų knyga 5. P. 290—291.

даж віна і воску[313]. Пра эканамічны стан Бельска найлепей сведчаць колькасць воінаў, якіх выстаўляў горад, а таксама памер дзяржаўнага падатку на вайну — сярэбшчыны. Так, у пачатку панавання Жыгімонта Старога Бельск выстаўляў 50 воінаў і плаціў 50 коп грошаў[314]. Не быў пазбаўлены Бельск і ардыншчыны. У 1501 г. мяшчане павінны былі заплаціць дзве паставы «трыцкага» сукна[315].

Непадалёк ад Бельска знаходзіўся праваслаўны манастыр у Супраслі. Манастыр быў заснаваны ў 1498 г. праваслаўным панам Аляксандрам Хадкевічам, сынам памерлага ў крымскай няволі кіеўскага ваяводы Івана Хадкевіча. Міхаіл Глінскі добра ведаў Аляксандра Хадкевіча. Апошні з 1501 г. з'яўляўся намеснікам у Пуні, мястэчку паміж Прэнамі і Мераччу. Мабыць, па дарозе з Пуні ў Супрасль Аляксандр Хадкевіч неаднаразова наведваў Міхаіла Глінскага. Абодва ўраднікі часта сустракаліся таксама на гаспадарскай службе. 12 ліпеня 1506 г. надворны маршалак прысутнічаў пры наданні Аляксандру Хадкевічу некалькіх сёл у Жалудоцкім павеце і людзей на рацэ Бераставіца[316]. Пазней, 23 ліпеня, абодва выступілі сведкамі ў прывілеі Багдану Аляксеевічу на сяло Капылы ў Камянецкім павеце[317].

Першым настаяцелем Супрасльскага манастыра быў ураджэнец Бельска прадстаўнік старажытныга праваслаўнага роду Пафнуцій Сегень. Міхаіл Глінскі мусіў быць асабіста знаёмым з Сегенем. Несумненна, што надворны маршалак неаднаразова наведваў манастыр, які ў пачатку XVI ст. перажываў перыяд бурнага росту.

Падляшша, як раней Троцкае ваяводства, з'яўлялася сферай экспансіі Міхаіла Глінскага. Ён задумаў стварыць тут уласную латыфундыю. Прадметам асаблівай увагі надворнага маршалка з'яўлялася паўночная частка Падляшша, на самай мяжы з Тэўтонскім ордэнам. У канцы XV — пачатку XVI стст. каланізацыйны рух у гэтым раёне толькі пачынаўся. Рашэнне Глінскага быць у гэтай справе першапраходцам было цалкам лагічным.

Недзе ў 1505 г., а можа і раней, Глінскі атрымаў маёнткі Райгарад і Гонязь[318]. Гэтыя гарады знаходзіліся на былой яцвяжскай тэрыторыі. У сярэдзіне XIII ст. яны былі арэнай жорсткай барацьбы

313 Акты Літоўскай Метрыкі неаднаразова згадваюць бельскія віны і воскавыя пенязі (LM. Užrašymų knyga 8. P. 412, 413, 414, 422).

314 Тамсама. P. 463—464.

315 Тамсама. P. 172; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 177.

316 LM. Užrašymų knyga 5. P. 281—282.

317 Тамсама. P. 279.

318 Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 108.

яцвягаў з галіцка-валынскімі князямі. У ходзе літоўска-крыжацкіх войнаў XIV ст. край быў цалкам спустошаны і ўяўляў сабой суцэльную пустыню.

Польскія даследчыкі І. Бараноўскі і, услед за ім, і Кшыштаф Пяткевіч мяркуюць, што з цягам часу Міхаіл Глінскі мог стварыць у Райгарадзе і Гонязі асобную «дзяржаву» з уласнай адміністрацыяй, якая знаходзілася па-за кантролем мясцовых улад і была падпарадкавана асабіста яму[319]. Пазней так зрабілі Радзівілы, якія атрымалі канфіскаваныя ў Глінскага Райгарад і Гонязь. Імкненне стварыць уласную «дзяржаву» менавіта тут было абумоўлена жаданнем Глінскага мець прамую сувязь са сваім старым сябрам магістрам Тэўтонскага ордэна Фрыдрыхам.

## 2.3.11. Справа запісу па душу князя Дзімітрыя Пуцяціча

Міхаіл Глінскі вярнуўся ў Літву разам з каралём у пачатку красавіка 1505 г. Па вяртанні дамоў Глінскі быў вымушаны заняцца маёмаснымі справамі кіеўскага ваяводы Дзімітрыя Іванавіча Пуцяціча, які памёр напрыканцы 1505 г. Яшчэ пры жыцці Пуцяціч неаднаразова прасіў Міхаіла Глінскага, каб той у выпадку яго смерці стаў апекуном усіх яго маёнткаў. Паколькі Дзімітрый Пуцяціч не пакінуў тастамента і не зрабіў укладаў па сваю душу і душы бацькоў, пра гэта мусіў паклапаціцца Міхаіл Глінскі. Справа апекі маёнткаў былога кіеўскага ваяводы і запісу па яго душу мела дзяржаўнае значэнне і патрабавала ўдзелу самога гаспадара. 29 красавіка 1506 г. у прысутнасці рады паноў ВКЛ быў зацверджаны запіс князя Міхаіла па душу Дзімітрыя Пуцяціча[320]. Пры гэтым прысутнічалі віленскі біскуп Войцех Табар, віленскі ваявода і канцлер Мікалай Мікалаевіч Радзівіл, гарадзенскі староста Ян Юр'евіч Забярэзінскі, жамойцкі староста і троцкі кашталян Станіслаў Янавіч Кезгайла, васілішкаўскі намеснік Станіслаў Пятровіч Кішка, ахмістр каралевы і ковенскі намеснік Войцех Янавіч Клочка, мерацкі намеснік Станіслаў Янавіч Забярэзінскі, канцлер каралевы, браслаўскі і жыжмарскі намеснік Іван Сямёнавіч Сапега.

З дазволу гаспадара Глінскі запісаў на Кіева-Пячэрскі манастыр, дзе быў пахаваны Пуцяціч і яго бацькі, палову даннікаў Зарамцоў былога кіеўскага ваяводы, а таксама ўстаў мёду з іх. Другую палову

[319] Baranowski I. Z dziejów feudalizmu na Podlasiu. Rajgrodzko-Goniądzkie państwo Radziwiłłów w I połowie XVI wieku // Przegląd Historyczny. 1907. T. 4. S. 163—167; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 108.

[320] LM. Užrašymų knyga 6. P. 64.

даннікаў Зарамцоў і ўстаў мёду надворны маршалак запісаў на Прачысценскую царкву ў Вільні. Князь Міхаіл выдаткаваў грошы «на вечныи упис» у мітрапалічы, смаленскі, полацкі, уладзімірскі, луцкі, тураўскі, перамышльскі і холмскі сінодзікі. Таксама з маёнткаў Дзімітрыя Пуцяціча Міхаіл Глінскі раздаў грошы на цэрквы ў ВКЛ. Сярод апошніх былі манастыр Святой Тройцы ў Вільні і дванаццаць віленскіх храмаў, дзве царквы ў Навагародку, Прачысценская і Барысаглебская, Уздвіжанскі манастыр у Менску, Прачысценская і Барысаглебская цэрквы ў Горадні, смаленская саборная Прачысценская царква, смаленскія Свята-Троіцкі і Спасаўскі манастыры, Міхайлаўская царква ў Віцебску, Сафійскі храм у Полацку, Пустынскі манастыр, берасцейская саборная Мікольская царква, уладзімірская Прачысценская царква, луцкая царква Іаана Багаслова, жыдачынскі Мікольскі манастыр, люблінская Спаская царква, холмская Прачысценская царква, перамышльская саборная царква. Не былі забытыя манастыр Святой Тройцы і сем цэркваў, што знаходзіліся ў маёнтках нябожчыка. Надворны маршалак даў вольную некаторым парабкам Пуцяціча. Нарэшце, ён распрадаў рухомую маёмасць (шаты, адзенне) былога кіеўскага ваяводы за 60 коп грошаў, якія пазней выдаткаваў на выкуп некалькіх асоб, што трапілі ў татарскі палон[321].

### 2.3.12. Апошні загад гаспадара

У драматычных падзеях ліпеня 1506 г. паміраючы кароль і вялікі князь Аляксандр паставіў на чале войска таго, каму больш давяраў, на каго ён найбольш спадзяваўся, чые здольнасці і таленты ён добра ведаў. Гэтым чалавекам мог быць толькі надворны маршалак князь Міхаіл Львовіч Глінскі. Гаспадара не палохала нават тая акалічнасць, што адносна малады князь не меў вопыту кіравання вялікім войскам. Манарх добра ведаў, якую школу Глінскі прайшоў у войску саксонскага герцага Альбрэхта. Гаспадар таксама разумеў, якую ролю князь адыграў у рэфармаванні ўзброеных сіл ВКЛ, з'яўленні новых відаў войска (рацы-гусары), што былі здольныя эфектыўна супрацьстаяць татарам. Не апошнюю ролю адыграў аўтарытэт, якім карыстаўся сярод воінаў надворны маршалак. Нельга было скідваць з рахунку татарскае паходжанне роду князя, яго добрае знаёмства са звычаямі татараў і іх ваенным мастацтвам. Нарэшце, няма нічога дзіўнага ў тым, што кіраўніком паспалітага рушання быў прызначаны не вялікі гетман, а іншая асоба. Так, ад'язджаючы з Кароны

[321] LM. Užrašymų knyga 6. P. 63—64.

ў ВКЛ, Аляксандр Ягелончык у сакавіку 1506 г. прызначыў кіраўніком кароннага паспалітага рушання кракаўскага кашталяна Спытка з Яраслава. Яму мусілі падпарадкоўвацца абодва каронныя гетманы: Мікалай з Каменца і Станіслаў з Ходчы[322].

## 2.4. У няласцы ў новага гаспадара

### 2.4.1. Зайздрасць радных паноў. Аднаўленне спрэчкі з Янам Забярэзінскім

Пасля смерці Аляксандра Ягелончыка становішча Міхаіла Глінскага на велікакняскім двары рэзка змянілася. Новы польскі кароль і вялікі князь літоўскі не спяшаўся аказваць надворнаму маршалку тую пашану, якую апошні меў у яго брата. Больш таго, пасля «паднясення» Жыгімонта на велікакняскі стол адбылося заўважнае ахаладжванне ў адносінах паміж ім і Глінскім. Новы ўладар фактычна выдаліў надворнага маршалка з ліку сваіх найбліжэйшых дарадцаў. Затое Жыгімонт усё часцей аказваў давер троцкаму ваяводзе Яну Юр'евічу Забярэзінскаму. Бернард Вапоўскі прыпісвае Міхаілу Глінскаму наступныя словы: «змянілася асоба ўладара, а не ўладар»[323].

У гэты час нядобразычліўцы на чале з Янам Забярэзінскім пачалі абвінавачваць Глінскага ў спробе захопу ўлады ў ВКЛ у часе хваробы Аляксандра. Князь Міхаіл у снежні 1506 г. спрабаваў паскардзіцца Жыгімонту пра паклёп на ўласную асобу, але апошні, які тады праводзіў уласную перадвыбарную кампанію, адклаў разгляд справы на нявызначаны тэрмін. Тады Глінскі ў студзені 1507 г. вынес сваю справу на разгляд кароннага сената. Каронны канцлер Ян Ласкі, які выступаў ад імя Жыгімонта, адказаў, што кароль перакананы ў нявіннасці Глінскага, і раіў таму спакойна знаходзіцца ў Літве, пакуль кароль не вернецца з Польшчы і не вырашыць яго спрэчку з Забярэзінскім. Праўда, у прыватнай размове Ласкі адзначыў, што Глінскі ніколі не будзе ў бяспецы ў асяроддзі літоўскіх паноў, якія імкнуцца пазбавіць яго жыцця[324].

Разам з тым, колішні фаварыт быў фактычна аддалены ад дзяржаўных спраў. Праўдападобна, яшчэ ў лістападзе 1506 г. на

[322] AA. S. 522.

[323] «(Glinscius) persuasum habuerit, personam se principis non principem mutasse» (Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 69); Finkel L. Michał Gliński // Ateneum Wileńskie. 1925/26. R. 3. Nr. 9. S. 79.

[324] Роўэл С. «Не кладзеце надзеяў на князёў»... С. 558.

гарадзенскім сойме Міхаіл Глінскі быў пазбаўлены пасады надворнага маршалка. Неўзабаве ён страціў бельскае намесніцтва і не быў зацверджаны ў якасці кіраўніка манетнага двара (мынцы)[325]. Старэйшы брат Міхаіла Глінскага Іван быў пераведзены са стратэгічна важнага ў адносінах з Крымам і Масквой Кіеўскага на Навагародскае ваяводства.

Цяжка вызначыць, дзе тут прычына, а дзе вынік. Ці сапраўды Жыгімонт паверыў абвінавачванням нядобразычліўцаў Глінскага, ці, наадварот, пагаршэнне з невядомых прычын стаўлення манарха да Глінскага надала імпэт ворагам апошняга. Хутчэй за ўсё, у дадзеным выпадку супалі абодва працэсы. Некаторыя сучасныя аўтары, у тым ліку і Герберштайн, сцвярджалі, што адразу пасля смерці караля Аляксандра Забярэзінскі і яго сябры выслалі ганца да Жыгімонта ў Глогаў з паведамленнем пра тое, што князь Міхаіл Глінскі збіраецца авалодаць ВКЛ, і прапанавай тэрмінова прыбыць у Літву[326]. Магчыма, Жыгімонту пасля абрання на велікакняскі стол не патрабавалася больш падтрымка князя Міхаіла. Нельга выключаць і пэўны элемент рэўнасці да несумненных талентаў і заслуг Глінскага з боку новага гаспадара. Нарэшце, Жыгімонт, які амаль усё папярэдняе жыццё пражыў за межамі Літвы, так і не здолеў разабрацца ў сутнасці канфлікту сярод радных паноў і паверыў паклёпу апанентаў князя Міхаіла. Сам Глінскі сваімі асобнымі эмацыйнымі заявамі і дзеяннямі мог падліць масла ў агонь.

Князь Міхаіл не мог не задумацца пра зменлівасць фартуны. Яшчэ нядаўна яго лічылі збавіцелем Айчыны, ён быў яе героем, трыумфатарам. Зараз жа яго ўспрымалі як здрадніка Айчыны і абвінавачвалі ў спробе ўзурпацыі велікакняскага стала. Усе раптоўна забыліся пра яго заслугі і адданую службу дзяржаве. Сам кароль Жыгімонт, з якім Глінскага, здавалася, лучылі прыязныя адносіны, не хацеў нават размаўляць з ім, не гаворачы ўжо пра тое, каб разгледзець у судзе яго іск па хлуслівых абвінавачаннях. Але Глінскі не зміры ўся з такім станам рэчаў і вырашыў змагацца за сябе і свой гонар. Глінскі ведаў, што яго чакае новая бітва, на гэты раз куды больш складаная і небяспечная, чым бой з татарамі пад Клецкам. Лепей смерць, чым страта гонару. За свой абражаны гонар Глінскі гатовы быў ісці да канца, не спыняючыся ні перад якімі перашкодамі, не ашчаджаючы фізічных і духоўных сіл, выкарыстоўваючы ўсе наяўныя сродкі.

[325] Pociecha W. Gliński Michał. S. 67 S. 67.

[326] Герберштейн С. Записки о Московии. Т. 1. С. 466—469.

### 2.4.2. Зносіны з крымскім ханам Менглі-Гірэем

Глінскі, уражаны і абураны непаслядоўнай пазіцыяй Жыгімонта, спрабаваў шукаць падтрымкі ў замежных уладароў. У сучаснай гістарыяграфіі лічыцца, што адным з першых, да каго звярнуўся Глінскі, быў крымскі хан Менглі-Гірэй[327]. У пачатку ліпеня 1507 г. крымскія паслы Ябагчы-ўлан і Хачы Мяндзей прынеслі лісты Менглі-Гірэя. У лісце на імя караля і вялікага князя Жыгімонта крымскі хан прасіў вярнуць Глінскаму маршалкоўства, пагражаючы ў разе невыканання сваёй просьбы нават разрывам адносінаў[328]. Хан, верагодна, праз гаспадарскага ганца Пятра Фурса, перадаў таксама асабісты ліст Глінскаму, у якім называў яго братам і абяцаў падтрымку. Як знак асаблівай прыязні Менглі-Гірэй перадаў яму «легкии впоминок»[329]. Аднак Жыгімонт у звыклай для сябе манеры марудзіў з адказам. Менглі-Гірэй вымушаны быў паўтарыць сваю просьбу, якую 17 лістапада 1507 г. прынеслі ў Горадню гаспадарскі пасол Якуб Івашэнцавіч і крымскі пасол Янчура[330]. Але і на гэты раз Жыгімонт праігнараваў просьбу Менглі-Гірэя. Адносна асобы князя Міхаіла Глінскага гаспадар адказаў толькі 21 лютага 1508 г., ужо пасля вядомых трагічных падзей[331].

Менглі-Гірэй, падтрымліваючы Глінскага, кіраваўся не толькі асабістымі сімпатыямі да яго. Крымскі хан разглядаў справу Глінскага як інструмент націску на Жыгімонта Старога. Менглі-Гірэй імкнуўся выкарыстаць канфлікт, каб дасягнуць новых саступак з боку кіраўніцтва ВКЛ. Падтрымліваючы амбіцыі Міхаіла Глінскага і ледзь не патрабуючы ад Жыгімонта аднавіць таго на пасадзе надворнага маршалка, Менглі-Гірэй толькі распальваў вогнішча канфлікту, і такая палітыка дала вынік. Паступова патрабаванні абодвух канфліктуючых бакоў станавіліся ўсё больш і больш радыкальнымі, а іх пазіцыі непрымірымымі. Да таго ж, справа Глінскага адцягвала ўвагу кіраўніцтва ВКЛ ад рашэння злабадзённых знешнепалітычных задач.

Але ці верыў сам князь Міхаіл, што падтрымка замежнага ўладара, у дадзеным выпадку крымскага хана, будзе мець плён? Ці спадзяваўся ён з дапамогай дыпламатычных захадаў Менглі-Гірэя вярнуць страчаныя пазіцыі на велікакняскім двары? Інакш кажучы,

[327] Кром М. Меж Русью и Литвой… С. 121.

[328] LM. Užrašymų knyga 8. P. 71.

[329] Тамсама. P. 71.

[330] Тамсама. P. 91.

[331] Тамсама. P. 101—102.

ці сапраўды Глінскі звяртаўся з просьбай да хана, каб той дапамог яму вярнуць пасаду надворнага маршалка. На гэта пытанне немагчыма адказаць, бо змест лістоў, якія князь Міхаіл дасылаў Менглі-Гірэю, невядомы.

Цікава, што пра пасольствы Глінскага да Менглі-Гірэея мы ведаем толькі з пазнейшых рэляцый Жыгімонта Старога, адрасаваных самому хану[332]. Аднак са зместу гэтых рэляцый цяжка зразумець, калі мелі месца зносіны паміж Глінскім і Менглі-Гірэем: да выступу Глінскіх 1508 г. ці раней. Нельга катэгарычна выключыць мажлівасць пасольства або нават пасольстваў Глінскага да Менглі-Гірэя на працягу 1507 г. Але магчымасці для зносін Глінскага з ханам былі ў той час вельмі абмежаванымі. Не выключана, што ўсім памежным старостам і намеснікам быў дадзены строгі загад кантраляваць рух на паўднёвай мяжы, перахопліваць і правяраць падазроных кур'ераў. Менавіта тады, каб прадухіліць непажаданую камунікацыю Глінскіх з Крымам, старэйшы брат Іван быў перасунуты з пасады кіеўскага ваяводы на пасаду новагародскага ваяводы. Але нават такімі мерамі цяжка было перасекчы ўсе шляхі камунікацыі. У якасці кур'ераў князь Міхаіл мог выкарыстаць асобных вялікакняскіх паслоў, Пятра Фурса або Якуба Івашэнцавіча, ці нават крымскіх пасланцаў. Той факт, што ў дзяржаўным архіве ВКЛ не аказалася ніводнага ліста Глінскага да Менглі-Гірэя, сведчыць не пра адсутнасць перапіскі, а пра марнасць спроб (у адрозненне ад пазнейшага ліставання Глінскага з маскоўскім уладаром) гаспадарскіх службоўцаў перахапіць лісты. Можна меркаваць, што сувязь Глінскіх з Крымам была ў азначаны час дастаткова надзейнай.

Змест пасланняў Глінскага хану, як ужо адзначалася, не відавочны. Пра яго мы можам меркаваць на падставе карэспандэнцыі Менглі-Гірэя і Жыгімонта Старога. Тут маецца істотная розніца. З лістоў хана каралю вынікае, што галоўным яго патрабаваннем было вярнуць Глінскага на пасаду надворнага маршалка. Але гаспадар у сваім адказе, зробленым ужо пасля трагічных падзей 2 лютага 1508 г., пісаў, што размова ішла пра захаванне ўласнасці Глінскіх[333]. У лісце да Менглі-Гірэя ад 11 чэрвеня 1508 г. Жыгімонт, згадва-

[332] Гл. ліст Жыгімонта Старога да Менглі-Гірэя ад 30 красавіка 1508 г.: «Тот лихий чоловекъ Глинскии, видячи, иж есмо с тобою, волным царемъ, братомъ нашимъ, перед Богомъ верным братством связали ся и ачъколве к тобе своими зрадными а лстивыми слове черезъ свои послы частокроть втекаетъ ся, а однако ж надеи в тобе никоторое ку помочи своеи не покладаетъ» (LM. Užrašymų knyga 8. P. 102).

[333] Гл. ліст Жыгімонта Старога да Менглі-Гірэя ад 21 лютага 1508 г.: «штож князь Михаило Львович Глиньскии, о котором же еси многокроть перво сего к намъ

ючы частыя пасольствы Глінскага ў Крым, гаворыць пра пасаду надворнага маршалка[334]. Пазней, каб нeяк закрыць гэтую тэму, гаспадар вымушаны быў падкрэсліваць, што Глінскі атрымаў пасаду надворнага маршалка часова, пакуль Рыгор Осцік знаходзіўся ў маскоўскім палоне. Спасылаючыся на меркаванне і просьбу сваіх радных паноў, Жыгімонт Стары адзначаў, што ён вымушаны быў вярнуць пасаду яе сапраўднаму носьбіту, нават нягледзячы на тое, што той па-ранейшаму знаходзіўся ў палоне[335]. Нарэшце, у згаданым лісце ад 11 чэрвеня 1508 г. Жыгімонт згадваў пасольства нейкага Хазяша, які быў дасланы «о Михаиле Глинском перепрошиваючи нас о гневъ»[336]. На гэтых падставах можна сцвярджаць, што яшчэ да бунту 1508 г. Міхаіл Глінскі звяртаўся да Менглі-Гірэя па падтрымку, але аб чым менавіта ён прасіў хана, нам невядома. Несумненна, князь Міхаіл спадзяваўся на часовае пацяпленне ў адносінах паміж Крымам і Літвой і разлічваў выкарыстаць зручны момант, каб, абапіраючыся на аўтарытэт хана, вярнуць сабе прыхільнасць з боку новага ўладара. Магчыма, Глінскага абнадзейвалі нявопытнасць Жыгімонта ў дыпламатычных гульнях і яго няпростае знешнепалітычнае становішча. У князя Міхаіла захоўвалася надзея, калі не вярнуць маршалкоўства, то захаваць хоць бы тое, што ў яго і яго братоў яшчэ заставалася.

Справа Глінскага для самога крымскага хана была надзвычай зручным і, галоўнае, своечасовым сродкам націску на караля. Нельга выключыць, што тыя катэгарычныя і неабгрунтаваныя патрабаванні адносна Глінскага («...сее дороги мою прозбу не оставъ, князю Михаилу Львовичу Глинскому, приятелю моему, в Литовском Князстве маршалство даи...», «Ино тепере сее дороги князю Михаилу Львовичу в Литовъском Князстве маршалство даи… Естли так не будетъ, мене, барата и приятеля, што вчинишъ о князи Михаиле Львовиче, естли прозба моя не станетъ, напотом мене братом собе не мовте, о князи Михаиле сюю прозбу мою иначе не вчините»)[337], якія хан выкладаў у лістах да Жыгімонта, сыходзілі не ад князя Міхаіла, а ад самога Менглі-Гірэя. Хан разумеў, што кароль Жыгімонт

---

писывал жадаючи, абыхмо его в ыменях тых не рушили, которыи ж был братъ нашъ Александръ ему подавал» (LM. Užrašymų knyga 8. P. 101).

[334] Гл. ліст Жыгімонта Старога да Менглі-Гірэя ад 11 чэрвеня 1508 г.: «и ты, братъ нашъ, пишешъ к намъ о немъ, будто бы Глинскии от насъ для того втекъ, иж есмо того вряду ему не дали маршалства» (LM. Užrašymų knyga 8. P. 103).

[335] Роўэл С. «Не кладзеце надзеяў на князёў»... С. 561.

[336] LM. Užrašymų knyga 8. P. 105.

[337] Тамсама. P. 70, 71.

не прызнае сваю «памылку» ў дачыненні да асобы Глінскага і не аднавіць таго на пасадзе. Адзінае, чаго можна было дамагчыся такімі «просьбамі», — яшчэ больш накаліць і да таго выбуханебяспечныя адносіны гаспадара і радных паноў з Глінскім.

Князь Міхаіл не мог не разумець, што яго спрабуюць выкарыстаць у чужой дыпламатычнай гульні. Шчыльныя адносіны з крымскім ханам, катэгарычныя і рэзкія патрабаванні апошняга да гаспадара маглі б кінуць на яго падазрэнне ў здрадзе. Наўрад ці Глінскі мог сур'ёзна спадзявацца на падтрымку хана. Не толькі ён, але і ўсе радныя паны добра ведалі кошт слова хана. Няўжо ён не разумеў, што заступніцтва хана, якога так ненавідзелі, але з якім мусілі падтрымліваць адносіны ў Вільні і Кракаве, можа абярнуцца супраць яго новымі праблемамі? Будучы ўжо і так дыскрэдытаваным і нават у значнай ступені ізаляваным, ён мусіў падтрымліваць (ці рабіць выгляд, што падтрымлівае) сувязь з ханам, мяркуючы, што ў будучым дапамога Менглі-Гірэя можа спатрэбіцца. Галоўнае, што сам Глінскі, як падаецца, імкнуўся ўжо не столькі вярнуць сабе пасаду надворнага маршалка, як ачысціцца ад тых сур'ёзных абвінавачванняў, якія высоўвалі ў дачыненні да яго асобныя радныя паны. Вясной 1507 г. праблема ўласнага гонару была для князя Міхаіла куды больш важнай, чым далейшая кар'ера. Яму неабходна было звяртацца да тых уплывовых асоб, найлепей хрысціянскіх уладароў, якія добра ведалі яго і яго абвінаваўцаў. Толькі яны, а не хан Менглі-Гірэй, маглі б, на думку Міхаіла Глінскага, паўплываць на рашэнні Жыгімонта Старога.

### 2.4.3. Візіт да венгерскага караля Уладзіслава Ягелона

Вясной 1507 г. Глінскі вырашыў звярнуцца да старэйшага ў родзе Ягелонаў — венгерскага і чэшскага караля Уладзіслава. Былы фаварыт адчуваў, што гэта яго апошні шанс адмыцца ад жахлівых абвінавачванняў літоўскіх паноў. 27 сакавіка 1507 г. князь Міхаіл вырушыў у дарогу[338]. Яго шлях мусіў пралягаць праз Кракаў, сілезскія гарады, Прагу, Тарнаву, Прэшпарак (Пожань, Браціслава), Вышаград. Як пісаў Глінскі пазней у лісце да імператара Святой Рымскай імперыі Максіміліяна Габсбурга, гэта падарожжа каштавала яму вялізных выдаткаў[339].

З часу візіту князя Міхаіла ў якасці велікакняскага пасла ў Буду зімой 1500—1501 гг. у Венгрыі адбыліся важныя змены. Кароль

[338] Decius I. De Sigismundi regis temporibus. Cracoviae, 1521. P. 23.
[339] Finkel L. Elekcya Zygmunta I... S. 278.

Уладзіслаў, 45-гадовы халасцяк, нарэшце ажаніўся. Яго абранніцай стала Ганна дэ Кандал (Anne de Candal), графіня дэ Фуа (de Foix), пляменніца французскага караля. Уладзіслаў асабіста ездзіў у Францыю за сваёй нявестай. Каранацыя і вяселле адбыліся пазней у Венгрыі. У чэрвені 1503 г. каралева нарадзіла дачку, якую ў яе гонар назвалі Ганнай. Яшчэ праз тры гады, у чэрвені 1506 г., на свет нарэшце з'явіўся спадкаемца трона прынц Людовік (Людвік). Аднак яго нараджэнне было аплачана дарагой цаной. Праз шэсць тыдняў пасля родаў каралева памерла. Пасля смерці жонкі Уладзіслаў, які яе вельмі кахаў, трапіў у глыбокую дэпрэсію.

Як падаецца, калі Глінскі ў красавіку 1507 г. прыбыў у рэзідэнцыю караля, той усё яшчэ знаходзіўся ў дэпрэсіі. Акрамя таго, увагу Уладзіслава займала апазіцыя венгерскіх магнатаў, якія не жадалі будучай каранацыі непаўналетняга Людвіка. У Будзе, а можа яшчэ раней, Глінскі зразумеў, што ён выбраў для выправы не самы зручны час. Але вяртацца дамоў было ўжо позна. Да таго ж князь Міхаіл заўжды ішоў да канца.

Уладзіслаў прыняў свайго старога прыяцеля. Але як адрознівалася гэтая аўдыенцыя ад той, якую венгерскі кароль наладзіў велікакняскаму паслу ўзімку 1501 года! І рэч была не толькі ў тым, што тады Глінскі выступаў у ролі афіцыйнага прадстаўніка свайго ўладара, а зараз прыехаў па прыватнай справе. Абодва, і кароль, і былы гаспадарскі фаварыт, знаходзіліся цяпер далёка не ў лепшым настроі. Гэта акалічнасць наклала сур'ёзны адбітак на іх сустрэчу. Па ўсёй верагоднасці, не было дасціпных жартаў і дэманстрацыі вытанчаных манер, якімі так славіліся Уладзіслаў і Глінскі. Усё было надзвычай сціпла і стрымана. Кароль Уладзіслаў, тым не менш, уважліва выслухаў Міхаіла Глінскага. Было вырашана выслаць да Жыгімонта з адпаведным лістом каралеўскага прадстаўніка Яна Пнёўскага. Уладзіслаў і князь Міхаіл, калі развітваліся, не маглі думаць, што гэта іх апошняя сустрэча. Венгерскі кароль памёр праз 9 гадоў. Князь Міхаіл перажыў яго на 18 гадоў.

Пасол Уладзіслава прыбыў у Вільню 18 ліпеня 1507 г.[340]. У прысутнасці венгерскага пасла Жыгімонт абяцаў разгледзець справу Глінскага, але неўзабаве вырушыў з войскам на ўсход, дзе працягвалася змаганне з вялікім князем маскоўскім[341]. Глінскі марна спрабаваў дамагчыся аўдыенцыі гаспадара ў Менску[342].

[340] Dziennik Macieja Drzewickiego. S. 348.

[341] Тамсама. S. 348.

[342] Pociecha W. Gliński Michał. S. 67.

Аднак і пасля вяртання з усходу дзяржавы Жыгімонт не збіраўся разглядаць справу Глінскага. Князь Міхаіл працягваў шукаць магчымасці яе вырашэння. Увосень 1507 г. ён наведаў некаторых велікапольскіх паноў, спрабуючы атрымаць іх падтрымку, але без асаблівых вынікаў[343]. 16 верасня 1507 г. князь Міхаіл знаходзіўся ў горадзе Пултуску[344]. У канцы месяца ён наведаў Познань, Шаматулы і Курнік[345]. Дарэчы, у той час, калі Міхаіл Глінскі знаходзіўся ў Вялікай Польшчы (25 верасня 1507 г.), у Смаленск прыбыў князь Канстанцін Астрожскі, які здолеў уцячы з маскоўскага палону.

Пасля завяршэння ваеннай кампаніі 1507 г. Жыгімонт пачаў збірацца ў Карону. Яго ад'езд прыспешвала чума, якая ахапіла сталіцу ВКЛ Вільню. 16 кастрычніка 1507 г. гаспадар з дваром прыбыў у Гародню, дзе ён прабыў да 11 снежня[346]. Не выключана, што менавіта ў Горадні адбылася апошняя сустрэча Жыгімонта з Глінскім, на якой апошні, раззлаваны нежаданнем гаспадара разгледзець яго спрэчку з Забярэзінскім, вымавіў: «Покушуся, кралю, о такую речъ, которая тобе и мине напотом будет жалосная»[347].

### 2.4.4. Помста Яну Забярэзінскаму

Пасля гэтай верагоднай сустрэчы Жыгімонта і Глінскага першы вырушыў у Польшчу, а другі вярнуўся дамоў. Зіму 1507—1508 гг. Міхаіл Глінскі правёў ва ўласным маёнтку Лішкава каля Мерачы. Апошняя аўдыенцыя канчаткова пераканала Глінскага, што чакаць падтрымкі ад Жыгімонта не мае сэнсу і што абараніцца можна толькі ўласнымі сіламі. Там жа ў Лішкаве, сярод замкавых муроў, якія яшчэ памяталі крыжацкія напады, быў распрацаваны дэталёвы план дзеянняў. Галоўнай мэтай акцыі павінен быў стаць крыўдзіцель Глінскага — троцкі ваявода Ян Забярэзінскі. Князя Міхаіла чакала новая бітва, не меней сур'ёзная, чым бітва пад Клецкам. Але калі на берагах Лані ён змагаўся за гонар Айчыны, то цяпер прыйшоў час змагацца за ўласны абражаны гонар. І ён, Глінскі, быў гатовы абараняць сваю годнасць усімі даступнымі сродкамі.

Аперацыя была не толькі дэталёва распрацавана, але і дасканала праведзена. 2 лютага 1508 г. Глінскі, устанавіўшы дакладнае

---

343 Pociecha W. Gliński Michał. S. 67.

344 Własnoręczne zapiski Erazma Ciołka... S. 455.

345 Rocznik Stanisława Naropińskiego // Monumenta Poloniae Historica. T. 3 / Wyd. A. Bielowski. Lwów, 1878. S. 221.

346 Dziennik Macieja Drzewickiego. S. 349.

347 ПСРЛ. Т. 32. С. 102.

месцазнаходжанне Яна Забярэзінскага, ажыццявіў імклівы марш з 700 коннікамі да Горадні, дзе знаходзіўся маёнтак яго галоўнага праціўніка. Напад адбыўся ўначы і застаў Забярэзінскага знянацку. У пакой да спячага ваяводы ўварваўся слуга Глінскага саксонец Крыштаф Шляйніц, які, выцягнуўшы соннага Забярэзінскага з ложка, аддаў яго на экзекуцыю аднаму татарыну. Адсечаную галаву Забярэзінскага Глінскі загадаў кінуць у мясцовы стаў[348]. Цяжка меркаваць, што канкрэтна штурхнула Глінскага на гэта злачынства. Магчыма, князь Міхаіл стаў ахвярай уласных эмоцый. Нянавісць да Забярэзінскага настолькі захапіла Глінскага, што ён рашыўся на безразважны крок. Магчыма, напад на маёнтак Забярэзінскага і забойства апошняга былі прэвентыўнай мерай. Не выключана, што сам Забярэзінскі з сябрамі і сынамі рыхтаваў замах на жыццё Глінскага, пра што існуюць ускосныя сведчанні. Проста маладзейшы Глінскі аказаўся спрытнейшым і апярэдзіў свайго праціўніка.

У трагічных падзеях, што адбыліся ўзімку 1508 г., здзіўляе абыякавасць Жыгімонта Старога да спраў сваіх вяльможных падданых. Новаабраны кароль, які так і не разгледзеў належным чынам справу Глінскага, не чуў адчайных папярэджванняў апошняга і спакойна ад'ехаў у Польшчу. Гаспадар як бы пакінуў заклятых ворагаў сам-насам, каб яны вырашылі спрэчку самастойна. Вынікам стала забойства троцкага ваяводы Яна Забярэзінскага і хваляванні сярод гаспадарскіх падданых. Папярэдні кароль і вялікі князь Аляксандр паступіў у падобнай сітуацыі іншым чынам. Ён улетку 1503 г. накіраваўся ў Польшчу толькі пасля таго, як разгледзеў спрэчку Глінскага і Забярэзінскага. Пры гэтым гаспадар забраў з сабой у Карону князя Міхаіла, прадухіліўшы трагічны варыянт развіцця падзей.

Неабходна адзначыць, што людзей, якія папярэджвалі Жыгімонта Старога пра магчымыя наступствы, не бракавала. Так, у брульёне інструкцыі пасольства літоўскіх радных паноў да Жыгімонта Старога ў лютым 1508 г. адчуваецца выразны дакор гаспадару, які ад'ехаў з краю, не вырашыўшы справы сваіх падданых. З тэксту вынікае, што яшчэ да трагічных падзей паны неаднаразова заклікалі караля тэрмінова вярнуцца ў Літву для разгляду пільных спраў, і калі б гаспадар пачуў гэтыя заклікі, як гэта рабілі яго папярэднікі Казімір і Аляксандр, не было б трагедыі[349].

[348] Pociecha W. Gliński Michał. S. 67.

[349] Materiały do dziejow dyplomacji Polskiej... S. 159—162.

## 2.5. На службе ў вялікага князя маскоўскага Васіля III

### 2.5.1. Бунт Глінскіх

Выканаўшы прысуд Забярэзінскаму, Глінскі накіраваўся ў глыб Літвы. Яго аддзел імгненна вырас да 3 тысяч чалавек. Яго аснову складалі воіны асабістага почата Глінскага і былыя найміты. Пазнейшая афіцыйная прапаганда ВКЛ прыпісвала яму спробу вызвалення з Троцкага замка заволжскага хана Шах-Ахмата. У лісце да Менглі-Гірэя Жыгімонт пісаў, што Глінскі хацеў вызваліць Шах-Ахмата «на лихо» крымскага хана[350]. Пазней князь Міхаіл накіраваўся ў Тураў, адкуль неаднаразова пасылаў ганцоў да гаспадара, спрабуючы наладзіць кантакт з ім. У якасці пасярэдніка Глінскі прасіў прыслаць Альбрэхта Гаштаўта, але кароль не адказаў на лісты князя Міхаіла. Звяртаўся Глінскі і да паноў-рады ВКЛ, каб яны дапамаглі яму прымірыцца з гаспадаром. Цікава, што паны-рада ў пасланні да караля ўстрымаліся ад катэгарычных ацэнак падзей, звязаных з забойствам Забярэзінскага[351]. Пазней радныя паны, абяцаючы заступіцца за Глінскага, прасілі яго раскаяцца ў тым, што ён учыніў з Янам Забярэзінскім[352]. Варта звярнуць увагу на тую акалічнасць, што толькі ў лісце да крымскага хана Менглі-Гірэя ад 11 чэрвеня 1508 г. Жыгімонт упершыню, прынамсі ў дыпламатычнай перапісцы, усклаў адказнасць за забойства Яна Забярэзінскага на Глінскага[353].

Падчас знаходжання Глінскіх у Тураве да іх прыбыла маскоўскае пасольства на чале з дзякам Мікітам Губой Маклаковым з прапановай паступіць на службу да Васіля III. Глінскія не адразу далі станоўчы адказ на гэтую прапанову. Відавочна, яны яшчэ не страцілі надзеі на прымірэнне з гаспадаром. Да таго ж, браты Львовічы аднachасова вялі перагаворы з кіраўніцтвам іншых дзяржаў, уключаючы Крым і Нагайскую Арду[354]. Калі ж ва ўмоўлены тэрмін (12 сакавіка 1508 г.) ад караля так і не прыйшло ніякіх вестак, раззлаваны Глінскі адправіў свайго ганца да вялікага князя маскоўскага са станоўчым

[350] LM. Užrašymų knyga 8. P. 101, 103.

[351] Тамсама. Р. 159—162.

[352] Materiały do dziejow dyplomacji Polskiej... S. 165—166.

[353] LM. Užrašymų knyga 8. P. 103.

[354] Тамсама. Р. 102, 103.

адказам на яго прапанову[355]. Глінскія занялі суседні Мазыр, дзе пазней у прысутнасці маскоўскіх паслоў прысягнулі на вернасць вялікаму князю Васілю III.

Цікава, што князі Львовічы абралі менавіта службу вялікаму князю маскоўскаму. Па ўсёй верагоднасці, іх выбар быў абумоўлены ваенна-палітычнымі меркаваннямі. Глінскія не сумняваліся, што толькі супрацоўніцтва з самым магутным уладаром рэгіёна (а такім яны лічылі, несумненна, Васіля III) магло прынесці ім рэальныя вынікі. Да таго ж, Васіль III знаходзіўся ў стане вайны з Жыгімонтам Старым.

Пры пераходзе на службу да Васіля III Глінскія імкнуліся ў першую чаргу захапіць як мага болей гаспадарскіх гарадоў і населеных пунктаў, з якіх яны збіраліся ў будучым служыць вялікаму князю маскоўскаму. «Русский Временник» падкрэслівае ўмовы, на якіх браты Львовічы прысягнулі Васілю III: «А князю Ивану Глинскому з братьею с великого князя воеводами Литовскую землю воевати за обиду свою. И которые литовские городы возмут, и на тех городех сидети князю Ивану з братьею, а великому князю в те городы не вступатися»[356]. Версія пра тое, што Глінскія быццам бы планавалі аднавіць Кіеўскае княства, была плёнам прапаганды Жыгімонта Старога. У лісце да Менглі-Гірэя ад 11 чэрвеня 1508 г. гаспадар сцвярджаў, што ханскі пасол Хазяш «свои листы писал до воеводы киевъского и до князеи и пановъ и мещан киевъских, абы они Киевъ подали тому зърадцы нашому Михаилу Глинскому»[357]. Але сам Глінскі, як гэта ўжо падкрэслівалася ў гістарыяграфіі, ніколі не выказваў падобных намераў[358]. Такім жа беспадстаўным было абвінавачанне Глінскага афіцыйнай прапагандай у спробе захапіць ВКЛ пасля смерці Аляксандра Казіміравіча. Глінскія пазіцыяніравалі сябе, перадусім, як службовыя князі.

У дзень Святой Тройцы (у 1508 г. гэта свята прыходзілася на 11 чэрвеня) князь Міхаіл разам з ваяводам Васіля III Васілём Шамячычам рушыў пад Менск, спадзеючыся на хуткае злучэнне з маскоўскімі ваяводамі, якія мусілі неўзабаве падысці з боку Полацка і Смаленска. Мэта паходу была абрана невыпадкова. Браты Андрэй і Пётр Дрожджы мелі маёнтак Ратам (Ратамка) пад Менскам,

---

[355] Кром М. Меж Русью и Литвой… С. 123.

[356] Зимин А. А. Новое о восстании Михаила Глинского в 1508 году. С. 71.

[357] LM. Užrašymų knyga 8.

[358] Кром М. Меж Русью и Литвой… С. 127.

а таксама двор у Менскім замку[359]. Глінскі не без падстаў разлічваў на падтрымку мясцовага гарнізона і навакольнай шляхты. Свайго стрыечнага брата Андрэя Дрожджу ён накіраваў пад Слуцк[360]. Тактыка ваенных дзеянняў Глінскіх нагадвала звычайны татарскі набег. З-пад Слуцка і Менска яны пусцілі загоны ў глыб дзяржавы. Як вынікае з ліста Міхаіла Глінскага да вялікага князя маскоўскага Васіля III, аддзелы мяцежнікаў хадзілі пад Клецк, Слонім, Навагародак, Куранец. Ад сталіцы дзяржавы Вільні ў пэўны момант іх аддзяляла ўсяго 8 міль[361]. Глінскі прызнаваўся маскоўскаму ўладару, што такая тактыка была выбраная дзеля таго, «абы замешка в земли стала а собране бы земъское росторгнено и перекажено»[362]. Асобныя аддзелы Глінскіх дасягнулі нават Полацкага павета. Адначасова брат Міхаіла Васіль Сляпы пустошыў землі Кіеўшчыны. Такім чынам, паўстаннем была закранута значная частка дзяржавы. Сам Міхаіл Глінскі адзначаў у лісце да Васіля III: «везде люди вашее милости огонь пускали и шкоды чинили, и полону на колькосдесят тисяч взяли…»[363]. Былі спустошаныя землі многіх паноў і князёў, у тым ліку кіеўскія ўладанні Льва Цішкавіча і полацкія маёнткі князя Сакалінскага[364]. Асабліва пацярпелі ваколіцы Менска і Слуцка.

Тактыка «выпаленай зямлі», якую прымянялі аддзелы Глінскага, мусіла адштурхнуць ад іх значную частку шляхецкага грамадства ВКЛ. Акрамя таго, войскі Васіля III і аддзелы Глінскіх мелі розныя стратэгічныя планы на будучыню і, як вынік, дзейнічалі нескаардынавана. Агульны наступ быў сарваны. Міхаіл Глінскі, які так і не дачакаўся маскоўскіх ваяводаў, быў вымушаны зняць аблогу Менска, што абараняўся невялікім гарнізонам, і рушыць на Барысаў[365]. Без маскоўскай падтрымкі Глінскі не стаў штурмаваць горад: «добывати города без наказу Вашей милости покусити ся есмо не хотели, а болши того под городомъ есмо не мешкали»[366]. Аднак «Русский Временник» сцвярджае, што аддзелы Глінскага і дапаможныя

---

[359] LM. Užrašymų knyga 8. P. 252.

[360] Гл. ліст Міхаіла Глінскага да вялікага князя маскоўскага Васіля Іванавіча (LM. Užrašymų knyga 8. P. 118). Не выключана аднак, што пасланне Міхаіла Глінскага Васілю III мела на мэце перадусім прапагандысцкі характар, а не адлюстроўвала рэальны стан рэчаў: надта ўжо стэрэатыпным выглядае апісанне дзеянняў войска Глінскіх у ВКЛ.

[361] LM. Užrašymų knyga 8. P. 118.

[362] Тамсама. P. 118.

[363] Тамсама. P. 118.

[364] Тамсама. P. 257, 268; Кром М. Меж Русью и Литвой… С. 125.

[365] LM. Užrašymų knyga 8. P. 118.

[366] Тамсама. P. 118.

маскоўскія сілы «и к городу приступали, и с пушек били, а землю воевали, мало не до Вильны»[367]. Няўдачай завяршылася таксама аблога Слуцка. Жыгімонту Старому нарэшце ўдалося сабраць войска, якое па колькасці значна пераўзыходзіла сілы Глінскіх. Апошнім не заставалася нічога іншага, як пачаць паступовы адыход да ўсходніх межаў ВКЛ у раён Друцка і Оршы. 24 мая гаспадар быў ужо ў Берасці, 7 чэрвеня — у Навагародку, а 23 чэрвеня ён прыбыў у Менск. Верагодна, у Менску 29 чэрвеня 1508 г. да гаспадара далучыўся князь Канстанцін Астрожскі[368].

У пачатку ліпеня Жыгімонт рушыў далей на ўсход. 12 ліпеня ён быў ужо ў Оршы. У апошні дзень месяца гаспадар прыбыў у Смаленск[369]. Пры набліжэнні гаспадарскага войска да Оршы Глінскія і маскоўскія ваяводы мусілі адвесці свае сілы на левы бераг Дняпра. Васіль Шамячыч і Даніла Шчэня (апошні прыйшоў на дапамогу мяцежнікам з Вялікага Ноўгарада) пайшлі да Мсціслава і Крычава, Міхаіл Глінскі выехаў у Маскву, пакінуўшы свой скарб у Почапе, а яго браты Іван і Васіль накіраваліся ў Мазыр[370]. На гэтым актыўная фаза паўстання скончылася. Праўда, яшчэ нейкі час Глінскія вялі партызанскую барацьбу на Палессі ў раёне Оўруча і Жытоміра.

У Смаленску Жыгімонт Стары знаходзіўся да пачатку кастрычніка. Падчас выправы гаспадар кіраваў ваеннай аперацыяй супраць Глінскіх і рабіў актыўныя захады дзеля падрыву сацыяльнай базы мяцежнікаў. Будучы яшчэ ў Кракаве, Жыгімонт Стары пачаў канфіскацыю валоданняў Глінскіх, а таксама маёнткаў іх блізкіх[371]. Тое, што раней належала Глінскім і іх прыхільнікам, было ў асноўным перададзена князям, панам і дваранам, што паходзілі з ахопленых мяцяжом раёнаў. Так, 7 чэрвеня 1508 г. Жыгімонт Стары выдаў прывілей клецкаму князю Фёдару Іванавічу на тры двары Глінскіх пад Клецкам[372]. 29 чэрвеня 1508 г. Фёдар Яраславіч атрымаў ва ўладанне воласць Вяда ў Навагародскім павеце[373].

---

[367] Зимин А. А. Новое о восстании Михаила Глинского в 1508 году. С. 71.

[368] LM. Užrašymų knyga 8. P. 255, 257, 261, 268.

[369] Тамсама. P. 270, 271.

[370] Зимин А. А. Новое о восстании Михаила Глинского в 1508 году. С. 72.

[371] Роўэл С. «Не кладзеце надзеяў на князёў»... С. 561—562.

[372] LM. Užrašymų knyga 8. P. 258.

[373] Тамсама. P. 268.

### 2.5.2. Ад'езд Глінскіх у Маскву

Палітыка канфіскацыі і актыўная раздача вярхоўнымі ўладамі земляў шляхецкаму саслоўю істотна падарвала сацыяльную базу Глінскіх. Яны так і не здолелі заручыцца падтрымкай тых прадстаўнікоў шляхты, на якіх разлічвалі ў пачатку паўстання. Да таго ж, як вынік актыўнай прапаганды Жыгімонта Старога, многія іх прыхільнікі пачалі пакідаць шэрагі мяцежнікаў. Засталіся толькі самыя надзейныя сябры і слугі. З такімі сіламі змагацца з гаспадарскім войскам было немагчыма. Але, самае галоўнае, учарашнія ворагі Жыгімонт і Васіль III дасягнулі згоды і заключылі ў пачатку кастрычніка «вечны мір». Маскоўскі ўладар, безумоўна, пры дапамозе Глінскага дамогся таго, да чаго так настойліва імкнуўся. Князь Міхаіл не мог не разумець, што яго выкарысталі ў чужой гульні. Працягваць барацьбу з Жыгімонтам не было сэнсу.

Глінскі ў апошні раз вярнуўся ў ВКЛ, каб забраць скарб і сустрэцца з братамі. У Маскву яны вярталіся разам у суправаджэнні сваіх нешматлікіх сяброў і блізкіх. Сярод іх былі князі Дзімітрый і Васіль Жыжэмскія, князь Іван Азярэцкі, князі Дзімітрый і Іван Глінскія, Андрэй і Пётр Дрожджы, Якуб Івашэнцавіч, князь Васіль Мунча, Міхайла Гагін, дзяк Мікольскі, князі Андрэй і Філіп Друцкія, Іван Матаў, Святоша, Дзяменя, Ізмаіл Тураў, Воін Яцкавіч, тры браты Крыжыны, князь Іван Казлоўскі[374]. Няўдача паўстання прывяла да эміграцыі ў Маскву Глінскіх і іх клана. Услед за князем Міхаілам выехалі многія яго баявыя таварышы па Клецкай бітве, якія падтрымалі яго справу. Ідэалагічна блізкі праціўнікам Міхаіла Глінскага ўкладальнік Хронікі Літоўскай і Жамойцкай не без радасці адзначыў: «Так в той час Литва и Русь з княжат Глинских были очищены»[375].

### 2.5.3. Смерць і нашчадкі

Князь Міхаіл пакідаў Радзіму з цяжкім сэрцам. Ён разумеў, што больш не вернецца туды, дзе нарадзіўся, правёў дзіцячыя і юнацкія гады, зрабіў бліскучую кар'еру. Адна думка асабліва не давала Глінскаму пакою. Так, ён дамогся сатысфакцыі ў свайго галоўнага ворага Яна Забярэзінскага. Ён ачысціўся ад хлуслівых абвінавачанняў, змыўшы іх крывёю свайго галоўнага абвінаваўцы. Але ці не заплаціў ён, Глінскі, занадта дарагую цану

---

[374] Зимин А. А. Новое о восстании Михаила Глинского в 1508 году. С. 72—73.

[375] ПСРЛ. Т. 32. С. 103.

за гэтае асабістае ачышчэнне. Не пра страчаныя маёнткі шкадаваў князь Міхаіл. Больш за ўсё яму было шкада ўласнага гонару. Спрабуючы абараніць свой гонар ад фальшывых абвінавачанняў, ад ярлыка здрайцы Айчыны, ён, як сталася, толькі пацвердзіў абвінавачванні сваіх праціўнікаў. Пасля ўсяго, што адбылося, за ім надзейна замацаваўся ярлык здрайцы, ачысціцца ад якога яму будзе немагчыма. Ці адбылося тады ўвогуле, калі следаваць такім разважанням, ачышчэнне? Ці не запляміў ён яшчэ болей свой гонар?

З такімі думкамі ў 1508 г. напярэдадні Хрышчэння князь Міхаіл прыбыў у Маскву[376]. Васіль III усё яшчэ меў вялікую патрэбу ў такім чалавеку, як Міхаіл Глінскі. Маскоўскі ўладар, які адразу пасля «вечнага міру» 1508 г. пачаў рыхтавацца да новай вайны з ВКЛ, спадзяваўся на яго вопыт і парады. У планах Васіля III у дачыненні да Літвы Міхаілу Глінскаму адводзілася ледзь не ключавая роля. Таму ён быў так ласкава прыняты і шчодра адораны[377]. Ад вялікага князя маскоўскага Міхаіл Глінскі атрымаў шэраг уладанняў (Медынь, Яраславец, Бароўск). У 1514 г. Міхаіл Глінскі трапіў у турму, адкуль быў вызвалены толькі ў 1527 г., пасля таго як вялікі князь Васіль III ажаніўся з дачкой яго брата Васіля Аленай[378]. Кар'ера Міхаіла Глінскага рэзка пайшла ўгору. Вялікі князь маскоўскі Васіль III сваім тастаментам прызначыў Міхаіла Львовіча (разам з князем Дзімітрыем Фёдаравічам Бельскім) апекуном сваіх непаўналетніх дзяцей Івана і Георгія. Як ваявода, Глінскі ўдзельнічаў у некалькіх ваенных экспедыцыях супраць Казані. Спроба Глінскага пасля смерці Васіля III усталяваць уласную гегемонію на маскоўскім двары не дала жаданых вынікаў: ён быў арыштаваны, кінуты ў турму, дзе і памёр. Кляймо здрадніка, здаецца, пераследавала яго да канца жыцця. Ім ахвотна і вынікова карысталіся ўсе ягоныя нядобразычліўцы і зайздроснікі. Не ў апошнюю чаргу з-за хлуслівых абвінавачанняў ён вымушаны быў правесці значную частку жыцця ў турме і заўчасна пакінуць гэты свет.

Нягледзячы на смерць у 1534 г. князя Міхаіла, клан Глінскіх у далейшым умацаваў свае пазіцыі ў Маскве. У другой палове 40-х гг. XVI ст. князі Юрый і Міхаіл Васілевічы першымі з клана

[376] Зимин А. А. Новое о восстании Михаила Глинского в 1508 году. С. 72.

[377] Пра сустрэчу Глінскіх у Маскве: Rocznik Stanisława Naropińskiego. S. 221—222.

[378] Пра матывы вяселля і яго наступствы для палітычнага жыцця Маскоўскай дзяржавы: Kollman N. Kinship and Politics. P. 144—145.

Глінскіх атрымалі баярскія тытулы[379]. Сын князя Міхаіла Львовіча ад шлюбу з княгіняй Абаленскай Васіль таксама быў баярынам і ваяводам на царскай службе. Васіль Міхайлавіч памёр у 1565 г., не пакінуўшы дзяцей. Нашчадкі князя Міхаіла Васілевіча займалі важныя пасады і мелі значную вагу ў асяроддзі палітычнай эліты. Род Львовічаў-Глінскіх выгас у Маскве ў 1602 г., пакінуўшы значны след у палітычнай і сацыяльнай гісторыі Маскоўскага царства.

[379] Kollman N. Kinship and Politics. P. 173—174.



**Дэфіляда войска. Біблія Францішка Скарыны.**



Бітва пры Равене. 1512 год. Выява XVI ст.



**Навагародак у пачатку XVI ст. Рэканструкцыя Віктара Сташчанюка.**




Войска ВКЛ вырушае з Навагародка. Сучасная кампутарная рэканструкцыя Вілюса Пятраўскаса.



Бітва з крымскімі татарамі. Музей гісторыі Клеччыны



**Бітва з татарамі. XVI ст. З Хронікі Аляксандра Гваньіні.**



**Лёгкая кавалерыя ВКЛ перапраўляецца праз Дняпро. Выява XVI ст.**



**Крымская конніца суправаджае турэцкае войска. Выява XVI ст.**




**Татарскі коннік. Малюнак Карнэліса дэ Бруйна. Другая палова XVI ст.**



**Карта Крыма. 1526 г.**




Літоўскі коннік. Малюнак Карнэліса дэ Бруйна. Другая палова XVI ст.




Сербскі рац.
Сучасная рэканструкцыя.

# 3. Стварэнне памяці пра Клецкую бітву 1506 г.

## 3.1. Клецкая бітва ў пісьмовых дакументах эпохі

### 3.1.1. Эпоха татарскіх нападаў у гістарычнай памяці рыцарскага саслоўя ВКЛ

Каб рэканструяваць ход бітвы пад Клецкам 1506 г. і вобраз яе галоўнага героя, неабходна ў першую чаргу разгледзець працэс стварэння памяці пра гэту гістарычную падзею і гэтага персанажа. Я буду карыстацца працоўным паняццем «стварэнне» гістарычнай памяці. Гэты тэрмін быў уведзены ў сучасную гістарыяграфію знакамітым французскім даследчыкам Жакам Лё Гофам[1]. Пад паняццем «гістарычнай памяці» разумеецца сукупнасць пісьмовых і рэчавых помнікаў, створаных на працягу пэўнага адрэзка часу. Прапанаваны ўвазе чытача раздзел выходзіць за межы традыцыйнай крытыкі гістарычных крыніц або нават гістарыяграфічнага аналізу. Ён з'яўляецца спробай высветліць, як вобраз канкрэтнай гістарычнай падзеі жыве ў грамадстве, суіснуючы з вобразамі іншых падзей.

Татарскія напады на землі ВКЛ пачатку XVI ст. трывала замацаваліся ў ментальнасці і гістарычнай памяці насельніцтва ВКЛ. У масавай свядомасці наступных пакаленняў апошнія 6 гадоў панавання Аляксандра Ягелончыка будуць успрымацца як час бед, пакут і смутку. Пачатак такому ўспрыняццю эпохі ўнука Ягайлы паклалі самі радныя паны ВКЛ. Неўзабаве пасля смерці караля і вялікага князя Аляксандра рада ВКЛ пісала да сваіх польскіх калег: «А прето видело ся прелатом и паномъ Радам Великого Князства, братьи вашей милости, абы было через насъ на сейме тое то щастное коронацыи вашеи милости припомянено, яко по тые лета пнованя славное памяти короля Александра Мендли Кгиреи, цесар перекопъскии, сам своею парсуною и детьми, и людьми своими не переставаючи казил земли граничные обоихъ панствъ, которые шкоды невымовные

[1] Le Goff J. Saint Louis. Paris, 1996. P. 441—442.

стали ся, которые плоны незличоные выведены, которые крови розлитье хрестиянство обоига стадла от того то поганьства втерпели, хто може выповедить»[2]. У далейшым татарскія напады былі выкарыстаны раднымі панамі для стварэння і ўмацавання ў масавай свядомасці насельніцтва ВКЛ і Кароны адмоўнага вобраза панавання Аляксандра Ягелончыка[3]. Трагічныя падзеі пачатку XVI ст. захаваліся ў народным фальклоры ажно да пачатку XX ст. Занатаваная ў той час народная песня «Над шырокый ракой каля Клецiўска» адлюстроўвае цяжкі эмацыйны стан захопленых татарамі людзей, якія назаўжды страцілі радзіму[4].

Татарскія напады моцна паўплывалі на гістарычныя ўяўленні насельніцтва ВКЛ. Больш таго, сучаснікі праецыравалі іх глыбока ў мінуўшчыну, ледзь не на часы Вітаўта, спрабавалі з іх дапамогай абгрунтаваць сучасны стан рэчаў. Цікавым падаецца выпадак з двума братамі Балтрамеевічамі Дамонтавічамі, Харытонам і Алехнам. Рэч у тым, што ў часе татарскіх набегаў пачатку XVI ст. у многіх баяр пагарэлі або згубіліся велікакняскія граматы-наданні. Таму, калі татарскія напады паслаблі, землеўладальнікі сталі масава звяртацца да новага вялікага князя і караля Жыгімонта з просьбай пацвердзіць наданні, якія яны атрымалі ад папярэднікаў апошняга. Якраз у гэты час браты Харытон і Алехна Балтрамеевічы Дамонтавічы прадставілі грамату на права валодання Ягінтаўскай і Тэкунаўскай зямлёй у Маркаўскім павеце Віленскага ваяводства, якую іх дзед Глеб Дамонтавіч быццам бы атрымаў ад вялікага князя Вітаўта. Але самае цікавае заключаецца ў тым, як Дамонтавічы абгрунтоўвалі заслугі, за якія быў узнагароджаны іх продак. Аказваецца, у часы Вітаўта баярын Глеб Дамонтавіч браў удзел у пагоні за татарскім войскам, якое было насцігнута і знішчана, а ўвесь нарабаваны скарб і забраны палон адбітыя. Здзіўляе эрудыцыя Харытона і Алехны Дамонтавічаў. Яны згадвалі, што бітва з татарамі, у якой браў удзел іх дзед, адбылася за Слуцкам, у Скавышынскім лесе. Яшчэ больш цікавай падаецца спроба Дамонтавічаў звязаць смерць былога гаспадара Тэкунаўшчыны, нейкага Тэкуна, з татарскім нападам, у выніку якога той загінуў. Відавочны анахранізм у грамаце не стаў перашкодай для велікакняскай адміністрацыі. Дакумент быў пацверджаны Жыгімонтам Старым, а пасля трансумаваны каралём Уладзіславам IV: «Bili nam čolom bojare našy Chariton da Olechno Baltromeevičy Domontovičy i pokladali pered nami žalobu svoju i list velikogo kniazja Vitolda dany Glebu Jureviču

[2] LM. Užrašymų knyga 8. P. 45.

[3] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 123.

[4] Чаропка В. Клецк. Повязь часоў // Беларускі гістарычны часопіс. 2006. № 8. С. 34.

Domontu na zemlju Jakgintovskuju, Tekunovskuju, kotorogo Tekuna Tatary zrubili, i ego nikotorogo ne zostalo otrodku, i na try selca v Markovskom stane, Kononovičy i Vežuny pry rece Ušy, da Šolovy u verstach deveti ot reki Veli, domov osmdesjat čotyry s perevozom Šolovickim, i z zemleju lugovoju i bortnoju, so pčolami, emu, Glebu Domontoviču, žone i detem, za tuju ego službu, kak, z vojskom svoim, ljudmi služebnymi, pogoneju idučy, nepryjatelskoe vojsko tatarskoe, za Sluckom, u lesech Skovyšynskich pobil i mnogo ljudej Litovskich u nevolju polonom zabranych, otgromil. I za tym listom velikogo kniazja Vitolta, tuju zemlju i sela s perevozom i z zemleju lugovoju i bortnoju, so pčelami i derevom bortnym, po davnosti prodkov svoich, deržat, a nichto pereškodoju ne byl, liš starosta Markovskij Mardas Miškovich ljudem Šolovickim v zemli bortnoj medy u pčol beret i grošy perevoznoje ot perevoznikov»[5].

Саму бітву пад Клецкам 5 жніўня 1506 г. высока ацанілі ўжо сучаснікі. Гэта была ледзь не першая буйная перамога войск ВКЛ над знешнім ворагам з сярэдзіны XV ст. Татары з часоў Вітаўта не цярпелі такога буйнога паражэння ад літвінаў. У Клецкай бітве крымскае войска панесла незвычайна вялікія страты. Вялікім быў адбіты палон, надзвычай багатымі аказаліся захопленыя трафеі. Неардынарнай была і сама постаць галоўнага трыумфатара Клецкай бітвы, князя Міхаіла Глінскага. Таму падзея не магла застацца незаўважанай сучаснікамі і сцерціся з памяці наступных пакаленняў. Клецкая перамога прыпала на апошнія дні жыцця польскага караля і вялікага князя літоўскага Аляксандра Ягелона, які атрымаў сапраўднае ўцяшэнне ад гэтай ледзь не адзінай буйной перамогі літоўскай зброі за гады яго праўлення.

### 3.1.2. Першыя весткі пра перамогу пад Клецкам

Водгукі Клецкай перамогі хутка і шырока распаўсюдзілася ва Усходняй Еўропе. Гэтаму паспрыялі адпаведныя прапагандысцкія захады кіраўніцтва ВКЛ. Першыя весткі пра перамогу пад Клецкам былі распаўсюджаныя афіцыйнымі асобамі, у першую чаргу, самім надворным маршалкам і гаспадаром. Ужо 12 жніўня 1506 г. галоўны герой бітвы князь Міхаіл Глінскі паведаміў у лісце да вармінскага біскупа Лукаша Ватцэнродэ пра буйную перамогу літоўскага войска над татарамі за ракой Лань[6].

З Лукашам Ватцэнродэ, дзядзькам па матчынай лініі знакамітага астранома Мікалая Каперніка, Глінскі падтрымліваў шчыльныя

---

[5] Vitoldiana: codex privilegiorum Vitoldi... S. 201—202.

[6] AA. S. 546—547.

сувязі. Пазнаёміліся яны, відаць, на велікакняскім двары ў часе візіту вармінскага біскупа з нагоды прускіх спраў у Вільню ў лютым-сакавіку 1503 г. У сталіцы Літвы Лукаш Ватцэнродэ быў сардэчна прыняты каралём і вялікім князем Аляксандрам, што некалькі змякчыла непрыемнае ўражанне ад моцных маразоў, якія трымаліся ўвесь час, пакуль пруская дэлегацыя знаходзілася ў ВКЛ[7]. Другі раз Глінскі і Ватцэнродэ сустрэліся ў Вільні 21 красавіка 1506 г. Калі вармінскі біскуп і мальбаркскі староста Амброжы Пампоўскі прыбылі да Вільні, ім насустрач выехалі князь Міхаіл і каронны канцлер Ян Ласкі з шыкоўнай світай[8]. Яны ўрачыста суправаджалі прускую дэлегацыю да караля Аляксандра.

У лісце Глінскага да Ватцэнродэ падкрэслівалася, што бітва доўжылася цэлы тыдзень пачынаючы з 1 жніўня і што пералом у ёй адбыўся толькі 5 жніўня. Глінскі падкрэсліваў вялікую колькасць адбітага палону і захопленых трафеяў, у першую чаргу, коней. Аднаго з палонных татараў ён нават выслаў вармінскаму біскупу ў якасці падарунка. Яшчэ праз два дні кароль польскі і вялікі князь літоўскі Аляксандр Ягелончык у лісце да жыхароў Гданьска, ужо лежачы на смяротным ложы, адзначаў, што бітва была надзвычай упартай і што шалі перамогі вагаліся то ў адзін, то ў другі бок (пра што сведчылі 13 сутычак паміж войскамі), пакуль, нарэшце, літвіны не зламілі ўпарты супраціў крымскага войска[9]. Адзначыўшы вялікую колькасць палонных і ваенных трафеяў, кароль і вялікі князь падкрэсліў вырашальную ролю Клецкай перамогі не толькі для яго падданых, але і для ўсяго хрысціянскага свету. Такім чынам, пра Клецкую перамогу войска ВКЛ над крымскімі татарамі хутка даведаліся ў Польшчы і Прусіі.

Клецкая перамога 1506 г. знайшла адлюстраванне ў дзённікавых запісах некаторых польскіх саноўнікаў. Так, плоцкі біскуп Эразм Цёлак занатаваў па гарачых слядах: «Augustus 5: Victoria super tartarorum 8 millibus circa Klijeczko»[10]. Клецкая бітва не была незаўважана каронным канцлерам Мацеем Джэвіцкім, які запісаў: «5 VIII Tartari in Lithuania circa Cleczko magna clade profligati duce… »[11]. На жаль, запіс не завершаны, але можна ўпэўнена сцвярджаць, што слова «duce» адносіцца да трыумфатара бітвы — князя Міхаіла Львовіча Глінскага.

[7] Memoriale domini Lucae. S. 140.

[8] Тамсама. S. 154.

[9] AA. S. 548.

[10] Własnoręczne zapiski Erazma Ciołka... S. 454.

[11] Dziennik Macieja Drzewickiego. S. 344.

### 3.1.3. Адлюстраванне Клецкай бітвы ў літаратуры эпохі Адраджэння. «Пруская вайна» Яна Вісліцкага

Бітва знайшла водгук і на старонках літаратурных твораў. Дзесяцігоддзе Клецкай бітвы было своеасаблівым чынам адзначана на старонках паэмы «Пруская вайна» Яна Вісліцкага. Аўтар, праслаўляючы часы Аляксандра (1492—1506 гг.), адзначыў, што найслаўнейшай падзеяй яго панавання была перамога над татарамі пад Клецкам.

*Alter Alexander fratris successerat aulae,*
*Vir sermone potens, vir et virtute nitescens,*
*Optimus Astreae cultor fotorque puellae,*
*Quem sors non voluit fieri sine nomine regem,*
*Sed super astrigerum victorem misit Olympum*
*Jam fera squaliduli calcantem limina leti*
*Insigni faciens florere ex hoste triumpho.*
*Audax Lithuanis quem sensit Nartarus agris —*
*Res vulgata satis — testis quoque Clecia moles*[12].

*(Брат Аляксандр прыняў ад яго каралеўскую ўладу,*
*Муж красамоўны, сваёй дабрачыннасцю слаўны таксама,*
*Велічнай дзевы Астрэі надзейны і верны прыхільнік;*
*Лёс караля не хацеў, каб застаўся навечна бясслаўным*
*Ён пераможца, — вось, калі межаў жахлівае смерці*
*Ужо дасягаў той кароль, то з трыумфам над ворагам лютым*
*Накіраваў яго лёс да нябесных вышыняў Алімпа.*
*Дзёрзкі татарын адчуў яго сілу ў межах літоўскіх —*
*Гэта вядома для ўсіх, таму доказ — цвярдыня пад Клецкам).*

Ян Вісліцкі, згадваючы перамогу пад Клецкам (як, дарэчы, і перамогу 1514 г. пад Оршай), імкнуўся пераканаць еўрапейскага чытача, што ВКЛ яшчэ здольна даць належны адпор іншаземным агрэсарам. Аўтар адносіў бітву да ліку самых значных перамог літоўскай зброі. Услаўленне Клецкай бітвы 1506 г. магло мець для Яна Вісліцкага асабісты інтарэс, бо, на думку асобных даследчыкаў, паэт мог паходзіць з мясцовасці паміж Пінскам і Клецкам[13].

---

[12] Вісліцкі Я. Пруская вайна / Уклад., перакл., камент. Ж. В. Некрашэвіч-Кароткай. Мінск, 2005. С. 166—167.

[13] Вісліцкі Я. Пруская вайна / Уклад., перакл., камент. Ж. В. Некрашэвіч-Кароткай. Мінск, 2005. С. 20—21.

### 3.1.4. Апісанне Клецкай бітвы польскімі хранiстамі. Мацей Мяхоўскі (з Мехава)

Клецкая бітва знайшла дастаткова шырокае адлюстраванне на старонках польскіх хронік. Прафесар Кракаўскай Акадэміі Мацей з Мехава (Мехавіта) сцісла адзначыў у першай рэдакцыі сваёй хронікі (1519): «Amplius ante festum S. Laurentii Lithuani prope castrum Kleczko Thartaros Przekopenses ut fertur quinque millia prostraverunt. Duo autem Caesareoli seu filii Caesaris ad paludes et loca limosa fugientes, noctis absceritate salvati, evaserunt, prefata victoria Domini Michaeli Hlinski et ejus providentiae attribuebatur»[14]. (Незадоўга перад святам святога Ваўжынца бліз горада Клецка літвіны разбілі перакопскіх татараў, якіх налічвалася, як сцвярджаюць, пяць тысяч. Але два царэвічы або сыны цара (крымскага) уратавалі свае жыцці, уцякаючы праз балоты і багністыя мясціны, а таксама дзякуючы наступленню ночы. Згаданая перамога прыпісваецца пану Міхаілу Глінскаму і яго прадбачлівасці).

У другой версіі хронікі, якая выйшла ў 1521 г., Мяхоўскі падаў пашыраны вобраз падзеі. Незадоўга да свята святога Ваўжынца, калі цяжка хворы кароль і вялікі князь Аляксандр канчаткова злёг у Вільні, татары ў колькасці 24 або 26 тысяч воінаў уварваліся ў межы ВКЛ, рухаючыся ў накірунку Вільні. На вестку пра гэта кароль склікаў паноў-раду і пасля нядоўгіх кансультацый абвясціў выправу. Аднак князь Міхаіл Глінскі ад імя ўсіх радных паноў сказаў, што яны выправяцца толькі тады, калі іх будзе суправаджаць сам гаспадар. На квадрызе (калясніцы, запрэжанай чатырма конямі) кароль быў адвезены ў Лідскі замак, да якога ў той момант набліжаліся татарскія наезнікі. Гаспадарскія выведнікі данеслі пра прыбыццё 30-тысячнага татарскага войска, у якім знаходзіліся два сыны крымскага хана, пад Клецк. Кароль даручыў камандаванне войскам вялікаму гетману Станіславу Кішку, але той нечакана захварэў, і яго месца заняў Міхаіл Глінскі. У гэты час татары, якія пакінулі свой абоз у бяспечным месцы за Клецкам (ultra Kloczko) пад аховай невялікага войска, разаслалі загоны ў колькасці дваццаці тысяч на рабаванне навакольных вёсак. Калі татары наблізіліся да Ліды на небяспечную адлегласць, кароль загадаў аднесці яго ў Вільню. Ужо лежачы на смяротным ложы, Аляксандр атрымаў вестку пра разгром татарскага войска. Згодна Мяхоўскаму, у бітве ўдзельнічала 14 тысяч

[14] Lectiones variantes primae editionis (anni 1519) Matthiae de Miechow Chronicae Polonorum. S. 281.

татараў, якія былі бязлітасна знішчаныя літвінамі. Шмат татараў трапіла ў палон. Пераможцам дасталася 12 тысяч коней і багатая здабыча. У другой рэдакцыі хронікі Мацей Мяхоўскі стрымана паставіўся да ролі князя Міхаіла Глінскага ў падзеях 1506 г. Ён адзначыў толькі, што апошні камандаваў гаспадарскім войскам, але ўжо не прыпісваў яму выключнай заслугі ў перамозе над татарамі. Прычыну такой метамарфозы можна растлучыць тым фактам, што галоўным рэдактарам другой версіі хронікі Мяхоўскага, верагодна, з'яўляўся сам каронны канцлер Ян Ласкі, якога цяжка было заўважыць у добразычлівым стаўленні да Глінскага[15].

### 3.1.5. Бернард Вапоўскі

Сучаснік Мацея Мяхоўскага афіцыйны каралеўскі гістарыёграф Бернард Вапоўскі падаў надзвычай дэталёвую карціну бітвы. Дзякуючы свайму высокаму статусу на польскім двары Вапоўскі меў шырокі доступ да разнастайнай інфармацыі. Яго інфарматарамі выступалі першыя асобы дзяржавы. Неабходныя звесткі пра бітву ён мог атрымаць з вуснаў аднаго ці некалькіх яе ўдзельнікаў. Верагодна, інфарматары Вапоўскага маглі належаць да польскай надворнай харугвы, з'яўленне якой, згодна аўтару, канчаткова здэмаралізавала татараў[16]. Бернард Вапоўскі карыстаўся таксама хронікай Мацея Мяхоўскага і некаторымі іншымі крыніцамі, у тым ліку архіўнымі дакументамі.

Дзякуючы несумненнаму літаратурнаму таленту аўтара апавяданне каралеўскага гістарыёграфа пра Клецкую бітву выйшла жывым і хвалюючым. Каб прыцягнуць увагу чытача, Вапоўскі адразу ўводзіць у фабулу апавядання элемент унутранай напружанасці. Спакойны аповед укладальніка нечакана перарываецца паведамленнем пра ўварванне татараў, якія знаходзіліся на адлегласці ўсяго толькі аднаго дня дарогі ад Ліды, куды прыбыў кароль і вялікі князь Аляксандр. Пасланнік, які прынёс гэту вестку, засведчыў праўдзівасць сваіх слоў ранай на твары, атрыманай ад татарскай стралы. Толькі дзякуючы прыткасці каня яму ўдалося ўнікнуць татарскага палону.

Галоўным арганізатарам абароны краю ў аповедзе выступае князь Міхаіл Глінскі. Менавіта ён выслаў аддзел рацаў на пошукі

---

[15] Варонін В. А. Два лісты пра бітву пад Клецкам у 1506 г. // Беларускі гістарычны агляд. 1995. Т. 2. Сш. 2 (3). С. 284—285.

[16] Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 67.

ворага адразу пасля атрымання навіны пра з'яўленне татараў. Яму рацы прынеслі сцятыя галовы татарскіх воінаў як сведчанне блізкага знаходжання ворага. Менавіта князь Міхаіл заклікаў да зброі і пачаў збіраць войска. Кароль і вялікі князь Аляксандр адсылаў да яго воінаў, якія на вестку аб набліжэнні татараў пачалі збірацца на ягоны двор. Вапоўскі адзначае не толькі несумненныя арганізацыйныя здольнасці Глінскага, але і яго вайсковы талент. Князь Міхаіл выступае ў Хроніцы як бліскучы стратэг. Маючы ўсяго 7 тысяч рыцараў, ён здолеў па частках разбіць 30-тысячнае татарскае войска, з якіх 10 тысяч знаходзіліся непасрэдна ў лагеры пад Клецкам. Вапоўскі адзначае выключную асабістую мужнасць Глінскага, падкрэсліваючы той факт, што ў бітве пад ім было забіта тры кані. Важную ролю ў перамозе адыграла веданне Міхаілам Глінскім звычаяў і нораваў татараў, а таксама выкарыстанне ў баі новых тэхнічных сродкаў — лёгкай артылерыі. Польскі храніст звяртае ўвагу на ваенную хітрасць князя Міхаіла, які пасля знішчэння татарскіх сіл стаяў на месцы іх разгромленага каша ў чаканні на падыход татарскіх загонаў. Не ведаючы пра разгром свайго лагера, татары бяспечна вярталіся і трапялі ў падрыхтаваную для іх пастку. У выніку праведзенай аперацыі, як адзначае Бернард Вапоўскі, было знішчана прыкладна 20 тысяч татараў, было захоплена амаль столькі ж коней. Быў вызвалены захоплены татарамі палон. Вапоўскі сведчыць, што дзякуючы атрыманай пад Клецкам перамозе князь Міхаіл Глінскі заваяваў сабе выключную славу (precipuam ejus victoriae laudem reportavit)[17].

### 3.1.6. Прускія аўтары пра Клецкую бітву. Вармінскі біскуп Лукаш Ватцэнродэ

Калі ў самым пачатку XVI ст. ВКЛ толькі пачынала ствараць уласную гістарычную памяць, то Тэўтонскі ордэн ужо меў багатую гістарыяграфічную традыцыю. Яна была прадстаўлена разнастайнымі пісьмовымі крыніцамі, у тым ліку аналамі, хронікамі, паэтычнымі творамі, дакументамі, што адлюстроўвалі не толькі падзеі ўласнай мінуўшчыны, але і гісторыю суседніх краін. Гістарычнае мінулае ВКЛ было прадметам пільнай увагі кіруючых колаў і ідэолагаў Ордэна. Працэс гэты пачаўся з моманту ўтварэння дзяржавы літвінаў і русінаў (з 30-х гг. XV ст. — Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае) у сярэдзіне XIII ст. У Літве і палітычна

[17] Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 68.

звязаных з ёй рускіх землях, якія больш чым паўтара стагоддзі вялі зацятую барацьбу з Тэўтонскім ордэнам, не існавала спрыяльных умоў для творчай дзейнасці. Не дзіўна, што першыя гістрычныя творы Літвы (De Witoldes Sache weddir Jagal und Skirgal) узніклі ў самім Ордэне, дзе прэтэндэнты на велікакняскі стол шукалі палітычнага прытулку і збройнай дапамогі. У сваю чаргу, ордэнскія храністы дбайна занатоўвалі падзеі, што адбываліся ў Літве і ў суседніх рускіх землях.

Клецкая бітва 1506 г. знайшла адлюстраванне ў мемарыяле вармінскага біскупа Лукаша Ватцэнродэ[18]. З 1496 па 1522 гг. гэты помнік вармінскай біскупскай курыі вёў тагачасны канцлер біскупа, Павел Дойстэрвальт (Pawel Deusterwalt)[19]. Апошні двойчы — у 1503 і 1506 гг. — суправаджаў Лукаша Ватцэнродэ ў Вільню, дзе мусіў пазнаёміцца з надворным маршалкам Міхаілам Глінскім.

Характарызуючы караля і вялікага князя Аляксандра Ягелончыка, Дойстэрвальт адзначае, што той нічым не вызначыўся ў вайсковых справах, акрамя, хіба што, перамогі над 20-тысячным татарскім войскам пад Клецкам, атрыманай незадоўга да сваёй смерці. У мемарыяле біскупа Лукаша падаюцца, аднак, надзвычай сціслыя звесткі пра бітву, згадваецца, што бітва працягвалася 8 дзён і што літвіны захапілі багатую здабычу, у тым ліку 30 тысяч коней: «In rebus bellicis nihil insigne egit, nisi quod paucis diebus ante obitum suum prope duodecim milia Tartarorum, qui ducibus duobus filiis imperatoris Tartarorum Prekopsky Lituaniam usque ad internectionem vastare destinaverant, prope oppidum Clyczko per continuos octo dies fudit, profligavit er extixit, paucis eorundem superstitibus»[20]. Сваё кароткае паведамленне Дойстэрвальт заканчвае сцвярджэннем, што яшчэ ніколі татары не неслі ў бітвах такіх вялікіх страт (In memoria hominum non extabant in tanto numero Tartaros uno conflictu interiisse)[21]. Крыніцай інфармацыі пра Клецкую бітву з'яўляліся лісты самога караля Аляксандра да вармінскага біскупа, што адзначана ў мемарыяле («quemadmodum ex literis Regis deprehendi potest»)[22], а таксама ліст Міхаіла Глінскага да таго ж адрасата.

---

[18] Memoriale domini Lucae. S. 156.

[19] Пра Паўла Дойстэрвальта падрабязней: Oko J. Paweł Deusterwalt nieznany humanista XV wieku // Ateneum Wileńskie. 1930. R. 7. Z. 1—4. S. 786—798.

[20] Memoriale domini Lucae. S. 156.

[21] Тамсама. S. 156.

[22] Memoriale domini Lucae. S. 156.

### 3.1.7. Клецкая бітва ў летапісах ВКЛ 20—40-х гг. XVI ст.

Падзея атрымала дастаткова значны рэгіянальны рэзананс у вялікай ступені дзякуючы таму, што якраз у гэты час культура ВКЛ ператваралася з вуснай у вусна-пісьмовую. Як вынік сацыяльна-эканамічных і палітычных ператварэнняў XV ст., пісанае слова набывала ўсе большае значэнне. Дакумент уваходзіў літаральна ва ўсе сферы жыцця ВКЛ, хоць вуснае слова працягвала па-ранейшаму дамінаваць у грамадстве. Пра рост пісьмовай культуры яскрава сведчыць паўстанне пры канцлеру Міхале Кезгайлавічу (1458—1476 гг.) дзяржаўнага архіва ВКЛ. Пры канцлеру Альбрэхце Гаштаўце (1522—1539 гг.) справаводства было ўдасканалена. У першыя дзесяцігоддзі XVI ст. у дзяржаве рыхтавалася кадыфікацыя звычаёвага права, якая была завершана з прыняццем Літоўскага Статута 1529 г. Аддаўшы даніну Альбрэхту Гаштаўту як таленавітаму адміністратару, нельга не згадаць, што ў маладыя гады ён прымаў актыўны ўдзел у змаганні з татарамі. У 1503 г. гетман Станіслаў Пятровіч Кішка, Альбрэхт Гаштаўт і Юрый Неміровіч разбілі татар пад Гарадком, за Прыпяццю, адбіўшы пры гэтым увесь палон[23]. У 1505 г. Альбрэхт Гаштаўт кіраваў гераічнай абаронай Новагародка[24].

Высокая культура ВКЛ у XVI ст. усё больш гістарызавалася. Палітычную эліту дзяржавы ў гэты час у большай ступені, чым у папярэднюю эпоху, пачалі цікавіць падзеі мінуўшчыны, што было абумоўлена, у першую чаргу, ростам яе гістарычнай самасвядомасці. Несумненна, значная частка ўспамінаў пра мінулае працягвала існаваць выключна ў вуснай форме. Некаторыя з іх, перадаючыся праз слова, з цягам часу скажаліся, але, тым не менш, працягвалі існаваць у памяці. Другая частка, пераходзячы з пакалення ў пакаленне, паступова гублялася. Тым не менш, урыўкі гэтых успамінаў былі пазней занатаваны ў пісьмовай форме.

Асноўным відам дзеяпісарства ў ВКЛ у XVI ст. сталі летапісы і хронікі. Не ўдаючыся ў высвятленне тэрміналагічных адрозненняў, адзначым, што на культурнай глебе ВКЛ у дадзеную эпоху абодва згаданыя літаратурныя жанры мелі куды больш агульнага, чым асобнага. Тэрмін «хроніка» адлюстроўваў растучы польскі культурны ўплыў у ВКЛ у другой палове XVI ст. Як летапісы, так і хронікі ВКЛ аб'ядноўвалі ў сваім складзе пагадовыя запісы і гістарычныя аповеды. Укладаліся гэтыя творы на дварах духоўных і свецкіх феадалаў

---

[23] ПСРЛ. Т. 35. С. 170.

[24] Тамсама. С. 171.

(Гальшанскіх, Гаштаўтаў, Хадкевічаў, Алелькавічаў і інш.). На летапісанне ВКЛ моцны ўплыў аказала летапісанне Галіцка-Валынскай Русі і, у меншай ступені, Вялікага Ноўгарада і Масквы.

Вытокі летапісання ў ВКЛ сягаюць першай трэці XV ст. Адным з самых ранніх помнікаў гэтага жанру стаў «Летапісец вялікіх князёў», створаны каля 1430 г. «Летапісец» з'яўляецца першай караткай гісторыяй дзяржавы з 40 — пачатку 90-х гг. XIV ст. Дапоўнены наратыўнымі творамі, у тым ліку «Пахвалой Вітаўту», а таксама пагадовымі запісамі, запазычанымі з наўгародскіх і маскоўскіх летапісаў, «Летапісец» склаў аснову першага зводу летапісаў ВКЛ, які быў укладзены ў 1446 г. Новы этап у развіцці летапісання ВКЛ наступіў у 20—40-х гг. XVI ст., ужо пасля Клецкай бітвы 1506 г. У гэты час з'явілася «Хроніка Вялікага Княства Літоўскага», у якой апавядаецца пра паходжанне літвінскай шляхты і пачаткі дзяржаўнасці ВКЛ. «Хроніка Вялікага Княства Літоўскага», аб'яднаная з «Летапісцам вялікіх князёў літоўскіх» і дапоўненая наратыўнымі апавяданнямі пра падзеі другой паловы XV — першай паловы XVI стст., утварыла другі звод летапісаў ВКЛ. Ён захаваўся ў трох рэдакцыях: кароткай (спіс Красінскага), пашыранай (спісы Яўрэінаўскі, Альшэўскі, Румянцаўскі) і поўнай (спіс Рачынскага, або Пазнанскі).

Першыя звесткі пра Клецкую бітву ў ВКЛ з'явіліся ў форме пагадовых запісаў у Яўрэінаўскім і Альшэўскім летапісах, а таксама ў летапісе Рачынскага. Для іх укладальнікаў бітва была яшчэ падзеяй блізкага мінулага, пра якую яны маглі чуць ад відавочцаў, і нават быць яе сведкамі. З гэтых трох крыніц паведамленне Альшэўскага летапісу самае сціслае[25]. Ягоны ўкладальнік абмяжоўваецца выключна месцам і датай бітвы: «Tatar pobito pot Klieczkiem w dzień Panni Mariey Sniežney pot lathi Božego Narodzenia tisiącz piećset szostego». Больш сціслым з'яўляецца толькі паведамленне Румянцаўскага летапісу («Татаров побито под Клетцом лета Божя нароженя 1500 (sic) году»)[26], што быў укладзены ў апошняй чвэрці XVI ст. Некалькі больш пра Клецкую бітву апавядае Яўрэінаўскі летапіс[27]. Ён падае не толькі час («Лета Божого Нарождения 1506-го. В Спасов пост») і месца бітвы («татар литва побила под Клецком, великих людей»), але называе імя яе галоўнага героя («а етманом был в тои битве князь Михаило Глинскои»). Летапісец імкнецца прытрымлівацца паслядоўнасці фактаў і спрабуе вызначыць месца бітвы ў ланцугу падзей. Абапіраючыся

[25] ПСРЛ. Т. 35. С. 192.
[26] Тамсама. С. 213.
[27] Тамсама. С. 192.

пераважна на польскія крыніцы (хронікі Мяхоўскага і Вапоўскага), ён адзначае, што бітве папярэднічаў сойм з удзелам караля Аляксандра Ягелончыка ў Лідзе і што апошні памёр неўзабаве пасля перамогі пад Клецкам. Больш падрабязна апавядае пра бітву летапіс Рачынскага[28]. Яго ўкладальнік падае не толькі месца і час бітвы, следуючы ў гэтым за Яўрэінаўскім летапісам, але і адзначае, абапіраючыся, магчыма, на Мяхоўскага, што гетман Станіслаў Кішка раптоўна захварэў у дарозе і з гэтае прычыны быў вымушаны перадаць свае паўнамоцтвы дворнаму маршалку Міхаілу Глінскаму. Летапіс Рачынскага паведамляе пра некаторыя дэталі бітвы, адзначаючы, што татары стаялі кошам пад Клецкам, а галоўная бітва з татарамі адбылася каля горада на рацэ Цапра, у водах якой знайшло свой апошні прытулак мноства татараў. Летапіс Рачынскага вызначае месца бітвы сярод іншых падзей. У ім адзначана, што «маючы ведомость о том король, иж татаров наголову побили, велми ся радовал и также з доброю паметью с тым светом и з слугами своими ростался».

### 3.1.8. Марцін Кромер

Сярэдзіна XVI ст. з'яўляецца своеасаблівай мяжой ва ўспрыняцці Клецкай бітвы 1506 г. грамадствам ВКЛ. Амаль не засталося больш удзельнікаў і сведак падзеі. Новыя пакаленні ведалі пра бітву выключна з вуснаў апавядальнікаў, што самі чулі пра яе ад відавочцаў або сучаснікаў ці з пісьмовых крыніц. У гістарычнай памяці ВКЛ бітва пачала паступова ператварацца ў падзею далёкай мінуўшчыны[29].

Новы этап у асвятленні бітвы пад Клецкам 1506 г. звязаны з імем польскага гуманіста Марціна Кромера (1512—1589 гг.). Сваю дзейнасць у якасці каралеўскага сакратара ён распачаў яшчэ ў часы Жыгімонта Старога[30]. Падчас працы ў каралеўскай канцылярыі ў маладога чалавека абудзілася цікавасць да гісторыі, чаму спрыяла яго добрая адукацыя, атрыманая ў лепшых італьянскіх універсітэтах (Падуя, Балонія)[31]. Абуджэнню цікавасці Кромера да гісторыі паспрыяла таксама яго праца ў 1550 г. па ўпарадкаванні каралеўскага архіва ў Кракаве[32].

---

[28] ПСРЛ. Т. 35. 167.

[29] Пра катэгорыі «блізкая» і «далёкая»: Гене Б. История и историческая культура Средневекового Запада. С. 92—99.

[30] Wyczański A. Między kulturą a polityką: sekretarze królewscy Zygmunta Starego (1506—1548). Warszawa, 1990. S. 107.

[31] Barycz H. Kromer Marcin // PSB. T. 15. S. 320—321.

[32] Wyczański A. Między kulturą a polityką... S. 107.

Ідэя напісання працы, прысвечанай айчыннай мінуўшчыне, з'явілася ў Марціна Кромера яшчэ ў 1544 г. пасля паўторнага вяртання з Італіі і атрымання пасады ў кафедральнай кракаўскай капітуле[33]. Работа над польскай мінуўшчынай была завершаная ў 1554 г. Праз два гады, у 1556 г., яна выйшла з друку ў Базелі ў выдавецтве Апарына пад назвай «De origine et rebus gestis Polonorum» («Аб паходжанні і дзеях палякаў»). Праца апіралася на гісторыю Польшчы Яна Длугаша, а ў заключнай частцы (1480—1506 гг.) на хроніку Вапоўскага. Твор Кромера быў закліканы пазнаёміць іншаземцаў з польскай гісторыяй. Ён меў несумненны выдавецкі поспех: за час жыцця аўтара выйшла пяць лацінскіх, адно нямецкае і адно польскае выданні[34].

Пры апісанні бітвы пад Клецкам 1506 г. Марцін Кромер карыстаўся, як ён сам адзначае, творамі Бернарда Вапоўскага і Мацея Мяхоўскага. Аўтар згадвае Вапоўскага, калі піша, што непасрэдна перад бітвай хворы кароль Аляксандр выказаў намер вярнуцца ў Польшчу, каб там у спакоі правесці рэшту жыцця, перадаўшы Карону і ВКЛ свайму малодшаму брату Жыгімонту[35]. На Мяхоўскага Кромер спасылаецца, калі адзначае, што літвіны доўга спрачаліся з гаспадаром, жадаючы, каб ён асабіста ўзначаліў паход супраць татараў[36]. У далейшым Кромер ужо не цытуе крыніцы, але са зместу твора відаць, дзе яго звесткі грунтуюцца на творы Вапоўскага і дзе ён аддае перавагу Мяхоўскаму. Кромер следуе за Вапоўскім, калі вызначае колькасць татарскага войска ў 30 тысяч чалавек, з якіх 10 — засталося ў лагеры, а 20 — разышлося рабаваць наваколле. Мяхоўскі піша толькі пра 24 або 26 тысяч татараў. Аўтар, грунтуючыся на звестках Мяхоўскага, адзначае, што на чале гаспадарскага войска стаялі надворны маршалак Міхаіл Глінскі і гетман Станіслаў Кішка. Але апошні захварэў, і войска мусіў узначаліць Глінскі. Колькасць гаспадарскага войска Кромер, следуючы за Вапоўскім, ацэньвае ў 7 тысяч коннікаў.

У апісанні самой бітвы Кромер, як падаецца, у большай ступені абапіраецца на Вапоўскага. Ён адзначае паспяховыя дзеянні артылерыі, пераправу праз раку левай калоны вялікакняскага войска і яе ўдар у тыл татарам, засаду на месцы татарскага лагера. Кромер адзначае талент і асабістую мужнасць Глінскага ў бітве. Аднак рашаючым момантам у змаганні ён лічыць з'яўленне на суседняй з полем бітвы гары

[33] Barycz H. Kromer Marcin // PSB. T. 15. S. 321, 322.

[34] Тамсама. S. 323.

[35] Cromer M. De origine et rebus gestis Polonorum. Basileae, 1566. P. 446.

[36] Тамсама. P. 446.

300 польскіх рыцараў, якіх узначальваў сын пазнанскага ваяводы Сяндзівой Чарнкоўскі. Імя апошняга прысутнічае толькі ў Мяхоўскага.

Гаворачы пра вынікі бітвы, Кромер грунтуецца пераважна на Вапоўскім. Ён адзначае, што ў баі было забіта 20 тысяч татараў, захоплена столькі ж коней, вызвалена незлічоная колькасць палонных. Дадамо, што з'яўленне працы Марціна Кромера выклікала вялікі рэзананс не толькі ў Кароне, але і ў ВКЛ. У Літве твор быў успрыняты адмоўна, галоўным чынам, з-за антылітоўскіх настрояў і поглядаў аўтара. На вальным сойме 1563—1564 гг. справа дайшла нават да пратэсту дэлегацыі ВКЛ у асобе канцлера Мікалая Радзівіла Чорнага супраць трактоўкі Кромерам падзей літоўскай мінуўшчыны[37]. Неўзабаве, аднак, стаўленне да гістарычнай працы Марціна Кромера карэнным чынам змянілася. У 1580 г. сойм нават ухваліў твор. У далейшым аўтарытэт гісторыі Марціна Кромера ўжо не падлягаў сумненню і аказваў адчувальны ўплыў на развіццё польскай гістарыяграфіі.

### 3.1.9. Марцін Бельскі

Клецкай бітве 1506 г. знайшлося месца і ў «Хроніцы свету» другога польскага аўтара Марціна Бельскага (1495—1575 гг.). Хроніка, што выйшла ў 1551 г., з'яўлялася першай кампіляцыяй на польскай мове, што была прысвечаная падзеям айчыннай гісторыі ад старажытнасці і да смерці Жыгімонта Старога ў 1548 г.[38]. Як і праца Марціна Кромера, хроніка Бельскага мела вялікі выдавецкі поспех. Пры жыцці аўтара пабачылі свет тры выданні, да самой смерці Бельскі працаваў над чацвёртым.

Апісанне падзей, як да, так і пасля 1506 г. грунтуецца, галоўным чынам, на хроніцы Мацея Мяхоўскага. Можна было б нават сказаць, што апісанне бітвы пад Клецкам уяўляе сабой добрасумленны пераказ адпаведнай часткі гэтага твора. Гэта першы аповед пра славутую падзею, які з'явіўся на польскай мове.

Залежнасць Марціна Бельскага ад Вапоўскага праяўляецца ў тым, што ён падае колькасць татарскага войска, якое ўварвалася ў ВКЛ, у памеры 30 тысяч. Таксама Бельскі, услед за сваім папярэднікам, вызначае страты татараў у бітве пад Клецкам у 20 тысяч. Нарэшце, ён адзначае, безумоўна, абапіраючы на Бернарда Вапоўскага, што ў бітве пад Глінскім было забіта тры кані[39].

---

[37] Barycz H. Kromer Marcin // PSB. T. 15. S. 323.

[38] Chrzanowski I. Bielski Marcin // PSB. T. 2. S. 65.

[39] Kronika polska Marcina Bielskiego // Zbiór pisarzów polskich. Cz. 5. T. 16. Warszawa, 1830. S. 89—92.

### 3.1.10. Інфлянцкая вайна і патрэба ў новых героях

У 1539 г. не стала Альбрэхта Гаштаўта. У 1548 г. памёр кароль і вялікі князь Жыгімонт Стары. З авансцэны сышлі асноўныя ідэолагі, што доўгі час навязвалі грамадству пэўны вобраз гістарычных падзей і персанажаў. Новы ўладар, сын Жыгімонта Старога ад шлюбу з Бонай Сфорцай, Жыгімонт Аўгуст, вызначаўся не толькі рэлігійнай талерантнасцю, але і палітычным лібералізмам. Менавіта ў гады яго панавання асоба князя Міхаіла Глінскага была вернутая з нябыту і фактычна рэабілітавана. Ва ўмовах Лівонскай вайны (1558—1583 гг.) ВКЛ і Польшча патрабавалі новых герояў мінуўшчыны, якія б сваімі ўчынкамі натхнялі маладое пакаленне на змаганне з ворагамі Айчыны. Такім героем, побач з князем Канстанцінам Астрожскім і Астафіем Дашкавічам, мусіў стаць Міхаіл Глінскі.

Новыя ўмовы патрабавалі новы вобраз героя. Працэс яго стварэння быў інспіраваны і кантраляваўся новай элітай ВКЛ на чале з Хадкевічамі і Радзівіламі. Браты Мікалай Радзівіл Чорны і Мікалай Радзівіл Руды, хоць і заціралі як маглі сляды супрацоўніцтва сваіх продкаў з Глінскім, тым не менш, не маглі не прызнаць яго заслугу ў бітве пад Клецкам[40]. Тым больш, што неўзабаве пасля ад'езду ў 1556 г. у Італію каралевы Боны Клецк перайшоў ва ўласнасць Радзівілаў. Адносіны Хадкевічаў да Міхаіла Глінскага заўжды, нават падчас яго канфлікту з Янам Забярэзінскім, былі дастаткова прыязнымі. Так, у 1507 г. служэбнік Мікалая Мікалаевіча Радзівіла Міхаленца паведамляў, што князь Міхаіл Львовіч Глінскі знаходзіцца «въ згоде а въ добромъ житьи» з гарадзенскім старостам Янам Юр'евічам Гальшанскім, Альбрэхтам Гаштаўтам і Аляксандрам Хадкевічам[41].

У рэчышчы родавых традыцый Радзівілаў і Хадкевічаў, а таксама ў адпаведнасці з пэўнымі ўхваленымі імі наратыўнымі схемамі ствараўся новы вобраз Глінскага. Асоба Глінскага мусіла быць трывала прывязана да Клецкай бітвы 1506 г. Сам жа вобраз бітвы трэба было яшчэ сканструяваць у адпаведнасці з чаканнямі і патрабаваннямі сучаснікаў. Аповед пра падзеі, што мелі месца ў сапраўднасці, не патрабаваўся, тым больш, што сведак бітвы ўжо не засталося.

Пра тое, што пільная ўвага да Клецкай бітвы і фактычная рэабілітацыя яе героя былі выклікаланы злабадзённымі ваенна-палітычнымі

[40] Finkel L. Elekcya Zygmunta I... S. 245—246.

[41] РИБ. Т. 20. С. 570.

падзеямі, яскрава сведчыць такі палемічны твор, як «Размова паляка з літвінам» (1564 г.), што прыпісваецца пяру віленскага войта Аўгустына Ратундуса. Аўтар згадвае апошнія падзеі на маскоўскім фронце, калі ў 1563 г. з-за безадказнасці многіх магнатаў і вяльможаў быў страчаны Полацк. Такім паводзінам шляхты ў ходзе полацкай кампаніі аўтар супрацьпастаўляе хуткасць і рашучасць, з якімі гаспадарскае войска рушыла на Клецк у 1506 г.: «Kiedy się przed tym nie hetman ale leda który pan litewski dla potrzeby rzeczy pospolitej ruszył, nie czekano listów królewskich, za nim w skok wszyscy, niedługo się burdając ani sejmując, jako się było stało, gdy Tatarzy aż Kłecko byli za Alexandra króla minęli; stanęło tam wnet prceciw Tatarom wojsko wielkie, które się dobrowolnie za Kiszką a Glińskim ruszyło, nie chcąc tych dwu panów i senatorów swych na mięsne, jako mówią, jatki wydać, porazili privatis auspiciis Tatary»[42].

### 3.1.11. Новы вобраз бітвы ў Хроніцы Быхаўца

Інфлянцкая (Лівонская) вайна, у якую ўступіла ВКЛ, не магла не абудзіць цікавасці да вайсковай гісторыі і ратных подзвігаў папярэдніх пакаленняў літвінаў. Страта Полацка ў 1563 г. і пагроза дзяржаўнаму суверэнітэту прымусілі грамадства ВКЛ мабілізаваць усе рэсурсы, у тым ліку і гістарычную памяць, дзеля адпору ворагам. Літва і Русь мелі патрэбу не толькі ў вопытных воінах, але і ў гістарычных героях. Менавіта тады, у сярэдзіне — другой палове 60-х гг. XVI ст., з'яўляецца шэраг гістарычных апавяданняў, прысвечаных бітвам, у якіх брала ўдзел войска ВКЛ. Асаблівую ўвагу іх укладальнікаў прыцягнулі аблога Хойніц у Прусіі ў 1466 г., сілезская выправа караля Казіміра 1474 г., малдаўскі паход караля Яна Ольбрахта 1497 г., бітва на Вядрошы 1500 г., а таксама Клецкая бітва 1506 г. Усе гэтыя і некаторыя іншыя апавяданні ўвайшлі пазней у склад «Хронікі Быхаўца».

Вобраз Клецкай бітвы 1506 г. у версіі «Хронікі Быхаўца» адносіцца да ліку найбольш маляўнічых і яркіх гістарычных апавяданняў ВКЛ гэтага часу[43]. Вобраз бітвы, пададзены ў хроніцы, быў абумоўлены тым гістарычным момантам, які перажывала грамадства ВКЛ. Апавяданне пра бітву пад Клецкам, як, дарэчы, і ўся «Хроніка Быхаўца», нясе выразны адбітак алігархічнай ідэалогіі. Так, арганізацыя адпору крымскаму нападу прыпісваецца выключна панам-радзе ВКЛ: «Korol že buduczy wo welikoy chorobi y ne wedaiuczy,

[42] Rozmowa Polaka z Litwinem. 1564 / Wyd. J. Korzeniowski. Kraków, 1890. S. 34.
[43] ПСРЛ. Т. 32. С. 171—173.

szto poczaty, pryzwal k sobi panow-rad swoich y hetmana swoieho pana Stanislawa Petrowicza Kiszku, y lubimaho swoieho marszalka dwornoho kniazia Michayla Lwowicza Hlinskoho, y wse delo swoje hospodarskoie y sprawu zemskuiu dast w ruki ich, sebe že poweli otnesty na nosilicach do Wilni»[44]. Сярод удзельнікаў бітвы, акрамя вялікага гетмана Станіслава Пятровіча Кішкі і дворнага маршалка Міхаіла Глінскага, згадваюцца амаль выключна магнаты (паны Андрэй і Юрый Неміровічы). Толькі адзін раз хроніка згадвае прадстаўніка сярэдняй ці дробнай шляхты — ахвярнага пісара пана Забярэзінскага Копця. Так «Хроніка Быхаўца» падкрэслівала гегемонію арыстакратыі ВКЛ у палітычным жыцці дзяржавы. Па-другое, Хроніка абараняе дзяржаўны суверэнітэт ВКЛ. Яе ўкладальнікам быў сапраўдны патрыёт Літвы, аматар яе гістарачнага мінулага, якім ён ганарыўся. Па-трэцяе, апавяданне пра Клецкую бітву настойліва падкрэслівае, што ратнікі ВКЛ змагаліся з ворагам, які значна пераўзыходзіў іх у колькасных адносінах. Укладальнік звяртае асаблівую ўвагу на тое, што 10-тысячнаму войску ВКЛ супрацьстаяла 20-тысячнае войска крымскіх царэвічаў[45]. Можна меркаваць, што суадносіны сіл, паказаныя ў аповесці пра Клецкую бітву, адлюстроўвалі рэальнасць бягучага моманту, калі войскам ВКЛ звычайна прыходзілася мець справу з праціўнікам, які меў колькасную перавагу. Напрыклад, у бітве на рацэ Ула пад Чашнікамі 26 студзеня 1564 г. 4-тысячнаму гаспадарскаму войску на чале з вялікім гетманам Мікалаем Радзівілам Рудым і польным гетманам Рыгорам Аляксандравічам Хадкевічам супрацьстаяла больш чым 10-тысячнае маскоўскае войска Пятра Шуйскага і Пятра Сярэбранага-Абаленскага. Тым не менш раптоўны і імклівы ўдар літвінаў па абозе праціўніка завяршыўся яго разгромам[46]. У сувязі з гэтым становіцца зразумелым сэнс паслання аповесці: воіны ВКЛ здольны і павінны перамагаць ворага, які мае над імі колькасную перавагу. Па-чацвёртае, аповесць надае асаблівае значэнне постаці галоўнага военачальніка. Падкрэсліваецца яго ініцыятыўнасць, рашучасць, асабістая мужнасць. Усе гэтыя якасці, якія аповесць прыпісвае князю Міхаілу Глінскаму, былі надзвычай

[44] ПСРЛ. Т. 32. С. 171.

[45] Пачынаючы з сярэдзіны XVI ст. іншыя крыніцы таксама падкрэсліваюць колькасную перавагу татараў падчас набегу 1506 г. Міхалон Літвін пісаў аб 3-разовай перавазе татарскага войска (27 тыс. супраць 9 тыс.). Мацей Стрыйкоўскі, следуючы традыцыі, закладзенай «Хронікай Быхаўца», пісаў пра 20-тысячнае татарскае войска і 10-тысячнае войска ВКЛ. «Хроніка Літоўская і Жамойцкая» паведамляе пра 30-тысячнае татарскае войска, якому супрацьстаяла 10-тысячнае войска ВКЛ.

[46] Podhorodecki L. Dzieje rodu Chodkiewiczów. Warszawa, 1997. S. 103—104.

запатрабаванымі ва ўмовах Інфлянцкай вайны. Пра гэта сведчаць г. зв. «гетманскія артыкулы», якія належалі пяру польнага гетмана ВКЛ Рыгора Хадкевіча. Нарэшце, аповесць пра Клецкую бітву канчаткова рэабілітавала князя Міхаіла, які пасля дзесяцігоддзяў дыскрэдытацыі і замоўчвання ягоных слаўных учынкаў стаў новым культурным героем для маладога пакалення рыцарства ВКЛ.

Аповесць пра бітву пад Клецкам, як, дарэчы, і ўся «Хроніка Быхаўца», была створана, верагодна, на двары польнага (з 1566 г. — вялікага) гетмана ВКЛ Рыгора Аляксандравіча Хадкевіча. Твор мусіў паўстаць у яго маёнтках: Вялікай Бераставіцы або ў Заблудаве на Падляшшы. Дату паўстання аповесці можна вызначыць як 1564—1570 гг., але ніяк не пазней 1572 г.[47], калі пан Рыгор памёр. Непасрэднай падзеяй, якая паўплывала на аповед пра Клецкую бітву, можна лічыць бітву на Уле 1564 г., у якой Рыгор Хадкевіч браў непасрэдны ўдзел. Імклівы ўдар па пазіцыях вялікага маскоўскага войска, разгром абозу праціўніка, хуткае і актыўнае праследаванне адступаючага ворага, багатая здабыча — усё гэта нагадвала пра падзеі амаль 60-гадовай даўніны пад Клецкам. Перамога на Іванскім полі пад Чашнікамі не магла не выклікаць у польнага гетмана гістарычных рэмінісцэнцый.

Рыгор Хадкевіч быў не толькі таленавітым тэарэтыкам і практыкам вайсковай справы, але таксама мецэнатам старабеларускай культуры і абаронцам праваслаўнай веры. Яго двор у Заблудаве з'яўляўся значным асяродкам старабеларускай праваслаўнай культуры. Ён заснаваў тут кірылічную друкарню, у якой намаганнямі Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца ў 1568 і 1569 гг. была выдадзена знакамітая Біблія. Рыгор Хадкевіч меў шырокую выдавецкую праграму, якую, аднак, па прычыне смерці не здолеў ажыццявіць да канца. Ён актыўна выступаў за выкарыстанне сучаснай яму старабеларускай мовы ў пісьмовасці, не толькі свецкай, але і рэлігійнай[48]. Рыгор Хадкевіч быў сапраўдным патрыётам свайго краю і зацята адстойваў суверэнітэт ВКЛ на перагаворах пра унію з польскім бокам.

Рыгор Хадкевіч мог стварыць магчымасці для ўкладання гістарычных твораў на сваім двары. Ён мусіў мець добрую асабістую бібліятэку. У разе патрэбы ён мог карыстацца багатымі зборамі бібліятэкі ў Супраслі. Прадстаўнікі роду Хадкевічаў цікавіліся

[47] Ян Якубоўскі, а ўслед за ім і Ежы Ахманьскі акрэслілі час паўстання Хронікі Быхаўца 1564—1574 гг.: Ochmański J. Nad Kroniką Bychowca // Studia Źródłoznawcze. 1967. T. 12. S. 162.

[48] Щавинская Л., Лабынцев Ю. Литература белорусов Польши (XV—XIX вв.). Минск, 2003. С. 33.

старажытнымі летапісамі і хронікамі. Адміністратар Інфлянтаў Ян Геранімавіч Хадкевіч знайшоў падчас прыняцця ордэнскага замка ў Вендэне «Хроніку Прускай зямлі» Пятра з Дусбурга, якую ён пасля перадаў для карыстання Мацею Стрыйкоўскаму[49]. І самае галоўнае, Рыгор Хадкевіч цікавіўся гісторыяй і меў дорыя веды ў гэтай галіне.

Укладальнік апавядання пра Клецкую бітву 1506 г. у версіі Хронікі Быхаўца мусіў карыстацца як пісьмовымі крыніцамі, так і вуснымі сведчаннямі. У першую чаргу, ён павінен быў абапірацца на Хроніку Марціна Бельскага, якая, у сваю чаргу, грунтуецца на Хроніцы Мацея Мяхоўскага. Аднак укладальнік аповеду падышоў да прац сваіх папярэднікаў асцярожна і нават крытычна. Ён не згадвае эпізод з пасольствам караля і вялікага князя Аляксандра да свайго брата Жыгімонта ў Сілезію, апускае імёны асоб, якія суправаджалі хворага караля з Ліды ў Вільню. У аповедзе адсутнічаюць звесткі пра ўдзел у Клецкай бітве польскай надворнай харугвы на чале з Сяндзівоем Чарнкоўскім. Усё, што было звязана з палякамі ў гэтай бітве і вакол яе, укладальнік старанна апускае. Не згадвае ён тыя моманты, якія маглі б у непрывабным святле прадставіць літоўскую магнатэрыю. Так, ён апускае эпізод, калі літвіны адмаўляюцца выправіцца ў паход, пакуль сам кароль і вялікі князь не стане на чале войска. Няма ў аповедзе і эпізоду са з'яўленнем на каралеўскім двары ў Лідзе параненага ганца з весткай пра нечаканы і раптоўны падыход вялікага татарскага войска. Нарэшце, вяртанне ў Ліду рацаў, якія прывялі з сабой палонных татар, а таксама прынеслі ў кайстрах адсечаныя галовы татарскіх воінаў, выклікае сярод літвінаў не страх, як гэта адзначаецца ў польскіх аўтараў, а радасць і вяселле: «syia widywsze panowe weselilisia y radosty napolnilisia, y toho czasu sami wseli na koni, y wsemu woysku kazali poyty z soboiu k Nowohurodku»[50].

Укладальніка аповеду пра Клецкую бітву не задавальнялі версіі польскіх аўтараў, і не толькі з ідэалагічнага пункту гледжання. Само апісанне падзеі магло падацца яму вельмі сціслым і агульным. Патрэбна было стварыць такі твор, які б прыйшоўся даспадобы ўсяму шляхецкаму саслоўю ВКЛ, ад магнатэрыі да дробнай шляхты. Твор павінен быў быць па-мастацку яркім, вобразным і захапляльным. І галоўнае, твор павінен быў быць напісаны не на лацінскай,

[49] Семянчук А. Удзел Мацея Стрыйкоўскага ў Інфлянцкай вайне // Castrum, urbis et bellum. Баранавічы, 2002. С. 347.

[50] ПСРЛ. Т. 32. С. 171—172.

польскай ці нават царкоўнаславянскай мове, а на жывой старабеларускай мове, якой стала карыстаўся ў штодзённым ужытку сам Рыгор Хадкевіч. Аповед павінен быў з'явіцца на мове, зразумелай усёй шляхце ВКЛ. Дзеля стварэння такога твора патрэбна было выкарыстаць не толькі наяўныя пісьмовыя крыніцы.

Таму, ствараючы ўласную версіі бітвы пад Клецкам 1506 г., укладальнік мусіў абапірацца на вусныя сведчанні. Думаецца, што такой крыніцай маглі служыць успаміны бацькі Рыгора, Аляксандра Іванавіча. Сын Івана Хадкевіча і Яўнуты Бельскай, Аляксандр з'явіўся на свет у 1457 г.[51]. Аляксандр Хадкевіч з уласнага досведу ведаў, што ўяўлялі сабой татарскія напады на землі ВКЛ. У 1482 г. ён разам з бацькам, тагачасным кіеўскім ваяводам, маці, сястрой Аграфенай быў выведзены ў татарскі палон. У крымскай няволі неўзабаве памёр яго бацька, аднак самога Аляксандра разам з маці і сястрой выкупіў кароль і вялікі князь Казімір Ягайлавіч[52]. Аляксандр Хадкевіч быў сучаснікам усіх тых падзей, якія апісваюцца ў апошняй частцы «Хронікі Быхаўца», пачынаючы ад II Прускай вайны (1454—1466 гг.), у якой яго бацька Іван мусіў камандаваць дапаможным аддзелам ВКЛ у часе аблогі Хойніц 1466 г., і заканчваючы Клецкай бітвай 1506 г. Аляксандр Хадкевіч пачаў службу ў 1495 г. на двары вялікага князя Аляксандра. У 1502 г. ен стаў велікакняскім канюшым, а перад Клецкай бітвай, у маі 1506 г., атрымаў пасаду маршалка. У тым жа 1506 г. кароль Аляксандр надаў яму шэраг уладанняў пад Жалудком каля Ліды, якія мусілі адчуць цяжар татарскага набегу 1506 г. Аляксандр Хадкевіч, хіба што, не браў удзел у Клецкай бітве, застаючыся пры хворым каралю і вялікім князю спачатку ў Лідзе, а пасля ў Вільні. Аднак ён мусіў чуць пра бітву з вуснаў непасрэдных удзельнікаў і, у першую чаргу, ад самога князя Міхаіла Львовіча Глінскага. Як маршалак, Аляксандр Хадкевіч падпарадкоўваўся непасрэдна Глінскаму, які з'яўляўся дворным маршалкам. Паміж двума ўраднікамі мусілі ўсталявацца прыязныя і даверлівыя адносіны, бо пасля бунту Глінскага ў 1508 г. Аляксандр Хадкевіч нават абвінавачваўся ў падтрымцы мяцежніка і правёў два гады ў зняволенні. Толькі ў канцы свайго жыцця, у 1544 г., ва ўзросце 87 гадоў (!) пан Аляксандр здолеў дасягнуць кар'ернай вяршыні — пасады навагародскага ваяводы. Ён памёр у 1549 г. ва ўзросце 92 гадоў. Аляксандр Хадкевіч быў, несумненна, вельмі набожным чалавекам. У 1500 г. на беразе ракі Супраслі ён фундаваў аднайменны манастыр, якому было наканавана адыграць выключную ролю ў рэлігійным

---

[51] Podhorodecki L. Dzieje rodu Chodkiewiczów. S. 12—19.

[52] Jasnowski J. Chodkiewicz Iwan // PSB. T. 3. S. 361.

і культурным жыцці ВКЛ і Польшчы[53]. Лічыцца, што першыя манахі прыйшлі ў Супрасль з Кіева-Пячэрскага манастыра. Свайго сына Рыгора пан Аляксандр таксама выхаваў надзвычай рэлігійным і адданым праваслаўю. Рыгор Хадкевіч мусіў атрымаць добрую хатнюю адукацыю. Важную ролю ў яго выхаванні адыгралі размовы з бацькам, за плячыма якога быў багаты вопыт. Несумненна, Аляксандр Іванавіч Хадкевіч дзяліўся са сваім сынам Рыгорам уласнымі ўспамінамі. Не выключана, што ў часе размоў з сынам бацька мог распавесці пра Клецкую бітву, сучаснікам якой ён з'яўляўся. Падчас укладання аповеду пра бітву сведчанні бацькі Рыгора Аляксандравіча павінны былі стаць важнай крыніцай.

Магчыма, нейкія звесткі пра набегі татараў на Панямонне Аляксандр Хадкевіч атрымаў ад паноў Неміровічаў, буйных землеўласнікаў у Новагародскім ваяводстве, дзе таксама мелі асобныя ўладанні Хадкевічы. З цягам часу многае з гэтых успамінаў забылася. З памяці зніклі яркія дэталі, звязаныя з бітвай, парушылася храналогія (Хроніка Быхаўца датуе бітву 6 жніўня 1507 г.), з'явілася пэўная блытаніна ў лакалізацыі бітвы.

Роднасныя сувязі трывала злучылі пана Аляксандра і яго нашчадкаў з Клецкай зямлёй. Сам ён быў жанаты на Васілісе, дачцэ клецкага князя Івана Васілевіча Яраславіча. Шлюб адбыўся недзе паміж 1509 і 1513 гг. Княгіня Васіліса Іванаўна памерла ў 1552 г. і была пахавана ў Супрасльскім манастыры. Несумненна, Аляксандр Іванавіч і Рыгор Аляксандравіч Хадкевічы па доўгу службы і асабістых пытаннях мусілі неаднаразова наведваць Клецк, дзе не маглі не агледзець поле слаўнай бітвы з татарамі, паслухаць аповеды сучаснікаў падзеі. Сам ландшафт Новагародскага ваяводства і ваколіц Клецка мог паслужыць крыніцай для рэканструкцыі вобраза бітвы. Несумненна, што ўкладальнік імкнуўся прывязаць бітву да канкрэтнага месца-топаса. Першаснымі апорнымі тапаграфічнымі пунктамі для яго з'яўляліся рака Лань і невялікі стаў, які ў першай палове XVI ст. называўся Красны, сама назва якога падказвала, што недзе паблізу магла адбыцца бітва з татарамі. Лагічным выглядала і імкненне ўкладальніка лакалізаваць бітву каля пагорка, дарэчы, безназоўнага, на якім павінен быў размясціцца лагер Глінскага перад рашаючым змаганнем з ворагам. Увогуле, тапаграфічныя звесткі, якія падае ўкладальнік, надзычай скупыя; у аповесці бітва разгортваецца ў прасторы паміж рэкамі Лань і Цапра. Сам укладальнік мусіў

[53] Щавинская Л., Лабынцев Ю. Литература белорусов Польши… С. 11.

паходзіць з двара Рыгора Хадкевіча. Ён быў праваслаўным і, адначасова, свецкім чалавекам, меў пэўны літаратурны талент і добрую фантазію.

Вобраз бітвы, пададзены ў «Хроніцы Быхаўца», вызначаўся не толькі патрабаваннямі сучаснага моманту, але таксама роднаснымі, прыяцельскімі і зямляцкімі сувязямі Хадкевічаў, а таксама бачаннем гістарычнага мінулага Бацькаўшчыны гетманам Рыгорам Хадкевічам. Дзякуючы літаратурнаму таленту ўкладальніка, а таксама палітычнаму ўплыву роду Хадкевічаў, вобраз Клецкай бітвы ў версіі «Хронікі Быхаўца» ледзь не адразу стаў дамінуючым у гістарычнай памяці ВКЛ, паступова выціскаючы ўсе астатнія версіі падзеі. На яго мусілі абапірацца ўсе сучасныя аўтары, якія пісалі пра Клецкую бітву, уключаючы Стрыйкоўскага, Гваньіні і інш. Паступова з Клецкай бітвы ствараецца легенда, а памяць пра яе становіцца міфам рыцарства ВКЛ. Шляхта атрымала новых герояў (гаспадарскага канюшага Юрыя Вала, князя Міхаіла Глінскага і інш.), якія павінны былі стаць прыкладам для пераймання. Памяць пра Клецкую бітву, як і іншыя бітвы з удзелам рыцарства ВКЛ (неабавязкова пераможныя), складала аснову гістарычнай самасвядомасці гэтага саслоўя, ствараючы яго калектыўную ідэнтычнасць. Ва ўмовах ледзь не перманентных войнаў ВКЛ (пазней Рэчы Паспалітай) у другой палове XVI ст. памяць пра Клецкую вікторыю мусіла быць запатрабаванай, натхняць на новыя ўчынкі і суцяшаць у выпадку паражэнняў.

### 3.1.12. Мацей Стрыйкоўскі

З дваром Хадкевічаў на Падляшшы быў звязаны і першы этап дзейнасці польскага храніста Мацея Стрыйкоўскага. Тут ён атрымаў надзвычай цёплы прыём, тут яму былі створаны спрыяльныя ўмовы для працы. Хадкевічы прадаставілі ў распараджэнне Стрыйкоўскага свае багатыя зборы, а таксама забяспечвалі яго ў разе патрэбы новымі крыніцамі. Пра перадачу Хадкевічамі Стрыйкоўскаму «Прускай хронікі» Пятра з Дусбурга ўжо гаварылася. Асабліва цесныя сувязі завязаліся ў Мацея Стрыйкоўскага са старэйшым сынам Рыгора Хадкевіча Аляксандрам, гарадзенскім і магілёўскім старостам. У рэзідэнцыі апошняга ў Гарадку (Грудэку) Стрыйкоўскі пачаў пісаць сваю слынную «Хроніку Польшчы, Літвы і Русі».

Сярод разнастайных падзей мінуўшчыны ў Хроніцы Стрыйкоўскага асабліва значэнне надаецца бітвам. Кароткі аповед пра тую ці іншую бітву (клецкія падзеі 1506 г. не з'яўляюцца выключэннем)

звычайна суправаджаецца вершаваным вопісам. Аднак ва ўяўленні аўтара існавала пэўная градацыя бітваў. У свядомасці Стрыйкоўскага, напрыклад, бітва пад Грунвальдам 1410 г., памяць пра якую захавалася толькі ў пісьмовых крыніцах, мусіла адрозніваацца ад бітваў пад Клецкам 1506 г. або Оршай 1514 г. , пра якія захаваліся сведчанні сучаснікаў. Ён здаваў сабе справу, што знаходзіцца на крайняй мяжы, за якой знікаюць нават ускосныя сведчанні пра апошнія падзеі. Адсюль тая стараннасць, з якой храніст збіраў звесткі пра падзеі, якія яшчэ адносіліся да сучаснасці.

Пры апісанні бітвы пад Клецкам 1506 г. Мацей Стрыйкоўскі карыстаўся рознымі тыпамі крыніц. Сярод пісьмовых сведчанняў трэба назваць хронікі польскіх аўтараў, у першую чаргу Мяхоўскага, Вапоўскага і Кромера. Стрыйкоўскі абапіраўся таксама на літоўска-рускія летапісы. Пад літоўскімі летапісамі, якія неаднаразова згадвае ў сваім творы Стрыйкоўскі, неабходна разумець пашыраныя рэдакцыі летапісаў ВКЛ кшталту Хронікі Быхаўца. Гэтыя творы былі ласкава прадастаўлены польскаму храністу для азнаямлення князем Заслаўскім у Вялікай Бераставіцы і панам Аляксандрам Хадкевічам у Гарадку[54].

Мацей Стрыйкоўскі карыстаўся таксама вуснымі сведчаннямі, а таксама ўласнымі назіраннямі. У адрозненне ад папярэднікаў, якія пісалі пра бітву, ён меў мажлівасць наведаць мясціны, звязаныя з гэтай славутай падзеяй, аб чым і згадаў у сваёй Хроніцы. Стрыйкоўскі наведаў Клецк каля 1578 г. , калі знаходзіўся на двары слуцкага князя Юрыя Юр'евіча Алелькавіча, які пасля смерці Аляксандра Хадкевіча стаў яго новым мецэнатам і спонсарам. Польскі храніст адзначае, што падчас вандровак па ваколіцах Клецка яму неаднаразова трапляліся матэрыяльныя сведчанні бітвы: амаль згнілыя панцыры, стрэлы, дзіды, шаблі і інш.:

*I dziś w tych com sam widział pługiem ostrym polach,*
*Oracz krzywy najduje znaki jawne w rolach,*
*Wyorywa pancerze i strzały zbotwiałe,*
*Kopije, szable, słyki, dawnością zbotwiałe*[55].

Тады ж, у часе вандроўкі ў Клецк, Мацей Стрыйкоўскі мог пачуць вусныя ўспаміны пра бітву. Невядома толькі, у якой меры ён выкарыстаў іх у сваім творы. Як вынікае з Хронікі, Стрыйкоўскі

---

[54] Улащик Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. Москва, 1985. С. 87.

[55] Stryjkowski M. Kronika polska, litewska, żmodzka i wszystkiej Rusi. T. 2. Warszawa, 1846. S. 336. Несумненна, гэтае апісанне мае гіпербалізаваны і агульны характар.

мусіў добра ведаць прастору бітвы; ён няблага арыентаваўся ў тапаграфіі Клеччыны.

Вершаваная паэма «Бітва з татарамі пад Клецкам» мае выключныя рысы твора эпохі Рэнесансу. Ужо сам пачатак паэмы адсылае да антычнасці, старажытных часоў:

*Tak gdy okrutnym Marsem pogaństwo burzyło,*
*I z chromonogim wlości Wulkanem kurzyło,*
*Stwożylby się i Jowis, jak olbrzymskich czassów,*
*Gdy do Egipskich pierzchał z swym senatem lassów*[56].

Асноўную ўвагу Мацей Стрыйкоўскі засяроджвае на чалавечых постацях. Галоўным героем паэмы з'яўляецца, безумоўна, князь Міхаіл Львовіч Глінскі. Адразу за кароткім уступам Стрыйкоўскі пераходзіць да асобы князя:

*Lecz Michał Gliński w sprawach rycerskich mąz sprawny,*
*Widząc upadek tuż być Litwy wszytkiej jawny,*
*Dziesięć tysięcy Litwy z Russaki zszykował,*
*A z nimi się pod Klecko co rychlej gotował*[57].

Стрыйкоўскі надзяляе постаць князя рысамі антычнага героя. Аўтар адзначае яго арганізатарскі талент, розум, мужнасць у баі, ваенную хітрасць, патрыятызм. У паэме вобраз князя Міхаіла ўзвышаецца над усімі астатнімі ўдзельнікамі бітвы. Стрыйкоўскі падкрэслівае, што дзякуючы перамозе пад Клецкам Глінскі на вякі праславіў сваё імя. Дзякуючы перамозе ён знайшоў мноства прыхільнікаў сярод жыхароў ВКЛ і іншаземцаў, у тым ліку выхадцаў з Польскай Кароны.

Акрамя асобы Міхаіла Глінскага ў паэме не бракуе іншых герояў меншага маштабу. Стрыйкоўскі асабліва адзначыў аркебузніка Рачка і ананімнага маршалка канцлера Радзівіла, якія дзякуючы сваёй трапнай стральбе нанеслі значны ўрон татарам і забяспечылі пераправу гаспадарскага войска праз раку:

*Lecz Raczko większy odniosł dank z rusznicą swoją,*
*I Radziwilów marszałek takież strzelbą dwoją,*
*Dwa tylko ze dwu ruśnic tatar nazad wsparli,*
*A nam zaś tysiąc dział za to ciż wydarli*[58].

---

[56] Stryjkowski M. Kronika… T. 2. S. 333.

[57] Тамсама. S. 333.

[58] Тамсама. S. 337.

Гэты эпізод можа сведчыць пра падтрымку, якую Стрыйкоўскаму аказалі Радзівілы, у першую чаргу віленскі ваявода Мікалай Радзівіл Руды. За дапамогу ў напісанні Хронікі Стрыйкоўскі падзякаваў роду Радзівілаў вершаванымі радкамі. Дзякуючы Хроніцы паступова склалася легенда пра адметную ролю аднаго з Радзівілаў у бітве. У гонар падзеі Мікалай Радзівіл, віленскі ваявода і канцлер ВКЛ, збудаваў храм Св. Юрыя каля свайго палаца ў Вільні.

Не забывае Мацей Стрыйкоўскі і польскую надворную харугву на чале з сынам пазнанскага ваяводы Сяндзівоем Чарнкоўскім, якая адным толькі сваім выглядам здэмаралізавала татараў. Чарнкоўскія адносіліся да ліку слынных магнацкіх родаў Вялікай Польшчы. Гняздом роду, што належаў да герба «Наленч», з'яўляўся Чарнкаў. На працягу стагоддзяў прадстаўнікі роду адыгрывалі важную ролю ў грамадскім і палітычным жыцці Вялікай Польшчы. Бацька Сяндзівоя Чарнкоўскага, Ян Сяндзівой, быў сынам ґнезненскага кашталяна Яна і Ядвігі Тэнчынскай. Ян Сяндзівой Чарнкоўскі чатыры разы браў шлюб. Першы шлюб з невядомай дачкой кракаўскага ваяводы Яна Тэнчынскага не прынёс нашчадкаў. Ад другога шлюбу з дачкой пазнанскага падкаморыя Сцібара з Понеца Зоф'яй нарадзіліся сыны Ян і Мікалай, а таксама дачка Ганна. Сяндзівой паходзіў ад трэцяга шлюбу Яна Сяндзівоя з нейкай Дарохнай. Ад гэтага шлюбу нарадзіліся таксама сын Мацей і дачка Катарына. У чацвёртым шлюбе, які Ян Сяндзівой Чарнкоўскі ўзяў у 1496 г. з Катарынай Крэткоўскай, ён, верагодна, не меў дзяцей[59]. Сяндзівой Чарнкоўскі займаў пасаду пшэменцкага кашталяна. Ад шлюбу з дачкой серадзкага ваяводы Амброзія Пампоўскага Барбарай ён меў чатырох сыноў: Яна, Жыгімонта (Зыгмунта), Станіслава Сяндзівоя і Войцеха Сяндзівоя[60].

Як выхадзец з Вялікай Польшчы, Мацей Стрыйкоўскі быў добра знаёмы з многімі прадстаўнікамі дому Чарнкоўскіх. Сучаснікамі польскага храніста былі пазнанскі біскуп Андрэй, пазнанскі кашталян Пётр, рагозінскі кашталян Войцех, а таксама Станіслаў, які быў старостам у велікапольскім Клецку[61]. Усе яны былі сынамі быдгаскага кашталяна Мацея, роднага брата Сяндзівоя. Актыўны ўдзел у грамадскім і палітычным жыцці бралі таксама іх стрыечныя браты, сыны Сяндзівоя Чарнкоўскага: велікапольскі

[59] Kaczmarczyk K. Czarnkowski (z Czarnkowa) Sędziwój h. Nałęcz // PSB. T. 4. S. 219—221.

[60] Lepszy K. Czarnkowski Stanisław Sędziwój h. Nałęcz // PSB. T. 4. S. 221.

[61] Herbarz polski Kaspra Niesieckiego. Wyd. J. Bobrowicz. T. 3. Lipsk, 1839. S. 212—214.

староста-генерал Войцех Сяндзівой і каронны рэферэндар Станіслаў Сяндзівой[62].

Праўдападобна, што Мацея Стрыйкоўскага з домам Чарнкоўскіх лучылі цесныя сувязі. Уплывовы Станіслаў Сяндзівой мог выступаць у якасці заступніка польскага храніста. Не выключана, што Мацей Стрыйкоўскі быў добра знаёмы і з сынам Войцеха Сяндзівоя Адамам Сяндзівоем, пазнейшым ленчыцкім ваяводам, які ў маладыя гады браў удзел у маскоўскай вайне, за што быў шчодра ўзнагароджаны Стафанам Баторыем[63]. Мацей Стрыйкоўскі не толькі добра ведаў сучасных яму прадстаўнікоў роду Чарнкоўскіх, але быў пароднены з апошнімі. Сын рагозінскага старосты Войцеха Пётр быў жанаты з Даротай Стрыйкоўскай[64].

Удзел Чарнкоўскіх у лёсе Мацея Стрыйкоўскага не мог не аказаць уплыў на змест аповесці пра Клецкую бітву. Прысутнасць аднаго з продкаў роду на старонках аповесці прадвызначыў той факт, што многія яго пакаленні з'яўляліся дзяржаўцамі велікапольскага Клецка. Велікапольскім клецкім старостам быў бацька Сяндзівоя Ян Сяндзівой[65]. Клецкай дзяржавай валодаў сын Сяндзівоя Ян[66].

Знаходзячыся ў літоўскім Клецку, Стрыйкоўскі не мог не чуць пра аднаго з самых багатых мясцовых землеўласнікаў — Валентыя Чарнкоўскага. Апошні не належаў да графскага роду Чарнкоўскіх, але мусіў паходзіць са шляхецкай сям'і, што жыла, праўдападобна, у ваколіцах Чарнкава, ад назвы якога магла ўзяць прозвішча. Валенты Чарнкоўскі асеў у Клецку яшчэ ў часы князёў Яраславічаў — не пазней 1521 г. Яго ўладанні знаходзіліся пераважна ў паўночна-заходняй частцы Клецкага княства, непадалёк ад Ляхавіцкай дзяржавы. У часе побыту Стрыйкоўскага ў Клецку яму было больш за 70 гадоў. Памёр Валенты Чарнкоўскі ў 1590 г.[67].

Несумненна, Мацей Стрыйкоўскі павінен быў звярнуць увагу на факт існавання ў Рэчы Паспалітай двух мястэчак з аднолькавай назвай Клецк, у ваколіцах якіх у другой палове XVI ст. пражывалі роды

[62] Dembińska H. Czarnkowski Wojciech Sędziwój h. Nałęcz // PSB. T. 4. S. 225.

[63] Dobrowolska W. Czarnkowski z Czarnkowa, Adam Sędziwój h. Nałęcz // PSB. T. 4. S. 214—215.

[64] Herbarz polski Kaspra Niesieckiego. T. 3. S. 212—214.

[65] Kaczmarczyk K. Czarnkowski (z Czarnkowa) Sędziwój... S. 220.

[66] Herbarz polski Kaspra Niesieckiego. T. 3. S. 212—214.

[67] Смерць Валентыя Чарнкоўскага занатаваў у сваім дыярыушы ляхавіцкі шляхціц Фёдар Еўлашоўскі: «Октобра 31, року 90 умарл сусед и приятель мой, чловек барзо добрый (Beatus Vir), пан Валентый Чарковский» (Старажытная беларуская літаратура: зборнік / Уклад. Л. С. Курбека. Мінск, 1990. С. 253).

з аднолькавым прозвішчам. Гэта акалічнасць паслужыла для Стрыйкоўскага падставай звязаць Клецкую бітву 1506 г. з велікапольскімі Чарнкоўскімі. Адным з галоўных герояў аповесці пра бітву становіцца Сяндзівой Чарнкоўскі, бацька Яна, Жыгімонта, Станіслава і Войцеха, якія бралі чынны ўдзел у лёсе Стрыйкоўскага. Гэта была свайго роду падзяка за спрыянне і дапамогу, якую аказалі храністу прадстаўнікі гэтага велікапольскага роду.

У праследаванні ўцякаючых татараў чынны ўдзел брала слуцкая княгіня, славутая бабка Юрыя Юр'евіча Алелькавіча, спонсара і мецэната Стрыйкоўскага:

*Nastassia też xiężna Slucka, swych bojarów,*
*Rozeslała przejmować pierzchliwych Tatarów,*
*Tak, iż ich pod Kopylem bardzo wiele zbito,*
*I u Piotrowicz gardłem zapłacili myto*[68].

Тут Стрыйкоўскі прычыніўся да з'яўлення легенды пра княгіню Настассю як змагарку за сваю Айчыну супраць татарскіх набегаў. Сённяшні вобраз княгіні як жанчыны-воіна, адлюстраваны ў тым ліку ў фільме «Анастасія Слуцкая», бярэ пачатак ад Стрыйкоўскага. У Хроніцы Быхаўца ён адсутнічае. Звесткі Хронікі Быхаўца пра пераймание татараў пад Слуцкам, Петрыкавічамі, Оўручам і інш. Стрыйкоўскі персаналізаваў, асабліва адзначыўшы ролю бабкі князя Юрыя Юр'евіча ў арганізацыі пагоні за рэштками разбітага татарскага войска.

### 3.1.13. Аляксандр Гваньіні

Мацей Стрыйкоўскі служыў падчас Інфлянцкай вайны ў Віцебску пад камандаваннем ротмістра Аляксандра Гваньіні (Гвагніна), ураджэнца Вероны і былога грамадзяніна Венецыянскай рэспублікі. У 1578 г. у Кракаве пад прозвішчам апошняга з'явілася лацінамоўная праца «Sarmatiae Europae Descriptio» («Апісанне еўрапейскай Сарматыі»). Твор утрымліваў багатыя звесткі па гісторыі і геаграфіі Польшчы, Літвы, Русі, Прусіі, Інфлянтаў, Масковіі і Татарыі. Храналагічна ён ахопліваў перыяд да пачатку панавання Генрыка Валуа (Валежага) у 1574 г.[69]. Стрыйкоўскі неаднаразова абвінавачваў Гваньіні ў тым, што той быццам бы скраў у яго «Sarmatiae Europae Descriptio» і потым выдаў як уласны твор. Спрэчка атрымала шырокі розгалас

[68] Stryjkowski M. Kronika… T. 2. S. 337.
[69] Budka W. Gwagnin Aleksander // PSB. T. 9. S. 203.

і была нават вынесена на разгляд самога Стафана Баторыя, які сваім прывілеем 1580 г. пацвердзіў аўтарства Стрыйкоўскага. Нягледзячы на гэты вердыкт, Гваньіні ў 1611 г. (пасля смерці Баторыя) выдаў значна пашыраную версію «Sarmatiae» ў перакладзе на польскую мову Марціна Пашкоўскага. Дарэчы, апошні сцвярджаў, што польскамоўныя дадаткі да твора належаць менавіта яму, а не Гваньіні[70].

Не ўдаючыся ў праблему аўтарства «Sarmatiae», адзначым толькі, што апісанне Клецкай бітвы ў Гваньіні істотна адрозніваецца ад вобраза бітвы ў хроніцы Стрыйкоўскага. Апісанне Клецкай бітвы ў польскамоўнай версіі «Sarmatiae» моцна залежыць ад тэксту Марціна Бельскага, а ў некаторых месцах літаральна паўтарае яго[71]. Так што, апісанне бітвы ў творы, які прыпісваецца Гваньіні, не вылучаецца арыгінальнасцю.

### 3.1.14. Віюк-Войцех Каяловіч

У сваёй «Гісторыі Літвы» пры апавяданні пра Клецкую бітву 1506 г. Віюк-Войцех Каяловіч (1609—1667 гг.) таксама абапіраўся на творы Стрыйкоўскага. Другая частка твора, у якой прадстаўлена бітва, пабачыла свет у 1669 г. у Антверпене (першая частка выйшла ў 1650 г. у Гданьску). Аднак Каяловіч не следаваў літаральна за Стрыйкоўскім і дадаў некалькі ўласных характарыстык да вобраза бітвы ў працы папярэдніка. Так, Каяловіч адзначаў, што суседняя сажалка, вада ў якой з-за крыві загінуўшых стала чырвонай, атрымала пазней назву Ружовы Стаў («Stagnum propinquum, quia ex influente cruore totum plane rubuerat, nunc etiam rosei stagni nomen retinet»)[72]. Гэта паданне Каяловіч мог чуць, калі вучыўся ў Нясвіжы ў 1629—1632 гг.[73]. У гады навучання або падчас сваіх вандровак па ВКЛ ён мог наведаць Клецк, тым больш, што сам горад у першай палове XVII ст. перажываў перыяд бурнага росту. Відавочна, Каяловіч, будучы ў Клецку, не мог не наведаць мясцовы замак, рэзідэнцыю Радзівілаў. Яго як гісторыка павінны былі цікавіць падзеі мінулага краю, у першую чаргу, бітва з татарамі 1506 г. Ён мог пачуць ад мясцовых жыхароў легенду, звязаную з назвай вадаёма. Першая палова XVII ст., такім чынам, пачатак міфалагізацыі самой бітвы. Народная памяць, спрабуючы вытлумачыць паходжанне

[70] Семянчук А. Удзел Мацея Стрыйкоўскага ў Інфлянцкай вайне. С. 345—346.

[71] Gwagnin Aleksander. Kronika Sarmacyey Europskiey. Kraków, 1611. S. 72—73.

[72] Kojalowicz Wijuk A. Historiae Lituanae, a conjunctione Magni Ducatus cum Regno Poloniae ad Unionem eorum Dominiorum. Antverpiae, 1669. P. 314.

[73] Dworzaczek W. Kojałowicz Wijuk Wojciech // PSB. T. 13. S. 270.

назвы Красны (Ружовы) Стаў, вымушаная была звярнуцца да падзей далёкай мінуўшчыны. Аднак памяць жыхароў горада наўрад ці сягала далей 100-гадовага адрэзка часу. Тое, што яшчэ захавалася ў памяці, — цьмяныя ўспаміны пра крывавую бітву з татарамі, якая адбывалася ў ваколіцах горада вельмі даўно. Паколькі яна тапаграфічна прывязвалася да Краснага Става, жыхары сталі тлумачыць паходжанне назвы чырвоным колерам крыві, якой напоўнілася сажалка ў ходзе бою з татарамі.

## 3.2. Трыумфатар Клецкай бітвы Міхаіл Глінскі вачыма сучаснікаў

### 3.2.1. Працэс стварэння «чорнай легенды» Глінскага: прычыны і абставіны

Мяцеж Міхаіла Глінскага 1508 г., забойства Яна Забярэзінскага, уцёкі да ворага Ягайлавічаў Васіля III і здабыча на карысць апошняга Смаленска адмоўна паўплывалі на імідж былога фаварыта Аляксандра Казіміравіча. Неўзабаве пасля ад'езду Глінскіх у Масковію пачала стварацца «чорная легенда» Міхаіла Глінскага, які абвінавачваўся ва ўсіх бедах, што напаткалі ВКЛ. Працэс ачарнення Глінскага пачаў яго былы прыяцель, а пазней кароль і вялікі князь літоўскі Жыгімонт Стары. У лісце да крымскага хана Менглі-Гірэя ён называў Глінскага не інакш як «лихий чоловекъ», «злыи чоловекъ», абвінавачваючы яго ў змове з ворагам Крыма заволжскім ханам Шах-Ахматам[74]. Віна за дрэнныя адносіны паміж Аляксандрам Казіміравічам і вялікім князем маскоўскім Іванам III таксама цалкам ускладалася на асобу Глінскага[75]. Глінскі абвінавачваўся ў смерці Аляксандра Казіміравіча, прычым, з выкарыстаннем сродкаў чарадзейства і магіі. У лісце да вялікага князя маскоўскага Васіля III Жыгімонт пісаў, што «...тот зърадца нашъ Глинскии брата нашого, зятя вашого Александра короля, с того света своими чары сослал»[76]. Адначасова ў адрас мяцежнага князя прагучалі абвінавачанні ў спробе захапіць уладу ў ВКЛ пасля смерці Аляксандра: «што тот злыи чоловекъ, зрядца нашъ Глински, запамятавъши ласки нашое, господаря своего, тотъ выступъ противъку намъ вчинилъ и тое дело, которое давно въ серцы своемъ мел, тыми разы деломъ хотел пополнити, а намъ

[74] LM. Užrašymų knyga 8. P. 101—103.

[75] Тамсама. P. 106.

[76] Тамсама. P. 106.

то гораздо было зведомо, иж он отчину нашу Великое Князство Литовъское по смерти брата нашого без бытности нашое, первеи нижли есмо з нашого господаръства приехали, хотел, подступивъши под нами, посести»[77]. У лісце да крымскага хана Жыгімонт Стары высунуў уласную версію забойства Глінскім свайго апанента Яна Забярэзінскага. Аказваецца, Забярэзінскі, будучы ў курсе намераў Глінскага захапіць дзяржаўную ўладу, папярэдзіў пра яго планы іншых радных паноў, за што і быў забіты людзьмі Глінскага. Нарэшце, князь Міхаіл абвінавачваўся ў знявазе асобы вялікай княгіні Алены Іванаўны, удавы Аляксандра Казіміравіча[78].

Адначасова з абвінавачаннямі Жыгімонт Стары агучыў версію пра нізкае паходжанне князёў Глінскіх. У лісце да Менглі-Гірэя ад 31 ліпеня 1508 г. гаспадар пісаў: «А што пишешъ, иж такова иного в Литве, каковъ Глинскии, нетъ, ино не толко Литовскои земли, але и в Орде многимъ зведомо, штож и отцы Глинских, и братя их, передъ тымъ и до сих часовъ в слугъ наших служили и теперо служать, а Глинскии не по отецству славен был, але ласкою брата нашого, и велико собе тую речъ отежаютъ князи и Панове Рада наша, которых жо роды на весь светъ славны, в которых и тепер Глинского братья и дяди служатъ, а у вашом листе то стоитъ, ижбы в Литве такова, каковъ Глинскии, нетъ»[79].

Кампанія па дыскрэдытацыі Глінскіх і персанальна князя Міхаіла суправаджалася акцыяй па канфіскацыі іх маёмасці. Неабходнасць гэтай акцыі Жыгімонт Стары абгрунтоўваў тым фактам, што Міхаіл Глінскі «тые именя… он был при брате нашомъ Александре, короли, своволне забрал...»[80]. Колішнія землі Глінскіх перайшлі да верных Жыгімонту асоб. У ліку тых, хто матэрыяльна выйграў ад канфіскацыі маёмасці Глінскіх, былі вялікі гетман князь Канстанцін Астрожскі і гаспадарскі пісар Богуш Багавіцінавіч. Але Жыгімонт і радныя паны не задаволіліся адной толькі канфіскацыяй. Былі знішчаны многія прывілеі на валоданне гарадамі і землямі, якія Глінскія, і ў першую чаргу князь Міхаіл, атрымалі ад Аляксандра Казіміравіча.

Кампанія па дыскрэдытацыі Глінскага суправаджалася гучнымі арыштамі. Па падазрэнні ў спрыянні і нават ва ўдзеле ў мяцяжы

[77] LM. Užrašymų knyga 8. P. 103—104.

[78] Тамсама. P. 106.

[79] Тамсама. P. 112.

[80] Тамсама. P. 104.

Глінскіх былі арыштаваныя многія дзяржаўныя саноўнікі. У іх ліку былі блізкія сваякі Глінскіх. Быў арыштаваны швагер Міхаіла Глінскага гаспадарскі канюшы Марцін Храптовіч. Пасля вызвалення ў 1511 г. ён ужо ніколі не здолеў аднавіць страчаныя пазіцыі. Ян Літавор Храптовіч, які вярнуўся з маскоўскага палону, ужо так і не зрабіў бліскучай кар'еры[81]. Ён атрымаў толькі пасаду гаспадарскага маршалка і старосты драгічынскага.

### 3.2.2. Адмоўны вобраз Міхаіла Глінскага ў палітычнай публіцыстыцы ВКЛ першай паловы XVI ст.

Абвінавачанні ў спрыянні Глінскім і дзяржаўнай здрадзе сталі моцным аргументам пры высвятленні адносінаў паміж асобнымі раднымі панамі ВКЛ. Асабісты канфлікт паміж маладымі вяльможамі, Мікалаем Мікалаевічам Радзівілам і Альбрэхтам Марцінавічам Гаштаўтам, у 1509 г. прывёў да абвінавачання прыхільнікаў апошняга ў дзяржаўнай здрадзе і ўдзеле ў бунце Глінскага. Альбрэхт Гаштаўт быў нават пазбаўлены ўсіх пасад і правёў больш года ў зняволенні. Аднак Гаштаўт здолеў апраўдацца перад гаспадарскім судом і пасля зрабіў бліскучую палітычную кар'еру. У 1513 г. ён быў прызначаны полацкім ваяводам, а ў 1522 г., пасля таго як атрымаў пасаду віленскага ваяводы і канцлерства, стаў першым свецкім ураднікам у дзяржаве.

Эпізод з абвінавачваннем у дзяржаўнай здрадзе і спрыянні бунту не даваў у далейшым спакою самаму магутнаму вяльможу ВКЛ. Яшчэ ў 1525 г. у лісце да каралевы Боны Сфорца Альбрэхт Гаштаўт вымушаны быў адмяжоўвацца ад падазрэнняў ва ўдзеле ў выступе Глінскага. Ён прыпісваў сабе асноўныя заслугі ў мабілізацыі ваенных сіл дзяржавы і арганізацыі барацьбы з мяцежнікамі[82]. Па словах Гаштаўта, ён праследаваў Глінскага разам з каралеўскім войскам да самога Смаленска і Дарагабужа[83]. Абвінавачванні ў дзяржаўнай здрадзе, на думку Гаштаўта, былі вынікам зайздрасці з боку яго праціўнікаў Радзівілаў, якія не маглі змірыцца з тым, што лаўры збавіцеля Айчыны дасталіся яму[84]. Не выключана, што ўсемагутны канцлер зрабіў усё магчымае, каб былі забытыя добрыя справы Міхаіла

[81] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 112.

[82] «Albertus Gastold, palatinus Vilnensis, Bone Sphortie, Regine Polonie. Contra ducem Constantinum de Ostrogk et contra Radivillones» (AT. T. 8. S. 262—263).

[83] «Albertus Gastold, palatinus Vilnensis, Bone Sphortie, Regine Polonie. Contra ducem Constantinum de Ostrogk et contra Radivillones» (AT. T. 8. S. 264).

[84] Тамсама. S. 264.

Глінскага і каб была сцёрта сама памяць пра яго. Відавочна, не без загаду Гаштаўта з Літоўскай Метрыкі былі вынятыя звесткі, якія нейкім чынам нагадвалі пра Глінскага. У будучым павінен быў застацца толькі вобраз Глінскага як здрадніка Айчыны і крывавага забойцы.

Трэба прызнаць, што прапагандысцкія высілкі Жыгімонта Старога і Альбрэхта Гаштаўта па дыскрэдытацыі былога надворнага маршалка далі плён. Асоба Міхаіла Глінскага была пакрыта друзам страшэнных абвінавачанняў, што было яшчэ горш, чым поўная «damnatio memoriae». «Чорны» вобраз Глінскага праіснаваў да смерці Гаштаўта (1539 г.) і Жыгімонта Старога (1548 г.). Толькі пасля гэтага пачаўся паступовы працэс перагляду стаўлення да асобы князя Міхаіла і яго ўчынкаў.

Былы падначалены Гаштаўта, гаспадарскі сакратар Венцлаў Мікалаевіч, больш вядомы пад псеўданімам Міхалон Літвін, досыць асцярожна ставіўся да асобы Міхаіла Глінскага, не спрабуючы нават накінуць на яго стэрэатыпныя абвінавачанні ў дзяржаўнай здрадзе. Ён толькі прыпісвае хітрасці Глінскага здачу Смаленска вялікаму князю маскоўскаму Васілю III у 1514 г.[85]. Праўда, згадваючы бітву пад Клецкам як адну з самых бліскучых перамог літоўскай зброі, Міхалон нічога не гаворыць пра асобу палкаводца, дзякуючы таленту якога перамога была дасягнута[86]. Так асоба героя бітвы была адзелена ад самой бітвы. Бітва і яе герой працягвалі існаваць асобна.

### 3.2.3. Голас у абарону Глінскага: Ёдак Дэцыус

У гэтым хоры абвінаваўцаў і нядобразычліўцаў дысанансам гучаў голас ураджэнца Эльзаса, служэбніка кракаўскага бургграфа Яна Бонера і выдаўца хронікі Мехавіты Ёдака (Юстуса) Дэцыуса (Дэцыя). Яго пяру належыць трылогія пра падзеі, што адбываліся ў Кароне і ВКЛ у пачатку панавання Жыгімонта Старога. З Глінскім Дэцыус пазнаёміўся ў Кракаве ў 1507 г. Нягледзячы на тое, што бітва пад Клецкам 1506 г. знаходзіцца па-за храналагічнымі межамі твора (*De Regis Sigismundi temporibus*), які пабачыў свет у 1521 г. у Кракаве, аўтар падрабязна спыняецца на асобе князя Міхаіла, яго фізічных і інтэлектуальных якасцях. Дэцыус падае кароткі агляд жыццёвага шляху Глінскага, адзначаючы пры гэтым яго 12-гадовае (sic!) знаходжанне ў Германіі, службу ў караля і вялікага князя Аляксандра. Дзякуючы Дэцыусу мы маем падрабязныя сведчанні пра сустрэчу Жыгімонта Старога і Міхаіла Глінскага перад «паднясеннем»

[85] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 79.

[86] Тамсама. С. 67.

і каранацыяй першага, а таксама пра акалічнасці бунту Глінскіх, іх уцёкі ў Масковію, аблогу Смаленска 1514 г., няўдалую спробу князя Міхаіла вярнуцца дамоў[87].

Дэцыус выкарыстоўваў для напісання свайго твора матэрыялы з Кароннага архіва ў Кракаве. Гэтыя матэрыялы за перыяд 1515—1535 гг., вядомыя як Acta Tomiciana (па прозвішчы тагачаснага кароннага падканцлера Пятра Таміцкага), былі пазней сабраныя і 8 верасня 1567 г. прадстаўленыя сенату Польскага каралеўства кракаўскім і плоцкім канонікам Станіславам Гурскім. Весткі Дэцыуса пра асобу Глінскага і яго жыццёвы шлях паслужылі асновай для наступных пакаленняў аўтараў, асабліва з нямецкіх зямель.

### 3.2.4. Міхаіл Глінскі як галоўны герой «Нататак пра Масковію» Жыгімонта Герберштайна

У асобе Жыгімонта Герберштайна (1486—1566), аўтара «Масковіі», мы маем незвычайнага сведку жыцця, у тым ліку і «нямецкага» перыяду, Міхаіла Глінскага. Насамрэч Герберштайн з'яўляецца ўнікальным сведкам. Па-першае, яго і Глінскага аб'ядноўвае тое, што яны абодва належалі да прыдворнага грамадства. Эпоха высокага Рэнесансу ў Еўропе, па меншай меры ў яе заходняй частцы, вызначалася складваннем новай індывідуальнасці[88]. У канцы XV — першай палове XVI стст. узмацняецца цікавасць да асобы чалавека, яго ўнутранага свету. У літаратуры і мастацтве гэта тэндэнцыя выразілася ў спробе дакладна і дэталёва перадаць індывідуальныя рысы чалавечага цела, адметнасці чалавечай душы і псіхікі. Са станаўленнем індывідуалізму звязана з'яўленне катэгорыі багата адораных у фізічным і інтэлектуальным плане людзей — «homo universale». Яны былі сапраўднай знаходкай для манархаў, вышэйшымі дарадцамі якіх многія з іх станавіліся. Гэтыя людзі былі гатовыя ўзяцца за любую справу; яны былі здольныя як да сур'ёзнага ўчынку, так і да жарту. Яны разумелі, якімі талентамі і здольнасцямі валодаюць, і таму лічылі, што маюць законнае права патрабаваць ад уладара багатыя дары за сваю службу. Рэч ішла не толькі пра матэрыяльнае. Куды больш значнай уяўлялася слава, вялікасць, пасмяротная памяць. Часам для дасягнення мэты выкарыстоўваліся любыя сродкі. Новыя людзі былі надзвычай амбітнымі і ганарыстымі індывідуумамі.

---

[87] Decius I. De Sigismundi regis temporibus liber, 1521 / Oprac. W. Czerniak. Kraków, 1901 (= Biblioteka pisarzów polskich. Nr. 39).

[88] Burckhardt J. The Civilization of the Renaissance in Italy. P. 87—93.

Адсюль зразумела іх гарачае жаданне дасягнуць чагосьці значнага яшчэ пры жыцці. Як Герберштайн, так і Глінскі належалі да гэтай катэгорыі людзей. Абодва былі багата адоранымі і ўсебакова развітымі, у большай ці меншай ступені неардынарнымі і выключнымі людзьмі. Абодва былі дарадцамі сваіх манархаў. Нарэшце, абодва дасягнулі зямной славы, праўда, рознымі сродкамі: першы сваімі літаратурнымі творамі, і ў першую чаргу знакамітай «Масковіяй», а другі — учынкамі, і, не ў апошнюю чаргу, дзякуючы перамозе над татарамі ў жніўні 1506 г.

Па-другое, абодва былі звязаны з дваром імператара Максіміліяна Габсбурга. Глінскі выхоўваўся на імператарскім двары ў 90-х гг. XV ст. Герберштайн пачаў службу пры двары імператара Максіміліяна I Габсбурга ў 1514 г.[89]. Выхаванне і служба на габсбургскім двары адыграла важную ролю ў станаўленні двух маладых людзей. Нельга не адзначыць той факт, што як Глінскі, так і Герберштайн праявілі сябе як таленавітыя дыпламаты. Яны неаднойчы выконвалі складаныя даручэнні сваіх уладароў.

Нарэшце, і гэта варта падкрэсліць, што Жыгімонт Герберштайн меў гонар ад імя імператара Святой Рымскай імперыі хадайнічаць за Глінскага перад вялікім князем маскоўскім Васілём III. Калі ў 1516 г. імператар Максіміліян I накіраваў Герберштайна ў Маскву, ён уручыў таму асабісты ліст да Васіля III з просьбай аб вызваленні князя Міхаіла Глінскага, які тады знаходзіўся ў турме. Мы дазволім сабе ў гэтым месцы прывесці змест гэтага ліста цалкам на мове арыгінала[90]:

*Maximilian von Gottes Gnaden erwahlter Romischer Kaiser u.s.w. Instruction, was unser getreuen Sigmund von Herberstein und Peter Maraxij unser Rathe mit dem Grossfursten der Reussen handeln sollen.*

*Item so sy inhalt unser sonder Instruction mit denselben grossen Fursten dem Reussen so viel gehandelt und ihne wie wir uns versehen dahin bewegt haben, dass er sich gegen unserem lieben Bruder dem Konig zu Pohlen ihrer Vehd halben in ein Compromiss einlassen will, oder die Handlung sonst zu End gebracht ist.*

*Sollen Sy seiner Lieb unsern sondern Credenz Brief uberantworten, und darauf mit dem besten Fug anzeigen, uns lang an wie sein Lieb Herzog Michel Linzkj vielleicht aus beweglichen Ursachen fencklichen halte, dieweilen wir*

[89] Picard B. Das Gesandtschaftswesen Ostmitteleuropas in der frühen Neuzeit. Beiträge zur Geschichte der Diplomatie in der ersten Hälfte des sechzehnten Jahrhunderts nach den Aufzeichnungen des Freiherrn Sigmund von Herberstein. Graz—Wien—Köln, 1967. S. 33.

[90] Adelung F. Siegmund Freiherr v. Herberstein: Mit besonderer Rücksicht auf seine Reise in Russland. St. Petersbourg, 1818. Рускі пераклад знаходзіцца ў выданні: Герберштейн С. Записки о Московии / Под ред. В. Л. Янина. Москва, 1988. С. 260—261.

*aber denselben Herzog Michel Linzkj von Jugend auf an unseren Hof erzogen haben, und er sich in inserem Dienst bey unserem lieben Oheim und Fursten Herzog Albrechten von Sachsen redlich und und wohl gehalten hat, seind wir ihme mit sonder Gnaden geneigt, ob er auch wieder sein Lieb ichts gehandelt hatt, so bedunckt uns doch, dass er solches Fencknus bissher wohl gebusst hab, und dieweilen dann in allen Sachen nicht die Strengigkeit, sondern zu Zeiten die Barmhertzigkeit gebraucht werden solle, seye an sein Lieb unser freundlich Begehren, Sy wollen die Ungnad gegen beruhrten Herzog Michael Linzkj abstellen, und uns zu Ehren und Gefallen ihne solcher seiner Fencknus ledig lassen, und den zu derselben unsern Rathe als unsern Handen stellen , und uberantworten, so wollen wir mit ihme so viel handeln und dermassen verpflichten, dass er wieder sein Lieb noch die Seinen nimmer sein, noch handeln soll, und dass uns sein Lieb solch unser Begehren nicht abschlag noch weigere, als wir uns des ganzlichen versehen, das wollen wir gegen seiner Lieb in dergleichen und mehrern freundlichen beschulden, wie dann sein Lieb das von unsern Rathen weiter vernemmen wirdet; geben in unser und des R. stadt Hagenau am 12. Decembr. im sechzehenden Jahr, unseres Reichs im 31 Jahr.*

*P. regem Commissio Domini Imperatoris ppr.*

*Hans Vinsterwalder*

Просьбу імператара Максіміліяна аб вызваленні Глінскага Герберштайн агучыў 19 лістапада 1517 г. на заключнай аўдыенцыі ў вялікага князя маскоўскага[91]. Пасол прасіў ад імя свайго ўладара вызва-

[91] «Наияснейший начальниче! свещеннейшее Цесарское Величество, меж иныхъ, приказал мне и моему товарищу господину Петру Мараскому, которой по воле Божией от сего света отъиде, чтобы намъ прежъ своего отъезда отселе Твоей Наиясности сиа грамота подати и потомъ говорити, что Его Цесарскому Величеству въ уши пришло, какъ Твоа Наиасность не безвинно некако подвигся, что князя Михаила Глинскаго поимана держишь, коего занежъ одъ младыхъ летъ въ своемъ дворе Цесарскомъ воспиталъ; также онъ у светлейшаго Алберта, Князя Саксонскаго, Начальника и сродника Его Величества дражайшаго, на его службе всегда себя бодрена показалъ. Того для Цесарская Милость о немъ зъжалитися не безлепа помыслилъ. И нечто тотъ князь Михайло Глинской некогда спротивно Твоей Наиясности учинилъ, и онъ уже такимъ поиманьемъ полно казни пострадалъ, мнитъ Его Цесарское Величество; и занежъ великихъ Начальниковъ то есть нарочито уставлено, чтобы сверпъство оставя и кроткою милостию и благостию къ повиннымъ себя имели, того для, Твою Наиясность учинилъ поискати, чтобы еси изволилъ для Его Величества и для межъ васъ особные дружбы и братства, того Глинского ослободити и въ наши руки Его Величества советникомъ дати. и чтобы Его Величеству служити болши моглъ; а съ нимъ Его Величество такъ хочетъ учинити и толь тяжкою его присягою связати, что противу Твоее Наиясности или твоихъ после того николи смеетъ что учинити. Дело въ томъ любезнейше Его Цесарскому Величеству учинишь, противу коего, где прилучится Твоей Наиясности учинити, хочетъ Его Величество памятовати» (Памятники дипломатических сношений древней России с державами иностранными. Т. 1. Памятники дипломатических сношений с империею Римскою с 1488 по 1594 год. Санкт-Петербург, 1851. Стб. 310—311).

ліць Міхаіла Глінскага, абяцаючы, што ў гэтым выпадку імператар прымусіць таго прыняць асаблівую прысягу не рабіць нічога заганнага ў дачыненні да асобы вялікага князя маскоўскага. Пры гэтым Герберштайн спасылаўся на традыцыі сяброўства паміж абодвума ўладарамі і на літасць хрысціянскіх правіцеляў у дачыненні да вінаватых і злачынцаў. У адрозненне ад імператарскага ліста прамова пасла ўтрымлівала намёкі на магчымасць будучай службы Міхаіла Глінскага на двары імператара Максіміліяна І.

21 лістапада 1517 г., незадоўга да ад'езду Герберштайна з Масквы, дзяк Шыгона Паджогін даў канчатковы адказ адносна далейшага лёсу знакамітага вязня: паколькі князь Міхаіл Глінскі ў зняволенні пажадаў вярнуцца ў праваслаўную веру, то праваслаўны ўладар не можа перадаць яго ў рукі неправаслаўнага правіцеля. Аргумент імператарскага пасла, што Максіміліян збіраецца адаслаць Глінскага на двор свайго пляменніка Карла (Карласа) у Іспанію, быў рашуча адкінуты маскоўскім бокам[92].

Калі Герберштайн, на гэты раз ужо як пасол караля Фердынанда, у 1526 г. яшчэ раз прыехаў у Маскву, Глінскі ўсё яшчэ знаходзіўся ў турме. Аднак у вельмі хуткім часе князь Міхаіл быў вызвалены і нават прызначаны апекуном малалетніх дзяцей вялікага князя. Тады ж, верагодна, і мусіла адбыцца асабістая сустрэча Жыгімонта Герберштайна і князя Міхаіла Глінскага. Пра гэта сведчыць ліст польскага канцлера Крыштафа Шыдлавецкага да саксонскага герцага Альбрэхта. Шыдлавецкі паведамляе, што ён меў за абедам гутарку з Герберштайнам, які распавёў шмат цікавага пра апошнія падзеі ў Маскоўскай дзяржаве. Аўстрыйскі дыпламат паведаміў канцлеру і пра вызваленне Глінскага. Са зместу ліста вынікае, што Герберштайн асабіста бачыўся з вызваленым князем. Праўда, калі каралеўскі пасол захацеў перагаварыць з Глінскім, той адказаў, што не здатны падтрымаць размову, бо даўно забыў нямецкую мову[93]. Сам жа Герберштайн патлумачыў нежаданне Глінскага размаўляць тым, што пасля вызвалення да яго было прыстаўлена мноства людзей, якія кантралявалі кожны ягоны крок.

Але, як падаецца, Герберштайн і Глінскі ўсё ж знайшлі зручны момант, каб перагаварыць. На карысць гэтага сведчыць паведамленне Герберштайна пра тое, што ён паспеў перадаць Глінскаму ліст ад саксонскага герцага Георга, якому той надзвычай усцешыўся і абяцаў

---

[92] Памятники дипломатических сношений… Т. 1. Санкт-Петербург, 1851. Стб. 313—314; Adelung F. Siegmund Freiherr v. Herberstein… S. 91—92.

[93] AT. T. 13. S. 193.

адказаць у хуткім часе[94]. Таксама, са слоў Шыдлавецкага, Глінскі скардзіўся на неадпаведнасць свайго матэрыяльнага становішча ў Масковіі рангу і статусу сваёй асобы[95]. Ва ўсякім разе, размова паміж Глінскім і Герберштайнам не магла быць доўгай. У ходзе яе аўстрыйскі пасол атрымаў звесткі пра становішча князя Міхаіла на маскоўскім двары.

У сваёй «Масковіі», якая была ўпершыню выдадзена ў 1549 г. на лацінскай мове, Герберштайн тройчы звяртаецца да асобы князя Міхаіла. Першы раз ён робіць гэта ў раздзеле пра паходжанне рускіх уладароў, дзе апісвае, як Глінскі подкупам захапіў Смаленск, які да гэтага належаў ВКЛ[96]. Другі раз аўстрыйскі дыпламат звяртаецца да постаці Глінскага ў раздзеле пра абрад вянчання манарха ў Маскоўскай дзяржаве[97]. Пасля аповяду пра шлюб вялікага князя Васіля III з Аленай Глінскай Герберштайн палічыў патрэбным сказаць некалькі слоў пра яе слыннага дзядзьку. Пры гэтым размова ідзе пераважна пра апошнія гады жыцця Міхаіла Глінскага, калі ён быў прызначаны апекуном будучага цара Івана IV Васілевіча. Заканчваецца аповед паведамленнем пра смерць Глінскага ў турме ў выніку змовы яго пляменніцы Алены і баярына Аўчыны. Нарэшце, трэці раз Герберштайн звяртаецца да асобы князя Міхаіла ў раздзеле, дзе размова ідзе пра ВКЛ. Апавядаючы пра слынных ваяроў гэтай дзяржавы, аўстрыйскі пісьменнік асабліва вылучае Канстанціна Астрожскага і Міхаіла Глінскага. Аўтар сцісла апавядае пра перамогі, галоўным чынам змаганне з татарамі, Канстанціна Астрожскага, а пасля пераходзіць да асобы Глінскага. Кампазіцыйна аповед пра яго займае цэнтральнае месца ў раздзеле пра ВКЛ. Гэта стрыжань, вакол якога нітуецца ўвесь раздзел[98].

Герберштайн пачынае з апавядання пра выхаванне маладога князя Міхаіла ў Германіі, пасля пераходзіць да апісання яго службы

[94] «...quocum (mit Herzog Michael) germanica lingua idem aulicus (Sigmund Herberstein) colloqui voluit, verum dux Michael dixit, sibi e memoria id idiomatis jampridem excidisse, quum tamen re vera loqui non audebat propter famulos suos sibi magis custodiae gratia, quam officii datos» (AT. T. 13. S. 193).

[95] «...Qui quidem dominus dux Michael vultum subtristem praesse ferebat prorumpentibus lachrimis. Quatenus ad conditionem ipsius, dicit eum satis bona provisum, non tamen, ut dignitas et splendor status sui poscit» (AT. T. 13. S. 193).

[96] Герберштейн С. Записки о Московии. Т. 1. С. 81; Herberstein S. Rerum Moscoviticarum Commentarii. S. 63—64.

[97] Записки о Московии. Т. 1. С. 143—144; Herberstein S. Rerum Moscoviticarum Commentarii. S. 107—109.

[98] Герберштейн С. Записки о Московии. Т. 1. С. 465—475; Herberstein S. Rerum Moscoviticarum Commentarii. S. 340—351.

ў караля і вялікага князя Аляксандра. Згадваючы бліскучую перамогу літвінаў на чале з князем Міхаілам Глінскім над крымскімі татарамі ў канцы панавання Аляксандра Ягелончыка (не называючы, аднак, месца бітвы), Герберштайн адзначаў, што ніколі пасля смерці вялікага князя Вітаўта літвіны не атрымлівалі такой бліскучай перамогі над татарамі[99]. Несумненна, што праца Герберштайна паспрыяла шырокай вядомасці ў Еўропе не толькі асобы Глінскага, але і бітвы пад Клецкам, якая па праву ўспрымалася вяршыняй палітычнай і ваеннай кар'еры князя. Саму Клецкую перамогу войска ВКЛ над татарамі аўстрыйскі дыпламат ставіў не ніжэй Аршанскай перамогі 1514 г. войск ВКЛ і Кароны над маскоўскімі ваяводамі.

Далей Герберштайн апавядае пра канфлікт паміж Глінскім і троцкім ваяводам Янам Забярэзінскім, які пасля смерці Аляксандра Казіміравіча прывёў да бунту князя Міхаіла і яго прыхільнікаў супраць новага манарха і іх наступнай эміграцыі ў Маскоўскую дзяржаву. Гаворачы пра службу князя Міхаіла вялікаму князю маскоўскаму, Герберштайн падрабязна распавядае пра капітуляцыю Смаленска, што прыпісвае вайсковаму таленту і хітрасці Глінскага, а таксама пра няўдалую спробу апошняга вярнуцца ў Літву пасля таго, як не спраўдзіліся яго надзеі на Васіля III. Завяршаецца аповед паведамленнем пра яго амністыю пасля 12-гадовага зняволення, прызначэнне апекуном дзяцей вялікага князя, новае зняволенне на падставе фальшывага даносу і смерць у турме.

Наколькі адпавядаюць рэчаіснасці занатаваныя аўстрыйскім дыпламатам звесткі пра Глінскага? Наколькі дакладнымі былі сведчанні, на якія абапіраўся Герберштайн, калі пісаў пра Глінскага? Ад часу падзей, удзельнікам якіх з'яўляўся апошні, прайшло як мінімум чвэрць стагоддзя, і пэўныя дэталі маглі лёгка сцерціся з памяці. На габсбургскім двары, асабліва калі жыў імператар Максіміліян, маглі памятаць пра юнака з далёкай Літвы, але нічога канкрэтнага пра яго асобу паведаміць не маглі. Акрамя таго, сустрэча самога Герберштайна з Глінскім у Маскве была занадта кароткай, каб апошні мог нешта распавесці пра сябе аўстрыйскаму дыпламату. Да таго ж, Герберштайн пісаў на нямецкай і лацінскай мовах, і адпаведна яго Глінскі гаворыць у «Масковіі» на гэтых мовах. Невядома, ці належалі словы, якія Герберштайн прыпісвае Глінскаму, апошняму. Магчыма, аўтар уклаў у яго вусны свае ўласныя думкі, уяўленні, погляды. Ці не з'яўляецца, такім чынам,

[99] Герберштейн С. Записки о Московии / Под ред. В. Л. Янина. Москва, 1988. С. 191; Herberstein S. Rerum Moscoviticarum Commentarii. S. 341—342.

Міхаіл Глінскі ўсяго толькі плёнам уяўлення аўтара? Ці не вылепіў Герберштайн вобраз свайго героя па пэўнай мадэлі, уласцівай перадусім нямецкай рыцарскай традыцыі.

Аднак, калі ўважліва чытаць Герберштайна, не пакідае ўражанне, што гаворка ідзе пра надзвычай неардынарнага чалавека. Аўтар нібы разумее, што мае справу са складанай і супярэчлівай натурай, ён намагаецца перадаць чытачу адметнасці асобы Глінскага. Калі Герберштайн піша пра дзёрзкі адказ князя Міхаіла Васілю III, пасля таго, як ён быў схоплены маскоўскай вартай пры спробе вярнуцца ў ВКЛ, адчуваецца, што тут, нягледзячы на схематычнасць эпізоду, гучыць голас сапраўднага Глінскага: «Ich hab den tod nie gefürcht, und noch nit, ain mal muess ich ye sterben, die seel aber steet in deiner macht nit»[100] (Смерці я не баяўся і зараз не баюся, калі-небудзь я ўсё роўна павінен буду памерці, але мая душа табе не належыць). Калі Герберштайн апісвае выпадак паміж Глінскім і Забярэзінскім з-за аўса, дзёрзкую размову надворнага маршалка з новым гаспадаром Жыгімонтам Старым, падаецца, што мы ўлаўліваем водгук рэальных падзей. Па ўсёй верагоднасці, аўтар быў перакананы ў тым, што любая спроба змясціць постаць Глінскага ў рамкі нейкай схемы будзе няўдалай. Асобе Глінскага цесна ў рамках схемы; яна імкнецца вырвацца на прастору. Таму аўтар, нягледзячы на ўласныя стэрэатыпы і перакананні, імкнецца як мага больш рэальна адлюстраваць постаць Глінскага. Асоба князя Міхаіла адчуваецца ў кожнай фразе, жэсце, учынку.

Несумненна, што Глінскі Герберштайна — жывы чалавек з яго перавагамі і недахопамі. «Масковія» даносіць да нас яркія і вобразныя эпізоды, звязаныя з жыццём і дзейнасцю Глінскага. Няма сумненняў, што Герберштайн любіў і паважаў свайго героя. У нечым ён нават захапляўся Глінскім, а дакладней уласнаручна створаным вобразам апошняга. Гэты вобраз нясе ў сабе адлюстраванне рэальнага вобраза героя.

[100] Herberstein S. Rerum Moscoviticarum Commentarii… S. 346—347.

# 3.3. Клецкая бітва ў мясцовых паданнях і легендах

## 3.3.1. Месца Клецкай бітвы 1506 г. у гістарычнай памяці клецкай мяшчанскай абшчыны XVI—XIX стст.

Паспрабуем таксама высветліць стаўленне да Клецкай бітвы тых прадстаўнікаў «безмолвствующего большинства», якія не пакінулі пасля сябе сведчанняў на паперы, але ў свядомасці якіх, тым не менш, вобразы гістарычных падзей існавалі. Нельга абысціся без вывучэння сацыяльнай памяці — механізмаў фарміравання і функцыянавання вобразаў гістарычнай падзеі ў грамадстве.

З паўстаннем клецкай гарадской супольнасці пачалася яе ўласная гісторыя. Адначасова распачаўся працэс тварэння яе культурнай памяці. Храналагічна ён супаў з пашырэннем у Клецкім княстве пісьмовасці. Дзякуючы гэтаму стала магчымым заснаванне архіва ў Клецкім замку. Архіў з'яўляўся важным культурным інстытутам, дзе зберагалася ўся пісьмовая памяць Клецкага княства. Замкавы архіў у Клецку мусіў паўстаць яшчэ ў 40-я гг. XVI ст., калі горадам кіравала каралева Бона. Да развіцця клецкага замкавага архіва спрычыніліся, у першую чаргу, наступныя гаспадары горада — Радзівілы. Ужо ў канцы XVI — пачатку XVII стст. клецкі замкавы архіў уяўляў сабой дастаткова буйны збор дакументаў. У вопісе замкавых кніг 1626 г. згадваецца, па меншай меры, 27 адзінак. Сярод іх былі ўласна замкавыя кнігі, а таксама кнігі валочнай памеры. Тут жа знаходзіўся інвентар Клецка 1558 г., які ўтрымліваў дарчую грамату Радзівілам на Клецк і Клецкую воласць. У замкавым архіве знаходзіліся г. зв. «пабаровыя квіты» ад розных асоб. Старэйшая кніга ў клецкім замкавым архіве, якую пачалі весці яшчэ ў часы клецкага старосты каралевы Боны Івана Міхайлавіча, датавалася 1543 г.[101].

Пісьмовы тэкст становіцца паступова важнейшым, але не адзіным сродкам захавання памяці клецкай гарадской супольнасці. Як паўсюль у традыцыйным грамадстве, носьбітамі памяці ў Клецку з'яўляліся таксама вуснае слова, прыродны ландшафт, агульнагарадскія святы і кірмашы, культавыя і свецкія пабудовы, нават вопратка і ежа, розныя знакі ў палях і каля дарог, крыжы на скрыжаваннях і інш.

---

[101] Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 694, воп. 2, спр. 3135.

Памяць клецкай гарадской грамады мела храналагічныя межы, далей якіх яна пранікала з вялікай цяжкасцю. Пераломным момантам мусіла быць сярэдзіна або нават другая чвэрць XVI ст., калі пачала паўставаць новая клецкая супольнасць. Яе мусілі цікавіць толькі тыя падзеі, што мелі дачыненне да яе самой і яе ўласнай гісторыі[102]. Усё, што выходзіла за гэтыя межы, не мела для гарадской супольнасці асаблівага значэння і не магло трывала замацоўвацца ў яе гістарычнай памяці. Адпаведна, для клецкіх мяшчан падзеі, што папярэднічалі сярэдзіне XVI ст. ці часам каралевы Боны, не ўяўляліся вартымі асаблівай увагі. Не дзіўна, што іх вобраз быў няпэўным і блытаным.

Кожная з трох асноўных этна-канфесійных супольнасцей Клецка мела ўласную гістарычную памяць, што адыгрывала ролю арганізацыі соцыуму, аб'яднання і захавання тоеснасці калектыву. Як ва ўсякім традыцыйным грамадстве, гістарычная памяць жыхароў Клецка мела ярка выражаную канфесійную афарбоўку. Рэлігійная прыналежнасць аказвала рашучы ўплыў на характар і змест гістарычнай свядомасці, вызначала формы ўвасаблення і актуалізацыі гістарычнай памяці. Асаблівасцю грамадскага жыцця Клецка, як і іншых беларускіх гарадоў, было тое, што розныя этна-канфесійныя групы мірна ўжываліся адна з адной, а іх сістэмы гістарычнай памяці мірна суіснавалі. Больш таго, працяглае суіснаванне розных сістэм гістарычнай памяці не магло не паўплываць на іх пэўную ўніфікацыю. Нягледзячы на тое, што змест гістарычнай памяці кожнай этна-канфесійнай групы адрозніваўся, на працягу стагоддзяў павінен быў выпрацавацца агульны для ўсіх канфесій фонд уяўленняў пра мінулае. Ён мусіў уключаць адметныя падзеі з жыцця горада, гістарычных персанажаў, памятныя мясціны, міфы і паданні, што былі агульнымі для ўсіх супольнасцей Клецка.

Вывучэнне культурнай памяці этна-канфесійных груп Клецка даволі складаная задача па прычыне адсутнасці дастатковай колькасці крыніц. Таму аб характары і змесце гістарычнай памяці жыхароў Клецка, асабліва яўрэйскай і татарскай грамад, можна меркаваць толькі прыблізна і ўмоўна. У выпадку яўрэяў і татараў складанасці ўзрастаюць з-за няведання большасцю сённяшніх даследчыкаў адпаведных моў: іўрыта і арабскай. Нарэшце — а размова тут ідзе ў першую чаргу пра яўрэяў — амаль не засталося носьбітаў традыцыйнай гістарычнай памяці гэтых груп. Тое, што мы сёння маем, — гэта

[102] Пра гэтую асаблівасць любога чалавечага калектыву: Halbwachs M. La mémoire collective. P. 74—79.

ўрыўкі і ўскосныя сведчанні, на якія моцна паўплывала кніжная традыцыя.

Гістарычная памяць яўрэйскай абшчыны Клецка складалася з падзей, звязаных з гісторыяй народа, сярод якіх можна выдзеліць наданні яўрэям рознымі гаспадарамі горада правоў і прывілеяў. Яна мусіла захоўваць імёны слынных прадстаўнікоў яўрэйскай культуры ў горадзе, у першую чаргу равінаў, сярод якіх вылучаліся Іуда бен Лёб, Міхал бен Мейр Айзенштадт, сын апошняга Майсей Айзенштадт і некаторыя іншыя[103]. Гістарычная памяць яўрэяў Клецка сягала першых дзесяцігоддзяў XVI ст., калі яны з'явіліся ў горадзе. Доўгі час у Клецку помнілі пра знаходжанне ў горадзе вядомага яўрэйскага філосафа Саламона Маймона[104]. Клецкія яўрэі помнілі таксама некаторых гаспадароў горада, асабліва тых, хто аказваў ім дапамогу. Асабліва ўдзячнымі яны мусілі быць асобным прадстаўнікам роду Радзівілаў, у першую чаргу Мікалаю Юзафу. Апошні ў канцы XVIII ст. не толькі вярнуў у Клецкую ардынацыю ўсіх яўрэяў, выгнаных адтуль Геранімам Фларыянам, і аддаў у іх рукі гарадскі гандаль, але і дапамог яўрэйскай грамадзе збудаваць вялікую мураваную сінагогу. Як сведчаць сучаснікі, інтэр'ер сінагогі быў упрыгожаны драўлянымі скульптурамі. У знак удзячнасці да спонсара і мецэната на франтоне гэтай пабудовы быў змешчаны радзівілаўскі герб[105]. Галоўнымі формамі ўвасаблення гістарычнай памяці клецкіх яўрэяў былі звычаі, рытуалы, святы, абрады, вопратка і г. д. Памяць яўрэйскай абшчыны захоўвалася таксама ў слове, як вусным, так і пісьмовым. Выдатным помнікам пісьмовай памяці былой яўрэйскай абшчыны ў Клецку з'яўляецца кніга «Pinkas Kletsk» (Памятная кніга Клецка), выдадзеная выхадцамі з Клецка ў Тэль-Авіве ў 1959 г. Носьбітамі яе гістарычнай самасвядомасці і гістарычнай памяці былі ў асноўным прадстаўнікі духавенства — равіны. Мы ўжо згадвалі пра ролю роду Айзенштадтаў у духоўным і культурным жыцці яўрэйскай грамады. Цікавым падаецца факт, што нашчадак гэтага роду, Барыс Айзенштадт, знаходзячыся ў Ізраілі, напісаў гісторыю роднай абшчыны[106].

Гістарычная памяць клецкіх татараў мусіла захаваць, у першую чаргу, імёны самых вядомых духоўных настаўнікаў — мулаў і імамаў, асобных вайсковых правадыроў, маршалкаў, якія вызначыліся

[103] Еврейская энциклопедия: В 16 т. Т. 9. Москва, 1991 (Репринтное издание). С. 554.

[104] Тамсама. С. 554.

[105] Ельскі А. К. Выбранае / Уклад. Н. Мазоўка, У. Казбярук. Мінск, 2004. С. 282.

[106] Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка. Клецкі раён. Мінск, 1999. С. 147.

ў войнах ВКЛ і Рэчы Паспалітай, а таксама ўладароў горада з роду Радзівілаў і, магчыма, каралевы Боны. Ніякіх успамінаў пра бітву пад Клецкам 1506 г. у памяці мясцовых татараў не захавалася. Іх гістарычная памяць не сягала далей сярэдзіны XVI ст. Найважнейшую ролю ў захаванні гістарычнай адметнасці і гістарычнай памяці ў асяроддзі клецкіх татараў адыгрывалі народныя звычаі, рэлігійныя святы і ўрачыстасці, рытуалы і абрады. Культурная памяць групы ўвасобілася таксама ў мясцовым ландшафце. Татары мелі свае мясціны памяці ў Клецку і яго ваколіцах. Гэта былі сёлы, у першую чаргу Арда і Асмолава, дзе пражывалі татары, мячэць і малітоўныя дамы, могілкі ў Асмолаве, дарогі і шляхі, што мелі назву татарскіх і інш. Невядома, ці ўспрымаўся ў асяроддзі мясцовых татараў клецкі раён Курганы як месца пахавання забітых у бітве 1506 г. крымскіх воінаў. Ва ўсялякім разе, сама гэтая падзея не знайшла адлюстравання ў гістарычнай памяці клецкіх татараў-мусульман. Гістарычная памяць клецкіх татараў жыла ў назвах населеных пунктаў[107]. Так, вёска Малышчычы (Малашчычы) была заснавана нашчадкамі татарскага воіна Малыша, які згадваецца ў попісе войска ВКЛ 1528 г. Назва вёскі Асмолава, верагодна, паходзіць ад асабовага імя Асмаіл (Ісмаіл), які быў першым гаспадаром зямлі (Асмаілава), на якой пазней паўстаў населены пункт. У сваю чаргу, назва вёскі Арда па-татарску азначае проста «паселішча». Назвы населеных пунктаў, такіх як, напрыклад, Ліпа, Ліпка, паходзіла са старажытнакіпчакскай (цюркскай) мовы і азначала «літва», «літоўскі»[108]. Галоўным носьбітам гістарычнай памяці клецкай татарскай грамады з'яўлялася мясцовае духавенства, сярод якога трэба вылучыць сем'і Ждановічаў і Александровічаў, нашчадкі якіх дагэтуль жывуць у Клецку.

Многае з пералічанага тычылася таксама клецкіх хрысціян. У іх гістарычнай памяці мусілі прысутнічаць тыя асобы і падзеі, што адыгралі важнае значэнне ў іх гісторыі. На падставе крыніц XIX—XX стст. можна меркаваць, што ў памяці жыхароў Клецка гісторыя іх роднага горада атаясамлівалася, перш за ўсё, з імёнамі каралевы Боны і Радзівілаў. Сярод апошніх народная памяць не вылучала канкрэтных персанажаў. Яна не захавала імені ніводнага прадстаўніка радзівілаўскай дынастыі, якая ўладарыла ў Клецку амаль 400 гадоў. Ранейшыя (да

[107] Пра татарскія населеныя пункты на Клеччыне гл.: Пазднякоў В. Татары Клецкага княства XVI ст. // Зборнік матэрыялаў I Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы». Ч. 1. Мінск, 1994. С. 111—122.

[108] Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. P. 9

сярэдзіны XVI ст.) персанажы мясцовай гісторыі ўвогуле не захаваліся ў народнай памяці. Ужо ў сярэдзіне XVI ст. жыхары Клецка слаба помнілі свайго папярэдняга ўладара, князя Фёдара Іванавіча Яраславіча, з дня смерці якога прайшло ўсяго 40 гадоў. Старая клецкая супольнасць знікла і знесла з сабой сваю памяць. Новая клецкая грамада, што прыйшла на яе месца, пачала ствараць уласную гісторыю і памяць[109]. Больш за ўсё яе цікавілі падзеі, звязаныя з наданнем Клецку розных правоў і прывілеяў, з'яўленнем грамадзянскіх інстытутаў, заснаваннем рамесніцкіх цэхаў, пабудовай культавых і свецкіх помнікаў і г. д. Мусілі таксама захавацца ўспаміны пра напады ворагаў, ваенныя разбурэнні, найбольш катастрафічныя пажары. Зараз ужо цяжка аднавіць змест культурнай памяці клецкай гарадской абшчыны XVI—XVIII стст. Пра яе можна меркаваць галоўным чынам на падставе ўрыўкавых і фрагментарных сведчанняў XIX—XX стст.

Не дзіўна, што Клецкая бітва 1506 г. не мела адчувальнага значэння для самасвядомасці клецкага грамадства, якое ніяк не звязвала ўласную гісторыю з гэтай падзеяй. Многія жыхары Клецка, што з'яўляліся выхадцамі з іншых месцаў і рэгіёнаў дзяржавы, зусім не ведалі пра яе. Нават нашчадкі сем'яў клецкага патрыцыяту мелі надзвычай цьмяныя ўспаміны пра бітву 1506 г. Падзея так і не стала састаўной часткай памяці жыхароў Клецка. І рэч не ў тым, што народная памяць з цяжкасцю ўтрымлівае канкрэтныя індывідуальныя падзеі[110], якія страчваюцца ўжо праз 40—50 гадоў. Клецкія мяшчане ўспрымалі гэту бітву як чужую, як такую падзею, што не мела ніякага дачынення да іх саміх, іх лёсу і прававога статусу. Бітва мела значэнне для шляхты, але не для мяшчанства, каштоўнасці якога ляжалі ў сферы мірнай працы. Мяшчане не адчувалі супольнага гістарычнага лёсу са шляхтай. У кожнага пласта насельніцтва была свая мінуўшчына і свой уласны погляд на яе. Тое з мінулага, што мела каштоўнасць для аднаго з іх, не мела каштоўнасці для другога, і наадварот. Таму і не дзіўна, што Клецкая бітва не стала прадметам калектыўнай рэфлексіі жыхароў Клецка, іх міфам.

Памяць не ўтрымлівала якіх-небудзь значных дэталяў падзеі. Нельга было вызначыць храналогію бітвы. Толькі прыродны ландшафт — гэты першасны сродак культурнай памяці — нёс у сабе памяць пра ўжо далёкую падзею. Пра яе нагадваў замкавы стаў, які

---

[109] Гл. падрабязней пра паўстанне новай памяці: Halbwachs M. La mémoire collective. P. 70.

[110] Падрабязней пра гэтую рысу народнай памяці: Элиаде М. Миф о вечном возвращении: Архетипы и повторяемость. Москва, 1998. С. 56—82.

пазней стаў называцца Красным. Не выключана, што на месцы бітвы быў усталяваны памятны знак у форме крыжа. Курганы ў паўднёва-заходняй частцы Клецка, а таксама паблізу вёсак Сухлічы і Сякерычы, мусілі звязвацца з татарскімі пахаваннямі[111]. Татарская дарога магла таксама ўспрымацца ў масавай свядомасці як матэрыяльнае сведчанне татарскіх нападаў[112].

Відавочна, што пры такім стаўленні да Клецкай бітвы 1506 г. з цягам часу яна знікла б канчаткова з памяці клецкага грамадства. Аднак успаміны пра яе захаваліся ў невялічкай групы клецкай супольнасці. Гэтай групай з'яўлялася шляхта, што мела маёмасць у Клецку. Першыя зямельныя наданні шляхце ў клецкай Слабадзе адносяцца яшчэ да эпохі панавання ў горадзе князёў Яраславічаў. У самым канцы Слабадской вуліцы, недалёка ад месца яе перасячэння з Сіняўскай дарогай, меў свой пляц Валенты Чарнкоўскі. Пазней гэты надзел быў перададзены ў арэнду Мацею Адамавічу[113]. У гэтым месцы, непадалёк ад плябаніі касцёла Святой Тройцы, знаходзіўся двор Себасцьяна Дыбоўскага[114]. Раней гэты двор належаў клецкаму мешчаніну Андрэю Мацвеевічу, у якога яго затым купіў Павел Папельжынскі.

Асаблівую ўвагу трэба звярнуць на асобу Валентыя Чарнкоўскага, які з'яўляўся буйнейшым землеўладальнікам у Клецкім княстве. Пра яго паходжанне нічога не вядома. Нельга сказаць нічога канкрэтнага пра яго гіпатэтычнае радство са знакамітым домам Чарнкоўскіх з Вялікай Польшчы. Адзінае, што добра вядома, — гэта час з'яўлення Валентыя Чарнкоўскага ў Клецку. Яго імя згадваецца ў гістарычных крыніцах пачынаючы з сярэдзіны XVI ст. Не выключана, што ён з'явіўся ў Клецку ў часы каралевы Боны, хутчэй за ўсё, перад валочнай памерай у 40-я гг. XVI ст. Ва ўсякім разе, айчынным крыніцам XV ст., уключаючы Літоўскую Метрыку, гэта імя невядомае. Памёр Валенты Чарнкоўскі ў 1590 г.[115].

Валенты Чарнкоўскі пражыў вельмі доўгае жыццё. Невядома, аднак, ці быў ён жанаты і ці пакінуў ён нашчадкаў. Невядома, кім прыходзіўся Валентаму Чарнкоўскаму Беньян Чарнкоўскі, якога Фёдар Еўлашоўскі таксама згадваў у сваіх мемуарах: «Не видивши

[111] ПКПКК. С. 389, 391, 403, 524, 532, 537, 551.

[112] Тамсама. С. 519.

[113] Тамсама. С. 392.

[114] Тамсама. С. 392—393.

[115] «Октобра 31, року 90 умарл сусед и приятель мой, чловек барзо добрый (беатус вир), пан Валентый Чарковский» (Старажытная беларуская літаратура… С. 253).

тэжъ там доброго товариства, сусед и прятель мой, пан Беньян Чарковский умарл року 1604, стычня 2 дня, не в дому своим, але в Лняникох, у пана Григория Униховского, где се обадва лечили у неякогось шкоты, доктора. Мой то был велкий приятель по некеды прешлых нехутях и заздростях, кторых был по ним и по пане Униховским дознал. А бодай и от инших не за то юж нецнотливою зазадростею не (щеснон) познавалэм о непогамованэ кглупство»[116].

Калі дапусціць, што пан Валенты і Беньян Чарнкоўскія мелі дзяцей, немагчыма станоўча адказаць на пытанне, ці засталіся жыць на Клеччыне іх нашчадкі. У пазнейшых апісаннях і інвентарах Клецка гэта прозвішча адсутнічае. Не выключана, што на Валентым і Беньяне род мясцовых Чарнкоўскіх спыніўся. Нават калі б так і было, цяжка пераацаніць ролю Валентыя Чарнкоўскага ў перадачы гістарычных традыцый. Яго асоба злучала не толькі розныя пакаленні клячан, але і розныя тыпы клецкага грамадства — замкавае і местачковае. Чарнкоўскі мусіў несці ў сабе памяць старога замкавага грамадства, якое цаніла воінскія ўчынкі, адвагу і смеласць. Унутры гэтай пераважна шляхецкай супольнасці мусіла захоўвацца памяць пра бітву з татарамі 1506 г. Валенты Чарнкоўскі, які пасяліўся на Клеччыне яшчэ ў 1520-я гг., мусіў застаць памяць пра бітву з татарамі ў ваколіцах Клецка яшчэ жывой. Пляц Чарнкоўскага знаходзіўся непадалёк ад Курганоў, на заходняй ускраіне Клецка, якія атаясамліваліся з месцам масавага пахавання забітых татараў. Мясцовыя жыхары без цяжкасці паказвалі мясціны, дзе адбылася сеча. Несумненна, гэтая падзея, а дакладней памяць пра яе, мусіла глыбока ўрэзацца ў памяць маладога чалавека. І гэтую памяць ён мусіў пранесці праз усё сваё доўгае жыццё. Дзякуючы Валентыю Чарнкоўскаму памяць пра бітву 1506 г. не знікла, а захавалася ў свядомасці жыхароў Клецка.

У наступныя стагоддзі, нягледзячы на тое, што кожная з клецкіх этна-канфесійных супольнасцей мела сваю ўласную памяць, існавала таксама агульная для ўсіх жыхароў горада памяць. Па меры развіцця Клецка яго жыццё станавілася ўсё больш складаным, ён абрастаў гісторыяй. Ужо ў сярэдзіне XVII ст. Клецк меў дастаткова значную культурную памяць. Яна мела свае кропкі фіксацыі: старадаўнія звычаі і традыцыі, правы і прывілеі, дадзеныя ўсім жыхарам горада яго ўладальнікамі.

Клецкая бітва 1506 г., хоць і захавалася ў наступныя стагоддзі ў памяці насельніцтва Клецка, тым не менш не адыгрывала ў ёй

[116] Старажытная беларуская літаратура… С. 261.

істотнай ролі. У асяроддзі клецкага мяшчанства памяць пра яе існавала амаль выключна ў вусным слове, паданнях і легендах, а таксама ў прыродным ландшафце. У мясцовых пісьмовых помніках наступных эпох (прывілеях, цэхавых статутах і іншых дакументах) не знайшлося месца нават для згадкі пра гэтую падзею.

Як маргінальная з'ява ў калектыўнай памяці супольнасці Клецкая бітва 1506 г. праіснавала на працягу больш чым трох стагоддзяў. Наўрад ці працы хронікі Быхаўца і Стрыйкоўскага маглі неяк стымуляваць цікавасць мясцовых жыхароў да далёкай падзеі. Гэтыя творы былі абсалютна невядомыя мясцовым жыхарам. Немагчыма таксама ўявіць, што жыхары Клецка ў тыя далёкія часы адмыслова ўшаноўвалі Клецкую перамогу 1506 г. Тым больш, яны не рабілі ніякіх спробаў нейкім чынам лакалізаваць бітву. Нарэшце, было забыта імя самога героя бітвы — князя Міхаіла Глінскага. Толькі асобныя цьмяныя паданні слаба даносілі рэха далёкай мінуўшчыны.

Клецкая мяшчанская грамада XVII—XVIII стст. уяўляла сабой тыповую камемаратыўную супольнасць. Памяць пра падзеі і з'явы адыгрывала ў яе жыцці не апошнюю ролю. Клецкая гарадская супольнасць мела сваё ўласнае ўяўленне аб мінулым, якое служыла ёй арыенцірам у штодзённым жыцці, дапамагала зразумець рэаліі жыцця, а таксама абгрунтаваць паходжанне мясцовых традыцый і звычаяў, царкоўных і грамадскіх інстытутаў. Калектыўная памяць служыла справе кансалідацыі клецкага мяшчанскага грамадства.

Дуалізм гарадской улады ў Клецку (ардынацкая адміністрацыя і рада-магістрат) прадвызначыў дуалізм галоўных культурных інстытутаў (замак і ратуша), што забяспечвалі захаванне і функцыянаванне калектыўнай памяці. У клецкім Дольным замку захоўваліся дакументы, што мелі дачыненне да клецкай ардынацыі Радзівілаў, а таксама грамадзянскія і крымінальныя справы мясцовай шляхты. У будынку ратушы знаходзіліся дакументы, што адносіліся да гарадскіх спраў, у тым ліку грамадзянскія і крымінальныя справы мяшчан. Гэты падзел адбыўся, відавочна, у сярэдзіне XVII ст. у сувязі з пашырэннем правоў на самакіраванне клецкай мяшчанскай абшчыны і з'яўленнем органаў гарадской улады. Адпаведна, адбыўся падзел кампетэнцый паміж княскай і гарадской адміністрацыяй. Частка архіўных матэрыялаў з замка, якія мелі непасрэднае дачыненне да гарадскіх спраў, была перададзена ў ратушу. Як сведчыць знакамітая гравюра Тамаша Макоўскага, ратуша (Pretorium) існавала ў Клецку ўжо ў самым пачатку XVII ст. Галоўнымі носьбітамі

культурнай памяці Клецка з'яўляліся прадстаўнікі гарадской эліты: замкавая адміністрацыя на чале з ардынацкім старастам, члены магістрата на чале з войтам, а таксама святарства.

Разнастайнымі былі формы ўдзелу клецкага мяшчанства ў калектыўнай памяці горада. Мінулае прысутнічала ў тэкстах цэхавых статутаў. Апошнія не толькі ўтрымлівалі нормы і палажэнні, што адносіліся да мінулых часоў, але часта адсылалі да падзей і асоб, дзякуючы якім з'явіліся гэтыя нормы і правілы. У Клецку, як і ў іншых гарадах, існавала, відаць, практыка публічнага чытання і дэкламацыі палажэнняў цэхавых статутаў на агульных карпаратыўных сходах. Яшчэ адной формай удзелу клецкіх мяшчан у калектыўнай памяці горада з'яўляліся судовыя паседжанні, у часе якіх бакі спасылаліся на правы і прывілеі горада, палажэнні цэхавых статутаў, згадвалі розныя падзеі, што адбыліся ў мінулым. Да калектыўнай памяці мяшчане далучаліся таксама праз удзел у храмавых святах, на якіх нярэдка агучваліся звесткі з гісторыі храма, паміналіся былыя святары. У сценах храма меліся надпісы і вобразы, якія сведчылі пра яго мінуўшчыну. Так, вядомы пісьменнік XIX ст. Павел Шпілеўскі згадваў, што на сценах клецкай царквы Св. Георгія ён бачыў славянскі надпіс 1589 г.[117]. Славянскі надпіс захоўваўся таксама на надмагільным помніку на могілках каля Арынскай царквы[118]. Распаўсюджванню і пашырэнню культурнай памяці спрыялі гарадскія кірмашы і таргі, дзе збіралася часам ледзь не ўсё гарадское насельніцтва, а таксама шматлікія госці. Кірмаш быў не толькі месцам сустрэчы людзей, але таксама сродкам пашырэння і перадачы інфармацыі, у тым ліку пра мінулае горада. Мінуўшчына прысутнічала таксама ў прыродным ландшафце Клеччыны, які нёс у сабе памяць пра падзеі і людзей мінулых эпох.

Такім чынам, Клецкая бітва 1506 г. мела дастаткова ўстойлівыя кропкі фіксацыі як у прыродным ландшафце, так, відавочна, і ў вуснай народнай традыцыі. Дзякуючы гэтай акалічнасці бітва захавалася ў памяці жыхароў Клецка. Але яе ўспрыняцце значна мянялася на працягу стагоддзяў клецкай гісторыі. Вобраз мінулага Клецка, што грунтуецца на бітве 1506 г. як галоўнай падзеі ў гісторыі горада, сфарміраваўся на мяжы XIX—XX стст. пад уплывам прац гісторыкаў. Канчаткова ён замацаваўся ў свядомасці жыхароў Клецка і даследчыкаў клецкай даўніны ў другой палове XX ст.

---

[117] Шпилевский П. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю. Минск, 1992. С. 61.
[118] Тамсама. С. 60.

### 3.3.2. Клецкая бітва 1506 г. з татарамі і бітва пад Клецкам 1706 г. са шведамі

Сярод гістарычных падзей, што адбываліся на Клеччыне і адлюстраваліся ў памяці мясцовых жыхароў, побач з татарскімі набегамі прысутнічае таксама шведская навала пачатку XVIII ст[119]. Можна сказаць, што ў народнай памяці захаваліся толькі найбольш разбуральныя падзеі з жыцця горада і гарадской супольнасці. Так, вайна 1812 г., якая абмінула Клецк, не пакінула якіх-небудзь трывалых успамінаў у асяроддзі жыхароў горада. Гэтаму сцвярджэнню пярэчыць той факт, што ў памяці гараджан не захаваліся падзеі сярэдзіны XVII ст., звязаныя з разбурэннем горада войскамі маскоўскага ваяводы Трубяцкога. Аднак не выключана, што апошні факт быў свядома выкарчаваны з памяці насельніцтва горада ў тыя часы, калі Клецк знаходзіўся ў складзе Расійскай імперыі.

Вяртаючыся да шведскага нашэсця пачатку XVIII ст., трэба адзначыць, што на працягу XIX ст. у масавай свядомасці жыхароў Клецка ўспаміны пра шведаў паступова ператварыліся ў міф. Падзея незаўважна для саміх мясцовых паступова абрасла легендамі. Сам факт шведскага ўварвання ператварыўся ў архетып — катэгорыю міфалагічнага дзеяння. Згодна з паданнем, якое было запісана ў 1879 г., шведы выкарыстоўвалі ў якасці стайні клецкую Пакроўскую царкву на Арыне, за што былі сурова пакараныя Богам. Калі яны хацелі вывесці сваіх коней з будынка царквы, то не здолелі гэта зрабіць: коні без усялякай на то прычыны не жадалі рухацца. У выніку шведы засталіся без коней і пацярпелі жорсткае паражэнне ў баі з рускімі войскамі[120].

Гэта мясцовая лягенда з'яўляецца, як падаецца, адлюстраваннем шырока распаўсюджанага ў паданнях сюжэта пра гвалты і святатацтвы шведаў у дачыненні да каталіцкіх і ўніяцкіх цэркваў падчас Паўночнай вайны. Адным з галоўных абвінавачанняў было тое, што шведы нібыта ў часе вайны шырока выкарыстоўвалі цэрквы ў якасці стайняў. Гэты сюжэт мала адпавядаў рэчаіснасці, але з'яўляўся дастаткова распаўсюджаным у антышведскай прапагандзе і народным фальклоры[121].

---

[119] Гл. падрабязней пра Клецкую бітву 1706 г.: Блінец А. Клецкія бітвы: 1506 і 1706 гады. Мінск, 2015. С. 73—128.

[120] Описание церквей и приходов Минской епархии. Минск, 1879. С. 129—131; Катлярчук А. Швэды ў гісторыі і культуры беларусаў. Мінск, 2002. С. 174.

[121] Катлярчук А. Швэды ў гісторыі і культуры беларусаў. С. 171.

Паданне мае ярка выражаную прасторавую прывязку пры адсутнасці адпаведнай часавай лакалізацыі. Месцам, дзе згодна з легендай адбываюцца падзеі, з'яўляецца Пакроўская (Арынская) царква. Можна дапусціць, што згаданая легенда нарадзілася ў асяроддзі кліру Арынскай царквы. Часам яе канчатковага афармлення можа лічыцца сярэдзіна або нават трэцяя чвэрць XIX ст., калі Арынская царква была канчаткова вернута праваслаўным, і для яе быў збудаваны новы будынак. Верагодна, пісьмовая фіксацыя легенды была прымеркавана да заканчэння пабудовы новага гмаха клецкай Арынскай царквы ў канцы 1870-х гг. Ва ўсялякім разе, паданне было невядомым Шпілеўскаму, які нічога не гаворыць пра яго ў сваёй кнізе. Увогуле, трэцяя чвэрць XIX ст. — гэта час, калі былі запісаны многія легенды з падобным сюжэтам. Згодна з паданнем, запісаным у Валожыне ў 1872 г., шведы выкарыстоўвалі мясцовую царкву ў якасці стайні, а таксама стралялі па абразах, за што былі сурова пакараны Богам — аслеплены[122]. Відавочна, для стварэння падобных легендаў святары выкарыстоўвалі фальклорныя сюжэты, што ўзыходзілі да эпохі існавання Рэчы Паспалітай. У XVIII ст. тэма шведскіх гвалтаў і святатацтваў у дачыненні да каталіцкіх і ўніяцкіх храмаў (клецкая Арынская царква тады належала ўніятам) выкарыстоўвалася прапагандыстамі гэтай дзяржавы[123]. Не выключана, што яшчэ тады гэты сюжэт увайшоў у мясцовы фальклор і стаў асновай падання пра шведаў у Клецку.

У другой палове XIX ст. Арынская гара становіцца адным з месцаў, у якім лакалізуецца памяць пра шведскую навалу. Другое паданне пра прысутнасць шведаў у Клецку гаворыць пра тое, што швед (кароль Карл XII?), адступаючы з Клецка, забыў пад гарой рукавіцу, па якую абяцаў вярнуцца[124]. Такім чынам, Арынская гара стала цэнтрам міфалагічнай прасторы, на якой разгортваліся міфалагічныя дзеянні. Яны адбываюцца не ў рэальным, а ў міфалагічным часе, у адпаведнасці з пазачасавай мадэллю.

Бітва са шведамі пачатку XVIII ст. выціснула з гістарычнай памяці мяшчан бітву з крымскімі татарамі, што адбылася на два стагоддзі раней. У народнай памяці засталася толькі шведская навала, а татарскія набегі былі амаль цалкам забытыя. Замена адной міфалагемы на другую ў свядомасці жыхароў Клецка адбылася не толькі

[122] Катлярчук А. Швэды ў гісторыі і культуры беларусаў. С. 174.

[123] Тамсама. С. 171.

[124] Запісана ў сакавіку 2005 г. ад ураджэнца вёскі Сіняўка, былога навуковага супрацоўніка Інстытута гісторыі НАНБ В. С. Талстога.

і не столькі таму, што шведскія падзеі адбыліся значна пазней за татарскія. Народная памяць анахранічная. Яна існуе па-за часам і не здольна ўтрымліваць канкрэтныя гістарычныя даты. У масавай свядомасці абедзве падзеі адносіліся да абсалютнай пазачасавай мінуўшчыны. На выцясненне вобраза татарскіх набегаў вобразам шведскай інтэрвенцыі паўплываў, у першую чаргу, той факт, што мясцовыя татары-мусульмане ў XIX ст. ужо не ўспрымаліся жыхарамі Клецка як «чужыя». Для мяшчан яны былі «сваімі», з якімі яны спрадвеку жылі побач у міры і згодзе. Гэты стан з сучаснасці пераносіўся ў далёкую мінуўшчыну. Народная свядомасць адмаўлялася верыць, што некалі магло быць інакш, а Клецк быў аб'ектам спустошальных татарскіх набегаў. Татарскія напады супярэчылі сучаснаму народнаму вобразу мінуўшчыны і мусілі быць выцеснены з народнай памяці. Да таго ж, з палітычнай карты Еўропы знікла Крымскае ханства. Амаль усе татары, і не толькі крымскія, апынуліся ў складзе адной дзяржавы — Расійскай імперыі. За выключэннем мясцовай шляхты каталіцкага веравызнання ўсё астатняе насельніцтва, у тым ліку і большасць гараджан, пад уплывам афіцыйнай прапаганды лічыла, што так было заўсёды, што гэтыя землі заўжды былі складовай часткай Расійскай імперыі.

У адрозненне ад татар, шведы былі для клецкіх жыхароў «чужымі». Яны маглі рабіць напады на Клецк, руйнаваць горад, з імі, нарэшце, маглі адбывацца змаганні. Таму міф пра шведаў хутка выціснуў з народнай памяці міф пра бітву з татарамі. Можна сказаць, што міф пра татарскія набегі захоўваўся ў народнай памяці датуль, пакуль не з'явіўся альтэрнатыўны яму міф, які ў большай ступені адпавядаў сацыяльна-культурным рэаліям.

Усе напады ворагаў на Клецк і змаганні з імі ў ваколіцах горада ў народнай свядомасці пачалі атаясамлівацца выключна са шведамі. Усе гэтыя напады зліліся ў адзін вялікі напад — шведскую навалу. Такім чынам, ужо на пачатку XX ст. у памяці жыхароў Клецка шведская інтэрвенцыя асімілявала ўсе варожыя напады, у тым ліку татарскія набегі. У гэтых умовах бітва на Красным Ставе, памяць пра жорсткі характар якой захоўвалася ў народнай памяці, пачала асацыіравацца выключна са шведамі, якім супрацьстаялі расійскія войскі на чале з царом Пятром. Нягледзячы на змену ўдзельнікаў бітвы, змест і характар народных паданняў пра яе застаўся ранейшым: бітва была надзвычай крывавай, кроў забітых і параненых афарбавала воды става ў чырвоны колер, чаму пазней той і стаў называцца Красным, шведы былі разбітыя. Апошняе

супярэчыць рэальнаму ходу бітвы, у ходзе якой рускія войскі пацярпелі сур'ёзнае паражэнне.

Краснастаўская бітва таксама паступова змяніла лакалізацыю. У сувязі з размежаваннем зямельных валоданняў у ваколіцах Клецка назва «Красны Стаў» замацавалася выключна за фальваркам, які знаходзіўся на паўднёва-заходняй ускраіне горада. У выніку ў масавай народнай свядомасці гэтая частка горада стала атаясамлівацца з Краснастаўскай бітвай.

Змест легенды пра Пакроўскую (Арынскую) царкву, а таксама розныя іншыя паданні пра шведаў засведчылі не толькі з'яўленне ў масавай свядомасці насельніцтва Клецка вобраза новага «чужога». З'явіліся таксама новыя «свае». Імі сталі расійскія войскі, расійскія манархі. Менавіта з імі звязваліся ўсе слаўныя старонкі гісторыі горада. Менавіта яны баранілі мясцовае насельніцтва ад ворагаў. Новыя «свае» ў другой палове XIX ст. канчаткова выціснулі ў масавай свядомасці ранейшых «сваіх». У гэты час былі канчаткова забыты дзяржаўныя традыцыі ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Нагадаем, што прайшло ўсяго нейкіх 50 гадоў з часу ліквідацыі Літоўскага Статута, Віленскага ўніверсітэта і ўніяцкай царквы.

Гэты факт адлюстроўвае працэс убудавання памяці клецкай гарадской супольнасці, як і іншых беларускіх гарадоў, у кантэкст гістарычнай памяці Расійскай імперыі. Расійская самаўладная дзяржава, за больш чым стагоддзе прысутнасці ў палітычным, эканамічным і культурным жыцці краю сталі «сваімі». Расійская гісторыя стала для мясцовых жыхароў «сваёй». У яе кантэкст упісваліся ўсе падзеі лакальнай гісторыі. Мясцовая памяць стала невялічкай часткай агульнарасійскай памяці. Ранейшая памяць клецкай мяшчанскай супольнасці была цалкам выцеснена з масавай свядомасці.




Клецкі замак у XVI ст. Рэканструкцыя Анатоля Кірыка.




Рэпрадукцыя гравюры Тамаша Макоўскага XVII ст. Музей гісторыі Клеччыны.




**Карта Клецка 1868 года. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі.**



**Крыж на меркаваным полі бітвы пад Клецкам. Гравюра XIX ст.**



Мячэт у Клецку. Здымак 1930-х гг.



Клецкае замчышча з боку колішняга Віленскага тракту (цяпер дарога Клецк–Ляхавічы).

# 4. Рэканструкцыя бітвы пад Клецкам 1506 г.

## 4.1. Агульныя меркаванні

### 4.1.1. Цяжкасці, звязаныя з рэканструкцыяй бітвы ў Сярэднявеччы і пачатку Новага часу

Любая спроба рэканструкцыі бітвы настолькі аддаленай ад нашага часу эпохі з'яўляецца няўдзячнай справай. Па-першае, сярод летапісцаў і храністаў было мала асоб, што былі непасрэднымі відавочцамі той ці іншай бітвы або чэрпалі звесткі пра падзею з першых вуснаў. Як ужо адзначалася, усе летапісныя нарацыі пра Клецкую бітву, уключаючы Хроніку Быхаўца і творы Стрыйкоўскага, належалі да значна пазнейшага часу. Больш раннія звесткі пра Клецкую бітву, што датуюцца часам, калі яшчэ маглі жыць непасрэдныя ўдзельнікі і відавочцы падзеі, надзвычай сціплыя і малаінфарматыўныя. Воіны, што вярталіся дамоў, безумоўна, дзяліліся ўласнымі ўспамінамі, але не заўсёды побач з імі быў той, хто мог перанесці іх на паперу. Так успаміны паступова знікалі разам з відавочцамі падзеі. Але нават калі летапісец знаходзіў такіх асоб, не было ніякай пэўнасці, што атрыманая ім карціна бітвы будзе поўнай. Ва ўмовах адсутнасці надзейнай камунікацыі паміж рознымі аддзеламі войска, ніхто не мог ведаць дакладна, што канкрэтна адбывалася на іншым участку бою. Як вынік, у галаве ўдзельніка не магло быць поўнай карціны падзеі. Гэта, хоць і ў меншай ступені, адносіцца таксама да военачальнікаў. З цягам часу многія дэталі сціраліся з памяці.

Не дзіўна, што калі летапісец праз нейкі час пачынаў пісаць пра бітву, у яго распараджэнні было зусім мала фактаў, пры дапамозе якіх ён мог бы аднавіць ход падзеі мінулага. Таму аўтар часта мусіў абапірацца на свае ўласныя ўяўленні і фантазію. Іншы раз летапісец чэрпаў звесткі пра падзею з розных крыніц, якія супярэчылі адна адной. У выніку атрымліваўся вобраз падзеі, які складаецца з узаемнасупярэчлівых або недапушчальных з пункту гледжання логікі фактаў.

Адпаведна, рэканструкцыя Клецкай бітвы 1506 г., якая прапануецца ніжэй, носіць гіпатэтычны характар. Аўтар не прэтэндуе на вычарпальнае і дакладнае апісанне гэтай гістарычнай падзеі. Ды і ўвогуле, ці будзе калі-небудзь магчымай поўная і дакладная рэканструкцыя Клецкай бітвы, тым больш, што верагоднасць з'яўлення новых пісьмовых крыніц практычна роўная нулю. Дзеля рэканструкцыі Клецкай бітвы 1506 г. мне прыйшлося праштудзіраваць усе наяўныя пісьмовыя крыніцы па тэме. Акрамя таго, каб лакалізаваць хоць бы больш-менш прыблізна месца, дзе магла адбыцца бітва, было праведзена вывучэнне мясцовага ландшафту. На гэтым няпростым шляху, які заняў многія гады, не абышлося без расчараванняў, памылак і радасці адкрыццяў.

### 4.1.2. Вобраз бітвы ў наратыўных крыніцах канца XV — пачатку XVI ст.

У гістарычных крыніцах ВКЛ XV — пачатку XVI ст. не існавала яшчэ выразнай і строгай тэрміналагічнай дыферэнцыяцыі паміж бітвай і простым сутыкненнем. Лічылася толькі, як і паўсюль у сярэднявечнай Еўропе, што кожнае змаганне павінна знайсці ў аналах воінскай славы сваё месца і назву[1]. Для азначэння бітвы і сутыкнення выкарыстоўваліся адны і тыя ж тэрміны. Часцей за ўсё ўжывалі паняцці «бой», «сеча», «побоище» і інш. Гэтымі тэрмінамі акрэслівалі самыя буйныя вайсковыя падзеі, што захаваліся ў гістарычнай памяці: Кулікоўскую бітву 1380 г.[2], бітву на Ворскле 1399 г.[3], Грунвальдскую бітву 1410 г.[4], бітву пад Вількамірам 1435 г.[5].

Пачынаючы з 30-х гг. XVI ст., каб адрозніць бітву ад простага ваеннага сутыкнення, у дачыненні да першай сталі выкарыстоўваць тэрмін «вялікі бой»[6]. З сярэдзіны XVI ст. у сталы ўжытак уваходзіць

[1] Хейзинга Й. Осень средневековья: Исследование форм жизненного уклада и форм мышления в XIV и XV вв. во Франции и Нидерландах. Москва, 1988. С. 112.

[2] «и бысть сеча сеча люта чрес весь день сентебря в 8» (ПСРЛ. Т. 32. С. 29).

[3] «Бысть побоище князю великому Витовту с Темиръ-Кутлуем царем…» (ПСРЛ. Т. 32. С. 31).

[4] «На ту осень бысть побоище королу Ягаилу, именемъ Владиславу, и князю великому Витовту Кестутевичъ с немъци и с пруси во Прусъкой земли, межи городы Дубровны и Остреда» (ПСРЛ. Т. 32. С. 55).

[5] «И князь Михаило прииде со всею силою литовъскою и с ляхи, и бысть им бои с Шъвитригаилом на Семенъ день, на летопроводца, а билися за Вилкомирем реце…» (ПСРЛ. Т. 32. С. 35).

[6] Хроніка Рачынскага, паведамляючы пра змаганне новагародскага князя Траняты з заволжскім ханам Курдасам, адзначае, што яны «вчынили бой вельми великий», а князь новагародскі Рынгальт, змагаючыся з рускімі князямі, «вчынил з ними бой

слова «бітва». Гаворачы пра змаганне на Грунвальдскім полі, укладальнік Хронікі Быхаўца адназначна называе яго «бітвай»: «Y koli wżo wsi woyska z obu storon byli pohotowe, tohdy korol Jagoylo y kniaź weliki Witolt tiahnuli ku bitwi wse lesnymi a zlymi dorohami»[7]. Гэты храніст таксама называе бітвай змаганне пад Хойніцамі 1454 г.[8]. Пэўны час у гістарычных крыніцах сярэдзіны XVI ст. новы тэрмін «бітва» працягваў суіснаваць з традыцыйным «бой». Пра гэта выразна сведчыць такі эклектычны твор, як Хроніка Быхаўца, укладальнік якога пры апісанні змаганняў на Вядрошы, пад Давыд-Гарадком і пад Клецкам выкарыстоўвае апошні тэрмін[9].

Толькі ў другой палове XVI ст. тэрмін «бітва» выцясняе тэрмін «бой» з наратыўных крыніц. Хроніка Літоўская і Жамойцкая адназначна называе змаганні на Вядрошы 1500 г. і пад Оршай 1514 г. «бітвамі»[10]. Навагародскі шляхціц Фёдар Еўлашоўскі называе ваеннае супрацьстаянне на Уле 1564 г. «бітвай»[11]. Тэрмін «бітва» пераважае таксама ў перакладных помніках, што распавядалі пра рыцарскія подзвігі: «Аповесць пра Трышчана», «Гісторыя пра Атылу, угорскага караля», «Аповесць пра Баву» і інш. Разам з тым, паступова ў старабеларускую мову пранікае тэрмін «валка», што сведчыць пра польскі культурны ўплыў у ВКЛ. Гэты тэрмін выкарыстоўваецца ў перакладной «Траянскай гісторыі», «Траянскай аповесці», «Александрыі».

На працягу XVI ст. тэрмін «бітва» паступова пранікае як у дзелавое пісьменства, так і ў эпісталярны жанр. Нягледзячы на тэрміналагічны разнабой, тагачасныя аўтары ўсё ж такі адрознівалі бітву ад узброенага сутыкнення. Бітва з'яўлялася вынікам негалоснай згоды абодвух военачальнікаў вырашыць на болі бою зыход змагання паміж імі. У той жа час, сутыкненне было часцей за ўсё вынікам выпадковай або нeспадзяванай сустрэчы праціўнікаў. Бітва — гэта свайго роду пашыраны варыянт дуэлі, дзе ўдзельнічаюць сапернікі разам са сваімі сябрамі і сіламі[12]. Вось што гаворыць Хроніка Быхаў-

---

вельми великий» (ПСРЛ. Т. 32. С. 131). У дачыненні да бітвы на Ворскле таксама выкарыстоўваецца тэрмін «boy weliki» (ПСРЛ. Т. 35. С. 148).

[7] ПСРЛ. Т. 35. С. 150.

[8] Тамсама. С. 161—162.

[9] Тамсама. С. 167, 170, 172.

[10] Тамсама. С. 100, 105.

[11] «А потом, за наступлением и поднесенем войны от короля его милости Жикгимонта Августа с кнезем Иваном московским, былем першший раз на войне, где и битва была нашим щастлива над москвою року 1564, месяца генваря 26, на Иван полю над рекою Улою» (Старажытная беларуская літаратура… С. 233).

[12] Duby G. Le dimanche de Bouvines, 27 juillet 1214. Paris, 1985. P. 190—208.

ца: «W leto od poczatku sweta szest tyziacznoie dewiatsotnoie dwadcat perwoie, a od božyiaho naroženia tysiacza czetyrysta dwanatcatoie, poczałasia walka korolu polskomu Władysławu Jagoyłu, a bratu ieho welikomu kniaziu litowskomu Witoltu z nemcy pruskimi. Y sobrali meży soboiu woyska welikii z obu storon. Korol Jagoyło so wsimi mocami koruny Polskoie, a kniaź Witolt so wsimi siłami litowskimi y ruskimi, y z mnohimi tatary ordynskimi; a mistr pruski także z mocami swoimi y so wseiu Reszoiu Nemeckoiu»[13]. Князь Канстанцін Астрожскі з раднымі панамі, даведаўшыся, што маскоўскія ваяводы чакаюць літоўскае войска каля Дарагабужа, «radu a wmysl swoy na tom położyli, małol mnoho moskwicz budet, tolko wzemszy Boha na pomocz bitysia s nimi, a ne biwszysia nazad ne wernutysia, no ity, y wse pryłuczywszesia widyty, ino szto budet wola božaia»[14].

Раз праціўнікі пастанавілі рашыць зыход змагання ў бітве, яны павінны былі выбраць месца, дзе маглі б памерацца сіламі. Гэта павінна было быць «местцо слушное до битвы»[15]. Найлепей для бітвы падыходзіла роўнае і шырокае поле. Аднак, часцей за ўсё, выбар быў абмежаваны. Часам прыходзілася доўга і ўпарта дабірацца да такога месца. Хроніка Быхаўца паведамляе: «Y koli wżo wsi woyska z obu storon byli pohotowe, tohdy korol Jagoyło y kniaź weliki Witolt tiahnuli ku bitwi wse lesnymi a złymi dorohami, a pola rownoho a szyrokoho ne mohli mity, hde by sia mili ku bitwe zastanowity, nižli tolko byli pola rownyja a welikije pod mestom nemeckim pod Dubrownom»[16]. У 1500 г. гетман Канстанцін Астрожскі і радныя паны «ydosza putem swoim od Lopatyna do Wedroszy dwe mili lesom y hraziu zloiu, y z welikoiu nuždoiu y trudnostiu ledwo pereszli za les, y skoro wyszli na pole…»[17]. Іншы раз прыходзілася перапраўляцца праз шырокія і глыбокія рэкі. Так, у 1514 г. войска ВКЛ і Польшчы было вымушана пераправіцца праз Дняпро ў тым месцы, дзе стаяла лагерам маскоўскае войска. Дзеля пераправы былі своечасова падрыхтаваны масты, па якіх удалося ў цэласці і захаванасці пераправіць не толькі жывую сілу, але і гарматы. Храніст не без гонару адзначае, што частка гаспадарскага войска (*комонник литовский*) у складзе 16 тысяч чалавек у парадным

---

[13] ПСРЛ. Т. 35. С. 150.

[14] Тамсама. С. 167.

[15] Тамсама. С. 105.

[16] Тамсама. С. 150.

[17] Тамсама. С. 167. Пра цяжкі пераход гаспадарскага войска да Вядрошы паведамляе таксама Хроніка Літоўская і Жамойцкая: «А так Константин... ишол просто, хотячи з москвою звести битву, тягнул з войском своим две миле тесным лесом и дорогою болотною» (ПСРЛ. Т. 35. С. 100).

шыхце здолела пераправіцца праз Дняпро ў раёне Оршы, страціўшы пры пераправе ўсяго аднаго чалавека[18].

Ва ўяўленні сучаснікаў бітвы вызначаліся ўпартасцю. Яны звычайна суправаджаліся вялікімі ахвярамі. Хроніка Быхаўца паведамляе пра пачатак бітвы пад Грунвальдам: «A zatym tyie hetmanowe woysko zszychowawszy potiahnuli ku bitwe, a nemcy także, widiaczy to, poczali sia s nimi potykaty, y poczałasia bitwa z porania meży nemcy i woyski litowskimi, y mnohoie mnożestwo z obu storon woyska litowskoho i nemeckoho pało»[19]. Апавядаючы пра бітву пад Оршай, ананімны храніст адзначаў: «А тая война была в пяток на Рожество Пресвятыя Богородицы и была война великая, бо москвы было пятькрот болш, ниж поляков, руси и литвы»[20]. Звычайна бітва доўжылася ледзь не цэлы дзень: «почанши от поранка аж до вечара самого»[21].

Зыход бітвы звычайна разглядаўся ў святле Боскага наканавання[22]. Перамога ў бітве ўяўлялася як вынік дапамогі Усявышняга[23]. Дарэчы, князь Міхаіл Глінскі, а таксама кароль і вялікі князь Аляксандр разглядалі перамогу ў бітве пад Клецкам не інакш, як вынік Боскай ласкі і дапамогі[24]. Паражэнне бачылася як сведчанне ўласных грахоў.

Пераможца ў бітве мог разлічваць на багатую здабычу: «И князь великий Скиргайло, одержавши звитежство и добытку великого, злата и сребра, каменя, жемчугу, и шат дорогих набравши, отиде восвояси»[25]. Часта землі і ўладанні прайграўшага станавіліся арэнай рабункаў з боку пераможцаў. Гаворачы пра перамогу Ягайлы і Вітаўта пад Грунвальдам, Хроніка Быхаўца адзначала: «A zatym wsich ich poraziwszy y mnohiie horody i zemli ich pobrawszy, a ostatok na konec wypleniwszy y wypaliwszy, y pustu zemliu wczyniwszy»[26]. Нярэдка пераможцу даставаўся вялізны палон уключна з вайсковым

[18] ПСРЛ. Т. 35. С. 105.

[19] Тамсама. С. 151.

[20] Тамсама. С. 105.

[21] ПСРЛ. Т. 32. С. 131.

[22] Гл. падрабязней: Duby G. Le dimanche de Bouvines… P. 191.

[23] «И поможе Бог великому князю Рынкгалту, аж князеи руских и всю силу их и орду татаръскую наголову поразил» (ПСРЛ. Т. 32. С. 131); «И помогл Бог войску полскому и литовскому, иж всю москву наголову побили» (ПСРЛ. Т. 35. С. 105).

[24] AA. S. 546—548.

[25] ПСРЛ. Т. 32. С. 131.

[26] ПСРЛ. Т. 35. С. 151.

кіраўніцтвам пераможаных. Падобнае адбылося з войскам ВКЛ у бітве на Вядрошы 1500 г. Літва адыгралася праз 14 гадоў у бітве пад Оршай, калі былі захоплены ў палон маскоўскія ваяводы. У бітве пад Клецкам 5 жніўня 1506 г. воіны Міхаіла Глінскага адбілі ў татараў вялікі палон і захапілі вялізную здабычу, у тым ліку і баявых коней: «Y napołniniwszy ruki zołota y srebra, y zbroy, y odeżd, y koney mnohocennych, y newymownyia radosty y weselija napołniwszesia tuiu nocz prebyli z pokoiem»[27].

Пераможцы з трыумфам вярталіся дамоў. Пасля Грунвальда Ягайла і Вітаўт «z welikoiu czestiui y z newymownym zwitiażstwom, y na weś swet znamenituiu slawu osiahnuwszy, za sia do swoich zeml dojechali, y połowicu choruhwey nemeckich y borody mistrowu y wsich kuntorow jeho z mertwych obodrawszy, y połowicu wziali do Polski, a połowicu do Litwy, hde ż tyie borody y choruhwi ich w zamku Krakowskiom w cerkwi swiatoho Stanislawa, a w Wilni także u swiatoho Stanisława zaweszony sut»[28]. Найвялікшы трыумф быў арганізаваны каралём і вялікім князем Жыгімонтам у Вільні для пераможцы бітвы пад Оршай князя Канстанціна Іванавіча Астрожскага[29].

Звернем увагу на яшчэ адну акалічнасць. Паступова, на працягу XV ст., сярод еўрапейскага рыцарства мяняецца стаўленне да бітвы. Дагэтуль буйнамаштабныя бітвы былі ў Еўропе рэдкасцю, і ВКЛ не было выключэннем. У XIV—XV стст. адбылося не так і шмат бітваў, у якіх бралі ўдзел воіны з Літвы і Русі. Можна прыгадаць бітвы на Стрэве 1348 г., на Ворскле 1399 г., пад Грунвальдам 1410 г., пад Хойніцамі 1454 г. і, нарэшце, напаўміфічную бітву на Сініх Водах 1362 г. Не ў апошнюю чаргу нежаданне ўступаць у бітву было выклікана тымі рызыкамі, што суправаджалі ўдзел у падобнай падзеі. Паколькі наступствы паразы падаваліся сур'ёзнымі, военачальнікі аддавалі перавагу іншым сродкам дасягнення перавагі над праціўнікам (напрыклад, спусташэнню яго земляў). Так паступалі паўсюдна ў Еўропе[30]. Адмова ад удзелу ў бітве не разглядалася як ганьба, але хутчэй як праява развагі і мудрасці.

---

[27] ПСРЛ. Т. 35. С. 172.

[28] Тамсама. С. 151.

[29] «Потым король войско роспустил, границу жолнерами осадивши, а князя Константина з триумфом в Вилню вдячне приймовал и до Острога, ударовавши, отпустил» (ПСРЛ. Т. 35. С. 106).

[30] Гл. развагі вядомага брытанскага гісторыка войнаў Майка Прэствіча пра характар войнаў Сярэднявечча: Prestwich M. Armies and Warfare in the Middle Ages: The English Experience. New Haven—London, 1996. P. 306—308.

У эпоху Рэнесансу ўсё змянілася. Эпоха італьянскіх войнаў, па меншай меры, з 1494 па 1525 гг., пабачыла значна больш бітваў, чым усе папярэднія эпохі[31]. Ніколі яшчэ военачальнікі не давалі столькі бітваў, як у гэтую эпоху. Таксама і ВКЛ пачынаючы з 1500 г. уступіла ў эпоху бітваў, якімі суправаджалася амаль усё XVI ст. Змена формаў вядзення вайны была выклікана, галоўным чынам, тэхнічным прагрэсам, з'яўленнем новых відаў ваеннай тэхнікі[32]. У першую чаргу гаворка ідзе пра ўдасканаленне старых і з'яўленне новых сродкаў вядзення бою. Агнястрэльная зброя і артылерыя павысілі агнявую магутнасць войска. З іх дапамогай военачальнікі небеспадстаўна спадзяваліся ўзяць верх над праціўнікам. Распаўсюджанне новай тактыкі адкрытага бою, якая традыцыйна звязваецца з англійскімі лучнікамі і нямецкімі пехацінцамі-кнехтамі, зрабіла больш прываблівай бітву як сродак вырашэння збройнага канфлікту. Нарэшце, яшчэ адным фактарам, які істотна павышаў прэстыж бітвы, былі пачуццё гонару і ўпартасць — рысы, уласцівыя многім военачальнікам той эпохі. Бітва, а тым больш выйграная бітва, успрымалася як надзейны сродак упісаць сваё імя ў аналы гісторыі, дасягнуць зямной і вечнай славы. Так атмасфера эпохі Рэнесансу з яе культам асабістай славы ўплывала на паводзіны воінаў на полі бою. Яна змушала іх добра падумаць, перш чым ухіліцца ад бою.

## 4.2. Ваенныя сілы праціўнікаў

### 4.2.1. Войска ВКЛ

З пункту гледжання гісторыі вайсковага майстэрства ў ВКЛ, бітва пад Клецкам 1506 г. стала пераломным момантам. Яна сведчыла пра перамены, што закранулі ўзброеныя сілы дзяржавы ў эпоху Рэнесансу. Пад Клецкам аформілася цэлая праграма далейшай рэарганізацыі ўзброеных сіл ВКЛ, якая, на жаль, пазней была рэалізавана толькі часткова.

Бітву пад Клецкам 1506 г. нельга разглядаць у адрыве ад змен канца XV — першай паловы XVI ст. у развіцці еўрапейскай вайсковай справы. Палігонам, дзе адбывалася апрабацыя новай зброі і тактыкі, служыла Італія, дзе сутыкнуліся інтарэсы буйнейшых еўрапейскіх дзяржаў. Ваенныя дзеянні на Апенінскім паўвостраве, якія

[31] Hall B. Weapons and warfare in renaissance Europe: Gunpowder, technology, and tactics. Baltimore—London, 1997. P. 165.

[32] Тамсама. P. 165.

з перапынкамі доўжыліся больш за паўстагоддзя (1494—1559), засведчылі істотныя інавацыі ў еўрапейскай вайсковай справе. Гэтыя змены закранулі ўзброеныя сілы практычна ўсіх удзельнікаў канфлікту. Бліжэйшым суседам ВКЛ і Кароны, які браў актыўны ўдзел у італьянскіх войнах, была імперыя Габсбургаў. Сам імператар Максіміліян І зарэкамендаваў сябе як буйны рэфарматар вайсковай справы, якога сучаснікі называлі «апошнім рыцарам» (*der letzte Ritter*) або «айцом ландскнехтаў» (*Vater der Landsknechte*)[33]. Імператар праяўляў клопат не толькі пра пехацінцаў: ён ніколі не забываўся пра кавалерыю. Аснову габсбургскай кавалерыі і гонар самога Максіміліяна складала выдатна ўзброеная цяжкая конніца. Улічваючы спецыфіку баявых дзеянняў, якія яму прыходзілася весці, імператар не грэбаваў таксама лёгкай кавалерыяй. Да коннай службы прыцягваліся не толькі землеўласнікі, але таксама гараджане і сяляне. Сама конная служба ў часы Максіміліяна пачала добра аплачвацца. Нарэшце, імператар спрычыніўся да развіцця артылерыі, якая шмат у чым была ўзорнай і пераўзыходзіла адпаведныя службы іншых еўрапейскіх дзяржаў.

Адначасова Максіміліян І Габсбург паказаў сябе здольным военачальнікам. Для яго былі ўласцівыя быстрыня манеўру, неспадзяванасць падыходу, ваенная хітрасць, уменне сабраць галоўныя сілы на важнейшым участку. Ён ахвотна шукаў бітвы з праціўнікам, якую разглядаў як найбольш хуткі спосаб вырашыць зацягнуты ўзброены канфлікт. Неаднаразова імператар з'яўляўся ў самых гарачых кропках на полі бою, дэманструючы асабістую мужнасць.

Еўрапейскія інавацыі ў вайсковай справе не засталіся незаўважанымі ў дзяржавах ягелонскай кааліцыі. Першымі, хто мог азнаёміцца з навінкамі ў тэхніцы і тактыцы, былі, несумненна, знатныя наёмнікі з ВКЛ і Польшчы, якія служылі ў войсках дзяржаваў – удзельніц канфлікту на Апенінах. Сярод іх былі, як адзначалася вышэй, князі Канстанцін Астрожскі і Міхаіл Глінскі. Яны неслі вайсковую службу ў імператара Максіміліяна І Габсбурга. Дзякуючы такім здатным воінам, як Астрожскі і Глінскі, асобныя заходнееўрапейскія навінкі пачалі пастулова з'яўляцца на абшарах ВКЛ. У гэтым раздзеле будзе зроблена спроба выдзеліць толькі асобныя новыя з'явы ў вайсковай справе, асабліва інавацыі ў тактыцы вядзення адкрытага бою, якія атрымалі распаўсюджанне ў гаспадарскім войску на пачатку XVI ст.

---

[33] Падрабязней: Wiesflecker H. Kaiser Maximilian I: Das Reich, Österreich und Europa an der Wende zur Neuzeit. Bd. 5: Der Kaiser und seine Umwelt: Hof, Staat, Wirtschaft, Gesellschaft und Kultur. München, 1986. S. 501—562.

Змены, якія пачалі адбывацца ў войску ВКЛ у канцы XVст., закраналі многія сферы вайсковай справы. У першую чаргу, яны адносіліся да метадаў камплектацыі і фарміравання войска. Асновай узброеных сіл ВКЛ па-ранейшаму заставалася паспалітае рушанне[34]. Кожны землеўласнік мусіў служыць асабіста і адначасова выстаўляць пэўную колькасць конных воінаў са сваіх уладанняў[35]. Самай дробнай арганізацыйнай адзінкай паспалітага рушання было кап'ё-почат, якое звычайна складалася з аднаго коннага воіна, узброенага кап'ём, і некалькіх конных стральцоў (арбалетчыкаў). У сваю чаргу, коп'і-початы аб'ядноўваліся ў харугву, якая выступала ў якасці галоўнай арганізацыйна-тактычнай адзінкі войска ВКЛ. Аднак у згаданы час такая форма мабілізацыі — паспалітае рушанне — перажывала сур'ёзны крызіс. У сувязі з развіццём гаспадарчых адносін у дзяржаве і паступовым фарміраваннем фальваркавай сітэмы, многія ваеннаабавязаныя землеўласнікі сталі цягаціцца вайсковай службай і ігнараваць загады гаспадара або гетмана. Стала відавочным, што служба з надзелу ўвайшла ў супярэчнасць з патрабаваннем часу. Паступова, асабліва са з'яўленнем наёмнікаў, у войску ВКЛ узрастаючае значэнне набывае кантракт, а таксама грашовая выплата. Вайсковая служба пачынае засноўвацца не на зямельным наданні, з якога неабходна служыць гаспадару, а на грашовым жалаванні.

Са з'яўленнем новых формаў камплектацыі і вярбоўкі ў войску ВКЛ адбываюцца істотныя структурныя зрухі. Паспалітае рушанне, якое працягвала следаваць старой традыцыі, ужо не адпавядала апошнім еўрапейскім тэндэнцыям вядзення вайны. Так, напрыклад, адным з сур'ёзных наступстваў італьянскіх войнаў канца XV — першай паловы XVI ст. быў паступовы заняпад конніцы, асабліва цяжкай, і рост значэння пяхоты[36]. Варта згадаць швейцарскіх пікінёраў і нямецкіх ландскнехтаў, якія бліскуча зарэкамендавалі сябе на Апенінах.

Паколькі паспалітае рушанне ВКЛ у першых сутыкненнях з ворагам у канцы XV — пачатку XVI ст. паказала сваю малаэфектыўнасць, неўзабаве былі прынятыя меры па яго рэарганізацыі і ўмацаванні

[34] Сагановіч Г. Войска Вялікага Княства Літоўскага ў XVI—XVII стст. Мінск, 1994. С. 6—17. Лясмайціс Г. Ад Вядрошы да Оршы. Змены ў сітэме камплектавання войска ВКЛ // ARCHE. 2014. № 12. С. 130—132.

[35] Бохан Ю. Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV — канца XVI ст. Мінск, 2002. С. 233—234.

[36] Hall B. Weapons and Warfare in Renaissance Europe. Gunpowder, technology, and tactics. Baltimore—London: John Hopkins University Press, 1997. P. 157—158.

дысцыпліны. У першую чаргу, былі зроблены захады па рэгламентацыі нясення ваеннай службы. Ужо на Навагародскім сойме 1502 г. было пастаноўлена, каб кожны землеўласнік выстаўляў з дзесяці службаў аднаго ўзброенага кап'ём конніка[37]. Пазней такая ці падобная рэгламентацыя знойдзе яскравае адлюстраванне ў соймавых пастановах і Статуце ВКЛ. Пазней, ужо пасля Клецкай бітвы, былі зроблены спробы павысіць вайсковую дысцыпліну. Ва Уставе, прынятай на Віленскім вальным сойме 1507 г., былі прадугледжаны надзвычайныя рэпрэсіўныя меры, уключна са смяротным пакараннем, у дачыненні да тых землеўласнікаў, якія не з'явіліся ў вызначаны тэрмін на вайну[38]. Для ўдоваў за падобнае парушэнне быў прадугледжаны штраф у 100 рублёў або, у крайнім выпадку, канфіскацыя маёнтка. Усе землеўласнікі былі абавязаны перапісаць усіх людзей ва ўласных маёнтках, а спісы перадаць гаспадару, які павінен быў вызначыць памер і характар службы кожнага[39]. Нарэшце, Устава прадугледжвала карныя захады супраць дэзерціраў з гаспадарскага войска. Парадак нясення ваеннай службы, а таксама правы і паўнамоцтвы гетмана былі вызначаны ва Уставе, прынятай на вальным сойме ў Берасці ў 1511 г.[40].

Па-другое, адбывалася далейшая дыферэнцыяцыя коннага войска. На мяжы XV—XVI стст. у ВКЛ фарміруюцца новыя тыпы кавалерыі. Пад заходнееўрапейскім, галоўным чынам, польскім, уплывам з'яўляецца цяжкая рыцарская кавалерыя. У бітве пад Клецкам яна была прадстаўлена польскай надворнай харугвай у складзе 300 рыцараў. Гэта былі з галавы да ног закаваныя ў жалеза вершнікі, узброеныя кароткім кап'ём або арбалетам (самастрэлам). Цяжкая кавалерыя па зразумелых прычынах не магла браць непасрэднага ўдзелу ў бітве з лёгкаўзброенай татарскай конніцай. Яе роля звялася пераважна да застрашэння ворага або штурму варожага лагеру. На другіх франтах, у прыватнасці на ўсходнім, дзе з канца XV ст. ішло перманентнае змаганне з Маскоўскай дзяржавай, цяжкая кавалерыя хоць і мела больш шырокае, але ўсё ж такі дастаткова абмежаванае выкарыстанне. Увогуле, яна канчаткова страціла самастойнае значэнне ў баявых дзеяннях і мусіла дзейнічаць ва ўзаемадзеянні з іншымі родамі войска.

---

[37] Бохан Ю. Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV — канца XVI ст. С. 245.

[38] LM. Užrašymų knyga 8. P. 296.

[39] Тамсама. Р. 296.

[40] Тамсама. Р. 308—309.

Адначасова ў войску ВКЛ істотна ўзрастае доля і значэнне лёгкай кавалерыі. Пад усходнім (сербска-венгерскім і татарскім) уплывам у войску ВКЛ пачалі з'яўляцца аддзелы лёгкаўзброенай конніцы. У першую чаргу трэба адзначыць рацаў, якія так бліскуча зарэкамендавалі сябе ў бітве пад Клецкам. Рацы паходзілі з Сербіі, дзе выдатна паказалі сябе ў барацьбе з туркамі. Пасля падзення Сербскага каралеўства яны перайшлі на службу да венгерскіх каралёў. Польскі храніст Ян Длугаш згадвае *Cohors Raczanorum* у бітве над Савай у 1463 г. Пасля смерці ў 1490 г. венгерскага караля Мацея Корвіна многія рацы падаліся на службу да польскага караля Яна Ольбрахта, дзе працягвалі змагацца з туркамі і татарамі. У ВКЛ рацы з'явіліся на самым пачатку XVI ст. Гэта было звязана з дзейнасцю князя Міхаіла Львовіча Глінскага, які мусіў высока ацаніць іх баявыя якасці яшчэ ў часе сваёй ваеннай службы ў Еўропе. Роднасныя сувязі Глінскіх з сербскім родам Якшычаў, многія прадстаўнікі якога камандавалі аддзеламі рацаў у Венгрыі, толькі спрыялі прытоку рацаў у ВКЛ.

Слова «рац» паходзіла ад назвы сербаў у лацінскіх крыніцах «rascianus», адкуль яна пранікла ў венгерскія крыніцы ў форме «racz» (па назве адной з зямель Сербскага каралеўства — Рашка). У сярэднявеччы паняцці «сербскі» і «рашскі» былі сінанімічнымі. У тагачасных крыніцах Сербскае каралеўства часта называлася Рашскім каралеўствам. Адпаведна, самі сербы звыкла называлі сябе рацамі. Гэтак, напрыклад, завецца старэйшы сучаснік Міхаіла Глінскага Канстанцін Міхайлавіч, аўтар знакамітых «Нататак янычара» (1500 г.)[41]. Цікавасць уяўляе народная этымалогія слова «рац», досыць распаўсюджаная ў сярэднявеччы. Так, аўтар «Вялікай хронікі пра Польшчу, Русь і іх суседзяў» выводзіць назву Рашскага каралеўства ад слова «рац», што азначала след мноства коней, сабраных у войска. Адсюль паходзіць назва мноства вершнікаў — «рацы»[42].

Рацы з'яўляліся найманым войскам і дзейнічалі асобна ад паспалітага рушання. Як лёгкая кавалерыя, рацы былі ўзброены толькі дзідай і тарчай, што рабіла іх надзвычай манеўранымі і хуткімі. На полі бою яны выконвалі не толькі функцыю выведкі, але таксама праводзілі дыверсійную дзейнасць у тыле ворага, а ў часе адступлення праціўніка актыўна праследавалі яго. Яны мусілі выконваць

[41] Записки янычара (Хроника о турецких делах Константина, сына Михаила Константиновича из Островицы раца, который был взят турками среди янычар) / Введ., перевод и коммент. А. И. Рогова. Москва, 1978. С. 35.

[42] Великая хроника о Польше, Руси и их соседях XI—XIII вв. / Под ред. В. Л. Янина. Москва, 1987. С. 35.

таксама функцыю асабістай варты, «прэтарыянскай гвардыі» князя Міхаіла Глінскага, былі найбольш адданым аддзелам тагачаснага надворнага маршалка. Пасля Клецкай бітвы 1506 г. рацы бралі ўдзел амаль ва ўсіх збройных канфліктах, у якіх удзельнічала войска ВКЛ. Асабліва вызначыліся яны ў бітве на Крапівенскім полі 1514 г. Рацы паклалі пачатак крылатай гусарыі ў Польшчы і ВКЛ, якая так бліскуча зарэкамендавала сябе ў войнах Рэчы Паспалітай другой паловы XVI—XVII стст.

Да лёгкай кавалерыі ў войску ВКЛ адносіліся таксама шматлікія татарскія аддзелы, якія яшчэ ў канцы XIV ст. пачалі з'яўляцца на землях дзяржавы[43]. У сувязі з узрослай у канцы XV ст. небяспекай з боку Крымскага ханства і Маскоўскай дзяржавы колькасць татараў на гаспадарскай ваеннай службе пачала няўхільна павялічвацца, а іх роля ў змаганні з праціўнікам — узрастаць. Татарская конніца рэкрутавалася звычайна з татараў, якія пражывалі на тэрыторыі ВКЛ, пераважна ў Троцкім і Навагародскім паветах. Гэтая лёгкая конніца была ўзброена лукамі, шаблямі, нажамі, зрэдку чаканамі[44]. Дзякуючы аператыўнасці і дысцыплінаванасці татарская лёгкая кавалерыя была незаменным элементам у войнах ВКЛ першай паловы XVI ст. Яе выкарыстоўвалі на полі бою, пры праследаванні адступаючага ворага, у рэпрэсіўных акцыях супраць насельніцтва на варожай тэрыторыі, а таксама на выведнай службе. Такім чынам, функцыі, якія выконвала татарская конніца ў гаспадарскім войску, у значнай ступені дубліравалі функцыі рацаў. Толькі, у адрозненне ад апошніх, якія з'яўляліся наймітамі, татары ўваходзілі ў склад паспалітага рушання дзяржавы, дзе ўтваралі асобныя харугвы або сцягі. У Кнізе данін Літоўскай Метрыкі 1507 г. згадваюцца татары сцягу Тагушэвіч[45]. Назва сцяга паходзіць хутчэй за ўсё ад асабовага прозвішча[46]. У адпаведнай кнізе 1510 г. згадваюцца два татарскія сцягі на гаспадарскай службе: Тагушэвіч і Алагірскі. Назва Алагірскага сцяга паходзіць ад родавага наймення Ялаір (Джалаір)[47]. У Кнізе данін 1507 г. згадваецца ўсяго 32 татарыны са сцяга Тагушэвіч, якія атрымалі «отправу» ад караля і вялікага князя Жыгімонта Старога, калі той знаходзіўся ў Кракаве. Што да Алагірскага

[43] Tyszkiewicz J. Tatarzy na Litwie i w Polsce... S. 187.

[44] Тамсама.

[45] LM. Užrašymų knyga 8. P. 401—402.

[46] У Кнізе данін 1510 г. згадваецца нейкі Кайка Тагушэвіч, які атрымаў ад гаспадара 8 коп грошаў і 5 локцяў лунскага сукна (LM. Užrašymų knyga 8. P. 420). Улічваючы памер узнагароды, можна меркаваць, што Кайка Тагушэвіч выконваў абавязкі харунжага сцяга.

[47] Думін С., Канапацкі І. Беларускія татары: мінулае і сучаснасць. Мінск, 1993. С. 32.

сцяга, Кніга данін 1510 г. згадвае толькі 8 служылых татараў. Відавочна, гэта далёка не поўныя спісы служылых татараў, а толькі тых, якія асабліва вызначыліся на гаспадарскай службе. І што надзвычай цікава, шасцёра з іх належалі да знанай татарскай сям'і Кенкевічаў з Навагародчыны: Ісак, Банка, Адка, Алехна, Легун (?), Келім. Улічваючы той факт, што раней Ісак, Банка, Адка, Келім Кенкевічы згадваліся ў Кнізе данін 1507 г. як служылыя татары сцяга Тагушэвіч, становіцца зразумелым спосаб утварэння новай татарскай харугвы на гаспадарскай службе. Алагірская харугва ВКЛ мусіла, верагодна, паўстаць на аснове ўжо дзеючай харугвы Тагушэвіч. Яе аснову складалі асобныя татарскія роды і сем'і, а таксама іх аддзелы, што вылучыліся са сцяга Тагушэвіч. Кіруючая роля ў Алагірскай харугве належала роду Кенкевічаў. Магчыма, што новая харугва ВКЛ была створана спецыяльна пад Кенкевічаў, улічваючы іх высокае сацыяльнае паходжанне і заслугі перад гаспадаром. Да іх далучыліся некаторыя іншыя татарскія роды і сем'і, што пражывалі ў ВКЛ. Нарэшце, у склад Алагірскай харугвы мусілі ўвайсці татары, захопленыя ў палон пад Клецкам.

Татарскія сцягі складалі асобны ваенны атрад, на чале якога стаялі харужы і маршалак. Харужы з'яўляўся ў першую чаргу ваенным кіраўніком сцяга, што ўзначальваў апалчэнне ў часе вайны, а маршалак — яго намеснікам[48]. Некаторыя знатныя татары, пераважна княскага паходжання, што вялі свой радавод ад Чынгізхана, маглі выступаць у часе вайны з уласнымі початамі па-за рамкамі харугоўнай арганізацыі татарскага апалчэння. Самы вялікі почат у пачатку XVI ст. мусіў мець царэвіч Азюбек (Аджубек), сын заволжскага хана Шах-Ахмата. Менавіта ён у 1507 г. за верную гаспадарскую службу атрымаў са скарбу 6 коп грошаў[49]. Буйныя початы мелі таксама Улан Асанчуковіч, Касым Булатавіч, Нурум Майкавіч, Бахты-Сеіт і інш.[50]. Не выключана, што царэвіч Азюбек ажыццяўляў вышэйшае кіраванне початамі татарскай вярхушкі на полі бою.

У сувязі з адсутнасцю спісаў сцяга Тагушэвіч, ранейшых за 1507 г., немагчыма дакладна ўстанавіць, хто са згаданых у Кнізе данін служылых татараў браў асабісты ўдзел у бітве пад Клецкам 1506 г. Можна меркаваць, што ўсе згаданыя ў спісе (ці, па меншай меры, большасць з іх) удзельнічалі ў Клецкай бітве і былі шчодра ўзнагароджаны новым гаспадаром за мужнасць. Аднак для падобнага сцвярджэння бракуе дакументальных сведчанняў. Несумненна толькі тое,

---

[48] Думін С., Канапацкі І. Беларускія татары… С. 34—36.

[49] LM. Užrašymų knyga 8. P. 400.

[50] Тамсама. P. 400—401.

што як баявая адзінка войска ВКЛ сцяг Тагушэвіч у складзе Навагародскай харугвы, як і пачаты татарскай вярхушкі (царэвіча Азюбека і інш.), браў непасрэдны ўдзел у Клецкай бітве.

Адзначым, што ўзрослае выкарыстанне лёгкай кавалерыі ў ВКЛ супраць татараў і маскавітаў адпавядала тагачасным агульнаеўрапейскім тэндэнцыям. Лёгкая кавалерыя актыўна выкарыстоўвалася ў італьянскіх войнах. Імператар Максіміліян І Габсбург, які мусіў весці працяглыя войны са стэпавымі народамі Усходу (венграмі, туркамі), ніколі не забываўся пра ўласную конніцу. Венгерская гусарыя брала актыўны ўдзел у вайне ў Фрысландыі. У часе вайны за Венецыю Максіміліян актыўна выкарыстоўваў албанскіх «штрадыётаў» (Stradioten), лёгкую конніцу, якая вызначалася не толькі нязвыклай рухавасцю, але і асаблівай лютасцю[51].

У часы праўлення Аляксандра Казіміравіча ў ВКЛ з'яўляюцца сталыя аддзелы найманых жаўнераў[52]. У іх склад уваходзілі пехацінцы і вершнікі з Польшчы, Чэхіі і Германіі. Першаснай арганізацыйнай адзінкай наймітаў з'яўлялася рота, на чале якой стаяў ротмістр. Аднак, у параўнанні з краінамі Заходняй і Цэнтральнай Еўропы, доля найманых жаўнераў у войску ВКЛ была нязначнай, што абумоўлівалася асаблівасцямі вядзення баявых дзеянняў на ўсходзе і поўдні дзяржавы, а таксама незадавальняючым фінансавым становішчам. Адзначым, што тая арганізацыйная структура найманых жаўнераў, што пачала складвацца ў ВКЛ у часы Аляксандра, без асаблівых змен пратрывала фактычна да канца існавання Рэчы Паспалітай[53]. Даследчыкі вылучаюць у акрэслены час тры асноўныя віды найманага войска: гаспадарскія дваране (служба якіх набліжалася да найманай), іншаземныя жаўнеры, мясцовае найманае войска[54].

У гэты час адбываюцца таксама сур'ёзныя змены ў тэхнічным забеспячэнні войска. Клецкая бітва 1506 г. засведчыла ўзрослую ролю агнястрэльнай зброі і артылерыі ў баявых дзеяннях. У барацьбе з татарамі выкарыстоўваліся пераважна лёгкія гарматы, г. зв. гуфніцы. Гэта былі перасоўныя прылады агнястрэльнай зброі на лафетах, якія можна было лёгка даставіць з адной мясцовасці ў другую або пераставіць з аднаго месца на другое. Артылерыя звычайна

[51] Wiesflecker H. Kaiser Maximilian I… Bd. 5: Der Kaiser und seine Umwelt… S. 554.

[52] Бохан Ю. Наёмнае войска ў Вялікім княстве Літоўскім у XV—XVI стст. Мінск, 2004. С. 13.

[53] Тамсама. С. 26.

[54] Лясмайціс Г. Ад Вядрошы да Оршы... С. 132—139.

распачынала бітву, падрыхтоўваючы наступ кавалерыі на пазіцыі ворага. Яна звычайна размяшчалася наперадзе або пасярод уласных вайсковых шыхтоў. З дапамогай артылерыі спрабавалі не толькі застрашыць ворага, але і нанесці яму ўрон у жывой сіле. Стралялі гуфніцы і гарматы яшчэ пераважна каменнымі снарадамі (кулямі). Малакалькасная лёгкая артылерыя пакуль што адыгрывала толькі дапаможную ролю, але яе значэнне было добра ўсвядомлена вайсковым кіраўніцтвам ВКЛ. Бітва пад Оршай 1514 г., дзе артылерыя мела ўжо самастойнае значэнне, яскрава сведчыць пра гэта[55]. Новае стагоддзе будзе для войска ВКЛ стагоддзем агнястрэльнай зброі і пораху. Гэта мела не толькі ваенныя і эканамічныя, але таксама псіхалагічныя і культуралагічныя наступствы[56].

Бітва пад Клецкам прадэманстравала ўзрастанне значэння вайсковай інжынерыі. Імклівы рух войска па перасечанай мясцовасці вымагаў адпаведных ведаў па фарсіраванні рэк, стварэнні гацяў і мастоў. Так, ваенная інжынерыя блісуча зарэкамендавала сябе пад Клецкам у жніўні 1506 г., калі ў сціслыя тэрміны воінам Глінскага ўдалося падручнымі сродкамі загаціць Сільну, пераправіцца на яе іншы бераг і ўсёй сілай атакаваць ворага. Можна без перабольшання сказаць, што бітва пад Клецкам 1506 г. дала значны штуршок развіццю ваенна-інжынернай думкі ў ВКЛ.

Удасканальвалася таксама фартыфікацыйнае майстэрства. У канцы XV — пачатку XVI ст. быў узмоцнены шэраг памежных замкаў, як на поўдні, так і на ўсходзе дзяржавы. З'явіліся новыя абарончыя збудаванні. У гэты час паўстаў знакаміты Мірскі замак. Сталіца дзяржавы Вільня была абнесена мураванай сцяной на выпадак татарскіх нападаў. Разам з тым, адбываўся далейшы заняпад асобных старых замкаў. Лёс слыннага Крэўскага замка — яскравы таму прыклад. Гаспадарскія замкі былі здольныя супрацьстаяць як інтэнсіўнаму штурму, так і працяглай аблозе. Капітуляцыя смаленскай фартэцыі ў 1514 г. стала вынікам не слабасці мясцовых абарончых збудаванняў, але хітрасці князя Міхаіла Глінскага, які ў той час служыў вялікаму князю маскоўскаму Васілю III, і здрады часткі смаленскага гарнізона.

У стратэгіі вядзення баявых дзеянняў таксама адбыліся пэўныя змены. Па-ранейшаму варагуючыя бакі імкнуліся, галоўным чынам, да вынішчэння і руйнавання тэрыторыі праціўніка, аслаблення яго

[55] Сагановіч Г. Войска Вялікага Княства Літоўскага… С. 53.

[56] Падрабязней на гэту тэму: Hall B. Weapons and warfare in renaissance Europe… P. 202.

ваенна-эканамічнага патэнцыялу. Спусташэнне земляў суседзяў было галоўным сродкам вайсковай стратэгіі Крымскага ханства. Не грэбавалі ім і іншыя дзяржавы. Так, у 1514 г. пасля няўдалай аблогі Смаленска гаспадарскае войска дашчэнту зруйнавала воласці вялікага князя маскоўскага Васіля III. У 1519 г. вялікае маскоўскае войска на «татарскі манер» ажыццявіла знішчальны рэйд у глыб тэрыторыі ВКЛ ледзь не да самой Вільні. Разам з тым, паступова ў якасці альтэрнатывы рабаванню пачынае разглядацца бітва. Часцей за ўсё, аднак, праціўнікі прымянялі абодва сродкі дасягнення стратэгічных мэтаў адначасова.

З пачаткам XVI ст. назіраюцца пэўныя змены і ў тактыцы бою. Бітва пад Клецкам 1506 г. мела важнае значэнне для далейшага ўдасканалення тактыкі баявых дзеянняў. Самае галоўнае, што ў бітве пад Клецкам 1506 г. былі ўпершыню апрабіраваныя і выкарыстаныя некаторыя новыя прыёмы і метады вядзення бою, якія пазней былі ўзятыя на ўзбраенне военачальнікамі ВКЛ. Па-першае, трэба адзначыць імклівы і рашучы марш на пазіцыі праціўніка пасля таго, як была высветлена яго дакладная дыслакацыя. Начны рух войска, які меў месца ў ходзе кампаніі 1506 г., таксама можа быць аднесены да набыткаў гаспадарскага войска. Прыбыўшы на поле бою, войска ВКЛ не імкнулася адразу ўвязацца ў бой з праціўнікам. Перад тым, як выбраць план і тактыку бою, вайсковае кіраўніцтва праводзіла грунтоўную разведку мясцовасці і пазіцый праціўніка. Бітве папярэднічала дыверсійная дзейнасць лёгкай конніцы – рацаў у тыле ворага. Бой пачыналі асцярожна, абменьваючыся ўзаемнымі ўдарамі, каб усыпіць пільнасць праціўніка і ажыццявіць неабходныя аператыўна-тактычныя дзеянні. У ходзе самога бою гаспадарскае войска прадэманстравала высокую манеўранасць і мабільнасць, спалучаючы франтальныя ўдары з флангавымі. У залежнасці ад шчыльнасці агню праціўніка само войска прымала згорнуты ці разгорнуты строй.

У бітве былі задзейнічаныя розныя вайсковыя аддзелы. Удзел у бітве розных відаў і груп войска патрабаваў ад камандавання каардынацыі іх дзеянняў. Пад Клецкам у 1506 г. вайсковае камандаванне ВКЛ канчаткова ўсвядоміла значэнне такой складанай ваеннай навукі, як узаемадзеянне розных родаў войска. Узаемадзеянне кавалерыі, пяхоты і артылерыі адыграе рашаючую ролю ў перамозе гаспадарскага войска над значна большым маскоўскім войскам пад Оршай у 1514 г.[57].

---

[57] Сагановіч Г. Войска Вялікага Княства Літоўскага… С. 53.

У бітве выкарыстоўваліся розныя тактычныя хітрасці. Так, у самы разгар бітвы пад Клецкам на Арынскай гары з'явілася польская надворная харугва, якая разгарнулася ў лінію, каб пераканаць татараў, што на дапамогу гаспадарскаму войску ідуць значныя падмацаванні. Глінскі, разбіўшы асноўныя сілы татараў, размясціў свае войска на месцы татарскага каша. Татары, якія былі ў загонах, не ведаючы пра вынік бітвы, вярталіся ў кош і траплялі ў падрыхтаваную для іх пастку. Нарэшце, калі вораг быў разбіты і змушаны да ўцёкаў, за ім была арганізавана энергічная і хуткая пагоня з мэтай яго поўнага знішчэння. Падсумоўваючы сказанае, можна адзначыць, што ваенная думка ВКЛ пачатку XVI ст., нягледзячы на тое, што яна па-ранейшаму развівалася ў рэчышчы старых стэрэатыпаў, была ў стане ўвабраць найлепшыя дасягненні тагачаснай перадавой вайсковай тактыкі і стратэгіі, інкарпараваць як заходні, так і ўсходні вопыт у гэтай галіне. Перамога пад Клецкам намеціла цэлую праграму развіцця вайсковага майстэрства ВКЛ[58], выкананне якой залежала ўжо ад дбайнасці вышэйшага кіраўніцтва дзяржавы.

Бітва пад Клецкам 1506 г. засведчыла ўзрослую ролю военачальніка ў змаганні. Галоўным героем бітвы стаў, безумоўна, надворны маршалак князь Міхаіл Глінскі. Перамога пад Клецкам у значнай ступені адбылася дзякуючы яго асабістаму таленту і волі. Князь Міхаіл Глінскі з'яўляўся якраз тым чалавекам, які ў канкрэтных умовах лета 1506 г. мог арганізаваць разгром татарскага войска. Гэтаму спрыялі яго асабістыя якасці: мужнасць, хуткасць, ініцыятыўнасць, дасціпнасць. Як надзвычай уплывовы саноўнік, а ў момант хваробы вялікага князя Аляксандра фактычна першая асоба ў дзяржаве, толькі ён мог арганізаваць супраціў крымскім татарам, хутка сабраць войска і выступіць насустрач ворагу. Дададзім сюды таксама вялізны аўтарытэт Глінскага ў грамадстве ВКЛ, асабліва сярод воінаў. Глінскі меў не толькі шмат ворагаў, але таксама багата сяброў і кліентаў. Нягледзячы на свой адносна малады ўзрост, князь Міхаіл меў ужо дастаткова багаты ваенны вопыт. Як татарын па паходжанні, ён добра ведаў звычаі і тактыку дзеянняў татарскага войска. Падчас «стажыроўкі» ў войску саксонскага герцага Альбрэхта, якое вяло ваенныя дзеянні ў Фрысландыі і Нідэрландах, Глінскі набыў багаты баявы досвед. Там жа ён меў унікальную магчымасць азнаёміцца з перадавой ваеннай тактыкай і стратэгіяй, якія праходзілі апрабацыю ў Заходняй Еўропе. Неабходна дадаць, што ваколіцы Клецка былі добра знаёмыя князю Міхаілу, паколькі тут знаходзіўся маёнтак

[58] Herbst S. Kleck 1506. S. 230.

Глінскіх Новы Двор[59]. Нарэшце, Глінскаму ўжо прыходзілася аднойчы ваяваць у падобных прыродных умовах, калі ён змагаўся ў Фрысландыі пад камандаваннем Вільвальта фон Шаумбурга. Моцна забалочаныя ваколіцы Клецка, несумненна, нагадвалі яму ваколіцы галандскага горада Гронінгена, дзе 14 ліпеня 1500 г. адбылася бітва саксонскага герцага Альбрэхта з фрызамі. Паўночныя Нідэрланды былі пакрыты густой сеткай рэк, каналаў і балот, што істотна стрымлівала рух войска. Герцагскім войскам, у складзе якога мусіў знаходзіцца малады князь Міхаіл Глінскі, камандаваў вопытны военачальнік Вільвальт фон Шаумбург. Фрызы грунтоўна падрыхтаваліся для абароны, выкарыстоўваючы для гэтага асаблівасці мясцовага ландшафту. Калі набліжалася герцагскае войска, фрызы паднялі шлюзы, каб працiўнік не меў мажлівасці наблізіцца да іх умацаванняў. Да пазіцый фрызаў можна было падысці па адзіным мосце, але ён настолькі добра прастрэльваўся артылерыяй, што не магло нават ісці гаворкі пра атаку. Тады Вільвальт фон Шаумбург загадаў адкрыць магутны артылерыйскі агонь з трох розных бакоў па пазіцыях працiўніка, які выклікаў вялізныя ахвяры і разбурэнні ў лагеры фрызаў. Тым часам пад заслонай артылерыйскага агню жаўнеры Шаумбурга аднавілі разбураны мост, дзеля чаго павінны былі знесці некалькі драўляных дамоў. Шаумбург з войскам перайшоў па адноўленым мосце і атакаваў фрызаў з тылу. Фрызы не вытрымалі націску і кінуліся наўцёкі. Адначасова саксонская кавалерыя перайшла праз ваду па мосце, які нядаўна ахоўвалі фрызы. Шаумбург арганізаваў пагоню ўслед за ўцякаючым ворагам. У выніку бітва завяршылася поўным разгромам фрызаў[60]. Няма сумненняў, што досвед вайны ў Фрысландыі быў выкарыстаны Глінскім пад Клецкам у 1506 г. Узрослая роля асабістага прыкладу военачальніка была пацверджана пазней дзейнасцю такіх камандзіраў, як гетманы Канстанцін Астрожскі і Рыгор Аляксандравіч Хадкевіч.

Ваенныя дзеянні патрабавалі значных фінансавых рэсурсаў. З канца XV ст. дзяржаўны скарб ВКЛ быў абцяжараны ваеннымі выдаткамі. Іх цяжар спадаў таксама на пануючае саслоўе дзяржавы, якому станавілася ўсё цяжэй выпраўляць воінаў на службу. Кошт ваенных дзеянняў істотна вырас. Не кожнаму землеўласніку была па кішэні вайсковая амуніцыя. З'явілася даволі значная катэгорыя землеўласнікаў, якія не маглі выправіць са свайго маёнтка хоць бы аднаго воіна і мусілі служыць самастойна. Некаторыя з іх выязджалі на службу

[59] LM. Užrašymų knyga 8. P. 258.

[60] Sperling O. Herzog Albrecht der Beherzte von Sachsen… S. 47—48.

са слабым узбраеннем. Асобныя не мелі нават каня і былі вымушаны служыць у пешым парадку. Толькі буйныя землеўласнікі маглі дазволіць сабе мець некалькі дарагіх коней і сучасны баявы рыштунак. З пункту гледжання вайсковай амуніцыі паспалітае рушанне ВКЛ пачатку XVI ст. уяўляла сабой надзвычай стракатую карціну. Побач з узброеным толькі дзідай або мячом баярынам часта знаходзіўся пан-вяльможа ў бліскучым панцыры. Не дзіўна, што чакаць нейкай значнай скаардынаванасці дзеянняў паміж імі на полі бою не прыходзілася. Гэта акалічнасць нярэдка вяла да фатальных вынікаў.

Таму не дзіўна, што ва ўмовах браку сродкаў на віленскім вальным сойме 1507 г. быў устаноўлены новы падатак на вайну — г. зв. сярэбшчына[61]. Насельніцтва ВКЛ павінна было плаціць 6 грошаў з воловай і 3 грошы з конскай сахі. Тыя, хто меў толькі аднаго вала альбо трымаў толькі зямлю, не забяспечаную жывёльнай цягай, мусілі плаціць па 3 грошы. Сярэбшчына бралася звычайна ўвосень пасля збору ўраджаю. Так, для 1507 г. быў вызначаны тэрмін на дзень Нараджэння Прачыстае Дзевы Марыі («на день Матки Божи последънее»), што было абумоўлена цяжкім становішчам насельніцтва пасля татарскага набегу 1506 г.

Вядома, што агульная сума даходу гаспадарскага скарбу ў 1502—1508 гг. складала 60 070 коп грошаў, або 8, 6 тыс. коп грошаў штогод[62]. Гэта сума ахоплівала прыбыткі з велікакняскага дамена, выплату агульных падаткаў (сярэбшчына, палюддзе), даходы з мытаў, корчмаў, ключоў, гарадоў, а таксама прыбыткі з заставы гаспадарскіх маёнткаў, меніцы і інш. Невядома, якая частка даходу са скарбу выдаткоўвалася на ваенныя патрэбы. Але, ва ўсялякім разе, гэтыя выдаткі былі вялікімі. Сюды ж трэба аднесці і ўскосныя выдаткі, якія ішлі на падтрыманне міру з татарскімі ордамі. Так, кошт пасольстваў, высланых да татараў у 1502—1508 гг., склаў 17 460 коп грошаў, або каля 2,5 тыс. коп грошаў штогод[63]. Сюды трэба дадаць яшчэ важкія сумы на гратыфікацыю, г. зн. на ўтрыманне шматлікіх татарскіх князёў, мурзаў і бекаў. Толькі ўтрыманне аднаго хана разгромленай Заволжскай Арды Шах-Ахмата і яго двара ў 1504—1505 гг. каштавала гаспадарскаму скарбу 1030 коп грошаў[64]. Такім чынам,

---

[61] LM. Užrašymų knyga 8. P. 297.

[62] Довнар-Запольский М. Литовские упоминки татарским ордам // Известия Таврической ученой архивной комиссии. 1898. № 28. С. 9, 14; Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 200.

[63] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 200.

[64] Тамсама.

толькі падтрыманне дыпламатычных зносін з татарамі і ўтрыманне ўплывовых татараў каштавала звыш 3,5 тыс. коп грошаў штогод, што складала амаль трэцюю частку прыбыткаў гаспадарскага скарбу. Сюды ж трэба яшчэ дадаць выдаткі на ўтрыманне памежнай старожы, падтрыманне ў належным стане фартыфікацыйных збудаванняў, вярбоўку наёмнікаў і г. д. Увогуле на ўтаймаванне рознымі спосабамі, як дыпламатычным, так і ваенным, татарскіх ордаў, галоўным чынам, Крымскага ханства магло ісці каля паловы (а можа, нават і болей) прыбыткаў скарбу.

Амаль перманентная вайна патрабавала не толькі вялізных грашовых сродкаў, але і значных матэрыяльных рэсурсаў (сукно, тканіны, футра, метал, дрэва і г. д.). Ваенныя дзеянні таксама вымагалі сталага і надзейнага забеспячэння войска неабходнымі прадуктамі харчавання (мяса, хлеб, соль, мёд, віно і інш.). Асаблівае пытанне — жывёлы на вайне. Ваенныя дзеянні патрабавалі вялікай колькасці коней і цяглавай сілы (валоў, быкоў), а таксама і корму для іх (авёс). Страты на вайне — гэта не толькі самі людзі, але яшчэ і жывёлы, што іх суправаджалі. Таксама вайна адцягвала насельніцтва ад стваральнай працы. Жыхароў гарадоў і вёсак нярэдка прыцягвалі да грамадскіх работ, звязаных з умацаваннем абараназдольнасці дзяржавы: рамонту дарог, замкаў, выканання старожы.

Клецкая бітва 1506 г. прадэманстравала таксама новы тып паводзін на вайне[65]. Змаганне стала больш жорсткім. Праціўнікі ўжо не мелі літасці адзін да аднаго, незалежна ад таго, хто быў перад імі: адна- або іншаверцы. Вынікам бітваў былі вялізныя ахвяры з абодвух бакоў. Смерць або раненне перасталі быць амаль выключнай прывілеяй шараговых воінаў. Яны не ашчаджалі нікога, уключаючы найвышэйшых военачальнікаў. Эмацыйны шантаж стаў нормай бітвы. Здзекі, гвалты, рабункі суправаджалі змаганне. Тыя з пераможаных, хто ацалеў, траплялі ў палон, адкуль большасць з іх не мела магчымасці вярнуцца. Багатыя і знатныя палоннікі станавіліся прадметам доўгіх дыпламатычных перагавораў і гандлю. Але пакуль ішлі перагаворы, многія з іх паміралі ў варожым палоне. Ваенныя дзеянні, у тым ліку і бітвы, наносілі вялізны ўрон эканоміцы і прадукцыйным сілам той мясцовасці, дзе яны адбываліся. Па самых сціслых падліках, амаль палова тагачаснай тэрыторыі ВКЛ у той ці іншай ступені знаходзілася пад пагрозай татарскіх нападаў.

[65] Пра характар войнаў у эпоху Рэнесансу: Burckhardt J. The Civilization of the Renaissance in Italy. P. 68—69.

### 4.2.2. Крымска-татарскае войска

Мабілізацыя ў крымскае войска пачыналася пасля прыняцця ханам або яго сынамі рашэння аб паходзе ў землі сваіх паўночных суседзяў. Адзначым, што вялікія выправы на поўнач, як у 1505 і 1506 гг., былі дастаткова рэдкімі. Крымскія татары звычайна абмяжоўваліся невялікімі набегамі на землі сваіх суседзяў. Гісторыкі дагэтуль спрачаюцца адносна колькасці татарскага войска. Калі з кароткатэрміновым набегам, у якім удзельнічала звычайна некалькі соцень чалавек, усё больш-менш зразумела, то адносна вялікай выправы ўсё яшчэ няма яснасці. Гістарычныя крыніцы таксама па-рознаму інтэрпрэтуюць колькасны склад крымскага войска. Даследчыкі ўжо пераканаліся, што да лічбаў тагачасных летапісцаў і храністаў трэба ставіцца асцярожна; многія з іх падаюцца вельмі перабольшанымі. Гэтае перабольшванне было свядомым з абодвух бакоў. Крымскія ханы часта завышалі колькасць уласнага войска перад замежнымі ўладарамі з палітычных меркаванняў. Так, у сваім ярлыку да вялікага маскоўскага князя Івана Васілевіча Менглі-Гірэй пісаў: «...рать свою борзо на конь посадив, два свои сына послал есми, Фетя-Гирея да Бурнаша-Гирея в головах, и всех уланов и князей, мурзы, вместе прикошевав, девяносто (!) тысяч рати послал есми...»[66]. Ваеннае і палітычнае кіраўніцтва ВКЛ таксама нярэдка дзейнічала аналагічным чынам, каб у выпадку перамогі паказаць яе значнасць, а ў выпадку паражэння апраўдацца за няўдачу перад гаспадарам. Апошні, дарэчы, сам не грэбаваў гэтым метадам. У 1512 г. Жыгімонт Стары ў адным лісце пісаў пра 10 тысяч татараў, што ўдзельнічалі ў бітве пад Вішняўцом. Пазней ён паведамляў ужо пра 20 тысяч наезнікаў. Нарэшце, у летапісах і хроніках, кшталту Хронікі Літоўскай і Жамойцкай, гэтая лічба вырасла да 25 тысяч ратнікаў[67].

Польскі гісторык О. Гурка, узяўшы за аснову першы знаны попіс жыхароў Крыма 1783 г., шляхам рэтрагрэсіі вылічыў, што на пачатку XVI ст. усё насельніцтва Крыма складала прыкладна 200—250 тысяч чалавек[68]. На гэтай падставе ён ацэньваў мабілізацыйную здольнасць Крымскага ханства ў адзначаны час дзесьці ў межах 20 тысяч чалавек. На думку даследчыка Мікалая Эрнста, збройныя сілы хана

---

[66] СИРИО. Т. 41. С. 430.

[67] ПСРЛ. Т. 32. С. 104.

[68] Кананoвіч У. Крымскія напады на Беларусь // Гістарычна-археалагічны зборнік: Памяці Міхася Ткачова. Ч. 1. Мінск, 1993. С. 142.

Менглі-Гірэя складалі каля 25 тысяч[69]. Другі польскі гісторык Е. Ахманьскі схіляўся да думкі, што максімальная лічба крымскіх ратнікаў складала некалькі дзясяткаў тысяч[70]. Гэтыя навуковыя высновы адпавядаюць інфармацыі аднаго з сучаснікаў і відавочцаў крымскіх выпраў першай паловы XVI ст. велікакняскага сакратара Міхалона Літвіна. Апошні пісаў, што крымскія татары настолькі размножыліся, што былі здольныя выставіць амаль трыццацітысячнае войска. Аднак пры гэтым ён удакладняў, што гэта была максімальная мабілізацыйная здольнасць іх дзяржавы. У самых значных выправах удзельнічала максімум палова гэтай лічбы воінаў[71].

У выпадку выправы 1506 г. гэтую колькасць можна паменшыць. Падзея мела месца ўлетку, калі многія крымскія татары былі заняты ў сельскагаспадарчай вытворчасці і знайсці сярод іх патрэбную колькасць ахвотнікаў было цяжэй. Многія з жыхароў паўвострава, асабліва прыбярэжнай паласы — татары, грэкі, армяне, генуэзцы, — папросту адкупаліся ад выправы. Крымскім ханам прыходзілася прыбягаць да паслуг розных «варагаў» і наймітаў, аднак наўрад ці за кошт апошніх удавалася цалкам ліквідаваць недахоп у воінах. Да таго ж, відавочна, хан не мог выслаць адразу ўсё сваё войска. Можна сцвярджаць, што ў вялікай выправе крымскага хана ўдзельнічала максімум 10, а хутчэй за ўсё, 5—7 тысяч воінаў.

Склад крымскага войска быў дастаткова разнастайным і стракатым. Самай вялікай вайсковай адзінкай у татараў з'яўлялася «цьма», якая складалася з 10 тысяч чалавек. На чале яе стаялі князі або сыны хана. Усё войска дзялілася на дзясяткі. У яго склад уваходзілі не толькі крымскія татары, але і іншыя стэпаўцы Прычарнамор'я, асабліва нагайскія татары[72]. Пасля далучэння Заволжскага ўлуса да Крыма ў 1502 г. у крымскім войску з'явіліся таксама тамтэйшыя татары. Часам, каб паўдзельнічаць у выправе, прыязджалі татары з іншых месцаў, напрыклад, з Белгарада[73]. Звыклай з'явай была прысутнасць у крымскім войску туркаў. Нярэдка да войска далучаўся розны зброд: рабаўнікі,

[69] Ernst N. Die ersten Einfälle Krymtataren in Südrussland // Zeitschrift für osteuropäische Geschichte. 1912. Bd. 3. H. 1. S. 18—19.

[70] Ochmański J. Organizacja obrony w Wielkim Księstwie Litewskim przed napadami tatarów krymskich w XV—XVI wieku // Studia i materiały do historii wojskowości. T. 5. Warszawa, 1960. S. 358—361.

[71] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 65—66.

[72] Возгрин В. Е. Исторические судьбы крымских татар. С. 160.

[73] AA. S. 125. У 1502 г. каралеўскія паслы Якуб Сякліцкі і Ян Котвіч даносілі польскім радным панам, што сярод захопленых у палон Сямёнам Гальшанскім татараў было 50 чалавек з чарнаморскага Белгарада.

злодзеі, былыя рабы. Нярэдка багатыя татары замест сябе адпраўлялі ў выправу беднякоў, забяспечваючы іх неабходным рыштункам і коньмі. Сустракаліся ў войску таксама малдаване, чаркесы, русіны[74].

Стракатым і разнастайным быў рыштунак і ўзбраенне крымскага войска. Галоўнай зброяй былі лук і стрэлы[75]. Рэдкімі былі шаблі. Толькі нямногія абраныя, у першую чаргу, князі і мурзы, мелі панцыры, тарчы і дзіды. Многія татары былі ўзброены простымі палкамі, а некаторыя былі ўвогуле без зброі. Чаго не бракавала ў татараў, дык гэта рамянёў і вяровак, якімі яны збіраліся вязаць палоннікаў, а таксама кашоў, куды яны змяшчалі малых дзяцей. Паколькі татары дзяліліся на дзясяткі, кожны дзясятнік меў кацёл для варкі мяса і маленькі барабанчык. Кожны татарын браў у выправу дудку, каб клікаць сваіх таварышаў, чашу для піцва, кнут, нож, шыла з ніткай[76].

У паходзе татары не абцяжарвалі сябе абозамі, беручы з сабой да пяці коней кожны. Коней яны часта мянялі, дзякуючы чаму маглі імкліва рухацца ці адрывацца ад праціўніка. Нярэдка татары бралі з сабой мноства пудзіл, імкнучыся тым самым стварыць у ворага ілюзію, што на яго рухаецца вялізнае войска.

Татары ў паходзе дэманстравалі ўзоры вытрымкі і аскетызму. Яны аднолькава добра вытрымлівалі холад, спякоту, дождж і мароз і маглі абыходзіцца без ежы некалькі дзён. Звычайна харчаваліся татары ў выправе падсмажаным просам і размолатым сырам[77].

Татары звычайна карысталіся вельмі трывалай і хуткай пародай коней, якая называлася «бахмат». Збруя і сёдлы былі драўлянымі, і, каб не пашкодзіць спіну каня, татары ўкладалі ў сёдлы траву або лісце[78]. Сёдлы служылі для розных мэтаў. Ніжняя частка сядла, зробленая з шэрсці або войлака, служыла дыванам, а верхняя частка — падушкай. Бурку татары выкарыстоўвалі ў якасці шатра або намёта. Для гэтай мэты яны бралі з сабой жэрдкі. Уткнуўшы жэрдкі ў зямлю і нацягнуўшы на іх бурку, можна было атрымаць прыстойнае жытло на адну ноч[79].

---

[74] Возгрин В. Е. Исторические судьбы крымских татар. С. 160—161.

[75] La Moscovie du XVIe siècle, vue par un ambassadeur occidental Herberstein / Présentation et traduction de Robert Delort. Paris, 1965. P. 158.

[76] Описание перекопских и ногайских татар, черкесов, мингрелов и грузин Жана де Люка // Записки Императорского одесского общества истории и древностей. 1879. Т. 11. С. 481.

[77] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 66.

[78] La Moscovie du XVIe siècle... P. 158.

[79] Описание перекопских и ногайских татар, черкесов, мингрелов и грузин Жана де Люка. С. 481.

Татары ўпэўнена сядзелі на кані, падціснуўшы пры гэтым ногі пад самае сядло, што дазваляла ім свабодна паварочвацца ва ўсе бакі. Вуздзечку яны трымалі левай рукой, а стралялі з правай. Татарын як бы зліваўся з канём, станавіўся адным цэлым з ім. Бездарожжа, глыбокі снег і крыхкі лёд татары пераадольвалі аднолькава ўпэўнена. Вывучка татарскіх вершнікаў была настолькі дасканалай, што, калі нешта падала на зямлю, яны нават на поўным ходу, звесіўшыся нізка на збруі, маглі бесперашкодна дастаць гэтую рэч[80]. Калі іх атакаваў праціўнік, узброены дзідай, яны без прамаруджання нападалі на яго з другога боку, з усяе сілы прышпорваючы коней[81].

Ваенная падрыхтоўка татараў была дасканалай. Яшчэ з маленства яны пачыналі практыкавацца ў стральбе з лука. Найважнейшае месца ў выхаванні маладых татараў займалі розныя конныя практыкаванні і спаборніцтвы. Пачынаючы з 12—13 гадоў яны выязджалі ў паходы і ўдзельнічалі ў набегах на суседзяў[82]. Не дзіўна, што з цягам часу з іх атрымліваліся выдатныя воіны.

### 4.2.3. Шляхі пранікнення татарскіх аддзелаў на землі ВКЛ і Польшчы, тактыка дзеянняў татарскага войска

Зыходным пунктам для татарскага войска з'яўляўся Перакоп. У той час гэта была першакласная татарская крэпасць, якая знаходзілася на перашыйку, што злучаў Крымскі паўвостраў з мацерыком. Перакоп атрымаў сваю назву ад рова, які быў прарыты на перашыйку. Гэта была свайго роду брама ў Крым, праз якую можна было па сушы пранікнуць у глыб паўвострава[83]. У Перакопе знаходзілася рэзідэнцыя крымскага ор-бека, у абавязак якога ўваходзіла падтрыманне знешняй бяспекі дзяржавы, кантроль за яе межамі, нагляд за іншымі татарскімі ордамі[84]. Несумненна, ор-бек мусіў таксама каардынаваць татарскія паходы ў суседнія землі.

Падрыхтоўка да выправы трывала нядоўга. Звычайна сам хан, яго сыны або хтосьці з буйных феадалаў вызначаў тэрмін збору ў Перакопе. У залежнасці ад колькасці ўдзельнікаў выправы зборы маглі працягвацца ад некалькіх дзён да некалькіх тыдняў. У выпадку

[80] La Moscovie du XVIe siècle... P. 159.

[81] Тамсама. P. 159—160.

[82] Иванин М. И. О военном искусстве и завоеваниях монголо-татар и среднеазиатских народов при Чингис-хане и Тамерлане. Улан-Удэ, 2005. С. 162.

[83] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 63.

[84] Возгрин В. Е. Исторические судьбы крымских татар. С. 133, 185.

з выправай 1506 г., верагодна, можна казаць максімум пра два тыдні. Прыкладна столькі ж часу запатрабавала падрыхтоўка да вялікай выправы 1500 г. супраць заволжскага хана Шах-Ахмата[85].

Рашэнне пра паход у глыб ВКЛ было прынята самім Менглі-Гірэем прыблізна ў сярэдзіне – другой палове чэрвеня 1506 г. з тым, каб у канцы чэрвеня – пачатку ліпеня ўжо выправіцца на поўнач, каб дасягнуць ураджайных земляў Ніжняга Панямоння ў часе жніва. Не без падстаў крымскае кіраўніцтва разлічвала, што ў гэты час амаль усё вясковае насельніцтва мусіла знаходзіцца ў полі, што надзвычай аблягчала работу татарскім чамбулам. Спадзяваўся Менглі-Гірэй і на эфект нечаканасці: наўрад ці мясцовае насельніцтва чакала новага татарскага нападу пасля спусташальнага набегу 1505 г. Кіраўніцтва войскам было даручана малодшым ханскім сынам Біці-Гірэю і Бурнашу. Абодва добра ведалі мясцовасць, куды накіроўваліся. У 1505 г. яны бралі ўдзел у вялікай выправе ў глыб ВКЛ, якая дасягнула Навагародка і Менска.

Пасля таго, як усё татарскае войска ў пачатку ліпеня 1506 г. вырушыла з Перакопа, яно мусіла пераадолець буйную водную перашкоду ў выглядзе Дняпра. У першай палове XVI ст. існавала некалькі зручных бродаў, пра якія ў сваім творы кажа Міхалон Літвін[86]. Часцей за ўсё татары карысталіся зручнай пераправай у раёне вострава Тавань. У гэтым месцы Дняпро і яго левы прыток Конская Вада былі нешырокімі і спакойнымі, так што іх можна было лёгка пераадолець. Да таго ж, Таванская пераправа знаходзілася на адлегласці ўсяго толькі аднаго дня пераходу з Перакопа. Тут быў знакаміты таванскі перавоз, дзе ў часы вялікага князя літоўскага Вітаўта дзейнічала мытня (Balneum Vitoldi), на якой гаспадарскія мытнікі спаганялі пошліну з купцоў. Як адзначае Міхалон Літвін, у першай палове XVI ст. тут яшчэ існаваў скляпеністы цагляны будынак былой мытні[87]. У 1503 г. Менглі-Гірэй паспрабаваў збудаваць на правым беразе Дняпра ў месцы пераправы каля Тавані невялікую фартэцыю, але толькі часткова здолеў ажыццявіць свой план. Затое яму ўдалося ўзвесці на левым беразе Дняпра, якраз насупраць Тавані, крэпасць Іслам-Керман, дзе пазней знаходзілася рэзідэнцыя татарскага памежнага старасты[88].

---

[85] Ernst N. Die ersten Einfälle Krymtataren in Südrussland. S. 22.

[86] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 99.

[87] Тамсама. С. 100.

[88] Ernst N. Die ersten Einfälle Krymtataren in Südrussland. S. 23. Крэпасць Іслам-Керман была названа ў гонар унука Менглі-Гірэя, сына хана Махмет-Гірэя, царэвіча Іслам-Гірэя, які тут выконваў абавязкі татарскага памежнага старасты.

Існавала яшчэ некалькі пераправаў на Дняпры, якімі карысталіся татары. Каля вусця ракі Цягінкі існавала Цягінская пераправа, а ў вусця Дняпра каля Ачакава — Ачакаўская. Дзеля забеспячэння надзейных пераправаў праз Дняпро тут Менглі-Гірэем былі збудаваныя дзве фартэцыі — Цягін і Ачакаў. Стратэгічнае значэнне Ачакава падкрэслівалася тым, што тут у часы наступніка Менглі-Гірэя, Махмет-Гірэя, знаходзілася рэзідэнцыя калгі Ахмеда (Ахмета), ханскага брата, які каардынаваў адсюль татарскія напады на землі ВКЛ і Польшчы[89]. Тут яшчэ ў 1492 г. Менглі-Гірэй збудаваў крэпасць, якая была ўзмоцнена ў 1504 г. Крэпасць Ачакаў мела важнейшае значэнне для татарскіх нападаў на паўночных суседзяў у 1510—1519 гг.[90].

Звычайна татары перапраўляліся праз рэкі, скінуўшы з сябе папярэдне ўсё адзенне[91]. Пры гэтым яны, як правіла, ставілі поруч трох або чатырох коней і прывязвалі да іх хвастоў доўгія бярвенні, на якія сядалі. Гэткім чынам яны пераправаліся праз раку[92]. У некаторых выпадках яны пераправаліся праз рэкі іншым уласцівым ім спосабам: браліся за грывы коней, а да іх хвастоў прывязвалі мяхі, замацаваныя на драўляных брусах або звязках чароту[93]. Гэта дазваляла ім вельмі хутка пераадольваць водныя перашкоды.

Пасля пераправы праз Дняпро перад татарамі паўставалі шырокія і роўныя стэпавыя прасторы. Далейшы іх маршрут вызначаўся асаблівасцямі ландшафту мясцовасці паміж паўночным узбярэжжам Чорнага мора і прыпяцкімі балотамі. Той факт, што самыя вялікія рэкі паміж Дняпром і Карпатамі цякуць у кірунку поўнач-поўдзень, абумоўліваў рух татараў у іх водападзелах.

Пераправіўшыся праз Дняпро ў раёне Тавані, татары спачатку рухаліся ў міжрэччы Дняпра і яго прытока Інгульца[94]. Гэта быў знакаміты «Чорны шлях». Сваю назву ён атрымаў ад вялізнага і густога «Чорнага лесу», які пачынаўся ў вярхоўях рэк Інгул і Інгулец пад Чаркасамі, а затым цягнуўся вузкім пасам на поўдзень да самага Корсуня. «Чорны лес» чыніў татарам не толькі перашкоду, але прыносіў пэўную карысць. Тут яны нярэдка хавалі здабычу, адпачывалі самі. Адсюль

[89] Ernst N. Die ersten Einfälle Krymtataren in Südrussland. S. 26.

[90] Тамсама. S. 23.

[91] La Moscovie du XVIe siècle... P. 158.

[92] Флетчер Д. О государстве Русском // Проезжая по Московии: (Россия XVI—XVII вв. глазами дипломатов). Москва, 1991. С. 91.

[93] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 66; Ernst N. Die ersten Einfälle Krymtataren in Südrussland. S. 27.

[94] Кананові ч У. Крымскія напады на Беларусь. С. 136.

яны рабілі нечаканыя напады на бліжэйшыя населеныя пункты. Мінуўшы «Чорны лес», татары рухаліся паміж прытокамі Дняпра, Цясьмой і Россю, з аднаго боку, і прытокамі Буга, з другога. Пазней «Чорны шлях» бег у міжрэччы Буга і Цецерава, а пасля паміж Бугам і прытокамі Прыпяці Сульчам і Гарынню[95]. Гэта была роўная бязлесная мясцовасць, па якой татары маглі рухацца з зайздроснай хуткасцю. Як сведчыць Міхалон Літвін, татарскаму войску пасля выхаду з Перакопа патрабавалася ў сярэднім 6 дзён, каб дасягнуць памежных гарадоў ВКЛ, Брацлава і Чаркасаў[96]. Думаецца, што такая ацэнка не з'яўляецца перабольшаннем. Магчыма толькі, што ў выпадку з большым войскам, як, напрыклад, у ходзе выправы 1506 г., татары мусілі рухацца павольней, пераадольваючы згаданую адлегласць за 8—10 дзён.

Звычайна татары рухаліся па стэпе маналітнай калонай. У ходзе руху сярэдняе татарскае войска, як, напрыклад, падчас выправы 1506 г., магло займаць фронт у некалькі соцень метраў. У глыбіню яно расцягвалася на некалькі вёрстаў. Наперад высылаліся выведнікі дзеля здабычы звестак пра праціўніка. Набліжаючыся да мяжы, татарскае войска звычайна дзялілася на асобныя аддзелы, колькасцю ў некалькі соцень чалавек. Каб праціўнік не заўважыў іх рух, аддзелы рухаліся па ярах і лагчынах. Для камунікацыі паміж аддзеламі выкарыстоўваліся розныя сродкі і ўмоўныя знакі: запаленая ануча, высячэнне агню крэсівам ноччу, кругавыя рухі коней і г. д.[97]. У такіх умовах гаспадарскай старожы было надзвычай цяжка ўстанавіць сапраўдныя памеры татарскага войска, месца і час яго збору, намеры праціўніка.

Рухацца прыходзілася як днём, так і ноччу. Татарын, з дзяцінства качуючы з месца на месца, набываў зайздросную памяць мясцовасці, прывучаючыся арыентавацца не толькі па нябесных свяцілах, Сонцы, Месяцы і зорах, але і па размяшчэнні ўзвышшаў, далін, рэк, яроў, азёраў, узгоркаў і г. д. Камень, куст, дрэва, напрамак ветру, смак вады з'яўляліся для яго прыкметай[98]. Акрамя таго, татарын меў незвычайную зоркасць: ён мог здалёк убачыць чалавека, які схаваўся за камень ці дрэва, або распазнаць дым ад вогнішча ці пару, што ўздымаўся ад кіпячай вады. Татарын таксама валодаў і зайздросным слыхам. Прыклаўшы вуха да зямлі, ён мог сказаць, з якога боку набліжаюцца вершнікі, і ацаніць іх колькасць[99].

---

[95] Ernst N. Die ersten Einfälle Krymtataren in Südrussland. S. 28—30.

[96] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 63.

[97] Иванин М. И. О военном искусстве и завоеваниях монголо-татар… С. 152.

[98] Тамсама. С. 153.

[99] Тамсама. С. 154.

Прыродная вынослівасць і загартоўка дазвалялі татарам лёгка пераносіць усе цяжкасці выправы, голад, холад, спякоту, смагу, бяссонныя ночы[100]. У часе выправы ў войску падтрымлівалася жорсткая дысцыпліна. Рухаючыся па варожай тэрыторыі, татары ўсяляк пазбягалі сутычак з варожым войскам.

Татары не рабілі звычайна спроб аблогі або штурму гарадоў, якія ляжалі на іх шляху. Для гэтага ў іх не было сродкаў, а звычайна і жадання. Амаль выключэннем з гэтага правіла стаў захоп ханам Менглі-Гірэем Кіева ў 1482 г. Для захопу гарадоў у татараў меўся ў азначаны час толькі адзіны спосаб: яны запальвалі пасад пасля таго, як той быў разрабаваны. У выпадку, калі агонь перакідваўся на дзядзінец-горад, і мясцовыя жыхары, што хаваліся там, кідаліся наўцёкі, населены пункт мог быць захоплены[101]. Хутчэй за ўсё, менавіта так быў знішчаны і захоплены Клецк у 1503 г.

Каб схаваць сляды руху па стэпе, татары прымянялі наступную хітрасць. Пасля начлегу татарскае войска дзялілася на асобныя аддзелы, якія рухаліся ў розныя бакі. Кожны з іх у сваю чаргу дзяліўся на некалькі частак, якія таксама раз'язджаліся ў розныя бакі. Пазней аддзелы злучаліся ў вызначаным месцы, а пасля ізноў дзяліліся, пакуль нарэшце не аб'яднаўваліся ва ўмоўленым месцы. У выніку трава, вытаптаная нязначнай колькасцю коней, на наступны дзень падымалася, і сляды руху татараў знікалі[102]. Дадамо, што сам выгляд татарскага войска дзейнічаў надзвычай застрашальна не толькі на мясцовае мірнае насельніцтва, але таксама на невялікае шляхецкае апалчэнне, старожу Кароны і ВКЛ.

Пад Белай Царквой «Чорны шлях» раздзяляўся на некалькі адгалінаванняў. Адно вяло ў бок Заслаўя-Валынскага, Уладзіміра-Валынскага, Крамянца, Луцка, Белза. Другое вяло на поўнач, у бок Прыпяці. Гэта быў надзвычай складаны маршрут для татарскага войска. Нездарма татары авалодалі ім толькі ў канцы XV — пачатку XVI ст. Тут умовы руху кардынальным чынам мяняліся. Стэпавы і лесастэпавы ландшафт змяняўся балоціста-лясным. Цяпер татарам прыходзілася рухацца праз лясы, балоты і рэкі Палесся. Акрамя відавочных нязручнасцей прыпяцкае адгалінаванне «Чорнага шляху» давала татарам пэўныя перавагі. Выкарыстоўваючы гэты маршрут, можна было напрасткі патрапіць у самы цэнтр ВКЛ.

---

[100] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 66.

[101] Ernst N. Die ersten Einfälle Krymtataren in Südrussland. S. 15.

[102] Иванин М. И. О военном искусстве и завоеваниях монголо-татар… С. 152—153.

У балоціста-лясной зоне рух татарскага войска істотна замаруджваўся. Яно ўжо рухалася не суцэльнай калонай, а невялікімі аддзеламі. Відавочна, татары вымушаны былі карыстацца паслугамі праваднікоў з ліку захопленых мясцовых жыхароў. Пра тое, якім цяжкім быў гэты адрэзак шляху для татарскага войска, сведчыць ліст маскоўскага пасла ў Крыме Аляксея Забалоцкага да вялікага князя Івана Васілевіча: «...а сами, государь, царевичи не пошли по тем местам, на которые, государь, ты велел им итти, за тем, что с ними было людей много, а те места кажут лесны и тесны»[103].

Галоўную перашкоду на татарскім шляху ўяўляла рака Прыпяць. Існавала некалькі бродаў (каля Турава, Пінска і інш.), праз якія перапраўляліся татары. Броды на Прыпяці татары выкарыстоўвалі ў 1497, 1502, 1505, 1506, 1510, 1521, 1527 гг.[104]. У некаторых выпадках татары перапраўляліся праз Дняпро ў раёне Лоева. У гэтым разе яны мусілі карыстацца «Мураўскім шляхам», які бег па водападзеле Дона і Дняпра і адно з адгалінаванняў якога вяло ў межы Маскоўскай дзяржавы. Пасля выхаду з Перакопа татары рухаліся ўздоўж левага берага Дняпра да самога месца пераправы пад Лоевам.

Другі шлях, вядомы як «Кучманскі», пасля выхаду з Крыма спачатку супадаў з «Чорным», аднак потым у раёне Мёртвых Водаў, непадалёку ад Тавані, аддзяляўся ад яго[105]. Пасля пераправы праз Паўднёвы Буг шлях ішоў паміж водападзеламі Буга і Днястра ў напрамку Падольскай зямлі і Чырвонай Русі. Сваю назву шлях атрымаў ад урочышча Кучман, праз якое ён вёў. Існаваў яшчэ і «Валашскі шлях», які вёў на землі Валахіі і Малдавіі, не закранаючы тэрыторыі ВКЛ.

Пасля пераправы праз Прыпяць татары імкліва прасоўваліся ў глыб ВКЛ. Асобныя аддзелы зноў злучаліся ў адзіную калону. Войска рухалася звычайна па водападзелах рэк Случы, Пцічы, Бярэзіны, пятляючы па балотах і лясах. У ходзе выправы 1506 г. татары мусілі пераправіцца праз Прыпяць у раёне Петрыкава (Петрыкавічаў). Затым яны рухаліся па водападзеле Пцічы і Случы. На сваім шляху яны мусілі абыходзіць вялікі Скавышынскі лес, які, аднак, надзейна прыкрываў іх рухі. Гэты маршрут вёў іх да самага Слуцка. Адлегласць паміж Петрыкавічамі і Слуцкам татары адольвалі на працягу аднаго дня, праходзячы да 25—30 міль (160—180 км). Так было, напрыклад, у 1503 г., калі «видивше сие напрасное прихождение

[103] СИРИО. Т. 41. С. 469.

[104] Кананoвіч У. Крымскія напады на Беларусь. С. 137.

[105] Тамсама. С. 136.

паганское князь Семен Михайлович з тыми, которые с ним были во городи, подивился такому наглому невидимому прихождению их, иже одного дня перешедше реку Припят, и того ж дня пришли к Слуцку двадцат и пять мил, инные же того дня минувши Случеск и дошли до Копыля, ешче од Слуцка пят миль»[106].

У 1506 г. татары не сталі разбіваць кош каля Слуцка, але, пераправіўшыся праз Случ блізу горада, рушылі далей у бок Капыля і Клецка адпаведна каля 40 і 70 км ад Слуцка. За Слуцкам і пад Клецкам характар мясцовасці карэнным чынам мяняўся. Гэта была адкрытая мясцовасць, дзе не было густых лясоў, непралазных балот і вялікіх рэк. Вяла яна ў бок Навагародскага ўзвышша. Тут на густанаселеных прасторах пачыналася для татар сапраўдная работа. Татарскія военачальнікі выбіралі месца, звычайна пад Слуцкам, Клецкам або, як у 1505 г., Менскам, дзе разбівалі лагер, адкуль шматлікія татарскія аддзелы разбягаліся ў розных накірунках дзеля палявання на мясцовых жыхароў. Цэлая мясцовасць пакрывалася як бы суцэльнай сеткай-пасткай, дзе адбывалася дзікае паляванне на людзей.

У 1506 г. Клецк стаў канечным пунктам татарскага паходу. Каб пераадолець адлегласць з Перакопа да Клецка (больш 1100 км), татарам спатрэбілася каля трох або трохі больш тыдняў[107]. У пачатку 20-х чыслаў ліпеня яны ўжо былі пад Клецкам, ваколіцы якога добра ведалі па ранейшых набегах.

Тут татары прымянілі ўжо звыклую па папярэдніх набегах тактыку. Пад Клецкам быў разбіты кош-лагер, у якім засталася прыблізна трэцяя частка ўсяго войска, а астатнія татары былі падзелены на загоны-чамбулы і высланы для рабункаў па навакольных мясцінах. У ходзе нападу 1506 г. у кашы заставалася недзе 2—3 тысячы чалавек, а астатнія 3—4 тысячы рабавалі наваколле. Кожны татарскі чамбул мусіў складацца з некалькіх соцень чалавек. Радыус іх дзеянняў дасягаў некалькіх дзясяткаў вёрстаў. Загоны мелі ўстаноўлены тэрмін вяртання з рабункаў. Схопленыя палоннікі і здабыча звозіліся ў кош, дзе знаходзіліся пад аховай вызначанай групы татараў.

---

[106] ПСРЛ. Т. 32. С. 169; Кананові́ч У. Крымскія напады на Беларусь. С. 140.

[107] Польскі даследчык С. Хербст, абапіраючыся на паведамленне французскага аўтара і падарожніка XVII ст. Баплана пра хуткасць руху татараў, лічыць, што апошнім патрабавалася больш за 50 дзён, каб адолець адлегласць ад Перакопа да Клецка (г. зн. яны рухаліся з хуткасцю 25 км у дзень). Калі б татарскае войска сапраўды рухалася з такой хуткасцю, пра яго надыход стала б вядома задоўга да з'яўлення пад Клецкам. У дадзеным выпадку магла мець месца няправільная інтэрпрэтацыя паведамлення французскага аўтара. Хербст мог прыняць 25 міль, што татары пераадольвалі штодзённа, за 25 км. Насамрэч татары былі здольныя рухацца нашмат хутчэй з хуткасцю 25 міль у суткі, пераадольваючы да 150–160 км.

# 4.3. Прастора бітвы

## 4.3.1. Прыродны ландшафт Клеччыны ў старажытнасці

Прыродны ландшафт Клеччыны, як і ўсёй Беларусі, сфарміраваўся ў пасляледавіковы перыяд прыкладна 10—12 тысяч год таму. Пасля таго, як растаялі льды, у нізінах утварыліся вялізныя запоўненыя вадой багністыя пусткі. Спатрэбілася яшчэ некалькі тысячагоддзяў, пакуль контуры рэк і азёр набылі выразнасці сучаснага геаграфічнага ландшафту.

Галоўнымі воднымі артэрыямі, якія праразалі тэрыторыю Клеччыны з поўначы на поўдзень, з'яўляліся Морач, Лань і Цна. Першыя насельнікі звычайна сяліліся па берагах рэк, на ўзвышаных мясцінах сярод балот, на схілах узгоркаў. Міжрэчча Лані і яе левага прытока Цапры з самых ранніх часоў з'яўлялася найбольш асвоеным чалавекам абшарам на тэрыторыі сучаснай Клеччыны. Паселішча на месцы сучаснага Клецка ўзнікла ў месцы, дзе ў Лань упадала невялікая рачулка Сільна (Сельна). Не выключана, аднак, што першапачаткова паселішча ўзнікла на месцы цяперашняга ўрочышча Гарадзішча, на высокім мысе левага берага ракі Лань, прыкладна за 3 км на поўнач ад Клецка.

Першапачатковае засяленне тэрыторыі Клеччыны, як сведчаць археалагічныя раскопкі, адбылося яшчэ ў эпоху каменнага веку, прыкладна ў V—IV тысячагоддзях да нашай эры[108]. Тэрыторыя сённяшняга раёна, асабліва міжрэчча Лані і Цапры, ужо ў тыя далёкія часы з'яўлялася важным арэалам сельскагаспадарчай вытворчасці. У тарфяніку бліз вёскі Капланавічы было знойдзена дубовае рала, якое адносіцца да эпохі жалезнага веку.

Даныя лінгвістыкі (у меншай ступені археалогіі) сведчаць, што першымі насельнікамі Клеччыны, як і большасці беларускіх зямель, маглі быць плямёны фіна-ўгорскай групы. На жаль, у ранніх крыніцах абсалютна адсутнічаюць звесткі адносна этнічных назваў гэтых плямёнаў. Толькі ў больш позніх крыніцах, напрыклад у «Аповесці мінулых гадоў», гаворыцца, што землі паміж Прыпяццю і Дзвіной, г. зн. і тэрыторыя гістарычнай Клеччыны, былі заселены дрыгавічамі.

На сённяшні час большасць даследчыкаў лічаць дрыгавічоў племем славянскага паходжання[109]. Аднак асобныя даследчыкі, па-

[108] Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка. Клецкі раён. С. 21—23.

[109] Пилипенко М. Ф. Возникновение Белоруссии: новая концепция. Минск, 1991. С. 32—33.

чынаючы ад Георгія Хабургаева, выказвалі меркаванне, што тэрмін «дрыгавічы» з'яўляецца славянізаванай назвай даславянскай формы[110]. Пры гэтым вытокі апошняй шукаліся выключна ў г. зв. балцкіх мовах, у якіх адшукваліся словы з гэтым коранем (dregnas — вільготны, dregme — вільгаць), і ў выніку рабіліся высновы, што дрыгавічы атрымалі сваю этнічную назву ад характару мясцовасці, на якой пражывалі.

Тым не менш, улічваючы магчымае фіна-ўгорскае паходжанне першых насельнікаў даліны Прыпяці[111], паспрабуем адшукаць паралелі тэрміну «дрыгавічы» ў фінскіх мовах. Варта толькі адзначыць, што даследаванне мае выключна гіпатэтычны характар і таму не можа прэтэндаваць на ісціну ў апошняй інстанцыі. У якасці пункта адліку возьмем больш правільную на думку даследчыкаў форму гэтага этнічнага наймення, а менавіта «дроговичи» (Л. Аляксееў) і «драгавічы» (М. Ермаловіч). Па ўсёй верагоднасці, абедзве гэтыя формы з'яўляюцца вытворнымі ад назвы «драгавіт, драгувіт, дрогавіт».

Тэрмін «драгавіт, драгувіт, дрогавіт» — двухскладовы. Другая частка тэрміна «віт» мае адпаведнік у фінскіх мовах, у якіх надзвычай распаўсюджаным з'яўляецца канцэпт «viit, g. viidu», які азначае «жытло, сяліба, месца пражывання, памяшканне»[112]. Значна складаней з першай часткай тэрміна. У фінскіх мовах няпроста адшукаць адпаведнік слову «драг, дрог, друг». Аднак, улічваючы тую акалічнасць, што ў гэтых мовах гукі «tr» (dr) і «r» могуць чаргавацца, як, напрыклад, у слове «truus» — «ruuz» (вялікая лодка, човен-пласкадонка), можна выказаць меркаванне, што альтэрнатыўнай формай «драг, дрог, друг» мог быць тэрмін «рог, раг, руг». І сапраўды, канцэпты «rog», «rag» і «rug» з'яўляюцца досыць распаўсюджанымі ў фінскіх мовах[113].

Паспрабуем разабраць гэтыя канцэпты паасобку. Слова «roog, g. roo» азначае ў фінскіх мовах «трысцё, трыснёг, трысцёвы зараснік»[114]. Што да тэрміна «rag», то ён азначае «зараснік, гушчар,

---

[110] Загарульскі Э. М. Заходняя Русь IX—XIII стст. Мінск, 1998.

[111] Шахматов А. В. К вопросу о финско-кельтских и финско-славянских отношениях // Известия Императорской Академии наук. VI серия. 1911. Т. 5. С. 711.

[112] Saks E. Esto-Europa: a treatise on the finno-ugric primary civilization in Europe. Montreal—Lund, 1966. P. 21.

[113] Пакінем у баку фіна-ўгорскі канцэпт «rõhu, g. rõhu», які адносіцца да сферы чараўніцтва і магіі.

[114] Saks E. Aesti: an analysis of an ancient civilization. Montreal—Heidelberg, 1960. P. 123.

хмызняк»[115]. Апошні тэрмін «rug» з'яўляецца, верагодна, вытворным ад слова «ruht, g. ruhi» або «ruih, g. ruuh», што азначае «невялікая лодка», асабліва «азёрная лодка»[116]. У дадзеным выпадку літара «h» перадаецца літарай «g», што ўласціва для лацінскай транслітарацыі фіна-ўгорскіх слоў. Думаецца, што ўсе азначаныя канцэпты дапаўняюць адзін другі, служачы адметнай характарыстыкай прыродных умоў, ландшафту, у якіх пражывалі дрыгавічы. У залежнасці ад абставінаў, жыхары гэтых мясцін маглі называць сябе па-рознаму, робячы націск на той ці іншы аспект асаблівасцей уласнага пражывання або ўласнай гаспадарчай дзейнасці. Падсумоўваючы сказанае, адзначым, што тэрмін «драгавічы» мусіў азначаць супольнасць людзей, якія пражывалі ў гушчарах і лясных зарасніках і якія лёгка перамяшчаліся па рэках і азёрах з аднаго месца на другое на сваіх невялікіх хуткіх чаўнах[117].

Паступова назва аднаго з мясцовых фіна-ўгорскіх плямёнаў, што пражывала ў даліне Прыпяці, стала абазначаць новую супольнасць, якая пачала ўтварацца ў выніку змяшэння фінаў са славянамі, якія пранікалі сюды з поўдня, а таксама балцкім насельніцтвам. Вынікам растучай славянізацыі, пачынаючы з IX—X стст., стала з'яўленне тыпова славянскага канчатка «ічы» ў назве новай этнічнай супольнасці. Не дзіўна, што ў XI—XIII стст., калі традыцыя ўжо стала выводзіла прыпяцкіх драгавічоў ад славян, некаторыя вучоныя кніжнікі, у тым ліку ўкладальнік «Аповесці мінулых гадоў», суадносілі іх з балканскімі драгавітамі (драгувітамі). Рускія кніжнікі, як падаецца, істотна «пашырылі» арэал рассялення драгавічоў, размясціўшы іх паміж Прыпяццю і Дзвіной. Неўзабаве мусіла з'явіцца і народная этымалогія паходжання назвы «драгавічы», якая зыходзіла са славянскай першаасновы гэтага этнічнага найменні.

Сучасная гідраніміка і тапаніміка раёна ў значнай ступені абавязана сваім існаваннем надзвычай багатаму свету ўяўлення старажытных насельнікаў Клеччыны. Не выключана, што гідронімы на тэрыторыі сучаснага Клецкага і суседніх раёнаў маюць пераважна фіна-ўгорскае паходжанне. Назва ракі Лань паходзіць, верагодна, ад эстонскага слова «lanne, g. lange», якое азначае «спад, спуск, падзенне»[118]. Гэта характарыстыка ракі як найлепей адлюстроўвае

[115] Saks E. Aesti… P. 128.

[116] Тамсама. P. 144, 190.

[117] Гл. агляд альтэрнатыўных версій паходжання назвы «дрыгавічы»: Рогалеў А. Сцежкі ў даўніну. Мінск, 1992. С. 12—22.

[118] Saks E. Aesti… P. 123.

асаблівасці ландшафту, па якім яна цячэ. Блізкім па значэнні да «lanne» з'яўляецца другое фінскае слова, а менавіта «laane, g. laine», якое азначае «хваля»[119]. З іншага боку, назва ракі Лань мае адпаведнікі і ў кельцкіх мовах, дзе яна азначае «чысты», «празрысты». Рэкі з падобнай або блізкай назвай маюцца ў розных частках Еўропы. Найбольш вядомай сярод іх з'яўляецца рака Лана ў басейне сярэдняга Рэйна ў Германіі. У сярэднявеччы назва беларускай Лані нярэдка перадавалася ў лацінамоўных дакументах як «Hlana» або «Lana».

Назва прытока Лані ракі Цапра (Цупра) была ўтворана, хутчэй за ўсё, ад слоў «soo, g. soo» (балота)[120], «pera, g. pära» (за, ззаду, у тыле) або «piir, pir, pyre» (памежжа, памежная зона)[121], а таксама «ra» (рака)[122], і азначае літаральна «рака, якая знаходзіцца за балотам», або «рака, якая цячэ паміж балот». Пры перадачы назваў з фінскай на славянскую мову гук «с» мог у асобных выпадках пераходзіць у гук «ц». У аснове найменя невялікай рачулкі Сельна (Сільна) магло ляжаць фінскае слова «siil, g, siilu» (пагорак, вугал, канец, мыс)[123] або «selg, g. selja» (край гары або пагорка, мыс, водападзел, рачны басейн, паўвостраў)[124]. З геаграфічнага пункту гледжання згаданыя канцэпты добра адлюстроўвалі характар мясцовасці, па якой цякла рака (канцэпт «na» ў фінскіх мовах азначае «рака»). З абодвух бакоў да рэчышча Сільны (Сельны) прымыкалі пагоркі; сама ж рака ў месцы ўпадзення ў Лань утварала як бы мыс, паўвостраў. Сам клецкі дзядзінец быў заснаваны на месцы старога неўмацаванага паселішча на левым беразе Лані ніжэй упадзення ў яе Сільны, на прырэчным схіле марэннага пагорка. Арынская гара, пад схілам якой цякла Сільна, сваю назву магла атрымаць ад фінскага слова «aru, g. aro» (пагоркавая мясцовасць, пагорак)[125] або «hari, g. harja» (вяршыня, грэбень, хрыбет)[126]. Толькі ў пазнейшыя часы назва гары стала атаясамлівацца з жаночым імем Ірына (Арына).

Назва паселішча, якое мясцовыя жыхары заснавалі ў месцы ўпадзення Сільны ў Лань, дайшло да нашых дзён у форме «Клецк, Клецак». Існуюць розныя меркаванні адносна этымалогіі назвы

---

[119] Saks E. Esto-Europa… P. 85.

[120] Saks E. Aesti… P. 154.

[121] Saks E. Esto-Europa… P. 21.

[122] Тамсама. P. 35.

[123] Тамсама. P. 73.

[124] Тамсама. P. 98—99.

[125] Тамсама. P. 20.

[126] Тамсама. P. 69.

горада. Раней яе паходжанне звычайна звязвалася са словамі «клецъ» (каморка, кладоўка, свіран), а таксама са словам «клечь» (бярозавыя парасткі). У апошнія часы выказвалася меркаванне, што ў аснове назвы Клецк мог ляжаць гідронім і што горад атрымаў сваю назву ад ужо зніклага прытока Лані, які адпаведна называўся «Клеча, Клеца»[127]. Пагаджаючыся ў цэлым з абраным накірункам пошукаў, хочацца выказаць уласнае меркаванне, што этымалогію прытока не трэба абавязкова шукаць у славянскіх мовах. На гэту акалічнасць звярнуў увагу яшчэ беларускі даследчык Аляксандр Рогалеў[128]. Тым больш, што першымі насельнікамі Клеччыны былі фіна-угры, якія пакінулі пасля сябе багатую спадчыну ў галіне гідраніміі. Не выключана, што ў аснове старажытнай назвы «Клеческ, Клечьск, Кльчьскъ» ляжала старафінскае слова «läte» (крыніца, выток)[129]. Верагодна, што ў тым месцы, дзе Сільна ўпадала ў Лань, знаходзілася крыніца або выток ручая. Трэба адзначыць, што да нядаўніх часоў рэчышча Лані было багата на крыніцы; у даліне ракі бралі пачатак многія ручаі. На мове першых жыхароў паселішча магло называцца «Летэ, Лятэ». Пазней да фінскай асновы слова быў дабаўлены тыповы славянскі канчатак «ск, цк», і з цягам часу адбылася замена літары «т» на літару «ч». Такім чынам, паселішча стала называцца «Леческ, Лечьск», пакуль у пачатку назвы не з'явілася літара «К» і не ўтварылася звыклая форма слова «Клеческ, Клечьск».

### 4.3.2. Клецкае княства ў Сярэднявеччы

Археалагічныя даныя сведчаць, што ў I—V стст. да нашай эры на месцы пазнейшага клецкага дзядзінца існавала неўмацаванае паселішча, якое належала да культуры штрыхаванай керамікі[130]. Устаноўлена таксама, што на месцы пазнейшага клецкага вакольнага горада ў X—XI стст. таксама існавала неўмацаванае паселішча[131]. Відавочна, што яно мусіла выконваць ролю адміністрацыйнага цэнтра для насельніцтва, што пражывала ў вярхоўях Лані і Ушы. Пабудова клецкага дзядзінца на месцы неўмацаванага паселішча адносіцца, па

---

[127] Лемцюгова В. П. Тапонімы распавядаюць: навукова-папулярныя эцюды. Мінск, 2008. С. 195—196.

[128] Рогалеў А. Сцежкі ў даўніну. С. 60. Мажліва, трэба звярнуць увагу на старажытныя кельцкія мовы. Напрыклад, на тэрыторыі сучаснай Ірландыі ў сярэднія вякі існавалі населеныя пункты з такімі назвамі, як, напрыклад, Клетэк (Cleteck) (Keltische Sagen aus Irland // Hrsg. M. Löpelmann. München, 2001. S. 145).

[129] Saks E. Aesti… P. 168.

[130] Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка. Клецкі раён. С. 25.

[131] Тамсама. С. 26.

даных археалогіі, да сярэдзіны XI ст. Узнікненне вакольнага горада археолагі датуюць XII—XIII стст.

Не выклікае сумненняў, што ў XI—XII стст. у гісторыі Клецка мусілі адбыцца кардынальныя зрухі. Гэтыя змены былі цесна звязаны з паўстаннем і пашырэннем дзяржавы русаў, або Рускай дзяржавы. Русы, якія ў другой палове IX — першай палове X ст. падпарадкавалі сваёй уладзе фінскія і славянскія плямёны вярхоўяў Дзвіны, Дняпра і Волгі, а таксама сярэдняга Дняпра, пачынаючы з другой паловы X ст. перайшлі да каланізацыі басейнаў іх прытокаў. Рака Дняпро выконвала важнейшую ролю ў распаўсюджанні ўлады русаў у рэгіёне. Пасля таго як русы ў сярэдзіне X ст. канчаткова замацаваліся ў Кіеве, яны амаль без прамаруджання пачалі асваенне зямель, што знаходзіліся ўздоўж прытокаў Дняпра. У 980 г. на Прыпяці быў заснаваны Тураў, а яшчэ праз стагоддзе, у 1097 г., — Пінск. Пасля асваення даліны Прыпяці русы звярнулі ўвагу на левыя прытокі гэтай ракі, па якіх яны сталі пранікаць на поўнач. Гэты працэс мусіў адбывацца на працягу XI ст. Пры гэтым Тураў з'яўляўся важнейшым стратэгічным пунктам, з якога ўлада рускіх князёў распаўсюджвалася на поўнач[132]. З гэтай важнай функцыяй Турава даследчыкі звязваюць яго высокае месца ў іерархіі рускіх гарадоў. Горад знаходзіўся на поўначы ранняй («унутранай») Русі. Адсюль пачыналася «знешняя», г. зн. новая Русь. У сваім руху на поўнач русы неўзабаве дасягнулі вярхоўяў Случы, Лані і Цны. Ля вытокаў Случы быў заснаваны Слуцк, які ўпершыню згадваецца ў гістарычных крыніцах пад 1116 г. Відаць, неўзабаве ў вытоках Лані быў заснаваны Клецк, які ўпершыню згадваецца ў хроніках пад 1127 г.

У вярхоўі Лані русы пранiклі, верагодна, дзесьці ў пачатку — першай палове XI ст. У сярэдзіне стагоддзя на месцы неўмацаванага паселішча быў заснаваны дзядзінец Клецка, а пазней, у першай палове наступнага XII ст., таксама вакольны горад. Клецк з'яўляўся цэнтрам удзела ў складзе Тураўскага княства і меў уласнага князя. У 1127 г. упершыню згадваецца ў летапісах клецкі князь Вячаслаў Яраславіч. На жаль, нічога не вядома пра яго паходжанне. Пазней, у 40-я гг. XII ст., клецкім князем з'яўляўся брат кіеўскага князя Усевалада Вольгавіча Святаслаў. Улада клецкага князя мусіла распаўсюджвацца на верхняе і сярэдняе цячэнне Лані, а таксама на вытокі Цны. На поўначы яна дасягала вытокаў Ушы. На ўсходзе прыродным бар'ерам, які аддзяляў Клецкае княства ад Слуцкага, магла з'яўляцца

[132] Загарульскі Э. М. Заходняя Русь IX—XIII стст. С. 100.

рака Морач. На захадзе межы Клецкага княства даходзілі, верагодна, да вярхоўяў Шчары.

З рускімі князямі звязваюцца важныя культурныя змены на тэрыторыі Клеччыны. Дзякуючы іх уладзе тут пачало распаўсюджвацца хрысціянства і з'явіліся першыя, яшчэ драўляныя, хрысціянскія цэрквы. Аднак доўгі час на Клеччыне, як і паўсюль на Беларусі, хрысціянства мусіла суіснаваць з паганствам, якое мела глыбокія карані сярод мясцовых плямёнаў. Двор князя і царква спрычыніліся да паступовай славянізацыі мясцовага насельніцтва. Працэс гэты мусіў зацягнуцца на доўгія стагоддзі, практычна да самага канца XV ст.

### 4.3.3. Клецк у канцы XV — пачатку XVI ст.

Пасля сярэдзіны XII ст. Клецк на доўгі час знікае са старонак летапісаў. Наступная згадка пра горад адносіцца ўжо да канца XIV ст. У канцы XIV — пачатку XV ст. Клецк згадваецца ў спісе літоўскіх гарадоў: «А се грады литовскыи: Случеск. Городец на Немне. Мереч. Клеческ. Кернов. Ковно»[133]. Да сярэдзіны XIV ст., хутчэй за ўсё, у часы Гедзіміна, Клецк з воласцю быў далучаны да ўладанняў вялікіх князёў літоўскіх. Клецк і воласць з'яўляліся непасрэднай уласнасцю пануючай дынастыі Гедзімінавічаў і ўваходзілі ў склад іх дамена[134].

Часам вялікі князь літоўскі перадаваў Клецк у якасці ўдзела сваім падданым, звычайна княскага паходжання. У канцы XIV ст. у Клецку кіраваў князь Ямант Тулунтавіч. Пасля яго гібелі ў бітве з татарамі на рацэ Ворскла ў 1399 г. горад перайшоў да малодшага брата Вітаўта Жыгімонта Кейстутавіча. У 1404 г. Вітаўт перадаў Клецк князю Раману Фёдаравічу[135].

У 1440 г. Казімір Ягелончык перадаў горад сыну Жыгімонта Кейстутавіча Міхаілу Жыгімонтавічу. Гэтым наданнем новы гаспадар хацеў заваяваць прыхільнасць князя, бацька якога, Жыгімонт Кейстутавіч, былы ўласнік Клецка, стаў ахвярай змовы літоўскай і рускай арыстакратыі ў Вербную нядзелю 1440 г. Але князь Міхаіл Жыгімонтавіч не кіраваў у Клецку доўга. Пасля выкрытай змовы супраць Казіміра Ягайлавіча ён вымушаны быў пакінуць Клецк і шукаць ратунку ў эміграцыі. Клецкая воласць перайшла непасрэдна

---

[133] Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов. Т. 1. Минск, 1959. С. 112.

[134] Пазднякоў В. Клецк X—XVIII стст. Матэрыяльная і духоўная культура беларускага феадальнага горада. Мінск, 2008. С. 20—28.

[135] Чаропка В. Клецк. Повязь часоў. Беларускі Гістарычны Часопіс. №8 (2006), С. 33.

да вялікага князя, які кіраваў ёю праз сваіх намеснікаў. Ужо ў 1441 г. згадваецца велікакняскі намеснік Івашка Рагацінскі[136]. Вядома таксама, што ў другой палове XV ст. функцыі велікакняскага намесніка ў Клецку выконваў Ян (Івашка) Неміровіч[137].

У другой палове XV ст. Казімір Ягайлавіч падараваў клецкую воласць маскоўскаму выгнанніку Івану Васілевічу Яраславічу, які быў сынам удзельнага серпухаўскага і бароўскага князя Васіля Яраславіча[138]. У 1456 г., пасля арышту свайго бацькі вялікім князем маскоўскім Васілём II, Іван Васілевіч разам з маці ўцёк у ВКЛ, да караля Казіміра. Невядома, аднак, калі дакладна збеглы маскоўскі князь атрымаў у валоданне Клецк. На гэты конт існуе некалькі поглядаў. М. Любаўскі лічыць, што Клецк з воласцю быў падараваны князю Івану Васілевічу адразу пасля прыезду апошняга ў ВКЛ у 1456 г.[139]. Ф. Леантовіч выказаў меркаванне, што Іван Васілевіч атрымаў Клецк толькі ў 1492 г., калі на велікакняскі трон узышоў Аляксандр Ягайлавіч[140]. З-за браку крыніц немагчыма вырашыць гэту спрэчку. Можна толькі меркаваць, што ісціна знаходзіцца недзе пасярэдзіне. Ва ўсялякім разе, несумненна, што недзе паміж гэтымі датамі Клецкая воласць стала ўласнасцю Івана Васілевіча Яраславіча. Клецкая воласць і іншыя воласці (Давыд-Гарадок, Рагачоў) сталі для яго рэкампенсацыяй за страчаныя на радзіме ўладанні. Пасля таго, як у 1498 г. сын Івана Васілевіча Яраславіча Фёдар ажаніўся з дачкой пінскай княгіні Мар'і (з роду Алелькавічаў) княжной Аляксандрай, Яраславічы сталі трымаць у сваіх руках абедзве воласці — Пінск і Клецк[141].

Валодаючы Клецкам, князь Іван Васілевіч Яраславіч пражываў, здаецца, пераважна ў Давыд-Гарадку. Пра гэты пункт як улюбёную рэзідэнцыю Яраславічаў ускосна сведчыць колькасць грамат і дакументаў, якія выходзілі з гэтых двух цэнтраў княскай улады. Пераважная большасць грамат, якія вядомы зараз даследчыкам, была выдадзена Іванам Васілевічам Яраславічам менавіта ў Давыд-Гарадку[142]. Не выключана, што на выбар князя паўплывалі меркаванні

[136] LM. Užrašymų knyga 3 / Parengė L. Anužytė ir A. Baliulis. Vilnius, 1998. P. 43.

[137] Тамсама. P. 19.

[138] Кром М. Меж Русью и Литвой… С. 103.

[139] Любавский М. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского Статута. Москва, 1892.

[140] Леонтович Ф. Очерки истории литовско-русского права: образование территории Литовского государства. Санкт-Петербург, 1894.

[141] Кром М. Меж Русью и Литвой… С. 103.

[142] Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy... S. 154—155.

бяспекі. Згублены ў палескіх лясах і сярод шматлікіх непраходных балот Давыд-Гарадоцкі замак уяўляўся амаль недаступным для татараў. Аднак можна знайсці і іншае тлумачэнне гэтай з'яве: дакументы Івана Васілевіча Яраславіча з Клецкага замка маглі не дайсці да сучаснікаў па той простай прычыне, што яны згарэлі або былі знішчаныя падчас аднаго з татарскіх набегаў пачатку XVI ст. Дый і сам Клецкі замак быў спалены і зруйнаваны татарамі ў 1503 г. Невядома, ці быў замак у Клецку цалкам адноўлены да 1521 г., калі памёр апошні з Яраславічаў князь Фёдар.

Праўленне караля і вялікага князя Казіміра Ягайлавіча (1440—1492) было часам буйнамаштабнай раздачы земляў з велікакняскага фонду і фарміравання буйной зямельнай уласнасці. У працэс зямельнай экспансіі былі ўцягнутыя ўсе катэгорыі ўласнікаў, ад баяр-зямян да князёў і паноў. Арэнай зямельнай экспансіі з'яўлялася ўся дзяржава. Клецкая воласць не была тут выключэннем.

Дэталёвая характарыстыка дадзенай тэмы ў адносінах да Клецкай воласці не ўяўляецца магчымай з прычыны недахопу крыніц. З другой паловы XV — пачатку XVI ст. да нас дайшлі пераважна рэгесты дакументаў на валоданне зямлёй для тых ці іншых катэгорый насельніцтва. Пры чым, як уяўляецца, яны не вычэрпваюць усіх рэгестаў і дакументаў, выдадзеных велікакняскай канцылярыяй для землеўласнікаў. Таксама трэба ўлічваць, што ў акрэслены час адрасатамі актаў на зямлю былі таксама прадстаўнікі мясцовай каталіцкай і праваслаўнай цэркваў, асобныя клецкія мяшчане, магчыма, нават татары.

Аднак нават надзвычай сціплая колькасць дакументаў у дачыненні да Клецкай воласці дазваляе зрабіць пэўныя высновы адносна характару і зместу працэсу фарміравання на гэтай тэрыторыі зямельнай уласнасці ў другой палове XV — пачатку XVI ст. Хоць у фарміраванні зямельнай уласнасці на тэрыторыі Клецкай воласці ўдзельнічалі практычна ўсе катэгорыі землеўласнікаў ВКЛ, у тым ліку паны і князі, сярод іх амаль не было прадстаўнікоў паноў-рады. Арэнай экспансіі з боку вышэйшых саноўнікаў ВКЛ (Радзівілы і інш.) Клецкая воласць стане толькі бліжэй да сярэдзіны XVI ст. А пакуль што найбуйнейшымі землеўласнікамі тут з'яўляліся прадстаўнікі пануючай дынастыі Гедзімінавічаў. Удава былога ўладальніка Клецка князя Міхаіла Жыгімонтавіча атрымала сяло Меншае на рацэ Цапра, якое належала раней нейкаму зямяніну Ігнату[143]. Іншыя

[143] LM. Užrašymų knyga 3. P. 43.

князі ў часы караля Казіміра таксама разгортвалі сваю эканамічную дзейнасць на Клеччыне. Князь Барыс Глінскі валодаў Новым Дваром верагодна, (сучасная вёска Навадворкі Клецкага раёна)[144]. У Клецкай воласці, як і ў іншых цэнтральных і заходніх паветах ВКЛ, асядалі князі-эмігранты з Маскоўскай дзяржавы. Адзін з іх, Іван Васілевіч Яраславіч, як казалася вышэй, стаў уладальнікам Клецка і воласці. Ён не толькі абдарваў клецкіх зямян і сваіх уласных слуг з валаснога зямельнага фонду і пацвярджаў іх ранейшыя зямельныя валоданні, але таксама павялічваў асабістую маёмасць праз набыццё баярскіх зямельных уладанняў. Так, прыкладна ў 1501 г. Іван Васілевіч Яраславіч набыў у баяр Грыня і Мацка Івашкавічаў Паўліковічаў маёнтак Лукаўцы[145]. Кароль Аляксандр дараваў уладальніку Клецка канюшых людзей у яго дзяржаве[146].

Асабліва актыўна ў акрэслены час зямельную экспансію ў Клецкай воласці разгортвалі паны. Андрушка Маствіловіч набыў у Клецкім павеце сяло Менідзікавічы[147], сяло Алізарава[148], а таксама княскі двор Цапру[149]. Адзначым, што пан Андрушка Маствіловіч браў актыўны ўдзел у тагачасным палітычным і грамадскім жыцці ВКЛ. У 1445 г. ён разам з іншымі літоўскімі панамі ўдзельнічаў у пераможным паходзе войска ВКЛ на вялікага князя маскоўскага. Андрушка Маствіловіч праявіў сябе таксама як мецэнат. У 1450 г. ён выдаў фундуш клецкаму касцёлу Св. Тройцы на дзесяціну са сваіх уладанняў[150].

У Клецкай воласці зямельную ўласнасць мелі і ншыя буйныя паны ВКЛ. Ян Неміровіч валодаў сялом Дабрамысль[151]. Фёдар Неміровіч атрымаў ад вялікага князя Казіміра ў 1441 г. сяло Агарэвічы замест некалькіх сёл у Тураўскай воласці[152]. Аднак асноўная маса валоданняў Неміровічаў знаходзілася ў суседнім з Клецкай воласцю Навагародскім павеце, а дакладней у яго паўднёва-ўсходняй частцы.

Паны атрымлівалі ў Клецкай воласці не толькі зямельныя уладанні, але таксама людзей, якія пражывалі на гэтай зямлі. Кароль

---

[144] LM. Užrašymų knyga 3. P. 56.

[145] Тамсама. P. 116, 117.

[146] Тамсама. P. 116.

[147] Тамсама. P. 43.

[148] Тамсама. P. 43.

[149] Тамсама. P. 68.

[150] Kodeks dyplomatyczny katedry i diecezji wileńskiej. T. 1 (1387—1507) / Wyd. J. Fijałek i W. Semkowicz. Kraków, 1948.

[151] LM. Užrašymų knyga 3. P. 19.

[152] Тамсама. P. 43.

Казімір дараваў Фёдару Глябовічу ў Клецкай воласці чатырох чалавек: Ціша і Якава Куліковічаў, Астапку і Фрола[153].

Сярод атрымальнікаў зямельнай уласнасці ў Клецкай воласці былі гаспадарскія ўраднікі і служачыя. Кароль Казімір дараваў маёнтак Грыцэвічы велікакняскаму пісару Ваську Любічу[154]. Пасля смерці апошняга ён разам з іншай зямельнай уласнасцю перайшоў да яго брата, таксама гаспадарскага пісара Пятрашкі Любіча. У самым пачатку свайго панавання вялікі князь Аляксандр пацвердзіў наданне Пятрашку Любічу маёнтка Грыцэвічы з усімі іншымі ранейшымі наданнямі. Адзначым, што да Ваські Любіча Грыцэвічамі валодаў Алізар, якому належала таксама аднайменнае сяло ў Клецкім павеце, што пазней перайшло да Андрушкі Маствіловіча. Відавочна, што пан Алізар (Аляхновіч?) не пакінуў пасля сябе нашчадкаў, і ўсе яго ўладанні перайшлі да іншых уласнікаў.

Баяры і зямяне таксама атрымлівалі зямельныя валоданні ў Клецкай воласці. Яшчэ ў самым пачатку свайго панавання вялікі князь Казімір надаў нейкаму Брыку з братам пустую зямлю Заніўчаву[155]. Пазней на гэтым месцы паўстаў маёнтак Брыкаўшчына[156].

У пачатку панавання вялікага князя Казіміра, а можа яшчэ ў часы вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча, баярын Пятрышча Рыгоравіч з братам атрымаў у Клецкім павеце сёлы Лявонавічы, Цыцкавічы, а таксама Мірашова[157]. Ён валодаў яшчэ і бортнікамі ў Клецкім павеце: Дзямідам, двума Дабарэвічамі, Палаўчыном, Клімцом і Трунцом[158]. Пятрышчу належалі таксама Жарабковічы[159]. Сынам Пятрышчы Рыгоравіча з'яўляўся гаспадарскі дваранін Пацка Пятрышчавіч[160]. Пасля смерці Федзькі Брыковіча менавіта Пацка Пятрышчавіч валодаў маёнткам Брыкаўшчына[161].

Зямянін Пішчык атрымаў ад вялікага князя Казіміра 9 чалавек у Круговічах і 3 чалавекі ў Жарабковічах[162]. Яго сынамі з'яўляліся

[153] LM. Užrašymų knyga 3. P. 56.

[154] Тамсама. P. 75—76.

[155] Тамсама. P. 56.

[156] Пазнякоў В. З гісторыі вёсак Клецкага раёна (XV—XVIII стст.) // Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка. Клецкі раён. Мінск, 1999. С. 74—75.

[157] LM. Užrašymų knyga 3. P. 43, 56.

[158] Тамсама. P. 55—56.

[159] Тамсама. P. 56.

[160] LM. Užrašymų knyga 8. P. 163, 407.

[161] Пазнякоў В. З гісторыі вёсак Клецкага раёна… С. 74.

[162] LM. Užrašymų knyga 3. P. 56.

Рыгор і Леўка Пішчыкавічы, якія, згодна з попісам 1528 г., выстаўлялі на гаспадарскую службу па кані[163]. Яцка Чартовіч атрымаў сяло Рамейкава пасля ўцёкаў яго былога гаспадара[164]. Землі ў Клецкай воласці атрымлівалі таксама баяры з усходніх паветаў ВКЛ. Так, старадубскі баярын Яцка Іллініч валодаў у Клецкім павеце сялом Пашэнка[165]. Сярод іншых найбольш знаных з крыніц другой паловы XV — пачатку XVI ст. клецкіх баяр і зямян можна згадаць Фёдара Шчэпу, Войну Мацвеевіча, Даматкана, Келбасу, Мілевіча.

У XV ст. Клецк з'яўляўся цэнтрам воласці (павета, districtus). Клецкая воласць непасрэдна ўваходзіла ў склад вялікакняскіх уладанняў. Клецкая воласць у Познім Сярэднявеччы ахоплівала значную тэрыторыю, якая істотна пераўзыходзіла памеры сённяшняга Клецкага раёна. Яна ўключала Клецкі замак і падпарадкаваныя яму населеныя пункты. На поўдні воласць межавала з Пінскай воласцю (княствам), даходзячы да сёл Агарэвічы[166], Круговічы[167] і Любашава[168] (цяпер Ганцавіцкі раён). На ўсходзе яна межавала са Слуцкім і Капыльскім княствамі, якія знаходзіліся ва ўладанні князёў Алелькавічаў. Усходняя мяжа былой Клецкай воласці прыкладна адпавядала сённяшняй мяжы паміж Клецкім і Капыльскім раёнамі. На паўднёвым захадзе воласць межавала са Слонімскай воласцю (паветам). Клецкая воласць, па меншай меры, у часы вялікакняскага намесніка Івашкі Рагацінскага (1440—1452 гг.), уключала сяло Дабрамысль[169] (цяпер Баранавіцкі раён) і, магчыма, сёлы Любошычы[170] (Любішычы, Любішчычы) (цяпер Івацэвіцкі раён) і Спорава[171] (цяпер Івацэвіцкі раён). На захадзе і на паўночным захадзе Клецкая воласць суседнічала з Навагародскім намесніцтвам. Мяжа паміж імі мусіла праходзіць недзе каля Ляхавічаў (Ляхава), Мышы і, магчыма, Гарадзішча, прычым згаданыя населеныя пункты адносіліся да Навагародскай зямлі. Відавочна толькі, што на ляхавіцкім накірунку мяжа паміж Навагародскай зямлёй і Клецкім княствам праходзіла паміж Ляхавічамі і Жарабковічамі. У склад

[163] РИБ. Т. 33. Литовская Метрика. Книги публичных дел. Петроград, 1915. С. 189.

[164] LM. Užrašymų knyga 3. P. 56, 65.

[165] Тамсама. P. 30.

[166] Тамсама. P. 43.

[167] Тамсама. P. 56.

[168] Тамсама. P. 56.

[169] Тамсама. P. 19.

[170] Тамсама. P. 54.

[171] Тамсама. P. 54

Новагародскага намесніцтва мусіў уваходзіць Нясвіж[172]. Мяжа паміж Клецкай і Нясвіжскай валасцямі праходзіла на поўнач ад вёскі Малева, якая падпарадкоўвалася клецкай адміністрацыі, ля самых вытокаў ракі Лань (цяпер вёска Лань Нясвіжскага раёна).

Дастаткова значная па плошчы Клецкая воласць не вызначалася раўнамерным і аднастайным развіццём. Найбольш важныя ў сельскагаспадарчым плане землі знаходзіліся на левабярэжжы ракі Лань. Самай асвоенай тэрыторыяй у Клецкім княстве з'яўлялася міжрэчча Лані і Цапры. На гэтай прасторы знаходзілася большасць населеных пунктаў (замак Клецк, двор Цапра, сёлы Меншае, Лявонавічы, Цыцкавічы, Мірашова, Грыцэвічы, Журылчычы, Брыкаўшчына і інш.). Глебы міжрэчча Лані і Цапры былі самымі ўрадлівымі ва ўсім Клецкім павеце. Землі на паўночны захад ад Клецка, асабліва тыя, што ляжалі паміж рэкамі Лукавец і Хінеўка, таксама адносіліся да ліку развітых у сацыяльна-эканамічным плане. Тут размяшчаліся родавыя сёлы, маёнткі і двары многіх літоўскіх феадалаў (Яраславічаў, Глінскіх, Даматканаў, Шчэпаў і інш.). У акрэслены час землі на паўднёвы захад ад Клецка таксама былі прадметам інтэнсіўнай каланізацыі. Тут яшчэ ў самым пачатку XV ст. былі закладзены вялікія сёлы Менідзікавічы (Масцілавічы) і Алізарава, якія ў сярэдзіне стагоддзя перайшлі да пана Андрэя Маствіловіча. Непадалёк ад Клецкага замка знаходзілася сяло Кушчыцы (Кухчыцы), якое належала князям Яраславічам[173]. У самым пачатку XVI ст. Яраславічы пачалі асваенне зямель басейна ракі Нача, дзе заснавалі маёнтак Сіняўка і сяло Панача[174]. Яшчэ ў часы Казіміра Ягайлавіча, а можа нават і раней, былі асвоены землі сярэдняга цячэння ракі Цна на самым крайнім поўдні Клецкай воласці і на памежжы з Пінскім княствам. На гэтай прасторы знаходзіліся вялікія сёлы Агарэвічы, Круговічы і Любашава (цяпер Ганцавіцкі раён). Прыкладна ў гэты ж час пачалося асваенне басейна ракі Морач у яе вытоках. Першапраходцамі тут выступалі баяры Яцка Іллініч і Іван Вяжэвіч. Дзесьці ў сярэдзіне XV ст. у вярхоўях Морачы было заснаванае сяло Макраны, першымі жыхарамі якога, відаць, былі 9 чалавек, якіх Іван Вяжэвіч набыў у Яцка Іллініча[175]. Магчыма, тут знаходзілася сяло Пашэнка, што належала

---

[172] Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie... S. 127.

[173] Пазднякоў В. З гісторыі вёсак Клецкага раёна… С. 80.

[174] Тамсама. С. 86, 84.

[175] LM. Užrašymų knyga 3. P. 56; Пазднякоў В. З гісторыі вёсак Клецкага раёна… С. 82.

Іллінічу[176]. Басейн ракі Морач быў знаным месцам княскіх і баярскіх ловаў — палявання і рыбалоўства.

Нягледзячы на дастаткова інтэнсіўнае асвенне тэрыторыі Клецкай воласці ў XV ст., заснаванне новых населеных пунктаў і цэнтраў гаспадарання, значная частка воласці, асабліва на поўдні, па-ранейшаму заставалася пакрытай густым лесам і балотамі. З фізіка-геаграфічнага пункту гледжання, поўнач і поўдзень Клецкай воласці моцна кантраставалі паміж сабой. Калі на поўначы палеткі і лугі межавалі з лясамі і балотамі, то поўдзень, за выключэннем раёна Круговічы—Агарэвічы—Любашава, уяўляў сабой амаль суцэльны балоціста-лясны масіў. На поўначы Клецкага павета знаходзілася большасць населеных пунктаў, там пражывала асноўная маса насельніцтва. На поўдні паселішчы былі рэдкія і насельніцтва ў іх нешматлікае. Само ж насельніцтва Клецкай воласці ў пачатку XVI ст. налічвала максімум 3—4 тыс. чалавек, з якіх некалькі соцень пражывалі ў Клецку. Па тэрыторыі воласці праходзілі важныя ў стратэгічных адносінах дарогі, якія звязвалі цэнтр воласці з іншымі цэнтрамі, у першую чаргу, са сталіцай дзяржавы Вільняй, а таксама з Пінскам, Слуцкам, Навагародкам і Слонімам. Важнае значэнне мелі таксама водныя шляхі. Найважнейшай воднай артэрыяй у Клецкай воласці была рака Лань, тады дастаткова шырокая і паўнаводная. Лань злучала Клецк з Давыд-Гарадком, Пінскам і Туравам. Праз правыя прытокі Прыпяці, асабліва Гарынь і Стыр, ажыццяўлялася сувязь з Валынню і Руссю. Захаваліся звесткі, што кароль Уладзіслаў Ягайла вяртаўся аднойчы з Вільні ў Польшчу праз Клецк па рацэ Лань, а далей правымі прытокамі Прыпяці[177]. Важнымі воднымі артэрыямі з'яўляліся таксама рэкі Цна і Морач.

Да пачатку XVI ст. насельніцтва Клеччыны, за выключэннем выспачак, дзе пражывалі пераважна перасяленцы з Прусіі і Літвы, было ў асноўным славянізавана. Гэтаму працэсу моцна паспрыяла папярэдняя хрысціянізацыя рэгіёна. Такім чынам, можна канстатаваць, што пры князях Яраславічах цалкам завяршыўся працэс, які распачаўся яшчэ пры іх далёкім цёзку князю Вячаславе Яраславічу. Акрамя русінаў і літвінаў на тэрыторыі Клеччыны ў той час пражывалі невялікія групы татараў, палякаў, жмудзінаў, прусаў, латгалаў, якія трымаліся ўласных звычаяў і мовы.

---

[176] LM. Užrašymų knyga 3. P. 30.

[177] Długosz J. Roczniki czyli kroniki sławnego Królestwa Polskiego. Ks. 11 (1413—1430). Warszawa, 1985. S. 57.

## 4.4. Бітва

### 4.4.1. Шлях гаспадарскага войска да Клецка

Вестка пра татарскі напад застала кіраўніцтва краіны ў часе пасяджэнняў паноў-рады, што адбываліся ў Лідзе. На той момант татары знаходзіліся на адлегласці ўсяго аднаго дня дарогі. Рацы, адпраўленыя на пошукі непрыяцеля, напаткалі невялічкі татарскі загон у мілі ад Ліды. Татары былі разбітыя, некалькі з іх трапіла ў палон. Адразу пасля гэтага было абвешчана паспалітае рушанне, на чале якога, згодна пазнейшай гістарыяграфічнай традыцыі, сталі найвышэйшы гетман ВКЛ Станіслаў Пятровіч Кішка і надворны маршалак Міхаіл Львовіч Глінскі. Збор асноўных павятовых харугваў і панскіх початаў адбываўся з 24 па 30 ліпеня. За гэты час да Ліды падцягнулася гарадзенская харугва. У склад войска ўваходзіла таксама лёгкая кавалерыя, г. зв. рацы, незаменная ў змаганні з такім шматлікім непрыяцелем, як татары. На дапамогу гаспадарскаму войску была выслана польская надворная харугва на чале з Сяндзівоем Чарнкоўскім.

30 ліпеня гэтае войска рушыла ў бок Навагародка, куды прыбыла на наступны дзень. На шляху да Навагародка гаспадарскае войска мусіла пераадолець паўнаводны Нёман недзе ў раёне Дакудава. Пасад Навагародка быў моцна пашкоджаны ў часе апошняга татарскага нападу летам 1505 г. Аднак замак не быў захоплены татарамі. Абаронцы, на чале якіх, згодна пазнейшай гістарыяграфічнай традыцыі, стаялі навагародскі намеснік Альбрэхт Гаштаўт, гараднічы Маскевіч, шляхціцы Іван Трызна і Няміра, здолелі адстаяць замак і нанеслі ворагу значныя страты вылазкамі і стрэламі з гармат[178]. У наступным 1506 г. татары зноў стаялі пад сценамі горада, аднак, здаецца, так і не наважыліся яго штурмаваць, абмежаваўшыся выключна рабаваннем навакольных вёсак[179].

У Навагародку гаспадарскае войска знаходзілася 3 дні. Час гэты быў прысвечаны, галоўным чынам, дакамплектацыі войска і высвятленню дакладнага месца дыслакацыі асноўных татарскіх сіл. Тут гаспадарскае войска папоўнілася новымі сіламі. Да яго далучыліся новыя харугвы і початы. Нарэшце, сабралася дэзарганізаваная татарскім нападам навагародская харугва. З усходу мусіла падысці менская харугва. 3 жніўня гаспадарскае войска налічвала ўжо не

[178] ПСРЛ. Т. 35. С. 171.

[179] Тамсама.

менш за 7 тысяч чалавек[180]. Асноўную яго масу складала паспалітае рушанне. Акрамя конніцы, у войску была артылерыя — як мінімум, дзве гарматкі. Тады ж высветлілася месцазнаходжанне татарскага каша. Аддзел, высланы на выведку панамі Андрэем і Юрыем Немtotalовічамі, паланіў непадалёк Гарадзішча 6 татараў, ад якіх кіраўніцтва войска даведалася, што татары разбілі лагер пад Клецкам, а дасланыя ў загоны аддзелы яшчэ не вярнуліся назад.

Атрымаўшы гэтую вестку, вечарам 3 жніўня гаспадарскае войска без прамаруджання вырушыла ў бок Клецка. Войска рухалася ў напрамку Агароднікаў, Карэлічаў. Рух адбываўся ў начны час, пры святле поўні і зор[181]. Марш адбываўся адной згуртаванай калонай. Наперад быў высланы аддзел «пярэдніх людзей» і старожа, у задачу якіх уваходзіла папярэджваць войска аб магчымым з'яўленні татарскіх загонаў. Камандаванне выбірала пераважна глухія, другасныя дарогі, бо імкнулася пазбегнуць сустрэчы з мабільным ворагам[182]. Часам гаспадарскае войска рухалася па лугах і палетках. Разам з тым, камандаванне пазбягала значных водных перашкод, якія маглі істотна замарудзіць рух войска. Адзінай буйной воднай перашкодай на шляху была рака Сервеч, якую войска пераадолела непадалёк ад месца ўпадзення ў яе ракі Нэўда (каля сучаснай вёскі Бярозавец) на досвітку 4 жніўня.

Ранкам 4 жніўня войска было ўжо ў Асташыне. Там яго кіраўніцтва даведалася ад уцекачоў з Цырына і Паланэчкі, што татарскія аддзелы знаходзяцца вельмі блізка. Таму пасля непрацяглага перапынку войска зноў вырушыла ў дарогу. Яно прасоўвалася ўздоўж прытока Нёмана Ушы ў кірунку Паланэчкі. Паміж Цырынам і Паланэчкай «пярэднія людзі» натрапілі на татарскі чамбул колькасцю 500 коннікаў, які вяртаўся ў кош пад Клецк. Распачалася пагоня. Татарскі чамбул быў нагнаны каля Ішкалдзі, частка татар была перабітая, некаторыя з іх былі ўзятыя ў палон. Толькі невялікай колькасці татар удалося ўнікнуць пагоні і, пераправіўшыся на правы бераг Ушы (у раёне сучаснай вёскі Круты Бераг побач са станцыяй Гарадзея), дабрацца да Клецка.

У гэты ж дзень гаспадарскае войска пераадолела шлях ад Ішкалдзі да сяла Малева, каля якога мела намер спыніцца на начлег. Да Клецка заставалася зусім блізка. У сучаснай гістарыяграфіі дагэтуль

[180] Herbst S. Kleck 1506. S. 221.

[181] Поўня была 5 жніўня 1506 года.

[182] Herbst S. Kleck 1506. S. 222.

няма адзінай думкі па пытанні, у якім населеным пункце спынілася гаспадарскае войска, перад тым як вырушыць на Клецк. Зараз даследчыкі схіляюцца да думкі, што гэта былі вёскі Вялікая або Высокая Ліпа ў ваколіцах Нясвіжа[183]. Верагодна, праблема ўзнікла выключна з-за пісарскай памылкі. У выніку шматлікіх перапісванняў Хронікі Быхаўца, у тым ліку з кірыліцы на лацініцу, назва населенага пункта, дзе спынілася гаспадарскае войска на апошні прывал перад бітвай, сказілася. У першапачатковым варыянце Хронікі павінна было быць «в селе на Липе», аднак пазнейшыя перапісчыкі несвядома аб'ядналі прыназоўнік «на» і асабовую назву «Ліпа», а пры перадачы на лацінскую графіку назва ўвогуле змянілася да непазнавальнай. У выніку мы і атрымалі сённяшні варыянт «w sele Nalipoy». Дарэчы, малодшы сучаснік укладальніка Хронікі Быхаўца польскі храніст Мацей Стрыйкоўскі падае назву населенага пункта як Ліпа[184]. У той жа час, населены пункт пад назвай «Ліпа» часта сустракаецца ў дакументах той эпохі.

Раніцай 5 жніўня 1506 г., пасля начной нарады камандавання, гаспадарскае войска вырушыла на Клецк. Па дарозе яго чакала яшчэ адна перашкода — рака Лань. Пераправіўшыся праз Лань у яе вытоках (верагодна, каля сённяшняй вёскі з той жа назвай) Глінскі накіраваўся на татарскі кош.

### 4.4.2. Лакалізацыя бітвы

У сучаснай гістарыяграфіі пытанне аб месцы, дзе адбылася Клецкая бітва 1506 г., дагэтуль трактуецца неадназначна. Большасць даследчыкаў прытрымліваецца думкі, што бітва адбылася на паўднёва-заходняй ускраіне Клецка каля дарогі на Кухчыцы і Сіняўку. Падставай для такой лакалізацыі з'явілася сведчанне Хронікі Быхаўца аб тым, што войска ВКЛ на чале з князем Міхаілам Глінскім падышло да Клецка ў дзень бітвы менавіта з боку Краснага Става («y как pryszli pod Kleczesk, k rece Lani, do Krasnogo Stawu od poludni»)[185]. Паколькі ў масавай свядомасці ў XIX—XX стст. назва «Красны Стаў» ужо трывала замацавалася за паўднёвай ускраінай Клецка, гэта месца пачалі паступова атаясамліваць з месцам, дзе ў 1506 г. адбылася бітва з крымскімі татарамі. Пры гэтым фраза «do Krasnogo Stawu od poludni» адназначна трактавалася як указанне на

[183] Блінец А. Клецкія бітвы... С. 29.

[184] «We wsi Lipiej» (Stryjkowski M. Kronika… T. 2. S. 333).

[185] ПСРЛ. Т. 32. С. 172.

прасторавы, а не часавы вектар. Лічылася, што войска ВКЛ падышло да Краснага Става з поўдня, з боку вёскі Кухчыцы пад заслонай урочышча Старына. Згаданая ў тэксце Хронікі Быхаўца грэбля, абапал якой велікакняскае войска збудавала дзве гаці дзеля пераправы, адназначна трактавалася як Краснаставуская грэбля. У XVII—XIX стст. на шляху з Клецка ў Сіняўку і Пінск сапраўды існавалі грэбля і млын, каля якіх знаходзіўся стаў, які тагачасныя крыніцы называюць Красным[186]. Гара, з якой ратнікі Міхаіла Глінскага ўпершыню пабачылі татарскае войска, упэўнена атаясамлівалася з сённяшняй вышынёй 229. Такі погляд усталяваўся ў сярэдзіне 30-х гг. XX ст. дзякуючы навуковаму аўтарытэту даследчыка ваеннай гісторыі ВКЛ і Польшчы Станіслава Хербста[187]. У пасляваенны час гэтае меркаванне знайшло адлюстраванне ў шэрагу навуковых[188], навукова-папулярных[189], энцыклапедычных[190] выданняў. Афіцыйныя ўрачыстасці 1996 г. з нагоды 490-х угодкаў падзеі і ўсталяванне памятнага крыжа ў гонар перамогі войска ВКЛ каля дарогі Клецк— Сіняўка, здавалася, канчаткова легітымізавалі паўднёва-заходнюю ўскраіну Клецка як месца бітвы з татарамі 1506 г. Падчас чарговых афіцыйных урачыстасцей 2006 г. з нагоды 500-годдзя бітвы агульнапрынятай была ўсё тая ж традыцыйная лакалізацыя яе месца.

Адзначым, што, нягледзячы на панаванне ў пасляваенны час версіі аб паўднёва-заходняй ускраіне Клецка як месцы бітвы 1506 г., існуюць альтэрнатыўныя погляды і меркаванні адносна лакалізацыі бітвы. Гэтаму спрыяе змест гістарычных крыніц, які дазваляе трактаваць месца бітвы па-рознаму. Так, напрыклад, інфармацыю Хронікі Быхаўца («woysko litowskoie wczynili dwe haty czerez reku obapol hrebli stawowoie»)[191] можна было б інтэрпрэтаваць так, што бітва адбылася на паўночна-заходняй ускраіне Клецка каля дарогі на Ляхавічы, дзе крыніцы сярэдзіны XVI ст. згадваюць адзіныя ў Клецку грэблю і сажалку[192]. Часам пад сумненне ставіцца нават магчымасць бітвы ў ваколіцах Клецка. Так, на падставе звестак летапісу Рачынскага («татарове у Клецка кошом стояли, и там же под Клецком над

[186] НГАБ. Ф. 694, воп. 2, спр. 3905, арк. 76.

[187] Herbst S. Kleck 1506. S. 214—230.

[188] Варонін В. А. Два лісты пра бітву пад Клецкам у 1506 г. С. 279—290.

[189] Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка. Клецкі раён. С. 35—37.

[190] Сагановіч Г. Клецкая бітва 1506 г. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4. Мінск, 1997. С. 195.

[191] ПСРЛ. Т. 32. С. 172.

[192] ПКПКК. С. 390, 391.

Цепрою была битва Литве с татары»)[193] рабіліся паспешлівыя высновы, што бітва адбылася на ўсход ад Клецка, на рацэ Цапра[194]. У пачатку 90-х гг. XX ст. па-новаму паспрабаваў паглядзець на праблему лакалізацыі бітвы мясцовы краязнаўца Іван Карпач. Абапіраючыся на ўласны глыбокі досвед клецкага ландшафту, ён выказаў меркаванне, што бітва 1506 г. мусіла адбыцца не на паўднёва-ўсходняй ускраіне Клецка, а ў паўночнай яго частцы, там, дзе невялікая рачулка Сільна ўпадае ў Лань, непадалёк ад нясвіжскага тракту[195]. На вялікі жаль, арыгінальная версія клецкага краязнаўцы не прыцягнула належнай увагі і цяпер амаль забыта.

Як бачым, існуе некалькі версій лакалізацыі бітвы 1506 г., якія істотна адрозніваюцца адна ад адной. Праблема патрабуе дадатковага грунтоўнага вывучэння. Дзеля яе вырашэння неабходна паспрабаваць яшчэ раз уважліва перачытаць усе пісьмовыя крыніцы, што маюцца ў распараджэнні даследчыкаў. Асаблівую ўвагу патрэбна звярнуць на дзве поўныя версіі апісання Клецкай бітвы 1506 г., выкладзеныя ў Хроніцы Быхаўца і Хроніцы Стрыйкоўскага. На вялікі жаль, апавяданні, сучасныя падзеі, адсутнічаюць. Два кароткія паведамленні пра бітву ў лістах Міхаіла Глінскага да вармінскага біскупа Лукаша Ватцэнродэ і караля Аляксандра да жыхароў Гданьска, напісаныя ў тэлеграфным стылі па гарачых слядах, не могуць лічыцца такімі.

Абодва апавяданні паўсталі значна пазней падзеі: Хроніка Быхаўца — у 60-я гг., а Хроніка Стрыйкоўскага — у 70-я гг. XVI ст. З моманту бітвы прайшло ўжо больш за 50 гадоў! За гэты час былі пазабытыя многія дэталі падзеі, не засталося яе непасрэдных удзельнікаў і сведак. Абапіраючыся на асобныя пісьмовыя крыніцы, як польскія, так і беларуска-літоўскія, а таксама на некаторыя ўскосныя сведчанні, укладальнікі паспрабавалі рэканструяваць ход Клецкай бітвы 1506 г. У гэтай рэканструкцыі знайшлі адлюстраванне многія сучасныя ім рэаліі і асобныя элементы тагачаснай алігархічнай ідэалогіі[196]. Абодва ўкладальнікі не толькі не з'яўляліся сучаснікамі падзеі, але не былі таксама ўраджэнцамі Клеччыны. Калі Стрый-

---

[193] ПСРЛ. Т. 32. С. 269.

[194] На існаванне такой версіі ўказваў беларускі гісторык Ю. А. Заяц падчас навукова-практычнай канферэнцыі, прысвечанай 500-годдзю Клецкай бітвы.

[195] Карпач І. Клецкая бітва з татарамі // Да новых перамог. 1991. № 109, 110, 112.

[196] Кbadановіч У. Клецкая бітва 1506 года ў гістарычнай памяці Вялікага Княства Літоўскага XVI ст. // Клецк у гісторыі Беларусі (да 500-годдзя Клецкай бітвы). Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі. Клецк, 5 жніўня 2006 г. Мінск, 2007. С. 72—75.

коўскі ўсё ж знайшоў час наведаць Клецк, пабываць на месцы бітвы, якое яму без цяжкасці паказалі мясцовыя жыхары, то аўтар аповесці ў версіі Хронікі Быхаўца наўрад ці бываў тут. Верагодна, ён паходзіў з Гарадзеншчыны, Віленшчыны ці Падляшша, бо толькі жыхар заходняй часткі ВКЛ мог напісаць, што гаспадарскае войска, рухаючыся ад Палонкі і Ішкалдзі, «ne dochodiaczy Molewa w sele Nalipoy noczowali»[197]. Толькі для ўраджэнца Віленшчыны або Гарадзеншчыны летапіснае сяло Nalipoy (даследчыкі звычайна атаясамліваюць яго з Вялікай або Высокай Ліпай у сучасным Нясвіжскім раёне) сапраўды знаходзілася перад Малевам. Аўтар апісваў падзеі, звязаныя з бітвай, знаходзячыся на захад ад яе месца. Не з'яўляўся ён, насуперак распаўсюджанаму меркаванню, і знаўцам клецкага ландшафту. Адсюль відавочна, што аповесць пра Клецкую бітву 1506 г. у версіі Хронікі Быхаўца не можа з'яўляцца надзейнай і абсалютнай крыніцай для ідэнтыфікацыі месца падзеі. Наадварот, мы павінны больш пільным вокам паглядзець на вершаваную аповесць пра Клецкую бітву, што выйшла з-пад пяра Мацея Стрыйкоўскага.

Справа не павінна абмяжоўвацца толькі пісьмовымі крыніцамі. Даследчык павінен прыцягнуць новыя віды крыніц, якія раней не выкарыстоўваліся зусім або выкарыстоўваліся слаба. Надзвычай важным з'яўляецца выкарыстанне даных археалагічных раскопак. Першым археолагам Клецкай бітвы можа лічыцца Мацей Стрыйкоўскі. Ходзячы па клецкіх ваколіцах, ён неаднаразова быў сведкам, як сялянскі плуг выворваў з-пад зямлі згнілыя панцыры, стрэлы, дзіды, шаблі[198]. У больш позні час мясцовыя жыхары неаднаразова знаходзілі рэшткі зброі і манеты, што адносіліся да часу татарскіх набегаў на Клецк. Але па-сапраўднаму навуковае вывучэнне археалагічнага мінулага Клецка пачалося толькі ў 60—80-я гг. XX ст. Даследаванні дазволілі вызначыць структуру горада ў X—XVI стст., а яна мае непасрэднае дачыненне да нашай тэмы.

Важнейшай крыніцай для нашай працы з'яўляецца прыродны ландшафт Клеччыны. Нягледзячы на тое, што за апошнія 500 гадоў чалавечая дзейнасць істотна змяніла прыроднае аблічча раёна, тым не менш, ландшафт Клецка і ваколіц усё яшчэ захоўвае памяць пра далёкія падзеі. Ад тых часоў мусілі захавацца аб'екты, што нагадвалі б пра Клецкую бітву. У гэтай сувязі асаблівая ўвага павінна быць звернута на вывучэнне мясцовай гістарычнай тапанімікі, асабліва

[197] ПСРЛ. Т. 32. С. 172.

[198] Stryjkowski M. Kronika… T. 2. S. 336.

тапанімікі эпохі татарскіх набегаў. Цяжка абысціся без напрацовак такіх навук, як анамастыка і этымалогія. Нельга забываць і пра г. зв. «народную этымалогію», якая спрабуе трактаваць паходжанне назваў зыходзячы з уласных канонаў.

Каб устанавіць дакладнае месца бітвы, патрэбна высветліць, па-першае, маршрут, якім татарскае войска прыйшло пад Клецк, па-другое, размяшчэнне татарскага лагера (каша) у ваколіцах горада і, па-трэцяе, верагодны маршрут адыходу татар з захопленым палонам. Паспрабуем спачатку адказаць на першае пытанне. Хроніка Быхаўца сведчыць, што крымскае войска з'явілася пад Клецкам, ідучы з-пад Слуцка ў бок Навагародка[199]. Слуцкі шлях быў добра знаёмы татарам. Яшчэ ў 1503 г. адзін з правадыроў выправы 1506 г. царэвіч Біці-Гірэй, стаўшы кошам пад Слуцкам, пачаў рассылаць загоны ў бок Клецка і Нясвіжа[200]. У Клецк татары маглі трапіць па Слуцкай або Капыльскай дарогах. У любым выпадку, татары павінны былі падысці да Клецка з паўднёва-ўсходняга напрамку, пераправіўшыся праз рэкі Цапра і Сільна.

Каб адказаць на пытанне, дзе татары пад Клецкам маглі стаць лагерам, трэба звярнуць увагу на структуру і планіроўку тагачаснага Клецка. Як уяўляецца, на пачатку XVI ст. Клецк складаўся з трох частак: дзядзінца, вакольнага горада і невялікага пасада, які з паўднёвага захаду прымыкаў да вакольнага горада (раён касцёла Св. Тройцы і царквы Св. Міколы)[201]. Пад заслонай як прыродных (рэкі Лань і Сільна), так і збудаваных (валы, роў) аб'ектаў горад з паўночна-заходняга напрамку быў амаль непрыступны для ворага. За ўсю гісторыю Клецка з гэтага боку ён так і не быў ніколі ўзяты. Аднак з усходняга кірунку горад не выглядаў такім абароненым. Тут, за выключэннем балоцістай ракі Сільны, не было значных прыродных перашкод, якія маглі б скаваць рух непрыяцельскага войска. У выпадку раптоўнага нападу з усходу драўляныя абарончыя збудаванні клецкага вакольнага горада не вытрымалі б націску праціўніка. Слабасць тагачаснага клецкага вакольнага горада пацвердзілі ваенныя падзеі пачатку XVI ст. У 1503 г. крымскі царэвіч Біці-Гірэй, прыйшоўшы з-пад Слуцка, спаліў вакольны горад і, магчыма, дзядзінец[202]. У 1505 г. Клецк быў зноў спустошаны

[199] ПСРЛ. Т. 32. С. 171, 172.

[200] Тамсама. С. 169.

[201] Пазднякоў В. Умацаванні Клецка XI—XVIII стст. // Гістарычна-археалагічны зборнік: Памяці Міхася Ткачова. Ч. 2. Мінск, 1993. С. 82.

[202] ПСРЛ. Т. 32. С. 169.

войскамі царэвічаў Біці-Гірэя і Бурнаша. Праўдападобна, да 1506 г. дзядзінец і вакольны горад так і не былі адноўлены. Таму татарскія царэвічы прыйшлі на папялішча, якое засталося ад клецкіх умацаванняў. Здаецца, што татары захапілі Клецк без супраціву з боку княскіх дружыннікаў, якія знаходзіліся тады па сёлах і не мелі магчымасці хутка сабрацца дзеля адпору. Нават калі войску Клецкага княства ўдалося б своечасова сабрацца, яно ўсё роўна не магло б супрацьстаяць моцнаму татарскаму войску. Сам пінскі і клецкі князь Іван Васілевіч Яраславіч, верагодна, адсутнічаў у Клецку. Хутчэй за ўсё, ён знаходзіўся ў Пінску або адным са сваіх маёнткаў. Уся надзея была на гаспадарскае войска, якое магло даць рады такому моцнаму і імкліваму праціўніку.

Прыйшоўшы амаль бесперашкодна пад Клецк, царэвічы Біці-Гірэй і Бурнаш разбілі там лагер, з якога разаслалі загоны ў розныя бакі. Першымі гэтую вестку прынеслі кіраўніцтву гаспадарскага войска браты Юрый і Андрэй Неміровічы, якія даведаліся аб тым ад 6 татараў, захопленых у палон каля Гарадзішча[203]. Дзе канкрэтна татары маглі разбіць свой лагер? З улікам асаблівасцей тагачаснай планіроўкі Клецка на гэтае пытанне можна даць адназначны адказ. Гэта мог быць, у першую чаргу, клецкі вакольны горад, а таксама тэрыторыя, што прымыкала да яго з усходу і паўночнага ўсходу. Пад заслонай рэштак клецкіх абарончых умацаванняў татарскія царэвічы пачувалі б сябе ўпэўнена. З паўночна-заходняга напрамку іх абараняў клецкі дзядзінец, валы, роў. На поўначы ад лагера знаходзіўся невялікі стаў[204], а на паўночным усходзе і ўсходзе пазіцыі татарскага войска абараняла балоцістая рака Сільна. Папярэдне татары разбурылі грэблі на нясвіжскай, ляхавіцкай і пінскай дарогах, каб максімальна ўскладніць рух гаспадарскага войска. На клецкім дзядзінцы была размешчана татарская старожа, якая адсочвала ўсе рухі ў ваколіцах Клецка.

Ускосным сведчаннем пра размяшчэнне татарскага лагера каля клецкіх умацаванняў з'яўляецца ліст Міхаіла Глінскага да вармінскага біскупа Лукаша Ватцэнродэ, у якім трыумфатар Клецкай бітвы адзначае, што татары «iuxta oppidum Clyeczko castra metati erant» (разбілі лагер каля горада Клецка)[205]. Тэрмін «oppidum» азначае звычайна ўмацаванае валамі і рвом месца. У нашым выпадку ён мусіць адносіцца

[203] ПСРЛ. Т. 32. С.172.

[204] ПКПКК. С. 393, 400.

[205] Finkel L. List Michała Glińskiego o bitwie pod Kleckiem w 1506 r. // Kwartalnik Historyczny. 1915. T. 29. S. 298.

да клецкага вакольнага горада, а не да дзядзінца, для якога існаваў адпаведны лацінскі тэрмін «arx». Тэрмін «oppidum» у дачыненні да клецкіх абарончых умацаванняў ужываецца таксама ў лісце караля і вялікага князя Аляксандра да жыхароў Гданьска[206]. У сваю чаргу, Мацей Стрыйкоўскі паведамляе, што татарскі кош размясціўся каля Клецкага замка[207]. Паэт Ян Вісліцкі адзначае, што сведкамі бітвы дагэтуль з'яўляюцца «Cleciae moles»[208]. Гэты тэрмін звычайна перакладаецца як «вал», «насып», «плаціна», а таксама «войска» або «лагер». Што да лацінскага прыназоўніка «iuxta», ён азначае непасрэднае суседства, геаграфічную блізкасць і перакладаецца як «паблізу», «непадалёк». Значыць, татарскі лагер прымыкаў непасрэдна да клецкіх умацаванняў, суседнічаў з вакольным горадам. Увогуле сучаснікі адзначаюць звычай татараў размяшчаць свой лагер на руінах нярэдка імі ж разбураных умацаванняў[209]. Так, у 1519 г. татары заманілі польскае войска на руіны спаленай імі крэпасці Сакаль і разбілі яго[210].

У чаканні гаспадарскага войска авангард татар высунуліся бліжэй да ракі Сільны. Татарскае войска займала Сільненскае балота абапал нясвіжскай дарогі, кантралюючы мажлівыя пераходы праз раку. У сярэдзіне XVI ст. Сільненскае балота становіцца аб'ектам гаспадарчай экспансіі з боку замкавай адміністрацыі Клецка. У часы каралевы Боны (1522—1558 гг.) балота выкарыстоўваецца пад агароды, якія апрацоўвалі замкавыя служачыя, у тым ліку замкавыя пушкары Грынь Якававіч і Якім Грыневіч[211]. Там жа, на балоце, знаходзіліся таксама валоданні і клецкіх мяшчан[212]. Тады ж праз балота была пракладзена новая гаць[213].

ГГалоўныя сілы крымскіх татар былі размешчаныя на выгане, які непасрэдна прымыкаў да Сільненскага балота. У сярэдзіне XVI ст. клецкі выган прасціраўся ад Рынку (цяпер плошча Маякоўскага) да Сільненскага балота і ад Нясвіжскай вуліцы да новапракладзенай з Рынку ў бок балота вуліцы і дарогі[214]. Зараз гэта прыкладна тэрыторыя паміж вуліцамі Леніна і Янкі Купалы, плошчай

[206] АА. S. 548.

[207] Stryjkowski M. Kronika… T. 2. S. 332.

[208] Вісліцкі Я. Пруская вайна. С. 166—167. Укладальнік перакладае гэты тэрмін як «цвярдыня».

[209] Смирнов В. Д. Крымское ханство… С. 340—342.

[210] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 67—68.

[211] ПКПКК. С. 393.

[212] Тамсама. С. 394.

[213] Тамсама. С. 394.

[214] Тамсама. С. 388, 394.

Маякоўскага і вуліцай Данілава. Пазней гэта вуліца атрымала назву Сільненскай (яе таксама часта называлі Сялянскай). Вуліца з такой назвай згадваецца ў інвентарах Клецка пачынаючы з 1737 г. Сільненская вуліца праіснавала ў Клецку да сярэдзіны XX ст., пакуль ёй не было нададзена імя Янкі Купалы.

Тэрыторыя, якая знаходзілася паміж Нясвіжскай вуліцай і Сільненскай дарогай, а таксама Рынкам і самім Сільненскім балотам, утварыла ў сярэдзіне XVI ст. г. зв. клецкае Новае места[215]. У гэтай частцы Клецка знаходзіліся сядзібы мяшчан[216]. На ўсход ад выгану і Сільненскай дарогі таксама знаходзіліся агароды клецкіх мяшчан, якія цягнуліся шырокім пасам паміж Цаперскай дарогай (сённяшняя 17 Верасня) і Сільненскім балотам[217]. Магчыма, дзесьці ў гэтым месцы татары трымалі шматлікі палон. Коней і скот, як падае Мацей Стрыйкоўскі, татары трымалі паблізу згаданага вышэй замкавага става[218]. Такім чынам, войска і абозы крымскіх царэвічаў Бурнаша і Біці-Гірэя расцягнуліся ад клецкага вакольнага горада і замкавага става да ракі Сільна ў паўночна-ўсходнім накірунку на адлегласць прыкладна 1—1,5 км.

Размяшчэнне татарскага лагера на паўночна-ўсходняй ускраіне Клецка забяспечвала татарам не толькі надзейную заслону ад верагоднага нападу войска ВКЛ, але дазваляла ім здзейсніць хуткі і беспераШкодны адыход дамоў разам з захопленым палонам і нарабаванай маёмасцю. Адыход татараў мусіў адбывацца па слуцкай, капыльскай, цаперскай і іншых дарогах, што вялі на ўсход і на паўднёвы ўсход. Іх шлях павінен быў праходзіць каля вёсак Сухлічы, Сякерычы, Панкратавічы, Цапра, Зубкі. Далей татары павінны былі вяртацца міжрэччам Случы і Арэсы. У раёне Петрыкава і Лоевай Гары яны перапраўляліся, адпаведна, праз Прыпяць і Дняпро, пасля чаго накіроўваліся ў Крым. Адыход у згаданым кірунку дазваляў татарам ажыццяўляць марш шырокім пасам, выкарыстоўваючы для гэтага лугі і палі. Тут было менш балот і лясоў.

Такім быў верагодны план дзеянняў татарскага вайсковага кіраўніцтва пасля вяртання ўсіх загонаў у лагер. Кіраўніцтва велікакняскага войска, у першую чаргу, князь Міхаіл Глінскі,

[215] ПКПКК. С. 394.

[216] Тамсама.

[217] Тамсама. С. 394—395.

[218] Stryjkowski M. Kronika… T. 2. S. 334.

ведала, несумненна, пра гэты план. Каб знішчыць праціўніка і адбіць палон — а гэта было, несумненна, галоўнай мэтай гаспадарскага войска, — патрэбна было перарэзаць татарам магчымыя шляхі адступлення ва ўсходнім і паўднёва-ўсходнім кірунках (слуцкую і цаперскую дарогу). Абцяжараныя вялізным палонам татары не маглі ў летніх умовах належным чынам скарыстацца пінскай дарогай, якая пралягала праз лясы і балоты. Адыход у гэтым напрамку быў мажлівы, галоўным чынам, у зімовых умовах[219].

Ноччу 5 жніўня, падчас апошняга прыпынку ў сяле Вялікая Ліпа, быў канчаткова абмеркаваны далейшы маршрут гаспадарскага войска пад Клецк. Верагодна, вайсковае кіраўніцтва ВКЛ ужо добра ведала, дзе знаходзіцца татарскі лагер. Перад Глінскім адкрывалася некалькі магчымасцей для манеўру. Варыянт атакі з боку Вялікай (Каралеўскай) дарогі дарогі праз грэблю на рацэ Лань, відаць, быў адразу адкінуты імі. З гэтага напрамку татарскі кош, як мы казалі, быў надзейна абаронены замкавымі валамі і рвамі. Да таго ж, гаспадарскае войска не мела адпаведнага рыштунку для штурму абарончых умацаванняў. У выпадку паспяховага штурму татары былі б толькі змушаны адступіць з занятых імі пазіцый на новыя. У гэтым разе, галоўная ваенная задача не была б выкананая[220]. Татары маглі б, як і годам раней, вывесці вялізны палон у Крым.

Можна было паспрабаваць абысці Клецк з заходняй ускраіны пад прыкрыццем урочышча Старына, з тым, каб выйсці да пінскай дарогі, пераправіцца тут праз Лань і нанесці ўдар па галоўных сілах татараў[221]. Маршрут гэты мог падацца вялікакняскім военачальнікам занадта доўгім. Наўрад ці манеўр застаўся б незаўважаным татарамі, у якіх быў бы час для перадыслакацыі сваіх галоўных сіл у гэтым напрамку. Да таго ж, камунікацыі былі разбураны, а пераправа праз Лань у гэтым месцы не была простай. Тут рака была дастаткова глыбокай і шырокай. Гаспадарскае войска чакала б сур'ёзная небяспека ў момант пераправы праз раку, бо з пагоркаў на левым беразе Лані на іх мог абрынуцца град стрэл ці лавіна татарскай конніцы. Нават калі б і ўдалося пераправіцца тут праз Лань, гаспадарскае войска чакаў бы няпросты пераход ад пераправы да ўсходняй ускраіны

---

[219] Так, у 1503 г. 3-тысячнае татарскае войска вярталася дамоў з-пад Слуцка і Навагародка праз г. зв. Грычынскае балота ў напрамку Гарадка (ПСРЛ. Т. 32. С. 170). Хроніка Быхаўца не падае, у які час года адбыўся гэты напад.

[220] Менавіта так лічыць польскі даследчык С. Хербст (Herbst S. Kleck 1506. S. 223—224).

[221] Ажыццяўленне гэтага плана С. Хербст прыпісвае Глінскаму (Herbst S. Kleck 1506. S. 224).

Клецка, дзе знаходзіліся галоўныя татарскія сілы. Гэта было б непрымальна для кіраўніцтва гаспадарскага войска, якое імкнулася хутчэй уступіць у бой з праціўнікам. Ва ўсякім разе, пераправа праз Лань непасрэдна на паўночна-заходняй і паўднёва-заходняй ускраіне Клецка несла шмат нязручнасцей і пагроз гаспадарскаму войску. Каб іх мінімізаваць, была патрэбна больш зручная пераправа.

Верагодна, у самым канцы начной нарады ў Вялікай Ліпе варыянт пераправы праз Лань на ўскраіне Клецка быў адкінуты. Замест яго паўстала ідэя пераправіцца праз раку ў яе вярхоўях за 6—7 вёрстаў на поўнач ад Клецка. Рака тут была не вельмі глыбокая і шырокая, не надта забалочаная. Але, самае галоўнае, тут не трэба было перапраўляцца пад градам татарскіх стрэл. Пераправа праз Лань менавіта ў гэтым месцы дазваляла гаспадарскаму войску здзейсніць імклівы пераход да Клецка і ўзяць пад кантроль верагодныя шляхі адыходу татарскага войска. Дзе канкрэтна гаспадарскае войска магло пераправіцца праз Лань? І. І. Карпач мяркуе, што яно пераправілася праз раку недзе ў раёне Быхаўшчыны[222].

Аднак нельга выключыць таксама, што вялікакняскае войска магло ўвогуле абысціся без пераправы праз Лань. Можна было б паспрабаваць абысці Лань каля яе вытокаў, паміж сённяшнімі вёскамі Чанавічы і Габруны. У гэтым разе гаспадарскае войска не шмат прайграла б у часе. Да таго ж, яно магло рухацца далей ледзь не да самога Клецка пад прыкрыццем вялізнага Дзямідаўскага лесу.

Куды б вёў войска ВКЛ гэты маршрут? Хроніка Быхаўца паведамляе, што войска прыйшло «pod Kleczesk, rece Lanie, do Krasnogo Stawu od poludni»[223]. На правым беразе Лані ляжалі землі ўтворанага ў сярэдзіне XVI ст. у сувязі з валочнай памерай Краснастаўскага фальварка (двара).

Валоданні Краснастаўскага фальварка прасціраліся ад сёл Кухчыцы і Лучычы, праз Жужаль і Старыну (фігуруе ў тагачасных крыніцах як замкавая дубрава) да сёл Вяжавічы (Яжавічы) і Лукаўцы[224]. Землі фальварка паўколам ахоплівалі Клецк з поўдня на поўнач, непасрэдна прымыкаючы да замка. Там жа, на правым беразе Лані, паміж г. зв. Дзікім балотам і далінай Загумнішча знаходзіўся першапачаткова Краснастаўскі двор. Сам фальварак належаў

[222] Карпач І. Клецкая бітва з татарамі // Да новых перамог. 1991. № 109, 110, 112.

[223] ПСРЛ. Т. 32. С. 172.

[224] ПКПКК. С. 404—405. У пазнейшы час замкавая валасць Краснастаўскага фальварка ўключала сёлы Вяжавічы, Кушчыцы (Кухчыцы), Лукаўцы, Ліскава, Якшыцы, Жылічы (НГАБ. Ф. 694, воп. 2, спр. 3912, арк. 57—58).

адміністрацыі Клецкага замка і таму называўся замкавым. У пазнейшыя часы на клецкім замчышчы знаходзіўся адзін з палеткаў Краснастаўскага фальварка[225].

Куды канкрэтна пад Клецк прыйшло гаспадарскае войска? Для адказу на гэта пытанне звернемся зноў да Хронікі Быхаўца. Аўтар аповесці пра Клецкую бітву паведамляе, што пасля таго, як літвіны прыйшлі пад Клецк, яны «z hory czerez reku wzreli polki tatarskije, stoiaczy pohotowe na boy»[226]. Пра якую гару гаворыць Хроніка? У папярэдняй працы я настоўваў, што гаспадарскае войска мусіла заняць пазіцыі на Арынскай гары[227]. Яна ўзвышалася на паўночнай ускраіне горада, з боку нясвіжскага ўезду. Цяпер там знаходзіцца Свята-Пакроўская Арынская царква, гарадскія могілкі, агульнаадукацыйны ліцэй. У сярэдзіне XVI ст. за Арынскай гарой, на востраве Навасадаў, знаходзіліся валоданні рускіх (праваслаўных) святароў, сярод якіх былі дыякан клецкай саборнай царквы Пракоп Левановіч, святар царквы Св. Спаса Іван Вакуліч[228]. У падножжа гары пачыналася сухліцкая дарога.

На поўдзень ад Гарынскай (Арынскай) гары знаходзіліся балота і рака з назвай Сільна, на другім беразе якой размясцілася татарскае войска. Значыць, Глінскі прывёў гаспадарскае войска туды, адкуль татары чакалі нападу. Сам ён, здаецца, не спадзяваўся асабліва на эфект нечаканасці. Ва ўмовах, калі абодва бакі канчаткова вырашылі памерацца сіламі ў адкрытым баі, такія меры станавіліся празмернымі. Міхаіл Глінскі наўмысна ішоў туды, дзе яго ўжо чакалі. Галоўным для яго было заняць зручную пазіцыю для атакі, падчас якой можна было б, нарэшце, здзівіць татарскіх царэвічаў нечаканым манеўрам. Такую магчымасць гаспадарскаму войску давала мясцовасць на правым беразе Сільны. Нягледзячы на забалочанасць поймы ракі, пераправа праз яе ўяўлялася куды больш зручнай, чым пераправа праз Лань у ваколіцах Клецка. Да таго ж, можна было б прыхаваць за Арынскай гарой частку сіл, якія ў патрэбны момант маглі б імкліва пераправіцца праз Сільну і раптоўным ударам па варожых тылах вырашыць зыход бітвы на карысць гаспадарскага войска.

Дэталёвае вывучэнне мясцовага ландшафту ў ліпені—жніўні 2016 г. дазволіла мне, аднак, істотна падкарэктаваць маю думку пра

[225] НГАБ. Ф. 694, воп. 2, спр. 3905, арк. 75 адв.

[226] ПСРЛ. Т. 32. С. 172.

[227] Кbadановіч У. Рэканструкцыя бітвы пад Клецкам 1506 года // ARCHE. 2014. №12. С. 194—195. Андрэй Блінец таксама прытрымліваўся падобнай думкі (Блінец А. Клецкія бітвы... С. 39).

[228] ПКПКК. С. 401.

Арыну як (адзінае) месца дыслакацыі гаспадарскага войска перад боем. Рэч у тым, што калі Глінскі рухаўся з поўначы на Клецк, то ён ніяк не мог абысці старажытнае клецкае гарадзішча, якое ўзвышалася на левым беразе Лані. Канешне, галоўнакамандуючы не мог не ацаніць стратэгічнае значэнне старажытнага гарадзішча: адтуль лагер татараў быў як на далоні, адтуль можна было адсочваць рухі татарскіх чамбулаў у ваколіцах. Адначасова аддзелы Глінскага павінны былі заняць і другую стратэгічную вышыню на поўнач ад Клецка: Арынскую гару. Заняўшы да найважнейшыя стратэгічныя пункты на поўнач ад Клецка, Міхаіл Глінскі пачаў абдумваць план атакі на татарскі кош.

Крыніцы сярэдзіны XVI ст. дакладна лакалізуюць старажытнае клецкае гарадзішча: «a lyeze myedzey blothey; z boku pyerwszego rzeka Lanya, a z drugyego boku blotho Szyelne...»[229]. У гэты ж час гарадзішча стала аб'ектам інтэнсіўнай гаспадарчай дзейнасці. У прыватнасці, там знаходзілася гаспадарка Ігната Сцяпанавіча Астравуха, які трымаў востраў на гарадзішчы на чыншавым праве.

Старажытнае клецкае гарадзішча было абследавана Леанідам Побалем у 1964 г. і Пятром Лысенкам у 1979 г. Пад час раскопак былі знойдзены ляпная і ганчарная кераміка, косці жывёл, попел, абпаленыя камяні. Згодна высновам беларускіх археолагаў, помнік адносіцца да мілаградскай культуры ранняга жалезнага веку і да эпохі Кіеўскай Русі[230].

За прыкладна 1 км на поўдзень ад старажытнага клецкага гарадзішча маленькая рачулка Сільна ўпадала ў Лань. Падыход да Сільны, аднак, быў моцна ўскладнены балоцістай мясцовасцю, якая адзяляла гарадзішча ад рачулкі. Невялікая балоцістая рачулка Сільна і была той ракой, на берагах якой адбылася адна з самых славутых бітваў у гісторыі Беларусі. Цікавая рэч, што ніводная з тагачасных крыніц, якая апісвае або згадвае бітву пад Клецкам, не падае назву ракі, на берагах якой адбывалася змаганне з татарамі. Калі б бітва сапраўды адбылася на берагах Лані, назва якой была добра вядомая сучаснікам, летапісец не прамінуў бы абавязкова гэта падкрэсліць. Так, Міхаіл Глінскі ў згаданым лісце да біскупа Лукаша Ватцэнродэ падкрэслівае, што змаганне адбылося «trans Hlana fluvium» (за ракой Ланню)[231], але ніяк не на рацэ Лань. Для князя, які ў момант напісання ліста знаходзіўся ў Вільні, Клецк сапраўды знаходзіўся за

[229] КППКК. С, 402.

[230] Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Мінская вобласць. Кн. 1. Мінск, 1987. С. 214.

[231] Finkel L. List Michała Glińskiego o bitwie pod Kleckiem... S. 298; AA. S. 547; Варонін В. А. Два лісты пра бітву пад Клецкам у 1506 г. С. 280.

Ланню, г. зн. на ўсход ад яе. Другі сучаснік бітвы, польскі храніст Бернард Вапоўскі адзначае, што «erat prope castra scythica fluviolus, etsi non magnus, limosus tamen et ob id ad transeundum difficilis»[232] (паблізу татарскага лагера была рачулка, хоць і невялікая, але балоцістая, і з гэтай прычыны цяжкая для пераправы). Тое ж самае гаворыць Хроніка Быхаўца: «Y pereszedsze (войскі Глінскага. — *У. К.*) stali ob reku s nimi, y dla zloho perechoženija reki ne mohli woskore sowokupitisia s nimi»[233]. Нарэшце, Мацей Стрыйкоўскі пісаў: «Была zaś rzeczka tamže nie bardzo glęboka, lecz błotna i z brzegami przykrymi szeroka, za tą się tatarowie uphcami zmocnili, by prześcia przez nię Litwie do siebie bronili»[234]. Гэтыя прыродныя асаблівасці ананімнай ракі, адзінадушна адзначаныя згаданымі аўтарамі, дазваляюць атаясамліваць яе выключна з Сільнай. Пісцовая кніга Пінскага і Клецкага княстваў таксама адзначае забалочанасць Сільны і яе непасрэднае суседства з балотам пад той жа назвай[235].

Непадалёк ад месца ўпадзення Сільны ў Лань, на паўночнай ускраіне Клецка, блізу Вялікай або Каралеўскай дарогі знаходзіўся невялікі стаў, які непасрэдна прымыкаў да абарончых збудаванняў вакольнага горада. Тагачасныя крыніцы называюць яго замкавым[236]. У сярэдзіне XVI ст. блізу става, як і на Сільненскім балоце, знаходзіліся агароды, якія належалі адміністрацыі Клецкага замка[237]. Пазней землі паблізу замкавага става выкарыстоўваліся пад сенажаць, якая належала да фальварка Красны Стаў[238]. У гэтай сувязі словы Хронікі Быхаўца «pryszli pod Kleczesk, k rece Lani, do Krasnoho Stawu» можна інтэрпрэтаваць у сэнсе падыходу войска ВКЛ менавіта да Клецкага замка, а дакладней, да вакольнага горада, які прыкрываў пазіцыі татарскага войска.

Згаданы замкавы стаў і быў знакамітым Красным Ставам[239]. Сваю назву ён мог атрымаць ад карычневатага (карычневага з чырвоным адценнем) колеру вады ў ім[240]. Нягледзячы на актыўную гаспадарчую дзейнасць чалавека ў першай палове XVI ст., стаў заставаўся моцна

---

232 Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 67.

233 ПСРЛ. Т. 32. С. 172.

234 Stryjkowski M. Kronika… T. 2. S. 334.

235 ПКПКК. С. 393—394.

236 Тамсама. С. 563.

237 «Ogrodu zamkowego nad sthawem a blothem, kthory yesth dlya wosczowych rzeczy a pothrzeb zamkowych wymyerzon» (ПКПКК. С. 393).

238 Інвентар маёнтка Красны Стаў за 1653 год: НГАБ. Ф. 694, воп. 2, спр. 3905, арк. 2.

239 Карпач І. Клецкая бітва з татарамі // Да новых перамог. 1991. № 109, 110, 112.

240 Пра этымалогію слова «красны»: Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Вып. 16. Мінск, 1997. С. 96—97.

забалочаным [241]. Версіі аб паходжанні назвы ад асаблівай прыгажосці мясцовасці або ад чырвона-крывавага колеру, які вада набыла пасля бітвы з татарамі, з'яўляюцца яскравымі прыкладамі «народнай этымалогіі». Красны Стаў часта яшчэ называўся старым ставам у крыніцах сярэдзіны XVI ст.[242] Магчыма, што Красны Стаў меў яшчэ і іншую назву. Так, Павел Шпілеўскі адзначае, што крывавая бітва з татарамі адбылася каля Цёмнага возера, якое пасля было перайменавана ў Краснае (Красны Стаў)[243]. Гэтая акалічнасць магла б удакладніць паходжанне назвы «Красны Стаў». Не выключана, што Цёмнае возера атрымала сваю назву з-за адпаведнага колеру вады (карычневатага з чырвоным адценнем). У гэтым разе, прыметнікі «цёмны» і «красны» (карычневы з чырвоным адценнем) маглі быць узаемазамяняльнымі, бо чырвоны колер ці, па меншай меры, асобныя насычаныя ягоныя адценні звычайна адносяцца да цёмных колераў. Забалочаны замкавы стаў з'яўляўся натуральнай прыроднай заслонай, якая надзейна прыкрывала тылы татарскага лагера. Ужо ў XVIII ст. замкавы стаў уяўляў сабой вадаём, які моцна зарос травой[244]. У выніку гаспадарчай дзейнасці наступных пакаленняў людзей замкавы стаў знік.

Менавіта на сільненскім выгане на поўнач ад клецкіх замкавых валоў і мусіла адбыцца бітва з татарамі 5 жніўня 1506 г. На карысць клецкіх замкавых валоў як месца апошняга супраціўлення рэшткаў татарскага войска сведчаць асобныя археалагічныя знаходкі. Яшчэ ў сярэдзіне XIX ст. Павел Шпілеўскі згадваў, што незадоўга да наведвання ім Клецка ў адным з правалаў каля гарадскіх валоў былі знойдзены рэшткі зброі і некалькі старажытных манет[245]. Сам аўтар, які набыў у мясцовых жыхароў некалькі манет, адносіў знаходкі да часу татарскіх нападаў (пачатак XVI ст.). Нядаўнія археалагічныя даследаванні Клецкага замка (С. Бубенька, В. Пазднякоў) выявілі на тэрыторыі як замчышча, так і вакольнага горада рэшткі разнастайнай зброі, у тым ліку наканечнікаў, стрэл і дзідаў[246]. Даследчыкі адносяць большасць сваіх знаходак да XIII ст., але прызнаюць, што іх

[241] Stryjkowski M. Kronika… T. 2. S. 333—334; ПКПКК. С. 393.

[242] ПКПКК. С. 390—391.

[243] Шпилевский П. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю. С. 59.

[244] НГАБ. Ф. 694, воп. 2, спр. 3905, арк. 75 адв.

[245] Шпилевский П. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю. С. 58.

[246] Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка. Клецкі раён. С. 26; Пазднякоў В. Унікальны мангольскі наканечнік стралы XIII ст. з Клецка // Зборнік матэрыялаў II Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі». Ч. 2. Мінск, 1995. С. 33—34.

дацiроўка ў значнай ступенi прыблiзная. Улiчваючы, што нiводная з iснуючых гiстарычных крынiц не згадвае татарскага нападу на Клецк у XIII ст., а г. зв. мангола-татарскае нашэсце на Русь з'яўляецца, хутчэй, гiстарыяграфiчнай канструкцыяй, далейшыя археалагiчныя даследаваннi Клецкага замка маглi б iстотна памаладзiць знаходкi.

### 4.4.3. Надвор'е ў час бiтвы. Клiмат у Познiм Сярэднявеччы

Пасля клiматычнага оптымуму, якi панаваў у Еўропе прыблiзна ў 900—1300 гг., паступова наступiў малы ледавiковы перыяд, якi суправаджаўся значным пахаладаннем. Разам з тым, рэзка ўзрасла колькасць анамальных прыродных з'яў.

Павышаная экстрэмальнасць у прыродзе была ўласцiвая i пачатку XVI ст. Зiмы былi звычайна надзвычай суровымi i халоднымi. Нярэдка выпадала багата снегу, як гэта здарылася ўзiмку 1502—1503 гг. Снежная i халодная зiма ў пэўнай ступенi спрычынiлася да паразы войска заволжскага хана Шах-Ахмата, якi прыйшоў на дапамогу каралю i вялiкаму князю Аляксандру Казiмiравiчу. Больш або менш мяккай была, як падаецца, зiма 1504—1505 гг.[247]. Як адзначаюць летапiсцы, у суседнiм з Полацкам Пскове былi чутны нават раскаты грому. Аднак наступная зiма 1505—1506 гг. была вельмi суровай. Акрамя халадоў ледзь не ва ўсiм краi панавалi эпiдэмii i мор: «Na tuiu ż zimu był mor weliki w Mensku, i stoiał nemało po wsey zemli»[248]. У гэтую зiму мор наступiў таксама i ў Пскове, а ў папярэднюю зiму 1505 г., як адзначаюць летапiсцы, эпiдэмii закранулi таксама Рыгу[249]. Цяжка сказаць, якой была зiма 1506—1507 гг. Назiральнiкi ў гэты час адзначалi вельмi лагоднае надвор'е ў Прусii[250], хоць у Заходняй Еўропе стаяла вельмi суровая i халодная зiма[251]. Ва ўсякiм разе, першая зiма пасля Клецкай бiтвы мусiла быць цяплейшай i лагаднейшай за папярэднюю.

Нягледзячы на тое, што лета 1500 г. было цёплым i нават у пэўных рэгiёнах гарачым[252], у наступныя 1501 i 1502 гг. лета выдалася надзвычай дажджлiвым i мокрым[253] У 1500 г. жнiво пачалося

[247] Борисенков Е., Пасецкий В. Тысячелетняя летопись… С. 306.

[248] ПСРЛ. Т. 32. С. 170.

[249] Борисенков Е., Пасецкий В. Тысячелетняя летопись… С. 306.

[250] Walawender A. Kronika klęsk elementarnych w Polsce i w krajach sąsiednich w latach 1450—1586. 1. Zjawiska meteorologiczne i pomory (z wykresami). Lwów, 1932. S. 59.

[251] Борисенков Е., Пасецкий В. Тысячелетняя летопись… С. 306.

[252] Walawender A. Kronika klęsk elementarnych w Polsce... S. 54.

[253] Тамсама. S. 55—56.

даволі рана, дзесьці ў сярэдзіне чэрвеня. Сам год быў надзвычай ураджайны, не бракавала прадуктаў харчавання, кошт якіх быў танным[254]. Невыпадкова, што ўвосень крымскія татары зрабілі буйны набег на землі Кароны і ВКЛ, зрабавалі Валынь, ваколіцы Любліна, спалілі Берасце, Камянец і Тураў. У адрозненне ад папярэдняга, 1502 г., нягледзячы на вялікую колькасць ападкаў, якія выпалі летам, быў дастаткова ўраджайным. Асабліва значным быў ураджай садавіны і гародніны, але яго не ўдалося захаваць, бо ён згніў[255]. Улетку 1503 г. пасля суровай і снежнай зімы стаяла, як падаецца, вельмі цёплае надвор'е. У гэты час у многіх краінах Еўропы на працягу больш чым чатырох месяцаў не было дажджу[256]. Не выключана, што ў 1503 г. быў сабраны добры ўраджай, што, відаць, не засталося незаўважаным у Крыме. Напрыканцы лета гэтага года татары ўварваліся на землі ВКЛ, пустошачы землі паміж Прыпяццю і Нёманам і даходзячы да Менска і Свіслачы. Не выключана, што лета наступнага 1504 г. было засушлівым, з-за чаго мусіў мець месца неўраджай або недахоп прадуктаў харчавання. Не выключана, што менавіта гэтым можна патлумачыць тое, што ў 1504 г. не было ніводнага татарскага нападу на землі ВКЛ. Лета 1505 г. было дажджлівым[257]. Тым не менш, сабраны ўраджай быў, мабыць, неблагім, чаму спрыяла лагодная восень[258]. Менавіта напрыканцы жніўня і ў пачатку восені па землях ВКЛ пранёсся знішчальны татарскі смерч.

Лета 1506 г., калі адбылася бітва пад Клецкам, было звыклым. Летапісцы не зафіксавалі ніякіх анамалій. Летнія месяцы былі цёплымі і, як думаецца, сухімі[259]. У Заходняй Еўропе ў гэты час стаяла засушлівае надвор'е. Можна меркаваць, што ў гэты год добра ўрадзіла збожжа, садавіна, гародніна. Пачатак Спасава посту мусіў быць цёплым і, не выключана, сухім, як гэта зазвычай бывае ў гэтых мясцінах у гэты час. Само надвор'е спрычынілася да таго, што змаганне было імклівым і дынамічным.

### 4.4.4. Тактычныя дыспазіцыі праціўнікаў перад бітвай

Відавочна, першапачаткова Глінскі хацеў імклівым і раптоўным ударам, з дапамогай пераважна рацаў і найманай кавалерыі, захапіць

[254] Walawender A. Kronika klęsk elementarnych w Polsce. S. 60.
[255] Тамсама. S. 60.
[256] Борисенков Е., Пасецкий В. Тысячелетняя летопись… С. 306.
[257] Walawender A. Kronika klęsk elementarnych w Polsce… S. 58.
[258] Тамсама. S. 59.
[259] Борисенков Е., Пасецкий В. Тысячелетняя летопись… С. 306.

татарскі кош, а затым разбіць татарскія чамбулы, якія будуць вяртацца са здабычай назад у кош. Аднак, здаецца, гэты рашучы план не ўдалося ажыццявіць, бо татары, якія ўніклі палону, здолелі вярнуцца ў кош і паведаміць сваім военачальнікам, што на іх збіраецца вырушыць гаспадарскае войска. Таму трэба было рыхтавацца да рашучага змагання з татарамі. Царэвічы Бурнаш і Біці-Гірэй мелі дастаткова часу, каб ацаніць становішча і падрыхтавацца да бітвы з войскам ВКЛ. Тактыка, якую яны абралі для будучага змагання, была добра прадуманай і не зусім уласцівай татарскім чамбулам. Замест таго, каб атакаваць войска Глінскага на маршы або на падыходзе да Клецка, было прынята рашэнне заняць абарону на супрацьлеглым беразе Сільны. Татарскі бок, адчуваючы колькасную перавагу войска ВКЛ, добраахвотна адмовіўся ад сваёй улюбёнай агрэсіўна-атакуючай тактыкі і аддаў ініцыятыву ў рукі праціўніка.

Яшчэ з часоў Тамерлана (Цімура) на выбар татарамі месца змагання ўплывалі наступныя абставіны: 1) наяўнасць вады; 2) зямля, здольная ўтрымаць войска, асабліва наяўнасць добрага падножнага корму; 3) зручнае месцазнаходжанне, якое б давала перавагу над праціўнікам (у першую чаргу, каб сонца не біла ў вочы); 4) месца змагання павінна было быць роўным і шырокім[260].

Пазіцыя, якую татары занялі пад Клецкам, адпавядала ўсім адзначаным патрабаванням. Мясцовасць была сапраўды роўная і шырокая. Моцна забалочаная рака Сільна была надзейнай прыроднай перашкодай. З паўночнага захаду, з боку Віленскага (Каралеўскага) шляху татарскае войска прыкрывалі напаўразбураныя гарадскія ўмацаванні. Тут былі папярэдне размешчаны асобныя татарскія аддзелы, якія павінны былі кантраляваць мясцовасць, што прылягала да замка. Гэта была свайго роду другая лінія абароны, на выпадак, калі праціўнік усё ж здолее пераадолець лінію Сільны. З тылу татарскае войска прыкрывала паўнаводная на той час рака Лань. Папярэдне татары мусілі разбурыць усе камунікацыі на Лані. Нарэшце, з левага боку татарскія пазіцыі абараняла невялікае, але вельмі забалочанае замкавае возера (Красны стаў). На думку татарскага ваеннага кіраўніцтва, яно таксама магло стаць перашкодай для праціўніка. З правага боку татарскія пазіцыі прыкрывалі шматлікія вазы, а таксама жывы шчыт з палоннікаў. Акрамя таго, татарскія военачальнікі разлічвалі, што войска ВКЛ падыдзе да Клецка толькі каля ці пасля апоўдня, а бой пачнецца, калі сонца будзе ўжо за спінамі татарскіх воінаў.

---

[260] Иванин М. И. О военном искусстве и завоеваниях монголо-татар… С. 143.

Нам невядома, у якім дакладна парадку татарскія войскі размяшчаліся перад бітвай. Мы не ведаем, на колькі баявых адзінак царэвічы Бурнаш і Біці-Гірэй падзялілі ўласнае войска. Вядома толькі, што ў часы Тамерлана татарскі аддзел, колькасцю меней 12 тысяч, дзяліўся на 9 частак: галоўны корпус складаў адну, правае крыло — тры, левае — тры, авангард — адну, аванпасты — таксама адну частку. У сваю чаргу, правае і левае крылы дзяліліся на авангард, правую і левую паловы[261].

Можна толькі меркаваць, што ў агульных рысах царэвічы Бурнаш і Біці-Гірэй прытрымліваліся падобнай схемы пабудовы войска. Наперадзе татарскага войска знаходзіўся аванпост. Перадавы аддзел татараў мусіў узяць пад кантроль адзіны сухапутны пераход цераз Сільну, які знаходзіўся на дарозе з Нясвіжа ў Клецк. У самой нізіне (балоцістай пойме Сільны) была размешчаная татарская старожа, у задачу якой уваходзіла адсочваць рухі праціўніка і своечасова перадаваць інфармацыю кіраўніцтву. Тут жа знаходзіўся невялікі аддзел лучнікаў.

У пойме Сільны, на невялікай адлегласці ад перадавых пастоў, мусіў знаходзіцца татарскі авангард. Заўважым, што ён складаў толькі нязначную частку войска. У яго склад мусілі ўваходзіць вопытныя лучнікі, якія пры набліжэнні праціўніка павінны былі закідаць яго стрэламі[262]. Не выключана, што частка лучнікаў павінна была спешыцца, каб дасягнуць большай дакладнасці і хуткасці стральбы.

Далей, ужо на Сільненскім пагорку (раён сённяшняй вуліцы Данілава і Панкратаўскай), які прымыкаў да поймы Сільны, мусілі знаходзіцца асноўныя сілы татараў. Тут быў размешчаны галоўны татарскі корпус, а таксама рэзервы. Па баках галоўнага корпуса знаходзіліся правае і левае крылы, якія былі самымі колькаснымі ў татарскім войску. На іх ускладаліся галоўныя надзеі татарскага кіраўніцтва. Правае крыло, верагодна, займала пазіцыю паміж сённяшнімі вуліцамі Янкі Купалы (Сільненскай) і Перамогі (Сіняўскі тракт). Левае крыло прымыкала да гарадскіх умацаванняў (тэрыторыя сённяшняга шпіталя). Асобны татарскі аддзел знаходзіўся на клецкім гарадзішчы. Частка татарскага войска была выдзелена для аховы палонных. Захопленых у ходзе выправы людзей татары мусілі трымаць на ўсход ад сённяшняй вуліцы Перамогі (вуліцы 17 Верасня і Панкратаўская).

---

[261] Иванин М. И. О военном искусстве и завоеваниях монголо-татар… С. 143.

[262] Stryjkowski M. Kronika… T. 2. S. 334.

Спачатку татары спадзяваліся пры дапамозе канцэнтраванай стральбы з лукаў нанесці як мага большыя страты праціўніку ў момант пераправы праз Сільну. Біці-Гірэй і Бурнаш стварылі своеасаблівы «пас смерці», які з улікам памераў войскаў і прыродных умоў мусіў мець шырыню 60—80 метраў. Для слабаўзброенага або нават сярэднеўзброенага вершніка любая спроба пранікнення ў гэтую зону павінна была скончыцца трагічна. Пасля правядзення абстрэлу праціўніка з лукаў царэвічы планавалі абрынуцца на яго сіламі конніцы. Спускаючыся з сільненскага пагорка, лавіна татарскай кавалерыі павінна была спіхнуць войска ВКЛ у балота і спыніць яго рух. Пасля манеўраныя калоны татараў павінны былі ўжо на супрацьлеглым беразе Сільны акружыць ворага і закідаць яго стрэламі.

Падобная тактыка была неаднаразова апрабіравана ў ходзе войнаў на еўрапейскім кантыненце. Яшчэ ў 1362 г. у бітве пры Азенкуры англічане выкарысталі ў якасці бар'ера на шляху французскай кавалерыі ўбітыя ў зямлю завостраныя жэрдкі, за якімі размясціліся лучнікі, якіх, у сваю чаргу, прыкрывала конніца. Сістэматычным абстрэлам лучнікі нанеслі адчувальны ўрон французскім рыцарам, што ў рэшце рэшт і вызначыла зыход бітвы на карысць англічан. У 1503 г., у бітве пры Чэрыньёла (Cerignola), іспанскі военачальнік Ганзала дэ Кардоба выкарыстаў у якасці перашкоды на шляху французскай кавалерыі акопы, за якімі размясціліся аркебузнікі. Апошнія літаральна знішчылі французскую кавалерыю, якую ўзначальваў князь нэмурскі Гастон дэ Фуа.

Разам з тым, тактыка татараў мела шэраг слабых бакоў. План царэвічаў Біці-Гірэя і Бурнаша меў шанц спрацаваць выключна ў тым выпадку, калі б праціўнік распачаў франтальную атаку з ходу і тым самым загнаў сябе ў падрыхтаваную пастку. Але план мог не прынесці поспеху ў тым выпадку, калі б праціўнік праявіў асцярожнасць. Так, згаданы французскі военачальнік Гастон дэ Фуа ў бітве пры Равене 11 красавіка 1512 г. не паўтарыў памылкі, зробленай у бітве з іспанцамі пры Чэрыньёла. З дапамогай прыцэльнага агню артылерыі, выкарыстаўшы абхадны манеўр, французская конніца і пяхота здолелі выбіць іспанцаў і нямецкіх ландскнехтаў з добра ўмацаваных пазіцый.

Акрамя таго, татарскія военачальнікі не пралічылі верагоднае выкарыстанне літвінамі артылерыі, якая была здольна нанесці сур'ёзную шкоду іх войску. Наяўных татарскіх сіл было недастаткова, каб прыкрыць усю лінію ракі Сільна. Існавала магчымасць пераправы войска ВКЛ у вярхоўях ракі і нанясення ўдару ў тыл

татарскага войска. Татары недаацанілі таксама ступень мабільнасці асобных аддзелаў гаспадарскага войска.

Нарэшце, татары, прыняўшы абарончую тактыку, былі пазбаўлены сваёй галоўнай перавагі — хуткасці. Яны добраахвотна аддалі ініцыятыву ў рукі праціўніка. Звычайна татары першымі пачыналі бой, імкнучыся захапіць правы фланг праціўніка, з тым, каб было зручней страляць з лукаў. Пры гэтым яны нярэдка імітавалі ўцёкі з поля бою з мэтай змусіць праціўніка распачаць актыўнае праследаванне, а затым спыняліся і з новай сілай накідваліся на ворага, выкарыстоўваючы засады і пасткі[263]. Аднак пад Клецкам татары былі пазбаўлены магчымасці прымяніць улюбёную імі тактыку.

Стоячы на старажытным клецкім гарадзішчы і ўважліва гледзячы на татарскія палкі, што прыгатаваліся да бою на супрацьлеглым беразе Сільны, Глінскі імгненна ацаніў становішча і ўнёс апошнія дэталі ў план бітвы. Войску прыйдзецца змагацца пераважна ў конным парадку. Патрэбна будзе ў першую чаргу разграміць татарскі кош да вяртання чамбулаў з загонаў. Ад палонных надворны маршалак ведаў, што большасць аддзелаў павінна была вярнуцца да 8 жніўня. Але трэба было ўлічваць, што асобныя татарскія чамбулы маглі вярнуцца раней. У такой сітуацыі неабходна было асцерагацца раптоўнага ўдару ў тыл. Войска ВКЛ павінна было дзейнічаць хутка і аператыўна. Неабходна было завяршыць разгром татарскага каша да канца таго ж дня.

Разам з тым, Глінскі добра разумеў, што паспешлівы франтальны ўдар па татарскіх пазіцыях прынясе больш шкоды, чым карысці. У гэтым выпадку гаспадарскае войска магло, па меншай меры, панесці вялікія страты. Галоўным было не спяшацца і добра падрыхтаваць рашаючы наступ на ворага. Глінскаму спатрэбілася нямала высілкаў, каб утаймаваць некаторых ваяроў, што літаральна рваліся ў бой. Галоўнай праблемай для надворнага маршалка былі стрэлы татарскіх лучнікаў. Падавіць іх магчыма было з дапамогай агнястрэльнай зброі. Некалькі гарматак суправаджалі гаспадарскае войска. Як потым высветліцца, яны адыграюць важную ролю ў бітве.

Нарэшце, Глінскі мусіў улічваць выдатныя баявыя якасці татарскага воіна. Надворны маршалак з асабістага вопыту ведаў пра мужнасць татарына, які заўжды да апошняга, нават страціўшы надзею на перамогу, змагаецца з праціўнікам[264]. Улічваючы адчайнасць та-

[263] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 66; La Moscovie du XVIe siècle... P. 158—159.

[264] Флетчер Д. О государстве Русском. С. 92.

тарскіх ваяроў, князь Міхаіл прадчуваў надзвычай цяжкае змаганне. Але Глінскаму было вядома і тое, што страта камандзіраў войска здольна прывесці татараў у такое замяшанне, што аднаўленне баявога парадку будзе немагчымым[265].

Глінскі выдатна разумеў, што ягонаму войску прыйдзецца ўступаць у бой амаль што з маршу. На падыходзе да Клецка маршавыя калоны павінны былі разгарнуцца ў баявыя парадкі і заняць дакладна адведзеныя ім баявыя пазіцыі ў стратэгічна важных месцах паблізу горада. Не ўсе наяўныя сілы мусілі быць адразу ўведзеныя ў бой: частка аддзелаў, лепш падрыхтаваных і ўзброеных, знаходзілася ў рэзерве на гарадзішчы і на Арыне, іншыя, больш мабільныя, былі пасланыя адсочваць і перахопліваць крымскія чамбулы, якія павінны былі вяртацца ў кош. Перапраўляцца праз Сільну было вырашана ў некалькіх месцах і не адразу. Праўдападобна, згодна планаў Глінскага, першая калона, якая пераправіцца праз раку, павінна была прыняць на сябе ўдар галоўных сілаў ворага з мэтай максімальна паслабіць яго, а таксама адцягнуць ягоную ўвагу ад пераправы другой калоны гаспадарскага войска. Пазіцыі, якія займалі войскі Глінскага пад Клецкам, дазвалялі ім ажыццяўленне шырокіх манеўраў па атачэнні і абыходзе крымскага войска. Пасля злучэння абедзвюх харугваў гаспадарскага войска на левым беразе Сільны план Глінскага прадугледжваў нанясенне ўдару злучанай масай паспалітага рушання па галоўных сілах крымцаў з мэтай паслабіць і разам з тым адсекчы іх ад ханскага лагеру. Затым павінны былі ўступіць у бой надворная харугва і найманая кавалерыя з мэтай давяршыць разгром ворага.

### 4.4.5. Апошнія прыгатаванні бакоў да бітвы

У адрозненне ад царэвічаў Бурнаша і Біці-Гірэя, Глінскі меў зусім мала часу для падрыхтоўкі да бітвы. План бітвы быў распрацаваны яшчэ на маршы; на месцы ў яго былі ўнесеныя толькі асобныя дэталі. Невядома, ці адбыліся перагаворы паміж Глінскім і царэвічамі. Крыніцы на гэты конт упарта маўчаць. Магчыма, што надворны маршалак паспрабаваў на самым пачатку бітвы ўступіць у кантакт з татарскімі военачальнікамі, каб схіліць іх да капітуляцыі. Але гэтая спроба мусіла скончыцца няўдачай. Калі дапусціць, што перагаворы паміж праціўнікамі ўсё ж мелі месца, яны павінны былі трываць нядоўга. Абодва бакі былі рашуча настроеныя вызначыць мацнейшага шляхам бітвы.

---

[265] La Moscovie du XVIe siècle... P. 159.

Акрамя пытанняў тактыкі, Глінскі надаваў важнае значэнне маральнай падрыхтоўцы сваіх людзей. Гэтай мэце мусіла служыць прамова перад войскам, якая з'яўлялася магутным канвенцыйным сродкам унушэння энтузіязму. Стрыйкоўскі паведамляе, што надворны маршалак зрабіў кароткую эмацыйную прамову. Аб'язджаючы войска, надворны маршалак заклікаў людзей мужна бараніць Айчыну, гонар уласных жонак, дзяцей і родных, а таксама паспрыяць вызваленню паняволеных братоў і сёстраў. Праўда, Стрыйкоўскі гаворыць, што Глінскі звярнуўся да войска з прамовай тады, калі гаспадарскае войска стаяла ўжо гатовым да пераправы праз Сільну, а не перад маршам са старажытнага гарадзішча або пачаткам атакі татарскіх пазіцый. Аднак з улікам таго, што існавала рэальная праблема данесці прамову да масы воінаў, не выключана, што Глінскі выступаў не адзін раз. Не выключана, што прамова перад войскам на пераправе праз Сільну была найбольш эмацыйнай з усіх, якія Глінскі агучыў падчас Клецкай бітвы. Наколькі змест прамовы, якую Стрыйкоўскі ўклаў у вусны Глінскаму, адпавядаў рэчаіснасці? Хоць Стрыйкоўскі і пісаў значна пазней разглядаемых падзей, змест прамовы дазваляе ўсё ж меркаваць, што яна не з'яўляецца літаратурнай выдумкай храніста. З іншага боку, можна меркаваць, што татарскія военачальнікі таксама звярталіся да ўласнага войска. Звычайна яны пачыналі бой з вокліччу «Olla billa» (Бог у дапамогу)[266].

Аднак прамова военачальніка перад войскам была не адзіным сродкам узняць матывацыю воінаў. Калектыўнаая малітва з'яўлялася яшчэ адным канвенцыйным сродкам падвышэння баявога духу. Наконт таго, ці маліліся воінства Глінскага перад бітвай, у крыніцах няма звестак. Аднак, улічваючы сярэднявечную традыцыю, згодна з якой малітва з'яўлялася неад'емнай часткай падрыхтоўкі да бітвы, можна станоўча адказаць на гэтае пытанне. Праблема ўскладняецца тым фактарам, што ў войску Глінскага знаходзіліся прадстаўнікі, па меншай меры, трох канфесій (праваслаўныя, каталікі, мусульмане). Невядома, як і ў які момант малілася рознаканфесійнае войска Глінскага. Таксама застаецца адкрытым пытанне, ці суправаджалі войска Глінскага святары тых канфесій, вызнаўцы якіх складалі войска ВКЛ. Можна канстатаваць, што для храністаў і летапісцаў такія моманты падрыхтоўкі да бітвы, як калектыўная і індывідуальная малітва, з'яўляліся само сабой зразумелым фактам, які не патрабаваў дэталёвага апісання.

[266] Флетчер Д. О государстве Русском. С. 92.

Разгортванне штандараў і сцягоў таксама было састаўной часткай рытуалу падрыхтоўкі да бітвы. Яно служыла сігналам для выступу войска. Гаспадарскае войска мусіла разгарнуць чырвоны штандар з выявай вершніка на кані з мячом. Не выключана, што былі разгорнуты сцягі асобных магнатаў, початы якіх удзельнічалі ў бітве. Сцяг з «Пагоняй» мусіў быць самым вялікім і прыгожым сярод усіх наяўных штандараў. Несці яго мусілі побач з Глінскім як найвышэйшым военачальнікам. Адначасова поруч з надворным маршалкам мусілі несці яго асабісты сцяг з выявай лілii, а таксама сцяг з выявай родавага герба Глінскіх. Разгортванне сцягоў мусіла адбыцца яшчэ ў часе стаяння гаспадарскага войска на старажытным гарадзішчы. Марш з гарадзішча адбываўся ўжо пад разгорнутымі сцягамі, што мусіла зрабіць моцнае ўражанне на татараў.

У войску Глінскага прысутнічалі музыкі. Музыка служыла не толькі сродкам падачы адпаведных сігналаў, але і спосабам падняцця баявога настрою войска. Так, у часе руху гаспадарскага войска з Арыны да Сільны гучалі трубы і гралі дудкі[267]. Перад боем воіны мусілі спяваць рэлігійныя гімны, у тым ліку знакамітую «Багародзіцу», а таксама вайсковыя песні, у якіх услаўляліся гераічныя дзеі продкаў.

У Сярэднявеччы бітве нярэдка папярэднічалі двубоі паміж наймагутнейшымі воінамі праціўнікаў. Так, напрыклад, Кулікоўскую бітву 1380 г. адкрыў бой паміж Перасветам і Чалубеем. Пад Клецкам, аднак, здаецца, абышлося без двубою[268]. У першую чаргу, гэтая акалічнасць была выкліканая асаблівасцямі мясцовасці, дзе размясціліся войскі. Праціўнікаў раздзяляла рака, і было цяжка вырашыць, на чыім баку мусіў адбыцца двубой. Адзіночнай бітве перашкаджаў таксама і вязкі характар грунту. Да таго ж, абодва бакі былі настроены рашуча і бескампрамісна. Яны не жадалі адцягваць вынік змагання.

### 4.4.6. Змаганне

Бітве папярэднічаў дзёрзкі рэйд рацаў у тыл татараў. Рацы, якім на дапамогу пазней прыйшоў аддзел лёгкай конніцы ў 500 чалавек, напалі на татараў адтуль, адкуль яны меней усяго чакалі — з боку замкавага става, пераправіўшыся папярэдне праз Лань у раёне старажытнага гарадзішча. Рацы смела ўступілі ў бой з размешчанай на

[267] Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI — першая палова XVIII ст. Мінск, 2005. С. 395.

[268] Андрэй Блінец прытрымліваецца іншага пункту гледжання: Блінец А. Клецкія бітвы... С. 44—45.

Вялікай (Каралеўскай) дарозе татарскай старожай і змусілі яе адступіць у кош. Вынікам такой дзёрзкай атакі стала здабыча вялікай колькасці коней, якіх татары пасвілі на поплаве каля замкавага става. Аператыўныя магчымасці татарскага войска былі значна зменшаны. Страціўшы коней, татары згубілі галоўную сваю перавагу — манеўранасць. Біці-Гірэй і Бурнаш былі змушаны адмовіцца ад актыўных абарончых дзеянняў і контратак. Многім татарам прыйшлося ваяваць у нязвыклай для сябе манеры, пешшу.

Цяжка сказаць, як было пашыхтаванае войска ВКЛ непасрэдна перад бітвай. Пазнейшыя крыніцы сведчаць, што войска Глінскага складалася з дзвюх харугваў (навагародскай і менска-гарадзенскай)[269]. У Хронiцы Быхаўца згадваецца, што войска ВКЛ заатакавала пазіцыі татараў дзвюма калонамі[270]. Можна толькі меркаваць, што ў першай лініі размяшчалася паспалітае рушанне, затым панскія початы, і толькі за імі — самыя баяздольныя часткі гаспадарскага войска, уключаючы надворную харугву і найманую кавалерыю. На Арынскай гары мусіла размяшчацца ў якасці рэзерву каралеўская прыдворная харугва, якой камандаваў Сяндзівой Чарнкоўскі. Рацы служылі пераважна для разведвальна-дыверсійнай дзейнасці, а таксама перасьледу адступаючага ворага. Далейшыя змены ў баявых парадках гаспадарскага войска мусілі ўжо адбывацца непасрэдна перад і ў ходзе самой сечы.

На падыходзе да ракі татары засыпалі гаспадарскіх воінаў градам стрэл, што магло нанесці ім немалыя страты. Глінскі загадаў сваім воінам атакаваць у разгорнутым парадку, што значна зменшыла страты[271]. У багністай глебе грузлі коні.

Спусціўшыся са старажытнага гарадзішча, гаспадарскае войска стала шырокім фронтам на правым беразе Сільны. Заняўшы супрацьлеглыя берагі Сільны, праціўнікі спыніліся ў чаканні. Так яны стаялі доўга і не ўступалі ў непасрэдны кантакт, абменьваючыся стрэламі з лукаў і лаянкай. Глінскі ў рыцарскім даспеху ўсім сваім выглядам паказваў, што ён не збіраецца пакуль атакаваць і што час працуе на яго. Такая тактыка літвінаў моцна раздражняла татараў, бо яны разумелі, што праціўнік нешта задумаў.

Аднак не ўсе ў гаспадарскім войску здолелі ўстрымацца ад спакусы заўчаснай пераправы і атакі. Згодна Хронiцы Быхаўца, невялікая

[269] Stryjkowski M. Kronika... T. 2. S. 333—334.

[270] ПСРЛ. Т. 32. С. 172

[271] Stryjkowski M. Kronika… T. 2. S. 334.

жменька дваран на чале з Копцем, пісарам пана Яна Юр'евіча Забярэзінскага, паспрабавала на свой страх і рызыку пераправіцца праз Сільну. На супрацьлеглым беразе яна была акружаная татарамі і ўшчэнт знішчаная. Сцятую галаву Копця татары насадзілі на дзіду і доўга насілі перад фронтам гаспадарскага войска. Выкарыстоўваючы такі эмацыйны шантаж, татары спрабавалі не столькі запалохаць літвінаў, але як мага хутчэй уцягнуць войска ВКЛ у бой. Татары не знайшлі іншага сродку, як з дапамогай абразы паспрабаваць прымусіць літвінаў раней устаноўленага часу пераправіцца праз Сільну. Выгляд сцятай галавы Копця выклікаў гул абурэння і праклёнцаў на правым беразе Сільны. Глінскі ледзь стрымаў сваіх воінаў ад заўчаснай атакі. З вялікай цяжкасцю гаспадарскія ратнікі здолелі ўтаймаваць свае эмоцыі.

Пачалася першая фаза бітвы. Яе распачала гаспадарская артылерыя. Залпы дзвюх гарматак, падмацаваныя стральбой з рушніц і аркебуз, аказалі на татараў моцны застрашальны эфект. Эфектыўна дзейнічалі лучнікі, якіх у гаспадарскім войску было нямала. Колькі часу доўжылася артылерыйская кананада, невядома. Яна мусіла быць нядоўгай, бо татары не мелі магчымасці адказваць тым жа самым сродкам. Не вытрымаўшы канцэнтраванага агню літвінаў, яны былі вымушаны адступіць ад берага, пакідаючы за сабой забітых і параненых.

Адкінуўшы з дапамогай артылерыі татар з левага берага Сільны, Глінскі загадаў масціць гаці праз раку[272]. Калі гаці былі гатовыя, пачалася пераправа. Пачаўся другі этап аперацыі. Настала чарга гаспадарскай кавалерыі. Першым пераправілася праз Сільну, недалёка ад яе ўпадзення ў Лань, правае крыло. Галоўны ўдар велікакняскіх воінаў быў скіраваны супраць вальнага татарскага гуфа, які ўзначальвалі царэвічы Бурнаш і Біці-Гірэй.

Атака кавалерыі традыцыйна лічылася класічным прыёмам баявых дзеянняў у Сярэднявеччы. Але яна патрабавала шмат падрыхтоўкі і высілкаў для каардынацыі дзеянняў вершнікаў. У першую чаргу, было неабходна, каб рыцары рухаліся сінхронна, не адрываючыся адзін ад аднаго. Інакш можна было несвоечасова патрапіць на праціўніка і стаць яго ахвярай. Кіраванне такой масай конных воінаў мусіла ствараць для военачальнікаў вялізныя праблемы. Вайсковыя камандзіры ў Сярэднявеччы звычайна не мелі ў сваім распараджэнні вайсковых адзінак, трэніроўку якіх яны

[272] «Quos Michael Glijnski omnium copiarum dux a ripa tormentis bellicis submovere cepit, amnemque alioque paludinosum arboribuss et fruticibus desectis, feno insuper, quod loco illo multum erat, constravit et permeabilem fecit» (Kroniki Bernarda Wapowskiego… S. 67). Stryjkowski M. Kronika… T. 2. S. 334—335.

б ажыццяўлялі на працягу доўгага часу. Нават у магнацкім почаце заўсёды былі людзі, якіх адмыслова набіралі для канкрэтнай кампаніі і якія ніколі раней не ваявалі поруч. Асобныя воіны звычайна трэніраваліся ў індывідуальным парадку, падтрымліваючы баяздольнасць на паляванні або ў рыцарскіх турнірах. Многія з паспалітага рушання ВКЛ не мелі нават такой мінімальнай падрыхтоўкі. Іх баяздольнасць знаходзілася на нізкім узроўні, што было сапраўдным галаўным болем для военачальнікаў. Але нават тых вершнікаў, якія мелі добрую індывідуальную падрыхтоўку, цяжка было пераканаць змагацца сінхронна. Для цяжкаўзброеных коннікаў гэтая праблема мусіла стаяць яшчэ больш востра, чым для лёгкаўзброеных.

З другога боку, мясцовы ландшафт мусіў моцна абмяжоўваць дзеянні гаспадарскай кавалерыі пад Клецкам. Нават пераадолеўшы балоцістую пойму Сільны, гаспадарскае войска мусіла літаральна ўскарасквацца па схіле. Таму не магло быць і гаворкі пра штурм конніцай татарскага каша. Хутчэй за ўсё, літвінскай кавалерыі прыйшлося дзейнічаць дробнымі вайсковымі адзінкамі.

З двух бакоў літвіны пачалі цясніць татараў. Нешматлікі татарскі авангард быў адразу апракінуты. Неўзабаве гаспадарскія воіны ўступілі ў бой з асноўнымі татарскімі сіламі. Распачаўся трэці, самы адказны і жорсткі этап бітвы, дзе праціўнікі сустрэліся тварам да твару на полі бою. Абодва войскі сышліся ў бязлітасным змаганні. Усё змяшалася: людзі і коні, свае і чужыя. Атмасферу на полі бою паспрабаваў перадаць у вершаванай форме Мацей Стрыйкоўскі:

*Huk, grzmot, kołat, trzask straszny, niebo brzmi i lassy,*
*Gdy gwałtownie w Tatarzy uderzyli naszy;*
*Kurzy się pył końskimi wzruszony kopyty,*
*A echo głos rozdwoja po polach sowity*[273].

Удар літвінаў быў настолькі моцным, што галоўны корпус татараў не вытрымаў. Яго сілы змяшаліся так, што не было і гаворкі пра арганізаванае змаганне. Праціўнік, аказваючы жорсткі супраціў, тым не менш, пачаў адступаць. У непасрэднай небяспецы апынулася стаўка татарскіх военачальнікаў. Здавалася, яшчэ трохі — і татары будуць канчаткова зломленыя. Іх становішча з кожнай хвілінай станавілася ўсё больш і больш крытычным. Царэвічы Біці-Гірэй і Бурнаш цудоўна разумелі сітуацыю. Аднак яны наўмысна пакінулі значныя сілы на флангах, каб у рашаючую хвіліну ўвесці іх у бой.

[273] Stryjkowski M. Kronika… T. 2. S. 335.

Гаспадарскае войска, якое працягвала з імпэтам цясніць праціўніка, было нечакана атакавана з флангаў татарскай конніцай. Татары ўсёй сілай абрынуліся на гаспадарскае войска. Часткі іх лёгкай конніцы, ажыццявіўшы г. зв. «татарскі танец», прынялі форму вялікага паўкола і пачалі націск на войска Глінскага, спрабуючы яго акружыць. Такая манера вядзення бою нагадвала танец, ад чаго і атрымала сваю назву[274]. Літвіны былі змушаны перайсці да абароны. Але сілы былі не роўныя. Пераўзыходзячыя сілы праціўніка пачалі цясніць гаспадарскіх воінаў, якія адчайна бараніліся.

### 4.4.7. Разгром галоўных сіл праціўніка

У момант, калі татары ўсілілі націск на гаспадарскае войска, левае крыло гаспадарскага войска завяршыла пераправу праз Сільну. Яго мусіў весці сам Міхаіл Глінскі. Магутным і раптоўным ударам левы гуф ударыў у бок татарскага войска і рассёк яго на дзве часткі. Тым самым быў аслаблены націск на на правае крыло гаспадарскага войска. Аб'яднанне правай і левай калоны мусіла адбыцца каля гаці на нясвіжскай дарозе, прыкладна там, дзе зараз стаіць Св. Крыж, насупраць дома № 27 па вуліцы Леніна. Гаспадарскае войска, аднавіўшы строй, ізноў перайшло ў наступ на праціўніка. Татарскае войска страціла баявы парадак і было змушана перайсці да абароны. Летапісец адзначае: «яко татарове не только битися, но очы и рук своих на литовское войско поднести не мгли»[275].

У момант злучэння правай і левай калон гаспадарскага войска, на Арынскай гары з'явіўся аддзел польскіх рыцараў , сярод якіх, мабыць, і быў згаданы вышэй Пётр Герваст з Унрава. З'яўленне польскай надворнай харугвы павінна было, на думку Глінскага, засігналізаваць татарам, што на дапамогу літвінам ідуць значныя падмацаванні. Каб пераканаць ворага ў сваёй колькасці, надворная харугва прыняла расцягнуты строй, каб заняць усю Арынскую гару. Выгляд польскай харугвы, закаванай у жалеза, якое зіхацела ў промнях сонца[276], дзіды з прапарамі, барабанны бой і гул труб аказалі паралізуючае ўздзеянне на татараў. Чакаючы ўступлення ў бой новых сіл праціўніка, татарскае войска пачало страчваць волю да супраціву. Пад магутным націскам войска Глінскага татары былі вымушаныя пачаць неарганізаванае адступленне.

---

[274] Пра баявы парадак татараў: La Moscovie du XVIe siècle... P. 159.

[275] Анталогія даўняй беларускай літаратуры... С. 395.

[276] У гэты час сонца павінна было знаходзіцца на захадзе. Гэта яшчэ раз пацвярджае версію пра тое, што бітва адбылася менавіта на рацэ Сільна.

Гаспадарскае войска цясніла татараў у бок клецкага вакольнага горада. Відавочна, Глінскі планаваў знішчыць татарскае войска, скінуўшы яго ў воды замкавага става. Татарскае камандаванне здагадалася пра гэты план і таму зрабіла адчайную спробу вырвацца з акружэння. Частцы татарскага войска на чале з царэвічамі Бурнашам і Біці-Гірэем удалося прарвацца скрозь шыхты ваяроў ВКЛ. Яны кінуліся наўцёкі па Цаперскай дарозе. Услед за імі паімчала лёгкая літоўская кавалерыя.

### 4.4.8. Пастка

Другую частку татараў адціснулі да замкавага става непадалёк ад месца ўпадзення Сільны ў Лань. Татары адступалі па тэрыторыі, якую сёння займае Клецкі раённы шпіталь. У цёмных водах замкавага става многія з татарскіх воінаў знайшлі апошні прыстанак.

Вакольны горад стаў месцам фінальнага змагання з асноўнымі татарскімі сіламі. Тут разгарэўся апошні акт драмы. На плошчы меней чым 8 га адбыліся важнейшыя падзеі ўсёй бітвы пад Клецкам. Адступленне рэштак татарскіх сіл у клецкі вакольны горад было вынікам не толькі націску гаспадарскага войска, але, здаецца, свядомым манеўрам. Відавочна, татары загадзя падрыхтавалі тут пазіцыі на выпадак магчымага адступлення. Тут былі вырыты земляныя ўмацаванні, пры дапамозе якіх татарскія царэвічы спадзяваліся пратрымацца. Яны разлічвалі арганізаваць зацяты супраціў наступаючаму гаспадарскаму войску на руінах вакольнага горада. Знясіліўшы літвінаў, можна было б паспрабаваць прарвацца і пачаць адыход у Крым. Пра вывад палону не было ўжо ніякай гаворкі. Размова ішла выключна пра тое, каб выратаваць жыцці тых, хто быў здольны ўратавацца сам. Падобную тактыку татары прымянілі супраць палякаў у бітве пад Сакалем у 1519 г. Яны заманілі польскае войска на руіны Сакальскага замка, дзе і знішчылі ворага[277].

Тактыка царэвічаў, аднак, у клецкім вакольным горадзе не спрацавала. Па-першае, татары, што абараняліся тут, былі значна аслабленыя ў папярэдніх баях. Колькасць татарскіх сіл, што ўмацаваліся ў горадзе, не дазваляла ім спадзявацца на перамогу. Адзінае, на што яны былі ў гэтым становішчы здатныя, гэта адтэрмінаваць час канчатковага паражэння. Па-другое, князь Міхаіл Глінскі, як добры знаўца татарскіх звычаяў і тактыкі, разгадаў план татарскіх

[277] Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян. С. 67.

правадыроў. Хоць у клецкім вакольным горадзе татары і здолелі аказаць супраціў, іх доля была ўжо вырашаная. У выніку апошняга штурму абаронцы былі часткова знішчаны, а часткова захоплены ў палон. Сярод апошніх мусіў быць знакаміты Мелік-баша.

Перад тым, як уступіць на тэрыторыю клецкіх валоў, частцы гаспадарскіх воінаў прыйшлося спешыцца. Гэта былі найбольш падрыхтаваныя і загартаваныя воіны Глінскага, ягоны сваесаблівы «спецназ», які мусіў добра валодаць прыёмамі рукапашнага бою, а таксама і халоднай зброяй. Складаўся ён з асобаў рознага паходжання: там былі русіны, літвіны, татары, сербы, палякі, немцы і інш. У баі за ханскую стаўку воінам Глінскага супрацьстаялі такія ж добра падрыхтаваныя і ўзброеныя крымскія элітныя сілы; сярод якіх маглі быць і італьянскія жаўнеры, ураджэнцы Кафы. Няма сумненняў, што «спецназ» Глінскага мусіў сутыкнуцца з адчайным і ўмелым супрацівам на клецкіх валах. Не выключана, што ў тым хаосе, які ўзнік пад час змагання за ханскую стаўку, Біці-Бірэй і Бурнаш змаглі пакінуць свой лагер і ўцячы.

## 4.4.9. Праследаванне

Тым часам праследаванне татараў, што ўцякалі ў накірунку Цапры, ператварылася ў сапраўднае паляванне. Праціўнік, здаецца, і не думаў пра супраціў. Пра нейкія пасткі і іншыя хітрасці ў дачыненні да літвінаў не магло быць і гаворкі. Усе думкі адступаючых былі скіраваныя толькі на ўласнае выратаванне.

Пераправа праз Цапру стала для татараў сапраўднай катастрофай. Вялікая іх колькасць патанула, іншых загналі ў суседняе балота, дзе і знішчылі. Катастрофу татарскага войска на Цапры вобразна перадае Хроніка Быхаўца: «И как прыбегли татарове ко Цебре, тогда мало не вси в реце и болоте потонули, так много татар и коней их в реце и болоте было, яко литва переезджали на конех и пешы перехожывали па мертвых телесах татарских и коней их»[278].

Толькі царэвічам Бурнашу і Біці-Гірэю з невялікім аддзелам удалося пераправіцца на супрацьлеглы бераг Цапры і адарвацца ад пагоні. Хаваючыся па лясах, блукаючы па балотах і палях, яны з невялікай колькасцю воінаў здолелі вярнуцца дамоў. Іншыя невялічкія групы татар, якія здолелі ўнікнуць гібелі ў бітве, на свой страх і рызыку прабіраліся ў Крым рознымі шляхамі. Іх лавілі пад Слуцкам, Капылём, Петрыкавічамі, Оўручам, Жытомірам і ў іншых

[278] Анталогія даўняй беларускай літаратуры… С. 395.

месцах. Толькі нямногім з іх удалося прыбегчы ў Крым, несучы вестку пра жудасную катастрофу.

Аднак перамога гаспадарскага войска яшчэ не была канчатковай. Не вярнуліся з загонаў татарскія чамбулы з палонам. Глінскі, ведаючы пра дакладны тэрмін іх вяртання ў кош, пайшоў на чарговую хітрасць. Надворны маршалак размясціў частку свайго войска на месцы, дзе знаходзіўся кош. Каб татары ні пра што не здагадаліся, ён пераапрануў пэўную колькасць воінаў у татарскую вопратку. На ўсіх шляхах і дарогах была размешчана старожа, каб перахопліваць татарскія аддзелы. Былі таксама ўзятыя пад кантроль усе броды і пераправы на рэках.

У прызначаны тэрмін, 8 жніўня, татары пачалі вяртацца ў кош і, не ведаючы пра разгром асноўных сіл, траплялі ў пастку, што падрыхтаваў для іх Глінскі. Практычна ўсе загоны былі знішчаныя. Гэтым завяршылася аперацыя па знішчэнні крымскіх нападнікаў і вызваленні захопленага імі палону. Яна працягвалася з 1 па 8 жніўня 1506 г.[279]. За гэты час адбылося 13 сутычак. Кульмінацыяй стаў дзень 5 жніўня 1506 г., калі пад Клецкім замкам разыгралася рашаючае змаганне. Сама бітва доўжылася некалькі болей трох гадзін. Дзень 8 жніўня быў апошнім днём змагання з крымскімі нападнікамі. У гэты дзень гаспадарскае войска вярнулася ў Вільню, несучы паміраючаму каралю і вялікаму князю Аляксандру вестку пра разгром татарскага войска

## 4.5. Пасля бітвы

### 4.5.1. Пахаванне забітых і ўшанаванне іх памяці

Гаспадарскаму войску ўдалося знішчыць галоўныя татарскія сілы. Быў вызвалены вялізны палон. Была адбіта вялікая колькасць нарабаванага дабра: коней, быдла і г. д. У рукі літвінаў патрапіла значная частка рэчаў, што знаходзіліся ў татарскім абозе. Аднак перамога ўсё ж не была поўнай. Правадырам татарскага войска, царэвічам Бурнашу і Біці-Гірэю, удалося ўнікнуць праследавання і вярнуцца ў Крым. Гэта была, бадай, адзіная акалічнасць, якая магла засмуціць літвінаў.

[279] «Pugnatum est Marte utrimque dubio vicibus multis a die Sancti Petri ad Vincula, que erat prima mensis hujus augusti, usque ad quintam ejusdem diem, qua die Quinta gratia divina prosperante nos Tartari sunt victoriosissime profligati, cesi fusique et continuatis in eis, qui fuge presidio se dedlderant, cedibus cruentis; tridecim conflictus commissi errant usque ad diem mensis ejusdem octavam,qua nostri palma victorie Deo miserante potiti tandem ad nos successive redeunt, spolia victorie referents» (AA. S. 548; Варонін В. А. Два лісты пра бітву пад Клецкам у 1506 г. С. 282—283).

Пасля бітвы ўсходняя і паўночна-ўсходняя ваколіцы Клецка былі літаральна ўсеяныя трупамі забітых татарскіх воінаў, якія хутка разлагаліся на гарачым жнівеньскім сонцы. Частка іх была пахавана на тэрыторыі на паўднёвы захад ад тагачаснага клецкага вакольнага горада. З-за спецыфічнай формы пахаванняў у выглядзе насыпаных курганоў гэтая мясцовасць атрымала пазней назву «Курганы». Назва «Курганы» праіснавала на гэтай тэрыторыі да сярэдзіны XX ст., пакуль не пачалася інтэнсіўная забудова раёна. У выніку назва практычна знікла з памяці людзей.

Застаецца, аднак, адкрытым пытанне, ці было звязана заснаванне ў першай палове XVII ст. у паўночнай ваколіцы Клецка пры дарозе з Нясвіжа Арынскай (Пакроўскай) царквы з ушанаваннем памяці воінаў, якія загінулі ў бітве з татарамі ў пачатку XVI ст. Невядома, дзе былі пахаваныя загінуўшыя воіны Глінскага. Ці былі яны, прынамсі хрысціяне, пахаваныя на Арынскай гары? Калі гэта сапраўды так, Свята-Пакроўская царква на Арыне магла ўспрымацца як некропаль і мемарыяльны помнік. Толькі ў 1996 г. пры дарозе на Кухчыцы і Сіняўку быў усталяваны памятны крыж, прысвечаны бітве 1506 г. Аднак, як адзначана вышэй, ён не адлюстроўвае месца, дзе мусіла адбыцца бітва. Гэта акалічнасць, канешне, не можа перашкодзіць яшчэ раз ушанаваць памяць палеглых у гэтай крывавай бітве. Крыж на Вуліцы Леніна (былой Нясвіжскай) насупраць дома № 27, які паспеў ужо абрасці легендамі і паданнямі, асабліва пасля пажару 1937 г., у народнай памяці ніяк не звязаны з падзеямі больш чым 500-гадовай даўніны. Аднак у сапраўднасці менавіта ён знаходзіцца недалёка ад месца, дзе адбыліся рашаючыя падзеі бітве 1506 г. Трэба думаць, што многія шараговыя воіны Глінскага былі пахаваныя, звычайна ў агульных магілах, непадалёку ад месца бітвы. Гэтыя месцы мусілі быць пазначаныя крыжамі. Целы або парэшткі найбольш знатных воінаў, што загінулі ў бітве, маглі быць перанесены на асвечаныя землі, якія належалі цэрквам або касцёлам, дзе былі затым пахаваныя. Гэтыя землі павінны былі знаходзіцца непадалёку ад Клецка або на зваротным шляху войска. Так як гаспадарскае войска вярталася па Вялікай (Каралеўскай) дарозе, то, мажліва, паблізу яе і трэба шукаць тыя мясціны, дзе і былі пахаваныя воіны Глінскага. Несумненна толькі, што належнае пахаванне загінуўшых воінаў, а таксама іхняе рэлігійнае памінанне праз малітву і боскую службу, з'яўлялася для Глінскага найвышэйшым абавязкам. Не выключана, што царкоўнае памінанне воінаў, загінуўшых у Клецкай бітве 1506 г., магло адбывацца пазней у касцёле Святой Тройцы і ў клецкіх замкавых храмах.

### 4.5.2. Клецк: гарадскі ландшафт пасля бітвы

Час пасля бітвы 1506 г. быў вельмі спрыяльным для Клецка. Спыненне татарскіх набегаў на землі Клецкага княства не магло не адбіцца самым станоўчым чынам на развіцці яго адміністрацыйнага цэнтра. Паступова вакол замка паўстаў значны горад. Разбудове Клецка паспрыяла актыўная гаспадарчая дзейнасць каралевы Боны Сфорцы, якая валодала Клецкам з 1522 па 1556 гг. Імкнучыся павялічыць прыбытковасць уласных уладанняў, каралева адразу актыўна прыступіла да іхняга ўпарадкавання. Гаспадарчая дзейнасць Боны адбывалася па некалькіх накірунках. Па-першае, разбудова старых і заснаванне новых мястэчкаў. У 1524 г. у Клецкім княстве было заснаванае новае мястэчка Сіняўка[280]. Тады ж пачалася інтэнсіўная разбудова адміністрацыйнага цэнтра рэгіёна Клецка. Па-другое, каралева Бона ініцыіравала правядзенне ў сваіх валоданнях, у тым ліку Клецкім княстве, аграрнай рэформы, якая ўвайшла ў гісторыю як «валочная памера», што неўзабаве стала ўзорам для ўсёй дзяржавы[281]. Галоўным вынікам рэформы стала паўстанне пры замках і гаспадарскіх дварах фальваркаў, якія ўяўлялі сабой буйныя вытворчыя комплексы. На тэрыторыі Клецкай воласці паўстала 5 фальваркаў: Краснастаўскі, Малеўскі, Сіняўскі, Цецеравецкі, Сапотвінскі[282]. Мястэчкі Клецк і Сіняўка мусілі выступаць гандлёвымі цэнтрамі для продажу сельскагаспадарчай прадукцыі з фальваркаў, а таксама з'яўляцца актыўнымі пасярэднікамі ў яе далейшым экспарце на Захад. Права на правядзенне штогадовых кірмашоў Клецк атрымаў яшчэ ў часы вялікага князя Аляксандра Казіміравіча — да 1506 г.[283]. У Сіняўцы кірмаш быў заснаваны ў другім дзесяцігоддзі XVI ст. князем Фёдарам Іванавічам Яраславічам з дазволу вялікага князя Жыгімонта Старога[284] (да заснавання мястэчка). Кірмаш, што паўстаў у Сіняўскім маёнтку Яраславічаў, даў пазней пачатак мястэчку.

Пра вынікі дзейнасці каралевы Боны па разбудове Клецка яскрава сведчыць «Пісцовая кніга Пінскага і Клецкага княстваў»,

---

[280] Bajko A. Ludność księstwa kleckiego w okresie pomiary włócznej // Lituano-Slavica Posnaniensia. Studia Historica. 2003. T. 9. S. 183.

[281] Пра «валочную памеру» гл.: Пичета В. Белоруссия и Литва XV—XVI вв. (Исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития). Москва, 1961. С. 21—42.

[282] Bajko A. Ludność księstwa kleckiego w okresie pomiary włócznej. S. 180—181.

[283] LM. Knyga Nr. 1 (1380—1584): Užrašymų knyga 1 / Parengė A. Baliulis ir R. Firkovičius. Vilnius, 1998. P. 117.

[284] LM. Užrašymų knyga 1. P. 117.

якая была ўкладзеная ў 1552—1555 гг. старостам Станіславам Хвальчэўскім. У першую чаргу, карэнным чынам змянілася планіроўка горада[285]. Новым гарадскім цэнтрам стаў утвораны ў другой чвэрці XVI ст. на поўдзень ад замкавых умацаванняў рынак. Рынак меў форму правільнага чатырохкутніка, ад якога адыходзілі чатыры галоўныя гарадскія вуліцы — Віленская, Нясвіжская, Пінская і Цаперская. Яшчэ адна вуліца вяла з рынку ў бок Сільненскага балота. Яна, як сведчыць Пісцовая кніга, мусіла паўстаць незадоўга да ўкладання апошняй.

На паўднёвы захад ад Клецкага замка яшчэ ў 20—30-я гг. XVI ст. пры старосце Іване Міхайлавічу Харэвічу паўстаў рамесніцкі цэнтр — Слабада. Там жа была пракладзена новая вуліца, якая ў Пісцовай кнізе згадваецца як «ulycza na Slobodzie»[286]. Слабадская вуліца пачыналася ў баку ад Курганоў і прыходзіла да новапракладзенай дарогі, што вяла ад Віленскай вуліцы (былая Яўрэйская, сучасная Гагарына) у бок Лані (сённяшняя Сіняўская, Макаўчука).

У выніку гаспадарчай дзейнасці Боны Клецк у сярэдзіне XVI ст. з'яўляўся ўжо дастаткова значным мястэчкам. Ён канчаткова выйшаў за межы замка. Калі раней замак быў цэнтрам Клецка, а сам Клецк атаясамліваўся з замкам, то цяпер замак апынуўся на ўскрайку мястэчка ў яго паўночна-заходняй частцы. У выніку развіцця Клецка пераважна ў паўднёвым і ўсходнім накірунках новым цэнтрам стаў Рынак. Аднак Клецкі замак не страціў свайго значэння. Ён па-ранейшаму заставаўся рэзідэнцыяй уладароў горада. Можна сказаць, што тагачасны Клецк меў два цэнтры: адміністрацыйны і гандлёвы. Першы атаясамліваўся з замкам, а другі — з рынкам. Істотна павялічылася плошча горада. Тэрыторыя Клецка ахоплівала 2081 прутоў, г. зн. больш за 2 валокі (больш за 42 га). На гэтай зямлі мелася 187 сядзібных пляцаў, з якіх 136 было заселена. У горадзе ў сярэдзіне XVI ст. пражывала каля 700 чалавек. Такім Клецк атрымаў яго новы ўладар Мікалай Радзівіл Чорны.

Разам з эканамічнай разбудовай Клецка пачала паўставаць новая гарадская грамада. Гэта была ўжо якасна іншая супольнасць жыхароў Клецка. І рэч не ў колькасці насельнікаў, якая ў часы каралевы Боны істотна вырасла. За гэты час адбыліся кардынальныя змены

---

[285] Пазднякоў В. Феадальны Клецк XIV—XVIII стст. паводле даных археалагічных раскопак і пісьмовых крыніц // Клецк у гісторыі Беларусі (да 500-годдзя Клецкай бітвы). Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі. Клецк, 5 жніўня 2006 г. Мінск, 2007. С. 31—33.

[286] ПКПКК. С. 391.

ў сацыяльнай і прафесійнай структуры насельніцтва Клецка. Ранейшая клецкая супольнасць групавалася вакол замка[287] і была звязана, пераважна, з яго абслугоўваннем[288]. Гэта была тыпова феадальная супольнасць, якая складалася, галоўным чынам, з ваенна-служылага люду, а таксама замкавай абслугі і невялікай колькасці пасадскіх людзей. У адрозненне ад яе, навапаўсталая клецкая грамада з'яўлялася пераважна супольнасцю рамеснікаў і гандляроў, што групавалася вакол Рынку. Асаблівасцю Клецка, як і іншых гарадоў ВКЛ, быў яго аграрны характар. Большасць жыхароў спалучала заняткі рамёствамі і гандлем з сельскай гаспадаркай. Гэты характар Клецк захоўваў да Другой сусветнай вайны і нават пасля яе.

Дынамічна растучае мястэчка прыцягвала мноства людзей. Гэта былі звычайна не толькі насельнікі навакольных вёсак, але выхадцы з іншых рэгіёнаў дзяржавы, а таксама іншаземцы. Гэты працэс быў паступовым. Так, яшчэ ў 1488 г. кароль і вялікі князь Казімір надаў тагачаснаму навагародскаму намесніку і ключніку Зенку Яўлашкавічу маёнтак Афанасаўскі ў Навагародскім павеце, уладальнік якога перасяліўся ў Клецк[289]. У самым пачатку XVI ст. яшчэ пры князю Іване Васілевічу Яраславічу, у Клецк мусілі перасяліцца некалькі канюшых з Клецкай дзяржавы[290]. Пасля 1506 г. колькасць жыхароў Клецка стала імкліва павялічвацца. Росту насельніцтва спрыяла палітыка Боны па прыцягненні новых жыхароў. Другая чвэрць XVI ст. з'явілася важным часам у паўстанні клецкай местачковай грамады. У канцы праўлення Боны Клецк налічваў ужо каля 700 жыхароў. Яшчэ больш імклівым стаў рост насельніцтва Клецка пры Радзівілах, якія валодалі ім з 1558 г. Асабліва бурным у дэмаграфічным плане быў перыяд з сярэдзіны XVI ст. да сярэдзіны XVII ст., за які колькасць насельніцтва павялічылася з 700 да 2,5 тысяч чалавек.

Новапаўсталая грамада была шматэтнічнай і шматканфесійнай. Акрамя беларусаў, якія ў другой палове XVI — другой палове

[287] Пра атаясамленне Клецка з замкам сведчаць тагачасныя крыніцы. Так, у 1507 г. князь Іван Васілевіч Яраславіч дараваў баярыну Фёдару Шчэпцы «месцо въ городе нашомъ въ Клецку и дворъ въ паркани, на имя Батурынский и огородъ за парканомъ» (Ревизия пущ и переходов звериных в бывшем Великом княжестве Литовском. Т. 1. Вильна, 1867. С. 271; Пазднякоў В. Умацаванні Клецка XI—XVIII стст. С. 82). Пад горадам тут, безумоўна, разумеецца клецкі дзядзінец (Верхні замак), а пад парканам — вакольны горад (Дольны, або Ніжні, замак).

[288] У 1524 г. сяляне клецкіх баяр Шчэпкі і Гараіна павінны былі «замокъ справляти водле давного обычая и на сторожу ку замку ходити» (Ревизия пущ и переходов звериных… С. 272; Пазднякоў В. Умацаванні Клецка XI—XVIII стст. С. 82—83).

[289] LM. Užrašymų knyga 4. P. 135.

[290] LM. Užrašymų knyga 1. P. 116.

XVII стст. складалі абсалютную большасць жыхароў Клецка, у горадзе пражывалі таксама прадстаўнікі іншых этнічных груп. Яўрэі з'явіліся ў Клецку, хутчэй за ўсё, у 20-я гг. XVI ст. (пры каралеве Боне). У самым пачатку яе праўлення дворны маршалак Юрый Ілініч аддаў клецкія корчмы ў арэнду купцу Айзіку Езафовічу (роднаму брату падскарбія ВКЛ Абрама Езафовіча) тэрмінам на 3 гады[291]. Але нельга выключыць, што яўрэі прысутнічалі ў эканамічным жыцці Клецка і раней. Вядома, што згаданы Айзік Езафовіч быў крэдыторам пінскага і клецкага князя Фёдара Іванавіча Яраславіча[292]. За пазыкі князь Фёдар Яраславіч аддаў Айзіку ў арэнду на 5 гадоў возера Вяда і вядскую карчму. З самага пачатку яўрэі адыгрывалі важную ролю ў гандлі Клецка, у тым ліку замежным. У 1542 г. гаспадарскі суд разглядаў справу па скарзе баярына Грышкі Катневіча на клецкага яўрэя Захарыя (Залмана) Маркавіча. Грышка скардзіўся, што калі Маркавіч гнаў валоў на продаж з Клецка ў Гданьск, ён моцна пашкодзіў яго палеткі. За гэта Катневіч забраў у Маркавіча аднаго вала, але быў жорстка збіты служэбнікамі Маркавіча. Суд прызнаў вінаватым Захарыя і абавязаў яго заплаціць Катневічу 12 рублёў грошай[293]. Фёдар Еўлашоўскі згадвае, што ён аказаў дапамогу маці Івана Крэчатоўскага, «кеды ю жиды клецкие были в долгох взяли»[294]. Клецкая яўрэйская абшчына згадана ў каралеўскім і соймавым статуце 1529 г., згодна з якім усе яўрэі ВКЛ, што пражывалі на каралеўскіх землях, павінны былі ўнесці ў скарб 100 коп грошаў для выкупу каралеўскіх вотчын[295]. Пісцовая кніга Пінскага і Клецкага княстваў згадвае некалькі яўрэяў, у тым ліку Ісака Шмойлавіча, Залмана Маркавіча, Хацка Лазаравіча[296]. Пражывалі яны ў самым пачатку Віленскай вуліцы, непадалёк ад Рынку. Можна меркаваць, што іх галоўным заняткам быў гандаль.

Цяжка сказаць, калі ў Клецку з'явіліся першыя татары. Некаторыя даследчыкі звязваюць іх з'яўленне з бітвай 1506 г.[297]. Аднак няма ніякіх сведчанняў пра тое, што першыя татары, якія пасяліліся ў Клецку, былі палоннымі. У сярэдзіне XVI ст. у клецкай гарадской

---

[291] LM. Knyga Nr. 225 (1528—1547): 6-oji Teismų bylų knyga / Parengė S. Lazutka, I. Valikonytė ir kt. Vilnius, 1995. P. 53.

[292] Тамсама.

[293] Тамсама. P. 207.

[294] Старажытная беларуская літаратура… С. 254. Іван Крэчатоўскі быў сынам клецкага казнадзея Фамы (Фальконіуша?).

[295] Регесты и надписи: свод материалов для истории евреев в России (80 г. — 1800 г.). Т. 1: До 1670 г. Санкт-Петербург, 1899. С. 111.

[296] ПКПКК. С. 387.

[297] Tyszkiewicz J. Tatarzy na Litwie i w Polsce... S. 170.

абшчыне быў, па меншай меры, адзін татарын. Гэта быў Сямён Татарын, які пражываў за касцёлам Св. Тройцы каля ракі Лань[298]. Усе астатнія татары жылі не ў самім мястэчку, а ў вакольных сёлах[299]. У крыніцах XV ст. няма згадак пра прысутнасць татарскага насельніцтва на тэрыторыі Клецкай дзяржавы. Можна толькі меркаваць, што татары былі паселены тут у часы каралевы Боны або пры князю Фёдару Іванавічу Яраславічу. Адсутнасць крыніц не дае магчымасць высветліць паходжанне татарскіх сем'яў, што пасяліліся ў Клецкім княстве. Можна толькі канстатаваць, што ў 20-я гг. XVI ст. яны ўжо пражывалі тут стала.

Татары Клецкага княства адносіліся да шляхецкага саслоўя і мусілі несці гаспадарскую службу. Яны складалі конную варту Клецкага замка, а ў часе вайны павінны былі абараняць яго[300]. Попіс войска ВКЛ 1528 г. згадвае 17 служылых татараў Клецкага княства: Піцілота, Вялічка, Васка, Якут, Кудаш, Бардаш, Берздзей, Мань Татар, Малыш, Разак, два Жданы, Агрыда, Багдан, Курмаш, Данка, Сенка. Усе яны мусілі асабіста з'яўляцца на гаспадарскую службу. Яшчэ адзін татарын, Фёдар, мусіў выставіць аднаго воіна[301]. У 1575 г. клецкія татары валодалі 101 валокай зямлі і выстаўлялі 32 «кані»[302].

У горадзе пражывалі таксама палякі. У клецкай Слабадзе трымаў пляц Валенты Чарнкоўскі[303]. Там жа знаходзіўся і двор Себасцьяна Дыбоўскага[304]. Цяжэй вызначыць этнічную прыналежнасць Станіслава Шалгалы (Салгалы), які трымаў зямлю на Сільненскім балоце[305].

У канфесійным плане ў Клецку пераважалі праваслаўныя (рускія па тагачаснай тэрміналогіі). У сярэдзіне XVI ст. у Клецку налічвалася, па меншай меры, 5 праваслаўных цэркваў: Саборная Прачысценская, Раства Прасвятой Багародзіцы, Святамікольская, Уваскрэсенская і Спаская. У гэты час у Клецку быў толькі адзін касцел, асвечаны ў імя Св. Тройцы. Колькасць католікаў у горадзе была адносна невялікай. Акрамя хрысціян, у горадзе пражывалі таксама іўдзеі і мусульмане. Відавочна, яны мелі ўласныя малельныя дамы. Пісцовая кніга згадвае існаванне іўдзейскіх могілак пры Віленскім

298 ПКПКК. С. 390.

299 Пазднякоў В. Татары Клецкага княства XVI ст. С. 111—122.

300 Bajko A. Ludność księstwa kleckiego w okresie pomiary włócznej. S. 182.

301 РИБ. Т. 33. С. 190.

302 Bajko A. Ludność księstwa Klieckiego w okresie pomiary włócznej. S. 182.

303 ПКПКК. С. 392.

304 Тамсама. С. 392—293.

305 Тамсама. С. 395.

тракце каля сённяшняй Бравароўшчыны. Татары мелі свае могілкі каля вёскі Асмолава (Асмолавічы) ля вытокаў ракі Лань. Бравароўшчына заставалася месцам пахавання яўрэяў да Другой сусветнай вайны, а ў Асмолаве татарскія могілкі дзейнічаюць і ў наш час.

У сацыяльным плане акрамя мяшчан у Клецку пражывалі нешматлікія прадстаўнікі шляхецкага саслоўя. Асобных шляхціцаў, а менавіта Валентыя Чарнкоўскага і Себасцьяна Дыбоўскага, мы ўжо згадвалі. Паколькі Клецк меў мноства храмаў, у склад мясцовай грамады ўваходзілі прадстаўнікі духавенства (святары, пратапопы, дыяканы).

Нягледзячы на тое, што большая частка насельніцтва Клецка прыехала ў горад з іншых месцаў, у новапаўсталай клецкай абшчыне мусіла існаваць уплывовая праслойка карэнных жыхароў, продкі якія пасяліліся ў Клецку яшчэ ў часы Яраславічаў. Іх трэба шукаць, у першую чаргу, сярод жыхароў тагачаснай Віленскай вуліцы, асабліва той яе часткі, што прымыкала да касцёла Св. Тройцы і царквы Св. Міколы. Гэта мясцовасць утварала першапачатковы клецкі пасад. Да іх ліку павінна была належаць сям'я клецкага войта Зенька Андрэевіча. Улічваючы, што царкоўныя пасады звычайна пераходзілі ў спадчыну, нельга выключыць, што згаданыя ў крыніцах XVI ст. клецкія святары, асабліва святар Мікольскай царквы Трахім Васілевіч, а таксама ксёндз Пузына, сапраўды маглі паходзіць са старых «патрыцыянскіх» сем'яў Клецка. У часы князёў Яраславічаў у Клецку пасяліліся і атрымалі маёмасць і асобныя прадстаўнікі шляхецкага саслоўя, у тым ліку згаданы Валенты Чарнкоўскі. Група гэта не была шматлікай, аднак яе ўплыў на гарадскія справы значна пераўзыходзіў яе колькасны склад. Гэта мусіла быць найбольш адукаваная і культурная частка клецкай абшчыны. Яна стала пасярэдніцай паміж дзвюма панаваўшымі ў горадзе дынастыямі: рускіх князёў Яраславічаў і Радзівілаў.

## 4.6. Асоба военачальніка

### 4.6.1. Цяжкасці, звязаныя з вывучэннем асобы ў Сярэднявеччы

Клецкая бітва 1506 г. непарыўна звязана з асобай яе галоўнага героя — князя Міхаіла Львовіча Глінскага. Надворны маршалак — цэнтральная фігура, сімвал бітвы. Асоба князя мусіла непасрэдным чынам паўплываць на зыход бітвы. Невядома, як склаліся б падзеі пад Клецкам, калі б на чале войска ВКЛ стаяў іншы чалавек. Не выклікае сумнення, што персона Міхаіла Глінскага — гэта той магутны фактар,

які быў здольны паўплываць на падзеі, у якіх ён браў удзел. З другога боку, бітва пад Клецкам 1506 г. — гэта вяршыня палітычнай кар'еры Глінскага ў ВКЛ. Адсюль такая ўвага да асобы князя.

Што ж уяўляла сабой асоба князя Міхаіла Львовіча Глінскага? Як, якім чынам яна была здольна паўплываць на ход і змест бітвы пад Клецкам 1506 г.? Каб адказаць на гэтыя пытанні, у нас маецца толькі адна магчымасць. Каб дабрацца да рэальнага Міхаіла Глінскага, мы павінны звярнуцца да тэкстаў, створаных у тую эпоху, калі ён жыў і дзейнічаў. Праз словы, жэсты і ўчынкі, якія прыпісваюцца князю Міхаілу, можна паспрабаваць вызначыць, якой была яго асоба ў сапраўднасці.

Задача гэта, аднак, не такая простая, як падаецца. Па-першае, не захаваліся некаторыя творы, прысвечаныя Глінскаму. Невядомы лёс згаданага вядомым польскім бібліёграфам К. Эстрайхерам твора «Życie księcia Michała Glińskiego», які быў надрукаваны ў Любечы ў 1560 г. Хроніка Быхаўца абрываецца якраз у тым месцы, дзе яе ўкладальнік абацяў, што ён яшчэ пра князя Міхаіла «веле дзивнага напишэ». І ўвогуле, людзі, якія добра асабіста ведалі Глінскага, не пакінулі ўласных успамінаў і сведчанняў.

Па-другое, усе знаныя нататкі пра дзеянні і ўчынкі Міхаіла Глінскага паўсталі пасля 1508 г. Таму яны абцяжараныя і скажоныя самім фактам бунту Глінскіх супраць караля і вялікага князя Жыгімонта Старога і іх наступным пераходам на бок вялікага князя маскоўскага Васіля III. Гэтыя тэксты паўсталі ў коле паноў-рады ВКЛ, праціўнікаў Міхаіла Глінскага, для якіх апошні быў крыніцай няшчасцяў Айчыны. Падобны погляд панаваў доўгі час і ў польскай гістарыяграфіі, да чаго прыклаў руку каронны канцлер Ян Ласкі.

І, нарэшце, усе біёграфы Глінскага, следуючы традыцыі, закладзенай Герберштайнам, пачынаюць апавяданне з яго ад'езду ў Германію і выхавання на двары саксонскага курфюрста Альбрэхта. Сведчанні пра дзіцячыя гады князя Міхаіла, калі закладваўся падмурак яго характару, наогул адсутнічаюць. Нам нават дакладна невядома, дзе ён нарадзіўся і правёў самыя раннія гады свайго жыцця. Якім было выхаванне князя ў дзяцінстве і які адбітак яно мела на асобу будучага героя Клецкай бітвы? Калі дзякуючы Герберштайну мы маем аповед, хоць у значнай ступені мадэльны і ідэалізаваны, пра юнацкія гады Міхаіла Глінскага, то адносна яго дзіцячых гадоў крыніцы маўчаць.

Каб дайсці да Міхаіла Глінскага ў дзяцінстве, трэба ў першую чаргу прааналізаваць сацыяльнае асяроддзе, у якім ён выхоўваўся,

сацыяльныя сувязі, якія маглі паўплываць на станаўленне асобы. У першую чаргу, гаворка ідзе пра сям'ю і род. У свой час Жак Лё Гоф, перайначыўшы фразу свайго слыннага папярэдніка і настаўніка Марка Блока, пісаў, што кожны чалавек падобны не толькі на свой час, але і на час сваіх бацькоў[306].

Прыступаючы да такой складанай тэмы, як асоба і індывідуальнасць Міхаіла Глінскага, нельга абысціся без заўваг метадалагічнага зместу. І першае пытанне, якое непазбежна ўзнікае ў падобных выпадках, гучыць так: ці можна ўвогуле дабрацца да сапраўднага Глінскага? Ці дастаткова будзе тых сведчанняў, што маюцца ў нашым распараджэнні, каб зразумець, якім насамрэч быў наш герой. Гэтае пытанне можна парыраваць адказам, што гісторыку заўжды будзе бракаваць сведчанняў і што не заўсёды наяўнасць вялікай колькасці крыніц дазваляе зразумець сутнасць з'явы. З другога боку, нават маючы перад сабой адзінкавыя сведчанні, можна на іх падставе стварыць цалкам прымальны вобраз падзеі або асобы. Застаецца пытанне: што трэба зрабіць, каб сведкі пачалі гаварыць, гаварыць тое, што ад іх патрабуе даследчык. Гісторыку не застаецца нічога іншага, як упарта і ўважліва працаваць са сведкамі. Ён мусіць перакананаць іх даваць паказанні. Але слухаючы паказанні сведак, трэба абавязкова звяртаць увагу на іх матывацыю і кантэкст, у якім робяцца выказванні.

### 4.6.2. Прыдворнае грамадства і станаўленне характару героя

Каб пазнаць асобу і індывідуальнасць князя Міхаіла, паспрабуем звярнуцца да сведчанняў людзей, якія асабіста ведалі Глінскага або шмат чулі пра яго, належалі да таго ж сацыяльнага асяроддзя, мелі падобнае выхаванне. Да ліку такіх людзей можна, у першую чаргу, аднесці Жыгімонта Герберштайна і слугу Ягайлавічаў Ёдака Дэцыуса (Дэцыя). Як не дзіўна, большасць гэтых людзей паходзіла з германскіх земляў, дзе князь Міхаіл пакінуў пра сябе добрую памяць, дзе надзвычай цанілі яго асобу. Таксама ў якасці крыніцы будуць выкарыстаныя дэпешы дыпламатаў з Польшчы, Лівоніі і Прусіі.

Герберштайн, прыступаючы да разгляду персоны князя, пачынае наўпрост з юнацкіх гадоў героя, з таго часу, калі той прыехаў у Германію. Аўтар, здаецца, не мае сумненняў, што ў загартоўцы характару Глінскага галоўную ролю адыграла выхаванне на двары

[306] Le Goff J. Héros du Moyen Age, le Saint et le Roi. Paris, 2004. P. 188.

германскіх уладароў. Пра папярэдняе выхаванне Міхаіла Герберштайн не ведае і, хутчэй за ўсё, не надае яму асаблівага значэння.

У лацінамоўным базельскім выданні 1556 г. пра юнацтва Міхаіла Глінскага гаворыцца наступным чынам: «Knes vero Michael Linski, qui cum adolescens adhuc in Germaniam venisset, et apud Albertum Saxoniae ducem eo tempore in Frisia bellum gerentem strenue se gessisset, ac per omnes militiae gradus magnum sibi nomen peperisset, Germanorumque apud quos adoleverat moribus imbutus...»[307] (Князь жа Міхаіл Глінскі, які юнаком прыехаў у Германію, з годнасцю паказаў сябе на службе ў саксонскага герцага Альбрэхта, які ў гэты час праводзіў ваенную кампанію ў Фрысландыі; прайшоўшы праз усе ступені ваеннай службы, ён здабыў сабе слаўнае імя, асабліва ў немцаў, сярод якіх ён выхоўваўся і чые звычаі засвоіў).

У нямецкамоўным венскім выданні 1557 г. Герберштайн гаворыць больш падрабязна і дэталёва пра выхаванне Міхаіла Глінскага ў Германіі:

«Dan Khnes Michael Linskhi der in seiner jugent bey Hertzog Albrechten von Saxen der zeit derselb den Khrieg in Friesland füerte gedient derselben zeit sich khain Knesen, sonder Pan Michael lassen nennen, hat sich aller ehrlichen sitten und Ritterspyl angenumen, und was Khriegsssachen, Rennen, Stechen, Ringen, Springen, auch zu Kurtzweil mit Tantzen und aller höfligkhait undterfangen, und damit für ander den rhuem gehabt...»[308]. (Князь жа Міхаіл Глінскі, які ў юнацтве служыў у герцага Альбрэхта саксонскага, які ў гэты час ваяваў у Фрысландыі, зваўся тады не князь, але «пан Міхал»; там жа ён засвоіў усе вытанчаныя манеры і рыцарскія звычаі, авалодаў ваеннымі адзінаборствамі, кшталту рэнэна, гештэха, барацьбы і скокаў, а таксама рознымі забавамі і пацехамі, кшталту танцаў і шляхетных паводзінаў, дзякуючы чаму ён займеў большую, чым у другіх, славу).

У далейшым «Масковія» Герберштайна будзе асноўным сведкам, з дапамогай якога мы паспрабуем зразумець асобу Глінскага, адкрыць яго індывідуальнасць. Аўстрыйскаму пісьменніку будуць дапамагаць іншыя сведкі, сучаснікі эпохі, да якой належаў наш герой. Некаторыя з іх абмяжоўваюцца ўсяго некалькімі фразамі і нават словамі, але ад гэтага іх сведчанні не становяцца менш істотнымі.

Аповед пра выхаванне маладога Міхаіла на двары саксонскага герцага Альбрэхта мае ўмоўны характар, падаецца ў адпаведнасці

[307] Herberstein S. Rerum Moscoviticarum Commentarii… S. 340.

[308] Тамсама.

з пэўнай мадэллю выхавання. Тут мы маем справу з узорнай формай, узорам для пераймання маладым пакаленнем рыцараў. Але разам з тым, гэтая мадэль рыцарскага выхавання, будучы адлюстраваннем рэальнага вопыту, уплывала на рэчаіснасць. Будучы прынятай за ўзор на двары нямецкіх уладароў, яна ўздзейнічала на паводзіны маладых прыдворных. Каб стаць сапраўдным прыдворным, дасягнуць вядомасці, трэба было засвоіць вытанчаныя звычаі і манеры, авалодаць усімі ваеннымі практыкаваннямі і адзінаборствамі, якія прадпісвала засвоіць прынятая мадэль выхавання ідэальнага прыдворнага.

Двор уладара і тое сацыяльнае ўтварэнне, што ўзнікала пры кожным двары, — прыдворнае грамадства — уяўляе сабой найважнейшую рэпрэзентатыўную інстытуцыю Сярэднявечча. Сацыялогія двара і прыдворнага грамадства на прыкладзе двара французскага караля Людовіка XIV былі грунтоўна даследаваны нямецкім сацыёлагам Норбертам Эліясам. Высновы, зробленыя ім, дзейсныя і для даследчыкаў, якія займаюцца іншымі дварамі і прыдворнымі грамадствамі Еўропы. На двары манарха былі сабраныя сотні, а часам і тысячы людзей, у задачу якіх уваходзіла абслугоўваць манарха, даваць яму парады, складаць яго світу[309]. Усе яны былі звязаны паміж сабой своеасаблівымі формамі ўзаемазалежнасці, падпарадкавання, іерархіі і этыкету. Н. Эліяс звярнуў асаблівую ўвагу на тыя формы і адносіны залежнасці, якія спрыялі крышталізацыі прыдворнага грамадства.

У сувязі з растучай мілітарызацыяй Еўропы, сведчаннем чаго сталі італьянскія войны 1494—1559 гг., прыдворнае грамадства Еўропы пачынаючы з канца XV ст. паступова ператвараецца ў грамадства воінаў-рыцараў. Дваранства становіцца саслоўем воінаў[310]. Рыцары складаюць значную, а часам нават, асабліва ў часы вайны, большую частку прыдворнага грамадства. Гэта характарыстыка адносіцца не толькі да двароў імператара Максіміліяна Габсбурга або саксонскага герцага Альбрэхта Веціна, якія вялі працяглыя войны. Падобнай тэндэнцыі не пазбег таксама двор вялікага князя літоўскага Аляксандра Казіміравіча, тым больш, што ВКЛ было ўцягнута ў амаль перманентнае супрацьстаянне з Маскоўскай дзяржавай і Крымскім ханствам. У такіх акалічнасцях двор Аляксандра Казіміравіча, асабліва ў 1500—1506 гг., калі яго кіраўніком быў князь Міхаіл Глінскі, мусіў быў набыць рысы ваеннага лагера. Сам кіраўнік

[309] Элиас Н. Придворное общество. Исследования по социологии короля и придворной аристократии. Москва, 2002. С. 50—52.

[310] Тамсама. С. 198.

двара павінен быў выконваць функцыі камандуючага надворнай харугвы. Адпаведна, выхаванне на двары мусіла мець ярка выражаны ваенны характар. Значнае месца ў дворскім жыцці мусілі займаць ваенныя заняткі і практыкаванні, рыцарскія турніры, сілавыя і атлетычныя спаборніцтвы. Канешне, не толькі вайна вызначала аблічча і характар двара Аляксандра Казіміравіча. Тут адбываліся таксама свецкія прыёмы, балі, гульні, розныя ўрачыстасці. Але вайна была ўсё ж галоўным чыннікам, які ўплываў на двор. Не дзіўна, што той, хто хацеў сцвердзіцца на двары Аляксандра, мусіў валодаць якасцямі воіна-рыцара. Рыцарства, нават у мірны час, было найбольш запатрабаванай катэгорыяй прыдворнага грамадства.

Праграма выхавання маладога прыдворнага мела ярка выражаны рыцарскі змест. Стаўка рабілася не столькі на засваенне вытанчаных манер (ehrliche Sitten), усялякіх пацех і забаў, кшталту танцаў і куртуазіі (Kurtzweil mit Tantzen und aller höfligkhait), колькі на авалоданне маладымі людзьмі рыцарскіх звычаяў і неабходных вайсковых практык (Ritterspyl und Khriegssachen).

Што да тэрміна «Kurzweil», ён ахопліваў усе формы прыдворных забаў ад танцаў да розных відаў куртуазіі. Куртуазія (Curialitas, höflichkeit) азначала рыцарскую форму паводзінаў на двары манарха[311]. Яна распаўсюджвалася на ўсе сферы дзейнасці прыдворнага: рыцарскі турнір, паводзіны за сталом, свецкія размовы, абыходжанне з дамамі[312]. Куртуазія з'яўлялася ў Сярэднявеччы кодам паводзінаў, сродкам выражэння самасвядомасці прыдворнага. Яна была цесна звязана з развіццём і разбудовай уласнага «я» прыдворнага[313].

Тэрмін «Ritterspyl» азначаў у Познім Сярэднявеччы не толькі спартыўную забаву дзвюх груп конных воінаў, якія ў поўным баявым рыштунку спаборнічалі паміж сабой, але ўсялякае коннае практыкаванне ўвогуле. Герберштайн асабліва выдзяляе такія конныя адзінаборствы, як гештэх (Gestech) і рэнэн (Rennen), якія ў часы імператара Максіміліяна І Габсбурга былі любімымі відамі спорту сярод маладых

[311] Элиас Н. Придворное общество...

[312] Nitschke A. Verhalten, — normen // Lexikon des Mittelalters. Bd. 8. München, 1997. Sp. 1534; Элиас Н. Придворное общество...

[313] Элиас Н. Придворное общество...

дваран[314]. Гештэх уяўляў сабой коннае сутыкненне на тупых дзідах[315]. Рэнэн з'яўляўся больш небяспечным спаборніцтвам, бо дзіды ў ім былі завостраны. Важнае значэнне ў рыцарскім выхаванні адводзілася барацьбе (Ringen) і скачкам (Springen), якія ў Сярэднявеччы і ў эпоху Рэнесансу з'яўляліся састаўной часткай нямецкай рыцарскай традыцыі.

Праграма выхавання маладога прыдворнага арыентавалася на аналагічную праграму для самога імператара, якая знайшла адлюстраванне ў панегірычных творах, прысвечаных Максіміліяну І Габсбургу. Да гэтых твораў адносяцца «Weisskunig», «Teuerdank» і «Freydal», якія адлюстроўваюць розныя бакі жыцця і дзейнасці «апошняга рыцара». «Weisskunig» апавядае пра палітычныя здарэнні і ваенныя кампаніі імператара. «Teuerdank» засяроджваецца на апісанні рыцарскіх прыгод Максіміліяна. «Freydal» увасабляе рыцарскі ідэал, прыняты на двары Габсбургаў [316].

Выхаванне маладога караля ахоплівала танцы, забавы і пацехі, рыцарскія гульні, турніры і збройныя практыкаванні, паляванне, сакаліныя ловы, рыбную лоўлю, сталаванне, банкеты і танцы ў масках, а таксама рамесніцка-тэхнічныя навыкі, выраб рыцарскага рыштунку, будаўнічае майстэрства, мастацтва ўзвядзення абарончых збудаванняў, мовы, веды па гаспадарчым і адміністрацыйным кіраванні (канцылярыя, манетная справа, горная справа), мастацтвы (маляванне, царкоўная і вайсковая музыка, сем вольных мастацтваў, медыцына, астралогія) і інш.[317]. Праграма выхавання будучага імператара ўвасабляла сабой рэнесансны ідэал «uomo universale» і была разлічана на кіраванне дзяржавай і дваром.

Ідэальны вобраз прыдворнага, пададзены ў італьянскім прыдворным Касцільёне (Castiglione), уключаў: 1) вайсковае майстэрства (скачкі, фехтаванне); 2) высокую гуманістычную адукацыю, да якой належалі таксама музыка і танцы; 3) прыемныя манеры і вытанчаныя звычаі (*grazia* і *sprezzatura*)[318]. У мадэлі Касцільёне знайшоў адлюстраванне кампраміс паміж *arma* і *littera*, паміж вайсковым майстэрствам і адукацыяй.

---

[314] Gamber O. Ritterspiel und Turnierrüstung im Spätmittelalter // Das rittterliche Turnier im Mittelalter / Hrsg. von J. Fleckenstein. Göttingen, 1985. S. 528.

[315] Бохан Ю. Турнірныя традыцыі ў Вялікім княстве Літоўскім у XIV—XVI стагоддзях. Мінск, 2008. С. 21—25.

[316] Müller J. D. Gedächtnus. Literatur und Hofgesellschaft um Maximilian I. München, 1982. S. 213—216.

[317] Тамсама. S. 225—228.

[318] Scaglione A. Knights at court. Courtliness, chivalry and courtesy from Ottonian Germany to the Italian Renaissance. Berkeley—Los Angeles—Oxford, 1991. P. 235.

Выхаванне маладога караля адбывалася ў кампаніі яго равеснікаў з арыстакратычных сем'яў. «Weisskunig» распавядае, што з маленства ён быў акружаны здольнымі і таленавітымі падлеткамі[319].

Важнае месца ў выхаванні маладога караля адыгрывалі ўсялякія куртуазныя забавы і танцы, асабліва танцы ў масках (Mummereien). Яны належалі да найулюбёных пацех на габсбургскім двары[320].

Асаблівая ўвага ў выхаванні маладога караля надавалася ўсё ж разнастайным спартыўным практыкаванням, сярод якіх гештэх і рэнэн займалі першае месца. «Weisskunig» сведчыць, што Максіміліян пасля таго, як толькі навучыўся фехтаваць на кані і ў пешым парадку (Fechten zu Ross und zu Fuss), адразу пачаў асвойваць розныя рыцарскія адзінаборствы: «da hueb er darnach an sich zu ueben in den ritterspilen mit rennen und stechen und befand, das ainer, der in den ritterspilen beruembt wolt werden, die uebung mit den taten und nit die lernung mit den werken prauchen muesset. Wie pald hat diser jung kunig aus seinem Verstand den rechten grunt der ritterspil fur sich genomen und sich auch also geuebt und von dem Ringen zu den sweren riterspilen gegriffen und darynnen albegen den preiss behalten»[321] (Пасля таго як ён пачаў займацца рыцарскімі практыкаваннямі, перадусім рэнэнам і гештэхам, то зразумеў, каб здабыць славу рыцара, патрэбныя ў першую чаргу практыкаванні з сапраўднымі ўчынкамі, а не вучоба з кнігамі. Як толькі малады кароль усвядоміў сутнасць рыцарскіх практыкаванняў і пачаў іх выконваць, то адразу ўзяўся, як за барацьбу, так і за складаныя рыцарскія адзінаборствы, у чым асабліва меў поспех).

Як толькі малады кароль узмужаў, ён пачаў змагацца ў турнірах у поўным баявым рыштунку (in hohem Zeug), што патрабавала асаблівага спрыту[322]. Максіміліян не толькі асабіста практыкаваў разнастайныя рыцарскія адзінаборствы, але ён з'яўляўся яшчэ і вынаходнікам некаторых з іх. Так, «Weisskunig» прыпісвае яму паўсюднае ўвядзенне ў Германіі гештэха[323].

Наколькі ж гэта літаратурная мадэль рыцарскага выхавання адпавядала рэчаіснасці? Думаецца, што паколькі «Weisskunig» і «Freydal» паходзілі са двара імператара Максіміліяна, то

[319] Kaiser Maximilians Weisskunig. Stuttgart, 1956. S. 221.

[320] Тамсама. S. 230.

[321] Тамсама. S. 236.

[322] Тамсама. S. 236.

[323] Тамсама. S. 236.

мусілі, хоць і ў гіпербалізаванай форме, адлюстраваць жыццё інстытуцыі. З другога боку, ідэалізаваныя куртуазныя рыцарскія забавы, адлюстраваныя ў літаратурных творах, павінны былі ўплываць на дворскае жыццё, знаходзячы сярод дваран гарачых прыхільнікаў.

Які ж уплыў мелі згаданыя рыцарскія практыкаванні і куртуазныя забавы на фарміраванне асобы прыдворнага, на развіццё яго духоўна-псіхалагічнага стану? Якія рысы характару яны фарміравалі? Каб адказаць на гэтае пытанне, неабходна разгледзець патрабаванні, што прад'яўляліся да ўдзельнікаў рыцарскіх турніраў. Гаворка павінна ісці пра рухі і пазіцыі цела пры адпаведных адзінаборствах.

У турнірах кшталту штэхена або рэнэна рыцар звычайна прымаў вертыкальную, злёгку нахіленую наперад пазіцыю, пры гэтым дзіда знаходзілася ў яго пад рукой[324]. Маладыя людзі імчаліся насустрач адзін аднаму кар'ерам, каб скінуць праціўніка з каня або зламаць дзіду аб яго тарчу. Галоўная надзея ўскладалася на раптоўнасць нападу. Галоўнай задачай у двубоі было любымі сродкамі выціснуць праціўніка з таго месца, якое ён займаў, і тым самым атрымаць свабоду манеўру. Калі вершнік сядзеў на кані больш прама і высока, ён мог спадзявацца на мацнейшы ўдар і на большую манеўранасць[325].

Такія адзінаборствы, як рэнэн, патрабавалі ад удзельнікаў фізічнай сілы. Не менш цаніўся спрыт. Удзельніку турніра трэба было ўхіліцца ад удару праціўніка або патрапіць на поўным скаку ў цэнтр шчыта ці адтуліну высока падвешанага пярсцёнка[326]. Выконваючы ваенныя практыкаванні, малады чалавек загартоўваў не толькі цела, але і дух. Ён вучыўся трывала вытрымліваць удары. Гэтая якасць характару потым моцна дапамагала ў рэальным жыцці, калі чалавек сутыкаўся з ударамі лёсу. Акрамя ўсяго, рыцарскія турніры развівалі хуткасць розуму. Рыцар павінен быў прыняць вернае рашэнне ў лічаныя секунды, каб не стаць ахвярай свайго саперніка.

Паглядзім цяпер на тагачаснае мастацтва танца. На двары імператара Максіміліяна былі асабліва распаўсюджаны наступныя яго віды: карагод (Reigentanz), парны танец (Paartanz) і трохскладовы (Dreiergruppentanz) з удзелам мужчыны і дзвюх жанчын[327]. У танцы

[324] Nitschke A. Bewegungen in Mittelalter und Renaissance. Kämpfe, Spiele, Tänze, Zeremoniell und Ungangsformen. Düsseldorf, 1987. S. 147—148.

[325] Nitschke A. Bewegungen in Mittelalter und Renaissance… S. 151; Nitschke A. Verhalten, —normen. Sp. 1535.

[326] Бохан Ю. Турнірныя традыцыі ў Вялікім княстве Літоўскім… С. 22—26.

[327] Freydal: des Kaisers Maximilians. Wien, 1882. S. LII—LIV.

ўдзельнікі з узнятымі рукамі і плячыма рухаліся насустрач. Пры дапамозе рук і плячэй рэгуляваўся, перш за ўсё, рытм танца. Асаблівая ўвага звярталася на ногі, рухі якіх дзялілі прастору, у якой абарачаліся танцоры, як бы на тры вымярэнні. Скачкі, якімі звычайна суправаджаліся танцы, служылі для таго, каб геаметрычна ўпарадкаваць прастору танца. У танцы партнёры павінны былі бесперашкодна рухацца ад аднаго месца да другога. Ад іх толькі патрабавалася каардынаваць узаемныя рухі.

Апісаныя рухі служылі для таго, каб удзейнічаць на ўладара з мэтай заваяваць яго давер або пашану. У гэтым сэнсе яны з'яўляліся мэтанакіраванымі. Разам з тым, гэта былі саслоўна тыповыя рухі. Іх трэба разглядаць як невербальную форму камунікацыі. З іх дапамогай малады прыдворны мусіў усталяваць кантакт з асяроддзем і пры гэтым без слоў нешта паведаміць пра сябе, з тым, каб гэтае асяроддзе магло прыняць яго сваім. Толькі пасля таго як малады чалавек авалодваў гэтымі рухамі і жэстамі, ён мог разлічваць стаць паўнапраўным членам прыдворнага грамадства[328].

Танцы і рыцарскія адзінаборствы вучылі маладога чалавека пакладацца, у тым ліку і ў жыцці, выключна на самога сябе, на свае веды і сваё майстэрства. Тым самым яны прывучалі яго адчуваць сябе самастойнай, незалежнай персонай. Прыдворныя былі людзьмі з высокім і часта хваравітым пачуццём уласнай годнасці.

Разам з тым, згаданыя практыкаванні і рухі мусілі развіваць ініцыятыву, прадпрымальнасць і мэтанакіраванасць. Але адначасова яны развівалі ў чалавеку і неразборлівасць у сродках дзеля дасягнення мэты[329]. Паставіўшы перад сабой канкрэтную мэту, чалавек гэтага кола імкнуўся дасягнуць яе любымі сродкамі. Калі хтосьці ці штосьці раптоўна аказвалася на яго шляху, перашкоду трэба было абавязкова пераадолець, не зважаючы на сродкі. Пакрыўджаны гонар патрабаваў помсты, пры гэтым сам абражаны павінен быў вырашыць, якім сродкам скарыстацца. Магчыма, з гэтай прычыны забойства слугамі Міхаіла Глінскага троцкага ваяводы Яна Юр'евіча Забярэзінскага не атрымала асуджэння з боку Жыгімонта Герберштайна, хоць апошні і не быў прыхільнікам крывавай помсты[330].

---

[328] Nitschke A. Der Wandel kindlicher Bewegungweisen im Mittelalter — Vorbilder und Räume // Zur Sozialgeschichte der Kindheit. Freiburg (Breisgau), 1986. S. 469—486.

[329] Nitschke A. Bewegungen in Mittelalter und Renaissance… S. 151.

[330] Пра характар Ж. Герберштайна: Picard B. Das Gesandtschaftswesen Ostmitteleuropas in der frühen Neuzeit… S. 26—31.

Танцы і куртуазія спрыялі спрытнасці і зграбнасці, што высока цанілася на двары. Яны вучылі маладога чалавека камунікацыі з рознымі па характары людзьмі, асабліва з супрацьлеглым полам. Малады чалавек вучыўся падтрымліваць свецкую размову. Нарэшце, танцы і куртуазныя забавы прымушалі яго каардынаваць і ўзважваць уласныя крокі і дзеянні. Жыццё пры двары вучыла яго стрымліваць уласныя эмоцыі і парывы[331].

Усё згаданае адлюстроўвае не арыгінальнасць канкрэтнага індывідуума, але нейкія агульныя магчымасці, якія маладому чалавеку забяспечвала куртуазна-рыцарскае выхаванне. Любы індывід існуе ў перапляценні разнастайных грамадскіх сувязяў, і менавіта гэтая шматстайнасць дазваляе яму рэалізавацца[332]. Веданне грамадства неабходна, у першую чаргу, для таго, каб зразумець, як фарміруецца і жыве асоба.

Прыдворнае грамадства — гэта асноўная сацыяльная група, у рамках якой адбывалася станаўленне і развіццё князя Міхаіла Глінскага як асобы. Ён мусіў у значнай ступені ўвабраць у сябе тыя агульныя ўяўленні, ідэалы, формы паводзін, якія існавалі ў гэтым грамадстве. Можна было б нават сказаць, што ўсё арыгінальнае і непаўторнае ў чалавеку вынікае ў значнай ступені з агульнагрaмадскіх тэндэнцый і рыс.

Калі князь Міхаіл вярнуўся дамоў, гэта быў ужо не юнак, але дасведчаны ў многіх галінах прыдворнага і дзяржаўнага жыцця муж. Гады навучання скончыліся, пачыналіся гады адказнай і складанай працы. Яго называлі ўжо не «панам», але амаль выключна «князем». Дзякуючы свайму выхаванню і самаадданай службе ў рымскага караля (з 1508 г. імператара Святой Рымскай імперыі) Максіміліяна ён здабыў сабе вядомасць у многіх краінах Еўропы. Беручы пад увагу тое, што крыніцы абазначаюць гады навучання Міхаіла Глінскага ў Германіі лацінскім тэрмінам «adolescentia» (нямецкае — Jungling)[333], якія звычайна ахоплівалі перыяд жыцця з 14 да 21 або 28 гадоў, можна меркаваць, што на той час яму было каля 25 гадоў.

---

[331] Гуревич А. Еще несколько замечаний к дискуссии о личности и индивидуальности в истории культуры // Одиссей. Человек в истории. Москва, 1990. С. 86.

[332] Le Goff J. Saint Louis. P. 186.

[333] Падрабязней пра тэрмін «adolescentia»: Hofmeister A. Puer, Iuvenis, senex: Zum Verständnis der mittelalterlicher Altersbezeichnungen // A. Brackmann (Hg.). Papsttum und Kaisertum. Forschungen zur politischen Geschichte und Geisteskultur des Mittelalters. München, 1926. S. 305.

### 4.6.3. Фізічнае і духоўнае аблічча князя Міхаіла Глінскага

Для Герберштайна ўсе фізічныя і маральныя якасці яго героя з'яўляліся вынікам выхавання на двары нямецкіх уладароў. Міхаіл меў не толькі магутнае цела (corpus validus), але таксама спрытны розум (dexteritas cognitas), дзякуючы якому ён стаў незаменным дарадцам свайго манарха. Увогуле ён быў чалавекам, карысным для любой справы, здатным як да жарту, так і да сур'ёзнай рэчы. Многія, асабліва немцы, цанілі яго менавіта за вастрыню розуму[334]. Нарэшце, Герберштайн адзначае такую рысу князя Міхаіла, як смеласць (fortitudo). Гэтыя фізічныя і маральныя рысы, на думку Герберштайна, і вызначалі асобу ці характар князя Міхаіла Глінскага. Гэтымі ж якасцямі ўзнагародзіў Глінскага яго равеснік і сучаснік Ёдак Дэцыус (Дэцый)[335]:

«Et cum corpore valido, ingenioque ad omnia versatili esset, multum etiam valebat consilio, feriis iocosisque rebus aeque idoneus, planeque (ut ainunt) omnium horarum vir: qua animi dexteritate multum sibi gratiae authoritatisque apud omnes, Germanos presertim, ubi educatus fuerat, conciliaverat»[336].

Нягледзячы на пэўную схематычнасць вобраза, адчуваецца, што тут мы маем справу з рэальным Глінскім, такім, якім яго бачыў Герберштайн. Несумненна, выхаванне на нямецкім двары ў многім паспрыяла развіццю і ўдасканаленню яго асобы. Але для гэтага ён мусіў мець добрыя задаткі, якія былі ў яго ад нараджэння і якія ён атрымаў ад сваіх продкаў.

Якой жа была постаць князя Міхаіла Глінскага? Пра гэта могуць прыблізна сведчыць два малюнкі ў люблянскім экзэмпляры нямецкамоўнага выдання «Масковіі» 1557 г. Абодва малюнкі зробленыя непрафесійнай рукой, надзвычай схематычна і ўмоўна. Цяжка сказаць, хто быў іх аўтарам. Няма ўпэўненасці ў тым, што яны былі зроблены ўладальнікамі экзэмпляра — крайнскім ваенным сакратаром Андрэем Неглічам або Леанардам Кранцам. Ва ўсялякім разе, іх аўтарам павінен быў быць чалавек, звязаны з дваром Габсбургаў, які, калі нават не ведаў асабіста князя Міхаіла, меў пэўнае ўяўленне пра яго фізічныя і духоўныя якасці. Можна меркаваць, што, нягледзячы на відавочную схематычнасць малюнкаў, аўтар збольшага здолеў адлюстраваць асобу князя.

---

[334] Herberstein S. Rerum Moscoviticarum Commentarii... S. 347—348.

[335] Decius I. De Sigismundi regis temporibus. Cracoviae, 1521. P. 117.

[336] Herberstein S. Rerum Moscoviticarum Commentarii... S. 347—348.

Малюнак знаходзіцца на нахзацы перад трэцяй старонкай вокладкі[337]. Глінскі паказаны да плеч. Гэта чалавек сярэдняга веку. Такім прыблізна і мусіў быць князь Міхаіл падчас бітвы пад Клецкам 1506 г. або ў першыя гады эміграцыі ў Масковію. На малюнку ён мае доўгія валасы, бакенбарды, але не мае вусоў. На галаве шапка з круглым верхам, над якой узвышаецца лацінскі роўнаканцовы крыж. Ад падбародка апускаецца ланцужок медальёна. Другі малюнак знаходзіцца ў правым полі тэксту, у якім апавядаецца пра Міхаіла Глінскага. Апошні паказаны ў поўны рост, хоць і непрапарцыянальна (галава складае трэцюю частку фігуры). Як і першы, другі малюнак таксама адлюстроўвае доўгавалосага чалавека з бакенбардамі без вусоў. На галаве шапка з круглым верхам, над якім узвышаецца амаль такі ж лацінскі роўнаканцовы крыж. На самой шапцы адлюстравана тры крыжы, па баках маюцца яшчэ два. На грудзях вісіць медальён. Глінскі апрануты як нямецкі кнехт: шытая куртка, кароткія штаны, чаравікі з «бантамі». У правай руцэ ён трымае дзіду.

Нягледзячы на ўмоўнасць малюнкаў, кожны адлюстраваны на іх элемент, кожная дэталь маюць асаблівае значэнне і сэнс, дазваляюць зрабіць пэўнае ўяўленне пра персону князя. Форма шапкі можа сведчыць пра княскае паходжанне Глінскага. Крыж на яе версе сімвалізуе прыналежнасць да рымска-каталіцкай царквы. Вопратка і ўзбраенне сведчаць пра яго выхаванне ў Германіі, службу ў якасці ландскнехта ў войску імператара Максіміліяна. Медальён на грудзях характарызуе ўплывовасць і знатнасць асобы Міхаіла Глінскага. У XVI ст. традыцыя нашэння памятных медалёў і манет была надзвычай распаўсюджанай сярод магнатаў і вяльможаў у Германіі і Польшчы. Як прадстаўнік вышэйшай арыстакратыі ВКЛ, князь Міхаіл не стаў выключэннем з гэтага правіла. Хутчэй за ўсё, ён насіў на шыі медаль з выявай асабістага герба, які ўяуляў сабой лілію, і нямецкамоўным надпісам у якасці легенды: «Herzog Michel Lintzki»[338]. Нарэшце, абодва малюнкі перадаюць псіхалагічнае аблічча князя Міхаіла Львовіча Глінскага. Погляд нашага героя прамы і мэтанакіраваны, ён адлюстроўвае яго рашучасць, упэўненасць, нават самаўпэўненасць.

Здаецца, што ўлетку 1506 г. у кіраўніцтве ВКЛ толькі адзін чалавек — надворны маршалак Міхаіл Глінскі — быў здатны вырашыць

[337] Герберштейн С. Записки о Московии: В 2 т. / Под ред. А. Л. Хорошкевич. Т. 2: Статьи, комментарии, приложения, указатели, карты. Москва, 2008. С. 230.

[338] Гл. апісанне пячаткі Міхаіла Глінскага на акце уніі 1501 г. (AU. S. 132). У кастрычніку 1998 г. у часе працы аўтара ў бібліятэцы Чартарыйскіх у Кракаве пячатка Глінскага на дакуменце адсутнічала.

зыход супрацьстаяння з крымскімі татарамі на карысць Айчыны. Для гэтага ён меў усе неабходныя якасці, набытыя праз выхаванне і адукацыю. Не дзіўна, што Герберштайн звязвае перамогу над татарамі пад Клецкам выключна з асобай Глінскага. Невыпадкова, што ўслед за характарыстыкай асобы свайго героя аўтар згадвае пра перамогу апошняга над татарамі: «Tartaros, Alexandro rege imperante, insigni clade profligaverat: neque a Vitoldi morte, Lithvuani tam praeclaram victoriam unquam reportarunt»[339] (У праўленне караля Аляксандра ён нанёс надзвычай моцную паразу татарам; ніколі ад часу смерці Вітаўта літвіны не атрымлівалі такой бліскучай перамогі над татарамі).

### 4.6.4. Стаўленне героя да смерці

Калі чытаеш жыццяпіс Глінскага, не пакідае ўражанне, што гаворка ідзе пра надзвычай неардынарнага чалавека, аўтар добра разумее, што мае справу з надзвычай складанай і супярэчлівай натурай, і намагаецца па мажлівасці перадаць чытачу асаблівасці яго асобы. Калі Герберштайн перадае дзёрзкі адказ князя Міхаіла вялікаму князю маскоўскаму Васілю пасля таго, як ён быў схоплены маскоўскай вартай пры спробе вярнуцца ў ВКЛ, адчуваецца, што тут, нягледзячы на мадэльнасць усяго эпізоду, гучыць голас сапраўднага Глінскага: «ich hab den tod nie gefürcht, und noch nit, ain mal muess ich ye sterben, die seel aber steet in deiner macht nit»[340]. Калі Герберштайн апісвае выпадак з Забярэзінскім у велікакняскім палацы, дзёрзкую размову Глінскага з Жыгімонтам Старым, мы ўлаўліваем водгук рэальных падзей, хоць і падпарадкаваных пэўнай мадэлі. Аўтар глыбока перакананы, што ўсялякай спробе ўкласці постаць Глінскага ў пракруставы ложак нейкай схемы наканавана пацярпець няўдачу. Асобе Глінскага цесна ў схеме; яна імкнецца вырвацца адтуль. Пры жыцці ён быў надзвычай неардынарнай асобай, каб яго індывідуальнасць пазбегла ўвагі сучаснікаў і не знайшла адлюстравання на старонках літаратурных твораў.

### 4.6.5. Міхаіл Глінскі ў коле сям'і

Акрамя прыдворнага грамадства, існаваў яшчэ адзін асяродак, які мусіў моцна паўплываць на асобу Міхаіла Глінскага. Гэта была яго сям'я, а дакладней яго род. У свой час Жак Лё Гоф, перайначыўшы фразу Марка Блока, пісаў, што кожны чалавек падобны не толькі на

[339] Herberstein S. Rerum Moscoviticarum Commentarii… S. 348.

[340] Тамсама. S. 346—347.

ўласны час, але і на час сваіх бацькоў[341]. Можна сказаць, што Глінскі мусіў быць падобным на час сваіх продкаў, дзядоў і прадзедаў. На жаль, як ужо адзначалася вышэй, пра яго бацьку мала што вядома.

Безумоўна, на яго характар і нораў мусіла моцна паўплываць кроўная спадчына Кіятавічаў-Мамаевічаў, з роду якіх выйшла мноства таленавітых людзей. Не выключана, што здольнасці князя Міхаіла як вайсковага камандзіра паходзілі ад яго далёкіх продкаў, у тым ліку ад Мамая, які быў здатным военачальнікам. Нарэшце, трэба ўлічваць пачатковую адукацыю і выхаванне, якія Міхаіл атрымаў на двары Храптовічаў.

Сямейнае выхаванне мусіла несці ў сабе адбітак рыцарскага духу. У родзе Глінскіх мусілі трывала захоўваць памяць пра далёкіх продкаў. Асаблівай пашаны быў, мабыць, удастоены князь Мамай. Ва ўласнай сям'і, а таксама ў сям'і Храптовічаў Глінскі мусіў атрымаць першыя навыкі і веды, неабходныя для будучай кар'еры. Малады Міхаіл быў дастаткова добра падрыхтаваны для працяглай «стажыроўкі» на дварах Еўропы.

### 4.6.6. Глінскі і бліжэйшыя сваякі: Храптовічы

Асаблівую ролю ў выхаванні маладога Міхаіла павінен быў адыграць гаспадарскі маршалак Ян Літавор Храптовіч, дзякуючы якому, як кажа пазнейшая легенда, ён трапіў на двор Габсбургаў. Якое ж выхаванне мог атрымаць Міхаіл на двары Храптовічаў? Улічваючы грамадскую функцыю Яна Літавора як прыдворнага караля Казіміра, а пасля і вялікага князя Аляксандра, гэта мусіла быць выхаванне з разлікам на будучую кар'еру ў якасці велікакняскага слугі. Ужо з маленства Міхаіл павінен быў засвойваць вытанчаныя манеры і звычаі.

У сядзібе Храптовічаў у Шчорсах Міхаіл выхоўваўся сярод чароўнай, яшчэ напалову дзікай прыроды Панямоння. Ён часта бываў у векавых дубровах або шпацыраваў уздоўж жытнёвых палеткаў. Багатая і разнастайная прырода Панямоння спрычынілася да развітога ўяўлення і ўражлівасці падлетка.

*Бор паказаць абяцаў я — вось там асалода*
*Вашаму сэрцу і воку, усё першародства*
*Скарбаў прыроды, спрадвечнай яе прыгажосці:*
*Дрэў, не кранутых сякерай, і траў нестаптаных,*
*Безліч дзічыны і звера чароды на пашы.*

[341] Herberstein S. Rerum Moscoviticarum Commentarii… S. 188.

*Пушча сваёю красой захапляе і яснавяльможных*
*Военачальнікаў нашых, што проста з паходаў*
*Сталі бівакам у ёй, жаўталістай, на промысел звера.*
*Тут адпачынак і дзейнасць спалучацца трапна*
*І паразвеюць навалу з душы*[342].

У выхаванні маладога Міхаіла важнае месца мела фізічная падрыхтоўка. Каб загартаваць цела юнака, Ян Літавор Храптовіч рана пачаў браць таго з сабой на паляванне. Тым больш, што непадалёк ад Шчорсаў, на правым беразе Нёмана, знаходзілася багатая дзічынай Налібоцкая пушча. У лясных пераходах, звярыных аблавах, праследаванні звера мужнеў характар Міхаіла, дужэла яго цела. Ён авалодаў разнастайнай зброяй: мусіў навучыцца добра страляць з лука, кідаць дзіду, валодаць мушкетам. Паляванне на звера, у тым ліку, на зубра і тура — волатаў літоўскіх пушчаў — выхавала ў юнаку адвагу, спрыт, назіральнасць, чуйнасць.

*Дзіўнага шмат выпадала пабачыць мне ў лесе,*
*Большага дзіва, чым тое, калі звар'яцела*
*Зубр на ахвяру нясецца з падскокам, не бачыў.*
*Кроў ледзянее, як глянеш, якая ў ім ярасць!*
*Лоўчы злаўчыцца, адскочыць, схінецца за дрэва —*
*Міма прамчыць, апантаны, агледзіцца, стане,*
*Чмыхае пысай храпастай і ў безлічы пахаў*
*Нюхам уловіць дыханне і пах чалавека.*
*Што чалавека? Усё, што прыкметы жывога*
*Мае ў сабе і няхай хоць чыі-небудзь праявіць,*
*Зараз жа стопча, збадзе, разарве на кавалкі*[343].

Акрамя палявання, юны Міхаіл мусіў таксама ўдзельнічаць у конных гонках, якія ладзіла мясцовае баярства. Удзельнікі спаборніцтваў павінны былі на конях адолець пэўную дыстанцыю. З маладых гадоў Міхаіл прызвычаіўся да такога роду саперніцтва.

*Слаўныя забаўкі — конныя гонкі, напрыклад.*
*Князь паважаў іх, як школу для мужных і смелых.*
*Цэль вызначалі за сотню стадый, і кожны*

[342] Гусоўскі М. Песня пра зубра. С. 73—74.
[343] Тамсама. С. 88—89.

*Удзельнік саперніцтва рваўся на сівым мустангу*
*Першым адолець дыстанцыю. Цэлыя вёскі*
*Гналіся ў скачках, бо лепшы праявіцца ў масе.*
*Вось па чарзе табунамі галопам узялі,*
*Лётам лятуць — толькі тупат ды грывы па ветры.*
*Чуйны скакун гаспадарскі намёк разумее*
*З першага знаку, і бачыш, як ён вокамгненна*
*Спіну падставіў. Ты вокам зміргнуць не паспееш —*
*Скочыў сусед на суседа: змяніліся коньмі.*
*Толькі і згледзіш, як стрэл апярэнні з калчанаў*
*Накрыж жахнуліся; коннікі з гіканнем зніклі.*
*Гонкі такія наладжвалі ў цёмныя ночы*
*Гуртам, каб мужны ахвоты паддаў баязліўцу,*
*А баязлівец, не бачачы страху, раўняўся*[344].

Больш складаным спаборніцтвам лічылася пераправа на кані праз раку. Неаднаразова прыходзілася Міхаілу пераплываць з канём Нёман у самых небяспечных месцах.

*Многа цяжэйшай была закладная, хто першы*
*Уброд на кані пераедзе раку без абходу*
*Плыні падводнай, віроў і трыснёгаў на тонях.*
*Ветраным днём, калі ў повень вялікія воды*
*Хвалямі коцяць на бераг, з'язджаліся к рэкам*
*Коннікі з вёсак вакольных, ушчунуць стыхію.*
*Звычаем конных было: і калчаны, і лук свой*
*Звязваць у вузел з адзеннем, каб, недзе на грыве*
*Сіўкі свайго ці буланага добра ўмасціўшы,*
*Самы быстрак пераплыць і сухімі даставіць.*
*Боская воля! Нібы на вадохрышчы колісь*
*Рынулі з берага голыя людзі на конях.*
*Бачыш — плывуць, пахаваўшыся ў плыні па шыі,*
*Толькі чутно, як пафыркваюць коні, а хлопцы*
*Боўтаюць нараўні з коньмі. Угледзішся — праўда:*
*Правай рукой учапіліся ў грыву, а левай*
*Горнуць, грабуць пад сябе белагрывыя хвалі.*
*Плёсу ж канца не відно, і з паўмілі да мелі*[345].

[344] Гусоўскі М. Песня пра зубра. С. 97—98.
[345] Таксама. С. 98.

### 4.6.7. Глінскі і гаспадар

Міхаіл Глінскі мог патрапіць на велікакняскі двор дзякуючы падтрымцы сваіх старэйшых братоў, гаспадарскіх дваран Івана і Васіля. Асабістае знаёмства з вялікім князем Аляксандрам Казіміравічам маладому Міхаілу мог забяспечыць яго выхавацель, надворны падскарбі і гаспадарскі маршалак Ян Літавор Храптовіч, які быў даверанай асобай гаспадара і адыгрываў выключную ролю на гаспадарскім двары. Першы асабісты кантакт Міхаіла Глінскага з гаспадаром мусіў адбыцца яшчэ ў самым пачатку панавання Аляксандра Казіміравіча, да ад'езду Міхаіла ў працяглую замежную вандроўку. Можна меркаваць, што яго падарожжа ў Святую Рымскую імперыю і знаходжанне на двары імператара Максіміляна не магло адбыцца без падтрымкі самога гаспадара і яго маці, аўстрыйскай прынцэсы Альжбеты.

Сваёй імклівай палітычнай кар'еры Міхаіл Глінскі быў абавязаны, несумненна, рыцарскай адукацыі, якую ён атрымаў на двары імператара Святой Рымскай імперыі Максіміляна Габсбурга. Заваяваць давер вялікага князя Глінскаму дапамаглі вострыя розум, а таксама вытанчаныя манеры і, верагодна, веданне некалькіх замежных моў. Збліжэнню вялікага князя Аляксандра Казіміравіча і Міхаіла Глінскага спрыяў і той факт, што апошні мусіў быць не на шмат маладзейшы за гаспадара.

Імклівае ўзвышэнне Міхаіла Глінскага пачалося ўвосень 1500 г., калі ён быў прызначаны на вакантную пасаду надворнага маршалка. Неўзабаве Глінскі здолеў стаць найбліжэйшым дарадцам вялікага князя Аляксандра. Дасведчанасць Глінскага ў еўрапейскіх справах, добрае веданне ім людской псіхалогіі, уменне хутка арыентавацца ў зменлівых абставінах прыдворнага жыцця, здольнасць хутка знайсці правільны адказ на складанае пытанне з цягам часу зрабілі надворнага маршалка пастаянным кампаньёнам вялікага князя. Здольнасць Глінскага да жарту толькі прыбаўляла яму аўтарытэту. Увогуле, як адзначаў Герберштайн, гэта быў чалавек на ўсякі момант.

Прызначэнне Міхаіла Глінскага на пасаду надворнага маршалка папярэднічала адказнай дыпламатычнай місіі ў Венгрыю ў снежні 1500 г. Ён быў высланы туды ўладамі ВКЛ з мэтай заручыцца падтрымкай караля Уладзіслава Ягелона ў барацьбе з Масквой. Міхаіл Глінскі, які толькі што вярнуўся з Германіі, як ніхто іншы з радных паноў ВКЛ падыходзіў да гэтай місіі. Вялікі князь Аляксандр разлічваў на шырокія сувязі Глінскага з дарадцамі Уладзіслава Ягайлавіча, а таксама яго асабістае знаёмства з венгерскім каралём. У цэлым місія

прайшла паспяхова, і венгерскі кароль Уладзіслаў Ягайлавіч пагадзіўся быць пасярэднікам у мірных перагаворах паміж Літвой і Масквой.

Акрамя дыпламатычных даручэнняў Міхаіл Глінскі звычайна выконваў дарадчыя функцыі. Пасада надворнага маршалка вымагала ад Глінскага амаль сталай прысутнасці на двары і рэгулярнага кантакту з гаспадаром. З цягам часу, асабліва пасля 1503 г., Глінскі ператварыўся ў галоўнага дарадцу Аляксандра Казіміравіча. Ён ледзь не паўсюдна суправаджаў вялікага князя, як у Літве так і за яе межамі. Гаспадар кансультаваўся з Глінскім амаль па ўсіх істотных пытаннях дзяржаўнага жыцця, часам насуперак волі вышэйшых саноўнікаў ВКЛ. Гэта акалічнасць сур'ёзна зблізіла гаспадара і яго дарадцу, але адначасова сапсавала адносіны Глінскага з асобнымі раднымі панамі.

Сведчаннем асаблівага даверу з боку гаспадара стала прызначэнне надворнага маршалка ў пачатку 1506 г. кіраўніком віленскага манетнага двара (меніцы). За той час (прыблізна год), калі Глінскі кіраваў манетным дваром, яго прыбытковасць істотна ўзрасла. Вялікі князь высока ціаніў здольнасці Міхаіла Глінскага як адміністратара. У якасці ўцянскага, мерацкага і бельскага намесніка надворны маршалак спрычыніўся да сацыяльна-эканамічнага развіцця даверaных яму тэрыторый. Вялікі князь не сумняваўся таксама ў ваенных здольнасцях Міхаіла Глінскага. Менавіта яму гаспадар даручыў кіраванне войскам перад абліччам татарскага нападу ўлетку 1506 г.

У гістарычных крыніцах па-рознаму ацэньваецца характар адносін паміж Міхаілам Глінскім і Аляксандрам Казіміравічам. Варта адзначыць, што непасрэдныя пісьмовыя сведчанні па гэтым пытанні нешматлікія, калі не сказаць адзінкавыя. Акрамя таго, яны паходзяць пераважна ад трэціх асоб, што пакінулі свае запісы ў значна пазнейшы час. Так, Хроніка Быхаўца называе надворнага маршалка не інакш як *мілоснікам* (фаварытам) Аляксандра Казіміравіча. Цікава, што гэтым эпітэтам у хроніцы ўзнагароджаны таксама адзін са слуг вялікага князя Жыгімонта Кейстутавіча Слаўка, які да апошняга абараняў свайго ўладара перад змоўшчыкамі.

У лацінамоўным выданні Герберштайна 1549 г., калі гаворка ідзе пра адносіны Глінскага з Аляксандрам Казіміравічам, выкарыстоўваецца тэрмін «autoritas», а ў нямецкамоўным выданні 1557 г. — «Verhalten». Абодва тэрміны могуць быць даслоўна перакладзеныя як давер або вера. Несумненна, што ў час, калі Герберштайн пісаў сваю «Масковію», тэрмін «Verhalten» разам з блізкімі па семантыцы тэрмінамі ўжо паспеў стаць ключавым у тагачаснай еўрапейскай палітычнай камунікацыі. Але ў Сярэднявеччы, у тым ліку і на мяжы

XV і XVI стст., для характарыстыкі адносін, заснаваных на даверы, выкарыстоўваўся зусім іншы тэрмін — «fides», якому ў славянскіх мовах мусіла адпавядаць паняцце «вера». Гэты тэрмін не быў канкурэнтам для «Verhalten» або «autoritas». Значыць, адносіны даверу былі распаўсюджаны ў Сярэднявеччы, але іх змест выражаўся іншымі, чым у Новы час, тэрмінамі[346].

У святле сказанага можна меркаваць, што тэрмін «мілоснік» толькі скажае характар і змест адносінаў паміж Міхаілам Глінскім і вялікім князем Аляксандрам. З іншага боку, няма сумнення, што згаданы Слаўка сапраўды з'яўляўся гаспадарскім мілоснікам, бо іх адносіны былі пабудаваны на ласцы або міласці гаспадара. Сваім узвышэннем Слаўка быў абавязаны выключна гаспадарскай ласцы. У выпадку з Глінскім становішча было адваротным: досвед і здольнасці князя сталі непасрэднай прычынай яго ўзвышэння на велікакняскім двары. Замежныя крыніцы, у першую чаргу, нямецкія (Дэцый, Герберштайн), пры апісанні гісторыі Глінскага спачатку падрабязна спыняюцца на яго асабовых якасцях і талентах. Толькі пасля гэтага яны пераходзяць да асвятлення фактаў яго кар'еры на двары вялікага князя Аляксандра.

У выпадку з характарыстыкай Глінскага гаспадарскім мілоснікам, як падаецца, размова не ішла пра свядомую спробу прынізіць асобу некалі магутнага вяльможы. Хутчэй за ўсё, справа ў нявызначанасці тагачаснай палітычнай тэрміналогіі ВКЛ, у несвядомай блытаніне паняццяў. Да таго ж, у Новы час, бліжэй да сярэдзіны XVI ст., паўсюль у Еўропе давераная асоба страчвае сваё значэнне як істотны элемент персаналізаванай улады. Паступова, са станаўленнем манархіі Новага часу і з развіццём бюракратычнага апарату, яна ператвараецца ў міністра. Не дзіўна, што ва ўмовах, калі давераная асоба страціла сваё значэнне на двары, яна пачала атаясамлівацца, хоць і несправядліва, з фаварытам ці «мілоснікам»[347]. Пра тое, што працэс заняпаду персаналізаванай улады мусіў закрануць абшары ВКЛ, ускосна сведчыць Хроніка Быхаўца.

[346] Hirschbigel J. Nahbeziehungen bei Hof-Manifestationen des Vertrauens? Karriere in reichsfürstlichen Diensten am Ende des Mittelalters (ungedruckte Habiliationsdissertation). Kiel, 2011. S. 55.

[347] Hirschbigel J. Nahbeziehungen bei Hof-Manifestationen… S. 255.

# Заканчэнне

5 жніўня 1506 г. адбылася знакамітая падзея. На полі пад Клецкам, у міжрэччы Лані і Сільны, сустрэліся два войскі. Першым кіраваў надворны маршалак вялікага князя літоўскага Аляксандра, князь Міхаіл Львовіч Глінскі, другім — сыны крымскага хана Менглі-Гірэя, султаны Бурнаш і Біці-Гірэй. Гэтая сустрэча была ў значнай ступені выпадковай. Пасля спустошальнага татарскага набегу на землі ніжняга і сярэдняга Панямоння ўлетку 1505 г. кіраўніцтва дзяржавы не чакала паўторнага нападу крымскіх татараў на цэнтральныя землі ВКЛ у наступным 1506 г. На думку польскага кіраўніцтва, галоўная небяспека ад татараў пагражала ў новым годзе землям Малой Польшчы і Русі. Перад сваім ад'ездам у ВКЛ у сакавіку 1506 г. кароль і вялікі князь Аляксандр Казіміравіч адобрыў шэраг мерапрыемстваў абарончага характару. Летам гэтага года на дапамогу рускім землям Кароны быў накіраваны корпус на чале з надворным маршалкам ВКЛ князем Міхаілам Глінскім. Ужо на маршы з Вільні ў Ліду Глінскі атрымаў вестку, што вялізнае крымскае войска ўварвалася на землі ВКЛ і рухаецца ў напрамку Навагародка. Тэрмінова было прынята рашэнне рухацца ў бок Навагародка на пошукі праціўніка. Раптоўнае з'яўленне вялікага татарскага войска ў ніжнім Панямонні было поўнай нечаканасцю для надворнага маршалка, але і ў татарскіх военачальнікаў прысутнасць у рэгіёне адмабілізаванага гаспадарскага войска мусіла выклікаць сапраўдны шок. Пасля спустошальнага набегу 1505 г. крымска-татарскае кіраўніцтва не спадзявалася сустрэць тут арганізаваны адпор. Тым лягчэй, на думку ўлад Крыма, было змусіць кіраўніцтва ВКЛ да сур'ёзных палітычных саступак шляхам вайсковай выправы.

З'яўленне вялікага гаспадарскага войска на чале з Міхаілам Глінскім парушыла ўсе планы татараў. У абцяжараных вялікім палонам татараў не засталося іншага выйсця, як прыняць бітву. Ход і характар бітвы пад Клецкам шмат у чым тлумачацца асобай і талентам надворнага маршалка Міхаіла Глінскага. Што было б, каб у ліпені 1506 г. каля паміраючага караля Аляксандра не аказалася яго фаварыта? Ці адбылася б увогуле бітва? Якім быў бы яе ход, змест і вынік? Я разумею, што мінуўшчына не церпіць умоўнага

ладу. Але, тым не менш, я дазволю сабе паставіць падобныя пытанні, бо занадта шмат у гэтых падзеях было завязана на асобе надворнага маршалка. Няма сумненняў, што ўвага наступных пакаленняў да бітвы пад Клецкам 1506 г. была ў значнай ступені выклікана тым, што на чале войска ВКЛ стаяла такая незвычайная і супярэчлівая постаць, як Міхаіл Глінскі. Пазнейшыя аўтары глядзелі на падзею праз прызму асобы князя Міхаіла. Цікавасць да бітвы тлумачыцца таксама тым, што яна папярэднічала драматычным падзеям, у якіх Глінскі прыняў самы актыўны ўдзел. Гэтыя падзеі ў значнай ступені змянілі не толькі яго лёс, але і адносіны ўнутры шляхецкага грамадства ВКЛ. Менавіта гэтымі акалічнасцямі тлумачыцца тое, што я дазволіў сабе так падрабязна даследаваць біяграфію Міхаіла Глінскага ад ранняга дзяцінства да эміграцыі ў Маскву ў 1508 г. Каб лепей зразумець паводзіны князя Міхаіла ўлетку 1506 г., мне прыйшлося пільна ўгледзецца ў яго дзіцячыя і юнацкія гады.

У значнай ступені дзякуючы Глінскаму бітва 1506 г. (хоць яна і не ўстрымала далейшыя татарскія напады на землі ВКЛ) адыграла важную ролю ў развіцці ваеннай справы ў ВКЛ. Як военачальнік Міхаіл Глінскі паспрабаваў прыўнесці ў бітву новыя элементы, сведкам якіх ён быў у часе службы ў войску рымскага караля Максіміліяна Габсбурга і саксонскага курфюрста Альбрэхта Веціна. Менавіта пад Клецкам у 1506 г. быў апрабаваны шэраг новых мерапрыемстваў ваенна-аператыўнага зместу, якія былі часткова рэалізаваны ў пазнейшыя часы. Несумненна, ад часу Клецкай бітвы пачалося больш актыўнае выкарыстанне агнястрэльнай зброі і артылерыі ў палявых умовах. Узрасло таксама значэнне інжынерна-тэхнічнай думкі. Новыя віды войска, такія як лёгкая конніца, бліскуча зарэкамендавалі сябе пад Клецкам. Адсюль пачаўся яе ўзыход. У далейшым лёгкая кавалерыя, правобраз будучай гусарыі, будзе адыгрываць усё большую ролю ў дзеяннях на паўднёвым і ўсходнім франтах. Дзякуючы ёй змаганне стала больш манеўраным і рухомым. Рэзка ўзрос тэмп баявых сутыкненняў. Бітва пад Клецкам 1506 г. — гэта трыумф такіх новых тэхнічных сродкаў, як агнястрэльная зброя і артылерыя. Але, самае галоўнае, бітва засведчыла ўзрослае значэнне асобы военачальніка, яго фізічных і маральных якасцей. Ад яго патрабавалася здольнасць правільна ацаніць становішча перад бітвай, а пасля хутка прыняць рашэнне адносна тактыкі і спосабу вядзення бою. Не апошняе значэнне мела асабістая мужнасць вайсковага правадыра. Ва ўмовах, што склаліся ў ВКЛ у пачатку XVI ст., лепш за ўсё на гэтую ролю падыходзіў

менавіта князь Міхаіл Глінскі. Нарэшце, ужо незалежна ад асобы і характару Глінскага, бітва пад Клецкам 1506 г. паклала пачатак новай катэгорыі бітваў у ваеннай гісторыі ВКЛ — жорсткіх, бязлітасных, крывавых, з вялізнымі стратамі з абодвух бакоў. Клецк азнаменаваў растучы поступ мілітарызацыі ВКЛ, што знайшло адлюстраванне ў павелічэнні выдаткаў на вайну і зменах у свядомасці насельніцтва дзяржавы. Грамадства ВКЛ паступова прызвычаілася глядзець на навакольны свет праз прызму ваеннага супрацьстаяння. Узрасла нецярпімасць, нават ксенафобія, да розных народаў і этна-канфесійных груп насельніцтва, у першую чаргу, да маскавітаў і крымскіх татар. На гэтую нецярпімасць у другой палове XVI ст. наклалася ўнутранае міжканфесійнае супрацьстаянне ў ВКЛ, глеба для якога была падрыхтавана ў папярэднія часы. Нарэшце, з Вядрошы і Клецка пачалася амаль суцэльная паласа войнаў, якія доўжыліся амаль усё XVI ст.

Асабісты фактар моцна паўплываў на вобраз, які бітва 1506 г. мела ў свядомасці сучаснікаў і наступных пакаленняў. Пакуль Глінскі лічыўся здраднікам Айчыны, яго заслугі замоўчваліся або прыпісваліся іншым. Але заслуга князя Міхаіла ў Клецкай бітве была настолькі відавочнай, што яе нельга было цалкам абысці ўвагай. Каб неяк зменшыць ролю Глінскага ў перамозе, ідэолагам ВКЛ на чале з канцлерам Альбрэхтам Гаштаўтам прыйшлося пайсці на прыніжэнне гістарычнага значэння самой бітвы. Больш таго, гэтыя асобы сцвярджалі, што лаўры пераможцы Глінскаму дасталіся выпадкова. Ім удалося пераканаць шляхецкае грамадства ВКЛ і Кароны, што з самага пачатку гаспадарскае войска ўзначальваў не Глінскі, а гетман Станіслаў Кішка, і толькі пасля таго, як апошні захварэў, паны перадалі кіраванне войскам надворнаму маршалку. Увогуле, тагачасныя летапісы і хронікі ВКЛ, укладанне якіх знаходзілася пад моцным уплывам усё таго ж Гаштаўта і біскупа Паўла Гальшанскага, абмяжоўваліся звычайна ўсяго некалькімі радкамі пра Клецкую бітву 1506 г. Цэнзура адносна асобы князя Міхаіла Глінскага існавала і ў суседняй Польшчы, звязанай з ВКЛ вузамі дынастычнай уніі. Тым не менш, нягледзячы на ідэалагічны дыктат кароннага канцлера Яна Ласкага, Бернарду Вапоўскаму ўдалося данесці да грамадства сапраўдную ролю Глінскага ў бітве.

Толькі пасля зыходу з палітычнай арэны стваральнікаў «чорнай» легенды Глінскага, пачаўся паступовы працэс яго рэабілітацыі. Важную ролю тут адыграў нямецкі дыпламат і пісьменнік Жыгімонт Герберштайн, які з сімпатыяй ставіўся да былога

надворнага маршалка. З прыходам у сярэдзіне XVI ст. на вяршыню ўлады ў ВКЛ новых асоб (Радзівілы, Хадкевічы) знікла патрэба замоўчвання асобы і ўчынкаў Глінскага. Клецкая перамога 1506 г. стала разглядацца як адна з слаўных перамог літоўскай зброі, а да Міхаіла Глінскага пачалі ставіцца як да аднаго з самых таленавітых военачальнікаў ва ўсёй гісторыі ВКЛ. Такі погляд на бітву знайшоў адлюстраванне ў Хроніцы Быхаўца, а пазней і ў Хроніцы Мацея Стрыйкоўскага. Тым не менш, новая інтэрпрэтацыя бітвы, якая цалкам упісвалася ў тагачасную шляхецкую ідэалогію, не была вольнай ад старых стэрэатыпаў. Так, аддаючы належнае таленту і здольнасцям князя Міхаіла, шляхецкія аўтары другой паловы XVI ст. цалкам пераняліі стары тэзіс аб тым, што войска ВКЛ з самага пачатку ўзначальвалі вялікі гетман Станіслаў Пятровіч Кішка і надворны маршалак Міхаіл Глінскі, і толькі тады, калі першы раптоўна захварэў, паны даручылі камандаванне войскам апошняму. Увогуле, той вобраз бітвы, які прысутнічае ў абодвух творах, адлюстроўвае сацыяльныя, палітычныя, культурныя і нават геаграфічныя рэаліі другой паловы XVI ст. Гэтаму вобразу Клецкай бітвы было наканавана надзвычай доўгае жыццё. Ён быў амаль цалкам успрыняты наступнымі пакаленнямі літоўскіх гісторыкаў, уключаючы Віюка Каяловіча, і, дзякуючы пашыранаму распаўсюджанню розных спісаў Хронікі Быхаўца, трывала замацаваўся ў гістарычнай памяці шляхецкага саслоўя XVII—XVIII стст.

Пачынаючы з другой паловы XVI ст. паўсюль — на маршы, у вайсковым стане, перад бітвай — воінаў ВКЛ натхняў вобраз слаўнай перамогі пад Клецкам. Бітва 1506 г. (у значнай ступені, прадукт уяўлення пазнейшых пакаленняў) стала адным з месцаў памяці шляхецкага грамадства ВКЛ і Рэчы Паспалітай. Разам з іншымі перамогамі вобраз клецкай вікторыі вызначаў гістарычную самасвядомасць шляхецкай супольнасці дзяржавы, якая атаясамлівала сябе, у першую чаргу, з рыцарствам. Для шляхты ВКЛ перамога пад Клецкам 1506 г. з'яўлялася магутным фактарам ідэнтыфікацыі, саслоўнай прыналежнасці.

Выяўленне і публікацыя Хронікі Быхаўца ў 1846 г. вядомым гісторыкам Літвы Тэадорам Нарбутам засведчыла растучы інтарэс культурнай грамадскасці Літвы і Беларусі да гістарычнай мінуўшчыны краю, у тым ліку і да Клецкай бітвы 1506 г. Распаўсюджанне ідэй гістарызму, бурнае развіццё ў апошнія дзесяцігоддзі XIX ст. гістарычнай навукі ў Расійскай імперыі спрыялі пошуку кожным сацыяльным суб'ектам (саслоўе, клас і інш.)

для легітымацыі свайго стану сваіх гістарычных каранёў. Клецкая мяшчанская супольнасць, даўняя мемарыяльная традыцыя якой была практычна разбурана ў сярэдзіне XIX ст., спрабавала захаваць тое, што засталося ад старой памяці, ад старых успамінаў. У гэтым ёй дапамаглі краязнаўцы і прафесійныя гісторыкі, якія аднаўлялі гісторыю горада. Дзякуючы ім з другой паловы XIX ст. гісторыя Клецка пачала атаясамлівацца з бітвай 1506 г. Больш таго, паступова перамога рыцарскага войска ВКЛ над крымскімі татарамі была ўзведзена ў ранг галоўнай падзеі шматвяковай гісторыі горада. Для жыхароў Клецка, які ў другой палове XIX ст. уяўляў сабой занядбанае мястэчка, гэта павінна было падняць прэстыж іх горада, пацвердзіць яго гістарычную значнасць. Так паступова, пачынаючы з другой паловы XIX ст., сталі з'яўляцца перадумовы для складвання новай гарадской «міфалогіі» Клецка. Прычым самую актыўную ролю ў гэтым працэсе адыграла не сама клецкая грамада і не ўраджэнцы горада, а краязнаўцы і прафесійныя гісторыкі.

У наступным XX ст. гісторыя Клецка ўспрымалася ўжо выключна праз прызму баталіі 1506 г., якая раней (па меншай меры, да сярэдзіны XIX ст.) займала маргінальнае месца ў гістарычнай памяці мясцовых жыхароў. Бачанне мінуўшчыны Клецка, у якім галоўнай падзеяй з'яўляецца бітва 1506 г., не страціла свайго значэння і на пачатку XXI ст.

Гістарычная рэканструкцыя Клецкай бітвы 1506 г. уяўлялася няпростай задачай. Праблема не ў тым, што захаваліся толькі адзінкавыя сведчанні пра гэту падзею. Галоўнай цяжкасцю было тое, што сам аповед пра бітву з'яўляецца такой жа «рэальнасцю», як і сама гэта падзея. Усе ранейшыя спробы аднаўлення ходу бітвы абапіраліся на аповесць пра яе ў версіі Хронікі Быхаўца, якая сама з'яўляецца гістарыяграфічнай канструкцыяй, створанай не менш чым праз 50 гадоў пасля падзеі.

Каб дабрацца да «гістарычнай праўды» пра бітву, аднавіць хоць бы ўмоўна і прыблізна яе першапачатковы вобраз (тут я яскрава ўсведамляю межы гістарычнага пазнання), мне патрэбна было абстрагіравацца ад шматлікіх пазнейшых напластаванняў, розных культурна-гістарычных мадэляў. Спалучэнне традыцыйных метадаў гістарычнага даследавання з метадамі лінгвістыкі, анамастыкі, археалогіі, дапоўненае старанным вывучэннем мясцовага ландшафту, дазволіла мне аднавіць — я гэта асабліва падкрэсліваю — у самых агульных рысах перадумовы і ход бітвы. У працы мне асабліва дапамог укладзены апытальнік. Шукаючы адказы на

пастаўленыя ў анкеце пытанні, старанна і неперадузята апытваючы крыніцы, мне ўдалося адкрыць шэраг дагэтуль невядомых дэталяў.

Першыя сутычкі старожы гаспадарскага войска і аддзелаў мясцовага баярства з татарамі мусілі адбыцца яшчэ 1 (14) жніўня 1506 г., калі асноўныя сілы гаспадарскага войска яшчэ знаходзіліся ў Навагародку. Рашаючая бітва адбылася 5 (18) жніўня 1506 г. на берагах балоцістай рачулкі Сільна, якая з'яўляецца прытокам Лані. Вялікакняскім войскам з самага пачатку камандаваў надворны маршалак Міхаіл Львовіч Глінскі. Вялікага гетмана Станіслава Пятровіча Кішкі ні на полі бою, ні ў войску ўвогуле не было. Прыкладна 7 тысячам воінаў Глінскага супрацьстаялі значна меншыя татарскія сілы (не больш за 3—3,5 тысячы воінаў). Нягледзячы на колькасную перавагу войска ВКЛ, змаганне вызначалася асаблівай упартасцю. Татарскае войска здолела добра падрыхтавацца да падыходу праціўніка. Яно выкарыстоўвала асаблівасці мясцовага ландшафту і рэшткі зруйнаваных у ходзе нападу 1503 г. клецкіх абарончых збудаванняў. Доўгі час ніхто з праціўнікаў не хацеў саступаць. Змаганне адбывалася з пераменным поспехам. Рашаючым аказаўся раптоўны ўдар у тыл татарскаму войску, які быў ажыццёўлены левым флангам вялікакняскага войска. Шэрагі татараў змяшаліся. Неўзабаве яны пад націскам войска ВКЛ пачалі адступаць у бок клецкага дзядзінца. Татары былі адціснутыя да замкавага ставу, у якім многія з іх знайшлі апошні прытулак. Рашаючае змаганне адбылося на тэрыторыі клецкага вакольнага горада. Тут жа галоўныя татарскія сілы здаліся ў палон. Частка татараў на чале з султанамі Бурнашам і Біці-Гірэем здолела вырвацца з акружэння і паспрабавала ўратавацца ўцёкамі. Для большасці з іх непераадольнай перашкодай стала балоцістая рака Цапра. Толькі нямногія здолелі вярнуцца ў Крым. Яшчэ, па меншай меры, тры дні пасля рашаючага змагання адбываліся лакальныя сутычкі з асобнымі татарскімі чамбуламі, якія вярталіся ў кош з нарабаваным дабром і палонам. 8 жніўня ўсё было скончана, а 12 жніўня надворны маршалак Міхаіл Глінскі склаў у Вільні пераможную рэляцыю паміраючаму каралю і вялікаму князю Аляксандру Казіміравічу.

# Крыніцы па гісторыі бітвы

## Ліст Міхаіла Глінскага да вармінскага біскупа Лукаша Ватцэнродэ

Reverendissime in Christo pater et domine graciose et honorande.

Postequam serenissimus princeps et dominus dominus Alexander Dei gratia rex Poloniae, magnus dux Lythwaniae etc. Dominus noster graciossimus, natos imperatoris Przecopiensis duos cum non modico gencium suarum exercitu in magnum ducatum Lithwaniae, eundem vastaturos, ingredi intellexerat, cupiens indemnitati dominiorum et subditorum suorum providere tempestive, certos Lithwanie dominos ac me simul cum eis contra et adversus christiani nominis hostes Tartaros ad resistendum ipsorum ferocitati et tirannidi vigilanter misit et expedivit. Qui iuxta opidum Clyeczko castra metati erant. Ubi Dei optimi gracia et auxilio Regieque Maiestatis fortuna felici aspirante, omnes Tartarorum acies, feria quarta di S. Marie ad Nives aliisque antea et post diebus per unam hebdomadem successive pugnando trans Hlana fluvium, exercitu regio salvo et illeso permanente, nostris instructis aciebus ac ipsorum fortiter resistentibus, totaliter cesi sunt et prostrati; immi, ut existimari potest, duodecim aut tredecim milia hominum citra vel ultra, valde paucis sine equis et armis, aliquibus eciam nudis, in fugam conversi. De fillis vero imperatoris certum non habeo, si vivant aut fugerunt vel occisi sunt. Post eos tamen gentes bene armate ad omnes viarum et aquarum transitus ad intercipiendum fugitivos misse sunt et in prompto expedite; certum habetur

Найшаноўнейшы ў Хрысце айцец і міласцівы і шаноўны ўладар!

Пасля таго, як найяснейшы гаспадар і ўладар, уладар Аляксандр, з Божай ласкі кароль польскі, вялікі князь літоўскі і інш., уладар наш наймiласцівейшы, даведаўся, што двое сыноў перакопскага цара з немалым войскам сваіх людзей уварваліся ў Вялікае Княства Літоўскае, з намерам яго спустошыць, то ён, жадаючы своечасова забяспечыць захаванасць сваіх уладанняў і падданых, пільна паслаў і выправіў супраць ворагаў хрысціянскага імені татараў некаторых літоўскіх паноў і мяне разам з імі, каб мы далі адпор іхняй нахабнасці і свавольству. Яны (татары) сталі кошам каля горада Клецка, дзе з ласкі і заступніцтва найдабрэйшага Бога, а таксама дзякуючы шчаслівай фартуне, якая была на баку Каралеўскай Вялікасці, у сераду, у дзень Святой Марыі Снежнай і ў папярэднія і наступныя дні на працягу аднаго тыдня, у выніку паспяховага змагання за ракой Лань, татарскія войскі былі цалкам разбітыя і знішчаныя каралеўскім аддзелам, які застаўся цэлым і непашкоджаным, і нашым добра абучаным войскам, а таксама праз іхні зацяты супраціў; увогуле, як можна ўстанавіць, каля дванаццаці або трынаццаці тысяч чалавек зусім нешматлікімі (групамі), без коней і зброі, а асобныя

illos non posse evadere quoquomodo. Et ita quidem territi erant hostes et imbeciles facti, ut unus viginti aut triginta fugabat. Homines vero, qui per eos capti erant, omnes salvi ad propria reversi, quorum numerus quadraginta millia hominum excedebat; equos campestres nostri prope triginta millia in predam ceperunt. De hoc igitur tam insigni et felici triumpho laudes et gracias Deo altissimo agendum. Mitto V. R. P. Unum linguarium de captivis Tartarorum, quem V. R. P. A me grata manu suscipere velit rogo, ipsum christianis in spectaculum habiturus, quatenus et ipsi tanti beneficii et victorie memores existentes, gracias et laudes Deo salvatori nostro persolvant. Me tandem V. R. P. Commendo favori et gracie, quam felicissime diu valere cupio.

Datum Vilnae, die Mercurii ante festum Assumpcionis Virginis Marie proximi anno

Domini 1506

Michael dux Hlinsky etc.

(Akta Aleksandra, króla polskiego, wielkiego księcia litewskiego itd. (1501—1506) / Wyd. F. Papée. Kraków, 1927. S. 546—547).

нават голымі, змушаныя былі ратавацца ўцёкамі. Пра сыноў жа цара не маю вестак, жывыя яны або ўратаваліся ўцёкамі ці былі забітыя. За імі аднак услед да ўсіх дарожных і водных пераходаў з мэтай перахопу ўцекачоў былі пасланыя і без прамаруджання выпраўленыя добра ўзброеныя людзі; упэўнены, што яны ніякім чынам не здолеюць уцячы. І вось такім чынам былі застрашаныя ворагі і зрабіліся настолькі безабароннымі, што адзін гнаў дваццаць або трыццаць чалавек. Людзі ж, якія былі захопленыя імі і колькасць якіх перавышала сорак тысяч, усе здаровыя вярнуліся дамоў; у якасці здабычы нашы захапілі каля трыццаці тысяч стэпавых коней. І такім чынам за гэтую бліскучую і шчаслівую перамогу трэба ўзнесці пахвалу і падзяку Найвышэйшаму Богу. Пасылаю Вашай Найшаноўнейшай Вялебнасці аднаго языка з ліку палонных татараў і прашу, каб Вашая Найшаноўнейшая Вялебнасць добразычліва прыняла яго ад мяне, з тым, каб хрысціяне, гледзячы на яго, узносілі падзяку і пахвалу Богу, нашаму збаўцу, пакуль будзе захоўвацца памяць пра само такое дабрадзейства і перамогу. Сябе ж я, нарэшце, аддаю міласці і ласцы Вашай Найшаноўнейшай Вялебнасці, якой я зычу шчыра доўгіх гадоў жыцця.

Дадзена ў Вільні ў найбліжэйшую сераду перад святам Унебаўзяцця Дзевы Марыі ў год ад нараджэння Госпада 1506.

Міхаіл, князь Глінскі.

# Ліст караля і вялікага князя Аляксандра да жыхароў Гданьска

Alexander dei gratia rex Polonie, magnus dux Lituanie, Russie Prussieque dominus et heres

Famosi fideles nostri dilecti. Filli czaris Tartarie fossate duo cum multis ducibus Tatrtaris in multitudine duodecim millium Tartarorum nuper subito insilierant dominium istud nostrum, contra quos dum istius terre populum cum nonnullis curiensibus Polonis felici auspicio direxissemus, conflixerunt cum Tartaris in loco ab hinc triginta milliaribus distanti in campo oppidi Kleczko. Pugnatum est Marte utrimque dubio vicibus multis a die sancti Petri ad Vincula, que erat prima mensis eiusdem diem, qua die quinta, gratia divina prosperante nos, Tartari sunt victoriosissime profligati, cesi fusique, et continuatis in eis qui fuge presidio se dediderant cedibus cruentis, tridecim conflictus commissi erant usque ad diem mensis octavam, qua nostri palma victorie Deo miserante potiti tandem ad nos successive redeunt, spoliea victorie referents. Vinctorum et exuviarum sordidarum tamen non mediocris est numerus, scilicet equorum, quos illi suo nominee bachmatos nominant, circiter triginta millia post certamina et in locis conflictum sunt collecta; eorum enim quilibet tribus ad minus equis utitur ad certamina iens. Igitur pro isto hoc auspicio felicissimo gratias Deo salvatori nostro decantavimus. Vestrisque Fidelitatibus novitatem non minus toti Reipublice christiane quam nobis Regnisque nostris salutiferam perscribimus, eamque per hunc nobilem Petrum Hervast de Unrow cubicularium nostrum Vestris Fidelitatibus notificamus, hortantes eas ut Deo clementissimo gratias persolvant nostreque felicitati congaudent. Et quidquid ipse Petrus Hervast cubicularius noster de ea ipsa novitate dixerit, sibi credant, nam conflictibus personaliter intererat et cum ceteris victoribus pugnabat.

Аляксандр, з Божай ласкі кароль польскі, вялікі князь літоўскі, рускі і прускі ўладар і дзедзіч.

Слаўныя, паважаныя падданыя нашы!

Два сыны перакопскай Татарыі з многімі татарскімі князямі ў колькасці дванаццаць тысяч татараў нядаўна знянацку ўварваліся ў гэтую нашую дзяржаву, супраць якіх мы накіравалі народ гэтай зямлі з некаторымі польскімі дваранамі дзеля паспяховай падтрымкі; яны біліся з татарамі ў месцы, якое знаходзіцца ў трыццаці мілях адсюль, на адкрытай пляцоўцы клецкага горада. З-за многіх пераменаў лёсу зыход змагання быў няпэўны для абодвух бакоў, пачынаючы з дня Святога Пятра ў Аковах, які прыпадаў на першы (дзень) гэтага жніўня, і ўключна да самага пятага дня гэтага ж месяца, (калі) у той самы пяты дзень дзякуючы Боскай ласцы, што была на нашым баку, татары былі найпераможна разбіты, знішчаны і разагнаныя, услед за чым паследавала крывавая разня тых, хто спрабаваў ратавацца ўцёкамі; адбылося трынаццаць сутычак уключна да восьмага дня гэтага месяца жніўня, у які нашыя, атрымаўшы славу перамогі ад міласэрнага Бога, пачалі нарэшце паслядоўна вяртацца да нас, несучы з сабой трафеі перамогі. Хоць і маецца немалая лічба палонных і брудных даспехаў, але ж пасля бітвы і ў месцах баёў было сабрана каля трыццаці тысяч коней, якіх яны на сваёй мове называюць бахматамі; кожны ж з іх, едучы на вайну, бярэ з сабой як мінімум трох коней. Тады ж за гэта самае найшчаслівейшае спрыянне мы выказалі (праспявалі) падзяку Богу, нашаму Збаўцу, і даносім таксама да Вашых Вернасцей гэтую навіну, не менш збавіцельную для ўсяго хрысціянства, чым для нас і нашых каралеўстваў, і паведамляем Вашым Вернасцям пра яе праз гэтага шляхетнага Пятра Герваста з Унрава, нашага каморніка, заклікаючы Вас, каб Вы ўзнеслі падзяку Найміласцівейшаму Богу

Datum Wilne, feria sexta in vigilia Assumptionis Virginis Marie anno Domini millesimo quingenterimo sexto.

Dominus rex per se

(Akta Aleksandra, króla polskiego, wielkiego księcia litewskiego itd. (1501—1506) / Wyd. F. Papée. Kraków, 1927. S. 548).

і ўзрадаваліся нашаму поспеху. І што бы ні казаў сам Пётр Герваст, наш каморнік, пра гэтую самую навіну, таму б Вы верылі, бо ён браў асабіста ўдзел у баях і змагаўся поруч з іншымі пераможцамі.

Дадзена ў Вільні ў пятніцу, напярэдадні Унебаўзяцця Дзевы Марыі, у год господні тысяча пяцьсот шосты.

Сам уладар кароль.

## Мемарыял пана Лукі (Memoriale domini Lucae)

In rebus bellicis nihil insigne egit, nisi quod paucis diebus ante obitum suum prope duodecim milia Tartarorum, qui ducibus duobus filiis imperatoris Tartarorum Przekopsky Lituaniam usque ad internectionem vastare destinaverant, prope oppidum Clyczko per continuos octo dies fudit, profligavit et extinxit, paucis eorundem superstitibus. Recepta sunt Tartaris in hac eorum strage, quemadmodum ex literis Regis deprehendi (potest), prope triginta millia canthriorum. In memoria hominum non extabant intanto numero tartaros uno conflictu interiisse.

(Scriptores rerum Warmiensium oder Quellenschriften zur Geschichte Ermlands. Bd. 2 / Bearb. v. C. P. Woelky. Braunsberg, 1889. S. 156).

У ваенных справах (кароль і вялікі князь Аляксандр. — *У. К.*) нічым адметным не вызначыўся, хіба што за некалькі дзён да сваёй смерці каля крэпасці Клецк на працягу васьмі дзён ён змусіў да ўцёкаў, разбіў і знішчыў каля дванаццаці тысяч татараў, якія на чале з двума сынамі перакопскага цара татараў аддалі Літву на поўнае руйнаванне, і толькі нямногім з іх удалося ўратавацца. У гэтай бітве ў татараў было захоплена каля трыццаці тысяч коней, як (можна) даведацца з лістоў самога караля. У народнай памяці немагчыма было адшукаць выпадак, каб у адной бітве было забіта столькі татараў.

## Жыгімонт Герберштайн

Es begab sich, das der kunig krank was, und die tatern kamen mit grossem hoer in das land. Der kunig muest nach irer gewonhait anziehen, ward mitgefuert. Al sachen warden knes Michaeln und ainem herrn, Schisska genant, bevolhen. Derselb erkrankt auch, also das alle handlung auf den knes Michaeln fiel. In summa die sach ward wol gluecklich verricht. Die Tatern waren so hart als nie geschlagen. Den kuenig fuert man wieder nach der Wild, starb aber unterwegen.

(Герберштейн С. Записки о Московии: В 2 т. Т. 1: Латинский и немецкий тексты. М., 2008. С. 464).

Здарылася так, што кароль захварэў, а татары з вялікім войскам уварваліся ў зямлю. Згодна іхняму звычаю, кароль мусіў вырушыць сам, але яго везлі. Усе справы былі даручаныя князю Міхаілу і яшчэ аднаму пану, якога звалі Шышка (!). Але ж і гэты апошні таксама захварэў, так што ўсё кіраванне апынулася ў руках князя Міхаіла. У цэлым, справа была паспяхова вырашаная: татары былі жорстка, як ніколі дагэтуль, разбітыя. Караля адвезлі назад у Вільню, але па дарозе ён памёр.

## Бернард Вапоўскі

(Rex Alexander) in Lidam arcem cum Helena regina ventum erat, leucis a Vilna duodecim distantem, cum trepidus nunciis accurrit cursu velocissimo nuncians: Tartaros hostes unius diei itinere hinc abesse, vastare, popularique omnia hostiliter; se in faciem sagitta saucium ex eorum manibus eq u i celeritate egre elapsum. Michael Glijnskij, eo nuncio consternatus, e vestigio aliquot misit equites Rascianos, qui explorarent omnia et certiora referrent. Vix leucam unam progressi erant, cum par fere equitum Tartarorum numerus eis occurrit; pugnatum hic acriter aliquandiu, victi Tartari, novem ex eis sunt interfecti; quorum capita abscissa et ad Michaelem ducem relata, pavorem ac trepidacionem toti curie ex hostis propinquitate ac celeritate attulere. Concursum mox ad equos et arma. Michael dux cogebat exercitum, ut Tartaris, terram Lituaniam late urentibus ac diffusis iret obviam. Alexander rex egro languens corpore in lecticam impositus, tota ea die et nocte, que secuta est, Helena regina comitante ex Lida irrequieta profectione Vilnam rediit, militesque, qui ad famam Tartari tumultus undique confluebant, ad Michaelem Glijnski omnium copiarum ducem remittebat, qui iusto auctus exercitu sub signis in hostem est profectus. Tartarico exercitu Tauricani cesaris filli duo preerant, qui apud Clecico, haud procul a Chroni amnis fontibus, nunc Nemenius erat, castra facerunt. Dena hic Tartarorum milia pro castrorum defensione apud se more gentis reliquerunt; vicena equitum milia ad diversas Lituaniae partes predatum emiserunt. Scytico equitatu nihil celerius; incredibile dictu quam multa terrarum spacia brevi temporis intervallo Tartari undique sparsi sunt emensi. Mortales multos insperato ac subito accessu

Калі ж кароль Аляксандр з каралевай Аленай быў ужо ў Лідзе, замку ў дванаццаці мілях ад Вільні, прымчаўся дрыжачы ад страху ганец і паведаміў, што татары, рабуючы, знаходзяцца ўсяго толькі ў адным дні пераходу адсюль; сам жа ён, паранены татарскай стралой у твар, толькі дзякуючы свайму хуткаíногаму каню здолеў уцікнуць палону. Міхаіл Глінскі, як толькі атрымаў гэтую вестку, разаслаў без прамаруджання ва ўсе бакі конных рацаў, каб тыя ўсё выведалі і прынеслі дакладныя весткі. Не паспелі яны прасунуцца на адну мілю, як патрапілі на аддзел татараў. Рацы адразу ўступілі з імі ў бой, у выніку якога дзевяць татараў было забіта, а іхнія адсечаныя галовы былі прынесеныя да князя Міхаіла. Страх і жах ахапіў увесь двор з прычыны такой блізкасці і хуткасці ворага. Адразу ўсе рушылі да коней і да зброі. Князь Міхаіл абвясціў збор войска, з якім бы ён выступіў бы ў паход супраць татараў, якія пустошылі ўшыр і ўпоперак Літву. Смяротна хворага караля паклалі на насілкі і неслі ўвесь гэты дзень і наступную ноч у кірунку Вільні; яго суправаджала каралева Алена. Воінаў, якія на розгалас аб татарскім нападзе, сцякаліся з усіх бакоў на каралеўскі двор, кароль адсылаў да Міхаіла Глінскага, які з'яўляўся галоўнакамандуючым усяго войска. Калі ўжо сабралося дастаткова войска, Міхаіл Глінскі ў разгорнутым страі рушыў на ворага. На чале татарскага войска стаялі два сыны таўрычаскага цара, лагер якіх знаходзіўся блізу Клецка, зусім недалёка ад вытокаў Кранона, які зараз называецца Нёман. Дзесяць тысяч татараў засталося для абароны лагера, а дваццаць тысяч іх разбеглася ў розныя бакі ў пошуках здабычы. Няма нічога хутчэй за скіфскую конніцу; падаецца неверагодным, як татары могуць пераадольваць такія адлегласці за такі кароткі адрэзак часу. Простых смяротных, засталых знянацку сваім

oppresserunt ac colligarunt, ferro et igne sevitum atrocissime ad tempus usque, quod eis ad reditum in pretoria castra prefixum erat. Michael Glijnskij moris eorum non ignarus, magna celeritate usus, castra ducum, antequam emisse copie convenirent, agredi constituit. Erat prope castra scythica fluviolus, etsi non magnus, limosus tamen et ob id ad transeundum difficilis: accedebat quod Tartari in ripa adversa consistentes sagittis, grandinis instar emissis, Lituanos incessebant, transitumque arcebant. Qos Michael Glijnskij omnium copiarum dux a ripa tormentis bellicis submovere cepit, amnemque alioqui paludinosum arboribus et fruticibus desectis, feno insuper, quod loco illo multum erat, constravit ac permeabilem fecit. Et oportune equites trecenti Poloni ex aulicis regiis, fulgentibus armis conspicui, in propinquo colle ex insperato apparuerunt, ut horribili tympanorum pulsu, clangore tubarum, falgore resplendencium armorum, extenso in longum equitatu, latam frontem ac speciem novi ac magni ex Polonia venientis exercitus prebuerunt, plurimque consternatos iam Tartaros magis exterruerunt. Michael dux septem circiter milibus hominum preerat, quibus animose cohortatis, per strata limosi fluminis loca et tela grandinis instar volancia, suas copias traduxit et in Tartaros magno impetu irruit. Scythe vix tentato certamine fugere ceperunt; qui casu ad paludem quandam cenosum venientes, plurimi hic alto voraginis profunditate hausti sunt. Miserabilis hic pereuncium colluctacio. Poloni ac Lituani a tergo instabant, cedemque augebant; Mendligeri cesaris filii duo, equis relictis, egre evaserunt. Magna in fuga cedes, sed longe major ad paludem edita; perpauci ex tanto exercitu evasere. Michael Glijnskij egregii ducis et fortissimi militis functus officio, precipuam eius victorie

раптоўным падыходам, яны хапаюць і вяжуць; і ўвогуле яны лютуюць уключна да таго часу, пакуль ім не загадана вярнуцца ў лагер. Міхаіл Глінскі, дасведчаны аб іхніх звычаях, і, узяўшы на ўзбраенне іхнюю зброю хуткасць, вырашыў заатакаваць лагер царэвічаў, перш чым там збяруцца разасланыя ва ўсе бакі чамбулы. Паблізу скіфскага лагера была рачулка, не надта вялікая, але надзвычай балоцістая, што вельмі ўскладняла пераправу праз яе. Да таго ж татары рэгулярна абстрэльвалі з супрацьлеглала боку стрэламі літоўскае войска, перашкаджаючы таму наладзіць пераправу. Аднак гарматнымі стрэламі Міхаіл Глінскі адагнаў татараў ад берага, услед за чым рачулка была загачаная высечанымі дрэвамі і кустамі, якіх было паблізу ўдосталь. Якраз у гэты самы час на суседнім з рачулкай халме раптоўна з'явілася трыста конных палякаў з ліку каралеўскіх дваран, якія прыцягвалі ўвагу сваёй бліскучай зброяй. Устрашальны трэск бубнаў, магутныя гукі труб, бляск зброі, нарэшце сам строй войска, якое расцягнулася на ўсю даўжыню халма, шырокі фронт і знешні выгляд якога прадказвалі падыход новых сіл, — усё гэта разам яшчэ больш застрашыла ўжо дастаткова запалоханых татараў. Сямітысячнае войска, да якога папярэдне звярнуўся з палымянай прамовай князь Міхаіл Глінскі, пераправілася пад страшэнным градам стрэл па пракладзенай праз балоцістую рачулку гаці на супрацьлеглы бераг, дзе яно з вялікім імпэтам накінулася на ворага. Скіфы, як толькі іх заатакавалі, пачалі адступаць. Адціснутыя да блізкага забалочанага става, многія з іх знайшлі сваю смерць у яго-най пучыне. Жахлівай была агонія гібнучых. Палякі і літвіны тым часам ударылі з тылу, і тым самым толькі ўзмацнілі разню ворагаў. Два сыны Менглі-Гірэя, пазбавіўшыся сваіх коней, ледзь здолелі ўцячы. Разня працягвалася і пад час уцёкаў ворага, але яшчэ больш значныя страты яны панеслі блізу аднаго балота,

laudem reportavit. Satis constat tres eo certamine equos sub ipso sagittis confixos, occubuisse. Cuius virtus ea die apud omnes strenua apparuit. Post cesos ac fugatos Tartaros Michael dux ad hostium castra cum omnibus copiis rediit, eo consilio, ut per partes redeuncia Tartarorum agmina, que predandi causa circumquaque sparsa erant, quę suorum ducum casum ignorabant, incauta optimeret ac contrucidaret, predamque et captivos ex barbarorum manibus recuperaret. Cessit res ex sentencia: quarta a parta victoria die Tartari predatores, omnium que acta sunt ignari, hinc et inde captivorum agminibus et preda multa onusti per partes ceperunt: qui primi venerunt per Lituanos ac Roxanos circumventi ad unum cesi omnes, idem aliis, prout successive redibant, event: miserabiliter cesi omnes. Multum sanquinis eo die et sequentibus haustum; viginti circiter Tartarorum milia hoc stratagemate cesa, totidem ferme equorum milia capta. Captivorum innumerabilis multitudo liberata, preda omnis recuperata. Postequam Alexandro tam inclita ac omni evo memorabilis apud Cleciam de hostibus Tartaris victoria nunciata est, sublatis in celum minibus, piis lachrimis suffuses, pro re bene gesta Deo Optimo Maximo gracias egit, verba illa Simeonis senis subiugens: "Nunc dimittis servum tuum Domine". Cetera nota.

(Kroniki Bernarda Wapowskiego (1480—1535) // Scriptores Rerum Polonicarum. Vol . II / Wyd. J. Szujski. Kraków, 1874. S. 66—68).

так што толькі нямногія з іх здолелі ўнікнуць смерці. Міхаіл Глінскі, які зарэкамендаваў сябе як бліскучы военачальнік, так і смелы воін, здабыў сабе гэтай перамогай вялікую славу. Дастаткова толькі адзначыць, што пад ім было забіта ў гэтай бітве тры кані. У гэты дзень усе даведаліся пра ягоную выключную храбрасць. Пасля таго, як Міхаіл разбіў і абярнуў ва ўцёкі татараў, ён вярнуўся з усім сваім войскам да варожага лагера з тым намерам, каб перахапіць і цалкам знішчыць тыя татарскія аддзелы, якія будуць ва ўстаноўлены тэрмін вяртацца ў лагер, яшчэ не ведаючы пра зыход бітвы, і тым самым адбіць у іх увесь захоплены палон і здабычу. Усё адбылося так, як і было задумана. На чацвёрты дзень пасля бітвы татарскія рабаўнікі, абцяжараныя палонам і скарбам, яшчэ не ведаючы пра тое, што адбылося, пачалі вяртацца з розных бакоў у лагер. Першыя прыбыўшыя татарскія чамбулы былі акружаныя літвінамі і русінамі, і ўсе да аднаго ўшчэнт вынішчаныя. Тое ж самае здарылася і з усімі астатнімі татарскімі чамбуламі, якія паслядоўна прыбывалі: усе яны былі бязлітасна вынішчаныя. Шмат крыві пралілося ў гэты і наступныя дні: прыблізна дваццаць тысяч татараў было забіта ў выніку гэтай хітрасці, і амаль столькі ж было захоплена коней. Была вызвалена незлічоная колькасць палонных, а таксама была адбіта і ўся захопленая здабыча. Пасля таго як Аляксандр даведаўся пра гэтую слаўную і векапомную перамогу над ворагамі татарамі пад Клецкам, ён узнёс угору рукі і з набожнымі слязамі на вачах падзякаваў Найвышэйшаму Богу, прыводзячы словы Шымона Старога: "Цяпер адпускаеш, Госпадзі, раба твайго".

## Мацей Мяхоўскі

Circa festum s. Laurentii cum rex malevalens Vilnae decumbit, Thartarorum viginti quattuor aut sex millia nunctiantur non solum in Lithuaniam, sed directe versus Vilnam progredi. Quorum transitu rex commotus tametsi langvidus consiliarios vocat consultat, et contra Thartaros expeditionem decernit. Cui cum Michael nomine procerum responderet,

absque rege nequaque ituros. Mathias Blonye phisicus regius obsecrat ne rex moveatur, quem praesagit hoc ipso solo aestivi temporis transitu, citius ad suum que hostium interitum perducendum. Vicit tamen pertinax Michaeli responsio ut rex ipse animo quevis debili tamen audacter declararet se contra Thartaros iturum, pervenitque in quadriga vectus ad castrum Lyda, cui appropinquabant Thartari, Helena Magna dux et conjunx, sequuta erat regem, quia vidit moribundum. Cumque speculatores regem avisatum facerent de triginta milibus Thartarorum versus Kloczko euntium in quibus Cezarelli essent aliquot. Rex nimium molestiae concepit que equo insidere nequiret, exinde subito morbum incidit, a quo sufragio medici excitatur, et Stanislao Kyska campiductori generali exercitum committit, qui obviam Thartaris iret. Cum Kyska universi barones et Michael missi. Ad custodiam vero corporis regii Albertus Vilnensis Episcopus Ioannes Zabrzezinski cum Ioanno Lasco cancellario deputati. Qui cum super istis extremis mutuo deliberarent eventibus, communi consensu statuunt Sigismundum ducem, regis fratrem, Glogoviae agentem vocandum. Suggerunt etiam Michaeli que et ipse litteras pro duce ipso scribat, ut quartocitius Lithuaniam advenire acceleret, sive enim vivet sive morietur rex, et similiter sive vincentur Thartari sive non, putarunt necessarium de hiis ducem tanque futurum regis successorem et heredem avisandum. Interim Kyska quadam egritudine incepit laborare adeo ut vix equum ascenderet.

Блізу свята св. Ваўжынца, калі кароль ляжаў хворы ў Вільні, надышла вестка, што дваццаць чатыры або дваццаць шэсць тысяч татараў уварваліся ў Літву і рухаюцца не пасрэдна ў бок Вільні. Кароль, устрывожаны іхнім надыходам, склікаў сваіх найбліжэйшых дарадцаў з мэтай падрыхтаваць выправу супраць татараў. Праз Міхаіла вяльможы паведамілі, што не рушаць без самога караля. Мацей з Блоні, каралеўскі лекар, настойліва адгаворваў караля ад гэтай выправы, баючыся, што адным толькі гэтым пераходам у летнюю пару ён хутчэй зруйнуе ўласнае жыццё, чым жыцці ворагаў. Міхаіл, аднак, здолеў настаяць на тым, каб слабеючы кароль усё ж абвясціў пра ўласны ўдзел у выправе супраць татараў. Караля ў квадрызе прывезлі ў Лідскі замак, да якога набліжаліся татары; яго суправаджала вялікая княгіня і жонка Алена Іванаўна, якая прадчувала хуткую смерць супруга. Неўзабаве шпегі прынеслі каралю вестку, што трыццаць тысяч татараў скіраваліся ў бок Клецка, сярод якіх знаходзіліся і два царэвічы. Кароль жа быў надзвычай раззлаваны ад таго, што ён не можа нават сядзець на кані; калі затым калі ягонае здароўе раптоўна пагоршылася, ён, прыслухоўваючыся да парады свайго лекара, перадаў кіраванне войскам найвышэйшаму гетману Станіславу Кішку, які павінен быў выступіць супраць татараў. Разам з Кішкам былі пасланыя і ўсе паны, у тым ліку і Міхаіл. Ахова цела караля была даручаная Альберту, віленскаму біскупу, Яну Забярэзінскаму і Яну Ласкаму, канцлеру, якія ў гэтых надзвычайных абставінах, параіўшыся, прыйшлі да агульнай згоды пасланць ганца ў Глогаў да князя Жыгімонта, каралеўскага брата. Паны пераканалі і Міхаіла адправіць лісты да князя, каб той як мага хутчэй прыбыў у Літву, яшчэ не ведаючы, ці будзе жыць кароль або памрэ, ці будуць пераможаныя татары або не — аб усім гэтым яны палічылі неабходным паведаміць князю як будучаму спадчынніку і гаспадару. Тым часам Кішку навалілася нейкая хвароба, так што ён быў ледзь

Thartari autem a Kloczko versus Lyda nunctiantur appropinquare, relictis ultra Kloczko impedimentis et bissaccis eorum in uno certo delecto securiori loco et parte suorum minus valentium pro tutamento cum his remanente, numeratis circiter viginti millibus delectorum pugnatorum Thartarorum. Interim etiam medicus regius de Blonje cancellarium avisatum facit, procuraret providendam regis animae salutem, sic in exercitu Kyska egrotatus ad exercitum dirigendum Michaelem substituit, baronibus per eum prior ordinatos exercitus commendat egrevalens….

Congressi autem cum Lithuanis erant Thartarorum quindecim millia circa Kloczko per Lithuanos victoriosissime fusa cesaque, paucis de curia regis ex Vilna advenientibus Polonis, quorum Sandivogium de Czarnkow Baronem palatini Posnaniensis filium cum caeteris familiaribus cancellarius ductorem praefecerat, qui licet certamine se non immiscuerant, quia tardiuscule venerant, armis tamen fulgentes in monticulo prope lacum et paludem pugnae per Thartaros visi, non parum hostibus timoris, et Lithuanis animi praebuere, quippe ut illos inspectarent Thartari, qui tum pro palude cum Lithuanis certabant, putantes ad Polonis quos per habitum et equites noverant, nova magnaque Lithuanis praesidia adventasse, fugae se committebant, quos Lithuani insequentes straverunt, ut veluti in messe manipuli per aliquot millia iacerent corpora occisorum, quorum Lithuani nonnullos vinctos, equorum vero circiter duodecim millia ex ipso conflicto retulerunt. Duo vero Caesareoli seu filli Caesaris, ad paludes et loca limosa fugientes, noctis obscuritate salvati evaserunt. Praefata aut victoria non campiductori Kyska aut duci Michaeli Glynsky, vel eorum, sed dei solius providentiae et regis foelicitati attribuebatur, qui dum cum morte et terreno hoste simul luctaret, devicto hoste, per mortem victor victus erat.

(Matthias de Miechow. Chronica Polonorum. Cracoviae, 1521. P. 394—396)

здольны ўзлезці на каня. Адначасова паступілі весткі, што татары ў колькасці дваццаці тысяч найбольш баяздольных і падрыхтаваных воінаў, пакінуўшы за Клецкам у адным бяспечным месцы ўвесь свой абоз са здабычай, ахову якога даручылі найменей здаровым і моцным з ліку сваіх, набліжаюцца да Ліды. Тым часам каралеўскі лекар з Блоні ўведаміў канцлера аб неабходнасці прыступіць да абраду збавення душы караля. Таксама і захварэўшы Кішка перадаў кіраванне войскам Міхаілу, і незадаволены, разам з астатнімі вяльможамі ў войску, аддаўся пад ягоную каманду…

Пятнаццаць тысяч татараў, якія сышліся з літвінамі на полі бою пад Клецкам, былі разбітыя і прагнаныя. Нямногія з польскіх каралеўскіх дваран, што прыбылі з Вільні і якіх узначальваў пан Сяндзівой Чарнкоўскі, сын пазнанскага ваяводы, разам з некаторымі іншымі каралеўскімі слугамі, хоць і не ўдзельнічалі ў самой бітве, бо прыбылі са спазненнем, тым не менш, стоячы на горцы блізу возера і балота, дзе адбывалася бітва, яны сваёй зброяй, што блішчэла на сонцы, нагналі немалы страх на татараў, а літвінам дадалі смеласці, бо татары, якія тады змагаліся з літвінамі ў балоце, гледзячы на іх, думалі, што літвінам з боку палякаў, якіх знешні выгляд і конны строй так уразіў татараў, ідуць на дапамогу новыя і значныя сілы. Услед за чым татары кінуліся наўцёкі, якіх літвіны несупынна білі, кідаючы на зямлю тысячамі целы забітых, як быццам снапы ў часе жніва. Некаторых з якіх (татараў) літвіны даставілі звязанымі; таксама яны захапілі ў гэтай бітве каля дваццаці тысяч коней. Што ж да двух царыкаў або сыноў цара, то яны, уцякаючы праз балоты і забалочаныя месцы, толькі дзякуючы наступленню цемры здолелі ўнікнуць смерці. Згаданая перамога прыпісвалася не гетману Кішцы ці князю Міхаілу, або ім абодвум, але Прадбачлівасці адзінага Бога і шчасцю караля, які адначасова змагаўся і са смерцю, і са смяротным ворагам, і, адолеўшы ворага, стаўся праз смерць пераможцам, якому наканавана было жыць у вяках.

# Марцін Кромер

...Intervallo quieti dato, mox auctis viribus mense Augusto denuo in Lituaniam irruperunt; et cum ad Clescum oppidum haud longe a fontibus Nemenis fluvii situm constipati pervenissent, relicti ibi duobus Soltanis (sic illi principis filios vocant) cum decem millibus eqitum, ad quos ipsi receptum habituri essent, caeteri ad viginti millia turmatim quoquo versus populabundi excurrrerunt. Vilnae rex languens iacuerat. Inde vero discedens cum uxore et supellectili sua universa, Lidam, quae arx duodecim milliariis a Vilna abest, pervenerat. Ac Mechoviensis quidem eum adventu Tartarorum excitum, cum negarentur Lituani, nisi rex ipse loco se movisset, ad arma concursuri esse, nequicquam dissuadentibus medicis, eo se vehi iustisse memorat, ne vel in extremo halitu suis deesset: Vapovius vero eum in Poloniam iter habuisse scribat, quo iam Sigismundum fratrem a Silesia evocavisset, ut concessis ei habenis Regni, ipse rebus gerendis propter ingravescentem et insanabilem morbum minime idoneus, in ocio reliquum tempus vitae transmitteret. Sed quocunque tandem consilio Vilnam reliquit, Lidae cum esset, ecce adest unus quispiam nuncians Tartaros populabundos vix unius diei itinenere abesse: se sagitta ictum in faciem, equi pernicitate manus eorum aegre effugiste. Parum fidei habitum est nuncio. Proinde Michael Glinscius, qui regem comitabatur, Roscios equites aliquot, quos ad manum habebat strenuos, dimisit, certius omnia exploraturos. Nec longe hi abierant, cum in turmam Tartarorum inciderunt: conserta que intrepide pugna, novem ex iis interfecerunt, caeteros in fugam verterunt, et praefixa hastis occisorum capita ad dominum suum attulerunt. Trepidatum est circa regem vehementer. Placuit deinde, ut is molestia itineris et quassatione maiorem in modum afflictus, lectica Vilnam reportaretur: Glinscius vero cum Stanislao Kisca duce

...Ў жніўні месяцы, у мірны час, яны (татары) з яшчэ большымі сіламі паўторна ўварваліся ў Літву. Калі татары дасягнулі крэпасці Клецк, недалёка ад вытокаў Нёмана, то там яны пакінулі дзесяць тысяч вершнікаў на чале з двума султанамі (так яны называюць сыноў свайго ўладара), да якіх яны павінны былі вярнуцца, а астатнія дваццаць тысяч разбегліся ў загонах рабаваць і пустошыць навакольныя землі. Тым часам у Вільні каралю станавілася ўсё горш і горш. Адтуль ён у суправаджэнні жонкі і ўсяго двара прыбыў у Ліду, замкак, што знаходзіўся ў дванаццаці мілях ад Вільні. Мяхоўскі звязваў гэты прыезд караля з нападам татарскага войска, у той час, калі літвіны адмаўляліся брацца за зброю, пакуль сам кароль не вырушыць у паход. Нягледзячы на пярэчанні лекара, кароль, які хоць і знаходзіўся пры смерці, тым не менш аддаў загад весці сябе. Вапоўскі пісаў, што кароль збіраўся выехаць у Польшчу і што ён ужо выклікаў з Сілезіі свайго роднага брата Жыгімонта, каб перадаць таму кіраванне каралеўствам, а самому з-за прагрэсіруючай і невылечнай хваробы пайсці на пакой, дзе б яго не абцяжарвалі дзяржаўныя справы. Але калі, кіруючыся гэтым рашэннем, ён прыбыў з Вільні ў Ліду, то туды неўзабаве прыехаў ганец, які паведаміў, што татары знаходзяцца ўсяго толькі на адлегласці аднаго дня пераходу. Сам жа ён, паранены стралой у твар, толькі дзякуючы хуткасці свайго каня здолеў пазбегнуць палону. Гэтая вестка выклікала напачатку недавер. Таму Міхаіл Глінскі, які суправаджаў караля, паслаў некалькі конных рацаў, якіх ён заўжды меў пры сабе, каб тыя ўсё выведалі. Ім не прыйшлося доўга шукаць ворага, бо неўзабаве яны патрапілі на адзін татарскі загон. Рацы бясстрашна ўступілі ў бой з татарамі, дзевяць з якіх яны забілі, а астатніх змусілі ратавацца ўцёкамі; сцятыя галовы забітых, прымацаваных

exercitus, et Lituana nobilitate, quae adventu tartarorum audito ad regem confluebat, hosti obviam iret. Missus etiam, qui Sigismundum regis fratrem celeriter acciret. Sive enim viveret rex sive moreretur, et sive vincerent Lituani, sive vincerentur, praesente eo videbatur opus esse. Ac rex quidem continuato die nocteque itinere, Alberto episcopo Vilnensi, Ioanne Zabrezinio et Ioanne Lasco cancellario Polono cum regina deducentibus, vix trahens spiritum Vilnam reportatus est. Michael vero Glinscius, cum Kisca subito morbo correptus esset, non ignarus moris Scythici, quamvis non plus septem millibus eqitum aggregasset, accelerandum sibi ratus est in hostem ad Clescum desidentem, priusquam cuncta agmina, quae diversa et palantia praedas agebant, eo sese recollegissent. Erat prope stativa hostilia, quam Lituani veniebant, amnis non magnis, neque profundus, sed limosus, et ob id aegre vadabilis. Eius ripam ulteriorem Tartari, cum Lituanos contra se adventare cognovissent, insederant, ac denso sagittarum imbre Lituanos transitu prohibebant. Habebant Lituani secum bombardas aliquot. Eas cum exonerassent, hostem a ripa summoverunt; et comportatis e vicino frondidus et vingultis, amnemque constrato in ulteriorem ripam cum evasisset, magno impetu in hostes irruerunt. Per opportune autem in primo agminum congressu eqiutes Poloni trecenti ex aulico regis comitatu duce Sendivoio Ciarnicovio palatini Posnaniensis filio Vilna accurrentes, e propinquo colle Tartaris sese ostendere. Cumque armis fulgentes frontem latius diduxissent, ac tympanis atque tubis vehementius insonuissent, et longe maioris, quam pro numero exercitus animum addidere, hostibus vero terrorem incussere. Itaque statim ii terga dedere. Nec segnius instabant Lituani fugientibus, nec ullum recolligendi sese spatium dabant. Forte palus erat caenosa, qua barbari constipati adhuc fugiebant. In eam cum urgentibus a tergo Lituanis compulsi errant, plurimi coeni voragine hausti sunt: nec pauciores

да дрэўкаў дзід, яны даставілі да свайго гаспадара. Акружэнне караля ахапіла паніка. Было вырашана, што з прычыны цяжкасці дарогі і выкліканай гэтым гайданкі караля панясуць на лектыцы ў Вільню, а Глінскі са Станіславам Кішкам, найвышэйшым гетманам, і ўсёй літоўскай шляхтай, якая, пачуўшы пра напад татараў, сцякалася на каралеўскі двор, выступіць супраць ворага. Паслалі таксама і да каралеўскага брата Жыгімонта, каб той прыспешыў свой выезд; незалежна ад таго, выжыве кароль або памрэ, перамогуць літвіны або будуць пераможаныя, аб усім гэтым вырашана было праінфармваць яго. А караль, які паміраў, быў адпраўлены ў Вільню: у дарозе яго стала суправаджалі, і ў дзень і ў ноч, віленскі біскуп Альберт, Ян Забярэзінскі, каронны канцлер Ян Ласкі, а таксама каралева. Калі ж Кішка быў звалены з ног раптоўнай хваробай, то Міхаіл Глінскі, добра ведаючы звычаі скіфаў, на чале войска, якое не пераўзыходзіла сем тысяч конных, паспяшыў на сустрэчу з ворагам пад Клецк, перш чым там збяруцца загоны, якія разрознена і паасобку займаліся рабаваннем. Каля варожага стану, куды прыбылі літвіны, была рачулка, невялікая і неглыбокая, але балоцістая, што рабіла пераправу праз яе цяжкім прадпрыемствам. Калі ж татары пабачылі, што літвіны збіраюцца наблізіцца да іх, то яны асыпалі іх з супрацьлеглага берага ракі густым градам стрэл, перашкаджаючы наладзіць пераправу. Літвіны мелі з сабой некалькі гармат. Калі ж з іх далі пару залпаў, то татары адразу разбегліся ад берага, пасля чаго, зладзіўшы з дастаўленых з паблізу кустоў і дрэваў гаць, пераправіліся па ёй на супрацьлеглы бераг ракі і з вялікім імпэтам накінуліся на ворагаў. У той самы час, калі войскі ўпершыню сышліся на полі бою, на суседнім пагорку перад зрокам татараў з' явілася трыста конных палякаў з прыдворнай каралеўскай харугвы на чале з сынам пазнанскага ваяводы Сяндзівоем Чарнкоўскім,

restitantes ab insequentibus contrucidati: Soltani, duces exercitus, equis in palude relictis, aegre evasere. Glinscius magnam non solum egredii ducis, verum etiam strenui militis laudem ex ea victoria reportavit, tribus equis sub eo confossis. Neque tamen hac ille victoria contentus fuit. Sed reductis ad hostium stativa copiis, tacitus ibi concedit, operiens donec caeteri, qui praedatum longe lateque excurrerant, casus suorum ignari ad stativa, quaemodmodum inter eos convenerat, reverterentur. Nec eum fefellit coniectura et successus. Post quartum enim diem, eos turmatim reverti incipientes, ut quique primi venerant, excepit, et magna straga concidit: ita ut viginti millia barbarorum tunc illis praeliis caesa, totidem equi capti memorentur. Praeda omnis excussa et ingens captivorum numerus liberatus. Iam Alexander rex desperata salute et testamento condito, sumptis que; rito Christiano sacris mysteriis, animam agebat, cum ei de victoria suorum nunciatum est. Sublatis in caelum manibus, et oculis lachrymas stillantibus tacitus amisso iam usu linguae gratias agere Deo visus est...

(Cromerus Martinus. De origine et rebus gestis Polonorum. Basileae, 1555. P. 669–670).

якія прыбылі з Вільні. З'яўленне войска, разгорнутага ў фронт, бляск зброі, магутныя гукі бубнаў і труб, што прымушала меркаваць пра яго шматлікасць, не магло не дадаць духу літвінам і пасеяць страх сярод татараў. Пасля чаго апошнія кінуліся ратавацца ўцёкамі. Літвіны ж пераследвалі іх бесперапынна, не даючы ні малейшага аддуху, пакуль натоўпы не прыбеглі да аднаго моцна забруджанага балота, у якое яны, цяснімыя з тылу літвінамі, і былі загнаныя. Шмат іх патанула ў балотнай пучыне, а нешматлікія ацалелыя былі знішчаныя пераследаўцамі. Самі ж салтаны, пакінуўшы коней у балоце, ледзь здолелі ўнікнуць пагоні. Дзякуючы гэтай перамозе Глінскі набыў вялікую славу не толькі бліскучага палкаводца, але і мужнага воіна; пад ім было забіта тры кані. Але ён не абмежаваўся гэтай перамогай. Разам з войскам ён вярнуўся ў варожы лагер, дзе зладзіў засаду, чакаючы там, пакуль у дамоўлены час пачнуць вяртацца тыя загоны, што разбегліся ўшыр і ўглыб дзяржавы ў пошуках здабычы і якія яшчэ не ведалі пра незайздросны лёс сваіх паблізу лагера. Прадбачэнне і поспех ізноў былі на ягоным баку! І насамрэч, на чацвёрты дзень, калі пачалі ўжо вяртацца загоны, то тыя з татараў, якія прыбылі першымі, былі перахопленыя і і знішчаныя дашчэнту, так што, як гавораць, у тых сутычках было забіта дваццаць тысяч варвараў, і захоплена такая ж колькасць коней. Была таксама адбіта ўся захопленая здабыча і вызвалена вялізная колькасць палонных. Калі каралю Аляксандру паведамілі пра перамогу сваіх, то ён, пасля таго, як ужо страціў усялякую надзею на выздараўленне і, склаўшы ўласны тастамент, далучыўся па хрысціянскаму звычаю да святых тайнаў, і з гэтым аддаў душу. Відавочцы сведчылі, што ён з паднятымі ўгору рукамі і поўнымі слёз вачамі моўчкі, страціўшы ўжо дар мовы, дзякаваў Богу...

## Альберт Віюк Каяловіч

Nunciatur interea Vilnam, Tauricanos Lithuaniam movisse. Rex incommodis belli ferendis iam debilis, nobilitati, quam suis edictis in eam occasionem ad arma evocaverat, committit, ut hostibus occurat. Nobilitas Glinscij artibus concitata, negat se signa moturum, nisi presente Principe. Glinscius, tametsi constitutum haberet, Regem Vilna extractum, incommodis viae, atque adeo vitae periculo, obijcere; consilium dissibulabat: tum, velti aliud ipse in gratiam regis sentiret; necessitati in subitis serviendum esse, prefatur. Mox subijcit, regem quantumvis aegrum, deportandum esse Lidam, ne nobilitas praetensam Regis absentia, e castris dilabatur. Posse inde commodius Sigismundo Principi scribit, ut ad suscipienda Lithuaniae gubernacula properet, Regemque fratrem exoneret publicis curis, quibus liber, et morbum medicinas vincentem levaret quiete; et animum, si spes omnis vivendi praecideretur, ad extremum diem comparare. Vix attigerat Rex Lidam, cum nobilis vir, aegre ex vastatorum manibus elapsus, nunciat; hostem igne ac ferro barbarem i omnia saevire; neque integrae diei itinere Lidam distare. Faciebat nuncio fidem, vulnus sagittam in genam acceptum: mox alii super alios fugam in castra delati, confirmabant viginti millibus Sluckum destinatis, reliquas copias incredibili celeritate Novogrodecum tendere. In vanis tamen meticulosorum hominum terriculamentis, haec sunt habita a plerisque, deceptis; quod hostium festinatio opinionem omnem superaret. Mittitur centuria Glinsciani equitatus, ad afferendum aliquid exploratum. Paucis leucis progressi speculatores, in manipulum Scyttarum inciderunt: commisso praelio caedunt aliquos, reliquos in fugam vertunt: ad astruendam fidem capita caesorum in hastis referunt. Tum primum in castris cessatum dubitari de hoste: omnes expedire arma, ad praelium se comparare: solus Rex

Тым часам у Вільню прыйшла вестка, што таўры рухаюцца на Літву. Ужо знямажаны хваробай кароль, якому да таго ж было цяжка ад ваеннай службы, загадаў шляхце выступіць супраць ворага (у разе ваеннай пагрозы ён звяртаўся да яе праз свае эдыкты – распараджэнні). Але шляхта, падбухторваемая Глінскім, не выказвала жадання адпраўляцца ў паход, пакуль не рушыць сам гаспадар. Глінскі, маючы намер выцягнуць караля з Вільні, тым самым абракаючы таго на цяжары дарогі і ў яшчэ большай ступені на небяспеку жыццю, утойваў свой уласны план: прагнучы каралеўскай ласкі, ён, тым не менш, у тагачасных надзвычайных умовах вымушаны быў падпарадкавацца неабходнасці. Неўзабаве Глінскаму ўдалося пераканаць усіх, каб караля, няхай і хворага, даставілі б у Ліду, толькі б не разбеглася адтуль здэмаралізаваная доўгай адсутнасцю караля шляхта. Адтуль ён пісаў да ўладара Жыгімонта, каб той паспяшыў прыняць пасаду вялікага князя ў Літве і ўзяў на сябе дзяржаўныя справы, каб ягоны брат кароль, будучы вольным ад іх, змог бы аблегчыць рознымі медычнымі сродкамі сваю хваробу, якая адольвала яго, і разам з тым падрыхтаваць уласную душу да смерці, нават тады, калі б надзеі на выздараўленне не было бы зусім.

Не паспеў кароль прыбыць у Ліду, як з'явіўся адзін шляхціц, які ледзь унікнуў палону рабаўнікоў, і паведаміў, што вораг знаходзіцца ўсяго толькі ў адным дні пераходу ад Ліды, усё вакол нішчачы агнём і мячом. Да вестак ганца паставіліся сур'ёзна, беручы пад увагу рану на ягоным твары ад стралы; неўзабаве і астатнія ўцекачы, што адзін за другім прыбывалі ў замак, пацвердзілі, што дваццаць тысяч татараў сталі кошам пад Слуцкам, а астатнія іхнія аддзелы з неверагоднай хуткасцю рухаюцца ў бок Навагародка. Чуткі запалоханых людзей аб рухлівасці ворагаў, якая пераўзыходзіла ўсякае ўяўленне, паступова распаўсюдзілася сярод насельніцтва. Тым часам Глінскі паслаў сотню сваіх вершнікаў, каб тыя раздабылі дакладныя весткі пра ворага. Не паспелі выведнікі прайсці і некалькі міль, як патрапілі на загон скіфаў: завязаўся бой, у выніку якога адных з ворагаў забілі,

prope furere, quod eo discriminis deductus, ne equum quidem prae aegritudine posset conscendere. Augebat tumultum, incerto auctore sparsus per castrum rumor, delectorum viginti millia, magnis itineribus recta Lidam properare. Comissa itaque belli totium summa exercitus Duci Stanislao Kiszka, expeditoque ad Sigismundum fratrem tabellario, ipse rex, cum Alberto Tabor, Episcopo Vilnensi, Ioanne Laski Regni cancellario, et Ioanne Zabrzezinski Marschalco Lituaniae, Vilnam se recepit. Iam pagis, nobilium curijs, templisque circumquaque ardentibus, ignis fumusque non dubium indicium faciebant, hostem vix ad leucam a castris regiis abesse. Magnam itaque celeritate Stanislaus Kiszka expeditioribus turmis negotium dat, ut dum exercitus robur, non integra decem millia, expeditur; hostem arceant ab effusa agrorum vastatione. Neque infeliciter ab eis res gesta est, aliquot manipulis vastatorum interceptis, deletisque. Ubi senserunt Scythae Lituana signa contra se moveri, suos ad castra revocare coeperunt. Id fore praesenseret Kiszka, atque ideo paucis ad vestigandos polantes per vicina missis, universas copias Novogrodecum, tum Kleckum, ducit, totam vi castra, in quibus Soltani, cum liberis et conjgibus, more gentis consederant, insperando aggrassurus, priusquam universi a vastandis agris confluerent. Verum ex quingentis circa Poloncam, ab eo legione, quae reliquos praecurrebat, profligatis, pauci fugam ex caede elati, maturo satis, belli Duces monuerunt, Lituanum exercitum instare. Cum igitur non posset Kiszka, uti voluerat, inopinato hostem adoriri, instructa ad apertum praelium acie, signa ducebat. Nonis Augusti ad Lipie constiterat, postero die cum hoste congressurus ; verum eadem nocte, repentino gravique morbo correptus, suas vices Michaeli Glinscio committere coactus est. Glinscius vir, et militaribus artibus probatus, et gloriae avidus, libenter tam speciosam Provinciam suscipit: millia septem delecti militis, tria non admodum

а другіх змусілі ратавацца ўцёкамі; для пацверджання галовы забітых прымацавалі да дрэўкаў дзід і прынеслі ў замак. Толькі тады ў лагеры перасталі сумнявацца ў прысутнасці ў зямлі ворага: усе ўзяліся за зброю і пачалі рыхтавацца да змагання. Толькі адзін кароль ледзь не прыходзіў у лютасць ад таго, што ён з-за сваёй хваробы не мог асядлаць каня. Раптоўна ў лагеры ўзнялося хвалянне з-за чутак, што распаўсюджваліся ў замку невядомай асобай, што дваццаць тысяч адборнай татарскай конніцы фарсіраваным маршам рухаюцца прама на Ліду. З гэтай прычыны камандаванне ўсім войскам было даручана гетману Станіславу Кішку, таксама быў пасланы ганец да брата караля Жыгімонта, а сам кароль у суправаджэнні віленскага біскупа Альберта Табара, кароннага канцлера Яна Ласкага і літоўскага маршалка Яна Забярэзінскага быў адпраўлены ў Вільню. Ужо паўсюдна пылалі вёскі, шляхецкія двары і цэрквы, і пажарышчы і дым, што разносіўся ветрам, сведчылі пра тое, што вораг знаходзіўся зусім побач з каралеўскім замкам. Таму Станіслаў Кішка пачаў без прамаруджання збіраць у шыхты войска і, як толькі колькасць войска дасягнула не менш за дзесяць тысяч воінаў, вырушыў у паход, каб спыніць рабункі ворагам вёсак і палеткаў. Ваенныя дзеянні распачаліся для літвінаў як нельга лепей: яны перахапілі некалькі татарскіх чамбулаў і ўшчэнт іх знішчылі. Калі ж скіфы зразумелі, што на іх ідзе літоўскае войска, то яны загадалі сваім аддзелам вяртацца ў лагер. Кішка, які прадбачыў падобны ход варожага камандавання, паслаў нямногіх са свайго войска для пераследу тых з татараў, якія яшчэ бадзяліся па ваколіцах, а ўсё астатняе навагрудскае войска накіраваў пад Клецк, каб усімі сіламі нечакана напасці на лагер, у якім згодна свайму звычаю заселі разам са сваімі жонкамі і дзецьмі абодва салтаны, перш чым усе татары вернуцца назад з рабункаў. Аднак асобныя татары са знішчанага пяцідзесяціасабовага чамбулу, які вырваўся наперад астатніх і быў разбіты паблізу Палонкі, здолелі пазбегнуць смерці, вярнуцца назад і папярэдзіць сваіх военачальнікаў аб набліжэнні літоўскага войска. Калі ж Кішка зразумеў, што ён не здолее нечакана напасці на варожы кош, то ён, аддаўшы войску загад рыхтавацца да адкрытага бою, вырушыў

armati, intrepide contra hostem ducit. Bitigereius cum fratre, instructis ad pugnam copiis, venientem Lituanum expectabat: amnis castra Scythica lato atque limoso alveo alluens superandus erat prius Michaeli: cujus vada, qua transituris commodior videbatur via, valida suorum manu opposita, praemunierat Bitigireus. Ubi in conspectum mutuum adversae acies venerunt, Michael neque loci iniquitate, neque barbarum multitudine turbatus, dat praelio auspicium. Ad castrorum latus, quod stagni paludosi aquis munitum, negligentibus custodies tenebatur, cohortes aliquot equestres inmittit, submissis deinde in subsidium quingentis, excubias hostiles caedit, pecore atque equos, per campos, intercipit. Facto deinde in eam stationem impetu, quae viam regiam insederat post dubiam aliquantum pugnam, loco hostem movet, atque ad suorum ordines reijcit. Purgato isthic campo, solus amnis interiectus obsistebat, ne utrimque totis viribus concurreretur. Promota ad ripam amnis Lituanorum acie, nimbi instar immensam sagittarum vim ab adverso margine effuderunt Scythae: at fere irrito eventu. Quia enim Michael destinato in eum finem consilio, aciem in latero diducendo, frontem ac corpus exercitus, extenuaverat, sagittae ultra aciem impetu delatae, fere adsque damno militum, equorumque, ab alto in terram redierunt. Admotis mox ripae sclopetariis, hostes ab adversa ripa depellantur: succedit Lituanus miles, atque prout tempus ferebat, coniectis in amnem virgultis, viam sibi aperit, atque impigre in alteram partem enititur. Michael ipse cum fronte exercitus, consertissimos hostium invadit, amisso uno ex vulnere equo, in altero praelium urget. Novogrodensis nobilitas in latus, in quo Duces hostium constiterant, magno impetu invecta, primum aciem hostilem ingenti strage perturbavit. Scytharum duces suo more signis a praelio cursu revocatis, laxataque acie ordines in gyros flectere, ac uno impetu in mediam Lituanorum

на чале яго. 5 жніўня ў Ліпе было вырашана распачаць на наступны дзень бітву з ворагам; аднак гэтай жа ноччу Кішка, якога нечакана схапіла цяжкая хвароба, быў вымушаны перадаць свае паўнамоцтвы Міхаілу Глінскаму. Глінскі, муж дасведчаны ў ваеннай справе і прагнучы славы, ахвотна ўзяў на сябе такі адказны абавязак і бясстрашна рушыў на ворага на чале сямітысячнага адборнага войска, да якога было далучана тры тысячы слабаўзброеных ратнікаў. БіціГірэй са сваім братам, падрыхтаваныя да бітвы, чакалі падыходу літвінаў. Міхаілу адкрыўся скіфскі лагер, які амывалі воды шырокай і балоцістай ракі, броды і плыткія месцы якой, дзе пераправа ўяўлялася зручнейшай, Біці-Гірэй умацаваў выстаўленымі насупраць вайсковымі аддзеламі. Калі праціўнікі пабачылі адзін другога, то Міхаіл, не звяртаючы ўвагі ні на нязручнасць пазіцыі, ні на колькасць ворагаў, даў загад распачаць бітву. Да месца, дзе лагер амываўся водамі забалочанага става і якое слаба ахоўвалася, ён выслаў некалькі аддзелаў конных, якім затым накіраваў на дапамогу пяцьсот воінаў, якія, выразаўшы варожую старожу, захапілі на поплаве вялікую колькасць быдла і коней. Пазней яны напалі на варожы каравул, які ахоўваў каралеўскую дарогу, і пасля жорсткага бою, прагнаўшы ворага з ягоных пазіцый, яны вярнуліся да сваіх. Да поля бітвы заставалася ўсяго толькі адзіная перашкода — рака, якая не давала праціўнікам сысціся адзін з другім. Калі войска літвінаў рушыла да берага ракі, то на іх пасыпаўся з супрацьлеглага берага шчыльны град стрэл, які, аднак, (ім) зусім не зашкодзіў. Бо Міхаіл Глінскі загадаў ар'ергарду войска прыняць разгорнуты строй, так што стрэлы, якія татары з ярасцю выпускалі па войску, падалі з вышыні ў зямлю, амаль не шкодзячы ні людзей, ні коней. Гарматнымі стрэламі ворагі былі адагнаныя ад берага ракі, пасля чаго літва рушыла наперад, і, пакуль час дазваляў, то, вымасціўшы рэчку галлём і тым самым праклаўшы сабе шлях, яна імгненна ўскочыла на супрацьлеглы бераг. Сам Міхаіл Глінскі з пярэднім гуфам урэзаўся ў натоўп ворагаў і, пазбавіўшыся параненага пад сабой каня, перасеў на другога, каб прадоўжыць бітву. Навагародская шляхта з вялікім імпэтам заатакавала той фланг, дзе знаходзіліся татарскія князі,

aciem parabant redire. Sed interea ab altero latere Grodnensis Minscensisque nobilitas incurrens, gyrum confudit, ordinesque perrupit. In ipso ardore pugnae, trecenti Polonorum equitum hastati, ductore Czarnkowski, quod graves armis, properantem Glinscium aequare passu non potuisset, supervenere. Hinc novi exercitus obiecta Scythis, qui ex hastarum laciniis, militarium signorum per errorem numerum suppidantes, metu adventantium tantorum subsidiorum, praelium campumque deserunt. Multi in fuga, plures Ceprae amnis limo implicati, pecudum instat sunt caesi. Stagnum propinquum, quia ex influente cruore totum plane rubuerat, nunc etiam rosei stagni nomen retinet. Duces ipsi per paludosa in sylvas pedibus eluctati aegre ferrum victorum evaserum. Viginti millia caesorum in campo numerata: equorum viginti tria millia capta: quadraginta mortalium millia ab hoste recuperata, ac omnis praeda. Glinscius amissis in praelia tribus equis, in quarto incolumis ac Victor, pugna et itinere fessum militem, in hostilibus castris quiescere iubet: promptioribus insidiis obtinenda varia itinera commendat. Hac Ducis industria quicumque a praelio abfuerant, internecione sunt delecti. Qui enim praelii fortunam ignorantes, castra secure repetebant, in ipsum Glinscium inciderunt: qui de occupatis castris praemoniti, effugia per diversas semitas quaesiverunt, insidiis excepti sunt. Neque fortunatior fuit fuga eorum, qui mature se e campo proripuerant. Nam Anastasia Slucensium Princeps, per omnes vias nobilitatem atque agrestes oprtunis locis disponi curaverat: quorum ferro, magna Scytharum vis circa Kopylum et Piotrowicz interijt.

(Kojalowicz Wijuk A. Historiae Lituanae, a conjunctione Magni Ducatus cum Regno Poloniae ad Unionem eorum Dominiorum. Vol. 2. Antverpiae, 1669. P. 309—314).

і нанесла вялізны ўрон авангарду варожага войска. Скіфскія князі, адклікаўшы па ўласнаму звычаю аддзелы з поля бою і згуртаваўшы разрозненыя сілы ў кола, з ярасцю ўдарылі ў самую сярэдзіну літоўскага войска. Аднак у гэты самы час ударыла з другога флангу гарадзенская і менская харугвы і, змяшаўшы варожае кальцо, парушыла баявыя парадкі ворага. У самы разгар бітвы з'явілася трыста ўзброеных дзідамі конных палякаў на чале з Чарнкоўскім, якія з-за цяжкага ўзбраення не здолелі адначасова з Глінскім прыбыць на поле бою. З-за вялікай колькасці дрэўкаў дзід, якія мела войска, татарам падалося, што на дапамогу літве ідуць значныя дадатковыя сілы, і, застрашаныя, яны пачалі пакідаць поле бою. Многія з татараў спрабавалі ратавацца ўцёкамі; яшчэ больш іх завязла ў балоцістай рэчцы Цапра, дзе іх пасеклі як скот. Суседні стаў, які з-за пралітай крыві амаль цалкам паружавеў, да сённяшняга дня завецца Ружовым. Самі ж князі здолелі цераз балоты пешшу прарвацца ў лясы, унікнуўшы толькі гэткім чынам мяча пераможцаў. На полі бою засталося ляжаць дваццаць тысяч цел забітых; было захоплена дваццаць тры тысячы коней. У ворага было адбіта сорак тысяч паланянікаў, а таксама была захоплена ўся здабыча. Глінскі, які страціў у бітве тры кані і, перасеўшы на чацвёртага, ужо ў якасці пераможцы, абсалютна цэлы і здаровы, загадаў свайму войску, хаця і стомленаму бітвай і дарогай, заняць пазіцыі ў варожым лагеры; таксама ён распарадзіўся размясціць шматлікія засады на розных шляхах. Так намаганнямі князя былі цалкам вынішчаныя тыя з ворагаў, хто не браў удзелу ў бітве, якія, не ведаючы пра зыход бітвы, у поўнай бяспецы вярталіся ў кош і траплялі на самога Глінскага. Тыя ж з іх, якія былі своечасова папярэджаныя з занятага лагера, паспрабавалі ўратавацца бегствам па вузкіх лясных сцяжынках, але былі перахопленыя тымі аддзеламі, якія знаходзіліся ў засадзе. І не быў іхні лёс шчаслівеўшы за лёс тых, хто здолеў раней вырвацца з лагера. Бо Настасся, слуцкая княгіня, парупілася размясціць на ўсіх шляхах і ў стратэгічна важных месцах шляхту і хлопаў, ад зброі якіх загінула вялікая колькасць скіфаў каля Капыля і Петрыкавічаў.

# Крыніцы і літаратура


## Архіўныя крыніцы

Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (Мінск). Ф. 694, воп. 2, спр. 3135, 3905, 3912.

Archiwum Główne Akt Dawnych (Warszawa), Rachunki Królewskie, sygn. 23, 25, 27; Metryka Litewska (Kopia Warszawska Metryki Litewskiej), sygn. 192.

Biblioteka Czartoryskich (Kraków), Teki Naruszewicza, t. 23, f. 460.

## Апублікаваныя крыніцы

Акты Литовской Метрики. Т. 1. Вып. 2 / Собр. Ф. И. Леонтовичем. Варшава, 1897.

Акты, относящиеся к истории Западной России, собранные и изданные Археографическою Комиссиею. Т. 1. Санкт-Петербург, 1846.

Белоруссия в эпоху феодализма. Сборник документов и материалов. Т. 1. Минск, 1959.

Великая хроника о Польше, Руси и их соседях XI—XIII вв. / Под ред. В. Л. Янина. Москва, 1987.

Вісліцкі Я. Пруская вайна / Уклад., перакл., камент. Ж. В. Некрашэвіч-Кароткай. Мінск, 2005.

Временник Императорского Московского общества истории и древностей Российских. Кн. 10. Москва, 1851.

Герберштейн С. Записки о Московии / Под ред. В. Л. Янина. Москва, 1988.

Герберштейн С. Записки о Московии: В 2 т. / Под ред. А. Л. Хорошкевич. Т. 1: Латинский и немецкий тексты. Т. 2: Статьи, комментарии, приложения, указатели, карты. Москва, 2008.

Гусоўскі М. Песня пра зубра. Мінск, 1980.

Записки янычара (Хроника о турецких делах Константина, сына Михайла Константиновича из Островицы раца, который был взят турками среди янычар) / Введ., перевод и коммент. А. И. Рогова. Москва, 1978.

Коммин де Ф. Мемуары. Москва, 1986.

Литвин М. О нравах татар, литовцев и москвитян / Пер. В. И. Матузовой; Отв. ред. А. Л. Хорошкевич. Москва, 1994.

Описание перекопских и ногайских татар, черкесов, мингрелов и грузин Жана де Люка // Записки Императорского одесского общества истории и древностей. 1879. Т. 11.

Памятники дипломатических сношений древней России с державами иностранными. Т. 1. Памятники дипломатических сношений с империею Римскою с 1488 по 1594 год. Санкт-Петербург, 1851.

Памятники дипломатических сношений Московского государства с Крымскою и Ногайскою Ордами и Турцией. Т. 1: 1474—1505 / Ред. Г. Ф. Карпов // Сборник Императорского Русского исторического общества. Т. 41. Санкт-Петербург, 1884.

Памятники дипломатических сношений Московского государства с Польско-Литовским государством в царствование Великого Князя Ивана Васильевича. Ч. 1 (годы с 1487 по 1533) / Ред. Г. Ф. Карпов // Сборник Императорского Русского исторического общества. Т. 35. Санкт-Петербург, 1882.

Писцовая книга Пинского и Клецкого княжеств, составленная пинским старостою Станиславом Хвальчевским в 1552—1555 гг. Вильна, 1884.

Полное собрание русских летописей. Т. 32. Хроники: Литовская и Жомойтская, и Быховца. Летописи: Баркулабовская, Аверки и Панцирного. Москва, 1975.

Полное собрание русских летописей. Т. 35. Белорусско-литовские летописи / Подг. Н. Н. Улащик. Москва, 1980.

Разрядная книга 1475—1605 гг. Т. 1. Ч. 1. Москва, 1977.

Рашид-ад-дин. Сборник летописей. Т. 1. Кн. 1. Москва—Ленинград, 1952.

Ревизия пущ и переходов звериных в бывшем Великом княжестве Литовском. Т. 1. Вильна, 1867.

Регесты и надписи: свод материалов для истории евреев в России (80 г. — 1800 г.). Т. 1: До 1670 г. Санкт-Петербург, 1899. С. 111.

Русская историческая библиотека. Т. 20. Литовская Метрика. Книги судных дел. СПб., 1903.

Русская историческая библиотека. Т. 27. Литовская Метрика. Книги записей. Санкт-Петербург, 1910.

Русская историческая библиотека. Т. 33. Литовская Метрика. Книги публичных дел. Петроград, 1915.

Собрание древних грамот и актов городов: Вильны, Ковна, Трок, православных монастырей, церквей и по разным предметам. Ч. 1. Вильно, 1843.

Старажытная беларуская літаратура: зборнік / Уклад. Л. С. Курбека. Мінск, 1990.

Тихомиров М. Н. Список Русских городов дальних и ближних // Исторические записки. 1952. Т. 40. С. 214—259.

Флетчер Д. О государстве русском // Проезжая по Московии: (Россия XVI—XVII вв. глазами дипломатов). Москва, 1991.

Acta Tomiciana. T. 1: 1507—1511. Poznań, 1852; T. 8: 1526. Poznań, 1876; T. 9: 1527. Poznań, 1876; T. 13: 1531. Poznań, 1915.

Akta Aleksandra, króla polskiego, wielkiego księcia litewskiego itd. (1501—1506) / Wyd. F. Papée. Kraków, 1927.

Akta unii Polski z Litwą 1385—1791 / Wyd. S. Kutrzeba i W. Semkowicz. Krakow, 1932.

Archiwum książąt Lubartowiczów Sanguszków w Sławucie / Wyd. Z. L. Radziszewski i in. T. 1: (1366—1506). Lwów, 1887; T. 3: (1432—1534). Lwów, 1890.

Codex epistolaris saeculi decimi quinti. T. 1: 1384—1492 / Wyd. A. Sokołowski i J. Szujski. Krakow, 1876; T. 3: 1392—1501 / Wyd. A. Lewicki. Kraków, 1894.

Cromer M. De origine et rebus gestis Polonorum. Basileae, 1566.

Decius I. De Sigismundi regis temporibus. Cracoviae, 1521.

Decius I. De Sigismundi regis temporibus liber, 1521 / Oprac. W. Czerniak. Kraków, 1901 (= Biblioteka pisarzów polskich. Nr. 39).

Dziennik Macieja Drzewickiego // Monumenta Poloniae Historica. T. 3 / Wyd. A. Bielowski. Lwów, 1878.

Freydal: des Kaisers Maximilians. Wien, 1882.

Gwagnin Aleksander. Kronika Sarmacyey Europskiey. Kraków, 1611.

Herbarz polski Kaspra Niesieckiego / Wyd. J. Bobrowicz. T. 3. Lipsk, 1839.

Herberstein S. Rerum Moscoviticarum Commentarii. Synoptische Edition der lateinischen und der deutschen Fassung letzter Hand Basel 1556 und Wien 1557 / Unter der Leitung von F. Kämpfer. München, 2007.

I diarii di Marino Sanuto. Vol. 3. Bologna, 1969 (Ristampa fotomeccanica de l'edizione: Venezia, MDCCCLXXX).

Kodeks dyplomatyczny katedry i diecezji wileńskiej. T. 1 (1387—1507) / Wyd. J. Fijałek i W. Semkowicz. Kraków, 1948.

Kojalowicz Wijuk A. Historiae Lituanae, a conjunctione Magni Ducatus cum Regno Poloniae ad Unionem eorum Dominiorum. Antverpiae, 1669.

Kroniki Bernarda Wapowskiego (1480—1535) / Wyd. J. Szujski (= Scriptores Rerum Polonicarum. T. 2). Kraków, 1874.

Kronika polska Marcina Bielskiego // Zbiór pisarzów polskich. Cz. 5. T. 16. Warszawa, 1830.

La Moscovie du XVIe siècle, vue par un ambassadeur occidental Herberstein / Présentation et traduction de Robert Delort. Paris, 1965.

Lectiones variantes primae editionis (anni 1519) Matthiae de Miechow Chronicae Polonorum // Kroniki Bernarda Wapowskiego (1480—1535) / Wyd. J. Szujski (= Scriptores Rerum Polonicarum. T. 2). Kraków, 1874.

Lietuvos Metryka. Knyga Nr. 1 (1380—1584): Užrašymų knyga 1 / Parengė A. Baliulis ir R. Firkovičius. Vilnius, 1998.

Lietuvos Metryka. Knyga Nr. 3 (1440—1498): Užrašymų knyga 3 / Parengė L. Anužytė ir A. Baliulis. Vilnius, 1998.

Lietuvos Metryka. Knyga Nr. 4 (1479—1491): Užrašymų knyga 4 / Parengė L. Anužytė. Vilnius, 2004.

Lietuvos Metryka. Knyga Nr. 5 (1427—1506): Užrašymų knyga 5 / Parengė E. Banionis. Vilnius, 1993.

Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 6 (1494—1506): Užrašymų knyga 6 / Parengė A. Baliulis. Vilnius, 2007.

Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 8 (1499—1514): Užrašymų knyga 8 / Parengė A. Baliulis, R. Firkovičius, D. Antanavičius. Vilnius, 1995.

Lietuvos Metrika. Knyga Nr. 225 (1528—1547): 6-oji Teismų bylų knyga / Parengė S. Lazutka, I. Valikonytė ir kt. Vilnius, 1995.

Luther M. Ein Sendebrief an Jhan von Schlenityz zu Jhanszhauszen [meynem besondern gonstigen herrn und freunde]. Wittenberg, 1522.

Materiały do dziejow dyplomacji Polskiej z lat 1486—1516 (Kodeks zagrzebski) / Oprac. J. Garbacik. Wrocław—Warszawa, 1966.

Memoriale domini Lucae // Scriptores rerum Warmiensium oder Quellenschriften zur Geschichte Ermlands. Bd. 2 / Bearb. v. C. P. Woelky. Braunsberg, 1889.

Regesta historico-diplomatica Ordinis S. Mariae Theutonicorum 1198—1525 / Hrsg. v. E. Joachim und W. Hubatsch. T. 1—3. Göttingen, 1948—1950.

Rocznik Stanisława Naropińskiego // Monumenta Poloniae Historica. T. 3 / Wyd. A. Bielowski. Lwów, 1878.

Rozmowa Polaka z Litwinem. 1564 / Wyd. J. Korzeniowski. Kraków, 1890.

Scriptores rerum prussicarum / Hrsg. v. T. Hirsch, M. Toppen, E. Strehlke. Bd. II. Leipzig, 1863; Bd. 5. Leipzig, 1874.

Stosunki z Mendli-Girejem, chanem tatarów perekopskich (1469—1515): akta i listy / Wyd. K. Pułaski. Kraków—Warszawa, 1881.

Stryjkowski M. Kronika polska, litewska, żmodzka i wszystkiej Rusi. T. 1—2. Warszawa, 1846.

Stryjkowski M. O początkach, wywodach, dzielnościach, sprawach rycerskich i domowych sławnego narodu litewskiego, żemojdzkiego i ruskiego / Oprac. J. Radziszewska. Warszawa, 1978.

Vitoldiana: codex privilegiorum Vitoldi magni ducis Lithuaniae 1386—1430 / Zebrał i wyd. J. Ochmański. Warszawa—Poznań, 1986.

Własnoręczne zapiski Erazma Ciołka z lat 1499—1508 // Kwartalnik Historyczny. 1902. R. 16.

Zbiór pamiętników do dziejów polskich / W. S. Broel-Plater. T. 1. Warszawa, 1858.

## Літаратура

Анталогія даўняй беларускай літаратуры: XI — першая палова XVIII ст. Мінск, 2005.

Артюхин Ю. Природные катаклизмы как одна из причин «Великой замятни» в Золотой Орде и возникновения Азака // Боспорские исследования. Вып. XXVI. Симферополь—Керчь, 2012. С. 314—334.

Базилевич К. В. Внешняя политика Русского централизованного государства. Вторая половина XV века. Москва, 1952.

Барэйша Ю. Мсціслаўскі манетны двор Алелькавічаў — Бельскіх. «Пісараўшчына» вясны 1482 г. Хроніка змовы 1480—1482 гг. па нумізматычных матэрыялах. Мінск, 2010.

Бережков Н. Г. Литовская Метрика как исторический источник. Ч. 1: О первоначальном составе книг Литовской Метрики по 1522 год. Москва—Ленинград, 1946.

Блінец А. Клецкія бітвы: 1506 і 1706 гады. Мінск, 2015.

Бойцов М. Погребение императора Фридриха III в 1493 году // Средние Века. 2000. № 61.

Борисенков Е., Пасецкий В. Тысячелетняя летопись необычайных явлений природы. Москва, 1988.

Бохан Ю. Наёмнае войска ў Вялікім княстве Літоўскім у XV—XVI стст. Мінск, 2004.

Бохан Ю. Турнірныя традыцыі ў Вялікім княстве Літоўскім у XIV—XVI стагоддзях. Мінск, 2008.

Бохан Ю. Узбраенне войска ВКЛ другой паловы XIV — канца XVI ст. Мінск, 2002.

Бычкова М. Белорусские предки Ивана Грозного // Наш радавод: Материалы Международной научной конференции по региональной истории Восточной Европы «Культура народов Великого Княжества Литовского и Белоруссии XIII—XX вв.». Ч. 3. Гродно, 1991.

Бычкова М. Е. Родословие Глинских из Румянцевского собрания // Записки отдела рукописей Государственной библиотеки им. В. И. Ленина. Кн. 38. Москва, 1977.

Бычкова М. Е. Русское государство и Великое княжество Литовское с конца XV в. до 1569 г. Москва, 1996.

Варонін В. А. Два лісты пра бітву пад Клецкам у 1506 г. // Беларускі гістарычны агляд. 1995. Т. 2. Сш. 2 (3). С. 279—290.

Возгрин В. Е. Исторические судьбы крымских татар. Москва, 1992.

Гене Б. История и историческая культура средневекового Запада. Москва, 2002.

Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Вып. 16. Мінск, 1997.

Греков Б. Д., Якубовский А. Ю. Золотая Орда и ее падение. Москва—Ленинград, 1950.

Груша А. Канцылярыя Вялікага Княства Літоўскага 40-х гадоў XV — першай паловы XVI ст. Мінск, 2006.

Гудавичюс Э. История Литвы с древнейших времен до 1569 года. Москва, 2005

Гуревич А. Ещё несколько замечаний к дискуссии о личности и индивидуальности в истории культуры // Одиссей. Человек в истории. Москва, 1990. С. 76—89.

Довнар-Запольский М. Литовские упоминки татарским ордам // Известия Таврической ученой архивной комиссии. 1898. № 28.

Думін С., Канапацкі І. Беларускія татары: мінулае і сучаснасць. Мінск, 1993.

Еврейская энциклопедия: В 16 т. Т. 9. Москва, 1991 (Репринтное издание).

Ельскі А. К. Выбранае / Уклад. Н. Мазоўка, У. Казбярук. Мінск, 2004.

Загарульскі Э. М. Заходняя Русь IX—XIII стст. Мінск, 1998.

Зимин А. А. Новое о восстании Михаила Глинского в 1508 году // Советские архивы. 1970. № 5.

Зотов Р. О черниговских князьях по Любецкому синодику и о Черниговском княжестве в татарское время. Санкт-Петербург, 1892.

Иванин М. И. О военном искусстве и завоеваниях монголо-татар и среднеазиатских народов при Чингис-хане и Тамерлане. Улан-Удэ, 2005.

Канановіч У. Дыпламатыя Вялікага Княства Літоўскага ў 1480 — першай чвэрці XVI ст. (Адносіны з Вялікім Княствам Маскоўскім і Крымскім ханствам). Дыс. ... канд. гіст. навук. Мінск, 1997.

Канановіч У. Клецкая бітва 1506 года ў гістарычнай памяці Вялікага Княства Літоўскага XVI ст. // Клецк у гісторыі Беларусі (да 500-годдзя Клецкай бітвы). Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі. Клецк, 5 жніўня 2006 г. Мінск, 2007. С. 68—76.

Канановіч У. Крымскія напады на Беларусь // Гістарычна-археалагічны зборнік: Памяці Міхася Ткачова. Ч. 1. Мінск, 1993. С. 135—155.

Канановіч У. Рэканструкцыя бітвы пад Клецкам 1506 года // ARCHE. 2014. № 12. С. 140—237.

Карпач І. Клецкая бітва з татарамі // Да новых перамог. 1991. № 109, 110, 112.

Карпов Г. Ф. История борьбы Московского государства с Польско-Литовским (1462—1508). Москва, 1867.

Карташев А. Очерки по истории Русской церкви. Т. 1. Москва, 1991.

Катлярчук А. Швэды ў гісторыі і культуры беларусаў. Мінск, 2002.

Квяткоўскі К. Бітва на Вядрошы 14 ліпеня 1500 года: ваенна-палітычныя перадумовы, абставіны і хада сечы, вынікі і значэнне для ўсёй кампаніі 1500 года // ARCHE. 2014. № 12. С. 40—120.

Кром М. Меж Русью и Литвой: Западнорусские земли в системе русско-литовских отношений конца XV — первой трети XVI в. Москва, 1995.

Лемцюгова В. П. Тапонімы распавядаюць: навукова-папулярныя эцюды. Мінск, 2008.

Леонтович Ф. Очерки истории литовско-русского права: образование территории Литовского государства. Санкт-Петербург, 1894.

Любавский М. К. Литовско-Русский сейм. Москва, 1900.

Любавский М. Областное деление и местное управление Литовско-Русского государства ко времени издания первого Литовского Статута. Москва, 1892.

Лясмайціс Г. Ад Вядрошы да Оршы: змены ў сістэме камплектавання войскаў ВКЛ // ARCHE. 2014. № 12. С. 121—139.

Ляскоронский В. Г. Русские походы в степи в удельно-вечевое время и поход кн. Витовта на татар в 1399 году // Журнал Министерства народного просвещения. 1907. № 5.

Малиновский И. Рада Великого Княжества Литовского в связи с боярской думой древней России. Ч. 2. Вып. 2. Томск, 1912.

Николай, архим. Историко-статистическое описание Минской епархии. Санкт-Петербург, 1864.

Николл Ч. Леонардо да Винчи. Полёт разума. Москва, 2006.

Описание церквей и приходов Минской епархии. Минск, 1879.

Пазднякоў В. З гісторыі вёсак Клецкага раёна (XV—XVIII стст.) // Памяць:

Гісторыка-дакументальная хроніка. Клецкі раён. Мінск, 1999. С. 72—91.

Пазднякоў В. Клецк X—XVIII стст. Матэрыяльная і духоўная культура беларускага феадальнага горада. Мінск, 2008.

Пазднякоў В. Татары Клецкага княства XVI ст. // Зборнік матэрыялаў I Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Татары-мусульмане на землях Беларусі, Літвы і Польшчы». Ч. 1. Мінск, 1994. С. 111—122.

Пазднякоў В. Умацаванні Клецка XI—XVIII стст. // Гістарычна-археалагічны зборнік: Памяці Міхася Ткачова. Ч. 2. Мінск, 1993. С. 77—92.

Пазднякоў В. Унікальны мангольскі наканечнік стралы XIII ст. з Клецка // Зборнік матэрыялаў II Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Ісламская культура татараў-мусульман Беларусі, Літвы і Польшчы і яе ўзаемадзеянне з беларускай і іншымі культурамі». Ч. 2. Мінск, 1995. С. 33—34.

Пазднякоў В. Феадальны Клецк XIV—XVIII стст. паводле даных археалагічных раскопак і пісьмовых крыніц // Клецк у гісторыі Беларусі (да 500-годдзя Клецкай бітвы). Матэрыялы навукова-практычнай канферэнцыі. Клецк, 5 жніўня 2006 г. Мінск, 2007. С. 28—40, 147—159, іл.

Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка. Клецкі раён. Мінск, 1999.

Петрунь Ф. Ханські ярлики на українські землі // Східний світ. 1929. № 2. С. 170—185.

Пилипенко М. Ф. Возникновение Белоруссии: новая концепция. Минск, 1991.

Пичета В. Белоруссия и Литва XV—XVI вв. (Исследования по истории социально-экономического, политического и культурного развития). Москва, 1961.

Пляўчынскі М. Антымаскоўскія кааліцыі Ягайлавічаў у XVI стагоддзі // ARCHE. 2014. № 12. С. 305—321.

Рогалеў А. Сцежкі ў даўніну. Геаграфічныя назвы беларускага Палесся. Мінск, 1992.

Роўэл С. «Не кладзеце надзеяў на князёў»: Міхаіл Глінскі, Жыгімонт Стары ды паны-рада // ARCHE. 2014. № 12. С. 546—581.

Русина О. В. Україна під татарами і Литвою. Київ, 1998.

Сагановіч Г. Войска Вялікага Княства Літоўскага ў XVI—XVII стст. Мінск, 1994.

Сагановіч Г. Клецкая бітва 1506 г. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі: У 6 т. Т. 4. Мінск, 1997.

Сафаргалиев М. Г. Распад Золотой Орды. Саранск, 1960.

Свенцицкий И. Лаврашевское Евангелие начала XIV века (палеографическо-грамматическое описание) // Известия отделения русского языка и словесности Императорской Академии наук. 1913. Т. 18. Кн. 1.

Семянчук А. Удзел Мацея Стрыйкоўскага ў Інфлянцкай вайне // Castrum, urbis et bellum. Баранавічы, 2002. С. 342—348.

Скрынникова Т. Харизма и власть в эпоху Чингис-хана. Москва, 1997.

Смирнов В. Д. Крымское ханство под верховенством Оттоманской Порты до начала XVIII века. Санкт-Петербург, 1887.

Старостина И. П. Судебник Казимира 1468 г. // Древнейшие государства на территории СССР: Материалы и исследования, 1988—1989 гг. Москва, 1991.

Тизенгаузен В. Г. Сборник материалов, относящихся к истории Золотой Орды. Т. 2. Москва–Ленинград, 1941.

Улащик Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания. Москва, 1985.

Федоров-Давыдов Г. А. Общественный строй Золотой Орды. Москва, 1973.

Хейзинга Й. Осень средневековья: Исследование форм жизненного уклада и форм мышления в XIV и XV вв. во Франции и Нидерландах. Москва, 1988.

Чаропка В. Клецк. Повязь часоў // Беларускі гістарычны часопіс. 2006. № 8. С. 34.

Шахматов А. В. К вопросу о финско-кельтских и финско-славянских отношениях // Известия Императорской Академии наук. VI серия. 1911. Т. 5. С. 707—724.

Шпилевский П. Путешествие по Полесью и Белорусскому краю. Мінск, 1992.

Шчакаціхін М. Нарысы з гісторыі беларускага мастацтва. Т. 1. Минск, 1928.

Щавинская Л., Лабынцев Ю. Литература белорусов Польши (XV—XIX вв.). Минск, 2003.

Элиаде М. Миф о вечном возвращении: Архетипы и повторяемость. Москва, 1998.

Элиас Н. Придворное общество. Исследования по социологии короля и придворной аристократии. Москва, 2002.

Юрганов А. Л. Категории русской средневековой культуры. Москва, 1998.

Adelung F. Siegmund Freiherr v. Herberstein: Mit besonderer Rücksicht auf seine Reise in Russland. St. Petersbourg, 1818.

Bajko A. Ludność księstwa kleckiego w okresie pomiary włócznej // Lituano-Slavica Posnaniensia. Studia Historica. 2003. T. 9. S. 180—183.

Baks P. Albrecht der Beherzte als erblicher Gubernator und Potestat Frieslands — Beweggründe und Verlauf seines friesischen Abenteuers // Herzog Albrecht der Beherzte (1443—1500): ein sächsischer Fürst im Reich und in Europa / Hrsg. A. Thieme. Köln—Weimar—Wien, 2002.

Baranowski I. Z dziejów feudalizmu na Podlasiu. Rajgrodzko-Goniądzkie państwo Radziwiłłów w I połowie XVI wieku // Przegląd Historyczny. 1907. T. 4.

Barycz H. Kromer Marcin // Polski Słownik Biograficzny. T. 15.

Boniecki A. Herbarz polski. T. 6. Warszawa, 1903.

Boniecki A. Poczet rodów w Wielkim Księstwie Litewskim w XV i XVI wieku. Warszawa, 1887.

Borucki M. Jak w dawnej Polsce królów obierano. Warszawa, 1976.

Budka W. Gwagnin Aleksander // Polski Słownik Biograficzny. T. 9. S. 202—204.

Burckhardt J. The Civilization of the Renaissance in Italy. London, 1995.

Chrzanowski I. Bielski Marcin // Polski Słownik Biograficzny. T. 2. S. 64—66.

Dembińska H. Czarnkowski Wojciech Sędziwój h. Nałęcz // Polski Słownik Biograficzny. T. 4.

Die Geschichten und Taten Wilwolts von Schaumburg / Hrsg. A. von Keller. Stuttgart, 1859.

Diveky A. Królewicz Zygmunt na dworze Władysława II, króla węgierskiego // Mediaevalia. W 50 rocznicę pracy naukowej J. Dąbrowskiego. Warszawa, 1960. S. 353—374.

Diveky A. Zsigmond lengyel herczeg Budai számadásai (1500— 1505) // Magyar Történelmi. 1914. Tár XXVI.

Długosz J. Jana Długosza kanonika krakowskiego Dziejów polskich ksiąg dwanaście. T. 5. Ks. 12 / przekł. K. Mecherzyńskiego. Kraków, 1870.

Długosz J. Roczniki czyli kroniki sławnego Królestwa Polskiego. Ks. 11 (1413—1430). Warszawa, 1985.

Dobrowolska W. Czarnkowski z Czarnkowa, Adam Sędziwój h. Nałęcz // Polski Słownik Biograficzny. T. 4. S. 214—215.

Duby G. Le dimanche de Bouvines, 27 juillet 1214. Paris, 1985.

Dundulis B. Lietuvos užsienio politika 16 a. Vilnius, 1971.

Dworzaczek W. Kojałowicz Wijuk Wojciech // Polski Słownik Biograficzny. T. 13.

Elias N. Über den Prozess der Zivilisation. Soziogenetische und psychogenetische Untersuchungen. Bd. 1: Wandlungen des Verhaltens in den weltlichen Oberschichten des Abendlandes. Frankfurt am Main, 1988.

Ernst N. Die ersten Einfälle Krymtataren in Südrussland // Zeitschrift für osteuropäische Geschichte. 1912. Bd. 3. H. 1.

Finkel L. Elekcya Zygmunta I. Sprawy dynastyi jagiellońskiej i unii polsko-litewskiej. Kraków, 1910.

Finkel L. List Michała Glińskiego o bitwie pod Kleckiem w 1506 r. // Kwartalnik Historyczny. 1915. T. 29. S. 296—299.

Finkel L. Michał Gliński // Ateneum Wileńskie. 1925/26. R. 3. Nr. 9. S. 71—81.

Fischer A. The Crimean Tatars. Stanford, 1978.

Fuchs F. Ustrój dworu królewskiego za Stefana Batorego // Studia historyczne wydane ku czci prof. W. Zakrzewskiego. Kraków, 1908.

Gamber O. Ritterspiel und Turnierrüstung im Spätmittelalter // Das rittterliche Turnier im Mittelalter / Hrsg. von J. Fleckenstein. Göttingen, 1985. S. 513—531.

Halbwachs M. La mémoire collective. Paris, 1968.

Hall B. Weapons and warfare in renaissance Europe: Gunpowder, technology, and tactics. Baltimore—London, 1997.

Hammer-Purgstall J. Geschichte der Goldenen Horde in Kiptschak. Pest, 1840.

Hieke W. Die Freiherren von Schleinitz in Nordböhmen // Mitteilungen des Vereins für Geschichte der Deutschen in Böhmen. Bd. 27. 1889.

Herbst S. Kleck 1506 // Herbst S. Potrzeba historii, czyli o polskim stylu życia: wybór pism. T. 2. Warszawa, 1978.

Heyck E. Kaiser Maximilian I. Bielefeld, 1898 (= Monographien zur Weltgeschichte. Bd. 5).

Hirschbigel J. Nahbeziehungen bei Hof-Manifestationen des Vertrauens? Karriere in reichsfürstlichen Diensten am Ende des Mittelalters (ungedruckte Habiliationsdissertation). Kiel, 2011.

Historical Dictionary of medieval Russia / Ed. L. Langer. London, 2002.

Hofmeister A. Puer, Iuvenis, senex: Zum Verständnis der mittelalterlicher Altersbezeichnungen // Papsttum und Kaisertum. Forschungen zur politischen Geschichte und Geisteskultur des Mittelalters / Hrsg. von A. Brackmann. München, 1926. S. 287—316.

Jasnowski J. Chodkiewicz Iwan // Polski Słownik Biograficzny. T. 3.

Kaczmarczyk K. Czarnkowski (z Czarnkowa) Sędziwój h. Nałęcz // Polski Słownik Biograficzny. T. 4.

Kaiser Maximilians Weisskunig. Stuttgart, 1956.

Kempa T. Dzieje rodu Ostrogskich. Toruń, 2003.

Keltische Sagen aus Irland / Hrsg. M. Löpelmann. München, 2001.

Kolankowski L. Dzieje Wielkiego Księstwa Litewskiego za Jagiellonów. T. 1. Warszawa, 1930.

Kolankowski L. Polska Jagiellonów: dzieje polityczne. Lwów, 1936.

Kolankowski L. Problem Kryma w dziejach Jagiellońskich // Kwartalnik Historyczny. 1935. Z. 3.

Kollman N. Kinship and Politics. The Making of Muscovite Political System. 1345—1547. Stanford, 1987.

Kołodziejczyk D. The Crimean Khanate and Poland-Lithuania. International Diplomacy on the European Periphery (15th—18th century). A Study of Peace Treaties Followed by Annotated Documents /(The Ottoman Empire and its Heritage. Politics, Society and Economy. Vol. 47). Leiden—Boston, 2011

Koneczny F. Sprawy z Mengli-Girejem 1473—1504 // Ateneum Wileńskie. 1927. R. 4. Z. 12—13.

Kryczyński S. Początki rodu książąt Glińskich // Prace historyczne w 30-lecie działalności profesorskiej Stanisława Zakrzewskiego. Lwów, 1934. S. 397—410.

Kuczyński S. Ziemie czernihowsko-siewierskie pod rządami Litwy. Warszawa, 1936.

Le Goff J. Héros du Moyen Age, le Saint et le Roi. Paris, 2004.

Le Goff J. Saint Louis. Paris, 1996.

Lepszy K. Czarnkowski Stanisław Sędziwój h. Nałęcz // Polski Słownik Biograficzny. T. 4.

Łowmiański H. Studia nad dziejami Wielkiego Księstwa Litewskiego. Poznań, 1983.

Malczewska M. Latyfundium Radziwiłłów w XV do połowy XVI wieku. Warszawa—Poznań, 1985.

Mol J.A. De slach by Laaksum 10 juny 1498 // It Beaken. 1998. No. 60.

Moraw P. The court of the german kings and of the emperor at the end of the middle ages // Princes, patronage and the nobility: the court at the beginning of the modern age (1450—1650) / Ed. R. Asch, A. Birke. London, 1991.

Mortensen H., Mortensen G. Die Besiedlung des nordöstlichen Ostpreußens bis zum Beginn des 17. Jahrhunderts. Bd. 2. Leipzig, 1938.

Müller J. D. Gedächtnus. Literatur und Hofgesellschaft um Maximilian I. München, 1982.

Narbutt T. Dzieje narodu litewskiego. T. 8. Wilno, 1840.

Narbutt T. Pomniejsze pisma historyczne: szczególnie do historyi Litwy odnoszące się. Wilno, 1856.

Neues allgemeines Deutsches Adels-Lexicon / Hrsg. E. Kneschke. Bd. 8. Leipzig, 1863.

Nitschke A. Bewegungen in Mittelalter und Renaissance. Kämpfe, Spiele, Tänze, Zeremoniell und Ungangsformen. Düsseldorf, 1987.

Nitschke A. Der Wandel kindlicher Bewegungweisen im Mittelalter — Vorbilder und Räume // Zur Sozialgeschichte der Kindheit. Freiburg (Breisgau), 1986. S. 469—486.

Nitschke A. Verhalten, — normen // Lexikon des Mittelalters. Bd. 8. München, 1997.

Ochmański J. Krzywy Gród wileński // Zapiski historyczne. 1971. T. 36. Z. 2.

Ochmański J. Nad Kroniką Bychowca // Studia Źródłoznawcze. 1967. T. 12. S. 155—163.

Ochmański J. Organizacja obrony w Wielkim Księstwie Litewskim przed napadami tatarów krymskich w XV—XVI wieku // Studia i materiały do historii wojskowości. T. 5. Warszawa, 1960. S. 349—398.

Oko J. Paweł Deusterwalt nieznany humanista XV wieku // Ateneum Wileńskie. 1930. R. 7. Z. 1—4.

Papée F. Aleksander (1492—1506) // Historia polityczna Polski. Cz. 1: Wieki średnie. Kraków, 1920.

Papée F. Aleksander Jagiellończyk. Kraków, 1949 (Kraków, 2006).

Papée F. Polska i Litwa na przełomie wieków średnich. T. 1. Ostatnie dwunastolecie rządów Kazimierza Jagiellończyka. Kraków, 1904.

Picard B. Das Gesandtschaftswesen Ostmitteleuropas in der frühen Neuzeit. Beiträge zur Geschichte der Diplomatie in der ersten Hälfte des sechzehnten Jahrhunderts nach den Aufzeichnungen des Freiherrn Sigmund von Herberstein. Graz—Wien—Köln, 1967.

Pietkiewicz K. Dwór litewski wielkiego księcia Aleksandra Jagiellończyka (1492—1506) // Lietuvos valstybė XII—XVIII a. Vilnius, 1997.

Pietkiewicz K. Wielkie Księstwo Litewskie pod rządami Aleksandra Jagiellończyka. Poznań, 1995.

Pociecha W. Gliński Michał // Polski Słownik Biograficzny. T. 8.

Pociecha W. Gliński Wasyl // Polski Słownik Biograficzny. T. 8.

Podhorodecki L. Chanat Krymski i jego stosunki z Polską w XV—XVIII w. Warszawa, 1987.

Podhorodecki L. Dzieje rodu Chodkiewiczów. Warszawa, 1997.

Prestwich M. Armies and Warfare in the Middle Ages: The English Experience. New Haven—London, 1996.

Purc J. Itinerarium Witolda wielkiego księcia Litwy (17 lutego 1370 roku — 27 października 1430 roku) // Zeszyty naukowe Uniwersytetu im. Adama Mickiewicza w Poznaniu. 1971. Nr. 11. S. 71—115.

Rabeler S. Niederadlige Lebensformen im späten Mittelalter. Wilwolt von Schaumberg (um 1450—1510) und Ludwig von Eyb (1450—1521). Würzburg, 2004.

Saks E. Aesti: an analysis of an ancient civilization. Montreal—Heidelberg, 1960.

Saks E. Esto-Europa: a treatise on the finno-ugric primary civilization in Europe. Montreal—Lund, 1966.

Scaglione A. Knights at court. Courtliness, chivalry and courtesy from Ottonian Germany to the Italian Renaissance. Berkeley—Los Angeles—Oxford, 1991.

Semkowicz W. O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachtą polską w Horodle roku 1413 // Lituano-Slavica Posnaniensia. Studia Historica. 1989. T. 3.

Słownik geograficzny Królestwa Polskiego i innych krajów słowiańskich. T. 11. Warszawa, 1890.

Sochaniewicz K. Itinerarium króla polskiego Aleksandra (29 listopada 1501 do 19 sierpnia 1506) // Sprawozdania z czynności i posiedzeń Polskiej Akademji Umiejętności. T. 27. 1922. Nr. 5.

Sperling O. Herzog Albrecht der Beherzte von Sachsen als Gubernator Frieslands. Leipzig, 1892.

Spuler B. Die Goldene Horde. Die Mongolen in Russland 1223—1502. Leipzig, 1943.

Streich B. Zwischen Reiseherrschaft und Residenzbildung: der wettinische Hof im späten Mittelalter (= Mitteldeutsche Forschungen. Bd. 101). Köln, 1989.

Suchocki J. Formowanie się i skład narodu politycznego w Wielkim Księstwie Litewskim późnego średniowiecza // Zapiski Historyczne. 1983. T. 48. Z. 1—2.

Tyszkiewicz J. Tatarzy na Litwie i w Polsce: studia z dziejów XIII—XVIII w. Warszawa, 1989.

Urzędnicy centralni i dygnitarze Wielkiego Księstwa Litewskiego XIV— XVIII wieku: spisy / Oprac. H. Lulewicz i A. Rachuba. Kórnik, 1994.

Walawender A. Kronika klęsk elementarnych w Polsce i w krajach sąsiednich w latach 1450—1586. 1. Zjawiska meteorologiczne i pomory (z wykresami). Lwów, 1932.

Wiesflecker H. Kaiser Maximilian I: Das Reich, Österreich und Europa an der Wende zur Neuzeit. Bd. 5: Der Kaiser und seine Umwelt: Hof, Staat, Wirtschaft, Gesellschaft und Kultur. München, 1986.

Wolff J. Kniaziowie litewsko-ruscy od końca XIV wieku. Warszawa, 1895.

Wyczański A. Między kulturą a polityką: sekretarze królewscy Zygmunta Starego (1506—1548). Warszawa, 1990.

# Геаграфічны паказальнік


**А**

Аба, горад 171
Абалонь (Кабалонь), горад 94, 98
Агароднікі, населены пункт 303
Агарэвічы, сяло 297, 299—301
Адоеў, горад 27, 38
Азенкур, горад, месца бітвы 322
Азія, частка свету 37
Азоў, горад 35, 135
Азоўскае мора 104
Алагірскі сцяг (харугва) 269, 270
Алеска, горад 113
Алізарава, сяло 297, 300
Альшаніца, урочышча 139
Амерыка, частка свету 25
Анікшты, горад 150
Антверпен, горад 128, 229
Антокаль, фальварак 148
Апакаў, горад 39
Апатаў, горад 48, 55
Апачычына, сяло 147
Апеніны (Апенінскі паўвостраў) 132, 133, 264—266
Арда, вёска 244
Арда, назва Татарскай дзяржавы 31, 48, 102, 106, 107
Арэса, рака 311
Аскол, рака 81, 103, 110
Асманская імперыя 34, 36, 40, 136
Асмолава (Асмолавічы), вёска 244, 340
Асташын, населены пункт 72, 303
Астрог, горад 263
Астэрга, зямля 144
Аўстрыя, краіна 148
Афанасаўскі, маёнтак 337
Ачакаў, крэпасць 283
Ачакаўская пераправа 283
Ашэйкаўскі двор 157

**Б**

Бабруйск, горад 59
Багемія 145, 148, 165
Бажанава (Забалоцце) 148
Базель, горад 214
Балонія, горад 213
Баравое, сяло 147
Баранавіцкі раён 299
Бароўск, горад 94, 190
Барысаў, горад 159, 175, 187
Барысаў Двор, сяло 147
Барысфен, антычная назва Дняпра 67
Бахчысарай (Бахчэ-Сарай), горад 33, 88
Беларусь, краіна 294, 315, 363
Белая, рака 106
Белая Русь 36
Белая Царква, горад 285
Белеўскі ўдзел 27
Беліца, горад 155
Белгарад-Чарнаморскі, горад-порт 28, 53, 55, 133, 134, 279
Белз, горад 55, 285
Бельск, горад 42, 172, 173
Бельская зямля 172
Бераставіца, рака 173
Берасце, горад 48, 52, 95, 135, 167, 172, 175, 188, 267, 319
Бершты, двор 127, 134, 158
Блонь, населены пункт 73, 373, 374
Блудава, сяло 167
Боснія, краіна 46
Бравароўшчына, маёнтак 340
Бранск, горад 42, 43
Браціслава *гл.* Прэшпарак
Брацлаў, горад 41, 81, 135—138, 140, 284
Брацлаўская зямля 139
Бруге, горад 142
Брэст-Куяўскі, горад 170
Брыкаўшчына, маёнтак 298, 300
Буг, рака 108, 284, 286
Буда, горад 78, 159, 160, 181, 182
Бялавічы, сяло 117
Бярозавец, вёска 303
Бярэзіна, рака 155, 286

**В**

Вавельскі замак (Вавель) 51
Вавельскі кафедральны касцёл (Вавель) 68, 79
Валахія, гаспадарства 33, 126, 135, 136, 286
Валашская зямля 56

Валашскі шлях 286
Валожын, горад 251
Валынская зямля (Валынь), складовая
частка ВКЛ 24, 36, 47, 48, 55, 114,
115, 135, 138—140, 168, 301, 319
Вальядалід, горад 138
Варатынск, горад 38
Варатынскі ўдзел 27
Вароніна, сяло 147
Васілішкі, горад 155
Васілішскі павет 147
Ватыкан, папская дзяржава ў Рыме 33
Ваўкавыск, горад 150
Ваўкавыскі павет 147
Вежуны, сяло 204
Везер, рака 141
Вена, населены пункт у Літве 65
Вена, сталіца Аўстрыі 129, 134
Венгрыя, краіна 25, 158, 160,
181, 182, 268, 357
Вендэн (Цэсіс), горад 49, 150, 220
Венецыя, горад 132, 139, 271
Венецыянская рэспубліка 228
Верона, горад 228
Верх, воласць 94, 98
Вестэрга, горад 143
Ветла, горад 113
Відава, рака 141
Вілейка, рака 122, 123
Віленскае ваяводства 203
Віленскі павет 149
Віленшчына, рэгіён 307
Вілія, рака 204
Вількамір, горад 150, 259
Вільня, сталіца ВКЛ 16, 29, 32, 40—42, 48,
49, 53, 55, 58—63, 67, 69, 71—74, 78—
80, 119, 122—126, 134, 137, 145, 147,
148, 156—158, 160, 163, 166, 171, 175,
181—183, 187, 188, 205, 207, 210, 218,
220, 221, 226, 263, 272, 273, 301, 315,
333, 360, 365, 367, 369, 370, 373—379
Абарончыя ўмацаванні
*Верхні замак* 60, 122, 124
*Вілейская вежа* 60
*Вострая (Медніцкая) вежа* 60
*Замкавая гара* 122
*Крывы замак* 123
*Ніжні (Дольны) замак*
60, 74, 122—124
*Рудніцкая вежа* 60
*Рускі горад* 123
*Троцкая вежа* 60
Храмы і манастыры
*Віленскія касцёлы і цэрквы*
123—124 (вопіс)
*Прачысценскі храм*
*(царква)* 123, 175
*Св. Станіслава касцёл* 122, 263
*Свята-Троіцкая царква* 123
*Свята-Троіцкі (Святой*
*Тройцы) манастыр* 123, 175
*Св. Яна касцёл* 60, 123, 124
Капліцы
*Гаштаўта* 122
*Манівіда* 122
Гарадскі ландшафт
*Гаштаўта пляц* 124
*Замкавая вуліца* 123
*Зялёны мост* 122
*Швінтарога даліна* 122
Вінніца, горад 135
Вісла, рака 48
Віцебск, горад 27, 41, 52, 62, 175, 228
Вішнявец, населены пункт, месца бітвы 278
Волга, рака 95, 96, 102, 105, 293
Ворскла, рака, месца бітвы 31, 94, 97, 102—
104, 107, 108, 118, 259, 260, 263, 294
Вуж, рака 59
Вышаград, горад 181
Вяда, возера 338
Вяда, воласць 188
Вядроша, рака, месца бітвы 11, 43—46,
53, 150, 158, 217, 260, 261, 263, 362
Вядрошскае поле 156
Вяжавічы (суч. Яжавічы), сяло 313, 314
Вязьма, горад 38, 39, 127
Вяйсеі, двор 146, 158
Вялікае Княства Літоўскае (Вялікае Княства
Літоўскае, Рускае і Жамойцкае, ВКЛ,
Княства) 11—14, 18, 22, 23, 25—30,
32—49, 51—64, 66—70, 74—77, 79,
82—84, 89, 92, 93, 95, 105, 106, 108,
111—120, 122, 124, 126, 127, 134, 136—
138, 140, 141, 148, 150—151, 153—155,
157—162, 165—168, 171, 172, 174—
179, 183, 185—190, 195, 198, 202—
207, 209, 212—226, 229, 230, 232, 234,
238—240, 244, 253, 259—261, 263—
278, 281—286, 295—297, 299, 302,
304—306, 311—313, 316, 318—320,
322—325, 327, 329, 330—332, 337—
339, 340, 341, 344, 352, 353, 357—364
Вялікае Княства Маскоўскае 33
Вялікае Княства Цвярское 26
Вялікая Арда 28, 29, 34, 35, 126
Вялікая Бераставіца, маёнтак 219, 224

Вялікая (Высокая) Ліпа, сяло 304, 307, 312, 313
Вялікая Польшча 183, 226, 246, 334
Вялікі Ноўгарад, горад і рэспубліка (да 1468 г.) 26, 27, 82, 86, 117, 188, 212
Вясёлы горад, населены пункт у Крыме 81

## Г

Габруны, вёска 313
Галандыя 142
Галіцка-Валынскае княства 172
Галіцка-Валынская Русь 212
Ганцавічы, горад 299
Ганцавіцкі раён 299, 300
Гарадзенскі павет 98, 116, 158, 167
Гарадзеншчына, рэгіён 307
Гарадзея, населены пункт 303
Гарадзішча, населены пункт 299, 303, 309
Гарадок (Грудэк), населены пункт 223, 224
Гарадок *гл.* Давыд-Гарадок
Гарынь, рака 284, 301
Гастамляны, маёнтак 115
Гданьск, горад 72, 77, 170, 171, 205, 229, 306, 310, 337, 368
Гезлёў, горад 37
Гелдэрн, герцагства 142—145
Германія (Немцы) 26, 46, 91, 98, 127, 129, 130, 131, 134, 154, 160, 233, 239, 271, 291, 341—343, 347, 350, 352, 358
Гладкавічы, маёнтак 97, 107, 115
Глечаніца, горад 104, 105
Глінеск, горад 94, 105
Глініца, горад 96
Глінск, горад 82, 94, 96, 102—104, 106, 108, 109, 112, 138
Глінская воласць 109, 110
Глінско, населены пункт 109
Глогаў, горад 177, 373
Глухні, вёска 113
Гольм, горад 171
Гомель, горад 42
Гонязь, горад 148, 173, 174
Горадня, горад 78, 137, 150, 156, 157, 175, 178, 183, 184, 294
Цэрквы
*Барысаглебская* 175
Гошчава, сяло 117
Гронінген, горад 144, 275
Грунвальд, населены пункт у Прусіі (зараз Польшча), месца бітвы 12, 31, 34, 76, 108, 118, 119, 122, 123, 224, 259, 260, 262, 263
Грыцэвічы, маёнтак 298, 300
Грычынскае балота 63, 312

## Д

Дабрамысль, сяло 297, 299
Давыд-Гарадок (Гарадок), горад 63, 211, 260, 295, 301, 312
Давыд-Гарадоцкі замак 296
Дакудава, населены пункт 302
Дамыслін, двор 113
Данілевічы, маёнтак 168
Дарагабуж, горад 42, 232, 261
Дарагічын, горад 172
Джучы ўлус 31, 102, 106
Дзвіна, рака 288, 290, 293
Дзікае балота 313
Дзмітраў, горад 39
Дзямідаўскі лес 313
Дзярэчын, маёнтак 172
Днестр, рака 28, 136, 286
Дняпро, рака 28, 39, 62, 102, 105, 147, 188, 198, 261, 262, 282, 283, 286, 292, 293, 311
Дон, рака 107, 286
Доўгі, населены пункт 65
Друцк, горад 62, 188
Дубніца, населены пункт 55
Дуброўна, горад у Прусіі, блізу Грунвальдскага поля 259, 261
Дусбург, горад 220, 224
Дэкшцяны, двор 148

## Е

Ельня, горад 44
Еўропа, частка свету 14, 29, 30, 36, 37, 46, 60, 129, 138, 148, 234, 239, 252, 259, 263, 268, 291, 318, 319, 344, 350, 354, 359

## Ж

Жалудок, населены пункт 221
Жалудоцкі павет 173
Жамойць (Жамойцкая зямля), гістарычная вобласць 155, 168
Жарабковічы, двор 298, 299
Жужаль, фальварак 313
Жураўка, населены пункт 108
Журылчычы, сяло 300
Жылічы, сяло 314
Житомір, горад 188, 332
Житомірскі павет 113, 115
Жэрава, сяло 147
Жэшаў, горад 55

## З

Забалоцце (Бажанава), сяло 147, 158
Заблудаў, маёнтак 219

Завілейская Літва 149
Заволжская Арда *гл.* Залатая Арда
Загальцы, сяло 147
Залатая (Заволжская) Арда 28, 30—32, 35, 36, 48, 49, 53, 54, 69, 83, 100—102, 105, 135, 148, 149, 276, 279
Занішчава зямля 298
Заслаў (Заслаўе-Валынскае), горад 135, 140, 285
Заслаўская воласць 113
Захад 25, 335
Заходняя Еўропа 40, 141, 271, 274, 318, 319
Заходняя Прусія 170
Заходняя Фрысландыя 144
Звін, рака 141
Звянігарад, горад 81
Зевенвудэн, горад 143
Змірклі, населены пункт 158
Зубкі, вёска 311

## І

Іванскае поле 219
Івацэвіцкі раён 299
Ізраіль, краіна 243
Імперыя (Resza Niemiecka, Імперыя Габсбургаў) 142, 261, 265
Інгул, рака 283
Інгулец, рака, прыток Дняпра 283
Інсбрук, горад 134
Інстэрбург, горад 157
Інфлянцкі ордэн (Інфлянты, Лівонскі ордэн, Лівонія) 49, 126, 150, 220, 228, 342
Ірландыя, краіна 292
Іслам-Керман, крэпасць 282
Іспанія, краіна 46, 138, 237
Італія, краіна 130—132, 138, 139, 148, 214, 216, 264
Ішкалдзь, населены пункт 58, 72, 121, 303, 307

## К

Кабалонь *гл.* Абалонь
Кабановічы, сяло 147
Кадчычы, сяло 167
Казань, горад 190
Казельск, горад 27, 38, 81
Калка, рака, месца бітвы 104
Калмак, рака 104
Кальчанка (Кальчан), рака 104
Каменец, горад у Польшчы 176
Каменнае, сяло 147
Камянец-Літоўскі (суч. Камянец), горад 48, 319
Камянец-Падольскі, горад 81
Камянецкі павет 68, 173
Канановічы, сяло 204
Канстанцінопаль, горад 132, 136
Капланавічы, вёска 288
Капыль, горад 57, 59, 228, 287, 332, 381
Капыльская дарога 308
Капыльскі раён 299
Капылы, сяло 68, 173
Каракарум, сталіца Мангольскай імперыі 101
Каралевец (Кёнігсберг), горад 155
Карона, назва Польскага каралеўства 14, 22, 29, 30, 33, 36, 37, 46, 48, 50, 51, 55—57, 61, 66, 67, 70, 74, 76, 79, 81, 135, 149, 155, 167, 170, 172, 175, 183, 184, 203, 214—216, 225, 234, 239, 265, 285, 319, 360, 362
Карпаты, горы 283
Карэлічы, населены пункт 303
Карэц, горад 140
Каспійскае мора 102
Кастаміраў, маёнтак 147
Кастэла Сфарчэска, замак 132
Кафа (Кефе, Феадосія), горад-порт 27, 35, 37, 104, 332
Кашылаўскія селішчы 136, 139
Кейданы, горад 155
Кернаў, горад 294
Кёльн, горад 128
Кіева-Пячэрскі манастыр 119, 174, 222
Кіеў, горад 28, 36, 39, 41, 43, 47, 48, 53, 81, 107, 118, 119, 139, 186, 285, 293
Кіеўскае ваяводства 177
Кіеўскае княства 31, 48, 186
Кіеўская Русь 315
Кіеўскі замак 147
Кіеўскі павет 115, 147, 177, 186
Кіеўшчына (Кіеўская зямля) 47, 169, 187
Кілія, горад-порт 28, 133, 134
Кіпчак, стэпавы рэгіён ва Усходняй Еўропе 31
Клевіца, двор 147
Клетэк, населены пункт 292
Клецк (Клічаск, Клеціўск), горад, месца бітвы 11—15, 55, 57, 59, 71, 72—76, 81, 84, 94, 120, 146, 163, 177, 183, 187, 188, 202—207, 209, 210, 212—217, 219, 221, 222, 224, 225, 227, 229, 233, 239, 241—253, 256—258, 260, 262—264, 267, 268, 270, 272—275, 285, 287, 288, 291—297, 299—321, 323, 324, 326,

329, 331, 334—341, 352, 353, 360—364, 366, 369, 370, 372—376, 379
Абарончыя ўмацаванні
*Верхні замак* 337
*Дольны (Ніжні) замак* 337
Вуліцы і плошчы
*Віленская (Гагарына)* 336, 338, 340
*Данілава (Лугавая)* 311, 321, 330
*Калгасная* 330
*Краснастаўская (Першамайская) вуліца* 12
*Нясвіжская (Леніна)* 310, 311, 330, 334, 336
*Панкратаўская* 321, 330
*Пінская (суч. Першамайская)* 336
*Рынак (Плошча Маякоўскага)* 310, 311, 336—337
*Сільненская (Сялянская, Янкі Купалы)* 311, 321
*Сіняўская (суч. Макаўчука)* 336
*Сіняўскі тракт (суч. Перамогі)* 321
*Слабадская (суч. Кітчанкі)* 246, 336
*Цаперская (суч. 17 Верасня)* 311, 321, 331, 336
Гарадскі ландшафт
*Арынская (Гарынская) гара (Арына, Гарыня)* 251, 274, 291, 314, 315, 324, 326, 327, 330, 334, 388
*Батурынскі паркан* 337
*Гарадзішча (Старое)* 388
*Загумнішча* 313
*Курганы* 244, 245, 247, 248, 334, 336
*Новае места* 311
*Сільненскі пагорак* 321
*Слабада* 246, 336, 339
Шляхі
*Віленскі тракт (Вялікая дарога, Каралеўскі шлях, Каралеўская дарога) 257, 316, 320, 327, 334, 339—340*
*Сіняўская дарога* 246
Храмы
*Арынская (Свята-Пакроўская)* 249, 250, 251, 253, 314, 334
*Прачысценская царква* 339
*Раства Прасвятой Багародзіцы* 339
*Св. Георгія* 249
*Св. Міколы (Святамікольская)* 308, 339, 340
*Св. Тройцы касцёл* 246, 297, 308, 334, 339, 340
*Спаская* 339
*Уваскрэсенская царква* 339
Клецка (Клецк), горад у Вялікай Польшчы 226, 227, 334
Клецкае замчышча 257
Клецкае княства 57, 62, 169, 227, 241, 246, 292, 293, 299, 300, 309,315, 335, 338, 339
Клецкая ардынацыя 243
Клецкая воласць 241, 294—301, 335
Клецкая дзяржава 227, 337, 339
Клецкая зямля 222
Клецкі замак 241, 248, 254, 296, 299, 300, 310, 314, 316, 317, 333, 336, 339, 369
Клецкі павет 115, 297, 298—301
Клецкі раён 290, 297, 299
Клеччына 14, 196, 225, 244, 247, 249, 250, 255, 288, 290, 292, 294, 297, 301, 306, 307
Княства *гл.* Вялікае Княства Літоўскае
Ковенскі замак 65
Ковенскі павет 157
Койданаў (Койданава), горад 52
Конская Вада, прыток Дняпра 282
Корсунь, горад 283
Котра, маёнтак 126
Коўна, горад 69, 82, 150, 157, 294
Кракаў, сталіца Польшчы (да 1586 г.) 17, 51, 52, 56, 78, 79, 81, 128, 133, 172, 181, 188, 213, 228, 233, 234, 263, 269, 352
Крамянец, горад 285
Кранон, лацінская назва Нёмана 370
Крапівенскае Поле, месца бітвы 269
Крапіўна, рака, месца бітвы 12
Краснае Сяло, мэстэчка 155
Краснастаўскае поле 361
Краснастаўская грэбля 304
Красны Стаў (Ружовы Стаў, Замкавы Стаў), возера і фальварак блізу Клецка 12, 222, 229, 230, 246, 252, 253, 304, 305, 313, 314, 316, 317, 320, 335
Крашын (Крошын), маёнтак 84
Круговічы, сяло 298—301
Круты Бераг, вёска 303
Крым, паўвостраў, назва Крымскага ханства 27—38, 41, 48, 50, 54—56, 59, 61, 63, 64, 69, 73, 75, 80—84, 92, 93, 96, 102, 114, 125, 126, 135, 139, 148, 177, 179, 180, 185, 200, 230, 278, 281, 286, 311, 312, 319, 331—333, 360, 365
Крымскае ханства 11, 12, 13, 27,

30—32, 36, 38, 41, 49, 81, 97, 185, 252, 269, 273, 277, 278, 279, 344
Крымскі перашыек 33
Крымскі юрт (улус) 31, 33
Крычаў, горад 188
Крэўскі замак 272
Кузьмінскі лес 137
Кунаў, горад 55
Куранец, населены пункт 187
Курнік, горад 183
Кучман, урочышча 286
Кушчыцы (Кухчыцы), сяло 300, 304, 305, 313, 314, 334, 387
Кучманскі шлях 286
Кыполава, сяло 147

## Л

Лааксум, горад 143, 144
Ламбардыя 132
Лана, рака 291
Лань, вёска 300
Лань, рака 12, 72, 76, 183, 204, 222, 288, 290—293, 300, 301, 304, 306, 308, 312—316, 320, 326, 331, 336, 339, 340, 360, 365, 366
Ланьцуцкая зямля 68
Лапацін, населены пункт 44, 261
Ласосіна, маёнтак 117, 147, 168
Лаўрышаўскі манастыр 120
Лёйвардэн, горад 144
Лівонскі ордэн (Лівонія) *гл.* Інфлянцкі ордэн
Ліворна, горад 133, 140
Ліда, горад 32, 68, 69, 71, 150, 155, 168, 207, 208, 213, 220, 221, 302, 360, 370, 372, 373—375, 378, 379
Лідскі замак 207, 373
Лідскі павет 147, 158
Ліпа, сяло 304, 306, 307, 380
Ліпск, вёска 121
Ліскава, сяло 314
Літва, гістарычная вобласць і дзяржава 13, 22, 24, 26, 30, 31, 33, 39, 40, 46, 50, 51, 61—63, 65, 67, 69, 70, 78, 83, 94, 95, 98, 99, 101, 106, 107, 109, 111, 119, 121, 122, 124, 127, 145, 148, 149, 155, 156, 159—162, 165, 169, 174, 176, 177, 180, 184, 185, 189, 190, 205, 209, 210, 215, 217, 218, 223, 228, 231, 239, 263, 301, 306, 358, 363, 369, 370, 373, 375, 378
Літоўская дзяржава 107
Літоўская зямля 47, 186, 231
Літоўская Русь 117
Ліў, населены пункт 78
Лішкаў, двор 157, 158, 183
Лоеў (Лоева Гара), горад 62, 286, 311
Лоск, маёнтак 114
Лукавец, рака 300
Лукаўцы, сяло 297, 314
Луцк, горад 81, 285
Луцкі павет 113, 167
Лучын, горад 39
Лучычы, сяло 313
Любашава, сяло 299—301
Любеч, горад 42, 341
Люблін, горад 48, 52, 64, 66, 134, 319
Любошычы (Любішчычы), сяло 299
Любуцк, горад 38, 39, 81
Любча, вёска 121
Льнянікі, населены пункт 247
Лынгмяны, населены пункт 65
Лявонавічы, сяло 298, 300
Ляхавіцкая дарога 309
Ляхавіцкая дзяржава 227—228
Ляхавічы (Ляхава), горад 257, 299, 305

## М

Магілёўская вобласць 116
Мазовія 78, 126, 172
Мазыр, горад 57, 136, 186, 188
Мазырская валасць 48
Майсэн, горад 145
Майшагала, горад 65
Макішын (Макошын), горад і валасць 94, 98, 111
Макраны, сяло 300
Максімавічы, сяло 147
Малая Польшча, рэгіён 66, 360
Малдавія, гаспадарства 286
Малева, вёска, фальварак 72, 300, 303, 307, 335
Мальбарк, горад 145, 168, 170, 171
Малы Корчын, горад 52
Малышчычы (Малашчычы), вёска 244
Мамаева ўрочышча 104
Мамай-сурка, населены пункт 104
Манголія, краіна 100
Мангольская імперыя 101
Манівідаўскі пляц 124
Манкуп (Мангуп), горад 35
Маркаўскі павет 167, 203, 204
Масальск, горад 39
Масква, горад і вялікае княства 26—29, 31, 35, 38—43, 48, 50, 54, 71, 76, 82, 84, 91, 93—95, 98, 99, 109, 117, 126, 127, 135, 149, 156, 159, 177, 188—191,

212, 235, 237, 239, 357, 358, 361
Масковія, лацінская назва Масквы 60, 85, 95, 169, 228, 230, 234, 235, 238—240, 343, 351, 352, 358
Маскоўскае княства 26, 28
Маскоўскае царства 191
Маскоўская дзяржава 11—13, 25, 26, 30, 37—41, 47, 49, 70, 84, 89—91, 159, 190, 237, 239, 267, 269, 286, 297, 344
Масцілавічы *гл.* Менідзікавічы
Медынь, горад 190
Межава, двор 155
Мена, горад 111
Менідзікавічы (Масцілавічы), сяло 297, 300
Менск, горад 43, 47, 52, 55, 587, 61—63, 67, 82, 150, 175, 182, 186—188, 282, 287, 318
Храмы
*Барысаглебская царква* 175
*Прачысценская царква* 175
*Уздвіжанскі манастыр* 175
Мельнік, горад 51, 81, 155, 172
*Мельніцкая унія* 74, 326
*Мельніцкі сойм* 74, 80
Менскі замак 187
Меншае, сяло 296, 300
Мерацкі павет 157
Мерач, горад 150, 156—158, 173, 183, 294
Мерач, рака 156
Мерзэбург, горад 146
Мёртвыя Воды, мясцовасць 286
Мікольскі манастыр у Жыдачаве 175
Мілан, горад 131—133, 139
Мір, замак 121, 272
Мірашова, сяло 298, 300
Міхлін, вёска 113
Морач, рака 288, 294, 300, 301
Мсціслаў, горад 53, 118, 119, 188
Мсціслаўскі раён 116
Мураўскі шлях 286
Мухаедавічы, сяло 147
Мцэнск, горад 39, 81
Мыш, населены пункт 299
Мяшчэрск, горад 38

## Н

Навадворкі, вёска 297
Навара, рэгіён 133
Навасадаў, востраў 314
Навасельца, маёнтак 147
Навастаў, сяло 147
Нагайская Арда 36, 185
Налібоцкая пушча 355
Нача, рака 300
Неапаль, горад 132, 139
Невяжа, рака 155
Неманойці, маёнтак 66
Немянчын, населены пункт 65
Нёман, рака 155, 157, 294, 302, 303, 319, 355, 356, 370, 375
Нідэрланды, краіна 128, 141—145, 274, 275
Ніжняе Панямонне, рэгіён 282
Навагародак, горад 49, 52, 55, 59, 62, 72, 136, 175, 187, 188, 194, 195, 211, 220, 282, 301, 302, 308, 312, 360, 365
Навагародскае ваяводства 177, 222
Навагародскае намесніцтва 121, 299, 300
Навагародскае ўзвышша 287
Навагародская зямля 299
Навагародскі замак 121
Навагародскі павет 83, 84, 116, 120—122, 167, 177, 188, 269, 297, 337
Навагародчына, рэгіён 270
Новы Двор, маёнтак 113, 115, 116, 120, 275, 297
Новы Рут, маёнтак 147
Ноўгарад-Северскае княства (зямля) 31, 47
Ноўгарад-Северскі, горад 36, 42, 50
Нэўда, рака 303
Нягневічы, вёска 121, 122
Нясвіж, горад 57, 59, 229, 300, 304, 308, 321, 334
Нясвіжская воласць 300
Нясвіжская дарога 309, 310, 314, 327
Нясвіжскі раён 299, 307

## О

Олеўская воласць 147
Орша, горад 52, 53, 188, 206, 224, 260, 262, 263, 272, 273
Остраў, замак 50
Оўруцкі замак 115
Оўруцкі павет 113, 115
Оўруч, горад 59, 147, 188, 228, 332
Очкаў, маёнтак 147

## П

Паволжа, рэгіён 30
Падляшша, рэгіён 50, 148, 155, 172, 173, 219, 223, 307
Падняпроўе, рэгіён 103, 105, 109
Падолле (Падольская зямля), рэгіён 28, 31, 36, 47, 48, 65, 67, 81, 113, 114, 138, 140, 168, 286
Падуя, горад 213
Паланэчка, населены пункт 303
Палессе, рэгіён 188, 285

Палонка, вёска 307, 379
Палтава (Палдова), горад 94, 96, 104, 105
Панача, сяло 300
Панкратавічы, вёска 311
Панямонне, рэгіён 70, 115, 222, 354, 360
Парчаў, горад 113, 134
Паўднёва-Заходняя Русь, рэгіён 110
Паўднёвая Русь, рэгіён 110
Паўднёвы Буг, рака 286
Паўночна-Усходняя Русь, рэгіён 31
Паўночны Каўказ, рэгіён 103
Пашэнка, сяло 299, 300
Перакопская Арда (Перакоп), другая назва Крымскага ханства 32, 33, 36, 48, 54, 66, 281, 282, 284, 286, 287
Пераломскі павет 146, 158
Перамышль, горад 27, 175
Пераяслаўскае княства 31
Персія, краіна 36, 101
Петрыкавічы (суч. Петрыкаў), населены пункт 63, 228, 286, 311, 332, 381
Петухова магіла 139
Пётркаў, горад 49, 51, 119
*Пётркаўска-Мельніцкая унія* 79
Пінск, горад 47, 58, 206, 286, 293, 295, 301, 305, 309, 387, 388
Пінскае княства 169, 299, 300, 315, 335, 338
Пінская воласць 299
Пінская дарога 309
Пінскі павет 168
Пожань *гл.* Прэшпарак
Познань, горад 46, 78, 183
Полацк, горад 27, 41, 46, 62, 82, 175, 186, 217, 318
Полацкі павет 187
Польскае каралеўства 22, 55, 62, 122, 234
Польшча, краіна 18, 22, 26—28, 33, 35—39, 46, 49—52, 66, 67, 70, 78, 126, 127, 134, 140, 145, 148, 151, 155, 156, 159—161, 167, 170, 172, 176, 183, 184, 205, 214, 216, 222, 223, 228, 261, 263, 265, 268, 269, 271, 281, 283, 301, 305, 342, 352, 362, 375
Понец, населены пункт 226
Почап, горад 188
Прага, горад 181
Пронск, горад 81
Прусія, краіна 51, 126, 148, 170, 205, 217, 228, 259, 301, 318, 342
Пруская зямля 220
Прут, рака 136
Прыпяць, рака 48, 57, 63, 147, 168, 211, 284—290, 293, 301, 311, 319
Прычарнамор'е, рэгіён 28, 279
Прэны, двор 157, 173
Прэшпарак (Пожань, Браціслава), горад 181
Псёл, рака 103, 110
Пскоў, горад-рэспубліка 82, 126, 318
Пултуск, горад 183
Пуня, двор 173
Пустынскі манастыр 175
Пуціўль, горад 39, 42, 81
Пціч, рака 286

## Р

Равена, горад 193, 322
Рагачоў, горад 38, 295
Радам, горад 61
Радашкавічы, населены пункт 155
Разань, горад і вялікае княства 31, 82
Райгарад, горад 148, 173, 174
Ракаў, воласць 116, 120
Рамейкава, сяло 299
Рамігала, горад 155
Расійская імперыя 250, 252, 253, 363
Ратам (Ратамка), маёнтак 186
Ратна, горад 113
Рашка, зямля 268
Рашскае каралеўства 268
Рашуковічы, воласць 120
Рокішкі, мястэчка 155
Рось, рака 284
Роўна, горад 139
Рудніцкая пушча 156
Ружовы Стаў *гл.* Красны Стаў
Руская дзяржава 293
Русь (Русія), агульнае паняцце 41, 47, 86, 91, 98, 107
Русь, складовая частка Вялікага Княства Літоўскага 13, 22, 26, 28, 30, 33, 40, 51, 55, 61, 62, 65—67, 70, 71, 101, 111, 119, 121, 149, 165, 169, 189, 217, 223, 228, 229, 263, 268, 293, 301, 318, 360
Рыга, горад 318
Рыльск, горад 43, 50, 81
Рым, горад 126, 132
Рэйн, рака 291
Рэч Паспалітая, краіна 223, 228, 244, 251, 253, 269, 271, 363

## С

Сава, рака 268
Сакаль, населены пункт 81, 310, 331
Сакальскі замак 331
Саксонія, зямля 47, 134, 145, 148, 154
Салхат, горад 33

Сандомір, горад 52
Санта Марыя дэ ла Грацые, манастыр 133
Сапотвіны, фальварак 335
Сарай, сталіца Залатой Арды 102
Сарматыя, краіна 228, 229
Сарока, населены пункт 56, 140
Сарока, рака 139
Саўка, сяло 147
Сахочаў, населены пункт 94, 98
Сваротва, маёнтак 120
Свержань, маёнтак 116
Свіслач, населены пункт 58, 319
Святая Рымская Імперыя 129, 131, 138, 139, 141, 142, 162, 170, 181, 235, 350, 357
Северскі Данец, рака 103, 110
Сейм, рака 103, 110
Серакаў, воласць 97, 107
Сербія (Сербскае каралеўства), краіна 268
Сервеч, рака 303
Серпухаў, горад 38, 127
Серхаў, маёнтак 97
Сілезія, правінцыя 148, 220, 375, 379
Сільна (Сельна), рака 272, 288, 291, 292, 306, 308—311, 314—316, 317, 320—331, 360, 365
Сільненскае балота 310, 311, 316, 330, 336, 339
Сінія Воды, месца бітвы 263
Сіняўка, маёнтак і фальварак 300, 335
Сіняўка, мястэчка і вёска 251, 304, 305, 334, 335
Скавышынскі лес 203, 204, 286
Скерстамоны, населены пункт 65
Скіфія, краіна 36
Скубрычы, сяло 147
Слонім, горад 52, 117, 187, 301
Слонімскі павет (воласць) 116, 147, 168, 299
Слуцк, горад 47, 57—59, 62, 187, 188, 203, 204, 228, 286, 287, 293, 294, 301, 308, 312, 332, 378
Слуцкае княства 169, 293, 299
Слуцкая дарога 308
Слуцкі замак 58
Случ, рака 57, 286, 287, 293, 311
Смаленск, горад 27, 41, 43, 44, 46, 52, 53, 81, 82, 118, 175, 183, 186, 188, 230, 232, 234, 238, 239, 273
Храмы
*Прачысценская царква* 175
*Свята-Троіцкі манастыр* 175
Смольнае возера 53
Сніпарод, населены пункт 103
Спорава, сяло 299
Стаі, селішча 113
Стаклішкі, мястэчка 65
Станка (Ставак), воласць 97, 107, 115
Старадуб, горад 42, 81, 94, 95
Стары Крым (Эскі-Крым, Салхат), горад 33
Старына, урочышча 305, 312, 313
Стары Рут, маёнтак 147
Строжаўцы, маёнтак 168
Стрэва, рака, месца бітвы 263
Стрэлен, горад 145
Стыр, рака 301
Сула, рака 110
Сульча, рака 284
Супрасль, манастыр 173, 219, 222
Супрасль, рака 221
Сухлічы, вёска 246, 311
Сушчаны, сяло 147
Сучава, горад 136
Сырыца, рака 50
Сычы, сяло 147
Сякерычы, вёска 246, 311
Сярпейск, горад 39
Сярэдняя Азія, рэгіён 31
Сярэдняя Еўропа, рэгіён 130, 148
Сярэнск, горад 27

## Т

Таванская пераправа 282
Тавань, востраў, крэпасць 282, 283, 286
Таганаў, маёнтак 147
Тарнава (суч. Трнава), горад 181
Татарская дарога 246
Татарская зямля (Татарыя) 103, 107, 228, 368
Таўрыда (Таўрыка), старажытная назва Крыма 33, 65
Торунь (Торн) 50, 170
Трокі, горад 31, 119, 122, 137, 154, 157, 163
Троцкае ваяводства 158, 173, 269
Троцкі замак 185
Троцкі ключ 119
Троцкі павет 269
Тураў, горад 47, 48, 58, 109, 168, 169, 185, 286, 293, 301, 319
Тураўскае княства 168, 293
Тураўская воласць 168, 169, 297
Турцыя, другая назва Асманскай імперыі 34, 35
Тэкунаўская зямля (Тэкунаўшчына) 203, 204
Тэль-Авіў, горад 243
Тэрвурэн, замак 128
Тэўтонскі ордэн 25, 26, 122, 145, 148, 156, 170, 172—174, 209, 210

## У

Угра, рака 29
Уздолбіцы, населены пункт 138
Украіна 97
Ула, рака 218, 219, 260
Уладзімір-Валынскі, горад 81, 175, 285
Уладзімір-Залескі, горад
і вялікае княства 31
Уладзімірскі павет 167—168
Уладова (суч. Уладава), населены пункт 108
Унраў, населены пункт 77, 330, 368
Уселюб, вёска 121
Усход 25
Усходняя Еўропа, рэгіён 13, 14,
22, 26, 28, 36, 89, 204
Уцяна, горад 148—150, 157
Уша, рака 59, 139, 204, 292, 293, 303

## Ф

Фларэнцыя, горад 133
Фрайбург-Брайзгаў, горад 144
Францыя, краіна 132, 139, 182
Фрысландыя, рэгіён 130, 137, 141—
145, 148, 271, 274, 275, 343

## Х

Хагенаў, горад 236
Хайльсброн, горад 128
Харасан, правінцыя ў Персіі 101
Харахорын, маёнтак 97
Хінеўка, рака 300
Хляпень, горад 38, 127
Ходабэнд, правінцыя ў Персіі 101
Ходасава (суч. Ходасы), сяло 116, 120
Ходча, горад 176
Хойніцы, горад у Прусіі 98, 217, 221, 260, 263
Холм, горад 175
Хорабр, горад 94, 98, 111
Horазаў, воласць 97, 107

## Ц

Цапра, маёнтак і вёска 297, 300, 311
Цапра, рака 213, 222, 288, 291, 296,
300, 306, 308, 318, 332, 365, 381
Цвер, горад 27, 31, 117
Цэцеравец, фальварак 335
Цецераў, рака 284
Цёмнае возера 317
Ціроль, горны рэгіён 133, 140
Цна, рака 288, 293, 300, 301
Цырын, населены пункт 303
Цыцкавічы, сяло 298, 300
Цэнтральная Еўропа 25, 271
Цягін, крэпасць 39, 283
Цягінка, рака 283
Цягінская пераправа 283
Цясьма, рака 284

## Ч

Чанавічы, вёска 313
Чаркасы, горад 56, 81, 283, 284
Чарнаўцы, горад 136
Чарнігава-Северская зямля 108—111
Чарнігаў, горад 39, 42
Чарнігаўскае княства 31
Чарнкаў, маёнтак 226, 227
Чашнікі, горад 218, 219
Чорнае мора 32, 283
Чорны лес 283, 284
Чорны шлях 283, 284—286
Чынгізхана імперыя 30
Чырвоная Русь 286
Чэрыньёла, горад, месца бітвы 322
Чэхія, краіна 25, 46, 160, 165, 271

## Ш

Шаматулы, горад 183
Швейцарыя, краіна 46
Шлягераўскі Двор 157
Шолавіцкі перавоз 204
Шолавы, сяло 204
Штум, горад 170
Шчара, рака 294
Шчорсы, маёнтак 116, 120, 121,
126, 167, 354, 355

## Э

Эйшышкі, мястэчка 95
Эльбланг, горад 170
Эльзас, рэгіён 233
Эмерых, горад 145

## Я

Ягалдаеўшчына, рэгіён 110
Ягінтаўская зямля 203, 204
Якшыцы, сяло 314
Яраславец, горад 190
Яраслаў, горад 55, 66, 176

# Імянны паказальнік

## А


Абаленская, княгіня 191
Абдула, татарын 64
Абрагім Цімірчыч, пісар 81
Абрам Езафовіч, падскарбі 338
Агрыда, татарын 339
Адам Якубавіч з Котры, пісар 126
Адзінцэвічы, род 147
Адоеўскія, князі 39
Ажбердзей, татарын 64
Азбука, кіят 101
Азюбек (Аджубек), царэвіч 270, 271
Азярэцкі Іван , князь 189
Азярэцкія, княскі род 147
Айдар (Гайдар), палонны татарын 83
Айдар Малы, талмач 65
Айдар Хазбеевіч, служылы татарын 65
Айзенштадт Барыс, гісторык 243
Айзенштадт Іуда бен Лёб, равін 243
Айзенштадт Майсей, равін 243
Айзенштадт Міхал бен Мейр, равін 243
Айзенштадты, равінскі род 243
Айзік Езафовіч, купец 338
Алан-Гоа, жонка Боданчара 93, 100
Алекса (Лекса, Лексада, Аляксандр), татарскі князь, сын Мансур-Кіята 95, 96, 98, 104—108
Александровічы, мяшчанскі род 244
Алелькавіч Аляксандра, княжна 295
Алелькавіч Мар'я, княгіня 295
Алелькавіч Міхаіл, князь 117, 122
Алелькавіч Сямён Міхайлавіч, слуцкі князь 57, 58, 63, 67, 68, 287
Алелькавіч Юрый Юр'евіч, князь 224, 228
Алелькавічы, княскі род 48, 117, 119, 212, 295, 299
Алена Іванаўна, вялікая княжна, каралева 16, 39—42, 68, 74, 77, 99, 127, 149, 170, 171, 231, 370, 373
Алехна Кенкевіч, татарын 106
Алізар, баярын 297, 298
Аліфер, баярын 65, 104
Альберт *гл.* Табар Войцех
Альбрэхт (Альберт) Саксонскі (Вецін), саксонскі герцаг 129, 130, 134, 137, 141—145, 175, 236, 237, 274, 275, 341, 343, 344, 361
Альгерд, вялікі князь 34, 123, 169
Альжбета, каралева-маці 51, 62, 357
Альтдорфер Альбрэхт, мастак 129
Аляксандр Казіміравіч Ягелончык, вялікі князь і кароль 11, 12, 17, 22, 24, 32, 34, 36, 37, 39—41, 43—46, 48—56, 58—60, 62—64, 66—74, 77—80, 89, 91, 99, 109, 121, 124—128, 134—141, 146, 148, 149—151, 155—156, 158, 159, 160, 162—164, 167, 168, 170—172, 175—177, 184, 186, 202—210, 213, 214, 220, 221, 230, 231, 233, 239, 240, 262, 271, 274, 295, 298, 306, 310, 318, 333, 335, 344, 345, 353, 354, 357—360, 365, 366, 368—370, 372, 377
Аляксандраў Сямён, служэбнік 147
Аляксееў Леанід, гісторык 289
Аляхновіч Пётр, кухмістр 153
Анакоза Рамадан, талмач 65
Андрэй Валатовіч, баярын 113
Андрэй Мацвеевіч, мешчанін 246
Антоній, святы 123
Аргыны, крымскі род 34
Асанчуковіч Урус-Улан Ахмет, служылы татарын 65, 83, 270
Асанчуковічы, татарскі род 83
Асан, маршалак 65
Асмаіл (Ісмаіл) 244
Асман, харужы, князь 65
Астапка, падданы 298
Астравух Ігнат Сцяпанавіч, пан 315
Астрожская Аграфена (Кацярына), княгіня 149
Астрожская Настасся, княжна 97, 108
Астрожскі Даніла, князь 97, 108
Астрожскі Канстанцін Іванавіч, князь, гетман 43, 44, 45, 60, 76, 135, 136, 137—141, 149, 158, 169, 183, 188, 216, 231, 238, 261, 263, 265, 275
Астрожскі Міхаіл, князь 139
Астрожскі Фёдар Данілавіч, князь 97
Астрожскія, княскі род 97, 109
Атыла, легендарны кароль 260
Аўраам, прарок 83
Аўраам, стараста 65
Ахманьскі Ежы, гісторык 219, 279
Ахмат, хан 28, 29
Ахмед, татарскі калга 283


## Б


Баба, персідскі военачальнік 101
Бава, легендарны герой 260
Багавіцінавіч Богуш, пісар 68, 231
Багавіцінавіч Леў, чашнік 153

Багдан, служылы татарын 339
Багдан Аляксеевіч, дваранін 68, 173
Багдан Карэйвіч, пан 148
Балінскі, прыдворны лекар 73
Балтрамеевіч-Дамонтавіч Алехна, пан 203
Балтрамеевіч-Дамонтавіч, Харытон, пан 203
Банецкі Адам, гісторык 112
Баплан Гіём дэ, падарожнік і інжынер 287
Бараноўскі І., гісторык 174
Барбара, дачка Амброзія Пампоўскага 226
Бардаш, служылы татарын 317
Бароўскія, князі 94
Барташ Табаравіч, маршалак 152
Барыны, крымскі род 34, 83
Басолі Карла, мастак 88
Батуш, крымскі пасол 64, 69, 82
Батый (Бату), хан 31, 38, 100
Бахты-Сеіт, служылы татарын 270
Бахціяр Даўлетэкавіч, мурза 61
Башык, татарын 64
Баязід II, султан 29, 87
Белеўскія, князі 39
Бельская Яўнута, пані 221
Бельскі Дзімітрый Фёдаравіч, князь 90, 190
Бельскі Марцін, гісторык 215, 220, 229
Бельскі Сямён, князь 42, 43
Бельскі Фёдар, князь 117
Бельскія, княскі род 90, 119
Бердзей, служылы татарын 339
Бердзібек, залатаардынскі хан 102
Біці-Гірэй, крымскі царэвіч 57, 62, 67, 70, 72, 73, 75, 81, 82, 278, 282, 308, 309, 311, 320—322, 324, 327—329, 331—333, 335, 360, 365, 380
Блінец Андрэй, гісторык 314, 326
Блок Марк, гісторык 342, 353
Богуш, татарын 64
Боданчар, легендарны продак Чынгізідаў 93
Бона Сфорца *гл.* Сфорца Бона
Бонер Ян, бургграф 233
Брандт Грэгар, райца 171
Бранкавічы, арыстакратычны род 160
Брант Себасцьян,ураднік 129
Бруйн Карнэліс дэ, мастак 200, 201
Брык, баярын 289
Брыковіч Федзька, баярын 298
Буанакорсі Філіп Калімах, каралеўскі выхавацель 77
Бубенька Святлана, археолаг 317
Бургкмайр Ганс, мастак 21
Бурлуд, зяць Чынгізхана 96
Бурнаш, крымскі царэвіч 62, 67, 70, 72, 73, 75, 81, 82, 278, 282, 308, 309, 311, 320—322, 324, 327—329, 331—333, 335, 360, 365
Бучацкі Ян, ваявода 58, 68
Быкоўскі Грыцка, дваранін 61

**В**

Валатовіч Андрэй, уладальнік маёнтка 113
Валовічы, арыстакратычны род 98
Валчковіч Цішка, службовы баярын 169
Вапоўскі Бернард, храніст 65, 67, 176, 208, 209, 213—215, 224, 316, 362, 370, 375
Варатынскі Фёдар, князь 95
Варатынскія, князі 39, 114
Васілевіч Трахім, святар 340
Васіліса Іванаўна, княгіня 222
Васіль II, вялікі князь маскоўскі 295
Васіль III, вялікі князь маскоўскі 24, 60, 82, 90, 91, 94, 96, 110, 185—186, 189, 190, 230, 233, 235, 238—240, 272, 273, 341, 353
Васіль Барысавіч, брат вялікага князя Міхаіла Барысавіча 117
Васіль Масквіцін, баярын 65
Васка, служылы татарын 339
Васка Пятровіч, мітрапалічы дзяк 146
Ватцэнродэ Лукаш, біскуп 65, 66, 73, 75, 204, 205, 209, 210, 306, 309, 315, 366
Ваўжынец, святы 207, 373
«Веткоперы», групоўка ў Нідэрландах 142
Веціны, дынастыя 128—130, 144, 145, 153
Вімпелінг Якуб, ураднік 129
Вінчы Леанарда дэ, інжынер, мастак 133
Вісконці, арыстакратычны род 131
Вісконці Валянціна, герцаг 132
Вісконці Марыя, герцагіня 131
Вісконці Філіп, герцаг 131
Вісліцкі Ян, паэт 206, 310
Вітаўт, вялікі князь 25, 31, 33, 34, 40, 82, 93—95, 97—99, 106—110, 116, 118, 122, 123, 156, 169, 203, 204, 212, 239, 263, 282, 294, 353
Вітцлебены, арыстакратычны род 130
Воін Яцкавіч, служэбнік 189
Вол Юрый, легендарны продак Валовічаў 98, 223
Вольтэр Ёхан, пісар 170
Вольф Юзаф, гісторык 113
Война Мацвеевіч, баярын 299
Войцех Івашкавіч, маршалак 152
Войшалк-Вайшвілак, князь 121
Вяжэвіч Іван, шляхціч 300
Вялічка, служылы татарын 339
Вячаслаў Яраславіч, князь 293, 301

**Г**

Габсбургі, дынастыя 129, 130, 132—133, 135, 138—140, 153, 242, 265, 346, 351, 354
Гагін Міхайла, баярын 189
Гальшанская Ядвіга, княгіня 120
Гальшанскі Аляксандр, кашталян, стараста 51, 52, 122
Гальшанскі Іван Альгімунтавіч, князь 169, 363
Гальшанскі Іван (Ян) Юр'евіч, князь 117, 122, 216
Гальшанскі Павел, біскуп 362
Гальшанскі Сямён Юр'евіч, намеснік 55, 139, 140, 279
Гальшанскі Юрый, пан 78
Гальшанскі Януш Аляксандравіч, крайчы 153
Гальшанскі-Дубровіцкі Юрый Іванавіч, князь 59
Гальшанскія, княскі род 119, 120, 193, 212
Ганна, княгіня 148
Ганна дэ Кандал, графіня дэ Фуа, каралева 182
Ганус, бакалаўр 65
Ганус, немец 157
Гараін, баярын 337
Гарнастай, пан 59
Гаўрыла Мялешкавіч, баярын 115
Гаштаўт (Гаштольд) Альбрэхт Марцінавіч, пан, падчашы 63, 126, 147, 148, 153, 161, 185, 211, 216, 232, 233, 302, 362
Гаштаўт Марцін, ваявода 126
Гаштаўты, панскі род 122, 212
Гваньіні (Гвагнін) Аляксандр, храніст 197, 223, 228, 229
Гедзімін, вялікі князь 79, 122, 294
Гедзімінавічы, дынастыя 294, 296
Гедройцкія, князі 110
Генрык Валуа (Валежы), кароль 229
Генрых Карлавіч, немец 157, 172
Георг, саксонскі герцаг 237
Георгій, сын Васіля III 90, 190
Геранім, святы 130
Герасім, мітрапаліт 118
Герберштайн Жыгімонт, пасол, аўтар 60, 85, 130, 141, 156, 162, 163, 177, 234—240, 341—343, 345, 349, 351, 353, 357, 358, 359, 363, 369
Герваст Пётр з Унрава, каморнік 71, 77, 330, 368
Герман, дзяк 44
Гінэк Ян, падкаморы 68
Гірэі, дынастыя 32, 33, 86, 112
Гіясэдзін, бацька Хаджы-Гірэя 31
Глеб Дамонтавіч, баярын 203, 204
Глезна Іёна, мітрапаліт 123
Глінская Алена Васілеўна, вялікая княгіня 90, 110, 190, 238
Глінская Федка 115, 120
Глінскі, Аляксандр *гл.* Алекса
Глінскі Барыс Іванавіч, князь 91, 92, 94, 95, 97, 98, 108, 112—114, 115, 120, 297
Глінскі (?) Барыс Сямёнавіч, князь 65
Глінскі Васіль Барысавіч, князь 114, 135
Глінскі Васіль Васілевіч, князь 114
Глінскі Васіль Дашкавіч, князь 115
Глінскі Васіль Львовіч (Сляпы), князь 89, 92, 95, 99, 103, 109—111, 114, 115, 118, 120, 124, 146, 147, 148, 153, 158, 167, 168, 187, 188, 190, 357
Глінскі Васіль Міхайлавіч, князь 191
Глінскі Дашка, князь 115
Глінскі Дзімітрый Васілевіч, князь 109, 114, 146, 189
Глінскі Іван, князь 108, 109, 189
Глінскі Іван Аляксандравіч, продак князёў Глінскіх 92—95, 97—99, 107—109, 111—113
Глінскі Іван Барысавіч, князь 114, 125
Глінскі Іван Васілевіч, князь 114
Глінскі Іван Львовіч (Мамай), князь 89, 92, 95, 103, 109, 111, 114, 115, 118, 120, 124, 125, 146, 147, 153, 158, 167, 177, 179, 186, 188, 357
Глінскі Леў Барысавіч, князь 14, 91, 92, 114—120, 147
Глінскі Міхаіл Васілевіч, князь 191
Глінскі Міхаіл Львовіч (Дародны, Немец), князь 11—14, 26, 47, 49—52, 60, 62, 64, 66—81, 85, 86, 89—95, 97—100, 103, 109—112, 114—119, 121—137, 139, 141, 142, 144—150, 152—169, 171—191, 204, 205, 207—210, 212—218, 221, 223, 225, 230—240, 248, 259, 262, 263, 265, 269, 272, 274, 275, 302, 304—306, 309, 311, 314—316, 319, 320, 323—328, 330—334, 339—345, 349—363, 365—367, 369—376, 380
Глінскі Рыгор Барысавіч, князь 59, 114
Глінскі Сямён Васілевіч, князь 114
Глінскі Сямён Іванавіч, князь 97, 108
Глінскі Юрый Васілевіч, князь 190
Глінскі Юрый Васілевіч (Храмы), князь 146
Глінскі Фёдар Іванавіч, князь 97, 108, 115
Глінскі Фёдар Львовіч, князь 99, 103, 114, 115, 125
Глінскія, княскі род 14, 49, 62, 71, 82,

86, 89—99, 103—113, 115, 117—120, 123, 126, 146, 148, 154, 158, 167—169, 179, 185—191, 230—232, 234, 268, 275, 300, 341, 354
Глябовіч Івашка, пан 65
Глябовіч Мікалай, пан 45
Глябовіч Станіслаў, пан, пасол 41, 78, 152, 156, 162
Глябовіч Фёдар, пан 298
Глябовіч Юрый, намеснік 125
Глябовічава Марына, пані 149
Глябовічы, панскі род 126
Гоз Ульрых, немец 157
Гоф Жак Лё, гісторык 202, 342, 353
Грынь Якававіч, пушкар 310
Грыцэвіч Багдан Онкавіч, месціч 25
Гурка О., гісторык 278
Гурскі Станіслаў, канонік 234

**Д**

Дабарэвічы, падданыя 298
Давойнавіч Андрэй Якубавіч, падкаморы 153
Даматкан, баярын 299
Даматканы, баярскі род 300
Дамонтавічы, баярскі род 203, 204
Данілавічы, дынастыя 91
Данка, служылы татарын 339
Данцішак Ян, пасол 138
Дарохна, жонка Яна Сяндзівоя Чарнкоўскага 226
Даўлет-Берды, хан 31
Дашка, баярын 65
Дашкавіч Астафій, пан 147, 216
Джанібек, залатаардынскі хан 31, 101
Джучы, хан 31, 101
Джучыды, дынастыя 101
Джэвіцкі Мацей, каронны падканцлер, канцлер 52, 205
Джэлал-эд-Дзін (Чжэлегдзінь), хан 34, 35
Дзімітрый, сын Івана III 52, 53
Дзюрэр Альбрэхт, мастак 129
Дзядок, дваранін 61
Дзяменя, служэбнік 147, 189
Дзямід, бортнік 298
Длугаш Ян, каралеўскі выхавацель, храніст 77, 214, 268
Дойстэрвальт Павел, канцлер 210
Дракула, дваранін 159
Дрожджа, Андрэй Аляксандравіч, дваранін 50, 114, 125, 135, 147, 168, 186, 187, 189
Дрожджа Пётр, дваранін 186, 189
Друцкі Андрэй, князь 147, 189
Друцкі Філіп, князь 189
Дэрбішэле Еваш, мула 65
Дэрмаш, татарын 64
Дэцыус (Дэцый) Ёдак (Юстус), пісьменнік 233, 234, 342, 351, 359
Дыбоўскі Себасцьян, мешчанін 246, 339, 340

**Е**

Елісей, святы 120, 121
Емурчэй, татарын 65
Епімахавіч Пятрашка, дваранін 65
Ермаловіч Мікола, гісторык 289
Есугэй-багатур, унук Хабул-хана 100
Еська, баярын 65
Есьмановіч Сцяпан, баярын 116
Еўлашоўскі Фёдар, аўтар мемуараў 227, 246, 260, 338

**Ж**

Жадзей Патарочыч, баярын 169
Жангеча, палонны татарын 83
Ждан, служылы татарын 339
Ждановічы, мяшчанскі род 244
Жыгімонт Кейстутавіч, вялікі князь 31, 33, 92, 98, 113, 122, 294, 298, 358
Жыгімонт Стары, каралевіч, пасля кароль 18, 34, 51, 52, 60, 62, 67, 68, 73, 74, 78—84, 91, 98, 99, 106, 138, 145, 146, 147, 149, 160, 173, 176—186, 188, 189, 203, 213—216, 230, 231, 233, 240, 263, 269, 278, 341, 353, 373, 375, 376, 378, 379
Жыгімонт Аўгуст, вялікі князь, кароль 216, 260
Жыжэмскі Васіль, пан 189
Жыжэмскі Дзімітрый, пан 189
Жыжэмскія, панскі род 147
Жынявой, дваранін 63
Жэрабяцічы, баярскі род 147

**З**

Забалоцкі Аляксей, пасол 135, 286
Забярэзінскі Станіслаў Янавіч, маршалак 152, 154, 174
Забярэзінскі Ян Юр'евіч, ваявода 47, 51, 52, 62, 64, 66, 68, 74, 126, 151, 154, 158, 161—166, 174, 176, 177, 183—185, 189, 216, 218, 230, 231, 239, 240, 302, 328, 349, 353, 373, 376, 379
Забярэзінскі Ян Янавіч, маршалак 153, 154
Забярэзінскія, арыстакратычны род 86, 154
Залахуб, дачка Чынгізхана 96
Залман (Захарый) Маркавіч, яўрэй 338
Заслаўскі, князь 224
Заслаўскі Міхаіл, пан 78
Захар'іны-Юр'евы, княскі род 90
Заяц Юрый, гісторык 306
Зенка Яўлашкавіч, намеснік, ключнік 337

Зенька Андрэевіч, войт 340
Зоф'я, дачка Сцібара з Понеца 226
Зусціньян Сабасцьян, пасол 159
Зяноўевіч Мікалай, пан 45
Зяноўевіч Юрый, пан 81

**І**

Іаан, святы 123
Іван, сын Васіля III 181
Іван III Васілевіч, вялікі князь 11, 26—28, 35, 38—42, 45, 50, 52, 90, 117, 127, 230, 278, 286
Іван IV Васілевіч, вялікі князь, цар 82, 91, 99, 238, 260
Іван Вакуліч, святар 314
Іван Данілавіч, вялікі князь 91, 98
Іван Карыбут, князь 95
Іван Янкавіч, дваранін 65
Івашкавіч-Паўліковіч Грынь, баярын 297
Івашкавіч-Паўліковіч Мацка, баярын 297
Івашэнцавіч Андрэй, пан 147
Івашэнцавіч Багдан, пан 147
Івашэнцавіч Дзімітрый, пан 147
Івашэнцавіч Якуб, пан, пасол 63—64, 81, 114, 147, 178, 179, 189
Ізабела, каралева Кастыліі 132, 139
Іздэмір, царэвіч 83
Ізмаіл, татарын 65
Ікібек улан, татарын 64
Ілініч Юрый Іванавіч, намеснік 52, 152, 168, 338
Ілініч Яцка, баярын 299—301
Ілінічы, панскі род 121
Ініклік, татарын 64
Ісак Шмойлавіч, яўрэй 338
Іслам-Гірэй, царэвіч 282

**К**

Кадыр-Берды, хан 34, 35
Кадышавіч Андрэй, князь 64
Кадышавіч Іван, князь 64
Казімір, каралевіч 79
Казімір Ягайлавіч, вялікі князь і кароль 22—29, 33, 38, 78, 79, 82, 92, 94, 95, 97, 98, 113, 115, 117, 119, 120, 122, 124, 125, 146, 151, 184, 217, 221, 294—298, 300, 337
Казлоўскі Іван, князь 189
Казлоўскія, князі 147
Кайрычак-аглан, хан 107
Каладзейчык Дарыюш, гісторык 31
Калантай Фёдар, дваранін 61
Калафёр, пан 160
Калумб Хрыстафор, першаадкрывальнік 25
Калькройт Тама фон, дваранін 47
Калькройтар (Калікратар), каралеўскі жаўнер 47, 164—166
Камін Філіп дэ, пісьменнік 131
Камянецкі Мікалай, ваявода 67
Канстанцін Міхайлавіч, пісьменнік 268
Капернік Мікалай, астраном 204
Кардоба Ганзала дэ, военачальнік 322
Карл, гелдэрнскі герцаг 144, 145
Карл V, імператар 138, 237
Карл VIII, кароль 131, 139
Карл XII, шведскі кароль 251
Карпач Іван, краязнаўца 306, 313
Карыбут-Дзімітрый, князь 114
Карыбутавіч Фёдар, князь 114
Карыбутавіч Ян, князь 114—115
Карыбутавічы, княскі род 97
Карыгайла-Казімір Альгердавіч, князь 123
Карым-Берды, хан 34, 35
Касаіт, татарын 65
Касцевіч Юрый, пасол 49
Касцевіч Януш Станкавіч, мечнік 153
Касцільёне, прыдворны 346
Касым Булатавіч, служылы татарын 270
Касым Сандукавіч, князь 64
Катневіч Грышка, баярын 338
Каяловіч Віюк-Войцех, храніст 229, 363, 378
Кебек, хан 34, 35
Кезгайла Станіслаў Янавіч, стараста, вялікі гетман 46, 52, 78, 127, 158, 162, 174
Кезгайлавіч Міхал, канцлер 23, 116, 211
Кезгайлы, род 23
Келбаса, земляўласнік 299
Кельміш-ака, дачка Кутукту 101
Кенкевічы: Адка, Алехна, Банка, Ісак, Келім, Легун, служылыя татары 270
Кецінг Лукас, райца 170
Кіпрыян, мітрапаліт 107
Кіпчакі, крымскі род 34
Кірык Анатоль, мастак 254
Кірыла Тураўскі, біскуп 169
Кітмахмет, татарын 65
Кішка Станіслаў Пятровіч, вялікі гетман 43, 45, 52, 63, 70, 71, 136, 153, 162, 174, 207, 211, 213, 214, 218, 302, 312, 362, 363, 365, 373, 374, 376, 379, 380
Кіяты (Кіятавічы), род 92, 93, 95—97, 100, 110, 112, 148, 354
Клімец, падданы 298
Клочка Войцех Янавіч, пан, ахмістр 52, 148, 149, 152, 174
Клочка Мацей, стараста 149
Копаць, пісар 218, 328
Котвіч Ян, пасол 279
Кочар, татарын 64

Кранц Леанард, сакратар 351
Красінскі, граф 212
Кром Міхаіл, гісторык 42
Кромер Марцін, летапісец 213—215, 224, 373
Крыжыны, браты, служэбнікі 147, 189
Крэткоўская Катарына, пані 226
Крэчатоўскі Іван, уласнік 338
Кудаш, служылы татарын 339
Кудаяр, татарын 64
Кукі-наён, знатны кіят 100
Кулікавіч Ціша, падданы 298
Кулікавіч Якаў, падданы 298
Кульмбах Ганс фон, мастак 18
Курдас, легендарны татарскі князь 259
Курмаш, служылы татарын 339
Курыцын Іван, пасол 135
Кутукту, хан 101
Кучукавіч Войцех Янавіч, маршалак, намеснік 52, 152
Кучукавічы, панскі род 126
Кучыньскі Стэфан, польскі гісторык 109, 111

## Л

Ланг Мацізс,ураднік 129
Ланya Жыльбер дэ, падарожнік 158
Ласкі Ян, каронны канцлер 17, 18, 52, 66, 68, 73, 77, 78, 170, 176, 205, 208, 341, 362, 373, 376, 379
Леванавіч Пракоп, дыякан 314
Легуш, талмач 65
Лібранскі, доктар, пасол 127
Лінгвен-Сямён, князь 118, 119
Лінгвенавіч Іван Юр'евіч, князь 116—119, 123
Лінгвенавічы, княскі род 118
Літвін Міхалон (Венцлаў Мікалаевіч), публіцыст 37, 43, 99, 218, 233, 279, 282, 284
Лука, пан 369
Львовічы, браты Глінскія 49, 89, 92—95, 98, 99, 104, 109—112, 114—116, 147, 148, 158, 185, 186, 191
Лысенка Пётр, археолаг 315
Любаўскі Мацей, гісторык 151, 295
Любіч Васька, пісар 298
Любіч Пятрашка, пісар 298
Людовік XII, французскі кароль 144
Людовік XIV, французскі кароль 344
Людовік Арлеанскі, герцаг 132
Людовік (Людвік) Ягелон, каралевіч 134, 182
Лютэр Марцін, рэлігійны рэфарматар 146

## М

Мажайскі, Сямён Іванавіч, князь 42, 50, 136
Маймон Саламон, філосаф 243
Майснер Крыштаф, жаўнер 134, 137
Макарый, мітрапаліт 48
Маклакоў Губа Мікіта, пасол 185
Макоўскі Тамаш, мастак 248, 255
Максіміліян I Габсбург, рымскі кароль, імператар 21, 128—131, 133, 138—140, 142—145, 152, 161, 170, 181, 235, 237, 239, 265, 271, 344—348, 350, 352, 357, 361
Малыш, служылы татарын 244, 339
Малышка Супрыч, татарын 106
Мамаевічы, род 73, 103, 354
Мамай, князь 18, 86, 92, 93, 95—97, 102—108, 112—113, 119, 354, 360
Мамак, князь 106
Мамкажа, татарын 64
Мамчыц-Сеіт, палонны татарын 83
Мандт Ёрг, райца, бурмістр 170, 171
Манівід Ян, пан 123, 124
Манівіды, арыстакратычны род 23, 122
Мансур-Кіят, легендарны продак кн. Глінскіх 92, 93, 96, 97, 99, 104—107, 112
Манцігердавіч Пётр Янавіч, ваявода, гетман 127, 137, 138
Манцігердавічы, панскі род 114
Мань, служылы татарын 339
Мараскі Пётр, пасол 235, 236
Маргарыта, эрцгерцагіня 128
Мардас Мішкавіч, стараста 183
Маркварт Тэафіль, служэбнік, цырульнік 154
Масквіч Рак, дваранін 63
Маскевіч, гараднічы 279
Маствіловіч Андрушка (Андрэй), пан 297, 298, 300
Матаў Іван, служэбнік 147, 189
Махмет Амін, казанскі хан 80
Махмет-Гірэй, крымскі царэвіч, хан 62, 67, 82, 84, 136, 282
Мацей Адамавіч, мяшчанін 246
Мацей з Блоні, прыдворны лекар, 73, 376, 377
Мацей Корвін, венгерскі кароль 268
Мелік-баша, палонны татарын 83, 84, 332
Мелік-Хафез, уплывовы татарын 83
Менгету-кіян, знатны кіят 100
Менглі-Гірэй, крымскі хан 11, 27—30, 32, 34, 35, 37, 41, 46, 47, 48, 53—56, 59, 61, 62, 64, 65, 69, 70, 72, 74, 80—84, 87, 103, 106, 112, 118, 119, 134,

136, 178—181, 185, 186, 182, 202, 230, 231, 278, 279, 282, 283, 285, 360, 371
Менгу-Цімур, хан 101
Мікалаевіч Венцлаў *гл.* Літвін Міхалон
Мікалай з Каменца, каронны гетман 176
Мікольскі, дзяк 172, 189
Мілевіч, зямянін 299
Міляноўскі Станіслаў, каронны віцэ-падскарбі 68
Мінквічы, арыстакратычны род 130
Мітка, дзяк 65
Міхаіл Барысавіч, вялікі князь цвярскі 117, 147, 168
Міхаіл Жыгімонтавіч, князь 32, 294, 296
Міхаленца, служэбнік 216
Мішка Каленік, баярын 113
Мольна, татарын 65
Монтаўтавіч Станіслаў, пан 167
Монтаўтавічы, панскі род 126
Мардаўлат, татарскі хан 34
Моўчан Свіркавіч, баярын 169
Мсціславец Пётр, друкар 219
Мсціслаўскія, князі 116
Мугэту-бахадур, знатны кіят 100
Муртаза, сын Мелік-башы 84
Муртаза, хан 29
Мышкоўскі Георгій, каронны пісар 68
Мялешкавічы, баярскі род 115
Мяхоўскі Мацей, гісторык 37, 65, 67, 207, 208, 213—216, 220, 224, 373

## Н

Нагай, хан 101
Нарбут Тэадор, гісторык 59, 131, 162—165, 363
Нарбутавіч Войцех, надворны харужы 153
Нарбутавіч Пётр, падкаморы 153
Нарбуты, панскі род 126
Настасся, княгіня слуцкая 63, 228
Нач (Онач), пан 113
Негліч Андрэй, сакратар 351
Неміровіч Андрэй, пан 218, 303, 309
Неміровіч Мікалай, пан 121
Неміровіч Фёдар, пан 297
Неміровіч Юрый, пан 63, 211, 218, 303, 309
Неміровіч Ян (Івашка), пан 113, 295, 297
Неміровічы, панскі род 121, 126, 222, 297
Нурдуўлут, хан 34, 35
Нурум Майкавіч, служылы татарын 270
Няміра, шляхціч 302

## О

Осцік (Осцікавіч) Рыгор Станіслававіч (Станкавіч), надворны маршалак 44, 45, 150, 156, 180

## П

Паджогін Шыгона, пасол 237
Пазднякоў Валерый, археолаг 317
Палаёла дэль П'ера, мастак 133
Палаўчын, падданы 298
Пампоўскі Амброзій, стараста, ваявода 205, 226
Панька, баярын 65
Папельжынскі Павел, мешчанін 246
Пацка Пятрышчавіч, баярын 298
Пацэвіч Юрый, пан 52, 155, 172
Пашкоўскі Марцін, перакладчык 229
Перамышльскі Іван, ваявода 44
Перасвет, легендарны асілак 326
Пербердзі, хан 34, 35
Петкавічы, панскі род 126
Пешка, баярын 97
Пётр I, цар 252
Пётр з Дусбурга, гісторык 220, 223
Пішчык, зямянін 298
Пішчыкавіч Леўка, зямянін 299
Пішчыкавіч Рыгор, зямянін 299
Плетэнберг Вальтэр, лівонскі магістр 49, 50, 53
Пнёўскі Ян, пасол 182
Побаль Леанід, археолаг 315
Пойцінгер Конрад, ураднік 129
Пронскі Фёдар, князь 61
Прэствіч Майк, гісторык 263
Прыхабскі, князь 65
Пузына, ксёндз 340
Пуцята Палачанін, баярын 65
Пуцяціч Дзімітрый, ваявода, пасол 34, 48, 53—55, 61, 123, 146, 147, 169, 174, 175
Пфінцынг Мельхіёр, ураднік 129
Пфлугі, арыстакратычны род 130
Пяткевіч Кшыштаф, польскі гісторык 142, 162, 168, 174
Пятраўскас Вілюс, кампутарны дызайнер 195
Пятрышча Рыгоравіч, баярын 298

## Р

Рабенвальдт Мертэн, райца 170, 171
Рабічковіч Абрам Езафовіч, падскарбі 157, 338
Рабле Свен, гісторык 128
Рагацінскі Івашка, намеснік 295, 299
Радзівіл, маршалак 207
Радзівіл Геранім Фларыян, князь 243
Радзівіл Мікалай I, ваявода 121, 122, 126
Радзівіл Мікалай Мікалаевіч, падчашы, троцкі ваявода 44, 51, 68, 126, 153, 161, 172, 174, 232
Радзівіл Мікалай Руды, магнат 216, 218, 226
Радзівіл Мікалай Чорны, канцлер

215, 216, 225, 226, 336
Радзівіл Мікалай Юзаф 243
Радзівіл Ян Мікалаевіч, пан, маршалак 126, 152
Радзівілы, род 23, 78, 121, 174, 216, 226, 229, 232, 241, 244, 248, 296, 337, 340, 363
Разак, служылы татарын 339
Рамадан, талмач 80
Раман Фёдаравіч, князь 294
Раманавая, пані 147
Ратундус Аўгустын, войт 217
Рачка, аркебузнік 225
Рашыд-ад-Дзін, летапісец 100
Рогалеў Аляксандр, даследчык 292
Роўэл Стывен, гісторык 141
Рымант-Васіль-Лаўрыш, легендарны князь 120
Рынгальт, легендарны князь 259, 262
Рэчжып, пісар і талмач 61

**С**

Садула, татарын 65
Саід-Ахмат, хан 29, 32, 35, 48
Сакалінскі, князь 187
Саковіч Андрэй, пан 113
Саковічы, панскі род 126
Салагубавіч Юрый Андрэевіч, пан 64
Салджыдай-гурган, эмір 101
Салтанец Барысавіч, баярын 169
Сантай Жыгімонт, венгерскі пасол 54
Сапега Багдан, пан 44
Сапега Іван Сямёнавіч, пан, маршалак 64, 152, 174
Сапега Івашка, пісар 126
Свідрыгайла, вялікі князь 32, 97, 108, 109, 111, 112—114, 259
Святоша, служэбнік 147, 189
Сегень Пафнуцій, настаяцель 173
Сезда, князь, брат Касыма Сандукавіча 64
Сеілт (Хажа-Сеіт), палонны татарын 83, 84
Сенка, служылы татарын 339
Сенька Тверыцін, баярын 65
Скалыбічы Ігнат і Даніл, баяры 169
Скарына Францішак, першадрукар 25, 192
Скіндар (Іскандэр), сын Мансур-Кіята 96, 106, 107
Скіргайла, вялікі князь 169, 262
Солтан Аляксандравіч, маршалак 121, 172
Солтан Іван Андрэевіч (Івашка), падскарбі 68, 153
Солтаны, панскі род 126
Соф'я, княжна 128
Спытак з Яраслава, кашталян 66, 176
Станіслаў Пятровіч, пан 114
Стафан, малдаўскі ваявода 41, 126, 135, 136, 140
Стафан, святы 129
Стафан, уладальнік маёнткаў 108
Стафан Баторы, кароль 227, 229
Сташчанюк Віктар, мастак 194
Струміла Станіслаў Пятрашкавіч, маршалак 134
Стрыйкоўская Дарота, сваячка Мацея Стрыйкоўскага 227
Стрыйкоўскі Мацей, храніст 63, 218, 220, 223—229, 248, 258, 304, 306, 307, 310, 311, 316, 325, 329, 363
Супрыч Малышка, татарын 106
Сфорца, род 132, 133
Сфорца Бона, каралева 216, 223, 232, 241, 242, 244, 246, 310, 335—339
Сфорца Б'янка Марыя, герцагіня 131, 133
Сфорца Джан-Галеаца, герцаг 131, 133
Сфорца Ладавіка, герцаг 131, 132
Сфорца Муцыё Атандола, кандацьер 131
Сфорца Франчэска, герцаг 131
Сцібар з Понеца, падкаморы 226
Сцяцко Мацей, дваранін 159
Сюлімень, нагайскі пасол 65
Сякліцкі Якуб, пасол 279
Сямён Татарын, клецкі жыхар 339
Сярэбраны-Абаленскі Пётр, ваявода 218

**Т**

Табар Войцех (Альберт), віленскі біскуп 51, 68, 75, 122, 155, 162, 174, 373, 376, 379
Тага Цімур, брат Батыя 31
Тагушэвіч Кайка, служылы татарын 269
Тагушэвічы, татарскі служылы род 269—271
Тайлак, крымскі ганец 80
Такта, хан 100
Талстой Васіль Сямёнавіч, гісторык 251
Таміцкі Пётр падканцлер 234
Тарахожа, палонны татарын, сын Мелік-Хафеза 83
Татар Мань, служылы татарын 339
Тахтамыш, хан 31, 33—35, 104—107, 110, 112, 360
Тахтамышавічы, ханскі род 74
Трайнат (Транята), князь 121, 259
Трубяцкія, князі 43
Трубяцкой, ваявода 250
Трунец, падданы 298
Трызна Іван, шляхціч 302
Трышчан, легендарны герой 260
Тулуй (Тулі), сын Чынгізхана 100
Тураў Ізмаіл, служэбнік 147, 189
Тэкун, баярын 203

Тэмеш, маршалак 64
Тэмуджын *гл.* Чынгізхан
Тэнчынская Ганна, пані 226
Тэнчынская Ядвіга, пані 226
Тэнчынскі Мікалай, пан 226
Тэнчынскі Ян, кашталян 226
Тэнчынскі Ян, пан 226

**У**

Угэдэй, хан 101
Узбек, залатардынскі хан 101, 102
Уладзіслаў IV, кароль 203
Уладзіслаў Казіміравіч Ягелон, кароль чэшскі і польскі 51, 54, 135, 148, 159—160, 182, 357, 358
Уладзіслаў Ягайла, кароль 31, 106, 169, 192, 203, 237, 238, 259, 260, 261, 262, 301
Уладзімір Альгердавіч, вялікі князь 169
Уланавічы: Адка, Ахмет, Бекім, Турун 64
Улу-Мухамед, хан 33, 35
Уніхоўскі Рыгор, пан 247
Урус, маршалак 64
Урустай Менскі (Мцэнскі), князь 107, 111
Урусчак, кіят 106
Усейн Хажак, нагайскі пасол 65

**Ф**

Фальк Генрых, райца 171
Фальконіуш Фама (Тамаш), клецкі казнадзей 338
Федзька Гаўрылавіч, баярын, пісар 121, 125
Федзька Рыгоравіч, пісар 121
Федзька Янушковіч, пісар 18
Фердынанд, арагонскі і сіцылійскі кароль 132, 139
Фердынанд, рымскі кароль 237
Фёдар, служылы татарын 339
Фёдар Карыбутавіч, князь 97
Фёдараў Іван, друкар 219
Філіп Габсбург, каралевіч 142
Фрол, падданы 298
Фрыдрых, саксонскі герцаг 20, 129
Фрыдрых (Фрыдэрык), брандэнбургскі маркграф 127, 128
Фрыдрых, магістр Тэўтонскага ордэна 145, 148, 168, 174
Фрыдрых Лагодны, курфюрст 130
Фрыдрых Габсбург, імператар 129
Фрыдрых Мудры, саксонскі герцаг 128
Фрыдэрык, кардынал 51, 54, 55
Фуа Гастон дэ, военачальнік 322
Фугер Якуб, банкір 129
Фурс (Фурсавіч) Пётр, баярын 147, 155, 178, 179
Фухс Найхард, военачальнік 143

**Х**

Хабул-хан, легендарны продак Чынгізхана 96, 100
Хабургаеў Георгій, даследчык 289
Хаджы-Гірэй, хан 27, 31—35, 82
Хадкевіч Аграфена, пані 221
Хадкевіч Аляксандр, віцебскі намеснік 26
Хадкевіч Аляксандр Іванавіч, маршалак 152, 173, 216, 221—224
Хадкевіч Іван, ваявода 173, 221
Хадкевіч Рыгор Аляксандравіч, ваявода, гетман 218—223, 275
Хадкевіч Ян Геранімавіч, пан 220
Хадкевічы, панскі род 212, 216, 220, 222—223, 363
Хадэцкі (з Ходчы) Станіслаў, каронны маршалак 67, 176
Хажа-Сеіт *гл.* Сеілт
Хажам-Бердзей, крымскі пасол 61
Хажаш, палонны татарын 83
Хазак, заволжскі князь, брат Шах-Ахмата 53
Хазяш, пасол 180, 186
Халецкі Міхал, пасол 49
Ханлайн Віт, служэбнік 128
Харэвіч Іван Міхайлавіч, староста 241, 336
Хасан, сын Мелік-башы 84
Хацка Лазаравіч, яўрэй 338
Хачы Мяндзей, пасол 178
Хвальчэўскі Станіслаў, клецкі староста 336
Хедэрлайн Ганс, военачальнік 133
Хербст Станіслаў, гісторык 287, 305, 312
Храптовіч Васіль Багданавіч, дваранін, лоўчы 125, 139, 153
Храптовіч Марцін Багданавіч, пан, канюшы, падскарбі, лоўчы 64, 68, 120, 125, 152, 167, 232
Храптовіч Мітка, дваранін 65
Храптовіч Федзька (Фёдар) Багданавіч, дваранін, падскарбі 65, 68, 125, 152—153
Храптовіч Ян Літавор, маршалак 44, 45, 92, 98, 120—122, 125—128, 135, 141, 232, 354, 355, 357
Храптовічы, арыстакратычны род 14, 116, 120, 121, 126, 154, 167, 354

**Ц**

Целяпнёвы-Абаленскія, княскі род 90
Цёлак Эразм, біскуп 68, 205
Цімур (Тамерлан), сярэднеазіяцкі заваёўнік 105, 106, 320
Цімур-Кутлук, хан 31, 94, 97, 107, 108, 259

Цішкавіч Леў, пан 61, 187
Цымерман Матс, бурмістр 170, 171
Цювікель-улан, крымскі пасол 80
Цяпецкая, удава 169

### Ч

Чажаліцкі Мацей, пасол 159
Чалубей, легендарны асілак 326
Чалядніны, княскі род 90
Чан Каір, заволжскі пасол 49
Чаратай, татарын 64
Чаркас, татарын 49, 150
Чарнкоўская Катарына 226
Чарнкоўскі Адам Сяндзівой, ваявода 227
Чарнкоўскі Андрэй, познаньскі біскуп 226
Чарнкоўскі Беньян, шляхціч 246, 247
Чарнкоўскі Валенты, шляхціч 227, 246, 247, 339, 340
Чарнкоўскі Войцех, кашталян 226
Чарнкоўскі Войцех Сяндзівой, стараста-генерал 226—228
Чарнкоўскі Жыгімонт 226, 228
Чарнкоўскі Мацей 226
Чарнкоўскі Пётр, познаньскі кашталян 226
Чарнкоўскі Станіслаў, стараста 226
Чарнкоўскі Станіслаў Сяндзівой, рэферэндар 226—228
Чарнкоўскі Сяндзівой, ваявода 215, 220, 226—228, 302, 327, 374, 376, 381
Чарнкоўскі Ян, кашталян 226—228
Чарнкоўскі Ян Сяндзівой, пан 226, 227
Чарнкоўскія, арыстакратычны род 226, 227, 228, 246, 247
Чарнкоўскія, шляхецкі род 227, 228, 247
Чартарыйскія, арыстакратычны род 253
Чартовіч Яцка, землеўласнік 299
Чынгізхан (Чынгіз), імператар 31, 38, 87, 93, 96, 100—102, 270
Чынгізіды, дынастыя 73, 74, 96, 97, 101, 102
Чэрнік Ян, гетман 46, 47, 165

### Ш

Шалгала (Салгала) Станіслаў, уласнік 339
Шамячыч, Васіль Іванавіч, князь, ваявода 42—43, 136, 186, 188
Шаумбург Вільвальт фон, военачальнік 129, 143—145, 275
Шах-Ахмат, хан 30, 48—50, 52—54, 64—66, 69, 82, 92, 103, 135, 148, 150, 157, 185, 230, 270, 276, 282, 318
Шлягер Генрых, мытнік 157
Шляйніц Крыштаф, жаўнер, служэбнік 145, 146, 154, 184
Шляйніцы Вольф, Генрых, Георг, Ёхан, Эрнст, Хугальд, Ян, Брыгіта, Катарына, Магдалена, шляхецкі род 145, 146
Шонбергі, арыстакратычны род 130
Шпілеўскі Павел, пісьменнік 249, 251, 317
Шуйскі Пётр, ваявода 218
Шуйскія, княскі род 90
Шымон Стары, прарок 372
Шэлендорф Ульрых, служэбнік 154
Шчакаціхін Мікола, гісторык мастацтва 60
Шчэня Даніла, ваявода 44, 188
Шчэпа (Шчэпка) Фёдар, баярын 299, 337
Шчэпы, баярскі род 300
Шыдлавецкі Крыштаф канцлер 237, 238
«Шырынгеры», групоўка ў Нідэрландах 142
Шырыны, крымскі род 31, 33, 34, 83

### Э

Эбенштайн Георг, военачальнік 133
Эліяс Норберт, сацыёлаг 344
Эмінэк, князь 34
Эрнст Мікалай, гісторык 278
Эстрайхер Караль, бібліёграф 341

### Ю

Юлій, папа рымскі 36, 37
Юрый Захарніч, ваявода 44
Юрый Сямёнавіч, князь, літоўскі пасол 113
Юхна Сеітавіч, татарын 106
Юшка Вязьміцін, баярын 65

### Я

Ябагчы-ўлан, пасол 178
Ягалдай Сараевіч, князь 82, 103, 105, 107, 110
Ягелоны (Ягайлавічы), дынастыя 12, 14, 29—30, 36, 51, 61, 74, 80, 117, 120, 129, 133—135, 140, 181, 230, 342
Якаў, яўрэй 157
Якаў Захарніч, ваявода 42
Якім Грыневіч, гаспадарскі пушкар 310
Якшычы-Бранкавічы, сербскі арыстакратычны род 148, 160, 268
Ямант Тулунтавіч, князь 294
Ян Ольбрахт, кароль 22, 49, 127, 128, 134—136, 140, 217, 268
Ян Пятровіч, маршалак 44
Янушка, маршалак 152
Янчура, пасол 178
Яраславіч Васіль, князь 95, 295
Яраславіч Іван Васілевіч, князь пінскі і клецкі 59, 94, 95, 114, 222, 295, 297, 309, 337
Яраславіч Фёдар Іванавіч, князь пінскі і клецкі 58, 94, 188, 245, 296, 335, 338, 339
Яраславічы, мясцовыя князі 227, 246, 247, 272, 295, 300, 301, 335, 340
Яўстафій, святы 123
Яцка Барысавіч, баярын 169

Навуковае выданне

**Уладзімір Ільіч Кананові̇ч**

# РЫЦАР НА ПОЛІ. КЛЕЦК, ЖНІВЕНЬ 1506 Г.: ГІСТОРЫКА-АНТРАПАЛАГІЧНАЕ ДАСЛЕДАВАННЕ

Навуковы рэдактар: Максім Макараў
Вёрстка: Зміцер Гупянец
Карэктура: Вераніка Гуйда
Дызайн вокладкі: Заміра Болцікава
Адказны за выпуск: Аляксандр Пашкевіч

Падпісана ў друк: 29.12.2017. Фармат 70x100 1/16
Друк афсетны. Папера газетная.
Улік.-выд. арк. 25,62. Умоўн.-друк. арк. 33,05
Наклад 200 асобнікаў. Замова 53

Выдавец:
Таварыства з абмежаванай адказнасьцю “Інбелкульт”
АДРН 1136733002120
пас. Малкамбіната, д. 21, 216790
г. Рудня Смаленскай вобласці, Расійская Федэрацыя
inbielkult@gmail.com

Надрукавана ў:
Друкарня «Ляўко»
вул. Уладзіміра Вялікага, д. 2, 79000, г. Львоў, Украіна

Гістарычная рэканструкцыя Клецкай бітвы 1506 г. уяўлялася няпростай задачай. Праблема не ў тым, што захаваліся толькі адзінкавыя сведчанні пра гэту падзею. Галоўнай цяжкасцю было тое, што сам аповед пра бітву з'яўляецца такой жа «рэальнасцю», як і сама гэта падзея. Усе ранейшыя спробы аднаўлення ходу бітвы абапіраліся на аповесць пра яе ў версіі "Хронікі Быхаўца", якая сама з'яўляецца гістарыяграфічнай канструкцыяй, створанай не менш чым праз 50 гадоў пасля падзеі.

Спалучэнне традыцыйных метадаў гістарычнага даследавання з метадамі лінгвістыкі, анамастыкі, археалогіі, дапоўненае старанным вывучэннем мясцовага ландшафту, дазволіла мне аднавіць у самых агульных рысах перадумовы і ход бітвы.



ISBN 978-5-00076-043-7

Уладзімір КАНАНОВІЧ Рыцар на полі бітвы